Нина Малдекан

# Холад доннай вадй

Ніна Маеўская

# Холад доннай вады

аповесці

МІНСК
«МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА»
1989

ББК 84Бел7
М13

Рэцэнзент *Алесь Масарэнка*

В новую книгу Нины Маевской вошли произведения, насыщенные интересными жизненными коллизиями, судьбы героев непросты и подчас противоречивы. Героиня повести «Холод донной воды» Анюта-Анна мучается угрызениями совести. У нее хорошая семья, прекрасный муж, но она полюбила другого человека... Проблемы долга, нравственной чистоты, ответственности за свои поступки — в центре внимания писательницы.

М $\frac{4702120201 - 083}{М\ 302(03)-89}$ 14—89

ISBN 5-340-00019-2.

© Выдавецтва «Мастацкая літаратура», 1989

# ЗАМОВА АД СТРАХУ



## 1

«Любая мая, я так доўга, неверагодна доўга шукаў цябе...»

Няйначай гэта было пісьмо. А чытаць чужыя пісьмы... Але вачэй ужо нельга было адарваць. Сева пакасіўся на Росціка, ці не пазірае той, але рукі не паклалі лісток на месца, пад стосік насовак.

Што ён шукаў у шуфлядцы матчынага трумо? Здаецца, шпільку... А можа — іголку, што патрапіцца. Не трымаць жа Росціку штаны ў руках, пакуль прыйдзе мама. Трэба выручаць брата. Ды як яна прышывае іх — кволенька, цененька, — дзіва што адлятаюць, як пстрычкі. Вось ён зараз яму прышпандорыць дык прышпандорыць — толькі нітку знайсці мацнейшую, — штаны ўшчэнт падзяруцца, а гузік будзе трымацца.

Росцік стаіць за плячыма і хапае ў яго што-кольвечы з-пад рук. Яму таксама цікава. А тут — розныя прыколкі, напільнічкі, нажнічкі, абцужкі.

Яны, праўда, ні разу не бачылі, каб мама сядзела перад люстэркам і пілавала пазногці, фарбавала іх вунь тым маленькім пэндзлікам, што мокне, апушчаны ў маціцова-чырвоны лак, ведалі — яна толькі зрэдку забягала ў цырульню, калі не было там чаргі, рабіла манікюр.

Сева шукаў іголку, і ўсе гэтыя прычындалы яго не цікавілі, як і розныя паперкі — рэцэпты, квіткі, інструкцыі, пашпарты гадзіннікаў. Гэта ўсё ён перагледзеў сотню разоў. А гэты пажаўцелы, дробна спісаны паліняным чарнілам ліст паперы, нібы назнарок схаваны пад стосік чыстых насовак, проста апякае рукі. Можа, пакласці яго назад? Засунуць далей, каб ніхто і не здагадаўся, што ён трымаў яго ў руках.

«Любая мая, я так доўга, неверагодна доўга шукаў цябе...»

— Скора ты, Сеўка?

Росціку нецярпелася. Карцела хутчэй бегчы гуляць. Як кот, ён зазіраў у акно: ці чакаюць яго хлапчукі?

О, гэта неадольная звычка чытаць усё падрад! Яна асабліва абвастраецца пасля экзаменаў. Хапаеш вачыма афішы, аб'явы, лозунгі на вуліцах, а дома — усялякія сумныя і блытаныя інструкцыі да сокавыціскалкі і пральнай машыны, — усё, што трапляецца на вочы. А яны, вочы, жвавыя, шустрыя, здаецца, самі сабе падсвечваюць і бачаць нават у цемнаце.

«...І — знайшоў. Як гэта цудоўна! Не разумею, як я жыў дагэтуль? Як я жыў без цябе? Можа, адною толькі надзеяю: напаткаю, знайду цябе, сваю адзіную. Толькі сваю. Нас параскідалі па свеце, а мы знайшлі адно аднаго. Цяпер кожны з нас палова суцэльнага. Хочаш, я раскажу табе ўсё спачатку, як гэта адбылося...»

Сэрца Севы замерла, прадчуваючы нейкую таямніцу. І цяпер ужо не важна было, чыя яна. Галоўнае, яна суладна была яго думкам, пацвярджала тое, што ён пакуль выказваў толькі тэарэтычна. Але, калі стане вялікім гісторыкам, як кажа Росцік, ён зможа ім даказаць. Ён знойдзе факты. Гарачая хваля радасці захаланула яго грудзі, і вочы яшчэ шустрэй пабеглі па радках.

«...Слухай! Я пачынаю голасам казачніка, а ты —

побач, ты маленькая, як дзяўчынка, на руках у мяне, і твар твой і вусны блізка-блізка. Слухай... — Сева ўвесь наструніўся, бы пачуў сапраўды голас таго невядомага, таямнічага казачніка. — Слухай... Даўным-даўно Зеўс стварыў племя людзей і нарок іх — андрагены. Кожны андраген увасабляў у сабе рысы і мужчыны, і жанчыны. Вельмі магутнае было гэта племя, вельмі таленавітыя былі гэтыя людзі. Прагрэсіравала культура, незвычайна хутка развівалася тэхніка. Розумам людзі набліжаліся да багоў. І багі перапужаліся. Гэтак дойдзе да таго, што людзі пераўзыдуць іх і звергнуць з Алімпа. Сталі нашэптваць Зеўсу аб гэтай пагрозе. Але Зеўс вельмі любіў гэтае племя і не звяртаў увагі. А багі ўсё нашэптвалі і нашэптвалі яму: «Знішчай людзей! Знішчай людзей! Знішчай, пакуль не позна».

Аднойчы Зеўс успыхнуў злосцю, схапіў меч і пасек андрагенаў, кожнага на дзве паловы — андрос (мужчына) і генос (жанчына). Пасек, а паловы параскідаў па ўсім свеце як мага далей.

З тае пары адна палова шукае другую. Доўга шукае і ўпарта. Толькі сваю.

Цудоўная казка Элады? Ці праўда? Я вельмі шчаслівы, што знайшоў цябе. Але з намі было інакш. Нас параскідала вайна. Жорсткая, злая вайна. Але мы знайшлі адно аднаго і нам нельга разлучацца. Нельга, ты разумееш?»

Цікава — хто яго напісаў? Хто і каму? Было пачуццё, што ён зазірнуў у нешта недазволенае, падгледзеў, падслухаў чужую таямніцу. Незразумела: як быць цяпер з ёю? Забыць? Ці дазнавацца да канца? Чырвань сораму і яшчэ нейкага хвалюючага, нязнанага дасюль пачуцця, якому ён яшчэ не ведаў назвы, лінула яму ў твар. Сэрца замерла, прыціхла ў чаканні, бы ён сам напісаў тое пісьмо. Але зноў жа — каму?

Усё яшчэ трымаючы яго ў руках, ён асцярогліва азірнуўся на Росціка. Той стаяў ззаду і, канечне ж, усё бачыў.

Сева хуценька стаў хаваць лісток пад насоўкі.

— Ты нешта чытаў... І я хачу, — прыставаў Росцік.

— Табе нельга.

Росцік лез у шуфляду. Чэпкі, вёрткі і настырны, ён не хацеў уступаць. Сева павярнуўся і ўзяў яго за рукі вышэй локцяў. Росцік тузаўся, як маладзенькі канёк, што трапіў у аглоблі.

— Гэта — пісьмо! — супакойваў яго Сева, тым даючы зразумець, што чытаць яго няможна.

— Ад бабулі? — узрадаваўся Росцік.

Сева пахітаў галавой.

— Але ты чытаў? Табе заўсёды ўсё можна... Тады расказвай... Ад каго?

— Не знаю. А можа, гэта нават і не пісьмо... Там напісана, што адзін чалавек доўга-доўга шукаў другога...

— І знайшоў?

Сева кіўнуў.

— Гэта пра нашу бабулю?

— Не.

— А пра каго?

— Не знаю.

Сева прышываў гузік, а Росцік стаяў, выпнуўшы жывот, і назіраў за кожным яго рухам, моўчкі, крышку пасопваючы. Маўчаў і Сева. А той невядомы казачнік добрым, ціхім, праніклівым голасам паўтарыў: «Нам нельга разлучацца. Нельга... Я знайшоў цябе... Знайшоў...»

Алене часам здавалася, што яна не жыве ў гэтым горадзе, што яна проста кожны ранак і вечар праязджае яго з канца ў канец. Іншы раз, занятая думкамі, нават не пратрэ рукою лапінку на запацелым у дождж ці перашклёным тонкім узорыстым лядком зімою акне тралейбуса, не зірне на вуліцы і плошчы. І горад, той горад, праносіцца недзе міма з мітуснёю ля ЦУМа і ГУМа, з людскім валам каля Палаца спорту, са стракаценнем афіш на круглых тумбах. І пазірае, то з лёгкай, як цень, скрухай зазначыць, што даўно не была ў тэатры, рэдка ходзіць у кіно, і толькі ў свой мікрараённы кінатэатр. Жыццё здасца аднастайным, як кола, яно варочаецца ў нейкім аднойчы зададзеным рытме: работа — дом, работа — дом... Блага, што кола гэта круцілася хутка, мільгалі дні, як спіцы, зліваліся ў адно. Цяпер ужо цяжка было адрозніць адзін дзень ад другога.

Тое, з чым яна не магла зміryцца раней, успрымалася спакойна, нават неяк асвядомлена суцішна. Верылася, што ўсё гэта часова. Ды некалі было спыняцца, думаць, узважваць гэтае часовае жыццё. Маладая жанчына, у якой сям'я, дзеці, адказная работа, дзе трэба з ра-

ніцы адключыцца ад усяго, забыць, што існуе іншы свет, апроч праекта, апроч гэтага бюро, застаўленага кульманамі, якімі, як шчытамі, адгароджана яна ад белага свету, і толькі адзін клопат — у тэрмін зрабіць праект другога блока гідраэлектрастанцыі.

Былі нейкія здарэнні, радасці, якія запаміналіся, западалі ў душу, але яны як бы жылі самі па сабе, часам толькі можна было звязаць нешта з парою года: гэта было зімою, гэта летам...

Шчаслівая Алена ці не, яна аб тым не думала, не аналізавала, не супастаўляла. Яна была шчаслівая тады, калі не хварэў Росцік, калі Андрэй раней прыходзіў дадому ці званіў ёй, каб не спяшалася — ён забярэ Росціка з дзіцячага сада. І тады ёй не трэба, як апантанай, бегчы да аўтобуснага прыпынку, а калі які сход ці палітзаняткі, кожны раз вінавацііца перад выхавацелькай, незадаволенай, капрызлівай, якой здаецца, што толькі яна і працуе: выхоўвае, падцірае і падмывае чужых дзяцей, а яны, іх мацеркі, не іначай як бегаюць па магазінах.

У большасці жанчын бывае ў жыцці такі перыяд, калі яны, хочуць таго ці не, павінны нечым ахвяраваць: на рабоце — уступіць мужчыне пасаду, хоць ён, можа, не мае і долі яе розуму і кемлівасці, бо ў яе ж — дзеці (як быццам іх у яго няма!), наогул, тут яе лічаць ненадзейнай, бо дзеці маюць звычку хварэць. Алена ведала — не адна яна такая. Яна назірала за маладымі жанчынамі ў тралейбусе, раніцой: так-сяк прычэсаныя, яны драмалі седзячы, а некаторыя ўхітраліся нават стоячы — у такой, так і ведай, дзеці малыя, можа, не спалі ноччу. Але гэта часова. Дзеці маюць асаблівасць расці. Праўда, чужыя дзеці растуць хутчэй, чым свае, але тым не менш — і свае паціху растуць. Вунь якія спакойныя раніцой жанчыны за сорак, поўныя годнасці, прычэсаныя, адзетыя строга і святочна. Алена ведала, што і яе цяжкасці часовыя. Вось і Росціку ўжо восем... Але нешта сумнае было ў іх тварах гэтых поўных годнасці жанчын. Як быццам нешта прайшло незваротна, што яны не паспелі зрабіць, спасцігнуць, зразумець, нечаму нарадавацца — а яно прайшло. Усё, на жаль, мінае, і мы застанёмся на беразе, а рака, рака жыцця, плыве, нясе нашы мары, надзеі, нашу любоў і нянавісць.

Алена пакуль што не думала пра тое — жыла сённяшнім. У канцы рабочага дня перакідвала лісток кален-

дара, нешта занатоўвала, значыла сабе на заўтра тэрміновае.

Сёння ж і гэтага не зрабіла, нібы ніякіх планаў, якія магла забыць, не было.

Пачакала, пакуль «раскланяўся» Вішнякоў. Выйшла на высокі ганак, заліты яркім веснавым сонцам — ажно захаланула ў грудзях ад гэтай прыгажосці, яснасці. Падумала: добра, што не пайшла да прыпынку з Ліяй Аркадзеўнай — нізашто б гэтага не ўбачыла, і добра, што ніхто не чакае яе, не сустракае. Але з'явілася і нейкае шкадаванне. Яна чамусьці падумала, што гэта і ёсць тое, што незаўважна кладзецца адметнай рысай на твары жанчын за сорак. Не, ёй не хацеласяя думаць пра гэта. Ніякіх успамінаў... Яна будзе жыць толькі гэтым днём. Толькі гэтым... Але ж *ён* стаяў з букецікам кветак, і гэта таксама было ў гэты дзень.

І Вішнякоў... Не, яна ніколі пра яго не думала. Упэўнена, што і ў яго нічога такога не было, проста вучыліся разам, разам дрыжалі перад экзаменамі. Так, так, неяк яна яму рабіла чарцяжы, і не толькі яму. Гэта для яе было проста. І што прыдумаў...

Сцішана пашумоўвалі дрэвы — гул машын не даходзіў сюды, — стромка пнуліся ў неба таполі, песціліся кучаравыя клёны. Ужо выкінулі трапяткія метлюжкі травы, хораша пераліваліся, гулялі на асфальтавай дарожцы цені. Алена ажно заплюшчыла вочы, каб адагнаць думкі, адкрыць павекі і як бы нанава ўбачыць увесь гэты трапяткі і прамяністы свет, любавацца, убіраць у сябе яго гукі, пахі, хараство і любасць. Думаць пра дрэвы, кветкі і траву ды сонца, што так высвеціла надвячорак. Але атрымалася гэта толькі на якія трыпяць хвілін. І зноў адступіліся дрэвы і кветкі. Не атрымліваецца так... Не атрымліваецца. Ёю авалодалі, акружылі тыя ж думкі, галасы і гукі. І няхай яна дзівачка, але ж і яны... «А хто табе сказаў, што ты маеш рацыю? Таксама знайшлася — барацьбіт за высокія ідэалы. Дапусцім, яны змоўчаць... Ты — пераможаш. Гэта маленькая твая перамога. Але ж ты на гэтым не спынішся. Ты зноў будзеш думаць не аб іх, а вышэй іх галоў. І яны табе гэта прыпомняць. Гэта пачатак! Запомні — гэта пачатак. Увесь час нельга ісці па прамой. Не атрымаецца». Вішнякоў нібы стаяў, як за кульманам, за тымі дрэвамі.

«Ты перамагала часта ў нашых юнацкіх спрэчках.

І адкрыю табе сакрэт, мы рабілі табе скідку. Таму што... таму што ў тваім стане нельга быць іншаї. Ты, як табе сказаць... ты «мечаная». О, як ён доўга гэта вымаўляў.

Не, яна не крыўдзілася на яго: кожны, як умее, дасягае мэты. Гэта — яго стыль. Не адорваць жа яе за тое, што яна ўсчала ў аддзеле, кветкамі.

«Кветкі?» Магчыма, нехта іншы паклапаціўся пра кветкі. Алена ўбачыла *яго* з шырокага, вымытага да бляску акна аддзела яшчэ задоўга да канца рабочага дня. Дарэчы — не толькі яна адна. Гэта на нейкі момант спыніла іх спрэчку. *Ён* стаяў у цені ліпы, ладны, у светла-шэрым касцюме, у руцэ трымаў некалькі нарцызаў, трымаў іх урачыста, а сам разглядваў прахожых, нібы вышукваў у гэтым натоўпе людзей, каму іх падарыць. Алена была ўсхвалявана размоваю, у яе ажно зардзелі шчокі, і ўся яна была як напятая струна, таму нават не звярнула на яго ўвагі: ну, стаіць чалавек, некага чакае. Кветкі. Звычайная гісторыя з кветкамі.

— Мусіць, нейкі паэт, — сказала, падыходзячы да акна, Лія Аркадзеўна.— Глянь, Аксана, можа, гэта твой?

Аксана падышла да акна.

— Для мяне ён замалы ростам і лысаваты, — сказала з лёгкай іроніяй.

На самой справе *ён* змяніўся. З'явіліся залысіны, раздаўся ў плячах. Час ідзе... Яна сядзела і маўчала, глядзела на яго ў акно. І не разумела, што ж адбываецца з ёю, нібы паспакайнела душой — ці ад таго, што ўбачыла яго, ці ад таго, што крыху адкаснуўся ад яе Вішнякоў. Але не, ён вярнуўся да той размовы. Ён проста, мусіць, шукаў нейкія аргументы, каб яшчэ раз паспрабаваць пераканаць яе.

— Я не разумею, чаго ты дабіваешся. Ты ж сама энную суму губляеш. Няўжо не разумееш? Я ведаю — табе яна не лішняя. І муж твой — ну што ён там, на «хуткай», зарабляе? Капейкі. Не дуры, Алена, — прымірэнча сказаў ён.

Зноў да грудзей падкацілася тая гарачая хваля — невядома чаго: абразы, крыўды, злосці, хвалявання.

— Урэшце, ты не думаеш пра людзей... Ты — кіраўнік, іх непасрэдны кіраўнік, начальнік групы, ты ў першую чаргу павінна думаць пра падначаленых.

— Вось так толькі пазіраць на іх, а вышэй галавы — ні-ні.

— Не, ты можаш глядзець на ўсе бакі, але думаць пра іх! Глядзі, Ліі Аркадзеўне — скора на пенсію. Ты ведаеш, як у іншых калектывах? Стараюцца, каб перад пенсіяй чалавек атрымліваў болей, тады і пенсія суадносна... Аксане — таксама не лішняя капейка. Яна толькі капіроўшчыца. Зарабляе — сама ведаеш.

Алена зірнула на адну, на другую. Вочы іх былі халодныя. Яна разумела, яны таксама супраць, толькі маўчаць. А Вішнякоў выступаў у якасці парламенцёра. Нажываў сабе капітал, хацеў быць добранькім. Але яна ведала: у першую чаргу ён думае пра сябе, а можа, толькі пра сябе.

Вішнякоў сеў насупраць. Усё-такі хацеў яе пераканаць. Яна падумала, што ён, урэшце, можа адхіліць яе прапанову як начальнік аддзела. Але яму чамусьці ўздумалася пераконваць, выхоўваць. У кожнага — свой стыль. Значыць, хоча, каб сама адмовілася ад сваёй жа прапановы.

Закончыўся рабочы дзень. З дзвярэй інстытута навалілі супрацоўнікі, і Алена бачыла, як наструніўся *ён*, замітусіўся. Вось-вось памкнецца да некага з кветкамі. Ёй нават цікава стала: звычайная жаночая цікавасць, ні больш ні менш.

— Алена Мікалаеўна, чакаць вас? — азвалася Лія Аркадзеўна. — Нам па дарозе.

— Не, не чакайце, — адказала яна.

Лія Аркадзеўна не збіралася доўга чакаць, у яе наогул не было звычкі затрымлівацца на рабоце. Калі гэтага патрабавалі абставіны, была цэлая трагедыя, быццам у яе дома плакалі дзеці, а пасля гэта прыпаміналася чорт ведае колькі разоў да месца і не — быццам праявіла працоўны гераізм. Лічыла, што, па меншай меры, ёй патрэбна было даць медаль, ну, у крайнім выпадку, — прэмію.

— Да заўтра, — сказала Лія Аркадзеўна пакрыўджана, нібы давала зразумець, што магла быць на яе баку, але тая сама грэбуе яе падтрымкай. Лія Аркадзеўна выразна зірнула на Вішнякова, маўляў, цяпер на яго ўсё спадзяванне, кіўнула яму, плюснула вачыма, як толькі адна яна так умела: гэта павінна было азначаць, што яна спакойная, калі за справу ўзяўся ён.

Вішнякову стала вальней. Ён адчуў сябе тым студэнтам-аднакурснікам, якія не раз сядзеў за адным сталом з ёю на лекцыях. Нечым падабалася тады Алена. Чым?

Цяпер цяжка нават успомніць. Яна была нейкая асаблівая, непадобная на іншых. Кволая, тоненькая, яна была падобна на чараўніцу са светлымі, рассыпанымі па плячах валасамі — такой яе сустракаў, бывала, знянацку ў інтэрнаце.

Тая, непрычэсаная, яму болей падабалася. І яшчэ — як яна рашала задачы! Радасна. Ён ніколі не бачыў, каб так радасна паглыбляліся ў сумоту сухіх бязлікіх лічбаў. А яна, здавалася, бачыла іх аблічча, характары. Не, яму гэта не зразумець... На яе было прыемна пазіраць. А як загараліся яе вочы, калі знаходзіла правільнае рашэнне, нават хацелася радавацца разам з ёю. Вішнякоў тады падазраваў, што яна не раўнадушная да яго. Яму гэта імпанавала. А каму не прыемна, калі...

І цяпер ён сядзеў насупраць.

Разгледзеўшы яго ўважліва, яна холадна адзначыла, што ён такі ж прыгожы, але быццам чужы, незнаёмы. Яму ўжо за сорак, а валасы — чорныя, не крапутыя сівізной, твар смуглаваты, нібы толькі што з поўдня.

Алена не адводзіла вачэй. Калі прыгледзецца, то і ён ужо мае прыкметы часу: прайшло ж гадоў пятнаццаць. «Што значыць бесклапотнае жыццё «за татам, за мамай». Як ні кажы, а чалавек старэе ад клопату. Не, і ў яго, відаць, хапае клопатаў. Ён проста харахорыцца. Яму таксама не шкодзіць лішняя капейка: вунь як хапаецца за яе ўсімі праўдамі і няпраўдамі», — думала Алена. Гэта неяк адхінула яе ад Вішнякова, і яна зірнула ў акно.

*Ён* яшчэ чакаў, але, мусіць, адчуваў, што безнадзейна, кветкі, што нядаўна так урачыста трымаў у руцэ, апусціў галоўкамі ўніз. Яна разглядвала і *яго*, на колькі дазваляла адлегласць. «Пастарэў, палысеў, але, відаць, не здаецца. Проста не прыкмячае яшчэ за сабою. Ну, мужыкі!»

— Знаеш, а ты мне нечым падабалася, — Вішнякоў гаварыў ёй «ты», карыстаючыся тым, што яны засталіся ўдваіх. — Цяпер і забі мяне, не сказаў бы чым.

— Я не змянілася. Ты проста перастаў заўважаць і цаніць у людзях іх якасці.

— Хм, ты была сама прырода. Дзіця прыроды. Памятаеш, якія ў нас узнікалі спрэчкі?

— У асноўным, каму лепш жывецца: вясковым ці гарадскім. Вам здавалася, што вясковыя ўсё цягнуць торбамі і мяхамі, а вы, няшчасныя, як жабракі.

— Памятаеш, як ты са слязьмі ў голасе даказвала, што карова толькі раз у год целіцца. Ды калгас забіраў цялё па кантрактацыі.

— Няўжо ты думаеш, што цяпер карова паскорыла тэмпы?

— Але ж твая мама жыла ў вёсцы і ты мела сякія-такія прадукты да ўсяго, што зарабляла. Гэта не так мала, — Вішнякоў хадзіў па пакоі. Схаваўся за кульман, нібы адтуль сачыў за яе настроем.

«Вось ты адкуль пачаў — гэта нітка са старога клубка».

— Да твайго ведама, яна не жыве болей у вёсцы. Мне вельмі сумна, што ты так нічога і не разумееш. Ці прыкідваешся?

Ён злёгку пачырванеў.

«Нейкія пачуцці ёсць і ў яго, — зазначыла сабе яна. — Хутчэй за ўсё прыкрасць і злосць».

— Я зразумеў, што... Ты мне прабач, вы, жанчыны, бываеце з прыветам.

«Ага, гэта — злосць. Няшчасны эгаіст...»

Яна зноў зірнула ў акно. Жоўтыя, белыя вяночкі нарцызаў усё пазіралі на асфальт, нешта там выглядвалі. «Яны завялі», — зазначыла сабе яна. Яна ўявіла іх пацёртыя, мятыя пялёсткі.

— Ты зразумей адно... — Вішнякоў перахапіў яе позірк. — Ён што, сапраўды чакае цябе? — здзіўлена папытаў, паказваючы на акно.

— Уяві сабе, што — мяне. — Ёй раптам захацелася ўстаць і пайсці насустрач — няхай бачыць. Але нешта стрымлівала: можа, гэтыя нарцызы. Так — яны. «Смешныя гэтыя мужыкі, смешныя, як дзеці».

— Што ж ты? І прабач, што я цябе затрымліваю...

Цяпер яны ўдваіх пазіралі ў акно, як *ён* соваў гэтыя завялыя кветкі сустрэчным дзяўчатам, жанчынам, а тыя шарахаліся ад яго, як ад ненармальнага.

— Бачыш, яму надакучыла чакаць. Нецярплівы... — Вішнякоў пасміхаўся, кпіў. Гэта атрымлівалася ў яго таксама злосна, нявесела.

Раптам *ён* збыў кветкі нейкаму хлапчуку, угаварыў, відаць, яго. Той, ашаломлены і здзіўлены, неахвотна ўзяў і пайшоў, азіраючыся. «Гэтак лепш, а то, як кавалер, з кветкамі, — і пра хлопчыка: — Адыдзецца ды кіне дзе-небудзь пад плот».

*Ён* яшчэ крыху пастаяў. Цяпер рукі яго былі свабод-

ныя, і ён сашчапіў іх за спіной, набыўшы выгляд бесклапотнага чалавека. А яна не ішла.

Вішнякову, відаць, было гэта цікава, хацелася даznацца, што за тып. (Мужчыны таксама цікаўныя.) І ў ім абудзілася сваё, пра што ён так доўга маўчаў. Трымаў у сакрэце.

— Ведаеш, я, калі ехаў у Сібір, думаў: вярнуся і жанюся з табою. Трымаў цябе на прыкмеце. Я чамусьці не думаў, што ты выйдзеш замуж...

Алена ўсміхнулася: ён, канечне, «заліваў», як гаворыць Сеўка, гэта ўжо новы падыход.

— Ён, — яна кіўнула на акно, — таксама так думаў.

*Ён* ужо, відаць, не меў ніякай надзеі, яшчэ раз зірнуў на дзверы, агледзеў вокны, увесь фасад, нібы збіраўся купіць і ацэньваў позіркам гэты гмах. Потым падаўся праз вуліцу, але прымарудзіў крокі, азірнуўся.

— Ну што, і нам пара, — сказала Алена. — Цяпер бягом на аўтобус.

Вішнякоў зірнуў няўцямна. І яна ўспомніла — і трэба ж! — яго даўнія словы. Яны нават уразілі яе сваёй няхітрай адкрытасцю. Тады яны гэтак не ўразілі яе, як цяпер. У іх ён быў увесь — увесь з яго нутром, нібы пераніцаваным. «Усім ты для мяне падыходзіш, але каб яшчэ магла бегаць».

Яна зірнула на яго, такога вымытага, напрасаванага, надушанага. Студэнтам быў не сказаць каб неахайны, але не такі дагледжаны. «Гэта ўсё яна», — падумала пра яго жонку.

Зняла тэлефонную трубку: што там дома?

— Сеўка, ты дома? А Росцік? Гуляе на вуліцы. Пытаеш? Глядзі яго, сынок. Я скора...

Вішнякоў не ішоў, здавалася, ён яшчэ нешта хацеў сказаць, у нечым яе пераканаць. Яна ж стамілася, стамілася даводзіць і тлумачыць, здавалася, такія простыя рэчы.

— Па-мойму, — сказала яна, — мы вырашаем, як будаваць мост — удоўж ці ўпоперак... Хоць кожны з нас ведае, як кладуцца масты і што яны злучаюць...

На вуліцы трапятала маладою лістотаю лета. Такое доўгачаканае і кароткае. І кожны год не паспееш апомніцца, як яно імгненна згарае, тухне. І ўспыхне коратка, восенню, ненадоўга, ясным і шчодрым цяплом, з ядранай

халадзінкай, якая, хочаш не хочаш, а напомніць — ужо не летняе цяпло. Але што цяпер думаць пра гэта. На вуліцы — лета. І трэба забыцца на ўсё, усё пакінуць за тымі тоўстымі мурамі пасляваеннага фундаментальнага будынка з ляпнымі фігуркамі пад паддашкам. Трэба дыхаць, жыць, лавіць усім целам лета, назапасіць яго на ўсю доўгую зіму, балазе ў апошнія гады, калі падраслі дзеці, яна можа дазволіць сабе, хоць трохі, самы зялёны кавалачак дарогі, прайсці пешшу. Праз пукатую, памятае, яшчэ нядаўна брукаваную і нейкую рамантычную сваёю даўнінай плошчу з маўкліва ўзнёслай царквой над нізкімі, бы гандлёвыя рады, дамінамі, старым, хітрай збудовы фантанам, які то струменіць халоднай восенню, увесь скразны і празрысты, нібы крыштальны, заварочвае, гайдае яго вецер, як вершаліну бярозы, то маўчыць у спякоту. І тоўстыя зялёныя каменныя жабы з адкрытымі ратамі, што абселі яго ўкруга, здаюцца асалавелымі ад духаты і смагі.

Ціхая набярэжная, абсаджаная ніцымі вербамі, вывела яе ў сквер, дзе скрозь ажурныя кроны дрэў, як жоўтае лісце, рассыпаліся па сцежцы варухлівыя сонечныя блікі. Яна нібы на імгненне апынулася ў казцы. Дрэвы ахінулі мудрай цішынёю, засланілі ад вулічнага шуму, ад таго мітуслівага жыцця, якое ішло, гналася следам. І толькі на імгненне, можа, прыпынілася, таксама залюбавалася веліччу і ціхай мудрасцю маўчання гэтых векавых дрэў, якое сведчыла, што ўсё — мітусня, ёсць нешта больш важнае і надзейнае. А тое адгарнулі, адпіхнулі, нібы далонькамі, лісцем дрэвы. Заціхлі далёкія гукі, растварыліся ў цішыні. І душа яе супакоілася. Найшоў одум. І яна падумала, што ўсё гэта нейкае непаразуменне, такога не магло быць. Яна адна — адна супраць іх. Як ні кажы, а гэта ўжо калектыў. Заўсёды цанілі, заўсёды прыслухоўваліся да калектыўнай думкі. А калі пагадзіцца? Калі пагадзіцца — атрымаецца ўсё проста. Праект група здасць датэрмінова. Пабудуюць аб'ект. А потым праекціроўшчыкі разам з выканаўцамі пададуць прапанову аб удасканаленні працэсу рэгулявання блока. Пойдуць рацпрапановы, прэміі... А так трэба добра выкладвацца яшчэ колькі часу. Ды ёсць пагроза, што тых дзён, якія засталіся да здачы праекта, не хопіць... Не хопіць. Іх, канечне, хопіць, у бога дзён многа, але мы самі сабе вызначаем тэрмін, самі сабе кідаем наперад метку, каб дабегчы да яе ў гэты тэрмін. А можа,

іначай і нельга. А то атрымаецца, як у таго сяржанта, які арыгінальна, без дапамогі Эйнштэйна, вырашыў праблему суадносін прасторы і часу, сказаўшы салдату: «Будзеш капаць канаву ад плота і да абеду. Зразумеў? Не зразумеў? Выконвай!» Канечне, прайшлі тыя часы, калі мы капалі ад плота і да абеду, але...

«Госпадзі, такая прыгажосць! І пра што я?! Пра што... Я ж жанчына... Жанчына! Патэнцыяльны палюбоўнік стаяў з кветкамі ў руках... Усё гэта дурасць... Не хапала толькі кветак. Смешныя гэтыя мужыкі, як дзеці. Патрыманы кавалер з кветкамі... Дзея з забытага старога рамана...» — пасмяялася ў душы. І зноў, як наяве, убачыла, як ён совае тыя кветкі разгубленаму хлапчуку... А сама падумала, што ён, мусіць, усё такі ж. Вось гэта лесвіца, высокая, крутая. Яна спускалася заўсёды па гэтай лесвіцы. Часам ён стаяў ужо ўнізе — чакаў. Якая пакута: колькі хітрасці і жаночага какецтва трэба было мець, якую муку зведаць, каб, спускаючыся па гэтай лесвіцы, не выдаць, як ёй цяжка. І самае жахлівае — ён бачыць гэта, бачыць, што яна накульгвае. Але, здаецца, ён не заўважае, яго не бянтэжыць гэта. О, як яна ўдзячна яму. Але лепш, каб ён не бачыў. Таму яна заўсёды старалася прыйсці раней.

Яны сустракаліся, калі ён прыязджаў на сесію, «спіхаў», як гаварыў сам, экзамены. «Спіхаў» лёгка. І быў заўсёды ўзбуджаны, вясёлы, гаваркі, летуценны. Яна нават гублялася перад ім, бо не ўмела быць такою. Нешта ў ёй было ці ад прыроды, ці з таго галоднага і халоднага дзяцінства, што не давала завельмі радавацца і весяліцца душы. Нібы дзесьці блізка, побач, была бяда, свая ці чужая — хто ведае? Яна здзіўлялася і зайздросціла, як смела, лёгка радаваўся ён.

Неяк, праходзячы міма помніка, ён мройліва сказаў: «У нас яшчэ ўсё наперадзе. Хто ведае, можа, не тут, а дзе-небудзь на другім відным месцы будзем стаяць і мы. І людзі будуць праходзіць...»

Гаварыў ён узнёсла і ўпэўнена. Здавалася, што ўсё, што патрэбна для гэтага, ён ужо зрабіў, але пакуль што трымае ў сакрэце, каб аднойчы, як громам, здзівіць свет.

І, зазірнуўшы ў яе вочы, спытаў: «Не верыш?»

«Са мною гэтага не адбудзецца, — проста і будзённа сказала яна. — Наша група праектуе блок электрастанцыі. А я малюю маленькі вузельчык у ім. Станцыя

будзе пабудавана, дасць святло, але нікому ў галаву не прыйдзе даследаваць, хто праектаваў той вузлік. Хіба калі нешта будзе не так, але гэта вядзе ў другі бок ад славы».

«А я вось скончу вучобу і напішу кнігу».

«Як яна будзе называцца?»

Чамусьці ёй здавалася, што вельмі важна назва кнігі, бы яна нясе нешта галоўнае ў ёй.

«Накіп», — не задумваючыся сказаў ён. — Яна будзе пра тыя адмоўныя з'явы, якія існуюць у нашай рэчаіснасці. Пра тое, што замінае людзям жыць нармальна».

«А мне здаецца, што жыць добра. Нават цудоўна! Мне, ведаеш, часам бывае шкада, што гэта не бачаць тыя, хто не вярнуўся з вайны. Мой бацька... Ён бы парадаваўся». Чамусьці яна лічыла сябе шчаслівай не тады, калі шчасціла ёй, а калі радаваліся гэтаму другія: мама, Марыя... А так наошта ўсё? Яна ведала сваё месца ў жыцці, яно ёй здавалася надзейным, таму і не марыла пра большае. Алена жыла тады ў Марыі, у яе маленькім інтэрнацкім пакойчыку. І ціха радавалася, што ёсць дах над галавою, прыпіска, работа. Марыя была незамужняя. І маці не на жарты непакоілася. Бывала, Алена прыедзе дадому, маці выпытвае ў яе пра Марыю, уздыхае. «Мамачка, — гаварыла Алена, каб супакоіць яе, — я выйду за першага, хто прапануе мне сваю руку».

Яны гулялі па горадзе. А потым ён праводзіў яе дадому. Ішлі пешшу. Яна стамлялася, ныла хворая нага. Ён усё гаварыў і гаварыў. Алена слухала. Ля пад'езда, потым на лесвіцы ля акна прагна і горача, апякаючы ёй вусны, цалаваўся. І ўсё парываўся зайсці ў пакой, асабліва калі не было Марыі. Ён проста вар'яцеў, настойваў, нават пагражаў расстаннем. Яна ж помніла дакорлівы позірк маці, калі сказала: «Я выйду за першага, хто мне прапануе». І дадала: «Ты за мяне не хвалюйся, я наперад нікому не паддамся».

Пасля гэтых сустрэч з ім яна доўга не магла заснуць. Усё думала, перадумвала. Апошнім часам яна баялася даць волю сэрцу. Нешта нетрывалае было ў іх адносінах, а можа, гэта яе няўпэўненасць, яе прымхлівая боязь радавацца таму, што яшчэ не збылося, а толькі мроіцца. Яна чакала яго пісем. І пісаў ён часта. Яна чытала і перачытвала.

Чакала адпачынку. Паедзе да мамы. А там іх будзе раздзяляць толькі дванаццаць вёрст... Што тыя дванаццаць вёрст?! Яна ў школу некалі хадзіла, праўда, ад нядзелі да нядзелі: жыла ў райцэнтры ў інтэрнаце. Ды і тэлефон... Пойдзеш на пошту, набярэш нумар — і пачуеш яго голас. Ён працаваў памочнікам пракурора. І яна званіла яму, чакала і чытала яго пісьмы.

...Алена выйшла на цэнтральную алею. Сталі сустракацца людзі, маладыя маці гулялі, коцячы перад сабою каляскі з дзецьмі. І яна стала думаць пра сваіх: Росціку трэба абавязкова купіць футболачак. Добра б, бавоўняных. Стала прыпамінаць, што ёсць у халадзільніку дома і што яшчэ трэба купіць. Ці ўсё добра ў Севы. Неарганізаваны нейкі. Спазняецца на работу. Трэба раней будзіць. Толькі дзе яго дабудзішся, калі ноч — чытае. І Андрэй многа працуе — можна было б пераїсці на стаўку. А так дома ніколі не бывае. А лепш бы, каб давёў дысертацыю. Але пра гэта яны даўно ўжо не гаварылі.

У гэтыя будзённыя клопаты зноў уварваўся *ён*. Здалося — ідзе насустрач. Яна нават прыпынілася, затрапятала сэрца. Але, на шчасце, памылілася. Ясна бачыла, што іншы чалавек, толькі вельмі падобны на яго. І — што ж гэта? — зніякавелая, з трапяткім, бы аголеным сэрцам, разміналася з незнаёмым.

«Госпадзі, — падумала яна. — Я з глузду з'ехала. Нашто мне гэта?» І сум, несусветны сум агарнуў яе, нібы нешта згубіла незваротнае.

## 2

Росцік то паціху плыў некуды, пагойдваючыся, як на хвалях — гарачая, гумавая надутая жабка спрабавала выслізнуць з-пад галавы, паплысці сама па сабе, але Росцік утрымаў яе за лапку, мякка прыгарнуў да шчакі, жмурыў вочы на зыркае сонца, то зыбаўся на верхняй паліцы ў цягніку, мякка пагойдваючыся, закалыханы, адураны сном. А цягнік нёсся, грукаючы на стыках, жалезныя яго колы грымелі накатнай хваляй — то заціхалі, то зноў абрываліся грукатам. Ён тады ўціскаўся ў матрац, прыліпаў да яго, як да дна лодкі, каб не вываліцца, сціскаў у руцэ мяккі ражок падушкі, як лапку гумавай надутай жабкі, і зноў жмурыўся на сонца... З

болем рассунуў шчылінкі вачэй. Не. Гэта — не сонца... Гэта лямпа... Сева яшчэ чытае.

— Росцік, чуеш, мы будзем жыць у космасе.

— На другой планеце? — перамагаючы сон, пытае ён.

— У касмічным горадзе, чудзік.

— У самым, самым космасе? Там жа цёмна і... А гэта скора?

— У-гу, — толькі мармытнуў у адказ Сева, ён, відаць, быў захоплены тым, пра што чытаў у кніжцы. І больш не звяртаў увагі на роспыты Росціка. Ён жа яшчэ зусім дурны. Мама часта гаворыць: «Божа мой, і калі ты паразумнееш?» Дарэчы, гэта яна гаворыць і пра яго, Севу.

Росцік няўцямна адкрывае вочы. З кім ён гаварыў? З Севам. Сева сапраўды чытае і калі адкажа зараз, значыць — з ім.

— А што будзе з нашаю Зямлёю? Яе ўзарвуць?

Росцік сядзіць на ложку сярод хваль згамтанай прасціны, перамагаючы сон, які так і хоча паваліць яго на падушку, як валіў на траву, дурэючы, шыракалапы Венькаў псіна, а потым падскокваў і кідаўся лізаць яму твар сваёю страшэннаю, з адвіслымі надыклямі, пашчай. Але ён чакае, што скажа Сева. «Сеўка-плеўка... Не ведае ён, што станецца з Зямлёю, а сам яшчэ хоча быць вялікім гісторыкам». Тое, што Сева будзе вялікім гісторыкам, ён не сумняваецца. «Гэта толькі трэба захацець», — гаворыць мама. Але, чамусьці, калі яна гэта гаворыць, сама нервуецца, быццам Сева не хоча. Ён хоча! Росцік ведае. Венік хоча ў армію, таму што ў яго ўсе былі ваенныя: і бацька, і дзед, і прадзед, які пахаваны ў кургане. Толькі Сеўка гаворыць, што Венік «залівае».

Вось Сева стане вялікім гісторыкам і раскапае той курган. Але як жа, калі мы будзем жыць у космасе?

— Сеўка, што будзе з Зямлёю?

Але Сева не адказвае. Ён зусім аглух. Толькі ўсё чытае і чытае.

— Там нічога не напісана?

Маўчанне Севы здаецца яму падазроным і жудасным. «Ведае ён, ведае. Толькі не хоча гаварыць. Сеўка-плеўка».

Росцік кладзецца на падушку, так-сяк нацягвае на сябе коўдру. Неўзабаве чуюцца яго кароткія ўсхліпы,

і ён ціхенька пачынае скуголіць, як шчанючок, якога пакінулі на вуліцы.

— Ты чаго, Росцік-хвосцік? — лагодна пытае Сева.

— Я не хачу жыць у космасе, я хачу да ба-бу-у-лі... — канючыць ён.

— Ты проста не хочаш ісці заўтра ў школу, так і скажы...

— Не хачу, не хачу...

Што было б, каб не маці. Яна адчыніла пакой:

— Сева, ты зноў не даеш яму спаць! — строга сказала яна. — Выключай зараз жа святло! Мне абрыдла вас штурхаць раніцой. І ты спазняешся заўсёды. Майстар Мікіціч скардзіцца. Усё — я тушу святло! Спаць!

Можна падумаць, што ў маміным родзе ўсе былі камандзірамі, няхай не генераламі, дык прапарамі. І, бывае, усе яны — з лампасамі, з кукардамі і без — стаяць у яе за плячыма. А Росціку так хочацца, каб яна падышла зараз у бухматым, мяккім, як ручнік, халаце, цёплая і добрая, пагладзіла яго па ўзмакрэлай дрыготкай спінцы, сказала: «Спі, дзіцятка, спі, заўтра дзень будзе, нас сонейка пабудзіць...» Як бабуля шаптала...

Бабуля так заўсёды гаварыла ды яшчэ дабаўляла: пеўнік запяе, курка яечка знясе. А мама проста шчоўкнула выключальнікам, быццам нейкі звер клацнуў зубамі, — стала цёмна. І горка, горка Росціку. Ён, схаваны цемраю ночы, вольна ўсхліпваў, грудзі яго аслабаняліся, нібы гэта там сядзелі слёзы, душылі яго, і цяпер яму рабілася лёгка, нават соладка ад гэтых пякучых слёз.

— Ну, чаго разнюніўся? Ты ж сам гаварыў, што паляціш у космас.

— Але я не хачу назаўсёды! Я хачу вярнуцца на Зямлю! А калі Зямлі не будзе... Куды я вярнуся? Куды?!

— Ты толькі носам не хліпай. У цябе там што? Лядзяш растаў? Яшчэ з зімы, мусіць, быў.

Сева ўсміхаўся, Росцік адчуваў гэта па яго голасе. Але правіў сваё.

— Я хачу заўтра да бабулі. Мне надакучыла хадзіць у школу.

— Цяпер жа ў школе — лагер. Урокі не задаюць...

— Усё роўна хачу да бабулі. Як усе леты...

— Усе леты, усе леты... Прайшлі, Росцік, тыя леты.

Сева сказаў гэта самотна. Ці толькі здалося Росціку.

— Чаму прайшлі? Вось жа цёпла як. Удзень сонца напячэ, аж цяпер акно адчынена. Цёпла. І заняткі скончыліся. Лета...

— Ты ж не заўсёды будзеш хадзіць у школьны лагер. Мама возьме пуцёўку на другую змену ў «Зубраня». Ведаеш, як там добра. І лес такі, як у бабулі, і поле, і...

Росціку здалося, што Сева яго ўгаворвае. Ад падазрэння і роздуму: чаго ён угаворвае — Росцік нават прыслухаўся. І змоўк. У гэтым Росцік адчуў нейкі падман. Але які? Чаму Сеўка ўгаворвае? Хіба бабулю не знайшлі?

Сева маўчаў. За акном, накочваючыся хваляю гукаў, праносіўся, патупваючы па рэйках: туп-туп-туп-туп, як вожык па хаце, трамвай. І гукі гэтыя то запаўнялі пакой, то вылятаді грымучым птахам на вуліцу, ляцелі на лес, падалі пад кроны дрэў і заціхалі, складвалі свае грымучыя крылы, слухаючы, мусіць, супакойлівы шолах лістоты. Калі заціхае трамвай, чуваць гэты шолах. Гэта шапоча лістотай бяроза пад акном.

Росцік плакаў і плакаў, мусіць, упершыню так соладка, неяк нават радуючыся, што плачацца. Ён ужо не хліпаў, слёзы ручаямі ліліся з вачэй, залівалі шчокі, падушку. І ад таго, што выліваліся яны, цела яго станавілася нібы бязважкім, лёгкім. І ўсё наўкруг губляла апору, рассыпалася, раз'ядноўвалася і плавала ў цёмнай гушчэчы ночы. Гучней бегаў трамвай, а можа, дом, памкнёны яго рухам, пускаўся за ім, як ляціць падагнаны парывам ветру сарваны ліст, але ляціць уніз да зямлі. А гэта — пёрка, якое падхапіў струмень паветра. І невялікі пакой на дзевятым паверсе пакалыхваўся, пагойдваўся, як шпакоўня на бярозе, потым паплыў, паімчаў усё вышэй і вышэй, у Росціка нават дух захапіла. І ён глыбока ўздыхнуў, набраў у грудзі паветра. Зусім блізка ўжо зоры, вунь яны вісяць, як жоўтыя ігрушы, як яблыкі ў цёмна-сіняй асенняй лістоце ў бабуліным садзе. І зялёныя, зусім зялёныя, яны мігцяць, зрываюцца і падаюць, нібы начны вецер трасе сад.

«Бабуля...» Росцік зноў успомніў пра яе. Зноў яму цяжка стала дыхаць, нібы таўсталапы Венькаў бульдог пакаціў яго на траву і наваліўся на грудзі. А вунь і Мішка! «Мішка... Мішка-а-а... а-а-а». Не, гэта не Мішка. Проста дрэва. Дзіўна — чалавек і дрэва, Мішка махае

яму рукамі, а нагамі ўрос у зямлю, як дрэва. «Я — Мі-ш-ш-ка, ш-ш-ка», — шуміць услед тое дрэва. Ага, Мішка — цяпер дрэва. Бацька разбурыў лятак. Цяпер Мішка — дрэва. Усе ў іх родзе былі дрэвы. Іх і завуць Дубовікі. Толькі Мішку дражняць Дубчык. Мішка Дубчык.

«Сеўка, Сеўка, рулюй назад. Я не хачу ў космас. Хачу да Мішкі! Хачу да бабулі. Булі... булі... булі...»

...Севу здалося, што нехта яго паклікаў у цемнаце. І ён прахапіўся.

«Гэта Росцік нешта балбоча ў сне. Во: булі... булі... булі... Пускае бурбалкі. А можа, зноў канючыць, просіцца да бабулі. Дурны ён, Росцік, зусім дурны яшчэ. Гэта кату ясна, што бабуля даўно памерла. Не разумею, навошта ад яго ўтойваць. Але скажы яму толькі, разрумзаецца, пабяжыць да мамы: «Няпраўда! Няпраўда, што бабуля памерла. Яна паехала ў вёску. Сеўка-плеўка, няпраўда». А мама: «Сева, ты перастанеш нерваваць дзіця? Няпраўда, няпраўда, сынок, супакойся». І будзе гладзіць малога па галоўцы.

Росцік — нервовы. Таму мама за яго і баіцца. Таму ад яго і тоіць усё. Росціка нельга хваляваць, нават смяшыць яго моцна нельга. Гэта ўсё таму, што ён тручаны. Але пра гэта ніхто не гаворыць, ніхто нават не ведае, апроч маці і цётачкі Марыі, ды яго, Севы. Ён усё падслухаў... Не, ён не хацеў падслухоўваць. Зусім не хацеў, шчырае слова. Ён спаў за шафай, завешаны шырмаю. Ён спаў. Ну, не мог жа ён ім сказаць: перастаньце — я ўсё чую. Добра, што цётачка адгаварыла, паабяцала, што забярэ да сябе дзіцятка — няхай толькі народзіцца. А потым чамусьці не ўзяла... Мама пашкадавала яго. І бабуля, мусіць, не ведала, што мама мерылася яго атруціць — піла пілюлі, каб ён не нарадзіўся. Яна хацела быць начальнікам, ёй прапаноўвалі. А бабуля думала, што Росцік спужаны. Забрала яго маленькага да сябе. «Палячу яго, — сказала яна, — пабачыш, як сем баб адходзіць, палепшае. На малацэ памацнее, паздаравее».

... «Міш-ш-ка! Мі-ш-ш-ка-а, мы прызямляемся! Злазь з дрэва і бяжы на бабуліны соткі! Мы там-м ся-дзем! Сева, давай мне руль! Давай, Сеўка-плеўка! Я сам. Ты падманіш, зноў накіруеш у космас. Там цёмна і халадна. Там ідзе каменны дождж і няма зямлі. Там няма зямлі...» Шызы, цякучы, бы дым, туман засціць вочы. Ніча-

гуткі не відно, колькі ні праціраў іх, як запацелае аконнае шкло. Туман ідзе нізка, абгортвае, калышацца на акне. Росцік расплюшчыў вочы, убачыў, як начны ветрык надзімае белую гардзіну на адчыненым акне. Хуценька заплюшчыў — трэба ж дагнаць той сон, вярнуць, пабачыць Мішку Дубчыка. Папытаць у яго пра бабулю, — Мішка ведае. Яны ж жывуць побач. Толькі стары плот перапінае агароды...

«Не крыўдуй на мяне, Мішка. Я не вінаваты. Я ж табе казаў, што крылы павінны быць рухомыя. Як у птушкі... У кажана таксама рухомыя. Вось палезеш на гарышча, там ён вісіць, сапраўдны кажан, галавою ўніз. Яго можна ўзяць у рукі, ён не лётае ўдзень, спіць».

... У тое лета яны будавалі з Мішкам лятак. Гэта Мішкава слоўца. Росцік жа гаварыў — дэльтаплан.

І вось намерыліся выпрабаваць. Там, на мелавых гарах, дзе глыбокія копанкі з застаялаю вадою. Мішка настырны. Абавязкова яму трэба было ляцець першаму. Росцік уступіў. А мог, урэшце, і не ўступіць.

Толькі Мішка, з усёй спарудай на спіне, адпіхнуўся нагамі ад вяршка гары, як (проста жах!) пайшоў, перакульваючыся і ломячы з хрустам, як сушняк, крылы, проста ў кар'ер з застаялаю смярдзючаю вадою. Так і боўтнуў уніз галавою. Толькі ваду замуціў, нібы чарада кароў прайшла.

Некалькі дзён яны перараблялі лятак, рыхтаваліся да новага выпрабавання, але прыйшоў сам Дубовік, бацька Дубчыка: мажны, як мядзведзь, у строчанай ватоўцы і вялікіх кірзачах.

«Што вы ўдумалі, смаркачы? Падшыванцы! Маць вашу... Галовы не паскручвалі?»

Яны не ўспрымалі таго, што ён гаварыў, не чулі слоў. Толькі бачылі, як, змазаныя салам, яшчэ новыя кірзачы з хрустам і трэскам ламалі лятак, які толькі што стаяў, зложыўшы крылы, пад страхою, бы спячы кажан. Што не паддавалася, Дубовік браў на калена, ламаў і крышыў усё начыста, мусіць, ён думаў, што гэта ракета.

«Ты хочаш бацькаву хату, смаркач, спаліць? Няхай гэты бабчыну паліць — у яго гарадская ёсць. А ты дзе жыцьмеш? Маць тваю... Я ў твае гады картоплі абганяў... Я табе налётаю! Хутка на зямлю пасаджу».

...Такі дым... Можа, сапраўды што загарэлася. Але не, не... Тоўстападэшвыя, вялізныя кірзачы, нібы колы трактара, топчуць, трушчаць лятак.

Не можа быць, каб дым! Гэта туман... Туман... Хоць бабуля заўсёды казала, уздыхаючы: «Да нас цяпер туманы не дакочваюцца, балота да-лё-ёка адступілася». Усё-ткі гэта туман... Вось з-за яго і не відаць бабулінай хаты.

Росцік разварочваецца раз, другі, спускаецца зусім нізка. Праходзіць гэты слаісты туман. «А-га-га! — крычыць радасна. — Вунь Мішкава хата! Вунь яна! І бяроза, і буслянка...» А бабулінай няма... Поле. Адно поле на тым месцы. Колькі ні кружы. Голае поле, ні вішань, ні яблынь. Толькі на ўскрайку — дрэва. Незразумелае, дзіўнае дрэва. Дрэва не дрэва, Мішка не Мішка. Карані вунь як за зямлю ўхапіліся, ажно вузлякі панадуваліся, а зверху — Мішка. А можа, гэта ён залез на дрэва, каб лепш яго бачыць, каб даць яму пасадку. Што ён? Мішка махае яму: няможна тут прызямляцца. Няможна? Мішка тут разагнаў бульбу. Вунь пабеглі раўчукамі роўненькія радочкі. Мішкаў бацька, Дубовік, раззлуецца. Тады ўсё кірзачамі сваімі                                                                      ператрушчыць.

Кружыць, кружыць Росцік над зямлёю. Шукае, выглядвае бабуліну хату. Няма яе, нідзе няма... І горка яму робіцца, нешта балюча перахоплівае горла. І хочацца заплакаць, закрычаць на поўныя грудзі.

«А-а-а-а», — крычыць ён і некуды падае, падае, аж зацінае дыханне.

— Ты чаго, Росцік? — трывожным шэптам пытае Сева і гладзіць умакрэлы чубок брата. — Прачынайся! Скора ўставаць. Чуеш, мама ўстала... І тата — таксама.

— Не хачу ў лагер. Хачу да бабулі...

... Сева ўжо зачыняе дзверы, чакаць яму няма калі, а Росціка яшчэ ўгаворваюць. Мама нервуецца. Шчокі яе гараць агнём. Яна стрымліваецца, каб не адшлёпаць яго чым-небудзь, не выкінуць за дзверы, а ўгаворвае. Што значыць — тручаны...

— Росцік, дагоніш... — гаворыць Сева, падбадзёрваючы яго. — Але я доўга чакаць не буду. Дуй хутчэй... Нешта пакажу па дарозе.

Што пакажа, Сева яшчэ не ведае. Можа, што і трапіцца. Ён проста падбадзёрвае, заманьвае брата пасвойму.

## 3

Вуліца яшчэ дыхала ранішнім халадком. Сонца выблытвала свае промні з-пад кляновых і ліпавых кронаў і з дрогкага лісця співала расу. Хораша. Свежа. Вось так бы ісці і ісці... Сева зірнуў на гадзіннік, да пачатку работы — трыццаць тры мінуты. Праўда, Мікіціч патрабуе, каб ён прыходзіў раней, мінут хаця б на пятнаццаць раней. Разлічыў: дваццаць мінут на хаду, трынаццаць на Мікіціча: да пачатку змены падаць кацёлкі. Але так хораша на вуліцы. Ціха і нават нейк урачыста. Прыемна ступаць па вільготны тратуар (яго, мусіць, нядаўна палівалі), дарожку сквера — тут яшчэ не прасохла раса. Горад прачнуўся. Замітусіўся. Людзі спяшаюцца на работу, аўтобусы ідуць валюхліва, цяжка. Натужна дымяць «Ікарусы», пастукваючы, снуюць трамваі. Але яны ўсе едуць кругаля, па шашы, Сева зрэжа вугал, пойдзе праз парк. Лічы пяць-сем мінут «чыстай эканоміі», як любіць гаварыць майстар Мікіціч.

Уваходзячы ў парк, азірнуўся: дзе той Росцік-хвосцік? Так дражніў яго не толькі Сева, а і яго сябрукі, таму што Росцік усюды хадзіў за Севам ухваста.

«Канечне, трэба было яго пачакаць. Бо заўпарціцца ды зусім не пойдзе. Мама спозніцца на работу, знервуецца».

Сева яшчэ раз азірнуўся. Няма. Дагоніць. Бывае, ён даганяе на выхадзе, але там яны разыходзяцца, «як у моры караблі». Росцік — налева, да школы, Сева — направа, на завод.

Парк сустрэў яго птушыным гоманам. Недзе ў вецці ліпы выспеўвала нябачная птушка. Заўсёды раніцою Сева прыкмячае яе голас, але якая з выгляду, ніколі не бачыў, здалося чамусьці, што яна шэранькая і маленькая, толькі такія птушкі, шэранькія і маленькія, хаваюцца, калі спяваюць.

Калі б яны ішлі разам, пра гэта можна было расказаць Росціку, нешта яшчэ прыдумаць. Але тут жа адумаўся. Даволі ўжо з яго казак! Вялікі! Трэба гаварыць праўду, няхай ведае пра ўсё як ёсць.

Вось і пра бабулю яму не сказалі. Памерла бабуля, а мама, здавалася, не па ёй плакала і перажывала, а не магла даўмецца, як быць з Росцікам. Гаварыць яму ці не? Раптам — разгорніцца. Потым парашыла не гаварыць. Пазвала дома ўсіх на кухню, калі Росцік глядзеў

мульцікі, і загадала, каб Росціку — ні слова. «Бабуля паехала ў вёску. Зразумелі?» І ні Росцік, ні Сева па ёй не плакалі, не бачылі, якая яна мёртвая. Сева, хоць і ведаў, што яна памерла, і моташна было ў яго недзе ў грудзях, але ганяў з хлапчукамі мяч: ніхто яго дадому не зваў, наадварот, дазволілі разам з Росцікам паехаць да Вадзіка на дачу аж на два дні.

У Севы была ўсё ж нейкая трывога ў душы, хоць ён і не плакаў, але слёзы, мусіць, тады ўжо закіпелі ў грудзях, прасочваючыся, як у зямлю вада, каб недзе там глыбока сабрацца ў крынічку.

...Памятае, як паехалі ў вёску. Маці і не хацела браць Севу, але ён не адставаў, прыліп як смала: так хацелася куды-небудзь ехаць. Проста ехаць... А тут — у вёску. Ды яшчэ патаемна ад Росціка.

Ён ніколі не заўважаў, што бабуліна хата такая старэнькая, гарбаценькая, акенцы якраз у палову тых вялікіх, светлых акон, якія пазіраюць на яе збоку. Яна, нібы бабулька, якой не хапае адно кульбы, аб'ехала, асунулася. Яны ледзьве адчынілі дзверы, перакасіла іх, як перакошвае твар неспадзяванае гора. І ўнутры была прапахлая пылам, заплеснявелая цішыня. Прыкрыты старою, спарахнелаю коўдраю драўляны нефарбаваны ложак, стол, збіты з дошак і накрыты старой, працёртай на рагах цыратай, шкапчык, прагрызены мышамі. Справа, ля парога, дзе вісеў драцяны вочап, падлога абсунулася, прагніла, узялася грыбам.

Сева адчуў няўтульнасць, мусіць, упершыню сэрца яго балюча заныла, нібы збітае аб асфальт калена. Нешта адбылося, ён адчуваў, але не мог зразумець: што? Старыя ходзікі на сцяне заіржавелі, і гірка, як старая парудзелая шышка, ляжала на ўслоне. Сева падцягнуў яе на ланцужку ўгору, таргануў карослівы ад іржы язычок маятніка. Той заматаўся спярша віхлява, потым пачаў выраўнівацца, недзе ўнутры гадзінніка хрыпла і натужна зачэкала. І раптам гадзіннік здрыгануўся, каўтануў вочка ланцужка, і маятнік зноў пайшоў матацца крыва і коса. Давялося выраўняць гадзіннік, бо ён скрануўся з месца, зноў таргануць маятнік, крыху счакаць. Здрыгануўся ён і другі раз, але каўтануць вочка ланцужка не меў сілы.

«Чаго ты прывязаўся да яго?!» — раздражнёна ска-

зала мама. Сева зразумеў, што ёй таксама няўтульна і горна тут. Яна быццам трапіла ў чужое, незнаёмае жытло, аглядала, бы ніколі не бачыла, патрэсканыя, не тынкованыя, але некалі беленыя сцены, вокны са слядамі падцёкаў з-пад шалёўкі, куткі з павучынымі гардзінамі, печ са скрыўленым чалеснікам, бы бяззубы рот.

Сказала, рыўком села на табурэт ля стала і заплакала. Сева азірнуўся. Не, яна не плакала, слёз не было, толькі нейкі стогн і енк вырываўся ў яе з грудзей, бы ад зубнога болю. Разгублены, ён падаўся на двор, зарослы быльнікам. Прайшоў напрасткі па ўтравелым гародзе да старых, разложыстых, з вузлаватым голлем яблынь. Абрадаваўся, убачыўшы пад лістамі рабрыстыя плодзікі. Памацаў, яны былі яшчэ ў белым пушку, як прыпыленыя. Але ўсё роўна зацяплілася радасць: вырастуць яблыкі.

Адкінуўшы рыўком на плот весніцы, зайшоў у двор чалавек. Ён размашыста шорхаў у траве нагамі, каб абчысціць свае вялізныя боты ад пылу.

«Нядаўна ж абкасіў, — гаварыў ён нібы сам з сабою, — а во як трава прэ. — Потым падняў позірк на Севу. — Прыехалі!..» — сказаў ці запытаў задаволена.

Маці выйшла на падворак.

«Глядзіце», — сказала яна, паказваючы на дзверы.

«Ці я не бачыў. Рано і вечар перад ачыма... То пайшлі да нас, што тут рабіць. Чакаў вясною, каб картоплiну ўкінуць. А цяпер хоць лубіну пасею. Усё не гуляцьме. Вунь калгас там падараў бульбянішча... А гэта — я дамовіўся».

Маці маўчала. Яна ішла, слухаючы дзядзьку, у суседні двор. Ды і Сева ведаў гэты двор, хату. Тут жылі Дубовікі, Дубчыкі, як дражнілі іх дзяцей.

«Мікола ж апошні год служыць. Трэба нешта думаць. Прыедзе — я яму ключы, — ён радасна, але стрымана засмяяўся. — Не ўлізне ад бацькі. Прыдумляюць — туды-сюды... Цяперака і тут абы рукі ды тэхніка ў руках... Трэба ўмець жыць...»

Дубовік быў ажыўлены, гаваркі.

«Трыста — гэта і багата. Толькі за пляц і даю. Хата — куды яна. Хіба толькі лазнечку потым зляпіць. І то толькі на верхнія вянцы... Ды дзе на палок выбраць. Хадземце, хадземце... — прыспешваў ён. — Пасядзім, закусім».

Але сам расседжвацца доўга не стаў. Укусіў трохі

і засяшаўся. «Яшчэ, можа, Захара з трактарам запарву», — сказаў ён жонцы. На шчокі яго пляміста выбіўся румянец, бы ён хваляваўся.

А Дубовічыха, гаманкая, рухавая жанчына, пачала ўгаворваць маці схадзіць у лес: «Яга-ад!.. Людзі вёдрамі цягаюць».

«Ой, хоць па лесе прайсціся», — уздыхнуўшы, пагадзілася мама. Можа, і ёй зрабілася раптам тут беспрытульна і холадна, як і Севу. Ён таксама пагадзіўся.

Калі яны вярнуліся, бабулінай хаты не было. Толькі развaленая печ стаяла, як на пажарышчы. Дацямна разбіваў яе ломам Дубовік, і, здавалася, яна глуха стагнала.

Старыя, скарэжаныя яблыні ляжалі ля плота на вуліцы і ў галлі іх лазілі, бы вусені, дзеці, напіхвалі кішэні шэра-зялёнай завяззю, потым абстрэльвалі адзін аднаго, носячыся па вуліцы. Завадатарам у іх, па ўсім, быў Мішка Дубчык. «Гэта ўсё нашае цяперака», — з гордасцю гаварыў ён усім.

Сева і маці, ідучы з лесу, селі на лаўку насупраць, нібы анямелі, адказалі ногі. І Сева толькі цяпер зразумеў: памерла бабуля, зразумеў сваё як бы сіроцтва. Вецер падхапіў пушынку адуванчыка, і яна паляцела над зямлёю. І Сева сабе здаўся тою пушынкай, ляцеў, не ведаючы, куды нясе яго вецер. Самі сабою пацяклі слёзы, толькі не па шчоках, а горлам — даўкія і калючыя, спаўзлі ў грудзі. Вочы яго былі сухія, але ён ведаў, што плача. І каб ён мог тады гаварыць, каб так не перасела ў горле, ён бы запытаў тады: «Хто мы цяпер?» — але гаварыць ён не мог, толькі падумаў. Але скора ўсё гэта прайшло: яму нават вальней стала, нібы нішто не трымала ўжо на зямлі. Хочаш — тут жыві, хочаш — ляці ў космас, а што — цікава...

«А Росцік яшчэ дурны. Яму можна маніць... Але трэба сказаць. Ну, паплача і супакоіцца. Трэба сказаць... І больш не маніць, а то самі хлусяць яму, заводзяць у зман, казачкамі кормяць, а потым перажываюць, што ён ніяк у розум не ўбярэцца, усё маленькі. Не, я ім займуся!»

...Сева спяшаўся, але яго ўсё адно міналі, пераганялі людзі, таксама, мусіць, заводскія. Іх было не многа, бо заводскі гарадок — за паркам, па той бок дарогі, дзе прабягаў, пасвістваючы, тралейбус.

Вось яна — дарога.

Прывалюхаўся «Ікарус» і спыніўся... Пасажыры высыпалі з дзвярэй і адразу, здаецца, не разгледзеўшыся, не раздумваючы і не азіраючыся, кідаліся ў розныя бакі, некаторыя нават подбегам, нібы ўцякалі, адбягаліся ад «Ікаруса».

Спяшаліся людзі на работу.

...Толькі яна не спяшалася, выкараскалася з аўтобуса, паціху і нават неяк асцярожна прайшла на мураву пад клён і села. Ці ногі памлелі, ці проста не было куды спяшацца. Можа, хацела адпачыць, як у вёсцы, ідучы з лесу. Абаперлася спінаю аб камялёк клёніка. (У горадзе ніхто не садзіцца ні на зямлю, ні на асфальт, ні вось так пасярод газона.) Яна сядзела. А людзі спяшаліся, беглі. Але ўсё-такі прыпыняліся, распытвалі. Іншыя падыходзілі і толькі заглядвалі праз галовы, бы дазнаваліся, «што даюць». Нічога не давалі, і яны ішлі далей. Сева сунуўся таксама спатоліць цікаўнасць. Словам, нешта павяло яго туды, прымусіла спыніцца. Штосьці балюча знаёмае, як згадка, нагарнулася, затоена і настойліва прымушала ўглядацца ў невялічкі, бы падсушаны, твар. Бабуля расшпіліла кофту, ссунула на патыліцу хустачку. І вецер гладзіў, лёгенька варушыў яе белыя, ненатуральна белыя, як сіняваты падталы снег, валасы. Заныла сэрца: «Зусім як наша бабуля, зусім. Валосікі такія ж беленькія і вочы жывыя, порсткія, але пазіраюць вінавата, сумна».

— Вам дрэнна? — пыталася ў яе буйнаносая жанчына, з тых дзейных асоб, якія гатовы нешта арганізаваць, заступіцца, пашумець, адчуваючы не толькі маральную, але і фізічную сілу.

Дзве маладзейшыя жанчыны таксама прыпыніліся толькі на імгненне:

— Трэба ёй «хуткую» выклікаць!

Гэта ўжо сучасны тып жанчын. Трэба! Гэта павінен нехта зрабіць, а не яны. Яны спяшаюцца. Так і ёсць: спяшаюцца. Жанчыны подбегам пусціліся да вялікага будынка інстытута з даўжэзнай назвай на шыльдзе. Адна, праўда, прыпынілася. Пашукала нешта ў сумачцы, выняла памаду, люстэрачка і на хаду, трымаючы пад пахай сумачку, мазанула чырвоным па вуснах, глянулася, трасянула кучаравымі валасамі.

Бабуля, разгубленая, пазірала вінавата: відаць, не звыклая надаваць людзям клопату.

— Вам дрэнна? — дапытвалася насатая.

— Дыхаць цяжка. Ды-ха-віца... у мяне. Во, па-сяджу крышку... Нічога, ні-чо-га.

— А куды вам ісці? Які дом?

Бабуля зусім разгубілася. Вочы яе затуманіліся жалем, нейкай нязгаснай тугою.

— А прозвішча як? — дапытвалася жанчына.

— Забылася я. Там усё засталося... там і пашпарт мой. Усё запісана.

— Ёй дрэнна! Трэба «хуткую», — удакладніў мужчына, паважны, у дыхтоўным касцюме. Відаць, з начальнікаў.

— Я была б яшчэ нічога, каб яны мяне не сарвалі, хату не прадалі. Я ж і столь пабяліла... Столь і печ... А яны прадалі.

Мужчына пакрочыў, не спяшаючыся, далей. Распарадзіўся — і дастаткова. Спакойна, паважна...

— Дык якая вуліца, дом?

— Забылася... — бабуля паднесла скурчаную руку да галавы, бы намагаючыся ўспомніць, вочы яе пазіралі цяпер жахліва. — У пашпарце запісана, у іх... Каб яны мяне не забралі... Я і не хацела...

— Божа мой, яна нічога не помніць! — сказала, адвярнуўшыся, насатая, ці сама сабе, ці то да Севы. А ён стаяў як слуп, пазіраў на бабулю. Сам, не ведаючы чаму, чакаў, чым жа ўсё скончыцца.

«Яна таксама гаварыла так. І таксама згубілася, калі пайшла сустракаць Росціка. Яе шукалі па ўсім мікрараёне, горадзе».

Яго ўразіла гэта падабенства сітуацыі, і розум туманіла, тлуміла, як учарашняя фантастыка: «А можа? А можа? Тады ж яны не бачылі яе, ні Росцік, ні ён. Маці сказала, што яна ў бальніцы, а потым... потым — яна памерла. Чаму ж ім — ні Росціку, ні яму — не паказалі? Няхай Росціка шкадуюць, засцерагаюць. А ён? Ён — дарослы чалавек. Можа, і не знайшлі тады яе?..» — яму ажно халадна стала ад гэтай думкі, маленькія мурашачкі ланцужком пабеглі па спіне. Цяпер ён зразумеў, чаго стаяў тут. Зразумеў... Ён чакаў, ён хацеў, каб яна ўспомніла. Успомніла?

Бабуля ж пазірала па-дзіцячы вінавата, глытала ротам паветра, нібы піла яго. І ветрык гладзіў яе валасы, ласкава варушыў іх, як мяккі пераспелы дзьмухавец.

— Вось што, хлопец, — насатая бы абудзіла яго, — ты пастой! Я выклічу «хуткую». Ты дачакайся...

Ён таксама хацеў сказаць, што спяшаецца, але не пасмеў, завельмі непадступны і распараджальны тон быў у гэтай жанчыны. Ды ён і не прывык пярэчыць дарослым. Яна хутка пайшла, а ён застаўся. Таксама зірнуў на гадзіннік — у яго было яшчэ пятнаццаць мінут. Таксама час падганяў. Але ён падсвядома спадзяваўся, што ў выпадку чаго перадасць свой пост каму-небудзь. Вось толькі спыніцца няхай хто. Але ніхто не спыняўся. Рэдкіх прахожых не цікавіла, чаго сядзіць на газоне ля броўкі дарогі бабуля, бы вясковая кабета на канаве, яны былі паглыблены ў нейкія свае думкі. Высыпаліся з аўтобуса, як бульба з развязанага мяшка, і раскочваліся кожны ў свой бок. Спадала хваля «пік», і аўтобус спыняўся радзей; са свістам, як ляціць міна, праносіўся тралейбус.

Сева не мог стаяць на месцы, ён нерваваўся, ногі самі перабіралі сцежку, вочы зіркалі то ў адзін бок дарогі, то ў другі: адкуль прымчыць тая «хуткая». Можна было кінуць гэтую бабулю і пайсці, але нешта замінала яму, тое, што было ўсярэдзіне, надрыўнае, пякучае. Ён мітаўся, адыходзіўся і зноў вяртаўся, бы нечым невідочным быў прывязаны да гэтай бабулі. І здрадлівая думка: пакінуць яе, няхай сабе сядзіць якая мне да яе справа, — падмывала і падмывала бераг яго сумлення.

Вунь варона ўселася на вяршок слупа, падставіўшы, можа, радыкулітную спіну сонцу, звесіўшы глюгу. «Кар-р, кар-р», — пачуў ён над галавою, нібы нешта ў яго яна папытала.

«Без пяці восем», — адказаў ён, зірнуўшы на гадзіннік. І яна паважна кіўнула галавою. А потым, бы адумаўшыся, закрычала — кар-р-р, кар-р-р — працягла і роспачна, шалёна сарвалася са слупа, замахала таропка крыламі, бы, дурная, некуды пазнілася. І сарока, пазіраючы на яе з рэдкага галля падсохлай таполі, рассмяялася, суха і зларадна.

Сева стаяў каля бабулі, узіраўся ў канец вуліцы: дзе тая «хуткая». Лепш бы ён сам пазваніў. Знайшоў тату. Той бы хутка...

А сарока ўсё смяялася, неспакойна паскокваючы на суку. Нічога не было пад рукою, каб пужануць яе.

Гадзіннік разбегся з хуткасцю звышгукавога самалёта. Гэта не старыя бабуліны ходзікі, павольныя і рыпучыя, а сучасны электронны гадзіннік, які толькі бліс-

каў зялёным святлом, як бліскае ў далёкім небе кропкай, знікаючы з вачэй, паветраны лайнер. Ён ведаў, што там, у цэху, носіцца, як тыгр, Мікіціч, і цётачка Марыя вінавата пазірае на яго, і трывога абмывае туманам яе валошкавыя вочы. І бераг яго сумлення вось-вось рухне, у яго ёсць апраўданне: цэх, Мікіціч, ненажэрны рыплівы канвеер, якому, здаецца, няма канца. Але перад тым ён узіраецца ў твар бабулі: няўжо яна не ўспомніла?

— Бабуля, дык як? — пытае ён.

— Ідзі сабе, дзіцятка, мне нічога не трэба. Я пасяджу...

Але яе вочы, нешта ў іх было: нейкі задаўнены боль, пазелянелая, як старыя медзякі, туга і гэтая дзіцячая вінаватасць, бездапаможнасць. Вось такімі вачыма пазірала і яго бабуля перад тым як згубілася недзе ў горадзе, сярод людзей і дамоў. Магчыма, вось гэтак жа... Але не толькі ад гэтай думкі рабілася яму не па сабе, а і ад таго, што там, у цэху, стаяць яго чырвоныя электракары і майстар Мікіціч сярдзіта варушыць вусамі, па-бычынаму пазіраючы з-пад густога зарасніку броваў. І хоць бы хто... Хоць бы хто...

— Дзевушка, дзевушка, бабулі дрэнна...

Яна зірнула пагардліва: маўляў, твая бабуля, вось і валаводзься з ёю.

— Эй ты, хлопец, чуеш? Я — табе. Ці не твая бабуля?

Гэты толькі крутнуў галавою: пайшоў ты.

А гадзіннік бліскаў і бліскаў зялёным вокам.

З таго боку, з лесу, на дарогу выходзіў Росцік. Нетаропка, як пенсіянер, што бесклапотна прагульваецца па парку. Росцік ледзьве цягнуўся, відаць, яму не хацелася ісці ў школу, ён марудзіў.

— Росцік! Росцік! Хутчэй сюды, Росцік!

## 4

Майстар Мікіціч нерваваўся: паглыбелі, здаецца, зморшчынкі на яго шырокім адкрытым твары, уздуліся жаўлакі ад сціснутых сківіц, і ўвесь ён пасуровеў. Прыцэльным позіркам звужаных вачэй пад сіваватымі, шчацінiстымі брывамі раз-пораз зіркаў на дзверы (няўжо зноў?..), шарыў па цэху, высвечваў і прыкмячаў самыя, здавалася б, непрыкметныя дэталі: пацямнелая (відаць,

даўно ляжыць) кацёлка са зблытанай намоткай пад канвеерам; пахілыя стосы скрынак (як складзіраваў, падшыванец!), што могуць заваліцца ад дотыку пальца; сарваная ветрам ці, можа, выбітая (але кім і як?) шыбіна ў высокай шкляной столі, куды зазірала жывое блакітнае неба, чыстае, вымытае начным дажджом; верабей, што чыўкаў на бэльцы (недзе ён сур'ёзна асталяваўся), прыўстаў прутка на тонкіх галінках-ножках, пакрыквае (от забіяка!) — голас смелы, па-вераб'інаму віскдівы, звонка разносіцца па яшчэ ціхім гулкім цэху. Майстар Мікіціч зірнуў на гадзіннік. Дзесяць... дзевяць мінут, і — трэба запускаць канвеер. Ужо сядзелі ля яшчэ нерухомай яго ручаіны зборшчыцы. Зноў пашукаў вачыма Севу (можа, скаліць зубы з кім з маладых?), але яго не было. (Пачакай жа ў мяне!)

Нервавалася і Марыя Мікалаеўна. Хоць здавалася, як звычайна, спакойна завязвала касынку, акуратна забраўшы пад яе чорныя, некалі нават, здавалася, сінявагыя валасы, глянула ў кругленькае люстэрачка ў прыўзнятай руцэ, некалькі разоў павольна пальцамі правяла па лобе, нібы хацела разгладзіць зморшчынкі. У душы Мікіціча на імгненне пацяплела, але ён не даў разгарэцца таму цяплу, патушыў, злуючы і на яе. Нерухома ля сцяны цэха і неяк беспрытульна, як не на сваім месцы, стаялі чырвоныя электракары. Яму даўно трэба было снаваць па цэху, падаваць кацёлкі на зборку трансфарматараў, але гэтага «таленавітага хлопчыка» не было. «Шчанюк, малакасос! Выганю к чорту! — лаяўся ў душы Мікіціч. — Выганю, і ніякая цётачка мяне больш не ўгаворыць, не ўпросіць. Даволі!» Ён ужо гэта нібы гаварыў Марыі, а яна пазірала на яго тым даўнім сваім позіркам, крышку сумным і вінаватым, нібы чытала яго думкі і прасіла не злаваць. У цэху яны амаль што не размаўлялі, толькі пазіралі, бывае, адно на аднаго. Марыя — мякка, з нейкім незямным спакоем і дараваннем. Хмуры і жарсткаваты позірк Мікіціча не вытрымліваў, ён адводзіў вочы: нібы сумленне яго сядзела ля гэтага бясконцага канвеера і заглядвала яму ў душу: «Дрэнна мне, Маня». Маня, Маня, Маня... Як дзіўна, мякка і як забыта гучыць недзе ў душы, у памяці гэта імя.

«Як ты, Пецця?»

І голас яе аднекуль здалёку ажно аддаецца рэхам: бы з лесу, стромкага бору, што тонка-тонка звініць на

сонцы, з-за рэчкі, якую ён пераплыў, хоць холад сцінаў пякуча грудзі, а яна — не адважваецца: «Як ты, Пеця?»

Але яна нічога не пытае, яна ніколі з той пары нічога не пытала, бы разумела ўсё, даравала. Прыйшла, села за гэты даўжэзны стол, і вось ужо добрую палову жыцця (а яно, як рызінка, расцягнеш — доўгае, адпусціш — кароткае), і палову гэтага доўга-кароткага жыцця сядзіць насупраць, маўчыць, а ў вачах гэты мяккі спакой і паразуменне. І яму, Мікіцічу, бывае ад гэтага позірку спакойна: упэўнены ён і моцны пад яго цяплом. Даўно, ой як даўно, жыве ён пад яе позіркам, і гэта не дае яму схібіць з прамой дарогі, нешта не так сказаць, зрабіць, узяць добра чарку. Ды ці мала што... Але зараз хочацца сысці з яе вачэй, выліць свой гнеў, як атруту, з душы. Так, ён быў непахісны, няўмольны, цвёрды як крэмень. Нават не пазіраў на Марыю. Падаўся да дзвярэй, глянуў здалёку на прахадную. Яго не было. І ўсё яго нутро кіпела ад гневу, ажно пякло ў грудзях, бы кіпеў там чайнік. (Выганю, выганю, як шчанюка!)

Марыя таксама, відно, непакоілася, гэта ён скмеціў, толькі слізгануўшы позіркам уздоўж канвеера. Ёй, відаць, незразумела, чаму не падаюць кацёлкі трансфарматараў. А што тут незразумелага — так пачынаецца не першая раніца. Зборшчыцы на сваіх месцах гатовы. Нават Ліпа... Не. Тое, што ён убачыў, скаланула: Ліпа, не зважаючы ні на кога, — мужчын тут не было апроч яго, але ж маглі кожную мінуту заявіцца рамонтнікі, слесары, ды ці мала хто, хоць вось гэты падшыванец, — паставіўшы нагу на зэдаль, Ліпа падцягвала тонкія панчохі ці калготкі (ліха іх ведае). Загалілася, як у балеце. «Сарамат-ні-ца!» Вось так яна сарвала навінку ў цэху, што была гонарам усяго завода: тэлевізійны дыспетчар. Газеты ўсе распісалі, дэлегацыі ездзілі пераймаць навінку: дзіва што, націснеш на кнопку — цэх увесь як на далоні, толькі круці рычажок, напраўляй, як бінокль, на які хочаш працэс. Аднойчы прыехалі высокія госці, захацелі зірнуць. Сабраліся ля пульта, уключылі. Засвяціўся тэлеэкран, праясніліся контуры — і што ж: стаіць Ліпа ва ўсёй красе, вось так — нагу на зэдаль, калготкі напінае, ну проста сорам. Дырэктар завода ажно ўспыхнуў чырванню і строга сказаў: «Пераключыць!» Але тут нешта заела, а Ліпа, як знарок, напаказ за другую нагу ўзялася, спадніцу загаліла аж некуды. Ногі ў яе, ка-

нечне... А кадр ні з месца. Тады начальнік цэха кінуўся наперад, закрыў сабою экран.

«М-мгы, — сказаў нехта з гасцей, — гэта цікава». Больш тэледыспетчар не ўключалі. Майстар Мікіціч пастарому павінен быў усіх трымаць у полі зроку, усім даць работу, адказваць на шматлікія пытанні, дабівацца, выбіваць, угаворваць, выхоўваць. Графікі, справаздачы, план, план, план... зарплата. І гэта яшчэ...

— Гэта яшчэ што? — Мікіціч грымнуў кулаком па стале. Ажно Ліпа імгненна выпрастала нагу, тузанула на каленцы спадніцу, зірнула на Мікіціча з-пад веек карцінна, звысоку, павярнула галаву і села, быццам яе абразілі. Але хуценька падхапілася, вочы пырснулі агнём. «Дак што рабіць, майстар?» — развяла рукамі яна, паказваючы далоні, бы лавіла ў іх кроплі дажджу.

Мікіціч, як метэарыт, кінуўся ў канец канвеера, пачаў хапаць, ускідваць на электракары скрынкі з кацёлкамі, аж тыя закруціліся на колах, схаваных пад пляцоўкай, як пад панцырам лапы чарапахі.

Марыя, стройная і строгая, у чорным атласным халаце, заспяшалася яму на дапамогу. Працавалі яны моўчкі, толькі скоса зіркалі адно на аднаго. Марыя — бы вінячыся, ён — насуплена, неяк нават пагрозліва, злуючыся.

Спачатку разнёсся характэрны гул электрычнага рухавіка, потым скрыгатліва, нібы неахвотна заварушыўся, зарыпеў — пайшоў канвеер. Цэх, вялізны, высокі, як хорам, са шкляной столлю, ажыў, напоўніўся рабочым шумам, супакойлівым і прывычным.

Вось тады і заявіўся Сева... Заявіўся, не запыліўся. У джынсах у абцяжку, модна пацёртых, з выстаўленай напаказ латкай — кавалачкам скуры вышэй калена, у такой жа крышачку скупаватай куртачцы. Яму было семнаццаць. І ўсё было ў яго, як у семнаццацігадовых — колер твару і пушок на верхняй губе, хоць ён ужо спрабаваў галіцца, і святло ў вачах, і позірк, ну, усё гаварыла пра гады.

— А вось і наш гяр-рой! — падкрэсліў апошняе слова Мікіціч. Ён стаяў — рукі ў кішэні чорнага, сацінавага халата, — і тон яго быў, здавалася, паблажлівы і бесклапотны, быццам не ён толькі нядаўна грымеў кулаком па стале, не ён кідаў скрынкі на электракары. — Ну і што скажаш сёння? Зноў будзем разглядаць тэорыю рассялення людзей па геннай рэакцыі на сонца? Можа,

пераселім цябе туды, дзе яшчэ сонца не ўзышло? Ці нешта іншае затрымала і...

— Ды там, на прахадной... Я прасіў, а ён — ні ў якую, упёрся рогам. Не пускае.

— Рогам? — іранічна, нават насмешліва перапытаў Мікіціч, але гэта было зманнае зацішша перад узрывам.

— Толькі ж адна мінута прайшла.

— Адна? Гэта мала? Ды ты знаеш, — зноў яму хацелася абазваць яго шчанюком, але стрымаўся, — ты знаеш, што значыць адна мінута для нашай краіны? Пакуль ты чухаўся, ужо сышлі недзе з канвеера машыны, станкі...

— Што вы ўсё за краіну, за краіну...

— А за што ж яшчэ, за што? — абурыўся гнеўна Мікіціч.

— Станкі, машыны... — сказаў паныла Сева. — А пакуль вы мяне ўшчувалі, іх ведаеце колькі нарабілі?

— Як ты размаўляеш са мною?.. І што за выгляд у цябе? Што за капа на галаве? — Ён зірнуў непрыязна, агледзеў яго з галавы да ног. — Усё! — сказаў, бы выдыхнуў. — Цярпенне маё скончылася. Тут не дзіцячы сад. Нянькі-байкі... Тут адказны ўчастак, цэх зборкі трансфарматараў, кан-ве-ер! Паняў? Я скажу, каб цябе наогул не пускалі сюды. Паняў?

— Дык я пайшоў, — ніколькі не разгубіўшыся, толькі ўскінуўшы брывамі, маўляў, хай будзе так, сказаў Сева.

Мікіціч не чакаў такога нахабства. Ён нават сумеўся. Толькі пазіраў на гэтага джынсавага хлопчыка нейкую хвіліну бы здзіўлена, потым ціха, з нейкім адчаем прамовіў:

— Ды валяй ты да чартавай матары!

У яго быў другі клопат. Цэх малых серый даў некамплектную прадукцыю, і зноў няма кацёлак нумар тры нуль-нуль восем. Вось-вось трэба будзе спыніць трэцюю лінію.

— Цябе мне не хапала...

Сева пайшоў. Ён яшчэ азірнуўся на Мікіціча, няйначай думаў, што майстар яго спыніць, але Мікіціч, як знарок, насупіўся, яго густыя бровы сурова сышліся ў адну лінію над вачыма: майстар злаваўся. «Нідзе не дзенешся, прыйдзеш. Стаж выпрошваць. Гісторык! Мамачка прыбяжыць: «Хлопчык трызніць гісторыяй».

Хлопчык, хлопчык!.. Абрыдлі мне гэтыя хлопчыкі!» — крычала яго нутро. Але твар быў строгі, засяроджаны, толькі бровы выдавалі хваляванне. Яны то сыходзіліся ў адну лінію, то разрывалі яе.

Марыя трывожна, запытальна пазірала ў яго бок, бы падзывала позіркам, але майстар Мікіціч быў яшчэ як вулкан, цяжка дыхаў, аж раздзімаліся крылы носа. Марыя круціла пальцам, нібы набірала лічбы на дыску тэлефона, паказвала яму, што пойдзе пазвоніць. Але ён махнуў рукою: не трэба. Прыкра ў яго на душы, пуста. Ён знарок не падыходзіць да Марыі: раптам сарвецца, нагаворыць і ёй чаго не след. Хіба вінна тут яна?

Дзень, як звычайна, праходзіў у клопатах, час рухаўся не з хуткасцю гэтага старога канвеера, а абганяў яго, і майстар Мікіціч з дня ў дзень мітаўся ў гэтым прамежку паміж часам і канвеерам, звязваючы іх канцы, а яны рваліся, і час абганяў канвеер. А трансфарматары чакалі ў дзевяці краінах свету, якім не было аніякай справы да Мікіціча, да яго клопату, да гэтага хлопчыка Севы, які «трызніць гісторыяй». І Мікіціч часам быў сам як трансфарматар, браў на сябе высокае напружанне, каб потым выдаць яго памяркоўна другім, а гэта — не стрымаўся.

— Прабач, але я выгнаў твайго «гісторыка», — крышку нахіліў галаву, панурыўся.

— Ты што так? — глянула дакорліва Марыя.

Мікіціч не падымаў вачэй. «Чорт іх ведае, што за дзеці пайшлі? Увогуле ж неблагі хлопец...» — раздумваў ён. І Марыя нібы пацвердзіла яго думкі.

— Ён не сапсаваны, ты дарэмна... І хлопчык сапраўды...

— Марыя, мне астачарцелі гэтыя хлопчыкі. Ты бачыла — ён у два разы вышэйшы за мяне ростам, у яго гады я араў поле! — зноў узгарэўся знутры. — Да д'ябла, да...

— Пра што ты? Цяпер іншы час, — сумна сказала яна, і ён зразумеў, што гэты «іншы час» апраўдваў і яго. «Які іншы?» — не разумеў усё ж. Для яго час не мяняўся, ён аднолькава хутка пёр паперадзе канвеера, і майстар гнаўся за ім, як на рыпучым возе. Галаву тлуміў клопат. А першай гадзіне спыніцца трэцяя лінія.

— Кожнаму сваё. Табе адно — канвеер. І ты дарэмна...

Мікіціч падняў вочы, зірнуў на Марыю, ужо не сяр-

дзіта, а аціхла і паразумела, вачыма стомленага чалавека.

— І ведаеш, Марыя... А-ах, — махнуў ён рукою. І пайшоў па праходзе між ручаін канвеера. «І ведаеш, Марыя, я стаміўся, і хочацца мне цішыні, але нельга, нельга спыніць гэты канвеер... А добра было б зараз паехаць у вёску, купіць хату і слухаць жаўранка. Але позна, позна, і я не скажу табе гэта. Нічога змяніць ужо нельга. Рухаецца, парыпвае канвеер, і пакуль ён ідзе — я жыву. І кожны дзень сачу, б'юся, сваруся, нервуюся, каб ён не спыніўся. І ты сядзіш там, на трэцяй лініі, кожны дзень, і, можа, таму я баюся, каб ён не спыніўся. Можа, таму... Але што цяпер пра гэта? Позна. І не да часу. Вось не будзе малых серый, і будзем сядзець склаўшы рукі». Нічога гэтага ён не сказаў Марыі. Толькі кінуў няўзнак, калі праходзіў:

— Носіцеся вы ўсе з ім. А трэба хлопца правучыць. Паказаць, што да чаго. Дарослы ўжо!

Марыя замацоўвала магнітаправод у кацёлкі амаль механічна, за доўгія гады працы рукі налаўчыліся, яна магла збіраць трансфарматар нават з заплюшчанымі вачыма. Выгляд яе быў заклапочаны, і на словы Мікіціча яна не азвалася, нібы ўсердзілася, зацялася. Але пасля абеду — ён і не чакаў, — як заўжды, паклала на ягоны стол поліэтыленавы мяшэчак, сказала: «Масла кісламалочнае, вяндліна, курыца. Цукар і хлеб возьмеш сам».

Марыя прыносіла ўсё гэта кожны тыдзень: ці ёсць у яго час самому бегаць па гэтых сталах заказаў? І гэта доўжыцца ўжо не першы год. Дзіўна неяк яна паклала мяшэчак, каб было там што цвёрдае, загрымела б аб стол. Вось яна мацуе, мацуе кацёлкі, і кожны дзень майстар Мікіціч пускае канвеер, хвалюецца, б'ецца як рыба аб лёд, каб ён не спыніўся, каб была ёй, Марыі, работа. Толькі работа... А ёсць жа яшчэ нешта ў жыцці, нешта-такі ёсць. Ад нечага ж яму прыкра, непаразумела прыкра, быццам спынілася трэцяя лінія. Не, зусім другое — на трэцяй лініі няма Марыі. Вось чаму яму стала так невыносна нудна, да болю самотна. Але прэч, прэч думкі! Цячэ і цячэ канвеер, як рака яго жыцця. І на другім беразе — Марыя.

## 5

...Казалі зборшчыцы адна адной па сакрэту — але ж, па сакрэту ўсяму свету, — што, калі памірала жонка Мікіціча, дык паклікала да сябе Марыю, маўляў, даручыла ёй мужа. І ўсё чакалі, што вось-вось яны сыдуцца. І той-сёй гаварыў проста ёй у вочы, маўляў, дачакалася ты, Марыя, свайго... але не дагаворвалі, бо тут сапраўды слова «шчасце» не падыходзіла. Марыя толькі пазірала з дакорам, хмурыла бровы, адыходзіла, у гаворку не ўступала. Але праходзілі месяцы, гады (ага, гэта ўжо гады), а ўсё заставалася па-ранейшаму. І зноў жа, не так, дык гэтак, пачалі пагаворваць, што Ангеліна забараніла Мікіцічу браць Марыю, і Марыю таму паклікала тады, каб сказаць гэта і ёй. Нічога падобнага, канечне, не было. Праўда, Марыя сама хадзіла да Ангеліны ў бальніцу (яна як-ніяк была ёй хоць далёкаю, але раднёю, яшчэ па вёсцы ведала яе). Ангеліна слаба, сабраўшы апошнія сілы, дакранулася да яе рукі. Марыя жахнулася: Ангеліна была непазнавальная — жоўтая, губы нібыта пакарацелі, агаліліся зубы, — але Марыя перасіліла жах, пагладзіла яе руку, худую, тонкую, як трысціна, і таксама жоўтую, як з падсохлай скурай. «Даруй мне», — ціха сказала Ангеліна. На гэтыя два словы яна сабрала, здалося, усе свае апошнія сілы. Як крылы матылька, якія безнадзейна б'ецца ў шыбіну акна, трымцела яе дыханне, таксама ўжо безнадзейнае. З цяжкім пачуццём вінаватасці выйшла Марыя з палаты.

Часам, калі Марыя пазірала на Мікіціча, тут жа ўяўлялася ёй Ангеліна, з глыбокімі запалымі вачыма, вастраносая, такая, якую бачыла яе ў апошні раз.

Мікіціч паглыбіўся ў разлікі: план — зменны, сутачны, месячны, квартальны. Жывыя промні сонца цёпла, як дзіцячай далонькай, дакрануліся да шчакі. Мікіціч павярнуў галаву, узняў вочы, і душа яго белым голубам рынулася ў тую фортку ў столі, адну хвіліну палётала, пакружыла і вярнулася. Ён адзначыў сабе: пазваніць рамонтнікам. А на бэльцы — пузца ўперад — прутка стаяў на галінках-ножках канаплючок і ўладарна, віскліва пакрыкваў, нібы дражніўся. «Іч ты!» — падміргнуў яму Мікіціч. Белая кропля каўзанулася па бэльцы, доўга ляцела і пляснулася на электракары. Мікіціч зірнуў на вераб'я, але ўжо без ранейшай павагі, а неяк цікаўна. Гэта значыла — яму пагражала высялен-

не. Можа, і спешнае, але трэба хвілін праз пяць пускаць канвеер.

— Пятро... — Марыя павагалася, — Аляксеевіч, — сказала стрымана і афіцыйна, — хоць ты і лічышся настаўнікам моладзі, але так нельга.

— А як па-твойму?

Яна маўчала.

— Трэба і гэтак... Даць яму адчуць, што тут не гулі, а вытворчасць. Дысцыпліна.

— Але ж ты не назусім яго... — хацела сказаць: выгнаў, але спахапілася, — адправіў?

— Не знаю, — нахмурыўся Мікіціч, бровы яго зноў сышліся. — Абрыдлі мне гэтыя балбесы. Вось пасля работы пайду яшчэ аднаго ўгаворваць — даручэнне дэпутацкай камісіі.

— Бачыш, аднаго ўгаворваць будзеш, а другога...

— Выгнаў, ты хочаш сказаць? Ага, — засведчыў нейкія свае думкі. — Ідзі працуй, Марыя, — і стомлена плюснуў вачыма.

— Ты зразумей... — яшчэ хацела сказаць штосьці, але Мікіціч апярэдзіў:

— Я разумею, ён незвычайны хлопчык. Прызнацца, звычайных я апошнім часам і не сустракаў — усё таленты. Дзе яны, звычайныя хлопцы, без гэтых вось фінтоў? Скажы мне, дзе?

Цяпер яна прыкрыла вочы, нібы ён гаварыў нешта недарэчнае, і трэба было перачакаць.

— Ці ж ты быў звычайны маладым?

— Ага, я быў звычайны! А таму, што прыйшоў у гэты цэх босы. Босы, разумееш! Я прыйшоў ратавацца ад голаду. А іх трэба ратаваць ад дабрабыту! І твайго пляменніка, і гэтага Веніка. Вось да чаго мы дажылі, Марыя...

— Ты грабеш усіх да кучы. У цябе ж свае дзеці.

— Яны таксама, на вялікі жаль, душэўна глухія...

Вочы яго сталі сумныя, ён задумаўся пра нешта сваё, што было не выказана, але зразумела Марыі.

— Яны нічога пра нас не ведаюць, Марыя. Яны не хочуць ведаць! Іх гэта не цікавіць!

— Пра нас? — сумелася яна.

— Ага, што ведае твой пляменнік пра цябе? Што думае?

— Нашто яму пра мяне нешта знаць і думаць? І хто я, каб пра мяне думаць?

Мікіціч паківаў галавою. Зірнуўшы на гадзіннік, заспяшаўся. Зноў яго пацягнуў за сабою канвеер. І зноў ён забыўся на Марыю, на Севу і Веніка, на дзяцей сваіх. Ён думаў і дбаў толькі пра адно — пра канвеер, пра трансфарматары, якія чакаюць дзевяць краін свету, і зноў ён быў майстар Мікіціч, якому няма калі разважаць і думаць ні пра сваю, ні пра чужую душу. Парыпваў, цёк канвеер...

Зноў яна механічна ўстаўляла ў кацёлку магнітаправод, а сама разблытвала і разблытвала свае думкі, як сапсаваную намотку, якую звычайна выкідваюць у брак. А думкі не выкінеш з галавы. Не выкінеш... «Іх не цікавіць... Ён так сказаў... А ці знаем мы самі, хто мы? Я — не знаю... Не знаю. І нічога зараз не зменіш. Ды ці варта? А ведаць? Навошта? Можа, няхай яно ўсё так, як ёсць. Не, ён не пра тое... Ён пра сваё... А я пра сваё. Йа клёша кі нё дор па... Божа мой, зноў блытаецца нейкая бязглуздзіца. Пэўна, заснула, не выключыўшы радыё, вось і ўбілася нейкая лухта ў галаву. Ды назольная...»

— Марыя! — Яна ўздрыгнула ад штуршка пад бок. Радасна павіскваючы, Ліпа паказала на табло. Зялёным па чорным, кроп'іста мільгалі літары. Яна прачытала: Манкевіч Алімпіяда.

— Гэта я, — уся свецячыся ад радасці, ускрыкнула Ліпа, нібы ніхто не ведаў, што гэта яна. І ўсе ўсміхаліся, гледзячы, як яна радуецца.

— Дзевачкі, я даўно зрабіла і ўсё паглядаю: калі я блісну? Думала, нізашто ён мяне не засвеціць, — смяялася, косячы вочы на майстра. — Марыя, праўда ён справядлівы?

— Хто? — не зразумела яна.

— Мікіціч. Марыя, чаму ты не выходзіш за яго? Я б на тваім месцы...

Марыя толькі ўсміхалася. Яна прывыкла да гэтых размоў. А жанчыны-зборшчыцы ўжо наваліліся на Ліпу са смешкамі.

— Ну, ты блiснула. Толькі ногі паказала — і бліснула.

— Дзевачкі, я ж старалася, працавала...

Росцік правёў позіркам Севу, які рвануў, як лось, на другі бок парку, здавалася, трашчала сучча. І сарока гучна і рыпліва засакатала, сарвалася з бярозы, гушканулася ў паветры і маляваным мультфільмаўскім самалёцікам з рэдзенька распёранымі крыламі, паляцела па сваіх сарочых справах. Росцік нічога не зразумеў: чаму трэба чакаць «хуткую», чаму яна павінна забраць бабулю. Нашто яе забіраць?

Тое, што яна сядзела на мураве пад дрэўцам, ніколечкі не бянтэжыла яго: стамілася і села.

Але што гэта за бабуля? Чыя? Чаму Сева прыпаручыў яе яму? А можа... Можа... Яму нават душна зрабілася: чаму ж ён яе не пазнае? Як жа так здарылася, што ён забыў яе?

Бабуля зірнула на яго і ўсміхнулася, вочы яе ажылі, паяснелі. Ён ведаў: яна абрадавалася яму. Яна заўсёды радавалася, згледзеўшы яго. Сумныя вочы яе ажывалі, спадаў туманок, нібы праціралі запацелыя вокны, разгіналася, выпроставалася шызая падкоўка рота.

— Сядзь воддзека во, — паказала яна рукою на траву, прымінаючы яе і разгладжваючы, — аддыхні, ножкі твае стаміліся. Ды пойдзем...

— Я не стаміўся.

— Я картоплі матычыла на гародзе. А ты пабег. Я ўвесь барок скаланула ля возера, дзяцей перапытала. Ажно ногі са страху ашэрхлі...

— Бабуля, а якое возера?

Росцік нічога не разумеў. Яна ніколі не казала пра возера.

Бабуля ўважліва ўгледзелася ў яго і раптам уздрыгнула, нібы абудзілася. Вочы яе разгубіліся, замітусіліся, бяскрылыя павекі падалі, падалі на вільготныя вочы, яна толькі паспявала іх падымаць, расплюшчваць.

А Росцік глядзеў на яе, усё больш і больш пазнаючы. І рукі яе сухія, са скручанымі, вузлаватымі, як галінкі, пальцамі, пазногці на іх сцёртыя глыбока-глыбока, толькі шызы паўмесячык на кожным. І валасы белыя-белыя, як пераспелы дзьмухавец. А галоўнае вочы — сумныя і добрыя-добрыя, ажно сэрца заходзіцца, нібы бачаць яны наскрозь, нібы ведаюць, чытаюць, што ён думае.

— Бяжы, маё дзіцятка, у школу, бяжы, — сказала яна сумна і цёмнымі, сухімі рукамі пагладзіла яго. І

4. Зак. 1058.

калі гладзіла, рука яе ўздрыгвала, як птушынае крыло. Зусім-зусім як некалі.

На твар яе наплыў цень, скамечыўшы яго, як сухі ліст. І дужка рота зламалася, кончыкі папаўзлі ўніз, абрысавалі востры глыбокі падбародак. Яна ледзьве разляпіла губы, глытнула паветра, каўтанула раз-другі, як вельмі гарачы чай.

— Яны прадалі маю хату, — гаротна сказала бабуля. — Я і столь пабяліла і печ...

Яна ўся нібы застыла, прыкрыўшы вочы.

А Росцік? Росцік адчуў, як чамусьці цяжка стала яму дыхаць, грудзі яго нібы нехта надзімаў гарачым паветрам, як валейбольны мяч, да болю. Ён засоп — ці то крык, ці то ўздых ірваўся з горла. Ён зразумеў, ён усё зразумеў, чаму яны ніколі больш не бываюць у бабулі. Яны таксама прадалі хату. На імгненне ён уявіў, як чалавек у чорных акулярах, у чорным плашчы адкрывае чамаданік — «дыпламат», паставіўшы яго на стол, поўны пачак грошай. І выкладвае, выкладвае іх, як пліткі шакаладу. А мама і тата... Не, мама і Сеўка хуценька складваюць іх у маміну дарожную сумку. Сеўка толькі паспявае лічыць... Адзін, два, тры... сто... дзвесце... трыста... Ён спяшаецца, лічыць, і галава яго ад напружання матаецца, як у запрэжанага каня, які адганяе заедзь. Як ён тады не здагадаўся? Іх не было два дні, потым яны прыехалі з вядром ягад. Толькі ў бабуліным лесе ёсць такія ягады чарніцы. Тата запытаў: «Ну як, згаварыліся?» Мама адказала: «На трыста». — «Аддай палову Марыі, яна твая сястра». Ён быў змрочны, курыў. «Яна адна, — сказала мама, — нашто ёй. А ў нас — сям'я. І мама жыла ў нас. Даволі і сто...»

«Мама, ты пра што?» — папытаў тады ён.

Яна не адказала, а раззлавалася: «Марш спаць!»

«Сеў, а, Сеў, — ужо лежачы ў пасцелі, папытаў ён. — Мы дзеравенскія?»

«Чаму ты парашыў?»

«Гэта Воўка сказаў. Калі ў нас там бабуля, то мы дзеравенскія. А ў яго дзед — мяснік, ён мяса ў магазіне сячэ. Воўка гаворыць, што гэта вельмі добра — быць мяснікoм...»

«Ну, і няхай становіцца мяснікoм, а мы будзем жыць скора ў космасе».

Але тады гэта не ўразіла Росціка. Гэта было несур'ёзна. Сева жартаваў. А калі гаварыў няпраўду, было

зусім не страшна. Бо з таго космасу можна было вярнуцца ў бабуліну хату...

— Бабуля, табе ўжо добра?

— Добра, добра, дзіцятка.

— Тады пойдзем дадому... Я тату пазваню... Ён прыедзе, калі табе стане дрэнна.

...Бабуля спала на сафе ў зале. Росцік чакаў, пакуль яна прачнецца. Ён і кніжку чытаў, і сам з сабою гуляў у шашкі, пакуль таксама не задрамаў проста на дыване, куды клала святло сонца. Можа, яно і змарыла яго, залашчыла цяплом, і ён задрамаў. Праз сон чуў трошкі прыцішаны і трывожны мамін голас.

— Алё, Марыя? Марыя, я не пазнала цябе па голасе. У вас шумна? На лініі... Хто падключыўся? Ніякі не магазін і не база! Пакладзіце трубку! Дайце пагаварыць! Марыя, ты мяне чуеш?.. Нехта замінае, кладзі трубку. Я перазваню. — Яна зноў засяроджана набірала лічбы. — Марыя, я страчу розум. Яны мяне даканаюць. Прыходзь сёння, я прашу цябе. — Яна маўчала, слухала, жмурыла тонкія, звівістыя бровы, яны нагадвалі двух чорненькіх лахмаценькіх вусеняў, якія то падпаўзалі, звіваючыся адзін да аднаго, то адскоквалі. — Не, не. Ты сама ўбачыш. Яны ўжо недзе знайшлі бабульку... Не, яна нічога не памятае. Доктара? Я не знаю сама, што рабіць. Трэба знайсці Андрэя. Міліцыю? Я пазваніла. Калі хто будзе шукаць... Канечне. А раптам... Ай, Марыя, я прашу цябе — прыходзь... Не, дома яго няма. Ды дзе-небудзь у парку з Вадзікам ці каля дома. Ты нешта ўтойваеш? Не, Марыя, я рахнуся, — памаўчала. — Як быць спакойнай? Як, скажы. На рабоце чорт ведае што. Я перасварылася з усімі. Я адна, разумееш, адна. Ды што табе расказваць. А сёння прыходжу... Ды не магазін гэта, не магазін? Пакладзіце, прашу вас, трубку. Марыя, тут нехта замінае. Пагаворым дома. Чакаю. Ды не база гэта! Во прывязаўся спекулянт нейкі. База яму, база... — Яна паклала трубку. Тэлефон прыціх. І яна сядзела нейкі момант самотная, аціхлая.

## 7

Марыя спынілася каля зачыненых дзвярэй у залу.

— Ціха, цётачка, яна спіць, — сказаў Росцік. Вочы яго свяціліся радасцю і трывогай.

— Я не пабуджу. Не бойся. — І Марыі чамусьці ста-

ла шкада яго, як шкада бывае пакрыўджаных або неразумных.

Яна паціху адчыніла дзверы і басанож (зняла басаножкі ля парога), мякка, па-кашэчаму ступаючы, прайшла ў залу.

На сафе, скурчыўшыся і ўткнуўшыся ў падушку, спала бабуля. Плечы яе былі ўкрыты пледам (мусіць, Росцік паклапаціўся), на квяцістай падушцы свяцілася воблачка адбеленых сівізною валасоў.

Марыя села ў крэсла насупраць, заціхла. Нешта ў гэтай бабулі было да шчымоты знаёмае. Гэты, нібы падсушаны, твар, сівенькія валасы. Спала яна ціха, расслаблена, як дрэва ў спёку. І толькі рэдкае дыханне, слабое і хліпкае, як глыбокі ўздых з задаўненым болем, трывожыла, прымушала прыслухоўвацца і чакаць, нібы ўздых гэты — апошні. Мяккі прыцемак пакоя сцярог яе сон, сцярог яго і Росцік. Ён сядзеў на лапіку палавічка перад дзвярыма, як шчанючок ля ганка, які ні кусацца, ні добра брахаць яшчэ не ўмее, але яму здаецца, што ён ахоўвае яго гаспадароў, а хутчэй за ўсё чакае, калі яны выйдуць, каб кінуцца клубком у ногі, качацца на спіне, дурэючы. Дурненькі і недарэчны шчанючок...

— Цётачка, ты пабудзіш яе? — гаварыў ён асцярожлівым шэптам.

Сам у пакой не заходзіў, сядзеў у прыхожай. У квадраце святла Марыя зноў бачыла яго вочы, заклапочаныя, насцярожаныя, нібы нехта ў малога нешта хацеўададабраць, і ён падрыхтаваўся абараняцца. Марыя ўлавіла сумны позірк сястры. У твары яе быў сум, затоена-жаллівы сум, які, Марыя ведала, копіцца, збіраецца па кроплі, каб залегчы ў грудзях мукай, а можа, яна ўжо і ляжала там, а цяпер, тоячыся, выглядвала. Алена, мусіць, заўважыла, што муку яе ўбачыла сястра, страпянулася і таропка пайшла на кухню, быццам там, падымаючы белы грэбень, выкіпвала малако. Марыя ўстала, яшчэ раз зірнула на бабулю, пачула яе дрыготкі ўздых. Так уздыхае ў сне, наплакаўшыся, пакрыўджанае дзіця. Нясцерпны жаль пранізаў яе грудзі. Выходзіла з пакоя, атухлы яе позірк зноў сустрэўся з Росцікавым, таксама прытушаным і пакорлівым. І яна, шкадуючы яго і нібы жадаючы супакоіць, дакранулася рукою чупрынкі, пагладзіла. А вочы яго ўжо радасна пыталі: «Ну што, бачыла, хто ў нас ёсць?» Яна ўздыхнула, пазіраючы і шкадуючы яго, і ён нешта западозрыў, але гэта быў нейкі

несвядомы прамільг, быццам праляцеў матылёк — каляровы махаон, а ён убачыў толькі яго цень.

Марыя ціха зачыніла дзверы, узяла яго за руку, павяла за сабою. І Росцік паслухмяна пайшоў у суседні пакой, дзе яны спяць з Севам. І адно, што яму пагражала, гэта сон. Але так рана ён ніколі не клаўся, і таму гэта яго не страшыла. Яшчэ і Сева гуляе на вуліцы. А яму сёння няможна.

Яна пасадзіла яго перад сабою і, уздыхнуўшы, так ёй было цяжка гэта гаварыць, сумна сказала:

— Росцік, гэта не наша бабуля. Разумееш, не наша-а...

І голас і позірк яе былі сумныя, Росцік прачытаў у іх пакуту, але зразумеў па-свойму: яна таксама хоча, каб бабуля знайшлася. І ён, што было вельмі дзіўна, паверыў ёй, але на твары адбіўся такі жах, быццам на яго вачах рушыўся дом або падала з бярозы шпакоўня з птушанятамі.

— А дзе ж наша? — роспачна і нават слёзна папытаў.

І яна зноў не змагла сказаць яму праўды.

«Смерць. Што ён ведае пра смерць? І ці трэба яму ведаць?»

Яна баялася яго нерваваць, баялася яго плачу, яго крыку, яго слёз. І таму сказала супакойліва і перакананальна:

— Жыве ў вёсцы. Хіба ты не ведаеш?

— Але чаму мы не едзем туды?

— Нам не даюць пакуль што адпачынку. Вось і не едзем. А за гэтай бабуляй скора нехта прыедзе ці прыйдзе. Ты помніш, як наша бабуля была згубілася, ты плакаў, а мы ўсе яе шукалі. І гэтую бабулю нехта, мусіць, шукае і плача. Можа, хлопчык такі, як ты...

Яна пазірала яму ў вочы, бачыла ў іх спагаду і жаль. Але не доўга. Скора бліснула ў іх ці то хітрынка, ці то здагадка, вочы звузіліся. Здаецца, ён нешта ведаў пра таго хлопчыка.

— Ён не хоча хадзіць у садзік ці ў школу: хоча жыць у бабулі ў вёсцы.

— Напэўна, — пацвердзіла яна.

— Яму хіба не сказалі, што бабулін дом прадалі? Яна мне ўсё расказала. Яны прадалі яе дом. Яна столь пабяліла і печ. І думала там паміраць. А яны ўзялі і прадалі яе дом. І цяпер ёй нават памерці няма дзе.

Калі мы прыйшлі, яна сказала: «Я лягу, дзіцятка. Ты мяне не трывож, а калі я памру — не пужайся. Я проста засну, і ўсё...»

Марыя адчувала, як выпаўзае з-пад яе ног зямля, дыбіцца гарбом. Нешта жахлівае гаварыла гэтае дзіця, гаварыла, не разумеючы, якая жорсткая рэальнасць злятае з яго губ, як яна халодзіць нутро, прымушае трымцець сэрца.

— Вы таксама прадалі бабуліну хату. Я знаю.

Яна нічога не магла сказаць яму, запярэчыць, апраўдацца, толькі глядзела на яго, нібы бачыла ўпершыню, і бязглуздзіца зноў, як рыба ў цесным вядры, перакульвалася ў галаве: «Додо, фэ додо... додо, фэ додо», нібы гэта азначала: маўчы, маўчы, навошта ты так.

Алена парушыла іх маўчанне, зазірнуўшы ў пакой.

— Росцік, а дзе ж Сева? — папытала яна, і голас быў прыцішаны. Відаць, таксама баялася патрывожыць бабулю.

— Сева сказаў, што пойдзе ў бібліятэку, а можа, ён у лесе з Венікам. Сева баіцца, што бабуля раптам сапраўды памрэ, вось і не ідзе.

Аленіны вочы пачалі шырока адкрывацца, яна нават пабялела. Глянула на Марыю, нібы шукала ў яе падтрымкі і парады, прасіла растлумачыць, што ўсё гэта азначае. Яна ўтаропілася на Росціка.

— Ідзі і зараз жа яго пазаві! — скамандавала. — Няхай прыходзіць. Тэрмінова.

Росцік насцярожана зірнуў на дзверы.

— Ідзі, ідзі, — сказала мама. — Бабуля будзе спаць.

— А калі ён не пойдзе? — Росцік марудзіў.

— Тады скажы яму, што ён няшчасны баязлівец!

Сева сапраўды баязлівец. Ён збаяўся...

## 8

Ісці дадому яму не хацелася. Ён ведаў наперад усё, што яны будуць гаварыць, і цётачка, і маці... Але бацька? Чамусьці тое, што мог бацька сказаць, цяжка было прадбачыць. Але Сева заўсёды болей спадзяваўся на яго. Бацька ў любых умовах мог зразумець і абараніць. Наогул, кожны чалавек можа абараніць другога, калі толькі захоча. Так, калі захоча... А раптам?

Сева сядзеў на лаўцы ў парку, неяк абыякава праглядваў старонкі кнігі. І прачытанае, і тое, пра што ён думаў, перамешвалася ў нейкую дзіўную неразбярыху.

«Войскі саюзнікаў зноў занялі Парыж. (А як жа цётачка Марыя? Шкада, што не пабачыў яе.) Напалеон зноў спешна адрокся ад прастола і хацеў падацца ў Амерыку. (Здаўся мне яго цэх. Вадзік вунь і не думае працаваць, усё адно — у армію.) Але берагі Францыі былі блакіраваны англійскай эскадрай, і ён быў вымушаны здацца англічанам. (Не, усё-такі трэба пагаварыць з ёю, каб толькі не расказала мацеры. Яна, мусіць, ужо дома, разбіраецца з Росцікам і бабуляй. Трэба было самому дачакацца «хуткую», усё адно спазніўся...) Англійскі ўрад са згоды саюзнікаў выслаў Напалеона на востраў Святой Алены. (Няўжо гэта цётачка Марыя ідзе. Відаць, да нас, маці пазваніла. Спяшаецца. Зараз паклічу, няхай прысядзе. Трэба ж пагаварыць... Толькі не адразу. Можа, прачытаць ёй што-небудзь. Яна любіць...)» І ён, калі яна прыпынілася і села, перачытаў ёй гэты абзац пра Напалеона.

Цётка Марыя прыкрыла вочы, нібы цярпліва чакала канца гэтай напалеонаўскай эпапеі.

— Хвала богу, з Напалеонам парошана. І давай пакінем яго ў спакоі. А цяпер, мілы мой, слухай мяне. Я гаварыла з Пятром Аляксеевічам...

— Хто такі?

Нейкі час яна пазірала на яго здзіўлена, недаверліва, нібы сарамаціла, пазірала, як на несамавітага.

— Цётачка, слова даю, не ведаю, — сказаў ён шчыра.

— Вось бачыш, Напалеонаў ты ведаеш. А майстра Мікіціча!.. — яна ажно павысіла голас, што здаралася рэдка.

Памаўчала, нібы глытала крыўду, і сінія вочы яе пацямнелі, як неба перад навальніцаю.

— Ну, адкуль жа? Ад вас толькі і чуеш: майстар Мікіціч, участак Мікіціча. І вы ж самі яго завеце Мікіціч, Мікіціч! Я першы раз чую, што ён Пятро Аляксеевіч.

— Табе, мой мілы, справы няма, як я яго заву! — усердзілася Марыя. — Я...

У душы, канечне, Сева шкадаваў, што так адбылося, але і сябе не лічыў вінаватым: не сам жа ён кінуў работу — майстар Мікіціч «турнуў» яго. О, як ён захлынуўся ад злосці! Ніколі Сева не бачыў яго такім... А яны ўсе ў адно — майстар Мікіціч, дабрэнны чалавек, душэўны.

Злыдзень ён, злыдзень! Так ён ім і скажа. Падумаеш, спазніўся крышку. Ён бы за змену гэтымі кацёлкамі ўвесь цэх заваліў. Усе праходы. Хай бы палазіў. Шкада, што пайшоў — трэба было так і зрабіць. Але цяпер позна. Як ён шкадаваў, што не зрабіў гэтак. Няхай бы ведаў.

— Цётачка, абарані мяне, яны ж мяне склююць. Склююць, як куры зерне, вось пабачыш, — пажаліўся, і невядома было, гаворыць ён сур'ёзна ці жартуе.

— Мілы мой, — сказала Марыя, — ты ўжо дарослы чалавек. А паводзіш сябе, як дзіця. Кожны чалавек павінен мець мэту ў жыцці і яе дабівацца.

Сева слухаў цётачку, а сам усё пазіраў у кнігу.

— Ды адкладзі ты гэтага Напалеона, — раздражнёна сказала яна. — Табе ўжо сніцца гэты Напалеон!

— Не ён мне сніцца, а вашы трансфарматары. Слухай, цётачка. Нядаўна сню... Быццам Напалеон прэ на нас. На вялізным полі выстраіліся палкі. Чую — ідзе пераклічка. Трыста дваццаты... трыста дваццаць другі... трыста трыццаць шосты...

Яна засмяялася, закінуўшы ўгору галаву з гладка зачэсанымі на прабор валасамі. Сева пачакаў, пакуль яна супакоіцца.

— Слухайце, яшчэ не ўсё. Потым нехта як гаркне: «Дзе трыста дваццаць першы?» І голас нейкі знаёмы. Глянуў я, а гэта майстар Мікіціч.

У цёткі Марыі ад смеху аж слёзы выпырснулі з вачэй, але яна стрымалася, пасур'ёзнела.

— Сягоння, дарэчы, не было кацёлак трыста дваццаць першага, і мы паўдня прастаялі...

— Ды пачакайце ж вы, цётачка, не дагаварыў... — спыніў яе Сева. — А Напалеон — такі маленькі, плюгавенькі — падбягае да Мікіціча і нешта крычыць яму пісклявым голасам. А Мікіціч — на яго грамавым сваім голасам: «Ды кацíся ты на востраў Святой Алены, і каб духу твайго не было». І націснуў чырвоную кнопку «пуск».

— Спадзяюся, цябе ён паслаў трохі бліжэй? — папытала цётка.

Тон яе быў не сказаць каб занадта сур'ёзны, але былі ў ім ноткі незадавальнення, патухлі агеньчыкі ў вачах, і яны сталі халодныя, шэрыя.

— Мяне? Мяне паслаў да чортавай бабулі, — крышку фрывольна адказаў ён.

— Мілы мой, ты ўсё-такі павінен папрасіць прабачэння ў Пятра Аляксеевіча, — настойвала цётка.

— За што, цётачка?! — Сева ўскінуў галаву, як знянацку падхліснуты жарэбчык. — Гэта ён, ён мяне выгнаў!

— Ну, ты таксама добры. Цаца гэткая. Разводзіш антымонію...

Цётачка Марыя занервавалася, ажно пасінелі яе вочы. Здавалася, іх сінява асляпіць яго.

— Севачка, ты зразумей, — даводзіла яна, — ён чалавек сур'ёзны, заняты. І любіць сур'ёзных людзей. Ты ж спазняешся і, замест таго каб папрасіцца, пляцеш яму ўсялякую лухту пра жаўранкаў і соў, нейкія свае тэорыі пра засяленне зямлі, выдумляеш нейкіх бабулек.

— Цё-ё... — узмаліўся ён. — Ды нічога я не выдумляў. Слухайце... Ну, можаце вы паслухаць чалавека ці не? Яна выйшла з аўтобуса і села пад клёнам на газон. І бачу я — якраз як наша бабуля. Нават дзіва. А яна хіліцца, хіліцца. Валосікі беленькія ветрык трэпле. Такі беленькі адуванчык...

Цётка занервавалася. І ён гэта адчуў, хацеў супакоіць.

— Ну, цё-ё... копія — наша бабуля. Сівенькая ўся, кволая. І, відаць, ёй дрэнна. Я — да яе, і людзі падышлі. Пытаюць: хто яна і адкуль, дзе жыве. А яна нічога не ведае. Разумееш, зусім не ведае, як дзіця.

Чаму яна маўчыць? Нервуецца, шукае, шукае ў сумачцы нейкую таблетку, можа, насоўку, бо вочы завадзянелі.

Севу шкада цёткі. Ён разгубіўся, не ведаючы, як суцешыць яе: куды падзелася яго самаўпэўненасць.

— Цётачка, ну што з табою? Чаго ты такая сумная? Цётачка? Ну хочаш, я папрашу прабачэння ў твайго Мікіціча...

— Хіба ён мой? Ён не мой.

— Наш? У нашага Мікіціча. Пайду і папрашу. Толькі ведай, што я не вінаваты. Гэта ён мяне турнуў. І бабулю я не прыдумаў. Прывёў яе Росцік. Я ж спяшаўся...

— Ты маніш сабе. Ты заўсёды шукаеш сабе апраўданне.

— Цётачка, ты правільна сказала. Я сам здагадваўся, а сказаць не змог. Часта ў мяне так — адчуваю, а выказаць не магу.

— Гэта ад таго, што ты яшчэ... — яна, як звычайна, хацела сказаць знаёмае яму — малы, але, зірнуўшы ў яго насмешлівыя вочы, прамовіла, — мала ведаеш жыццё. Вось што ты ведаеш пра мяне? — нечакана запытала яна.

Сева зірнуў на яе адкрыта, цёпла, здавалася, гэтае пытанне яго ніколькі не здзівіла, не паставіла ў тупік. І ён сказаў, як даўно і лёгка засвоены ўрок:

— Ты — добрая, справядлівая, не ўмееш крыўдзіцца, любіш усім дапамагаць, — ён крышку задумаўся. — Ага, любіш слухаць музыку і дарыць пласцінкі, яшчэ — прыгожая...

Яна ўсміхнулася:

— Была. Але ўсё, што ты нагаварыў, так і не так. Не ў гэтым соль.

— І памятаеш, у нас з табою заўсёды былі тайны, — напомніў ён.

Нейкі час яны маўчалі. Загаварыў Сева:

— Цётачка, ты ўмееш захоўваць тайну. Я магу табе даверыць сваю?

— Канечне.

— Цётачка, я не знаю, хто я і да чаго здатны. Мне проста трэба разабрацца. Я прашу цябе, давядзі гэта ім. Дапамажы мне. А цяпер — самы патаемны мой сакрэт. Толькі не лічы мяне чокнутым, як Вадзік. Ён гаворыць, што гэта нейкі заскок. А ты — зразумееш. Я вывучаю гісторыю. Не проста гісторыю... Войны. Катастрофы. Бедствы. Колькі існуе жыццё — людзі ваююць, захопліваюць землі, ратуюцца ад землятрусаў і паводак, проста вандруюць з месца на месца. Так было стагоддзі. І хто цяпер можа сказаць, хто ён. Войны параскідалі людзей па зямлі... (Вось і гэта пісьмо... Не, лепш не гаварыць ёй пра пісьмо, бо невядома, хто яго і каму напісаў.) І толькі па сонцу кожны можа знайсці сваё месца на зямлі. Ты ўсміхнулася, нешта не так я гавару? Ты не прымаеш маю тэорыю?

— Не, мусіць, усё гэта так... Нас параскідала па свеце вайна...

Яна ўздыхнула. Стала сур'ёзнай. Не, яна не пасміхалася над ім. Яна ўсё разумела.

— Я ж у цябе толькі што пытала: што ты знаеш пра мяне? Што ты ведаеш пра нас? І ты не спяшайся вывучаць чалавецтва. Ты пачні з нас, з тых, хто вакол цябе. Калі ты зразумееш, даведаешся, хто мы, — тады інакш

будзеш пазіраць на свет. Хочаш, я нешта табе раскажу. Але не цяпер. Счакай крышку. Трэба ж нешта рабіць з бабуляй. Там і маці хвалюецца, а мы сядзім, разважаем.

— Цётачка, я крышку тут пабуду. А цябе прашу: не кажы ім пакуль што пра Мікіціча. Ты ж умееш захоўваць тайны.

Яна толькі ўсміхнулася.

— Не баўся. І табе трэба збірацца: можа, паедзеш у калгас. Я пагавару з Мікіцічам, — сказала. І пайшла.

## 9

Алена піла чай. Кубак у яе руцэ ўздрыгваў, і пара над ім вілася лёгкім дымком. Алена дзьмула на гэты дымок, а па шчоках паўзлі і паўзлі слёзы.

— Садзіся, — сказала яна Марыі, паказала на кубак, дзе дыміўся, астываючы, чай.

Марыя глянула на сястру і, перш чым сесці, адчыніла шафку буфета (яна ведала тут усё), дастала бутэлечку з валяр'янкай, накапала ў мензурку.

— Пакуль што не бачу прычыны, каб так нервавацца, — сказала, падаючы яе Алене.

— Проста стамілася я, Марыя. І вось гэта яшчэ. Не знаю, што мне заўтра рабіць... Я павінна выйсці на работу. Мяне не зразумеюць. Ды і як раскажаш... — Яна пасядзела задумліва. — Лухта нейкая... І ў той жа час...

— Супакойся. Да заўтра яшчэ многа часу.

— Адчыні дзверы, — сказала Алена, — раптам нехта будзе званіць, а мы не пачуем. Павінен жа яе нехта шукаць.

Бледны, панылы Аленін твар, здаецца, выцягнуўся.

— Перакусіла б чаго. Я табе бутэрброд намажу, — сказала Марыя — нібы яна, а не Алена, была тут гаспадыня.

Алена сцерла ручніком слёзы са шчок.

— Што там у Севы? — папытала.

— Ды нічога... — ухільна адказала Марыя. — Спазніўся сёння. Ну, і Мікіціч пагарачыўся. Нічога, усё наладзіцца. Я пагаварыла з ім. Ён жа не твой Вішнякоў, зразумее.

— Ага, ён як толькі прыйшоў... Ведаеш, мужчына. Мужчын ніколі не цікавіць нічога. Гэта толькі жанчынам усё трэба: яны выстройваюцца ў чэргі, бягуць, усё хапаюць... Усё ім трэба — гэтым жанчынам... Сказаў нам: «Я разумею, вы жанчыны. Але мяне не цікавіць, што там у вас дома — дзеці ці чэрці. Мяне гэта не цікавіць. Мяне цікавіць толькі работа. Зразумелі? І каб на рабоце ніякіх размоў пра дзяцей». Мужыкі, тыя заківалі галовамі, як коні, а мы, бабы, раты паразяўлялі. Але ні адна і слова не вымавіла. Мову адняло. Сядзім цяпер, маўчым. З аднаго боку, гэта і добра. Яны хоць чужых дзяцей не абмываюць. А то аднойчы чую: «Што гэта ў яе за дзіця, усяго баіцца. Ненармальнае, мусіць».

Яна памаўчала, потым азвалася зноў:

— Марыя, а я разумею, у ім мой страх. Затоены, як чарапашка пад панцырам. Я напаіла яго гэтым з малаком сваім... Я помню яго, ліпучы, слізкі, як вужака завіваецца на шыі, ссе, высмоктвае грудзі, ажно млеюць, падкошваюцца ногі, — яна закрыла вочы, узяла галаву ў рукі. — Помніш, мама гаварыла: «Забудзь, забудзь, дзеткі, усё забудзь, за трыма горамі, за трыма морамі няхай застанецца, вятрамі сухімі развеецца, мохам-травою парасце... Забудзь, дзеткі, забудзь...» Помніш, яна клала нас спаць і замест калыханкі паўтарала... Марыя, чаму яна ніколі не спявала? Толькі шаптала... І гэты яе дрогкі шэпт з рэдкім, як усхліп, дыханнем, нібы вяртае мяне да жыцця...

Алена закрыла далонямі твар, нейкі час сядзела, уздрыгваючы.

Марыя моўчкі ўстала, накапала сабе валяр'янкі.

— Толькі гэта не забылася, а залягло недзе глыбока, нячутнае і невідочнае, і перадалося яму...

— Алена, ну што ты гаворыш. Росцік цудоўны, цікавы хлапчук. Мне здаецца, што ўсе мы проста няправільна сябе з ім паводзім. Усё цягнем яго ў нейкую казку, аберагаем залішне. І мы нядобра зрабілі, што адправілі іх, калі хавалі маму...

— А я думаю часта: каб мы не забралі яе адтуль, з вёскі, яна яшчэ пажыла б трохі.

Марыя з дакорам пазірала на сястру.

— Глупства ты гаворыш. А хто б там яе дагледаў? Проста хвароба, старасць...

— Не, Марыя. Яна засумавала... Корань вырві з зямлі, і ён сохне. Так і яна... Корань, вырваны з зямлі.

Памаўчалі.

Раптам Алена падхапілася, ірванулася ў прыхожую.

— Мне здалося, званіў тэлефон, — сказала, заходзячы зноў на кухню. Села на сваё месца.

— Што ж няма доўга Андрэя? — папытала Марыя.

— Званіў... Заедзе. У яго ў нашым раёне ёсць выклікі.

— А як у цябе на рабоце?

— Усё тое ж. Але, здаецца, я перамагла. — Радасць на нейкі час асвяціла яе твар. — Але бачыш, як мне не шанцуе... Яны без мяне ўсё перакруцяць.

— Ды перастань ты. Заўтра пойдзеш... А скажы, Вішнякоў — гэта такі чарнявы. Ён жа, здаецца, з табою вучыўся. Тады ў Сібір паехаў...

— Канечне, ён. Помніш, у цябе начаваў, калі я была ў Кіеве на аперацыі.

— Ага, ён тады ўвесь вечар пытаўся пра цябе. Я не сказала, што табе будуць рабіць аперацыю. Можа, баялася ўракнуць. Я падумала...

— Яму проста не было дзе начаваць. Мусіць, месцаў у гасцініцы не было.

— Я тады схлусіла, што ў мяне начная змена. А сама пераначавала ў прыяцелькі. Ён, мне здалося, разумны хлопец быў.

— Не, Марыя, я яго ведаю лепш. Праўда, не скажу, што дасканала. Але было ў ім штосьці, што адпужвала. Як бы што ўтойваў. Ці хацеў быць не такім, як быў.

— Гэта праходзіць.

— Не скажы...

— А як з тваёю тою прапановаю?

— А-а-а. Вішнякоў не можа выйсці з ёю «наверх». Там трэба будзе сказаць, што «інжынер такая-та прапануе...». А ён гэтага сказаць не можа, у яго годнасць і гордасць не дазваляюць. Вось калі б можна было сказаць: «Я».

Алена заірдзелася, вочы яе гарэлі мігатлівым зялёным святлом. Усхваляваная, яна заўсёды прыгажэла (наогул, расхваляваны чалавек заўсёды прыгажэй за таго, хто абыякавы і посны, як сухі ліст. Але не ўсякі. Злы ашчэрваецца, робіцца агідны. А добры прыгажэе). Марыя ажно залюбавалася ёю.

— Марыя, чаму ніхто не звоніць? Няўжо яе ніхто не будзе шукаць? І наогул, чаго мы сядзім? Трэба ж

нешта рабіць. Я пазваню ў міліцыю, папытаю, можа, хто хапіўся старой. І дзеці недзе загуляліся.

— Я іх клікну, а ты займайся вячэрай. Скора Андрэй прыйдзе. Чым будзеш карміць мужа?

— Марыя, а ты помніш Шалевіча?

— Ну, даўся ён табе. Знайшла каго ўспамінаць.

Алена нічога ёй не сказала. Каб усё было так проста... Каб было так...

«Што ж гэта са мною? Што? Чаму няма радасці ў жыцці? Чаму я думаю пра яго? Чаго ён другі дзень стаіць як паставы ля інстытута? І чаму я не магу спакойна, як чужога чалавека, абмінуць яго? Што са мною, чаго так ные сэрца, чаго я хвалююся? Чаго баюся? Усё прайшло! Прайшло! Ды і нічога не было. Нічога... Проста цвіў відук...» Маці яго не вырывала, і ён зацвітаў кожнае лета. Паспее, будзе забаўка дзецям. Дзеці выраслі, пакінулі дом, а мак узыходзіў кожнае вясны, а летам — аднойчы, нечакана, ураз — прачыналіся раніцой кветкі: белыя, ружовыя, чырвоныя банты кружыліся ў карагодзе, трапяталі матылямі над зялёным бульбоўнікам. Але ў тое лета яна, здаецца, упершыню заўважыла гэта хараство: гэты бела-ружовы баль, сярод якога і сама была лёгкай — кружылася, здаецца, не датыкаючыся зямлі, у чароўным карагодзе. Як хораша было наўкола! Як кружылася галава! Але ведала: скора відук абтрасе ад пялёсткаў макаўкі і, нібы людскі натоўп, будзе ціхенька, як бы асуджальна, пахітваць галовамі, бы нечаму здзіўляючыся.

«Не, проста цвіў відук. Кароткае яго цвіценне.

Чаму ж так па-здрадніцку паводзіць сябе сэрца? Чаму трывожыцца і ные? Госпадзі, а можа, яму дрэнна, адзінотна? Няма горай чалавеку, як адзінота. Можа, яму трэба нешта расказаць, параіцца, падзяліцца. Я ж таксама ў нечым вінавата. У нечым... Ён жа быў заўсёды шчыры. Пісаў пра ўсё, што думае, пра што марыць. У яго ўсё было рамантычна, узнёсла...»

У яе проста. «Мама ўвесь час на рабоце, а мы — адны. Раслі як трава. Як усе дзеці пасля вайны. Усё было наша: і лес, і поле, і балота. А я ўпала з гушкалкі. Высока ляцела, аж дух захапіла, а яна выслізнула з-пад ног. Выцялася. Вось цяпер назаўсёды мечаная», — напісала яна неяк пра сябе.

«Не гаруй, Алена, мы прыдумаем табе якую-небудзь рамантычную гісторыю», — адказаў ён.

Не, ёй не хацелася прыдумляць ніякіх гісторый, яна была ўся з адной праўды. Часам жорсткай, але праўды. I гэта было ўсё яе — і боль, і жыццё. Пэўна, тады яна думала, што завяла яго ў той тупік рамантыка, характар. Ён быў у глыбокай прастрацыі. А ў прастрацыі і пад машыну трапіш, не толькі... Колькі яна перадумала пра гэта.

«Тады ў мяне было апраўданне: яго трэба ратаваць, а можа, яе? I так, і гэтак я апраўдвала сябе. Але...»

...*Ён* прыйшоў нечакана. Позна. Яна ўжо лягла спаць. Адчыніла Марыя. У кватэру ён не зайшоў, толькі папрасіў паклікаць Алену: трэба, маўляў, пагаварыць. Ён быў заклапочаны. Дзе падзелася весялосць: вочы атухлыя, позірк — долу. Светлы касцюм прымяты, крышку неахайны: ведама, чалавек з дарогі, ачужалы, а не так даўно і бачыліся. Нават рукі не падаў. Стаяў на лесвічнай пляцоўцы ля акна, пазіраў у густую, ужо начную цемнату.

«Ты мяне зразумееш, — сказаў неяк трагічна, як акцёр у меладраме, — я ведаю, ты ўсё зразумееш...»

Гэта цяпер усплыло такое параўнанне, а тады яна адчула, як бухнула ў грудзях сэрца, зачасціла, налілося трывогай. «Ты адна мне можаш дапамагчы». Было такое ўяўленне, што ён гаворыць сам з сабою ў цёмную ноч, як у бездань сваіх думак. Але яна была побач, яна стаяла, накінуўшы паверх начной сарочкі Марыін халат. Тое, што трапіла пад рукі. Без прычоскі. Такую ён яе ніколі не бачыў: мог бы хоць здзівіцца, разгледзець. Але ён яе не бачыў.

«Калі змагу», — ціха сказала яна, не ведаючы, якіх ахвяр ад яе ён запатрабуе. Раптам скажа... Увогуле, думалася зусім другое. Што цяпер пра тое...

«Разумееш, мне трэба грошы... На білет. Я павінен яе адправіць...»

«Каго, куды?» — не могучы ачомацца, як пасля дурнога сну, папытала Алена.

I ён блытана, дзе падзелася красамоўства, нейкай каравай, калдобістай мовай расказаў, што паехаў у камандзіроўку, ну і зайшоў да даўніх знаёмых — яны некалі жылі ў Дубраве. «Кірэевы, можа, помніш? Потым пераехалі ў Варонеж». Чужы горад, у гасцініцу не ўбіцца. Пераначаваў, потым бацькі ўвапхнулі яму ў

рукі яе. Завуць яе Люда. Не, ён не можа паехаць з ёю дадому. Не можа! Гэта неверагодна!

Здавалася, што ён толькі нядаўна працвярэзіўся. А можа, яно так і было.

Алена не думала ні пра што, неяк адразу наўкруг стала пуста. Проста хацелася, каб ён хутчэй пайшоў. Ці пайсці самой. Яна, не сказаўшы ні слова: чакаць не чакаць, — ляпнула дзвярыма. Узяла грошы, усе, што былі, здаецца, восемдзесят рублёў. Выйшла, працягнула... Як бліснулі, ажылі яго вочы.

«Вось, — сказала. — І больш, калі ласка, ніколі сюды не прыходзь».

Адчула, як успыхнула яе нутро, загарэлася і доўга, доўга гарэла — дні, ночы, месяцы, — пакуль не выгарала датла, як маланкай выпаленае дрэва.

І тады, і пасля, і нават цяпер яна думала: навошта дала яму грошы? Можа, ён скарыўся б і ўсё ў іх наладзілася. І заўсёды бачылася ёй сумная, заплаканая... — увогуле, бачылася па-рознаму, то зусім няшчасная, то нават радасная, што развязала рукі, — дзяўчына. І Алена суцяшала сябе, што толькі дзеля яе яна гэтак зрабіла. Была ўпэўнена, ды яно, відаць, так і было, што ён ведаў яе раней. І што ніякай камандзіроўкі не было: проста паехаў, захацелася пабачыць, як кажуць, прыцаніцца, можа, разабрацца ў сабе, ну, а бацькам што — выдаць нявесту, калі жаніх з'явіўся ў хату.

Колькі тады пісем ён прыслаў! Колькі ў іх было красамоўства, колькі лірыкі... І ні разу: а як жа жывеш ты? Толькі тут ёй адкрылася, што ніколі ён не задаваў такіх пытанняў і раней. Для яго існаваў толькі ён сам, адзіны, вырАтаваны ад сямейных пут, вольны і шчаслівы.

Алена ж старалася меней думаць пра яго.

Вечарамі пасля работы чамусьці вельмі стала балець нага.

Заплюшчвала вочы, і густы вецер, якому, здаецца, толькі што ляцела насустрач, займаў дыханне, зялёны выган дыбіўся пагоркамі, накочвала хвалямі збажына з-за нізкіх хат, што патанулі ў ёй, як у моры, і яна ляцела над зямлёю. Толькі раптам усё абрывалася, гушкалка выслізгвала з-пад ног. Шчаку калоў (нібы нехта пачварны, няголены) пучок скошанага трыснягу. А зямля, зялёная з жытнёвай хваляй і пагоркамі, усё яшчэ плыла ўваччу, толькі чамусьці ў шэрым, мітуслівым

тумане, то патанаючы, то ўсплываючы. Каленка тады не балела... Гэта потым зрабілася балюча ступаць, і яна — ідзе, ідзе, а потым, як бусляня, стане на адной назе, пастаіць, адпачне. Так вось прывыкла і дарослая — прыпыніцца, пастаіць на адной назе. Дасць роздых другой...

Напісала тады (адразу ж пасля іх апошняй сустрэчы) пісьмо прафесару ў Кіеўскі інстытут артапедыі, прафесару, пра якога даўно вычытала ў газеце, але пісаць не пісала, здавалася, не было патрэбы, а цяпер ёй трэба было, абавязкова, неадкладна пазбавіцца сваёй меткі. Прафесар аказаўся чулы да чужое бяды. І, здаецца, усё разумеў без слоў. Хаця яна на адзіноце напісала ўсё пра сябе, пра маці, якая з цямна да цямна працавала ў калгасе, пра іх, дзяцей, што раслі, як трава пад сонцам і дажджамі. Пра гушкалку на выгане, пра тое, што нага спачатку не балела, потым, калі ўжо не магла ступіць, маці несла яе дзесяцігадовую на руках дваццаць вёрст да станцыі. Павезла да брата свайго, палкоўніка, у Ленінград. Ён ужо дамовіўся быў пакласці пляменніцу ў ваенны шпіталь, але палкоўнічыха, жонка дзядзькі, запратэставала: «Пакідаць дзіця, хто ж будзе яго адведваць? Не, не! Вязіце дадому. Там таксама ёсць бальніцы, урачы...» А некаторыя палкоўнікі толькі на рабоце ў чыне, а дома — як разжалаваныя, і рэкнуць не смеюць. Усё пад казырок... жонкам. І павезла яе маці — дзе павезла, дзе панесла са слязьмі — зноў у сваю вёску. Праўда, калгаснае кіраўніцтва і райана паклапаціліся, і яе, пасля лячэння ў раённай бальніцы, накіравалі ў санаторый у Ялту. Там яна прабыла больш года. Боль утаймаваўся, заціх, але хвароба заціснула каленку так, што яна знерухомела, як сутык на жытняй сцябліне. Напісала прафесару і пра тое, што скончыла на «выдатна» інстытут і працуе інжынерам.

...Яна сядзела перад ім... І прафесар, — уяўляла яго чамусьці сівабародым, у акулярах, а ён круглавіды, дабрадушны, сярэдніх гадоў мужчына, з коратка падстрыжанымі, пасыпанымі сівізной валасамі, — пазіраў на яе сумна...

І яна ўся трымцела нутром, як лісток таполі, чакаючы яго рашэння.

«Вы не перадумалі?» — мякка спытаў прафесар, нібы чакаючы, што яна так і зробіць — перадумае. «Аперацыі такога роду мы толькі пачынаем рабіць. І раз на

раз не прыходзіцца... Будзе балюча... Магчыма, і пасля... Цяпер вы ходзіце нармальна. А можа быць нават горш, — ён развёў рукамі. — А боль заўсёды адлюстроўваецца на твары. А твар ваш прыгожы і чысты. Вы не замужам...» — не запытаў, а быццам стаў здагадвацца ён, выстройваючы нейкую сваю лінію яе паводзін.

Яна хітнула адмоўна галавою, не могучы сказаць яму здаўленым горлам нават кароткае, як выдых, «не». Усё рушылася, рушылася, як пясчаны дом.

«Зразумела. — Ён быццам зноў пацвердзіў сваю думку. — Добра! Я зраблю ўсё магчымае...»

З клінікі, дзе яна ляжала ў чаканні аперацыі, напісала да маці: «Мама, гэтыя месяцы я не змагу табе пасылаць грошай. А калі ў цябе будзе нявыкрутка і спатрэбяцца, будзеш у раёне, зайдзі... — яна напісала адрас Шалевіча, — ён мне вінаваты...»

...«Госпадзі, што я ўспамінаю? Навошта? Быццам іншага клопату няма».

Яна заглянула ў залу. Старэнькая ляжала выпрастаўшыся, скрыжаваўшы рукі на грудзях. Алена ажно пахаладзела. «І Андрэя доўга няма. Хоць бы паглядзеў, паслухаў сэрца. Яна, мусіць...» — ёй чамусьці стала страшна.

Дрыжачай рукою набрала нумар «Хуткай дапамогі».

— Клаўдзія Пятроўна, добры вечар. — Голас падрогваў, бы яе калаціла ад холаду. — Калі ласка, прашу вас, можа, вернецца Андрэй Іванавіч... Ага, гэта яго жонка. Не пазналі? Голас змяніўся. Ну, бывае. Няхай ён заскочыць дадому.

— У яго вельмі многа выклікаў, але ён ведае...

— Што ведае?

— Пра бабулю... Ага, Росцік званіў. Можа, ёй дрэнна? Дык я каго-небудзь прышлю...

— Не, дзякуй вам. Мы пачакаем Андрэя Іванавіча. Усяго добрага.

## 10

...Недзе блізка ён пачуў голас брата, але за дрэвамі, за густой лістотай, за купінамі ліп не бачыў яго.

— Сеўка-а-а! — гукаў Росцік. — Ну чаму ты не азываешся? — Росцік хіценька пахныкаў, потым пачуўся яго адчайны роў.

— Я тут, Росцік! — адазваўся ён, кіруючыся на голас брата.

Росцік шмыгаў носам, пакрыўджана пыхцеў. Ён спыніўся перад Севам і, не падымаючы галавы, размазваў слёзы па шчоках.

— Росцік, ты чаго? — Сева ўзяў яго за плечукі і зазірнуў у вочы. — Чаго ты, Росцік? Гавары... Што дома? Ці цётачка прыйшла?

— Мама сказала, каб ты ішоў... — хліпаў Росцік.

— А як бабуля?

— Бабуля нічога не гаворыць...

— А ты чаго плакаў?

— Я хадзіў, хадзіў, а цябе няма. І нікога няма. Я думаў, што я зусім адзін.

«Яны, пэўна, яго знарок адправілі з дому. Можа, тая бабуля памірае?» Яму раптам стала жудасна, і ён прыгарнуў і прыціснуў да сябе Росціка.

Неяк незаўважна пашарэла. Паветра слаба прасвечвалася, як ускаламучаная вада. Росцік нават спатыкнуўся аб нейкі корань. Дрэвы прыціхлі, пазмрачнелі, толькі ствалы бяроз свяціліся дзённым, неонавым святлом, як стаўбунаватыя ліхтары ля кінатэатра. Сева з Росцікам ішлі праз лесапарк. Зрэшты, гэта быў ужо не лес, але яшчэ і не парк, проста бярозавы і ліпавы гаёк, — яго ўсё падціскаў і падціскаў кожны год, разрастаючыся, мікраараён. Вось ужо некалькі дамоў зайшло ў бярэзнік, стаяць, як грыбы-веліканы. А ад іх веерам разбягаюцца ранішнія сцежкі. І ўвесь лес перамотаны, спавіты імі. Асфальту тут яшчэ не было, і нехта гэтыя дарогі-сцежкі вытоптваў вясною першы, абыходзячы праталіны і балацявінкі.

Сева любіў гэты лясок. Ён увесь быў яму знаёмы да драбніц. Тут прайшло яго дзяцінства. У гэтым бярозавым гайку яны з Вадзікам вясною, калі яшчэ пад пашкамі елак ляжаў снег, надразалі сцізорыкам кару на бярозах і чакалі, калі выплыве празрыстая кропля соку, злізвалі яе, не могучы адчуць смаку і наталіць смагу. Але так соладка было, дурасліва лізаць халодныя і крышку шорсткія, бы папяровыя, запацелыя ствалы бяроз. А там, у лагчыне, дзе параслі дзірваном ці то былыя акопы, ці то проста нейкія яміны (гаварылі, што тут стаяла некалі вайсковая часць і салдаты вучыліся акопвацца, ставіць палаткі), добра было гуляць у вайну. Залягаць нябачна ў ямінах, налятаць знянацку на

прытоенага «ворага», борацца, валтузіцца на мяккім дзірване. А як прыемна было, набегаўшыся, ляжаць «забітым», раскінуўшы рукі і заплюснуўшы вочы, адчуваць, як маладое вясновае сонца лашчыць твар, а ветрык чэша валасы. Так соладка было ляжаць, набірацца сілы ад гэтай зямлі, а потым патаемна, нечакана для «ворага», выпаўзці па высокім дрыжніку ў засень кустоў, усхапіцца і бегчы, хаваючыся за дрэвамі, адстрэльваючыся, і з крыкам «ур-ра» бясстрашна кінуцца прама на «агонь праціўніка» і не падаць, не скарацца, а перамагаць. І Вадзік, рыжы, рабаціністы, які заўсёды чамусьці быў за фрыца, тады вешаў на шыю свой вялікі, зялёны, як сапраўдны, аўтамат і канючыў, што ён не гуляе, што так не чэсна, што забітыя не ўстаюць. Але Сеўку так не хацелася падаць забітым назаўсёды: чырвоныя не паміраюць, даказваў ён, імітуючы параненага ў нагу або руку, кідаўся на Вадзіка, каб абяззброіць яго ды хоць хвіліну пастраляць з шыкоўнага зялёнага аўтамата.

А колькі па гэтых сцежках вылетана на веласіпедзе, колькі разоў на крутых віражах пікіраваў ён цераз руль, узбіраўся на крутыя пагоркі і нёсся насустрач ветру, бы на крылах! А ў самым гушчары, асабліва ўвосень, можна было затаіцца дзе-небудзь і, набраўшы сухога лісця і галля, у ямінцы, як у пячурцы, раскласці цяпельца і з кім-небудзь з хлапчукоў-аднагодкаў гаварыць і марыць пра моры і акіяны, пра далёкія зоры, самалёты і касмічныя караблі.

Сева ішоў паволі, не выбіраючы дарогі, ішоў напрасткі, увогуле, ён і не думаў пра яе, ногі неслі знаёмымі заблытанымі сцежкамі. А ззаду, не адстаючы, цягнуўся Росцік.

— Хочаш, я нешта табе пакажу, — сказаў Сева.

— Цікавае?

— Канечне. Вось паглядзі наўкола. Нідзе няма дажджу. Цёпла. Суха. А я ведаю тут такую мясцінку, дзе ўвесь час ідзе дождж.

— Так не бывае.

— Ты ўпэўнены?

— А-га, — кіўнуў галавою Росцік.

— Я табе калі маніў? — запальчыва папытаў ён, і сам здзівіўся, чаму так упэўнена пытае. «Канечне, маніў. Хіба не казаў, што бабуля жыве ў вёсцы? Казаў. Але гэта святая няпраўда».

Росцік маўчаў, толькі ўпарта глядзеў на яго, нібы

загадваў: калі міргне, значыць — схлусіў, калі не... І Сева апусціў вочы.

— Росцік, давай больш ніколі-ніколі не хлусіць адзін аднаму. Гаварыць толькі праўду.

— Тады скажы мне: дзе наша бабуля?

Цяпер Сева маўчаў.

— Сам гаварыў: давай гаварыць праўду, і сам — маўчыш.

— Таму што я таксама, як і ты, не ведаю. Разумееш, мы нічога не ведаем. Я не быў, калі яе хавалі.

— Яна памерла?

Сева кіўнуў галавою. А Росцік наступаў са сваімі пытаннямі.

— І хату яе прадалі?..

—Ага.

— Не, ты мне скажы: спачатку яна памерла ці спачатку прадалі хату?

— Чаму ты пытаеш?

— Таму што калі спачатку прадаюць хату, то старэнькім няма дзе паміраць, і яны доўга пакутуюць.

Сева пазіраў на яго і не разумеў: Росцік гэта ці не? Ці той Росцік, якога яны заўсёды аберагалі ад усялякіх нягод, якому хлусілі? А ён жа ўсё ведае! Сева нават узрадаваўся гэтаму адкрыццю.

— Ну, хадзем, пакажу! — пацягнуў ён Росціка, радуючыся, што ён ніякі не нервовы, проста яны ўсё прыдумалі! Прыдумалі! Яны ўсё хлусілі малому яму, а ён верыў, не мог сам разабрацца.

Сева схапіў Росціка за руку, пацягнуў за сабою. Яны праімчалі па ўтаптанай, як ток, сцежцы сярод раскідзістых, цёмных, як стагі, ліп, спусціліся ў лагчыну, густа парослую бярэзнікам, асіннікам, вербняком і таполямі. Дрэвы тонкія, як бамбукі, цягнуліся наперагонкі ў вышыню. Дзе-нідзе паламаныя, пахіленыя ці то ад моцнага ветру, які тут пахадзіў, ці то ад нечых паганых рук, якія яшчэ ні разу, мусіць, не пасадзілі дрэва, а зламалі ці адно...

Сцежка, пацямнелая ад вільгаці, спускалася ў нізок, заценены вербняком. Пацягнула вільгаццю, макрэчай, пахам моху. Буйныя кроплі, рэдкія, але лапушыстыя, расплюскваліся на сцежцы, прашывалі шурпатае лісце. Прыслухацца — шалясціць, шапаціць па лістоце рэдкі, бы пробны, дождж. Так бывае, калі надыдзе нечакана хмара і раптам сыпане, як праз рэшата, буйныя кроплі.

Дзіўны дождж шумна шапацеў і шапацеў у лісці, сыпаўся на сцежку, Росціку на галаву, на рукі. Ён слухаў і пазіраў як зачараваны.

— Гэта дажджавыя дрэвы, як у Афрыцы? Помніш, ты чытаў мне аднойчы.

— Не. Ты прыгледзься. Галлё бы хто апырскаў мыльнай пенай.

— Слінай, — удакладніў Росцік.

— А ў ёй, — Сева нахіліў галіну, — у гэтай сліне, сядзяць маленькія вастрадзюбенькія жучкі. Гэта яны і наслінілі... Можа, гэта іх сліна, а можа, яны выцягваюць яе з дрэва? Гэтага я не ведаю. Многа мы яшчэ з табою не ведаем, Росцік...

— Нават не ведаем, хто мы... — уздыхнуў Росцік. — А калі бабуліну хату прадалі, дык мы ўжо не дзеравенскія?

— А ты хочаш быць дзеравенскім?

— Не, не хачу. Але хачу, каб быў бабулін дом. Каб было, як раней.

Нехта крануў струну, раз, другі. Недзе блізка пачуліся галасы, сабачы брэх.

— Венік балдзее, — сказаў Сева.

Дрымотны к вечару лес абуджала брынькание гітары, і слабы, пераменлівы — то тэнар, то хрыплы бас — голас Веніка, паражыўшага, як ён гаварыў, «каланіяльны рэжым», выдаваў няхітрыя песні пра гітару са зламанай дэкай, што пяе, смяецца і рыдае, пра маці, якая чакае сыночка, пра ўркагана, якога не трэба баяцца, бо прыйшоў сёння ён без нажа: мільёны яму надаелі, грошы — гразь, але без іх — нікуды, таму ён паныла глядзіць на свабоду... Было такое ўяўленне, што Венік сам іх выдумляе і спявае на адну мелодыю. І «шобла», як зваў дзятву Венік, з усяго пасёлка слухала іх, разявіўшы раты. Сева ведаў, што яны «атабарыліся» там, у цёмным кутку лесу, у зарасніку вербаў і яварніку, на ссунутых адна да адной лаўках. Хлапчукі былі розныя. Малыя і крыху большыя, бяздумныя і бесклапотныя, яны інстынктыўна цягнуліся адзін да аднаго, збіваліся ў гурт, як авечкі. Але кожнаму гурту патрэбен баран, а хлапчукам завадатар. Ім і стаў Венік. І гэта «шобла» абсядала яго кожны вечар. Венік быў асобай экзатычнай: не, ён больш не насіў штаны клёш, з зубцамі «маланак» па нізе калашын. Гэта мода прайшла. На ім былі пацёртыя джынсы, з латкамі на самых непрадбачаных

месцах, цыраваная на скорую руку спартыўная футболка. У адрозненне ад валасацікаў, ён быў брытагаловы: пад прызыўніка.

Але пакуль што ваенком толькі прыглядваўся да яго. І Венік чакаў яго рашэння. Вечарамі брынькаў на гітары і, як смеццем, сыпаў сваімі песнямі. А «падрастаючае пакаленне», якому толькі нядаўна ён перастаў выварочваць кішэні, у знак удзячнасці з бляскам у вачах слухала свайго задумлівага, капрызлівага куміра, хоць бацькі і забаранялі гэтым хлапчукам круціцца каля Веніка і слухаць усялякую пашляціну.

Да Веніка далучыліся і тыя, хто чакаў асенняга прызыву. Ім падабалася крыху «пабалдзець», паслухаць Венікаў «блеў», але ўсур'ёз ніхто з ім не сябраваў, адносіліся да яго насцярожліва. Большасць добра, мусіць, яшчэ памятала, як Венік заступаў дарогу і прыцішаным, глухім голасам загадваў: «Ану, выварочвай кішэні, пля». У многіх выклікаў зайздрасць Венікаў Каштан, паджары, з гідлівым выскалам бульдог, які, здаралася, як і яго гаспадар, пагардліва, аж адвісала ніжняя губа, пазіраў наўкола: у сабак таксама часам не бывае настрою. Але, як толькі збіраліся хлапчукі, Каштан рабіўся рахманым, усім соваў пад руку сваю дураслівую галаву і «ўсміхаўся»: яшчэ больш адвісала чорная пашчэнка і звужваліся вочы. Каштан, у адрозненне ад Веніка, любіў кампанію. Ён сам лахкаў па лесе, прыставаў да хлапчукоў, заводзячы знаёмствы і гульні.

Венік не працаваў. Яго ўладкоўвалі многа разоў: выканком, міліцыя, дзе ён быў на ўліку, знаёмыя бацькоў, але нідзе ён доўга не затрымліваўся. Наогул, праца была, як кажуць, не для яго. Ён пахваляўся сваімі генамі, быццам усе ў яго родзе былі палкаводцамі; праўда, бацька яго быў ваенны ў адстаўцы і працаваў кадравіком у інстытуце. Венік выдумляў неверагодныя гісторыі пра сваіх продкаў. «Блатныя» (так ён зваў сябрукоў па калоніі) проста дохлі ад зайздрасці», — успамінаў часта Венік.

Недзе блізка басавіта, бы засопшыся, пагыркваў Каштан: мусіць, нехта з хлапчукоў дурэў з ім. Ахвотнікаў падладзіцца да Каштана пабольшала, бо Венік абяцаў падарыць сабаку каму-небудзь з хлапчукоў, калі яго прызавуць у армію. І тыя, з надзеяй на ўдачу, абходжвалі Каштана, а заадно і Веніка.

Росцік таксама, зачуўшы Каштана, ажно ўвесь зага-

рэўся, імкнучыся хутчэй патрымаць яго кіпцюрастую, але расслабленую, як нежывую, каб не падрапаць малога, лапу ў сваёй руцэ. Каштан абавязкова з ім павітаецца.

Сева, цяпер ужо ўслед за Росцікам, накіраваўся на гукі гітары, смех і сабачае пагыркванне.

Севу Венік любіў за тое, што той умеў здорава «заліваць» пра вайну са шведамі, пра Пятра, Напалеона...

— Валяй сюды, Сеў! — запрасіў ён.

Да ног іх дурасліва пакаціўся клубком Каштан, і яны спыніліся. Росцік прысеў, пагладзіў яго. Каштан лавіў яго руку, радасна гыркаў, асцярожна ціскаў іклэмі.

— Прызямляйся! Скавырні вунь таго стручка. — Так, без цырымоній, Венік прапанаваў Севу сесці. І, заўважыўшы яго нерашучасць, напусціўся на малога: — Не навучылі, пля, у школе саступаць месца старэйшым? Глядзі ў мяне... — Нешта ён быў залішне мітуслівы, прымаў Севу як найлепшага дружбака, нібы толькі яго і чакаў.

Венік сядзеў, закінуўшы нага на нагу, на каленях была гітара, ён курыў. Дастаў пачак, разявіў яго ў руцэ, лёгка страсянуў: маўляў, частуйся. Але Сева не ўзяў.

— Хоч, заўтра на рыбалку матанём, — прапанаваў Венік. — Пагода цяпер...

— Не, я заўтра на работу, — адказаў Сева.

Венік зірнуў на яго здзіўлена, нават расчаравана, як на падазронага чалавека.

— Цябе ж турнуў Мікіціч, думаеш, не знаю? — Венік хмыкнуў, скрывіў тонкія губы, сказаў грэбліва: — І мяне сёння ўшчуваў. Выхоўваў...

— Ты яму нашто?

— Ды ён у камісіі па рабоце з такімі, як я. Ну і заліваў... Як ён на завод прыйшоў босы. Хацеў я разуцца і прыйсці. Яшчэ б торбачку на кіёк ды цераз плячо...

Веніку было весела ад сваёй дасціпнасці. Ён нават ускочыў і стаў, крыўляючыся, вытвараць з сябе гаротніка. Хлапчукі смяяліся, але Севу чамусьці было не смешна. Ён, як наяве, убачыў ссунутыя на пераноссе бровы Мікіціча, яго позірк, які пранізваў навылёт. Падумаў, што Мікіцічу было б не смешна, а нават балюча. Зірнуў на Веніка як на несамавітага, адчуў перавагу над ім, гэтым інфантыльным каралём хлапчукоў. Чамусьці захацелася хутчэй пайсці адсюль. І ён клікнуў Росціка, які забаўляўся з Каштанам.

— Ты чаго, Сеўка? — папытаў Венік, мусіць, яму такі сумна было сярод дзятвы.

— Нам трэба ўжо ісці, — пацвердзіў і Росцік. — У нас бабуля памірае. — Росціку, відаць, трэба было з некім падзяліцца. Гэта яго хвалявала, сядзела, як стрэмка.

— Якая бабуля? — скрывіў губы Венік.

— Чужая. Яе Росцік прывёў дадому, — адказаў Сева.

— Як гэта прывёў?

— Яе хату прадалі, а паміраць ёй няма дзе... — сумна сказаў Росцік.

Венік зусім нічога не разумеў, як ні напінаў свае мазгі.

— Ты яе што, падабраў на вуліцы і прывёў? Ну і дзівак, пля... — Ён выразна пакруціў пальцам каля скроні. — Люблю дзівакоў. З імі жыць весялей. Ён бабулю прывёў... — Яшчэ раз пакруціў пальцам ля скроні.

Росцік насупіўся.

— Ты сам дурань, — сказаў ён. — Я табе расказаў, а ты нічога не зразумеў.

— Ну-ну, пля... Валяй да сваёй бабулі! — Венік нервова брынькнуў на басавых струнах.

— Ідзём, — сказаў Сева, беручы Росціка за руку.

— Забірай яго ды глядзі, а то ён вам скора не толькі бабулю прывядзе...

І яны пайшлі.

За плячыма была цішыня. Не шумелі, не валтузіліся падлеткі. Толькі Каштан у некалькі скачкоў дагнаў Росціка, кінуўся яму пад ногі, забарабаніў лапамі па зямлі, як просты дварняк, завучы на гульню. Венік свістам паклікаў сабаку.

...Цётачка Марыя сустрэла іх на краі бярозавага гайка.

— Вось вы дзе, — сказала яна. — А я шукаць выправілася.

Яны насцярожыліся. Але ні адзін не папытаў: чаго?

Росцік ужо выходзіў на дарожку, як раптам у кусце бружмелю нешта зашалясцела, ірванулася чорнай доўгай стралою. Ён слязліва і роспачна ўскрыкнуў.

— Ты што, гэта ж кот, — сказаў, супакойваючы яго, Сева. — Глядзі, адбегся і прысеў, вочы гараць, як светлякі.

Росцік узіраўся ў даволі густы прыцемак, ніякіх светлякоў ён не бачыў.

— Ԋа клёша кі нё дор па, Ія сё промэн дан ле буа, — прагаварыла нечакана, нават для самой сябе, цётка Марыя. Сева спыніўся.

— Цётачка, адкуль ты ведаеш па-французску?

— Гэта хіба па-французску...

— Канечне. Адзін кот не спіць... Не. Толькі кот не спіць, адзін гуляе ў лесе.

— Толькі кот не спіць, адзін гуляе ў лесе... — паўтарыла разгублена яна. — Адкуль жа я гэта ведаю? — папытала раздумліва ў сябе. — Няўжо гэта так?

— Што так? — папытаў Росцік. — Што кот адзін гуляе?

— Гэта я сама з сабою, — супакоіла яна яго. І абодва зразумелі, што цётачка нешта не ў гуморы ці не хоча з імі гаварыць.

«Додо, фэ додо...» — зноў перавярнулася ў галаве Марыі. Яна хацела папытаць у Севы, што ж гэта значыць, але ярка бліснулі асветленыя вокны дома, і хлапчукі радасна, амаль наперагонкі пабеглі да ганка. У двары стаяла «хуткая». Значыць, заскочыў дадому тата.

На вешалцы быў яго белы халат. Тата ў світэры сядзеў каля бабулі, нібы і не ўрач быў зусім. Бабуля ўжо не ляжала, выпрастаўшыся, як нежывая, а прыхінулася да высока падаткнутай пад спіну падушкі.

— Звычайныя склератычныя з'явы, — сказаў ён Марыі, калі тая зайшла ў залу.

Тата нешта распытваў у бабулі. І яна адказвала слабым, патухлым, нібы не тутэйшым ужо, голасам. Паасобна вымаўляла кожнае слова, нібы сама прыслухоўвалася да яго, сумняваючыся і правяраючы, ці так сказала.

Маці, несучы ў залу на падносе спадачкі і кубак, мусіць, вячэру бабулі, шыкнула на Росціка і Севу, якія шумна скідалі красоўкі ў цеснай прыхожай, замінаючы адзін аднаму і штурхаючыся. Яна таксама хацела паслухаць, што гаворыць бабуля.

— Яны мне не дадуць памерці. Пакладуць у бальніцу, як некалі. А там усё вартуюць ды ўколы шпіляюць. Спаролі ўсю, сесці не магла. Не, дзеткі, нічога я есці не буду, — гэта маці падступалася з ядою, — нічога мне не лезе. Няма смаку. Не старайся, любка, я зараз пайду. Ага, пайду. — Яна нібы ўгаворвала сябе і ляжала, не варушылася, не было сілы.

— Вы ўспомнілі, дзе ваш дом? — прасвятлеў заклапочаны мацерын твар.

— Недзе, дзеткі, пад Глускам.

Алена з адчаем зірнула на Марыю, якая моўчкі стаяла ў дзвярах.

— Дзе гэта пад Глускам? — папытаў шэптам Росцік у Севы. Той паціснуў плячыма.

— Далёка, кіламетраў сто пяцьдзесят ці дзвесце, — шапнула цётка.

І Росціку здалося гэта неверагодна далёка, як да космасу. Ажно туга сціснула яго сэрца.

— Я пайду, — закраталася на пасцелі бабуля. — Дзяцей пабяру і пайду... Усе людзі ідуць. Толькі каб клункі дзе на падводу ўскінуць... Збірайцеся, дзеткі! Гора, гора якое!..

Твар бабулі, здаецца, застыў, і вочы пацягло туманам, яна нешта намацвала, шукала рукамі, можа, тыя клункі ці дзяцей, якіх трэба пабраць.

І Росцік уявіў, што ідуць яны з бабуляю ў цёмную ноч, кругом нічога не відаць, хоць вока выкалі, і нешта варушыцца побач, за кустамі. Вялізныя, рукастыя цені даганяюць іх, кідаюцца зверху. Холад папоўз па спіне. Росцік адступіў у прыхожую, сцяўся.

Сева, адчуваючы нейкую сваю віну ў тым, што адбылося, хуценька схаваўся ў дзіцячым пакоі. Ён разгарнуў кніжку, і першая прачытаная фраза зачапіла яго і павяла ў гісторыю. «У параўнанні з мінулай вайной вайна восемсот дванаццатага года — гэта лёгкая праходка Напалеона па Еўропе...»

Маці, цётачка Марыя і бацька неяк страхотліва і спагадліва пазіралі на бабулю. Яны паразумела пераглянуліся, нібы ўсё зразумелі, што сказала яна.

— Так, — неяк адрывіста і коратка, як канчатковы прысуд, прамовіў бацька. Выняў з-пад яе спіны падушку, паправіў коўдру, якой была ўкрыта бабуля: — Лажыцеся зручней, лажыцеся. Паспіце крышку. Вам трэба адпачыць. Гэта звычайная з'ява ў цяперашніх старых, асабліва жанчын, якія перанеслі вайну. Ёй трэба спакой, ніякіх раздражняльнікаў, — гаварыў ён, нібы гэта была іх бабуля, а ён толькі доктар. — Я, можа, сам прывязу лекі ці з кім перадам...

Маці стаяла з падносам у руках, не магла, не знаходзіла месца, куды яго паставіць.

— Ты ж на «хуткай» і можаш яе забраць, — прага-

варыла няпэўна. — Яна хворая... яна трызніць. Урэшце... — яна яшчэ хацела знайсці нейкі довад. — Урэшце, яна чужая. Мы не можам яе даглядаць. Ты можаш завезці яе ў бальніцу... — угаворвала яна яго. Голас яе дрыжэў, невядома, ці то быў гнеў, ці, можа, страх. Гэтакі ж страх віў і віў гняздзечка ў Росцікавых грудзях, зварочваўся тугім камячком, месціўся, як хамячок, глыбей, каб потым грызці, драпаць яму грудзі. Ён толькі пазіраў на дарослых.

— Марыя, пазвані ў міліцыю. Можа, хто пытаў? — загадала маці.

Бацька адышоў ад яе з шэрым, разгубленым тварам. У яго завастрыліся скулы, падабраліся шчокі, губы змыкнуліся, здаецца, наглуха. Алена не ведала, што Андрэй не чуе. Ён быў далёка, у памяці, дзе цёк і цёк людскі натоўп, здаецца, зрушыўся ўвесь свет: людзі плылі па вуліцы, як рака. «Збірайцеся, дзеткі! Збірайцеся, дзеткі. Не трэба коніка, ён нас дагоніць. Нічога, што драўляны... Збірайцеся, дзеткі». На тысячу галасоў гучала, паўтаралася гэта ў галаве, паўтаралася, як рэха, блізкае, далёкае, рознагалосае. Гэта чуў ён, чуў, але дзе і калі? О, бяссілле памяці! О, бяссілле розуму...

— Андрэй, ты чуеш, што я гавару? — памацнелым голасам сказала Алена. — Ты ж можаш забраць яе ў бальніцу.

— Не, не магу. У гэтым няма неабходнасці. Яна адпачне, і ўсё пройдзе. Гэта бывае ў яе ўзросце.

— Але мы... яна... — запіналася Алена. — Ты разважаеш як чужы, быццам гэта не твой дом, а старая твая...

— Так не робяць, Алена! — сказаў ён строга і нават злосна. — Не такая яна, каб у бальніцу. Ды яе нехта шукае...

— Каб шукаў, то ўжо даўно быў бы тут. Божа, што за людзі? — у яе голасе была роспач.

Андрэй паклаў руку на яе плячо, супакоіў:

— Не хвалюйся. Уладзіцца. — Апрануў белы халат. І падаўся да дзвярэй.

А яна толькі праводзіла яго позіркам.

— Вось так ён заўсёды, — сказала да Марыі. — Ты толькі набудзь. Не спяшайся.

...На гук тэлевізара, на яго прыцішаны голас у залу сабралася ўся сям'я. Крэсламі і спінамі адгарадзілі ад

экрана бабулю. Росцік сеў проста на кілім ля ног Севы.

У Лондане ішоў дождж. Ён размываў твары на шэрым экране. У поле зроку траплялі адно расквечаныя парасоны. Пад імі маўклівым натоўпам стаялі жанчыны. Гэта — лагер Грынэм-Комэн. Тут у палатках жывуць жанчыны, якія, дзівячы свет сваёй непахіснасцю і бясстрашшам, імкнуцца абараніць гэты кавалачак зямлі, а з ім і цэлы свет, які той-сёй хоча ператварыць у папялішча. Яны кідаліся на загароду з дроту, ірвалі яго, перашчыквалі абцугамі. Паліцэйскія бесцырымонна адцягвалі іх, скручвалі рукі, кідалі ў машыны.

А гэта — «жалезная ледзі». Прычэсаная — валасок да валаска, — па-дзелавому, без усмешкі на твары, усмешкі жанчыны, жонкі, маці, бабулі (няўжо ў яе няма сям'і, дзяцей, унукаў?) паціскае рукі генералам: дзякуе за ракеты. Гэта ракеты вязуць на базу. Доўгія, крытыя фуры натужна равуць і выюць, паўзучы ў цемру.

У Вашынгтоне было таксама, мусіць, золка. І дэманстранты хуталіся ў доўгія шалікі, у балоневыя курткі. Але ішлі і ішлі перад Белым домам з лозунгамі і плакатамі. На броўцы тратуара стаялі, расставіўшы ногі, пільныя паліцэйскія.

— Не дай бог, дзеткі, не дай бог вам гэта зведаць, — пачуўся ціхі кволы голас бабулі.

Першая ўстрапянулася маці. Цётка Марыя мігам выключыла тэлевізар.

— Яшчэ ж спорт, — запратэставаў Сева.

— Даволі, — супакоіла яго маці. — Дайце чалавеку спачыць.

Бабуля ўжо сядзела на сафе. Грэбалася, шукала, мусіць, апратку.

— Гэты доктар быў харошы, — сказала яна. — Разумны. А мяне яны былі паклалі ў тую, дзе трохі памешаныя. Ото адно гаворыць, і тут — другое. Сапраўды крыху памешаныя. Найбольш ад вайны.

— Ёй трэба адпачыць, — сказала Алена. — Хадземце на кухню. А Росціку пара спаць.

— Не, дзеткі, я пайду. — Бабуля рашуча наважылася ўстаць і ісці.

— Не-не, вам нельга. Ноч на вуліцы. Ісці вам пакуль няма куды. Трэба адпачыць. І ўспомніць... — угаворвала яе Алена. — Зараз доктар вернецца. Прывязе пілюлі. І вам будзе зусім добра, — а сама, павярнуўшыся да Ма-

рыі, у роспачы прастагнала: — Няўжо яе ніхто не шукае? Што за людзі без сэрца, без душы... Божа мой, — шаптала яна, як малітву. — Божа мой...

Толькі Марыя была маўклівая і засяроджаная. Здавалася, гэта ўсё ёй абрыдла і яна чакала, каб хутчэй пайсці дадому. Там у яе цішыня і спакой. На кухні яна стомлена села на табурэтку, апусціла галаву на руку.

— Яна мне так нагадвае нашу маму... — сказала задумліва.

І Росцік успомніў яе. Сівенькая, у белай хустачцы, яна сядзела ля акна і пазірала, пазірала на вуліцу, невядома пра што думала, што ўспамінала. Яе патухлыя вочы былі поўныя глухога затоенага болю. І толькі, калі бачыла, што ідзе ён або Сеўка, нібы абуджалася, ажывала, як расліна на ўсходзе сонца. Спяшалася да дзвярэй, каб сустрэць. І Росцік таксама бег з усіх ног, згледзеўшы яе ў акне.

Аднойчы ён загуляўся і зусім забыўся, што яна чакае яго, пазірае і пазірае ў акно на белы калючы снег. І твар яе быў ужо не той, карычняваты, нібы падсушаны, а жаўтавата-белы, як падмарожаны яблык. Яна не дачакалася яго і пайшла шукаць...

Росціку стала холадна ў грудзях, і той хамячок-сум заварушыўся, драпнуў кіпцюрыкамі раз, другі...

Алена нервавалася. Грымелі, скрыгалі адна аб адну талеркі ў яе руках, з ляскатам і звонам ляцелі відэльцы і лыжкі ў сушку. Потым яна паставіла на сярэдзіну кухні стол.

— Толькі ідыёт мог прыдумаць такую кухню, — абуралася яна. — Мусіць, той, хто есць адзін, хаваючыся ад людзей. Чаму тут не павінен стаяць людскі стол, каб села сям'я? Эканомім, усё эканомім, каб потым выкінуць на вецер, спаліць, прапіць. Ідыёты! — грымела яна, а на вачах блішчалі слёзы. — Ведаеш, калі мама была, я яе ўсё старалася накарміць асобна. Месца ж на кухні няма ўсім разам сесці. Можа, яна думала, што мы грэбуем ёю, бо, калі заставаліся я і Андрэй, ніколі не садзілася за стол з намі. — Алена ставіла посуд, хаваючы вільготныя вочы.

— Аленка, мне не стаў. Я толькі што вячэрала, — папрасіла Марыя. — Ды мы з табою і чай пілі... Кармі дзяцей. Ім ужо даўно спаць пара...

Росцік сядзеў нахохлены, хмуры, бы хворы верабей. І сам не ведаў, што з ім, ці то страх, ці то жаль скоўваў

яго, спавіваў, — і яму не хацелася нікуды ісці, не хацелася есці. Нешта было не так, ці ў гэтым свеце, ці ў самім ім. Яму не разабрацца. Яму было боязна і шкада ўсяго — Зямлі, якую разбураць, хоць Сева гаворыць, што такога не можа быць, такога не дазволяць, шкада бабулінай хаты, якую не ўбачыш цяпер нават з космасу, і гэту бабулю шкада, таму што ёй не было дзе памерці, і што яе ніхто не шукае, і шкада было ката, які адзін, калі ўсе спяць, гуляе па лесе... Слёзы самі сабой папаўзлі з вачэй, не хацеў плакаць, а яны паўзлі і паўзлі. Цётачка Марыя гладзіла яго па галаве і гаварыла:

— Давай пойдзем спаць, а заўтра, заўтра... — Але яна не ведала сама, што паабяцаць яму на заўтра. А ён знаў — заўтра ўсё будзе, як заўсёды. Раніцой усе будуць спяшацца. І мама, і тата, і Сева. І яму трэба будзе ісці ў школьны лагер. А там... Дудаль. Тоўсты, трэба злажыць разам Росціка і Воўку, каб атрымаўся такі Дудаль, вочы хцівыя, позірк драпежны. Ад яго няма адхлання. Дудаль вяжацца, прыдзіраецца, мучыць яго дзень у дзень: то падножку падставіць, то затопча яго малюнкі на асфальце, то скіне з гушкалкі. Ён можа дзень хадзіць услед як прывязаны і рабіць усё насуперак — затоптваць, закрэмзваць, рушыць, ламаць, дражніцца, даваць пстрычкі, круціць за вуха, шчыпацца, пляваццa...

Не, ён не хоча ісці туды, дзе Дудаль. Ён хоча да бабулі, там Мішка. Мішка зусім-зусім іншы. І яны будуць пасвіць каня. Сапраўднага, жывога каня і катацца на ім.

— Не хачу, не хачу, не хачу! — паўтараў, хліпаючы, Росцік. Цвёрды камяк, як корак, затыкаў яму горла да болю, і хацелася крыкам, плачам выпхнуць яго. Аслабаніцца.

— Ідзі, маё дзіцятка, сюды.

Голас быў мяккі, крышачку хрыплаваты, нібы хто разломваў падсохлы, счарсцвелы хлеб. Росцік прыслухаўся, прыціх. Паляжаў якую хвіліну, потым падняў галаву. Бабуля сядзела на сафе, праз адчыненыя дзверы ён убачыў яе, падобную на вялікую птушку.

— Ідзі ж сюды, да мяне, — паўтарыла яна. І зноў да яе голасу дамяшаўся нібы шорхат лісця ад нечаканага ветрыку, а можа, гэта Сева паставіў старую пласцінку, і яна захрыпела. — Ідзі, дзіцятка.

Першай пайшла да яе Марыя. Яна павярнула крэсла і села насупраць бабулі.

— Ну, як вам? Лепш?

— Дзякую. Толькі бяда, што замінаю людзям. Я скора паїду...

Росцік уціснуў мордачку ў шчыліну між дзвярэй, як цікаўнае, насцярожанае мышаня з норкі, перш чым шмыгнуць у жытнёвы зараснік.

— Ідзі сюды, дзіцятка, я пашапчу на цябе. Не бойся. Я ўсіх дзяцей на сяле лячыла, — паясніла яна Марыі, — мяне і на конях, і машынаю вазілі. Вот толькі на матацыкла ніколі не садзілася, трасе вельмі, як у ліхаманцы, баялася, што не адзержуся.

Цётка Марыя паразумела кіўнула галавою. І Алена ўжо была тут, прыбегла з кухні, запытала:

— Што? Мне здалося, прыйшоў нехта...

— Хлопчык ваш, я пазіраю, спужаны. Ён і ўдзень тут прыснуў: вочкі закрыты — а яблыкі ходзяць. Я палячу яго, — сказала бабуля.

Алена разгубілася, але сястра зрабіла ёй знак вачыма, рухам галавы супакоіцца і рукою паказала на дзверы.

— Яна ўспомніла, можа? — ціха, амаль шэптам папытала Алена, і Марыя зноў зрабіла ёй знак ісці. Росцік тым часам сеў на край сафы.

— Сядзь бліжэй, — сказала бабуля і ўзяла яго руку ў свае халодна-жарсткаватыя, сухія, бы звітыя з вузлатых вераўчын.

Алена ўстала і пайшла ў прыхожую, села каля тэлефона, нібы збіралася званіць, але нешта раздумвала. У кутку калідора на пральнай машыне прымасціўся Сева. Яму адтуль відно і чутно было ўсё, што робіцца і гаворыцца на кухні і ў зале, так зваўся самы вялікі пакой у іх кватэры.

— Чаго ж ты баішся, дзіцятка? — бабуля пытала шапатліва-ласкава, нават ранейшыя шорхат і хруст размяклі ў яе голасе, растварыліся, як цукар у вадзе.

Росцік яшчэ не праглынуў камяк слёз, што затыкаў яму горла, не даючы сказаць слова.

— Напэўна, цемнаты? — папытала бабуля.

— Не-е, — выдыхнуў, хліпнуўшы, Росцік. — Не цемнаты, а таго, што ў цемнаце. Яго не відно, але яно страшнае...

— А-а-а, — зразумела бабуля, заківала галавою.

— А яшчэ Дудаля... — шчыра прызнаўся ён.

— Што гэта — дудаль?

— Тоўсты такі, прыдзірака. Да ўсіх ён прыстае...

Яны гаварылі амаль шэптам, і ўсе прыціхлі, нават супакоіўся вурклівы халадзільнік на кухні, маўчаў Сеўка, цётка ля тэлефона, мама.

А Росцік, нібы зачараваны, шаптаўся з бабуляй.

— Я буду праганяць тую пачвару, што жыве ў цемры, — гаварыла бабуля, — а з Дудалем ты потым і сам справішся. Набярэшся смеласці і моцы і справішся.

— Ён адвернецца, а я падыду і стукну... — рашыўся Росцік.

— Не, так не рабі. А падлезе — дай! А што там! Трэба абараняцца!

Росцік бы наяве ўбачыў, як гэта ўсё будзе: сэрца яго заштурхалася, заскакала, нібы мячык. І Воўка, і Дашка, якія ўбачылі, як ён сеў на Дудаля верхам, скачуць і плешчуць у ладкі.

— У цябе ёсць у кішэньках што-небудзь непатрэбнае? — пытала бабуля. — Чаго не шкада — вяровачка ці каменьчык?

— Каменьчык ёсць. Я яго знайшоў. Ён гладзенькі, як марскі.

— Табе яго не шкада?

— Не-е.

— Вазьмі яго ў кулачок і зацісні, не моцна, але каб не валіўся.

Росцік паслухаўся. Бабуля штосьці шаптала.

Цёплая цішыня ахутала Росціка. Яна мякка напаўняла пакой, месцілася і мацнела недзе ў ім самім. Здавалася, нібы спорны дождж шапоча, шапоча, тоненька тупае наўкола, а ён сядзіць у цяпле ля адчыненага акна і толькі зрэдку падстаўляе далоні пад капеж. Звонкая кропля пляснулася ў далонь, і ён заціснуў яе. Не, гэта каменьчык, гладзенькі, як марскі, але ён чамусьці вільготны, зусім мокры, бы Росцік выціснуў з яго ваду, ці сапраўды ўпала тая празрыстая звонкая кропля дажджу. Не, не дождж шапоча ў лісці бярозы, гэта бабуля нешта шэпча, шэпча. А што? Як ні прыслухоўваўся Росцік, а слоў не мог разабраць. Дрымота змарыла яго, рот сам раскрываўся, пазяхаў. Хацелася прылегчы, бо зараз засне, паваліцца, а дождж усё шапаціць і шапаціць. І каменьчык мокры, нібы ён апусціў руку ў ваду і расці-

скае, расціскае кулак, вось ён выслізне, як рыбка, і пойдзе на дно. Не, бабуля казала трымаць яго ў далоні. І ён заціскае яго моцна-моцна, каб не выкаўзнуўся.

— А цяпер, — кажа бабуля, — ты нічога не баішся.

Голас яе множыцца, слова кладзецца на слова, аддаецца рэхам, быццам гэта не бабуля, а нехта вялікі, як высечаны з высокай, каменнай гары, моцны, уладарны, які ўсё бачыць і чуе, што робіцца на свеце. «Ты нічога не баішся!» — кажа ён. І Росціку робіцца лёгка і радасна пад яго аховай. Як патрывожаны кажан, над галавою яшчэ носіцца, мітусіцца страх, але ён сам шукае, у якую б шчыліну зашыцца, зацяцца.

— Пойдзеш адзін... Пастарайся далей ад дома. І кінь яго ад сябе — колькі хопіць сілы. Потым не бяжы адразу, а ідзі паціху і не азірайся. Зразумеў?

Росцік, як зачараваны, кіўнуў галавою.

Сева злавіў выразны матчын пагляд: ён павінен быў паціху ісці следам. Ці як сабе хоча, але каб не напужаць дзіця. Ён усё разумеў.

Росцік уступіў у святло вокан вялікага дома і яшчэ баязліва, бы крадучыся, падаўся па звілістай сцежцы між бяроз.

Яму хацелася занесці каменьчык як мага далей, каб тое, страшнае, што жывым ценем блукае ў цемры, не знайшло дарогі назад, да яго. На скрыжаванні, у самай блытаніне лесапаркавых сцежак, ён на хвіліну спыніўся. Сабраўшы ўсе сілы, шпурнуў каменьчык далёка-далёка ад сябе. Азірнуўся толькі ля дома. У цемры маціцовым мігатлівым святлом, як перліны ў вадзе, свяціліся бярозы. Было ціха-ціха... Зірнуў на неба, дзе буйна высыпалі нізкія зоры. Здавалася, ён стаіць пад высокім галістым дрэвам, — можа, гэта яблыня. А яблыкаў на ёй — не злічыць. Вунь упаў адзін, ажно чыркануў святлом... Шкада, упаў вельмі далёка... Не пабяжыш... Ды і бегчы няможна, калі пабяжыш, той, што жыве ў цемры, абавязкова заўважыць і пагоніцца...

## 11

Гэтага сёння яму толькі не хапала: не заводзілася машына. Матор адно коратка і віскліва ўзвываў і заціхаў, а калёсы нібы засмактала гразь. Ён зноў уключыў

запальванне, націснуў на педаль: «Наперад і ўверх», — нібы скамандаваў не ёй, а хутчэй сабе. Але зноў толькі шархатлівае павіскванне. «Што за чорт? Прыйдзецца пакінуць тут. Падкаціць бліжэй да броўкі...» Ён азірнуўся, глянуў у задняе шкло. З інстытута — магутныя, дубовыя дзверы не зачыняліся — адзін за адным, як пчолы з лятка, вылятала, выходзілі, выскоквалі людзі, кіруючыся кожны ў свой бок. І гэты *тып* стаяў, як і ўчора. Толькі без кветак. Вішнякоў нейкі момант разглядваў яго праз шкло: «Нічога з выгляду мужык, — ацаніў, як толькі мужчына можа ацаніць да сябе падобнага, — відаць, усё на месцы. Ну, Аленка, ну, праўдашукальніца...» Маланкава бліснула думка: на гэтым можна яе асадзіць. Шанцы ў яго руках. Не разумеючы яшчэ сам, дзеля чаго гэта трэба і што скажа, Вішнякоў вылез з машыны, падышоў да яго.

— Чакаеш некага? — сказаў крышку развязна, лічачы кожнага на вуліцы за панібрата. Наогул, мужчыны так часцей і звяртаюцца адзін да аднаго. І гэта панібрацтва іх не абражае, а надае адносінам дружбацкі характар. Гэта жанчыны «выкаюць» і патрабуюць перавагі адна над другою.

— Ага, чакаю, — адказаў той, толькі на імгненне адвёўшы позірк ад дзвярэй, каб кінуць яго на субяседніка.

— Яе ўжо няма. Яна пайшла раней, — сказаў ён упэўнена.

Тып змераў яго недаверлівым і крыху здзіўленым, а можа, збянтэжаным позіркам. А ён, хаваючы іронію, зірнуў на яго шырокі, як лапата, гальштук, касцюм з шырокімі, плюхатымі лацканамі: «Правінцыя. Вырваўся: старое надумаў успомніць. Гэтыя правінцыялы — сантыментальны народ. І яшчэ ім здаецца: у вялікім горадзе, як у джунглях, згубішся, ніхто нічога не даведаецца. Не, дружа, памыляешся».

— Няма яе. І заўтра яшчэ невядома, ці будзе.

Ён не ведаў, верыць яму ці не. Адно ўпяўся позіркам у незнаёмца.

— Вы ж чакаеце Арловіч, — упэўнена сказаў Вішнякоў. — Вось я і гавару вам...

Яго развесяліла, як гэты правінцыял, вытрашчыўшы вочы, ашаломлена пазіраў на яго, не могучы даўмецца, хто ён і адкуль, ці даць яму веры, ці не? Стаяў як слуп.

— Слухай, штурхані мяне, — сказаў, нібы яны былі даўнія сябры. Правінцыял — не сказаць, каб з ахвотаю, аглядаўся, нібы адчуў нейкі падвох, — упёрся, як вол, кароткапалыя рукі якураслі ў задок машыны, твар і кароткая бычыная шыя наліліся адразу чырванню. І Вішнякоў падумаў: «Ужываеш яе, праклятую. Не без таго...» Калі машына падала знаёмы роўны голас, ён кіўнуў галавою, даў знак адступіцца, пагнаў машыну ўперад, а потым, бы ўспомніўшы пра яго, азірнуўшыся, даў задні ход да броўкі.

— Садзіся, падвязу, — сказаў. І мужчына разгублена падаўся да яго, яшчэ ўсё азіраючыся. Плюхнуўся ў машыну ўпэўнена, з асалодаю разваліўся, даўшы роздых нагам. Мусіць-такі, добра ён тут натаптаўся. Нешта ў ім імпанавала Вішнякову. Можа, правінцыяльная непасрэднасць, нават даверлівасць — сеў і едзе, ці нейкая непрыкаянасць — было ўяўленне, што яму ўсё роўна, куды, навошта ехаць? Можа, і сюды, да дзвярэй інстытута, ён прыйшоў таму, што не было куды ісці. У люстэрку перад вачыма быў яго твар, крышку стомлены, крышку абыякавы, хоць здавалася, што ён з цікавасцю разглядвае горад, але гэта падманлівая цікавасць, — крышку сумны. Ага, сумны...

Ён не казаў, куды яго падвезці, ды Вішнякоў і не пытаў, ехаў сваім шляхам.

— Вы сказалі, — нарэшце нібы прачнуўся, — яна пайшла раней? Чаму?

— Хто? А-а... Яна — жанчына. У іх заўсёды нейкія справы, — сказаў Вішнякоў абыякава, але зноў псаваўся настрой, бы падводная плынь зацягвала яго, размывала спакой і паволі, але настойліва ўсяляла ў душу заклапочанасць. — Горш няма, як працаваць з жанчынамі, — гэта прагучала як вынік яго кароткага маўчання.

— А мне здаецца — наадварот. Не нап'юцца, не загуляюць, як мы, мужыкі...

«Правінцыял, — падумаў паблажліва, а можа, спагадліва Вішнякоў, — ты сапраўдных шалаў не бачыў. Мераеш, мусіць, усіх па гэтай манашцы. Дарэчы, адкуль ён ведае яе?»

— А вы даўно знаёмы?

— Ды гадоў... з дваццаць, — сказаў і сам здзівіўся, колькі часу прайшло. Яна магла прайсці і не заўважыць яго, а ён — яе. Можа, так і адбылося. — Яна змяніла-

ся? — папытаў неяк скоранька і нават спуджана. — Час бяжыць, як вада...

— Думаю, што не. Хаця — чаму... А вы яе даўно не бачылі? — чамусьці перайшоўшы на «вы», што здаралася з ім рэдка, — узнікла адчужанасць, нібы ён хацеў аддаліць ад сябе чалавека, паставіць яго на сваё месца. — То пазванілі б па тэлефоне...

— Я пазваніў, а мне сказалі, што даўным-даўно нумар змяніўся. Я ведаю, дзе жыве яе сястра. Урэшце, так яно было б і лепш... — І, нібы ачуняўшы, занепакоіўся, стаў азірацца, прыкідваць, дзе знаходзіцца.

Вішнякова бы варам абдалі, незразумелае яшчэ пачуццё: ці то рэўнасці — не, яе не павінна было быць, дзе няма любові, хіба бывае рэўнасць, — ці нечага іншага, што бывае, калі згледзіш чужога чалавека на сваім агародзе або за рулём сваёй машыны, хаця ключы ў цябе, апанавала ім.

— У яе нешта здарылася? — занепакоіўся ён.

Вішнякоў падумаў, што не папытаў у яго імя. Але зараз знаёміцца яму не хацелася. І ўвогуле, куды і навошта ён яго вязе? А ў самога такая скруха, незразумелая і глухая, на душы. Адкуль, чаму?

— Думаю, што нічога сур'ёзнага не адбылося: хлапчук прывёў бабульку, якая не помніць свайго дому.

— Не помніць свайго дому? — перапытаў, не разумеючы, пасажыр.

І Вішнякоў убачыў у люстэрка, як выцягнуўся яго твар, верхняя губа непрыемна закасалася. Падумаў: мусіць, вось такі выраз быў і ў яго самога, калі гэта пачуў у аддзеле. Ён таксама нешта не зразумеў і дазволіў ёй пайсці раней неяк механічна. Самога ж ахутала нейкая прыкрасць... І вось не праходзіць...

Толькі цяпер ён зразумеў тое, да чаго не мог даўмецца. І жахнуўся: «Яна таксама не помніла дому... А раптам, раптам...» Руль каўзануўся ў знямелых руках, але ён утрымаў, падкаціў машыну да броўкі, спыніўся. У грудзях жахліва пякло, і сэрца, здаецца, самлела ад гэтае спёкі. Пасажыр зразумеў, што прыехалі. Неяк нават ахвотна вылез з машыны, падзякаваў.

Вішнякоў глянуў яму ўслед, убачыў, як упэўнена той пакрочыў, нібы яму якраз сюды і трэба было. Некалькі хвілін сядзеў у машыне, не кратаўся.

«Раптам гэта яна, — падумалася зноў. — Яна ж колькі разоў сыходзіла... Не, не...» Думкі пераходзілі ў

карціны, і маці, сухенькая, з запалым ротам і шчокамі, толькі скулы тырчалі, пазірала на яго пустымі, халоднымі, як пелькі, вачыма, і барада яе нервова торгалася, бы маці ўсё нешта жавала. І яму пакутліва і балюча было на яе пазіраць. Ніколі-ніколі не было такога з ім, нават тады, калі сказаў ёй, што адвязе ў *той* дом. Яна пакорліва пагадзілася: «Рабі, сынок, так, як табе лепей». Яна заўсёды так гаварыла. Але на гэты раз глухая асуджанасць была ў яе голасе ўпершыню. Калі ж ён быў у яе? Увосень, мінулую восень... каля года... Сэрца зноў заціснула, цяжка стала дыхаць, і ён цёр, цёр далонямі па грудзях. Яны тады сядзелі побач, але моўчкі. Як сядзяць двое чужых людзей у адным трамваі, чакаючы кожны свайго прыпынку, каб выйсці і ніколі болей не сустрэцца. Толькі гэта было не звыклае, абыякавае маўчанне, а цяжкае, напятае да знямогі. Так і здавалася, вось-вось прарвецца крыкам з анямелых яго грудзей. А яна быццам нешта ўсё жавала і жавала, муліла бяззубым ротам, хоць у жылістай, старэчай, жаўтаватай у карычневыя плямкі руцэ некранутая ўздрыгвала каробка мармеладу, які ён заўсёды прывозіў. Ён убачыў, ага, убачыў, бо нічога тады не адчуваў і не мог адчуць, што ёй холадна, што яна прамерзла і ўся дрыжыць, — калоціцца. Можна было правесці яе да вуліцы, пасадзіць у машыну, уключыць матор, каб сагрэцца, але ён гэтага не зрабіў, хоць і сам адчуваў, як восеньская сырасць і халадок запаўзаюць пад скуранку. Ён нават не сказаў маці, што гэта яго машына стаіць за плотам, не пахваліўся. А любіў жа хлапчуком пахваліцца якой-небудзь самаробкаю, цацкаю, выдадзенаю ў школе ручкаю або пачкам алоўкаў. Абавязкова скажа ёй: «Мама, зірні, што ў мяне!» І яна, было, хвалілася ім, кожнаму сустрэчнаму-папярэчнаму казала: «Гэта сынок мой».

Павыходзілі са сваіх пакояў старыя, праходжваліся, адкрыта, як дзеці, разглядваючы яго, а яна маўчала. І прагорклае гэта маўчанне, здавалася, ніколі не скончыцца. І яно не скончылася. Яна проста паднялася і моўчкі, як нямая, — нават і рухам яму нічога не сказала, не хітнула галавою, — пайшла, уздрыгваючы, як ад холаду, у дом. Яму б дагнаць яе...

Вішнякоў блытаўся між дамоў пасёлка: здавалася, тут не было вуліцы і дамы стаялі нязвыкла, натоўпам. Ішоў, зазіраючы ў вокны. Яны амаль паўсюдна былі не занавешаны. Хто ў іх будзе зазіраць? Каму яно патрэб-

на — чужое жыццё? Каму цікава? Ну, вось стаіць чалавек, відаць, на кухні, курыць, хукаючы дымам у фортку. Жонка не дазваляе ў хаце курыць, а можа, хвалюецца? Хвалюецца... Ну, і няхай хвалюецца. Вунь, у другім акне. Ходзіць па хаце ў камбінацыі: выгалілася, хоць бы яшчэ фігура, а то тумба. Тумба... Няхай хоць голая ходзіць. Ды і іншых, мусіць, гэта мала турбуе. Хоць пайдзі ў трусах і з партфелем — нікога не ўразіш. Не, на вуліцы можа міліцыя спыніць. А дома можна сам-насам, як каму зручней.

Ён дзівіўся, спыняўся, уражаны. Ні адно акно не было завешана: пажылая сівая жанчына мыла посуд, стос талерак — паелі, папілі і пайшлі. Другая, маладая, коратка стрыжаная, амаль што пад колішняга хлопчыка — цяперашнія не вельмі хочуць стрыгчыся — несла з ваннай захутанае ў прасціну дзіця. А ў гэтых застолле... Людзі жылі адкрыта; вокны, як кадры на пульце тэлерэжысёра, выбірай, націскай кнопку і пускай на экран. Усё аднолькава: і кватэры, і мэбля, і заняткі... Нівеліравана жыццё... Аднолькавае? Ну, не скажы... Гэта толькі на першы погляд. А яно ў кожнага сваё. І вунь за тымі — зашторанымі, як у блакаду, вокнамі, і за гэтымі — адкрытымі любому воку. А ўсё ж яно — сваё... У кожнага... І ніколі не даведаешся, што ў каго на душы, ніколі. Адзіная схованка, адзіная таямніца ў чалавека — яго душа, склеп, дзе можна ўкрыцца, схаваць самае патаемнае, куды няма ходу чужому позірку, няма нават замочнай адтуліны, каб падгледзець, няма такога апарата, каб паслухаць яе голас, а ён, глухі, патаемны, заўсёды шэпча сваё. Толькі сваё...

Як не падобны часам чалавек звонку на таго, які ён унутры. Неба і зямля. Бывае, каторы век пражыве, а так і не ўгадаеш, хто ён на самай справе. Не, не дурань стварыў чалавека. Не дурань, а нехта хітры і прадбачлівы, а можа, фантазёр? Успомніўся дзядзька яго Макарчук, якога нядаўна хавалі. Такі рэспектабельны быў, заўсёды з кветкамі, з шампанскім, з цукеркамі, прыгожа апрануты. Усе лічылі яго багатым. А памёр — пахаваць не было за што. А ў Князева — разам працавалі — пры жыцці не было капейкі ў кішэні, ніколі нікога не падтрымаў, жанчыне кветкі не купіў, усё апраўдваўся, маўляў, канцы з канцамі не сыходзяцца. А ў самога тысячы на кніжцы засталіся. Навошта? Для каго? А чалавек жыў і радаваўся... Чаму радаваўся? Можа, і была ў яго

адзіная радасць, што ёсць яна, тая таямніца, схаваная ад усіх, радаваўся, нібы перахітрыў усіх.

Вось і яму, Вішнякову, здавалася, што ён натура складаная, няпростая. Як прыемна было адчуваць сябе загадкавым, гэтакім таямнічым, хоць часам не так проста, нібы вугалёк у далоні трымаеш. І жыць гордасцю, радавацца, што ніхто, ні адзін чалавек не ведае: хто і што ты. Ён прывык — і, здаецца, гэта было нармальна — гаварыць адно, думаць другое, а рабіць, можа, нават і трэцяе. Ганарыцца сваёю складанасцю і змястоўнасцю.

Але раптам... Калі гэта здарылася? Ці не з прыходам яго ў гэты аддзел? А можа, пасля апошніх іх размоў з Аленаю? Мусіць, што пасля іх... Раптам ён адчуў, як расхрыстана пустая яго душа, куды падзелася былая радасць. Зайздросціць жанчыне? Гэта не прыстойна мужчыну, скажа кожны. Але ён сябе злавіў на тым. Так, так. І ён, складаны, змястоўны і па-свойму суцэльны, стаў распадацца, рассыпацца, як пясчаны пагорак, з якога знялі дзёран. Вось-вось знікне зусім,ператворыцца ў роўнае месца. Не прызнаваўся сабе, але зайздросціў ёй, яшчэ ў юнацтве, калі яны слухалі адны лекцыі, рашалі адны задачы, пілі незавараны інтэрнацкі чай, што называўся «белай ружай». Зайздросціў, як гэта ў яе проста атрымліваецца! Яна магла шчыра (толькі не зразумела, чаго больш — радасці ці суму — было ў голасе) расказваць пра вясковае галоднае дзяцінства; пра тое, як лазілі яны, дзеці, у гароды, а яна заўсёды сядзела на «шухеры»; пра тое, як разабрала рэпрадуктар, думаючы, што там, у маленькай скрыначцы, сапраўды сядзяць артысты; пра Марыю, як тая каталася на лыжах на ўроку фізкультуры, а вопраткі не было, толькі паркалёвая сукеначка прыкрывала яе голыя сцёгны, на плячах куфайка і на нагах такія ж у радкі строчаныя буркі з галёшамі, — каталася і ўпала, а сукенка і задралася, усё голае, а хлопец, яе аднакласнік, стаў і пазірае, вачэй не можа адвесці, замест таго, каб руку падаць ды памагчы ўстаць; расказвала пра маці, як яна ў першы пасляваенны год наварыць ім заціркі аржаной, колеру руды, а сама не есць, хоць бы ім хапіла...

Усё гэтак, усё, а можа, і болей, горай, галодней было ў яго. І калі яна расказвала бясхітрасна і непасрэдна, ён цягнуўся да яе, гэта было яго, роднае, а яшчэ хацелася разгадаць таямніцу, чаму яна можа гэта

ўсё расказваць, не саромеючыся, не баючыся, што падумаюць тыя, хто слухае, а ён, ён хавае гэта глыбока-глыбока ў душы, як у зямлі: сто свідравін зрабі — не падымеш на паверхню. І толькі тады, калі яна пачынала ўспамінаць, зноў жа — невядома, сумна ці радасна, — у яго душы, як тлушч з малака, пачыналі падымацца на паверхню ўспаміны, але ён маўчаў. Не, Вішнякоў не мог гэта расказаць. Гэта ўнізіць, знішчыць яго. Здавалася нават, што гэта было не з ім, а з другім хлопчыкам, падобным на яго, а ён рос забяспечаным, сытым, задаволеным і, як абразу, хаваў тое былое жыццё, яшчэ ў дзяцінстве марыў вырвацца з яго, як з гразі, абчысціцца і назаўсёды забыць. Саромеўся маці, якую ў мястэчку звалі Бежанкай. Колькі гадоў прайшло, а яна так і засталася з мянушкай Бежанка, і гэтую падслепаватую хатку, амаль на курыных ножках, якую яна, гаротніца, пасля доўгіх бадзянняў з дзіцем па людзях, так-сяк зляпіла і якая для яе была як залатая, — ён, не задумваючыся, спаліў бы сваімі рукамі. Яшчэ ў інстытуце Вішнякоў прыдумаў сабе біяграфію. Яна сведчыла, што ён чалавек забяспечаны і незалежны і таму ледзь не ахвяраваў стыпендыяй. Толькі дзякуючы земляку-аспіранту іх факультэта, які, як ні дзіўна, зразумеў яго, закінуў слова, але, адчуваючы, мусіць, роднасць душы і сітуацыі, выкрываць яго не стаў.

Вішнякоў верыў, што пасля інстытута ён не ўпусціць шанцу, возьме ўсё, што яму належыць, возьме, выгрызе, вырве, выдзярэ. Не, ён не ўпусціць нават самага маленькага шанцу. Яны будуць ведаць Бежанчынага сына! Непакоіла яго толькі адно: непрэстыжная цяпер прафесія — інжынер. Хто ведае яго? Дзе яны, знакамітыя інжынеры? Толькі, можа, тыя, хто распрацоўвае касмічныя караблі, ну, яшчэ самалёты. Дык і то іх імёны рассакрэчваюцца пасля смерці. А яму патрэбна было ўсё пры жыцці... Слава? Смешна ў нашым жыцці простаму інжынеру пра гэта марыць, нават калі ты таленавіты, бо які-небудзь прайдзісвет-сераднячок, абапіраючыся дзе на «валасатыя рукі», дзе на хітрасць, можа залезці на самую верхатуру грамадскай лесвіцы. А адтуль спускаць з грукатам няможна, няма такой завядзёнкі. Мы — культурныя, выхаваныя. Грошы? Грошы таксама не зашкодзяць. Яны пакуль што пра многае сведчаць.

У Вішнякова з дзяцінства раздвойвалася душа: з

аднаго боку, ён быў Бежанчын сын (суседзі, знаёмыя, не ўспаміналі яго прыгожага прозвішча Вішнякоў, бы яго не існавала), хлапчук у кароткім — рукавы ажно лезуць на локаць — пінжачку, а з другога — чалавекам вялікай годнасці і светлай будучыні (настаўнікі, газетныя артыкулы, кнігі, фільмы яму цвярдзілі, што людзі ўсе роўныя, што ва ўсіх аднолькавыя магчымасці, усё залежыць толькі ад тваёй здатнасці і здольнасці). І Бежанчын сын парашыў цвёрда — ісці ўгору, толькі ўгору. Наперад і ўверх! Вось яго лозунг. Праўда, ён не выстаўляў яго, але ў самога быў заўсёды перад вачыма: напісаны смела цвёрдаю рукою. І варта яму было крышку расслабіцца, адпусціць павады, як нехта, невідочны, падымаў той лозунг і тыркаў яму пад нос, часам насмешліва і зласліва.

І ён зноў гаварыў сабе: «Наперад і ўверх!»

Але зараз з ім нешта сталася, як непрыкаяны, ён хадзіў вакол гэтага дома...

## 12

У кватэру Росцік убег радасны. Убачыўшы яго прасветлены твар, усе заўсміхаліся. І ў хаце стала светла, нібы ніколі тут не было ні трывогі, ні суму. І бабуля — свая, родная — сядзела на сафе. Здаецца, яна ледзьледзь усміхнулася: расцягнулася, распрамілася зламаная дужка губ.

— Я зусім не баяўся! — радасна паведаміў Росцік.

І ўсе ўсміхаліся яму. На нейкі момант яны забыліся на тэлевізар, хоць і сядзелі перад экранам. І Росцік таксама прыстроіўся паглядзець.

...Белы туман закрыў экран. Росціку здалося, што гэта сапсаваўся тэлевізар. Але не, туман пачаў рассейвацца. І гэта не туман, гэта дым, а можа, слёзатачывы газ. Высокі, кучаравы чалавек у белай кашулі схапіўся за твар, закрыў рукамі вочы, мусіць, не мог пазіраць. А ззаду паліцэйскія з дубінкамі, і нешта чорнае палілося між пальцаў, афарбавала рукі, кляксамі запляміла асфальт. Гэта — кроў... Кроў... Паліцэйскія хапаюць ахвяру, спрытна закручваюць назад рукі і кідаюць у машыну. І другога... Але, відаць, ён нежывы, бо цела апала, як вялая расліна, і яны цягнуць яго па зямлі...

— За што яны іх? За што?.. І дзе гэта?

— У Чылі. Яны супраць рэжыму Пінaчэта, — паясняе Сева.

— Гэта значыць за мір? — папытаў Росцік. Але разважаць няма калі. Мяняюцца кадры, краіны і гарады.

І ў Лондане зноў дождж, сівы туман хутае дарогі. Але натужна гудуць вялікія, як лесавозы, машыны, цягнучы на сабе доўгае, раздутае, як ненажэрная акула, цела ракеты. А людзі кідаюцца пад калёсы, кладуцца на асфальт дарогі. «Няўжо ён не спыніцца? Няўжо паедзе проста на іх?» Росціку хочацца закрыць твар рукамі, каб вочы не бачылі гэтага жаху. Але гэта робіць за яго невідочны аператар, ён адводзіць камеру.

— Яна зараджаная? — не па-дзіцячы сур'ёзна пытае Росцік. Але ўсе маўчаць, ніхто яму не адказвае.

Бабуля, пацíху разгінаючыся і прытрымліваючыся за сафу, потым за сцяну, раскінуўшы ў бакі рукі, бы вагалася падлога, — матанецца з-пад ног, ці паспее за што ўхапіцца? — патэпала ў прыхожую.

Алена нейкі момант назірала моўчкі за ёю, здаецца, падтрымлівала яе паглядам, як дзіця, якое толькі вучыцца хадзіць. Калі бабуля няўзнак пахіснулася, сарвалася ўслед, гатовая падхапіць.

— Вам што-небудзь трэба? Вам сюды? — яна запаліла святло ў туалеце.

— Мне трэба ісці... У мяне жакетка была, — разгублена і няўпэўнена сказала бабуля.

— Вам холадна? — папытала заклапочана Алена. — Я дам хустку. Ахініце плечы...

Яна ледзьве запыніла яго на ляту, некалі лёгкае, як дыханне, слова, а цяпер ачужэлае губам, яно толькі росчыркам, нейкім знакам мільганула ў галаве: «Ахініце плечы... мама», — і перасела слязою ў горле, калі адчула пад хусткаю завостраныя, кашчавыя, як у дзяўчаці, плечы; здалося, на кволую расліну накінула яна гэту цяжкую хустку.

— Як жа я пайду ў чужой? — аглядаючы ніякавата сябе, шапатліва і заклапочана прамовіла бабуля.

— Гэта маміна... — ледзь стрымліваючы дрыготку ў голасе, прашаптала Алена, уражаная, як падобна гэта жанчына на яе маці. Мільганула: усе старыя ў рэшце рэшт робяцца падобныя адзін на аднаго. І яшчэ адна думка ўразіла яе сваёю непасрэднай жорсткасцю, шчымотнай праўдай, нібы нехта напомніў ёй, прысароміў: «Ты ні разу не ўкрыла вось так яе плячэй. Ёй холадна

было каля цябе, холадна душы... Вось таму яна і цягнулася да Росціка. Няпраўда, няпраўда... Гэта проста ты забылася», — супакойвала сябе.

— Вам нельга ісці, — сказала яна. — Цёмна. За вамі скора прыйдуць... — Гаварыла, а сама думала: «Каб спяшаліся, то ўжо былі б. Няўжо яе ніхто не будзе шукаць?»

— Хадземце на кухню. Я дам вам чаго перакусіць... Хоць кубачак малака.

— Не, есці не хачу. Я водзека во пасяджу...

Яна прыстроілася ля акна, расхрыстанага, фіранкі ніколі не зацягваліся, не запіналіся. Акно было высока, пазірала на лес, а цяпер у бязмежную цемру з далёкімі мігатлівымі агеньчыкамі. Бабуля павярнулася і пазірала туды. Што яна бачыла там, у цемры? Можа, тое жахлівае і невідочнае, чаго баяўся так Росцік і што яна ўмела адганяць шапатлівым, настойлівым заклёнам, моцным духам сваім, а цяпер і ад іншых адагнаць была бяссільна і сама баялася яго, як дзіця. Сядзела і думала. Пра што, пра каго — ніхто не ведаў.

«Вось так і мама сядзела і ўсё думала, думала... Пра што? Ніхто не ведаў... Ніхто не пытаў, а сама яна не гаварыла. Вось так і дзеці мае не будуць ведаць, пра што думаю я. Не папытаюць... Не папытаюць?»

На Алену найшло нейкае жахлівае здранцвенне. Яна нічога не бачыла, не чула, ні пра што не думала, хоць пазірала, прыслухоўвалася, старалася зазірнуць у глыбокі і вузкі, як пакінутая свідравіна, калодзеж памяці. На такую свідравіну яна натрапіла аднойчы ў лесе, дзе нядаўна нешта шукалі геолагі. І нават страшна стала: як свішч, зеўрала свідравіна цёмнаю востраю пустатою, прашываючы зямлю. Гэтага Алена не бачыла, але ведала, і яе пужала, ураждвала нежывая пустата. Людзі спадзяваліся, свідравалі яе, але ні кроплі каштоўнай вільгаці не пырснула знутры, а толькі зеўрала яна, тая пустата.

А бабуля маўчала. Тужліва і журботна яна пазірала ў цемру. Алена не стала трывожыць яе. Яна зірнула на чырвоныя ходзікі, уманціраваныя ў кухонную белую шафу. Жахнулася, што так позна. І дзяцей пара заганяць спаць, выключаць тэлевізар ды даць спакой на ноч гэтай бабулі.

Падумала пра Андрэя: дзе ён, у якім канцы гэтага вялікага горада, каму спяшаецца на дапамогу — пры-

слухоўваецца да затухаючага, слабога біцця нейчага зношанага сэрца, а можа, закасаўшы рукавы, робіць штучнае дыханне. Здаецца, яна бачыла яго твар — сцятыя вусны, засяроджаны лоб з кроплямі поту. «Відаць, няма калі пазваніць, а можа, не ў галаве. А мог бы...» — нават сорамна стала: пра што гаварыла яму. Спахапілася, каб жа не забыць даць бабулі пілюлькі на сон. Заспяшалася ўкладваць дзяцей.

— Росцік, Сева, — спаць! — сказала строга. Але яны не скрануліся з месца, пазіралі на экран. І яна мітнулася да выключальніка, працягнула ўжо руку.

— Ма-а-а, — залямантавалі яны. Але не гэта яе спыніла.

Рослыя, дужыя паліцэйскія з нецярплівымі аўчаркамі асцярогліва набліжаліся да ахутанага дымам, а можа, дарожным пылам фургона, які ляжаў на баку. А ўнутры яго, нязручна, ненатуральна заваліўшыся на сядзенні, абмяк сівы чалавек сялянскага аблічча.

Алена адхапіла руку ад выключальніка. Можа, дзеля таго, каб пачуць голас каментатара: «Маленькі чалавек выбег на плошчу гісторыі з крыкам роспачы і праклёнам і разбіўся аб бяздушную чыгунную гаргару дзяржавы. Але ў маленькага, невядомага чалавека, калі ён хоча, каб яго пачулі, ёсць, відавочна, толькі адзін выпадак у жыцці і адна-адзіная плата — яго адзінае жыццё».

— Што з ім? — папытала яна ў дзяцей.

— Ён хацеў у знак пратэсту ўзарваць манумент у цэнтры Вашынгтона, — сказаў Сева. — Але толькі страшыў...

Яна кіўнула галавою.

— Ідзіце спаць, — сказала ўжо спакойна і заклапочана, нібы хочучы ў вялікім вар'яцкім свеце аберагчы хоць свой маленькі астравок, раскалыханы заморскімі бурамі. — Я пасцялю тут бабулі...

— Мама, калі яна не наша, то нечая. Так? — сказаў прыцішана Росцік. — Але яе ніхто не шукае. Чаму?

— Можа, і шукаюць. Горад вялікі, у кожную кватэру не зойдзеш.

— Шукаюць яе, мусіць, на вуліцах, па скверах, — сказала Марыя. — Бо хто ў сучасным горадзе запросіць другога ў кватэру? Перад носам дзверы зачыняць, калі і пазвоніш. Сантэхніку цяпер і то не адчыняюць.

— Госпадзі, а што я буду рабіць заўтра, калі па яе

ніхто не прыйдзе? — занепакоілася Алена. — У хаце адну не пакінеш...

— Я буду дома. Не хвалюйся, — сказаў Сева.

— Як дома? — мітнула на яго позірк маці.

Сева сумеўся, зірнуў на выратавальніцу — цётачку Марыю. Тая не міргнула.

— Я дамоўлюся з Мікіцічам, — супакоіла яна сястру.

— Ну, тады добра, — абрадавалася Алена. — А я знервавалася ўся. Чужы чалавек...

— І я хачу быць дома, — са спадзяваннем і маленнем у вачах занудзіў Росцік.

— Вось хутчэй за ўсё ты і застанешся. А Сева пойдзе, трэба працаваць. Нечага лынды біць, — стражылася яна.

Росцік устрапянуўся, як верабейка, радасць асвяціла вочы.

А Сева шукаў дапамогі і заступніцтва ў цёткі.

Паспешлівы званок сарваў усіх са сваіх месцаў. Кожны хацеў адчыніць дзверы. Гэтага званка чакалі ўвесь вечар, як чакаюць запозненага, далёкага госця, спадзеючыся і не спадзеючыся, што ён прыйдзе, і ведаючы, што не прыйсці не можа. Спрытнейшая за ўсіх аказалася цётка Марыя. Усе памкнуліся за ёю. Нават бабуля, устрапянуўшыся, як абуджаная птушка, хутчэй спуджаная, патэпала, перабіраючы далонькамі сцяну, крадком выглядала з вузкага калідорчыка ў прыхожую. Шуганулі туды і Сева з Росцікам.

Марыя адчыняла дзверы, а яны ўсе стаялі паўкругам, нібы сустракалі самага найлепшага і доўгачаканага госця.

Менавіта гэта і ўразіла Вішнякова. Ён спыніўся, як акамянелы, за парогам, не рашаючыся пераступіць яго. Маўчаў. І яны таксама нейкі момант разглядвалі яго. Высокі, чарнявы, з жывымі, крышку раскосымі вачыма, нібы ўладальнік іх, напорысты і імклівы, у той жа час шукаў шлях для адступлення або асцерагаўся некага, хто быў збоку, трымаў яго ў полі зроку.

— Заходзьце, Віктар Сцяпанавіч. Заходзьце, — ветліва запрасіла ўстрывожаная і здзіўленая Алена нейкім глухім, грудным голасам.

Цяпер усе ўражана зірнулі на яе.

— Гэта — Віктар Сцяпанавіч Вішнякоў, наш начальнік. Сама не заўважыла, што сказала «наш», а не мой.

Росціку «наш» глянуўся, і ён, як вавёрка, шмыгнуў у куток на пральную машыну, на былую Сеўчыну пазіцыю: адсюль праглядваюцца дзверы кухні і залы і чутно ўсё, што гавораць, а яны будуць ці там, ці там. Яго ж, гэта відавочна, да размовы не дапусцяць. Севу — таксама. Ён хоць і працуе на заводзе, а дарослым яго ніхто не лічыць. Таму і шухнуў сюды, штурхануўшы Росціка ў самы куток, ажно той запішчаў.

Але строгі матчын позірк, — маўляў, не можаце сябе паводзіць пры чужых людзях, — які тая мітнула на Севу, падахвоціў Росціка скінуць Севу з машыны. Той не вельмі ўпінаўся. Было ўражанне, што «наш» не збіраецца заходзіць у кватэру: просіць прабачэння, што, маўляў, ішоў міма. Парог ён усё-такі пераступіў, але далей — ні ходу.

Алена ўразілася, убачыўшы Вішнякова, ды і выгляд у яго быў не такі, як заўсёды — строгі, вытрыманы, ганарлівы, а нейкі дамашні, расслаблены, заклапочаны. Гэта потым, убачыўшы яе, — ці ёй здалося? — ён выпрастаўся, падабраўся.

— Прабачце, што мы — вось так... усе... У нас — бабуля, і мы чакалі, што па яе...

Яго, здалося, гэта вельмі зацікавіла, ён прабегся вачыма па тварах, спыніўся на бабуліным.

— Ваша мама? — папытаў ва ўсіх разам, а сам усё выглядваў, бы хацеў убачыць яшчэ некага.

— Не, — адказала Алена, заступіўшы бабулю, каб яна не пачула, ці што. — Чужая.

— А-а-а, — неяк вельмі панятліва кіўнуў ён, яшчэ раз зірнуўшы на бабулю з-за Аленінага пляча. — А я ішоў міма. Наогул, зусім выпадкова. Думаю, трэба зірнуць, як мае падначаленыя жывуць? Наогул, гэта абавязак кожнага кіраўніка. Я збіраюся наведаць усіх.

Марыя пачала запрашаць яго ў залу, а Алена кінулася на кухню гатаваць чай.

— Што вы, што вы, — гаварыў Вішнякоў.

Ён быў асаністы і крышку, здавалася (можа, сапраўды здавалася), крышку пагардлівы. Зайшоў і спыніўся ў прыхожай.

— Не благая, не благая ў вас кватэра. Тры пакоі. Што ж, не блага, не блага. — Ён зноў нейкім стомленым позіркам каўзануў наўкола. — Прыхожая цесная. Што ж, такія будуюць, — развёў рукамі.

Крышку сумеўся, зірнуўшы на Марыю, якая неяк

залішне па-простаму разглядвала яго, нібы не чакала ўбачыць такім, які ён быў.

— І вы жывяце, і яшчэ бабуля?..

— Не, — усміхнулася няведама чаму Марыя, — ні я, ні бабуля...

— Ах, я забыў. Так-так... А я, ведаеце, гуляю па вечарах у парку. А вашы вокны асветлены. Вось так. Ну што ж, прабачце. Усё добра. Я пайшоў. Прабачце, позна. На жаль, на жаль...

Ён адступіў ад дзвярэй. Калі Алена прыбегла з кухні, дзверы за ім зачыніліся. Ашаломленая яго хуткім знікненнем, глянула на Марыю, бы тая была віною. Марыя толькі паціснула плячыма.

— Трэба ж было яму хоць сказаць... Адпрасіцца...

Гудзеў, пашчоўкваў на нейкіх невідочных стыках ліфт. Алена кінулася ўніз па прыступках лесвіцы, але палічыла, што дарэмна, не дагоніць... Увайшла ў кватэру задумлівая, засяроджаная.

— Чаго ён прыходзіў? — папытала ў Марыі.

— Ішоў і зайшоў, — не надала значэння яго прыходу Марыя. — І я пайду, позна, — дадала, шукаючы вачыма сваю сумачку.

— А мы чай не пілі, — напомніў Росцік.

— Табе ўжо, мілы мой, спаць трэба, — пагладзіла яго чубок цётачка Марыя.

— А мы чай не пілі! — пярэчыў ён.

— Марыя, пачакай крышку. І пазвані яшчэ раз участковаму, калі ласка. Можа, пытаў хто? Як жа так... А вы — спаць! — скамандавала Алена дзецям.

— Дарэчы, чаго ён прыходзіў? — нечакана папытала Марыя, толькі хвіліну назад для яе было ўсё ясна: ішоў міма, святло ў вокнах... — Мне здаецца, што...

— Што? — насцярожылася Алена. Яна і сама думала: чаго ж ён прыходзіў?

— ...Што ён зразумеў, куды патрапіў, толькі калі адчыніліся дзверы.

— Ты думаеш? Мне здаецца, што яго грызе нешта. Ён ніколі не быў такі... Ён нешта хацеў сказаць... — словы яна гаварыла неяк паасобна, нібы ў нейкай гульні расстаўляла іх.

Марыя зазваніла лыжачкай, і Алена, здаецца, упершыню не заўважыла, іншы раз гэта яе раздражняла.

— А можа, ён каго-небудзь шукаў, — заначыў Росцік. — Прыйшоў, паглядзеў...

— Разумнік ты мой, — пагладзіла яго Алена.

І зноў заспяшалася на званок, толькі ўжо тэлефонны, і ўсе на кухні прыціхлі, ловячы кожнае яе слова.

— Не, не, вы памыліліся. У нас няма Міхаіла Іванавіча, і Антаніны таксама... Калі ласка.

Потым сама стала хутка, звычна круціць дыск тэлефона.

— Алё, міліцыя, дзяжурны. Ага! Тая самая, што з бабуляю. Пыталіся. Мужчына? Давалі адрас? Больш не званіў? Не... Ну добра, пачакаем. Вось толькі не ведаю, як заўтра? Канечне, працуем. Ага.

— Ну, вось зноў — чакайце, — сказала Алена, вяртаючыся на сваё месца ля халадзільніка, унутры якога гуло і пералівалася, нібы нешта варылася. — І што я вам скажу. Росцік, мусіць, сказаў праўду.

Росцік праясneў.

— Толькі ўсё гэта не зразумела...

— А ты ўжо адразу — сумленне мучыць, грызе... — папікнула яе Марыя. — Ішоў чалавек... Ну і зайшоў...

Змоўклі. Кожны думаў пра сваё і ўсе, мусіць, пра адно і тое ж. Кожны меў свой варыянт.

— Ну, не могуць жа адразу згубіцца некалькі бабуль. І адна, і другая...

Не паспеў Сева даказаць, як прыадчыніліся дзверы ў кухню.

— Дзеткі, я ўспомніла, — вінавата неяк і ў той жа час радасна сказала бабуля. — Унука майго завуць... — яна зноў спужана і разгублена напінала памяць, здаецца, шарыла там, як гандлярка ў кішэні: вот жа быў кашалёк і — няма. Заморгала.

— Сядайце, — усхапіўся Сева. І ўсе ўсаджвалі яе. Алена налівала ў кубак чаї.

— Вот жа ўспомніла была... — на старэчым твары адбілася пакута.

— Вы ў дачкі ці сына жывяце? — папытала Алена.

— Ва ўнука... Ён патрэбны чалавек, так ён пра сябе гаворыць, а дзе працуе, не ведаю. Ведаю, што патрэбны. Як вып'е, дык усё хваліцца: я — патрэбны чалавек.

— Каму патрэбны?

— Не ведаю, наўродзе як усім. А мне здаецца, ён шафёр. Шафёр, канечне, чалавек патрэбны. Як у сяле, дак і сена прывезці, і дроў. А тут што вазіць?

— Вы не хвалюйцеся, — супакоіла яе Марыя, — успомніце.

Бабуля ўздыхнула:

— Каб яны хаты мае не прадалі, я б угу якая яшчэ была. А гэта хіба можна трываць. Ляжа на канапе і ўвесь дзень толькі нейкага хрыпатага круціць. Вой як зачую, у галаве ўсё пераварочваецца. Вось сёння трохі адышла. Памерці не даюць, людзі мае. Мая баба памірала і маці, дак легла сабе ціхенька за шырмаю і ляжала. А гэта як раніца — уставай, баба, і пасцель скруцяць. Маўляў, няможна ляжаць: людзі да нас ходзяць. А гэта ў бальніцу заперлі. Ну, думаю, лягу ціхенька і памру. Дак дзе там, урачы не даюць, усё з гэтымі шпрыцамі носяцца... — Яна пазірала патухлымі, выцвілымі вачыма некуды ў пустату.

— Вы ідзіце, лажыцеся. Успомніце...

— Хіба што за ноч. Я ж, дзеткі, ноччу саўсім не сплю. Што перадумаеш, што ў галаве перавернецца. І бежанства, і партызаншчына, і пасля вайны нялёгка, ой, нялёгка было.

Пашарэлі, спапяліліся яе вочы, зноў патухлі.

— А вуліцу вы ведаеце, дзе жывяце? Назву...

Бабуля паціснула плячыма, хутчэй убрала галаву ў плечы:

— У нас у сяле ніколі і назвы вуліцы не было. Пасёлкі хіба: Канцавы ці Узлессе. То і я тут не пытала.

— Вы ж некуды ехалі?

— Думала, сяду на аўтобус, да Глуска даеду, а там знайдуся.

— Там ёсць нехта ў вас?

— Чаму не — сяло людзей. Вось хату маю, дак яны прадалі... — Зноў вочы яе засмуціліся.

І Росцік пазіраў на яе жаласліва. Яму так хацелася, каб яна ўспомніла, бо як жа так не ведаць, хто ты. І зноў яго агарнуў страх. Раптам гэта здарыцца і з ім? І ён не будзе ведаць, хто ён і чый. Страх, халодны, слізкі, пачаў агортваць, спавіваць туга і моцна. Росцік ужо не мог паварушыцца, маўчаў. Толькі з надзеяй заглядваў у вочы маці, брату, цётачцы: ці гэтак з імі. «Трэба ўсё начыста даведацца і запомніць, каб не забыць. Усё, усё... Каб не забыць... І пра тату, і пра маму. Усё, усё».

Маці павяла бабулю ў залу. Вярнулася.

— Госпадзі, — сказала. — Мы ўсе такія разявакі. Нават не папыталі, як яе імя. Гэта ж яна павінна ведаць... Чалавек не можа забыць сваё імя!

— Ніколі-ніколі? — папытаў з надзеяй Росцік.

— Ніколі! — сказала яна ўпэўнена.

І Росцік адчуў, як яму стала вальней дыхаць. Страх аслабаніў крыху грудзі.

— Усё бывае, — уздыхнула цётка Марыя. — Мы хіба ведаем, хто мы? Можа, і звалі нас не так...

— Як гэта? — не зразумеў цяпер Сева.

Цётачка ўсміхнулася аднымі губамі, ды і не ўсмешка гэта была, а жаль, які скрывіў ёй губы.

— Ты вось захапляешся гісторыяй. Рознымі там царамі, Напалеонамі, а не ведаеш таго, што было нядаўна, што было з намі.

Вецер, ужо начны, абудзіў бярозу пад вокнамі, яна заварушылася шумна, нібы нехта выбіраўся з капы сена, заварушылася і фіранка на акне, а за ёю хіснуўся плецены з лазы, як капялюш, абажур пад столлю.

## 13

«Навошта я пайшоў туды? Навошта? Гаварыў нейкае глупства: хачу зірнуць, як жывуць мае супрацоўнікі... Глупства! Думаеш, яны гэтаму паверылі? Сядзяць зараз і ахаюць: Вішнякоў, Вішнякоў... Глядзі ты, ніколі не думалі, што ён такі...» Ад прыкрасці ажно нудзіла яго, выварочвала душу. Але ён яшчэ пазіраў на асветленыя вокны, таксама не завешаныя. Надзімаецца, калышацца гардзіна. Гэта для прыгажосці, ці, як кажуць, утульнасці, каб не здавалася голым акно. Танная гардзіна выпырхнула за акно і трапятала, трапятала белым крылцам, як начны матылёк, які прыляцеў на святло і, зачараваны, да знямогі, апякаючы крылы і слепнучы, кружыў і кружыў вакол.

Вішнякоў адчуваў сябе так, нібы з полымя выскачыў, калі выйшаў адтуль, але гэта святло незразумела прыцягальнае, яшчэ не адпускае яго зрок, вабіць. І сэрца пячэ нудлівая скруха. Навошта, навошта пайшоў?

Але другі голас, — спачатку ўразіўся, пачуўшы яго ў сабе, ніколі раней не заўважаў, што ёсць гэты ўнутраны голас, разважны і сталы, даводзіў: «Ты ж хацеў зірнуць на тую старэнькую, табе ўлезла ў галаву, што гэта, можа, твая маці. Яна ж, памятаеш, была аднойчы з'ехала з таго дому, куды ты яе завёз».

«Але навошта было мне ісці? Я мог сесці ў машы-

ну — гэта нейкіх сто пяцьдзесят вёрст, дарога цяпер у парадку, чатыры гадзіны ў два канцы. А я там болей паўгадзіны не бываю. Навошта? Пра што гаварыць?»

«Але ж ты гэтак не зрабіў. Здагадваешся, чаму? Нецярпенне? О, гэта мае зусім іншую назву. Не крыўдуй, але гэта — маладушша. Кінуць-рынуць і ехаць адразу ты не мог. Табе не прыйшло ў галаву. Тады, калі гэты хлопчык, Росцік ці Сева (як іх там завуць), каторы пазваніў маці, што знайшлася бабуля, у цябе мільганула — прызнайся! — нейкая думка. Але яна каўзанулася, як нага на лёдзе, і ўсё. А потым, калі дайшло, было позна: баяўся растлумачыць Наташы, нічога, хоць забі, не прыходзіла ў галаву. Можна было пачакаць і зрабіць гэта заўтра, але ты, даруй за адкрытасць, не прывык турбавацца за некага. Калі б ты не пайшоў, цябе б гэта турбавала да заўтра, а для цябе любая турбота, калі яна датычыцца некага другога, — ярмо на шыі. Ты хацеў хутчэй скінуць. Дарэчы, калі б сапраўды гэта аказалася яна? Што было б?»

«Завёў бы машыну. І завёз назад. А Наташа? Яна не ведае, што ў мяне ёсць маці і што яна ў доме для састарэлых. Не пытала мяне ніколі пра тое. У яе свае бацькі, яна там болей бывае, як дома. Вось і цяпер там. Недзе звоніць дадому, правярае. А я не магу там бываць. Мне ўспамінаецца яна. Так, так! Раней гэта было не так востра. А цяпер я заўсёды думаю пра яе».

«Чаго ты нервуешся? Супакойся. Мала, відаць, думаеш, калі не сказаў пра яе жонцы. Скажаш? Цяпер не ведаеш. Як яна паглядзіць на гэта: трэба ж, мацеру куды запраторыў?»

«Глупства! Нічога яна не скажа. Не з тых. Гэта яны, ого як яны ўзняліся тады, як дзеючы вулкан! Якімі толькі словамі не кідаліся, сапраўды, як каменнем. Ніхто не ведае, як мне цяжка было тады. Ніхто гэтага не разумеў. Не хацеў разумець. Хутчэй за ўсё яны зайздросцілі мне. Ім здавалася, што я раблю галавакружную кар'еру. Яны і Маргарыту навучылі. Дурніца яна, якая дурніца! Прыйшла і сказала: «Я знаю, ты хочаш мяне ўзяць, каб я тваю маці глядзела. А сам — за мяжу... Пашукай іншую дурніцу!»

«Пачакай, што за сумбур. Давай усё па чарзе».

«Яна ўжо не магла жыць адна ў той старэнькай хаціне... Летам яшчэ нічога, а зімою...»

«Пастой, хто яна? Маці твая, дык ты яе так і назы-

вай. Ачужаў язык? Тады давай, як хочаш: яна дык яна».

«Яна зусім не трымала цяпло. Яна? Язва! Яна — гэта хаціна, не маці ж... Ды і маці таксама... Яна пастарэла. І хвароба нейкая дзіўная ўвалілася. Яна забывалася. І ўсё ішла шукаць сына. Дактары гаварылі, што гэта ад таго, што яна ў час вайны нагаравалася. Мусіць, губляла мяне. Я забраў яе да сябе. Паляжала ў бальніцы, ачуняла. А з Маргарытай усё было... Так, заставалася толькі пайсці зарэгістравацца. І тут выпала нагода... На два гады ў Манголію. На будаўніцтва электрастанцыі. Ведаеш ужо, што Маргарыта мне сказала. Дурніца, яна мне падабалася... І мы ж, каб толькі пазнаёміліся, а то жылі ўжо два гады незарэгістраваныя, працавалі разам. Канечне, супрацоўнікі яе падбухторылі, гаварылі, мусіць: «Глядзі. Ён распішацца з табою, паедзе, а ты будзеш мацеру яго глядзець. Ён дзеля гэтага і заспяшаўся распісвацца». Дурніца Маргарыта... ім паверыла. Адзіная жанчына была. Мы падыходзілі адно аднаму і ў рабоце і... А далей... Мне трэба было неяк быць з ёю. Ага, з маці! Я з вялікімі цяжкасцямі, нібы чорт ведае куды, уладкаваў яе ў гэты захудалы дом. Часова. Але яны ўсе... Увесь калектыў канструктарскага бюро, у якім я працаваў, асабліва жанчыны — о, як я ненавіджу іх!.. — узняліся, загаманілі, запырскалі слінаю. Давялося застацца. Праўда, работу я адразу змяніў. Вось і ўся гісторыя. Дык у чым я вінаваты. У чым? Кожны жыве, як умее, а хутчэй — як удаецца. Ты хочаш, каб я іх паважаў. На вось — выкусі. Ага, я памяняў работу. Ажаніўся. Шмат вады сплыло...»

«І ты баяўся зараз, што цябе будуць асуджаць... І яна, я маю на ўвазе тваю аднакурсніцу Алену. Яна ж ведае цябе...»

«Ведае? Ніхто мяне не ведае. Я сам сябе не ведаю. І яе не ведаю. Хоць забі, не магу зразумець, чаму, чаму яна так дабіваецца, каб затрымаць праект. Гэта ж ёй не дае нічога, акрамя... Акрамя таго, што яго потым не трэба будзе дапрацоўваць. Адзін дзяржаўны інтарэс. Не баіцца, ідзе супраць усіх. Хіба супраць? Яна ж іх усіх пераканала. Цяпер я застаўся адзін. Як я вырашу — так і будзе. Добра, калі яе заўтра не будзе... Гэта добра... Значыць, я вольны ў сваім рашэнні... Гэта добра. Але яе дасюль не магу зразумець».

«Не можаш? Бачыў, як яны ўсе павыскоквалі на-

сустрач? Ты палічыў, колькі іх? Яна не адна... Вось у чым справа. Яны ўсе там аднадумцы. А яшчэ перад дзецьмі. Людзі заўсёды больш шчырыя перад дзецьмі. А ты — адзін. Ты заўжды адзін...»

Ён сядзеў на лаўцы пад раскідзістым клёнам на ўскрайку лесапарку. А насупраць, хоць і далёка, і высока, але праз рэдкае голле развесістых бяроз былі відаць асветленыя вокны кватэры, у якой яго маглі выслухаць і зразумець. Але навошта гэта яму? І толькі нейкая часовая слабасць, ці, можа, гэта называецца «маладушша», завяло яго туды. І ён радаваўся цяпер, што не раскрыўся перад імі, што выскачыў. Толькі радасці не было. Была адзінота, несусветная адзінота, бы патрапіў у космас і ніяк не мог спусціцца да людзей. І дадому ісці не хацелася. Там ён таксама адзін...

...За дзвярыма доўга трымалася цішыня. Ён, расчараваны, намерыўся падацца ўніз па лесвіцы. Але марудзіў. На нешта яшчэ спадзяваўся. І сапраўды, пачуўся плёскат босых ног, па хадзе ён пазнаў, што гэта Маргарыта: так яна хадзіла босая, пляската плюхаючы ступнямі па падлозе. Пры гэтым яе акруглыя лыткі падрыгвалі. Гэта спачатку вельмі падабалася яму, ён не ўпускаў момант, каб глянуць, правесці яе позіркам.

Маргарыта стаяла за прыадчыненымі дзвярыма моўчкі. Гэта доўжылася нейкі момант, пакуль мужчынскі голас з глыбіні пакоя не папытаў у яе: «Хто там?»

— Нехта памыліўся! — гучна сказала яна, а сама ўсё пазірала на яго, не адводзячы вачэй, стаяла ля адчыненых дзвярэй і не адступалася, не пускала ў кватэру і не зачыняла.

— Ну, што ж ты? — папытаў зноў той жа голас, нецярплівы і капрызны.

— Зараз. Я скажу яму толькі... — гаварыла яна.

— Што ты яму скажаш? — праз сілу ўсміхаючыся, а можа, толькі крывячы губы, паўшэптам запытаў Вішнякоў.

— Я скажу яму, што ён памыліўся адрасам! — у нейкай роспачы, сцяўшыся і востра ніжучы яго позіркам, амаль крычала яна.

— Так, бачу, я памыліўся, — сказаў пакорліва ён, усё яшчэ спадзеючыся, што яна падасць нейкі знак. Але вочы яе, два карычневыя клешчыкі, не адпускалі яго і не давалі магчымасці наблізіцца. Потым дзверы з ляскатам зачыніліся, нібы рванула іх скразняком.

— Хто ж мы? — трывожна папытаў Росцік. — Чаму ў нас няма дзеда, як у Воўкі? А ў Генкі нават чацвёра — два дзяды і дзве бабулі. А ў нас толькі адна бабуля была?

Гэтае «была» ён сказаў няпэўна, скрадліва, — раптам яны скажуць: «Не была, а ёсць», — вочы яго забегалі. Глядзеў то на аднаго, то на другога, шукаючы адказу.

— Наша бабуля памерла, — сказаў Сева.

Яны ўсе ўздрыгнулі, нібы пачулі гэта толькі цяпер, нібы і здарылася гэта толькі-толькі, і зірнулі на Росціка. Вочы яго акругліліся, спыніліся спужана, пашукалі адказу ў вачах, што былі насупраць: маці, цётачкі.

— Я так і думаў, проста вы ўсе хлусілі, што бабуля жыве ў вёсцы. Калі б яна жыла, мы б паехалі туды, — сумна сказаў ён.

Маці дакорліва пазірала на Севу:

— Проці ночы...

— Ён ужо дарослы, і даволі яму хлусіць. Робіце з яго нейкага дурненькага!

Скалануўся, сцепануўся халадзільнік, завурчаў, зашумела вада недзе на ніжэйшым паверсе, а яны маўчалі.

— Можа, і дрэнна мы робім, што нічога вам не расказваем. Ды і што расказваць? Наша мама, ваша бабуля, таксама нам нічога не расказвала. Мы маглі і гэтага не ведаць, калі б я ў апошнія дні не сядзела пры ёй...

...Марыя на імгненне прыкрыла вочы. І, як наяве, убачыла яе твар, нейкі памаладзелы, толькі бледны, жаўтавата-матавы, як слюда. А можа, гэта ад снегу за акном усё наўкола пасвятлела.

«І мне сёння лепш», — з палёгкай сказала яна. І голас яе быў кволы.

«Вось і добра. Ты яшчэ ўстанеш», — падбадзёрыла Марыя.

«Не-е, — яна пахітала галавою на падушцы. — Гэта апошні дзень. Чалавеку даецца перад канцом адзін дзень, каб распарадзіцца тым, што ён пакідае пасля сябе. — Яна змоўкла, прыкрыла вочы. Адпачыла крышку і сказала: — Снег выпаў... І я ляжу ўся ў снезе па грудзі».

«Я грэлачку табе ў ногі пакладу».

Яна пахітала галавою:

«Сядзь лепей каля мяне».

Марыя паслухалася. Села. А ў самой скамянела ўсё ў грудзях, застыла, слова не вымавіць. Яна ўзяла мацерыну руку ў свае. І, здалося, не рука гэта, а галінка вішні.

«Ты, калі я стану цяжка-цяжка дыхаць, падкладзі пад плечы мне свае рукі. Не хачу мучыцца».

Марыя больш не магла трываць, боль разрываў грудзі, і яна прыпала тварам да яе рукі.

«Не трэба, — сказала ціха маці. — Усе мы прыходзім у канец дарогі. Не трэба... — голас яе трапятаў язычком дагараючай свечкі. — Помніш, вы яшчэ малыя былі, а я нанялася рэзаць лёд зімою. Куб пада мною адваліўся, — я і шухнула ў раку. Абмерзла ўся, пакуль да жылля дапяла. Захварэла. Ты і Аленка вельмі плакалі. Можа, таму я і не памерла тады, выжыла. А цяпер не трэба... Пажыла я, даволі...»

Яна змоўкла. Закрыла вочы. Ні адна рыска, ні адна зморшчынка не варушыліся на яе твары. І Марыя прыпала да яе лоба губамі, як рабіла маці некалі, правяраючы, ці не гарачыя ў іх галоўкі.

«Мама, мама», — трывожным і роспачным шэптам сказала яна, ці то намагаючыся, ці то баючыся яе пабудзіць.

Яна зноў прыадкрыла вочы, цяжка, як пасля доўгага сну, які яшчэ не адкаснуўся.

«А вы жывіце дружна. Раз ужо так здарылася, што сталі вы сёстрамі, жывіце, як сёстры».

«Як так здарылася?» — прашаптала Марыя.

«Нашу вёску спалілі. Мяне з дзецьмі, я іх абаіх на руках несла, пагналі ў канцлагер. Там дзеткі мае загінулі: у іх бралі кроў. Я вас знайшла, як аслабанілі. Усе, у каго былі дзеці, кінуліся ў дзіцячы барак. Я ведала, што маіх няма ўжо, але не магла не пайсці. Хоць зірнуць на тое месца... Вы ляжалі знясіленыя на нарах. — Ёй цяжка стала дыхаць, грудзі захадзілі. Нібы апошняе хваляванне, балючае сэрцу, цяпер, перад смерцю, завалодала ім. — Цёмненькая, добра ведаю, што францужанка, а вось другая — не ведаю. Яна ўсё маўчала, толькі галоўкаю хітала, так і не пачула ад яе ніводнага слова. Доўга не чула, думала, што яна нямчурачка. А потым давай яе вучыць гаварыць па-свойму. Гавару, а

яна толькі пазірае ды губкамі варушыць. А гукі недзе глыбока-глыбока, ніяк не выплываюць з таго дна. Потым сказала: ма-ма, — і заплакала... Раней нічога, а потым я ўсё перажывала, можа, хто шукаў вас, можа, маці якая гаравала, а я... вас забрала. Але ж і пакінуць нельга было...»

...У цёткі Марыі голас ірваўся, як дрэнна ссуканая нітка. І ў мамы блішчалі слёзы на вачах.

— Лепш не ўспамінаць... Не ўспамінаць... Дзеці, ідзіце спаць. Ідзіце, дзеці.

Было ціха, толькі за вокнамі недзе шамацела лісцем бяроза. Сон павузіў вочы Росціка, і маці ўстрапянулася, як птушка. А цётачка сказала:

— Вось, мусіць, з таго далёкага дзяцінства і помню гэта: Додо, фэ додо... Йа клёша кі нё дор па, іл сё промэн дан ле буа...

Яна змоўкла.

— Спі, засынай, толькі кот не спіць, шпацыруе па лесе, — пераклаў Сева.

— Хутчэй за ўсё гэта калыханка. Толькі хто яе спяваў, на жаль, ніколі не даведацца.

— Сева, як ты думаеш: яе знойдуць? — пытаў, ужо лежачы ў ложку, Росцік.

— Каго? — не зразумеў той, бо думаў пра цётачку Марыю, пра бацьку, пра тое, якая пясчынка — лёс чалавека ў дзюнах гісторыі.

— Бабулю.

— Калі будуць шукаць, то знойдуць, — памаўчаў. — Канечне, знойдуць.

— А мы ніколі не даведаемся нічога пра сваіх бабуль? Пра дзядоў сваіх? — (У голасе Росціка столькі сапраўднай тугі, нібы ён — маленькая птушка, якая носіцца непрыкаяна над светам, не ведаючы, дзе запыніцца. Настрой яго перадаўся Севу. І вось ужо — дзве птушкі плаваюць у высокім небе, падымаючыся ўсё глыбей і глыбей у блакіт, а гнязда іх не відно.) — Ніколі-ніколі... Нават калі ты станеш вялікім гісторыкам? — дапытваецца Росцік.

Сева маўчаў. Ён не ведаў... Не ведаў...

— Ну чаго ты маўчыш, Сева, гавары.

— Ты ведаеш, чаму пяюць пеўні?

— Не. Чаму?

— Таму, што ў гэты момант на небе ўзыходзіць зорка, якая будзіць іх.

— Як нас сонца?

— Ты малайчына, Росцік. Усё разумееш. Людзі — ёсць совы і жаўранкі. Адны ўстаюць вельмі рана, другія — позна. Гэта нездарма. Тысячагоддзямі людзі арыентаваліся па сонцы. Сонца ідзе з усходу, і паўсюдна, куды яно прыходзіць, прачынаюцца людзі. Вось так з усходу на захад, быццам хваля коціцца, прачынаюцца, прачынаюцца людзі. Але цяпер усё пераблыталася. На зямлі былі войны, землятрусы, патопы. Людзі пераблыталіся. А трэба б іх рассяліць па сонцы. І тады кожны будзе ведаць, адкуль хто.

Росцік маўчыць, не азываецца.

— Росцік, ты чуеш? — ціхенька пытае ён.

«Росцік, ты чуеш?» Голас раскаціста, уроссып аддаецца рэхам: «Чуеш... чуеш... чуеш...», — моцнымі, сухімі, як удары каменняў ад высокіх гор, басавітымі і хрыплымі ад мораў, тонкімі, нібы званочкі, ад ледзяных рэчак, глухімі і сіплымі ад лясоў. «Ро-с-ці-к, ты чуеш... чуеш... чуеш... Мы птушкі... птушкі... птушкі... Ляцім за сонцам... сонцам... сонцам... Мы птушкі... усё наша, зямля... зямля...»

«Давай знойдзем бабулін дом... дом... дом...» — чуе памножаны свой голас. І ляціць, ляціць над лясамі, над марамі, над рэкамі...

«Падымемся вышэй... вышэй... вышэй, — чуецца Севаў голас. — Калі ўзарвецца тая ракета, мы згарым, згарым... гарым... І ўпадзем чорнымі галузамі на зямлю... зямлю... лю... лю...»

«Давай ператворымся ў рыбін... рыбін... рыбін... Паплывём на дно мора... мора... мора... а-а-а...»

«Мора ўскіпіць, ускіпіць... піць... піць... піць...»

Росцік адчуў, як перасохла ў роце. «Трэба адкрыць рот, — падумаў ці нехта падказаў. — Бачыў жа, птушкі ў гарачыню сядзяць з адкрытымі дзюбамі. Хіба яны не ведаюць, што ў нашым парку ёсць месца, дзе не перастае дождж? Ляцім туды. Не, мы рыбы... А мора так горача кіпіць... піць... піць...»

— Росцік, Росцік, што з табою? — Мама стаяла на каленях перад яго ложкам. — Табе нешта сніцца? Піць? Зараз прынясу. Госпадзі, ён жа ўвесь гарыць.

Сева спрасонку не разумеў, што здарылася. Чаму тут мама? Што з Росцікам?

— Я ж гаварыла, гаварыла, нельга яму адразу столькі інфармацыі, — дакарала яна Севу.

Ён уключыў лямпу, сеў на ложак да Росціка.

— У цябе нешта баліць? — папытаў у яго.

— Не ведаю. У мяне проста сліна не глытаецца.

— Ма-а, у яго баліць горла, — сказаў ён мацеры, якая несла градуснік.

І бацька ўжо быў тут як тут, хоць позна вярнуўся з работы.

Мама была ласкавая і заклапочаная. У яе нават зморшчынка з'явілася на лобе. Росцік дацягнуўся рукою, хацеў расправіць яе, разгладзіць, але не, не разгладжвалася, відаць, ужо прывыкла да лоба, а Росцік раней яе не бачыў.

Яна прысела на ложак, ухутвала яго — заматала шыю сваёй пуховай хусткай. Нават хацела накарміць яго з лыжачкі, як малога, маннаю кашаю. Росцік ведае ўсе гэтыя хітрыкі: мама спяшаецца, яна думае, што так будзе хутчэй — запхне, запхне яму ў рот кашу, а так ён будзе сядзець над талеркаю, нудзіцца.

І Сева зайшоў, сказаў:

— Не сумуй, Росцік-хвосцік. Я табе прывязу...

— Што? — Росцік ледзь пракаўтнуў гэта слова, балела горла.

— Свісток.

Росцік скрывіўся: свісток. Гэта значыла — нічога.

— Ідзі хутчэй, свісток. Спознішся, — прыспешыла яго мама. — Сам цэлы прыязджай...

Сева быў ужо ў прыхожай. Мама кінулася да яго.

— Себанька, хлопчык, глядзі ж, будзь асцярожны...

— М-а-а, — дакорліва працягнуў ён, зачыняючы дзверы.

Вось каму зайздросціў Росцік. Сева едзе ў сапраўдную вёску, сёння ён раненька збіраўся: цётачка пазваніла.

— А ты ляжы, сынок, паспі яшчэ, — угаворвала яго мама, — ты ж дарослы ў нас. Мне абавязкова трэба пайсці сёння на работу. Разумееш? У мяне вельмі тэрміновае заданне. Разумееш?

Росцік згодна кіўнуў галавою.

— Я табе буду званіць. Праз колькі табе званіць? І тата заскочыць... Так?

Росцік ведаў: тата, можа, і не заскочыць, яго ж чакаюць хворыя. Можа, ён увесь дзень будзе насіцца «пад сірэнаю».

— Ды ён жа ў нас малайчына. Дарослы чалавек! — падбадзёрыў і тата, не абяцаючы заскочыць.

— А я пастараюся доўга не быць, можа, удасца работу ўзяць дадому, — гаварыла мама. — Бабуля будзе таксама спаць. Ты яе не трывож. Яна пасціць, потым за ёю прыедуць.

— Яе ўжо знайшлі?

— Ага, знайшлі... І прыедуць пасля работы... Я буду дома.

Гэтая навіна і абрадавала, і засмуціла Росціка. Але яму было цікава: хто знайшоў бабулю. Уяўленне малявала тлустых, як майскія хрушчы, хлапчукоў накшталт Дудаля, злых цётак, з пляміста чырвонымі шчокамі і залатымі зубамі, заплаканых дзяўчынак, хлопцаў накшталт Веніка... Магла ж быць у Веніка бабуля. А ён усё брынькаў, брынькаў на гітары і гарлапаніў свае песні. Потым пачынаў шарыць у бабуліных кішэнях. Цяпер жа ён не спыняў хлапчукоў. Вось яна і пайшла...

Уключыў магнітафон: а там раўлі, гарлапанілі не па-нашаму, свісталі, такое нават тата не выносіць, не гаворачы пра маму і цётачку. Але думаць, уяўляць усё гэта было нібы стаяць на галаве. А станеш на ногі — увесь перакулены свет таксама робіцца звычайным, звыклым. І, здаецца, што бабуля так заўсёды і жыла з імі, толькі на трошкі-трошкі некуды ад'язджала. А наогул, ні ляжаць, ні есці, ні гуляць, ні чытаць, ні маляваць не хацелася. Хацелася ўключыць тэлевізар. І ён уключыць ціхенька-ціхенька; шэптам. Яна не пачуе. Ён нават можа навушнікі надзець, як робіць Сева. Толькі Сева недзе схаваў іх — не знайсці. «Сеўка-плеўка, а сам толькі заўсёды свісткі абяцае». Ні ў стале, ні ў тумбачцы пад тэлевізарам, ні ў шафе — нідзе навушнікаў не было. «Ну, Сеўка-плеўка, напэўна, з Вадзікам на нешта памяняўся. Ці Вадзік выпрасіў: «Дай мне паслухаць трошкі, пакінеш — і твой Росцік-хвосцік паломіць». Нядаўна ён так прасіў у Севы велік на месяц пакатацца: «Дай, ты будзеш здаваць экзамены — Росцік паломіць». Быццам Росцік сапраўды калі-небудзь што ламаў. Сеўка гаворыць: «Мама, я дам Вадзіку на месяц велік пакатацца». «Добра, — адказала мама, — а што, Вадзік нам дае на гэты час «Запарожац»?» Вадзік чамусьці

так здзівіўся, ажно ледзь вочы на лоб не выскачылі. А на веліку толькі раз пракаціўся і прыгнаў. Напэўна, не захацеў мяняцца на «Запарожца». Няма нідзе навушнікаў... Ну, Сеўка-плеўка... Тады трэба ў бабулі папытаць дазволу, толькі не забыць сказаць: «Калі ласка».

Росцік асцярожна прыадчыніў дзверы ў залу: бабуля, зляжыўшы стосікам пасцель, сядзела на сафе, быццам глядзела тэлевізар, і ён абрадаваўся. Але экран не свяціўся.

— Бабуля, калі ласка, я ўключу тэлевізар, — сказаў Росцік.

Яна заківала галавою:

— Уключай, дзетка, уключай...

Экран заміргаў, засвяціўся. Зноў дыміўся той, учарашні абернуты фургон, толькі ўсё круцілася і круцілася, як ваўчок, кола. Сабакі, напінаючы павадкі і цягнучы за сабою асцярожлівых паліцэйскіх, якія па магчымасці стрымлівалі іх, парываліся да фургона...

Росцік ведаў: гэта паўтаралі ўчарашні сюжэт пра амерыканца, які, пратэстуючы супраць устаноўкі ракет, пагражаў узарваць абеліск, нацыянальны гонар Амерыкі. Але... у яго не аказалася дынаміту. І фургон яго ляжаў на баку, а да яго прама, навастрыўшы насы і, відаць, чуючы пах свежай чалавечай крыві, ірваліся сабакі.

Бабуля таксама пазірала на экран.

— Вось так — папрывучваюць, потым яны на людзей кідаюцца, — сказала яна. — Ад нас як турнулі гітлераўцаў, дак яны і сабак адцураліся. Па лясах тыя разбегліся і на людзей кідаліся, здзічэўшы зусім. Ваўкалакамі іх звалі...

Росцік павярнуўся да бабулі, слухаў, што яна расказвае. Яна гаварыла, не пазіраючы на яго, нібы сама з сабою. Нібы хацела выліць з душы той мул, што ўсплыў, ускаламучаны гэтымі, што напіналі павадкі, сабакамі. Як убачыла іх і ўспомніла, ажно скаланулася.

— Доўга яны па лясах яшчэ бадзяліся. Помню, ішла я з раёна, па пошту хадзіла, у розыскі на радню падавала. А зімою — колькі таго дня. Ураз і сцямнела. Ну, яны мяне і аблажылі з усіх бакоў. — Яна раптам як ачнулася. Зірнула на Росціка: ці яму гэта расказваць. Дзіця, баяцца будзе. Але ён прасіў:

— Расказвай, бабуля.

— Падгалістыя, дужыя, як жарабкі. Бягуць, гоцаюць

лапамі па сцежцы, ззаду, ажно кіпцюры, чутно, намерзлыя цокаюць. І збоку бягуць, па снезе, мякка ступаюць, але зубы, як абцугі, клацаюць. Ішла і толькі адно думала, сцераглася, каб не паслізнуцца, не ўпасці, бо тады ўся гайня і ўссядзе на плечы, парвуць на кавалкі. Бегчы таксама няможна — пагоняцца. Не верыла: як так во загінуць, праз пекла вайны прайшоўшы, усё вытрываўшы. А кроку не наддаць — ногі, як дзеравянныя, не гнуцца. А ў роце горка, мо жоўць разлілася са страху. Вось так во і ішлі да вёскі. Як выплылі агеньчыкі яе, як з туману, ледзьве стрымалася, каб не пабегчы. У грудзях сперла — дыхаць нельга. І яны занерваваліся: неахвота было адставаць, падвываць сталі ад роспачы, павісквацьк. Ужо ля хат я рукі падняла, нешта хустка мая, як капшук, надзьмулася, халодзіць скуру мароз. Мацнула, ажно гэта мае валасы пасталі, папруцянелі, як шчэць парабіліся. Тырчаць, як хіб у дзіка...

Бабуля, здаецца, вінілася перад ім, што расказала гэтакае страшнае, заглядвала ў вочы. І адразу ж пачала супакойваць:

— Ты ж хаця не бойся. Гэта даўно было. Цяперака іх нідзе няма ў нас. Усіх пералавілі. Панішчылі.

Спачатку Росцік не зразумеў, адкуль гэтае дзілінькание: з прыхожай ці з тэлевізара. Але яно паўтарылася, настойлівае і рэзкае. Ніхто, ні мама, ні тата, так не звоніць, хоць як спяшаюцца. Нават ён, Росцік, калі ўжо, бывае, дацерпіцца, што здаецца, на хвіліну спынішся і пацячэ раўчук. І Воўка з суседняй кватэры так не звоніць, ён кораценька, толькі пальцам ткне ў кнопку і адыходзіць, бы апячэцца, ці толькі дзынкне, бы сілы ў яго ўжо ні-ні. Але адчыніш дзверы, кінецца, як баран, у бойку, можа з ног збіць: да долу партфель і вопрамеццю ў туалет. А там пасля цэлае мора на падлозе. Росцік бярэцца тады яго ўшчуваць: «Чаго свае дзверы хутчэй не адчыняў!» «Свае... баяўся, што не паспеў бы», — вінавацiцца Воўка. І праўда, доўга потым корпаецца ключом у замку, пакуль свае дзверы адчыніць.

...Званок ужо прадзілінькаў, можа, тройчы. «Хто ж гэта можа быць?» Росцік зірнуў на бабулю. Яна таксама прыслухалася.

— Гэта яны, — сказала трывожна, з нейкім нават жалем. Было ўяўленне, што за дзвярыма нехта не вельмі харошы. Можа, нават і дрэнны. Росцік намерыўся не адчыняць. Але званкі сыпаліся, як гром з неба.

Бабуля замітусілася, пачала шукаць сваю жакетку, але не знаходзіла, трывожна пазірала на дзверы, нервавалася.

— Адчыні, дзетка, — сказала яна Росціку, а сама прысела, бы ногі яе памлелі. — Гэта яны па мяне...

Росціку не хацелася адчыняць, але ён паслухаўся бабулі. Пакруціўшы гузік замка, падаў на сябе дзверы, а сам стаў за імі, як адчыняў суседскаму Воўку. Здавалася, яны, тыя, што за дзвярыма, зараз уварвуцца, саб'юць яго з ног.

Адчыніў... Яны стаялі, не рухаліся, нібы не самі толькі што так настойліва званілі. Росцік выйшаў з-за дзвярэй.

— Прывет! — сказаў яму высокі танклявы мужчына, за ім стаяла бляклатварая, з белымі-белымі, быццам лялечнымі, валасамі жанчына. — Гэта ты звалок нашу бабулю?

Росцік пазіраў на яго, моргаў вачыма, нічога не могучы сказаць, толькі балюча, ажно перасмыкаўся ягоны твар, каўтаў сліну, якая чамусьці збіралася і збіралася ў роце, а каўтаць балела горла.

Мужчына рашуча накіраваўся ў кватэру, а за ім — і яна.

— Бабуля, слава богу, — закудахтала, як курыца, — а мы ўвесь горад скаланулі. Гаварылі ж вам на вуліцу не хадзіць. Тут сам, бывае, закруцішся, не ведаеш, у які бок едзеш. Збірайцеся хутчэй. Што ў вас было надзета?

Росцік убачыў, як упаў у сухія далоні бабулін твар, яна нібы спужалася гэтых людзей. І Росцік увесь сцяўся ад болю, балела не ў горле, боль ішоў аднекуль з грудзей, вялікі, востры, праз горла ён ніяк не пралазіў, толькі раздзіраў яго пякуча і шчымліва. І Росцік стаяў, уцяўшы галаву ў плечы. А мужчына ўсё яшчэ пазіраў на яго, трошкі дакорліва, а хутчэй насмешліва, быццам здзіўляўся, маўляў, не чакаў ад такога шпанюка гэткай выхадкі. Бабуля яго, відаць, не вельмі цікавіла. На пальцы ён пакручваў ключык ад машыны на моцным бліскучым ланцужку, бы гуляў з ім, падражніваючы Росціка.

— Во-ой, не хачу-у, — праз стогны выдыхнула бабуля. — Вот жа ў людзей ціха, і прылегчы можна...

— Бабуля, — угаворвала жанчына, яна, мусіць, была ўнучка, толькі ўжо дарослая. — Гэта ненадоўга. Ну,

колькі вам гаварыць, як толькі атрымаем новую кватэру, так і адвязём вас...

— Як жа? Вы ж хату маю прадалі! — бабуля ўжо гаварыла нават са злосцю, нервова, капрызліва.

— Мы не назусім, часова, разумееце, часова надзейным людзям... — талкавала жанчына, напінаючы на бабулю амаль сілком жакетку. Бабуля не давалася. Хутчэй за ўсё яна нічога не разумела, сцялася, як апруцянела, ад гэтае навіны.

— А ўчора я ўсяператрэслася, — даводзіла ёй белавалосая. — Можа ж у любы час быць абследаванне. Думаю, прыйдуць, а вас няма. Скажуць: фікцыя. Дакажы потым. Так і будзем сядзець у цеснаце...

Сілаю, як дзіця, апранала яна бабулю, тая ж, здаецца, скарылася, стала абыякавай і паслухмянай, абвяла, як расліна.

Росцік не разумеў, пра што яны гаварылі, толькі адчуваў — бабулі дрэнна, але яна скарылася: усё вырашаюць яны, гэтыя двое. І яны зробяць так, як захочуць, як ім трэба.

— Ну, што ты ёй тлумачыш. Знайшла месца і час, — занерваваўся, аж затанцаваў на месцы, як конь, мужчына, на падлозе адазваўся цокат яго падкаваных абцасаў, а ключык заматаўся хутчэй. — Бяры яе і — у машыну. Угаворвае...

І Росціку хацелася заплюшчыць вочы і бадануць яго галавою ў жывот, каб ногі задраў, але ён толькі моцна-моцна сцяў кулакі, а ў горле нешта балюча рвалася, ажно слёзы засцілі вочы.

Жанчына. пачала падштурхоўваць бабулю да парога..

— Пачакай, — сказала тая, — яшчэ вось што...

Яна хацела, відаць, яшчэ нешта выпатрабаваць, можа, каб гэты, падкаваны, не ўключаў на ўвесь вечар магнітафон, дзе ўсё не па-нашаму, аж у галаве робіцца нядобра, ці каб адвялі ёй месца, дзе можна было б памерці так, як паміралі яе бабуля і маці. Ці, можа...

— Потым, потым, у машыне пагаворым, — прыспешвала яе жанчына.

Трэба было ісці, нічога не зробіш. І бабуля патэпала ў прыхожую. Сумна і балюча перасмыкнуўшы тварам, зірнула на Росціка, дакранулася да яго пляча сухою рукою, нібы няўзнак, абаперлася і сказала:

— А ты нічога не бойся, дзетка. Здаровенькі расці.

Шкада, што я не навучыла цябе замове. Замове ад страху...

У Росціка, як слюдою, зашкліліся вочы, і бабулін твар пачаў расплывацца, сцірацца, губляючы рысы, у жаўтаватую пляму, бы і не твар то быў, а кветка дзьмухаўца на сонцы.

— Толькі, дзеткі, ад цяперашніх страхаў няма замовы...

Мужчына, нецярпліва падрогваючы нагамі і пакручваючы ключык, засланіў яе сабою, потым павярнуўся да Росціка, зірнуў на яго насмешліва, як на несамавітага, чамусьці нахабна падміргнуў, як Дудаль, моцна тузануў на сябе дзверы, і яны з ляскатам зачыніліся.

Пакуль Росцік апамятаўся і адчыніў іх, на лесвіцы нікога не было. Ён кінуўся ў кватэру — да аднаго акна, да другога, на балкон. Але нідзе іх не было. Спяшаліся людзі, трамваі, машыны; бабулі і тых дваіх не было відно. Шапацела бяроза за кухонным акном, і вецер штурхаўся ў гардзіну, як невідочны шчанючок, якога ні прылашчыць, ні пагладзіць. А кватэра зусім пустая, глухая і адзінокая. У грудзях стала раптам слабка, і слёзы не сцякалі, як дажджынкі, а лінуліся вольна і спорна, выкочваючыся на шчокі. Ён ледзь паспяваў іх выціраць. І разам з імі прарваўся голас, амаль незнаёмы. Ён вырываўся штуршкамі, як ікаўка, ірваў сцятае горла, і тады Росцік даў яму волю. Балазе, ён быў адзін і ніхто не чуў яго і не бачыў. І тэлефонную трубку ён зняў, хліпаючы, прыклаў да вуха, яшчэ не ўняўшы гэтага нутранога голасу.

— Росцік! Росцік! Ты чуеш мяне? — аднекуль здалёк, праз гуд правадоў, праз трэск і папіскванне ў эфіры, праз яго, Росцікаў, плач нёсся Севаў голас. — Росцік, я з аўтамата. Мы яшчэ не паехалі, чакаем аўтобусаў.

— ...

— Росцік, чаму ты маўчыш?

Росцік затаіўся, з болем пракаўтнуў слёзы.

— Яны забралі бабулю, — пажаліўся ён.

— Хто яны?

— Маладыя дзядзька з цёткаю. Забралі і павезлі. Сказалі, што хату яе прадалі не назусім, а на трошкі і адразу яе туды адвязуць.

— Як гэта?

— Не знаю.

— ...

— Сеўка, ты пашукай там нашу бабулю. Яны сказалі, што яе адразу завязуць.

— Росцік, гэта, можа, не ў той вёсцы.

— А можа, і ў той. Сеўка, ты чуеш? Сеўка...

## 15

...Плошча каля заводскай прахадной была запруджана людзьмі, як перад дэманстрацыяй на свята. Але сёння ўсе непазнавальныя, апранутыя ў штармоўкі, курткі, спартыўныя касцюмы, абутыя большасць у кеды, красоўкі, толькі старэйшыя мужчыны ў старыя, хто-ніхто ў пакрыўленыя чаравікі, гумавікі, моладзь нават у модныя, пухнатыя. Сумкі, рэчмяшкі былі састаўлены разам ля лавак ці кінуты проста дзе папала. Гэта нагадвала што каму: каму бежанства ці цыганскі табар, Севу ж — нядаўнія паездкі ў піянерлагер. Людзі сноўдаліся, размаўлялі, паспешліва забягалі ў магазін — нехта нешта забыў, у чаканні ад'езду круцілі транзістары, хоць з рэпрадуктара каля прахадной гучалі бадзёрыя песні. Сева выглядваў цётачку Марыю. Няўжо яна не выйдзе? Паваніў Росціку, а яе ўсё не было.

Гэтаю ноччу, пасля таго як разбудзіў іх Росцік, ён доўга думаў пра яе, пра маму, пра тату, пра Росціка, наогул пра ўсіх іх, і нават пра гэтую бабулю. Нейкае новае, яшчэ незразумелае пачуццё з'явілася ў яго душы. Не, не з'явілася, яно, мусіць, нібы зярнятка ў глебе, ляжала на дне душы, а цяпер пачало прарастаць. І кволымі, але чэпкімі карэньчыкамі ўпарта чаплялася то за Росціка, то за цётачку, то за маці. Яно збірала іх разам вакол яго, і ён не мог зразумець, да каго мацней цягнецца карэньчык яго пачуцця, з якой крыніцы прагне найбольш напіцца. Цяпер ён не ўяўляў іх паасобку, не ўяўляў адно без аднаго — толькі ўсіх разам, як пялёсткі аднаго рамонка, які рос на высокай клумбе каля заводскай прахадной. Можа, упершыню адчуў радасць проста думаць пра іх, ведаць, што яны ёсць. І жахліва нават у думках было ўявіць, што яны маглі быць чужыя, што яны былі чужыя, а вось сабраў іх лёс і парадніў, што яны могуць калі-небудзь зноў стаць чужымі. Тое, пра што ён даведаўся, усхвалявала і ўразіла яго. А ён жа ведаў толькі драбніцы з таго, што таілі іх душы і сэрцы. Хацелася ведаць болей — усё. Хвалявала яго па-іншаму цяпер і тое пісьмо, што было схавана ў шуф-

лядцы трумо, і паводзіны цётачкі Марыі. Асабліва яе... Асыпаліся пялёсткі рамонка, падалі долу...

Яшчэ ноччу прыйшло яму ў галаву недзе пачутае ці вычытанае, што людзі, калі пачынаюць старэць, успамінаюць дзяцінства, нават маленства да самых драбніц, і так яскрава, быццам усё, бачанае і чутае тады, было няйначай як учора.

А цётачка Марыя старэла. Ён ведаў, яна падфарбоўвае валасы, каб не было відаць сівізны, і часам сумна разглядвае сябе ў люстэрка. І гэта яе додо, фэ, додо... — калі гэта яна ўспомніла, значыць, успомніла нешта яшчэ, а можа, і ўсё: хто яна і адкуль, толькі тоіць ад усіх, як таіла сказанае бабуляй, а сама выбірае хвіліну, каб пакінуць іх, паехаць шукаць сваіх? Ад гэтых думак сірацела яго сэрца і заўчасна і журботна пачынала сумаваць па цётачцы Марыі. Ён любіў яе, як маці, і, можа, болей мацеры, жарсткаватай, строгай. Матчыну строгасць заўсёды перамагалі цётчына памяркоўная дабрыня і развага.

Таму так радасна раптам стала: вось і яна! Цётачка Марыя шукала вачыма, канечне ж, яго, хоць ёйківалі, загаворвалі знаёмыя. Многія яе ведалі. Але яна не спынялася каля іх. І Сева, абрадаваны, падаўся насустрач. Цётачка была ў чорным, хораша падагнаным бліскучым рабочым халаце. Крышку строгая, але такая родная і прыгожая. І, канечне ж, несла авоську, напакаваную скруткамі, кулькамі. Гэта адзінае, што засмуціла яго, бо толькі нядаўна спрачаўся з маці, якая старалася ўвапхнуць у рэчмяшок, здавалася, усё, што было ў доме і належала і не належала яму. Цётачка перш-наперш таксама ўзялася пакаваць усё ў рэчмяшок.

Сева незадаволена скрывіўся:

— Што я, на год еду? І так не панесці.

— Аўтобус завязе, — сказала яна.

Да іх падыходзілі людзі, віталіся з цётачкаю Марыяй, спыняліся, гаварылі. Але вось яны засталіся адны. Селі на лаўку, у цені ліп.

Сева нерваваўся. Яму абавязкова на развітанне трэба было пагаварыць з ёю. Абавязкова, пакуль не прыйшоў аўтобус. І ён без лішніх уступаў, нібы працягваючы тую іх гаворку, папытаў пра тое, што было для яго вельмі важна:

— Цётачка, а ты нічога... нічога не помніш з дзяцінства?

Яна адразу нібы не зразумела, здзівілася:

— А-а, ты пра гэта... — На хвілінку задумалася, наморшчыла лоб. — Чаму ж? Я помню белы дом і вялікіх белых птушак, можа, гэта былі лебедзі ці гусі. Калі мы з маці вярталіся дадому, я ўсё чакала, што вось-вось пакажацца той белы дом. Прыйшлі мы на нейкую пустку, зямля там дымілася. Я папытала: «Дзе наш белы дом?» Помню, што яна чамусьці не ўсё, здавалася, разумела, што я гавару. Я таксама не ўсё. Яшчэ з дзяцінства запала ў душу нейкае непаразуменне, а потым і яе і маё імкненне — зразумець. Помню, яна зірнула разгублена, вінавата. Потым сказала... Не, не магу дакладна сказаць, ці сказала, ці я ўсё зразумела сама: «Ён тут быў, куды мы прыйшлі, але фашысты разбурылі яго, усіх загналі пад зямлю, і мёртвых, і жывых. Бачыш дымкі — гэта зямлянкі. Там цяпер жывуць людзі».

— І яна болей не расказвала вам нічога пра дзяцінства?

— Хто?

— Бабуля.

— Мілы мой, — сумна сказала цётачка Марыя. — Ёй было некалі. Яна ўсё працавала: сеяла, жала, касіла, арала. Божа мой, што перарабілі яе рукі! Яна зімою наймалася нават лёд рэзаць на рацэ. І яны былі чырвоныя, прыпухлыя, у крывавых драпінах.

— Хто?

— Рукі. Нас жа трэба было пракарміць, адзець. Яна ўсё чакала з фронту мужа. Помню, залезем мы вечарам на печ усе разам, прыціснемся адна да адной, абдымем яе. А яна расказвае: «Вось прыйдзе тата і нас не пазнае, скажа: «Манечка, якая стала, коскі пацямнелі». А я яму — зірні, у яе і радзімка якая ля вушка, як слёзка. А ў Аленкі вочкі зелянцовыя сталі, колер змянілі. У дзетак, як падрастаюць, заўсёды вочы мяняюцца».

У цётачкі Марыі, ці гэта толькі здалося Севу, вочы таксама сталі сінія-сінія, бліснулі слёзы, нібы раса на валошцы. Строс адну вецер, пакацілася, празрыстая, на шчаку, але яна прыкрыла яе далонню, сцерла. Усміхнулася вінавата.

А ў Севы сціснула горла, слова не сказаць, і не гаварыць нельга. Ледзь выціснуў:

— А ён... Пазнаў.

Цётачка Марыя на імгненне задумалася. Хацела адказаць...

— Едзеш?! — не то папытаў, не то пацвердзіў майстар Мікіціч, нечакана перапыніўшы іх гаворку.

Яны і не заўважылі, што ўсе ўжо садзяцца ў аўтобусы. І толькі яны нібы нікуды не збіраюцца, прахалоджваюцца ў цяньку. Цётачка заспяшалася. Стала сама хапаць, каб паднесці рэчмяшок. Але Мікіціч адвёў яе руку.

— Пакосіш сена і давай не дуры, вяртайся ў цэх, — сказаў ён сурова, але вочы яго пазіралі цёпла, і Сева кіўнуў у знак згоды. Ускінуў на плячо рэчмяшок, падаўся да аўтобуса. І потым праз шкло ўбачыў іх, цётачку Марыю і майстра Мікіціча. Яны стаялі побач. Ён нешта сказаў ёй. І яна ўсміхнулася. І ад таго, што яны былі побач, і ад цётаччынай усмешкі яму стала спакойна і хораша. Але ўсю дарогу не пакідала адчуванне, што ён нечага не сказаў ні цётачцы, ні яму, Мікіцічу. Гэта штосьці было цёплае і мяккае, радаснае і журботнае, яно пякотна залягло ў грудзях ля самага сэрца, яго пакуль што і нельга было выказаць словамі, хіба толькі мякка дакрануцца да цётаччынай рукі, падаць ёй скоранька паліто ў прыхожай, а на рабоце вазіць і вазіць кацёлкі, траляваць іх на гэты ненажэрны канвеер, каб убачыць, што ў майстра Мікіціча на месцы бровы, а не сышліся на пераноссі ў адну лінію, і вочы раптам бліснуць, засвецяцца, нібы блік асенняга сонца ўпадзе на ваду.

Раней ён, калі прызнацца, недалюбліваў майстра Мікіціча. Цяпер зразумеў, што проста раўнаваў цётачку да яго. Яна, ён чуў, як гаварылі дарослыя, яшчэ маладою дзяўчынаю, прыгажуняю з прыгажунь, з-за яго прыехала ў горад, уладкавалася на яго ўчастку. Вучылася, скончыла вячэрні тэхнікум, а з цэха так і не пайшла.

І цяпер ка́залі, што майстар Мікіціч заве яе замуж, а яна нешта ўсё раздумвае, маўчыць, нечага ўсё чакае. «І правільна», — думаў Сева, баючыся яе згубіць, аддаць гэтаму чужому чалавеку.

Думка, што зараз прыйшла яму ў галаву, была жахлівая: яна ўспомніла той белы дом і, пэўна ж, паедзе яго шукаць. Вось чаму яна не ідзе за Мікіціча. Вось чаму! Таму і таіла ўсё ад іх, не казала.. Няўжо пакіне іх, няўжо паедзе? Свет, утульны і ціхі, трывалы і моцны, які дасюль быў у іхняй сям'і, здаўся хісткім і кволым. Усе яны нібы ўзляталі разам на гушкалцы, якая магла

ў любы момант выслізнуць з-пад ног. Цётачка пакіне іх. І чаго яны будуць варты без яе дабрыні? Як жыць ім без яе супакойлівых, ласкавых слоў, без яе пяшчоты? І ён быў гатовы хоць зараз папрасіць прабачэння ў майстра Мікіціча і за сябе, і за Веніка, толькі б усё засталося як было. Каб ён мог гаварыць на такія тэмы, каб яны з майстрам Мікіцічам былі запанібрата, ён бы яму сказаў: «Што ж ты, стары (стары, канечне, у харошым сэнсе, як цяпер гавораць, наўродзі «брат»), што ж ты, стары, не бачыш нашу прыгожую, добрую цётачку, а ўсё рвешся, носішся за сваім канвеерам. Бяры яе за руку і трымай. Запрасі яе ў кіно, у тэатр, на танцы. А я, — не верыш, шчырае слова, — наважу гэтых кацёлак на ўвесь месяц наперад. Не дам спыніцца канвееру, не думай... І гэта рассяленне людзей па рэакцыі на ўзыход сонца — глупства. Усе мы адзін аднаму радня. І трэба быць разам».

Зноў успомнілася тое, прыхаванае пісьмо. Можа, гэта нехта знайшоў і маму, толькі яна хавае ад іх, не прызнаецца. Там жа так і напісана: «Нас параскідала вайна. Але мы знайшлі адзін аднаго. Знайшлі...» Упершыню прадчуванне самоты агарнула яго душу, нудліва заныла ўсярэдзіне, нібы ехаў ён не на нейкія два тыдні ў вёску, а, ні многа ні мала, — ляцеў у космас. Міжволі глянуў на прастор неба. Там, у яго сінім бяздонні, пакідаючы воблачны бела-бухматы след, імкнуўся ўвысь ледзь бачнай кропкай, як кончык стралы, рэактыўны самалёт.

Сева ўявіў сабе чалавека, які там адзін, сам-насам, спакойны, сабраны і ўпэўнены. Яны былі нібы браты, і гэтая роднасць надала яму цвёрдасці, і ўпэўненасць таго нібы перадалася яму. Шустрым позіркам ён яшчэ шукаў у людской мітусні на вуліцах родныя постаці.

Аўтобус спыніўся на ўскрайку вёскі, дзе былі гаспадарчыя забудовы: невялікая рубленая хата з пакатым дахам — брыгадзірская, высокая, крышку нібы пахіленая — вагавая, павець, мусіць, для сена. А наўкруг — выган, зялёны, квяцісты — крываўнік, палын, драсён, пырнік. Усё гэта густа зраслося, сплялося, наслалася на зямлю і здавалася б шчыльным, мяккім дыванам, каб не вытыркалі леташнія сухія бадылі палыну.

Памагатыя весела высыпалі з аўтобуса, пакідалі

рэчы і самі — хутчэй на мураву. Прыемна было распрастацца на халаднаватай зямлі, бесклапотна ляжаць, раскінуўшы рукі, слухаючы, як бэрсае валасы ветрык, падстаўляць сонцу твар, адчуваючы яго пякучую ласку.

Тыя, хто хутка прыстасоўваецца да любых умоў, ужо распраналіся, загаралі. Мужчыны, хлопцы паскідалі кашулі, некалькі дзяўчат — Севу гэта нават здзівіла — былі ў купальніках, як на пляжы, хоць вады не было і блізка.

Ён ляжаў таксама на зямлі, зняў толькі джынсавую, малаватую ўжо, але, як сказаў жартаўліва бацька — для сельскай мясцовасці сыдзе, — куртачку, застаўся ў белай футболцы: на грудзях — разяўленая ікластая пашча льва. Леў скаліўся, хутчэй усміхаўся людзям, сонцу, сіняму нізкаму небу, і зноў было лёгка і бесклапотна на душы. Побач з Севам сядзеў, абапёршыся на напакаваны, вялікі, як куль, рэчмяшок, мужчына. Сева бачыў яго на заводзе недзе ці не ў трэцім цэху. Мужчына быў, неспакойны, насунуўшы на вочы казырок палатнянай кепачкі,, ён задзіраў галаву, відавочна, гэты казырок замінаў яму, але ён як бы не здагадваўся, а толькі закідаў галаву, узіраўся некуды, некага чакаў, час ад часу незадаволена бурчэў:

— Ну, што ж яны, пара б і за работу. Чаго тут вылежвацца?

Яго падтрымалі некалькі цётак, гэткіх таўстух. Адна з іх скінула блузку і сядзела ў ружовым бюстгальтары. Яны пад'юджвалі мужчыну: маўляў, вось такія ў нас парадкі, адзін не ўмее арганізаваць работу, а церпяць усе. Абураліся так, нібы зараней ведалі, што гэтак будзе, а цяпер толькі радасна пацвярджалі свае прадбачанні. Сева слухаў, як яны шпілялі, падкусвалі гэтага, у кепачцы, відаць, ён быў за старшага, але не верылася, што яны так ірвуцца да работы. Хутчэй было так: ты мне дай работу, а як я буду працаваць — не твой клопат.

Гэта яму нечым нагадвала адну матчыну сяброўку: яна любіла піць глыткамі халодную каву, але заўсёды яе раздражняла, калі ў кафэ падавалі астылую. Яна любіла, калі кава астывала ў яе руках.

Мужчына моўчкі, скоса зірнуў на тую, у ружовым бюстгальтары.

— Не сарамаці людзей...

— Ці ты не бачыў? Другім і не цікава.

— Хлопец вот.

— Хлопец паболей твайго знае. Яны цяпер раннія.

Мужчына таргануў за казырок кепачку, нібы яшчэ болей хацеў прыкрыць вочы, глянуў на Севу.

— Чуеш, кучаравы, ці не ты Марыін пляменнік?

— Я-а, — адказаў Сева, чакаючы, што скажа ён.

Мужчына нешта шукаў у кішэні.

— Клапатлівая ў цябе цётка. На вось грошы, забыла аддаць.

— Чаго ж адразу аддаеш, яшчэ ў магазін пабяжыць. Глянь, падаліся вунь, — жанчына накінула на плечы блузку, паказала на двух, што ішлі ў напрамку магазіна.

Мужчына, выцягнуўшы шыю, прыўзняў падбародак.

— Турын з Ахрэмчыкам. Гэтыя не ўпусцяць, — зазначыў ён. — Ну, добра, — дадаў, нібы пагразіўся.

Да прыезджых ішла жанчына ў палінялым, які, відаць, пабачыў уволю сонца і дажджу, пінжаку. Пінжак аздабляла стракатая касынка, сяк-так завязаная на шыі, а можа, жанчына ссунула яе з галавы, з гладка зачэсаных пад грабеньчык валасоў. Жанчына ішла порстка і лёгка, можа, яшчэ і таму, што на яе танкаватых жылістых нагах былі лёгкія абшарпаныя ўжо кеды, ці, можа, клопат падганяў яе. Яна сапраўды здавалася вельмі сур'ёзнай.

Мужчына ў кепачцы, як толькі згледзеў яе, устаў, падаўся насустрач. Яна, убачыўшы яго, заўсміхалася, на яе цёмным абветраным твары бела бліснулі зубы.

— Старыя знаёмыя, — падміргнула сяброўцы адна з жанчын.

— Дзіва што, кожнае лета сена косіць, — зазначыла другая. — Астапавіч! — гукнула. — Ці скора тое свята будзе? — ажно ўздрыгнула яе белая хустка, завязаная так, нібы караблік тырчаў на макаўцы.

— Таварышы, — звярнулася да прыезджых жанчына (яна аказалася брыгадзірам). — Павінен зараз пад'ехаць старшыня — хоча пагаварыць, потым я вас раскватарую.

Сева не вельмі ўслухоўваўся, што гаварыў старшыня нешта пра надвор'е, пра цяжкасці засушлівага лета, пра недахоп рабочых рук — ну, як звычайна гавораць па радыё ці тэлебачанні. Севу адно ўразіла, што стар-

шыня быў зусім малады, гэты Астапавіч перад ім — бацька. Старшыня гаварыў і ніякавата хаваў вочы, апускаў галаву. Наперадзе людзей, што, сабраўшыся ў круг, слухалі старшыню, выставіліся дзве дзяўчыны ў вясёлых купальніках: рукі ў бокі, выгляд незалежны, позіркі гуллівыя. Яны нібы знарок хацелі збянтэжыць старшыню. А свае на іх пазіралі весела, з цікавасцю. Астапавіч апусціў ніжэй на вочы казырок, падаўся да тых дзвюх.

— Сораму няма... Выставіліся, — голас яго быў нізкі, сіпаваты, позірк знішчальны. Дзяўчаты адступілі далей, прысмірэлі. Астапавіч стаў на іх месца, нібы сцярог, каб зноў не высунуліся

Севу ён нагадаў нечым майстра Мікіціча, той мог яшчэ і трапнае слова сказаць, мянушку прыклеіць. Як яму аднойчы — Кудлай. Сева доўга не мог яму даравацы, але крыху падстрыгся.

І вось яны ўжо, узяўшы свае рэчы, ідуць па вуліцы вёскі. Вуліца шырокая, як праспект, пясчаная, абсаджаная дрэвамі. Не проста рад таполяў ці ліп, як у горадзе, а дрэвы розныя, ля кожнага дома свае, нібы гаспадары стараліся адзін перад адным, кожны хацеў, каб яго двор быў адметны. Ля аднаго дома раслі дрэвы, якія Сева бачыў упершыню. Яны трымцелі лістотай нават у гэты цёплы бязветраны дзень, і, мусіць, нечая трапяткая душа сумавала і непакоілася разам з імі тым вечным неспакоем, які не кожнаму дадзены і які не кожны разумее. Брыгадзір, тая хударлявая жанчына, якую Сева не зразумеў, як завуць, ці то Даліла, ці то Даліна, вядзе іх. Рухавая, яна звыкла ідзе наперадзе, забягаючы ў двары, або гучна, без цырымоніі выклікае гаспадароў, а потым дае каманды прыезджым.

— У гэты двор — хлопцаў, траіх.

— Няхай і чацвёрты. Месца хопіць, — дадае і гаспадыня, чарнявая, вастравокая, відаць, вясёлая і дасціпная, яшчэ не старая маладзіца. — Во, чатырох ды маіх два... Будзе цэлая хеўра. Хлопцы, толькі, гэтага... гарэлкі не піць. Бо павыганяю, будзеце пад плотам начаваць, — ці то жартам, ці то сур'ёзна грозіць яна.

Даліла-Даліна паказала на двух, кіўнула і Севу. І ён ужо хацеў падацца за імі, але ў двары насупраць, абапёршыся на веснічы, стаяла бабуля — уся нейкая надзвычай светлая, валасы, як снег, Сева ажно страпянуўся, здалося, што гэта тая самая бабуля... Казаў жа

Росцік, што яе адразу адвязуць. Спыніўся здзіўлены і пазіраў на яе.

— Даліна! Ото ж мяне мінаеш? — з кропляй горычы сказала бабуля і, высока, годна трымаючы бялюткі вянок сівізны на галаве, дадала: — Хата ў мяне бялёна. Млечко ёсць.

З-пад бялёсых броваў лілі ціхі сум вочы.

— Думала, можа, неспакойна вам будзе, бабуня Анэля, — адказала Даліна.

— Прашу хоць таго юнака, — кіўком яна паказала на Севу.

Сева ажно разгубіўся. За спіною чамусьці засмяяліся.

А ён, як загавораны, пакіраваў у яе веснічкі.

— Як цябе — Сева? — успомніўшы імя, пазваў яго Астапавіч, — уладкуйся і ў дзве гадзіны — да брыгадзірскай.

— Не заблудзіцца, — адказала за яго бабуля, зачыняючы старэнькія рыплівыя веснічкі.

І ён пайшоў па зарослай сцежцы, якую, відаць, з кожным годам усё шчыльней зацягвала драсёнам, як старую копанку раскай, і яна ўсё вузела і вузела — год-два і знікне. Высокі разгаты клён узвышаўся ля двара, а ад яго ў палісадзе падняліся маладзенькія, якія бабуля не хацела ці не здужала выкараніць, кленікі, — чыста гадавальнік. Так і раслі яны, маладыя, дужаючыся, хто каго перагоніць, хто болей забярэ ў свае далоні сонца. Далей быў стары сад: яблыні разложыстыя, слівы купчастыя. І дом быў нейкай старой будовы, вялікі і нізкі, аблеплены, як гандлярка ношкамі, усялякімі каморамі. Усярэдзіне было чыста і халаднавата, бы толькі што тут хадзіў вецер. Шырокія памаснічыны ішлі ад парога да супрацьлеглай сцяны, як павысціланыя ручнікі. Мэблі амаль не было, і хата выдавала пустэльнай, нейкай нежылой, няўтульнай. У куце, ля ўвахода, уладарыла печ, разявіўшы пашчу на акно, нібы здзіўлялася, нешта там убачыўшы.

— Ступай-ступай, — падказала бабуля, — госцем будзеш. Тута спацьмеш, — паказала на ложак ля акна. — Запытаю імя тваё...

— Сева, — адазваўся ён.

— Як то? Севасцян, пэўна?

— Усе завуць мяне Сева.

— Сева ты быў, як у кароткіх портках бегаў, а за-

раз — Севасцян, — зазначыла яна, нібы размаўляла сама з сабою. І ўжо да яго: — Здарожыўся, мусіць, Севасцян? Выпі млечка, хочаш кваснага? Лепей — слодкае. Смятанкі. То бардзо смачна, — нібы ўгаворвала бабуля. — Дзякаваць будзеш потым. Найперш выпі.

Яна не звяртала ўвагі на яго аднекванне, налівала малака ў кубак.

— Прашу да столу. Млечка слодкае, — пахваліла. — А цяпер збірайся, Севасцян. Порткі ў цябе зацесныя — рабіць замінацьмуць, зашыршыя надзень.

Дзіўная была яна нейкая. І гаварыла неяк дзіўна — з націскамі ў яе былі яўныя нелады. «Відаць, нетутэйшая. А можа, усе так гавораць тут», — падумаў Сева. А вечарам папытаў у яе:

— Бабуля Анэля, вы полька?

Яна зірнула на яго спачатку непаразумела, потым усміхнулася.

— То бардзо даўно было, а зараз ужо даўно-даўно тутэйшая. Я і не памятаю ўжэ ні радні, ні месцін тых. А ото ж са мною цуд творыцца. Пачну мувіць што, ды раптам слова і забуду. Як па-тутэйшаму, успомніць не магу, а ўспамяну — па-свойму. Стара стала. Стары — што малы. Што з млеком маткі прыйшло, у крыві застанецца. Зайшла я сюды замуж даўно, яшчэ ў тую войну. Мене муж прывёз сюды, да свае радні, як з войску яго зволілі. Прыехалі. Яны ўсе, радня яго, з хаты і выйшлі, толькі я сяджу на лаве ля вакна. А яно адчынена. Чую мувяць: «Нашто польку ўзяў? Ето ж ворагі». А ён ім адно сказаў: «Не ўсе палякі — сабакі». Потым яны мяне палюбілі: я хлеб смачны пячы ўмела, краўчыхаю стала. Ад маці то ў мяне. За тое яны мяне шляхцянкаю празвалі. Але я роду простага. Бацька мой сплаўшчыкам быў. Лес па Нёману сплаўляў. Яшчэ мене трафейнай Анэляй завуць, — бабуля ўсміхнулася. — Хто-та сказаў, што Мікіта, то мужа майго звалі, з войны з трафеямі прыйшоў. А трафеі тыя — то я была.

Бабуля змоўкла. Яна сядзела на прыступках ганка. Галава яе была прыўзнята, нос завостраны, тонкія губы сцяты, толькі на лобе варушыліся зморшчынкі, выдаючы нейкія думы.

Сонца, якое толькі што стаяла распаленым паўкругам на захадзе, раптоўна схавалася. Пацягнула вільгаццю. Здавалася, што недалёка возера ці рака. Сева з кніжкаю прымасціўся проста на мураве, але чытаць ужо

было цемнавата, ды і трава ўвачавідкі вільгатнела. Бабуля вынесла з хаты посцілку.

— Кінь пад сябе, — сказала. — Зямля цягне. Вада ў нас блізка. Салдаты, помню, у вайну стаялі, мувілі: «Ваяваць у вас, матка, ліхо: на метру траншэю пракапай — вода, нігдзе ў Расіі такога нема». І лес у нас не расце. Карані мерзнуць. Адно трава. Яна ў рост чалавека бывае каторае лета.

— А вёска зялёная, дрэў колькі.

— Яна на выспе стаіць. А дрэвы пасля вайны пасадзілі. Наўчыцель тут жыў у мене. Прыняла я яго. Пашкадавала — худы, хворы. Бедны, і пажыў не доўга. Лёгкія былі паранены, сухоты ўкінуліся. Харошы чалавек быў. З лясоў ён. Ото ж узяў вучняў, паходзіў па вёсцы, дазнаўся, у якім доме якое дрэва любяць. Потым паехаў і прывёз. На свае ўсё грошы. І кождаму тое, што запісаў. О, загаманілася я, — схамянулася бабуля, бы нешта важнае ўспомніла, — кроўку трэба сустракаць. Будзеш сядзець тут, не забаішся? — раптам папытала яна.

Гэта пытанне засцігла Севу знянацку, ён ніколі пра тое не думаў.

— Я да тэго, што цяпер людзі ў горадзе жывуць, жывёліны, апроч сабакі, не бачаць. Хоць бы ў звярынцы паказвалі. Ото ж прывезлі да суседкі ўнучку. Дзіцятку чатыры годзікі, дак яно карову, беднае, убачыла ды ў крык, аж сіне стало — спужалася. А сабак — ніводнага не баіцца.

Бабуля неяк сумна ўсміхнулася.

— Я, малы, таксама перапужаўся аднойчы — убачыў інваліда на мыліцах. Гляджу — нешта страшнае на драўляных нагах на мяне ідзе, грыміць па асфальце. Як закрычу... — расказваў Сева.

— Ото ж, дзетка, гэтага можна спужацца, — уздыхнула бабуля. — Не ўспамінай супраць ночы, — бы папрасіла. Узяла даёнку, пайшла да каровы.

Сева падаўся на вуліцу. Хацелася прайсці па вёсцы: паглядзець, ці сапраўды ля кожнага двара свае, адметныя дрэвы.

Вярнуўся ён хутка, але бабуля ўжо лягла, дзверы ж не замыкала. Азвалася з-за шырмы, калі ён зайшоў у хату: «Ці ты, Севасцян?» Наказала піць сырадой. Ён стаяў на стале, у цёмным гліняным гладышку, цёплы, з шумком зверху.

— Што там ёсць на вёсцы? — запытала бабуля.

— Ціха. У клубе толькі співаюць. Але я не пайшоў.

— І схадзіў бы да светліцы, паслухаў, як нашы дзяды співаюць. Жыць зараз стала — толькі песні спевай. З гораду прыедуць, пакосяць, паграбуць, бульбу выберуць.

Бабуля памаўчала, потым з-за шырмы зноў пачуўся яе голас:

— А я, памятаю, малая была — баялася, як мужчыны спеваюць. Я табе мувіла: бацька мой быў сплаўшчыкам. Бывала, яны збяруцца ў нас, вып'юць і заспеваюць. А я з-за коміна пазіраю: твары хмурныя, бровы на вочы насунуты, галасы хрыплыя, прастуджаныя, і страшна мне робіцца, увесь сум песні той панылай у грудзі кладзецца, цісне, і цяжка мне, цяжка. І песні той ніводнай не помню. Можа, і ўспомню калі...

Нешта яшчэ гаварыла бабуля Анэля з-за свае параваны, як называла яна шырму. Сева не заўважыў, як голас яе пачаў аддаляцца, быццам бабуля адыходзіла ўсё далей і далей ад яго па лузе, перад вачыма слаліся і слаліся, як сцяжыны, валкі важкай, густой сеянкі. Бабуля ішла па іх лёгка, не дакранаючыся нагамі, мусіць, ведала — Сева іх падварушыў. «Севасцян! — пазвала яна. — Севасцян! Азірніся». Глянуў ён — гэта ж цётачка Марыя, радасная, светлая, і чамусьці валасы ў яе белыя, як у бабулі Анэлі, разбэрсаныя ветрам. Не, яна не ідзе, яна бяжыць яму насустрач, як дзяўчынка, і, захлынаючыся ветрам, крычыць: «Успомніла я, успомніла гэты белы дом!»

## 16

— Глядзіце! Мой паляцеў! Высо-о-ка!

Белы папяровы самалёцік, як ластаўка, нырнуў у паветры, ён то імгненна пікіраваў, то, падхоплены невідочнай хваляй, можа, махнула веццем ліпа на краі лужка, набіраў вышыню і не падаў. І Росцік бег за ім з радасным крыкам:

— Глядзіце, як мой высока!

Але раптам самалёцік перакуліўся дагары, крутануўся, нібы трапіў у паветраны вір, і пачаў падаць.

— Усё, пайшоў у штопар, — заключыў Воўка.

— Не справіўся з кіраваннем!

— Гаручае... гаручае скончылася!

Кожны выкрыкваў сваё меркаванне.

Расчырванелыя і захопленыя палётам, яны насіліся па лужку ў лесапарку, нібы ў іх таксама адраслі крылцы, але яшчэ не дужыя, неаперaныя. Так, падрастаючы, кураняты, бывае, растапырыўшы рэдкія крылцы, бегаюць, ганяюцца за мушкамі.

— А мой — пайшоў на пасадку! Ура-а-а!

Гаманкая гурма хлапчукоў кінулася цяпер у другі бок, за шустрым Генікам, самалёцік якога плаўна ішоў на пасадку, нібы вёў яго спрактыкаваны пілот.

За ўсім гэтым, седзячы ў цяньку дрэў, назірала выхавацелька, у тонкім, з заломленым пад ілбом полем, саламяным капелюшы. Побач на той жа пасцілачцы дзяўчынка ўголас чытала кніжку, а іншыя слухалі.

Самалёцік плаўна, усё ніжэй і ніжэй, спускаўся на зямлю, здаецца, ён выглядваў зручнейшае месца для пасадкі. Праляцеў над кустом рамонку, зачапіў бухматы шарык адуванчыка, і маленькія парашуцікі пырхнулі з-пад яго, нібы гэта ён выпусціў іх са свайго нутра. Парашуцікі не падалі, а падымаліся ўгору, кружыліся: і тыя, што рассеяў самалёцік, і тыя, што пазбівалі сандалямі дзеці. А белы самалёцік ткнуўся носам пад ліст трыпутніку, на самай сцежцы. Тут яго і накрыў Дудаль, ухапіў і змяў, а сам хціва пазіраў на хлапчукоў: што яны будуць рабіць? З-пад верхняй, караткаватай яго губы выглядвалі рэдкія, крывыя, але моцныя зубы.

— Гэта мой самалёцік, — сказаў Генік. Але замест самалёціка ў руцэ Дудаля была скамечаная ў шматок паперчына.

— На, — Дудаль кінуў яе яму ў твар. — Самалёцік, — перакрывіў яго ён.

Хлопчыкі спыніліся, збіліся ў гурт, як авечкі. Толькі саплі, расчырванелыя ад гульні, ды зыркалі вачыма: што адбылося? А Дудаль стаяў перад імі, як паліцэйскі з тэлевізійнай перадачы. Зачэпленая за папружку на карычневым шнурку матлялася выструганая з палкі «дубінка», кішэня вузкіх джынсаў тапырылася — там ляжаў, няхай сабе цацачны, але пісталецік. Хлопчыкі пазіралі, як пакалыхвалася самаробная дубінка, як шчэрыў ён рэдкія зубы. Можна было падумаць, што ён усміхаецца, але ўсе ведалі — у яго проста кароткая верхняя губа.

— Ты нашто скамечыў яго? — горача сказаў Росцік.

— Праезду няма, гані назад! — сказаў задаволена Дудаль. — Я тут паставы!

Хлопчыкі стаялі і маўчалі, ашаломленыя яго паводзінамі.

— Ніякі ты не паставы! — запярэчыў Генка.

— Вось вырасту і стану паставым, буду вам усім дзіркі прабіваць. Парушыў — дзірка! Парушыў — штраф!

— А калі не парушыў?! — знайшоўся Росцік. — Што тады?

— А паспрабуй дакажы! Га-а! Мой бацька аднаго, ведаеш, як прыціснуў...

Хлопчыкі сталі шчыльней. Дудаль насцярожыўся. Ён пачаў здымаць з папружкі сваю самаробную дубінку.

— Даказаць, га-а?! — закрычаў Росцік.

Ён, як Венікаў Каштан, кінуўся пад ногі Дудалю, ураз пакаціў яго. І яны сталі валтузіцца на траве. Хлапчукі нейкі момант глядзелі, бы не разумеючы, што адбылося. Потым усе гуртам навалiлiся на іх. Дудаль нема ўзроў. На крык яго прыбегла выхавацелька:

— Вы што, хлопчыкі? Вы што? Хутчэй уставайце!

Адны хуценька ўскоквалі і адбягаліся, бы яны тут ні пры чым, другія, адкаціўшыся, пазіралі на яе, не разумеючы, чаму не можна дурэць. Росціка ж прыйшлося адцягваць, ён моцна, абедзвюма рукамі трымаўся за Дудалеву дубінку, якая так і засталася пры боку, трымаўся, намагаючыся зламаць. Ён быў чырвоны, потны, мяккі чубок збіўся, тырчаў, як нацукраны.

— Росцік, ты што? Ніколі б не падумала на цябе...

— А няхай не хоча дзіркі прабіваць. Няхай не марыць! — горача адказаў ён.

Дудаль ляжаў ніцма і роў так моцна, што яго маглі пачуць пад зямлёю. Выхавацелька разгубілася, не ведала, што рабіць.

—Якія вы ўсе жорсткія, жорсткія... — паўтарала яна. — А ты, — сказала яна Росціку, — горшы за ўсіх! Я паведамлю тваім бацькам.

«Ну і няхай, — парашыў ён. — Затое Дудаль запомніць...»

...Усё было добра. І сонца яшчэ свяціла на ўсю моц, можна было вынесці ў парк мяч і гуляць з Воўкам дацямна, каб толькі не гэтая запіска, якая муляла ў кішэні, адцягвала яе, як камень. Дадому Росцік ішоў нехаця, торкнуў руку ў кішэню, нібы спадзеючыся, што гэта падман: ніякай запіскі няма. Але яна ляжала. Выклікалі ў школу маму. Росцік не разумеў, чаму выклікаюць

іменна яе, а не тату. І калі Сева вучыўся, заўсёды выклікалі маму. Лепш бы тату — ён зразумее. Але як гэта зрабіць, калі запіска адрасавана маме?

Дадому ісці не хацелася. Росцік сышоў са сцежкі і сеў на траву пад дрэвам. Тут і знайшоў яго Воўка. З разгону кінуўся на траву, схапіў Росціка за плячо, хацеў перакуліць, падурэць. Але, убачыўшы яго сур'ёзны твар, усё зразумеў. Сцішыўся. Пачаў назіраць за вароною, якая хадзіла, угнуўшы галаву, і нешта шукала ў траве. Не проста шукала, яна ўпляталася дзюбаю і спрабавала выдраць пучкі травы з каранямі, нібы палола грады. Упіналася, ледзьве не садзілася на хвост. Зрэдку ёй гэта ўдавалася. Воўку гэта не спадабалася: кшыкнуў на яе, як на курыцу. Варона адляцела крыху, каркнула, пазіраючы на яго, агрызнулася.

Па дарожцы ішла, пэўна, дадому, Ветка, валасы расплюшчыла, распусціла па плячах, фарсіла, канечне.

— Вы чаго седзіце? — папытала яна.

— Нічога, сядзім, і ўсё, — адказаў Воўка.

Ветка горда страсянула валасамі, напэўна, пакрыўдзілася.

«Ну і няхай», — падумаў Росцік.

Ён назіраў, як аддалялася Ветка, і яму здалося, што гэта ўжо было: і сонца, і Воўка, і дзяўчынка, падобная на Ветку, і ён з запіскаю, як з каменем, у кішэні.

...Ага, было... Зусім жа нядаўна. Тою вясною. А можа, гэта было не з ім. Можа, гэта быў зусім іншы хлопчык.

Чамусьці цяпер, калі закрыеш вочы і павернеш твар да сонца, успамінаецца ўсё. Сонца тады было зыркае. Яно свяціла проста ў вокны — шырокія, вялізныя, светлыя. А там, на дрэве, выспеўваў шпак, немітусліва цягаў першую зяляніну ў свой дамок. Хацелася пазіраць туды, але сонца сляпіла вочы...

...Хлопчык сядзеў за партаю ў школе. Ён ужо ведаў усе літары, спрытна навучыўся пісаць. І ў школе былі нават урокі, якія называліся «хуткапіс». Ужо тое, што чалавек становіцца граматным, вялікі цуд. Па дарозе са школы ён з захапленнем прачытваў некалькі разоў адны і тыя ж шыльды і вельмі любіў спыняцца ля дошкі з афішамі. Які цудоўны свет тут адкрываўся! Потым аказаўся спісаны крэйдай гараж у двары: якіх імён, якіх ісцін там толькі не было! З'явіліся некаторыя вельмі дасціпныя нататкі і на шпалерах каля пісьмовага ста-

ла, на гладкай, паліраванай паверхні яго самога. Усюды. А гэты хуткапіс — проста цуд. Але чамусьці мама хапалася за сэрца і адыходзіла: «Як ты пішаш, як ты пішаш?» — з болем у голасе гаварыла яна.

А літары чапляліся адна за адну, станавіліся ў радкі. І тыя — ну якраз як чарга ў школьным буфеце. Вось літары згрудзіліся цесна-цесна, сталі лезці адна на другую, напіралі ўперад, выштурхоўвалі часам каторую. Вось выпхнулі «р», і аказалася — смех, ды і толькі, — салдаты крычалі «ўа», але потым у наступным радку «я» не вытрымала і зрабіла падножку. І ўсе літары пачалі хіліцца ў другі бок, зусім не па школьных правілах. І самае цікавае, што хлопчыку гэта нават спадабалася, ён нібы зрабіў адкрыццё ў пісьме. Рука яго ўздрыгнула, і, можа, таму «к» прынаравілася і брыкнула «о» нагою, як той футбольны мяч, а «ф» раздзімалася, нібы душылася са смеху, як дзяўчынка за адною партаю з хлопчыкам, што зазірала ў яго сшытак. Але нічога, усе літары дружна трымаліся за рукі, хоць пры гэтым завельмі расцягнулі «ж», але яно мацавалася стойка, як сам хлопчык, калі гулялі ў «Цілім-бамба» і ніхто не мог разарваць тады ланцуг. Затрыманаму прыходзілася станавіцца побач і брацца за рукі.

Пісалася хутка і лёгка. Заданне настаўніцы было выканана. Хлопчык разахвоціўся, хацеў пісаць яшчэ і яшчэ. Але што? Ён патрымаў паднятую руку, настаўніца не звярнула на яго ўвагі, яна штосьці хутка чытала. Хлопчык абвёў позіркам клас. Дзяўчынка каля акна, схіліўшы на бок галаву, старанна пісала. На парце было сонейка, залаціста свяціліся яе валасы, уздрыгвалі завіткі. Вось яна падняла галаву і чамусьці таксама зірнула на хлопчыка крышку здзіўлена і сарамліва. Потым зморшчыла кірпаты нос. Не, яна не дражнілася, яна ўсміхнулася па-добраму. І хлопчык зразумеў, што яна харошая і добрая і, можа, нават самая лепшая ў іх класе. Яшчэ нешта ў ёй было, пра што ён здагадваўся, але не мог сказаць тое словамі. Мусіць, яна была прыгожая. А што яна добрая, ён ведаў: учора на вялікім перапынку яна працягнула яму яблык, а яшчэ раней, калі ў яго не пісала ручка, дала сваю запасную.

І магчыма таму, што яна была харошая, прыгожая і добрая дзяўчынка, а можа, ад вялікага жадання пісаць, ён узяў кавалачак паперы і хуценька, як даўно выпакутаванае, вынашанае, вырашанае напісаў: «Я цябе

люблю калі вырасту мы пажэнімся». Словы былі напісаны правільна, толькі яшчэ не было ніводнага знаку прыпынку, бо гэтага яны яшчэ не праходзілі.

Але толькі ён памкнуўся працягнуць руку, каб перадаць гэтую няшчасную запіску, настаўніца, нібы толькі за ім і сачыла, падняла на яго вочы. Позіркі іх сустрэліся. Яе — прамы і ўладарны, яго — разгублены і вінаваты. Яна пазвала яго рухам рукі, і ён паслухмяна і даверліва панёс ёй першае тайнае пасланне. Настаўніца прачытала і абурылася. І, канечне ж, напісала, яна яшчэ хутчэй умела пісаць, запіску маме.

Са школы ён ішоў адзін, хмурны і засяроджаны. Недалёка ад дома дагнаў яго другі хлопчык. Яны ішлі і маўчалі. Потым той падбіў наском чаравіка каменьчык. Каменьчык загрукацеў па асфальце і лёг пад ногі хлопчыку. Хлопчык проста механічна ўдарыў па каменьчыку. Ён адскочыў уперад. І абодва хлопчыкі ўжо ганялі каменьчык па асфальце, але адзін раптам спахмурнеў і кінуў гульню. Другі, нібы зразумеў, што з ім, крануў за рукаво. «Ты ж ні ў чым не вінаваты, — сказаў ён упэўнена і шчыра. — Ты не цяпер хацеў жаніцца, а як вырасцеш. Усе дарослыя жэняцца».

Хлопчык згодна кіўнуў галавою. І твар яго праясцеў. Ён і сам увесь час думаў пра гэта і ніяк не мог зразумець — у чым яго віна. Хіба не можна думаць пра тое, што будзе яшчэ не скора?

І зноў ён стаў вясёлы і шчаслівы.

«Ур-ра!» — чамусьці крыкнуў ён і кінуўся ганяць каменьчык, а потым прынёс футбольны мяч, сапраўдны, якім гуляюць знакамітыя футбалісты і на якім вялікімі літарамі было напісана: «Ballon gala».

Дзяўчынка нічога гэтага не ведала. Але хлопчык нібы помсціў ёй за нешта, не даваў праходу. Замілаванне перайшло ў варожасць. Зімою ён бамбіў яе снежкамі, летам таксама знаходзіў, як яе зачапіць і давесці часам да слёз.

І аднойчы яна, калі ён загарадзіў ёй дарогу, сказала: «Мы сягоння пераязджаем у новы дом. І болей ты мяне ніколі не сустрэнеш і ніколі не ўбачыш».

Яна заплакала. І ў хлопчыка з рук выпала снежка: «Куды?» — «Вось і не скажу».

Ён увесь дзень быў на вуліцы, нават пабег за машынаю, у кабіне якой ад'язджала дзяўчынка. Але скора яна схавалася за павароткай. Назаўсёды...

...Ён сядзеў і маўчаў. Маўчаў і Воўка. Некалі гэта ён, Воўка, здагадаўся, што хлопчык ні ў чым не вінаваты. А цяпер? Цяпер ён маўчыць. Росцік пакасіўся на яго, і Воўка сказаў:

— Запіска маленькая і лёгкая. Яе можна згубіць, калі трымаць не ў кішэні, а проста ў руцэ.

Росцік спачатку абрадаваўся яго словам, выхапіў яе з кішэні. Але і ў руцэ яна была цяжкая, не вылятала, а ліпла, ліпла да далоні...

І Росцік зразумеў, што Воўка даўно не насіў дадому запісак і забыўся, што яны цяжэй за ранец з кніжкамі. Але цяпер яго хвалявала не гэта. І ён зусім не хацеў пазбавіцца запіскі. Росцік проста жадаў, каб яна была адрасавана не маме.

— Воўка, чаму запіскі заўсёды пішуць мамам? І выклікаюць у школу таксама іх...

Воўка маўчаў. Відаць, і для яго гэта была загадка, і ён думаў.

— Таму, што мамы ёсць ва ўсіх, — нарэшце ўпэўнена сказаў ён. — А таты не ва ўсіх. І можна памыліцца.

Росцік глянуў на яго, уражаны. Сапраўды. Ён жа ведае, што не ва ўсіх. Вось і ў Воўкі няма таты... Ён ёсць, але не жыве з імі.

— А давай сходзім да яго. Я скажу, што ты сумуеш, — прапанаваў нечакана ён, бо ведаў, што Воўку самому гэтага не сказаць.

Воўка пахітаў галавою.

— Мама не дазволіць. Яна адрас не дасць.

Яны сядзелі і маўчалі. А ў густой кроне дрэва шабуршыліся, папісквалі, шчабяталі птушкі.

— Напэўна, у іх вывеліся птушаняты, — сказаў Росцік.

— А запіску можна перапісваць. Проста сказаць заўтра Галіне Пятроўне, каб перапісала на тату, — знайшоў выйсце Воўка.

— Яна тады падумае, што ад нас пайшла мама, — сказаў Росцік. А ў самога мільганула думка: як жа так можа быць? Куды ёй ісці, калі ў цэлым свеце яны ў яе толькі адны. А раптам...

Чамусьці сціхлі, змоўклі птушкі. І парк заціх — не пашумоўваюць ліпы. Росцік пакруціў галавою, нібы ў вушах была вада.

— Воўка, а мы давай яго ўсё роўна знойдзем. І я скажу яму...

## 17

Дзень дыхаў вільготна і душна. Парыла. Зранку было вельмі росна. І ў поўдзень пакоша расіла ногі.

Першы ўкос ляжаў у валках, а трава ўжо зноў імкнулася ўгору, узнімала іх, прашывала наскрозь. Сена, не паспеўшы высахнуць, урасло, і яго трэба было выдзіраць, сырое, знізу жаўтаватае, як водарасці.

— Дзіва што, даўно скошана і нікому ніякай справы. Яшчэ б трохі — і пагніло.

— Ага, парадку няма.

Сева пазнаў іх: гэта тыя жанчыны, што сядзелі на выгане каля Астапавіча. А вунь і сам ён: перакідвае, валкуе сена, бы заўсёды займаўся гэтым. Ішоў ён упэўнена, размашыста варушыў пракосы.

— Не маглі сена згрэбці — спадзяваліся на нас, — зноў бурчала адна, а на галаве быў ужо не фанабэрысты караблік, а шчыльна завязаная на лоб хустка. Час ад часу жанчына сцягвала яе з галавы і выцірала ўспацелую шыю, твар.

— Гэта дык работа — падарвешся. А мне нельга. Сятчатка можа адслаіцца, зусім аслепну.

— Ты памалу. Ці ідзі да Астапавіча, няхай дасць іншую.

— Якую? Іншай няма. Можа, хіба ўзяць вядро ды схадзіць па ваду вунь у той калодзезь.

— Гэта ж трэба — сена дасюль не згрэбці. Чакалі з горада...

— Наша гаспадыня казала, што няма каму — усяго чалавек дзесяць у іх працаздольных. А так усе старыя. Яна і хаты паказвала: і там, і там — старыя. Маладыя цяперака ўсе па гарадах. А тут — горад блізка.

— Божа, што ў гэтым горадзе знайшлі? І сама я... Ай, што гаварыць. Толькі душу растраўляць. Нічога не перайначыш. Ні сам, ні дзецям сваім не дасі. Чалавек так створаны. А кватэру гэту атрымаеш, за яе і дзяржышся. Дзе кватэра ёсць — там і радзіма.

— Ой, як мы нагараваліся на прыватных. Як ты яе цяпер пакінеш? Яна ж — як залатая.

Севу непрыемна было, што ён мімаволі слухае чужую гаворку. Жанчына пачала расказваць падрабязна, як атрымлівалі кватэру. І ўсё гэта яму было нецікава.

— А каб у наш час давалі ў сяле кватэры ды трохі заробак лепшы, думаеш, не заставаліся б?

— Дзіва што. Павыганялі нас з вёсак, а цяпер папікаюць.

— Гаворыш, дзесятак працаздольных. Хлусня! Я столькі маладых бачыла тут. А няма ахвотнікаў гэта сена грэбці. Проста дурняў няма — работа ж капейкі каштуе. А пуп парвеш.

— Можам і на абед не зарабіць сёння.

— А што ты думала? Але, можа, па рублю і выйдзе.

— Дзіва што сена ляжыць. Хто яго за капейкі будзе грэбці?

— Машыны ёсць.

— Нешта ж не відно тых машын.

— Брыгадзірка казала, што прыгоняць падборшчык. Бачыла — адно кулі раскідае.

— Ай, лепш бы нас паслалі буракі палоць. Мы адмаго году былі. Таксама работка, рукі дзеравянныя парабіліся.

— Што ні гавары, а нешта трэба рабіць з сялом.

— То многа і робіцца.

— Трохі пазнавата, ды і не ўсюды. Там, дзе гаспадары, кіраўнікі харошыя. А трэба паўсюдна.

— А тут во пасылаюць, а пра ўмовы ніхто не думае. Гэта добра, што цёпла. Людзі ж сюды штогод ездзяць. То хіба нельга пабудаваць гасцініцу ці інтэрнат?

— Хоць бы хату якую пераабсталявалі. Так непрыемна на кватэры жыць. Мне ўсё ўспамінаецца, як мы па прыватных хадзілі...

Жанчыны ішлі пракосамі, адна з аднаго боку, другая — з другога. Працавалі яны не таропка. Часта спыняліся, гаварылі. А Сева ўсё махаў і махаў віламі — справа, злева, — камлюкавата, туга клаўся валок. Але растрасаць яго не было калі, спяшаўся. Ад прыпрэлай травы ішла парнасць. Дурманіў пах балотнай мяты, вятроўніку. І здавалася, што паветра густое, цягучае, як мёд. Яно абвалаквала твар, рукі. Тонкае марыва дрыжала ў паветры, засціла далячынь, тонкім цюлем завешвала гарызонт.

— Пагода, як у Сочы, — гаварыў ужо нехта з другога боку.

— А мне Сочы не падыходзіць. Ездзілі мы туды на машыне. Пабылі трохі ды ў Крым. Ціск душыць. Вось і зараз баюся, каб не падскочыў.

Сева прарываўся праз гэтыя, зусім нецікавыя яму

размовы ўперад. Было душна, адчуваў, як пад спартыўкаю па жалабку спіны спаўзаюць кроплі поту. Пот еў вочы: гэта, як адкрыццё для сябе, ён адчуў упершыню, бо ніколі не верыў, што так бывае. З-пад ног, як плюшкі, шлопаліся, адскоквалі патрывожаныя жабы, паблісквалі вільгаццю і, здавалася, што яны таксама пакутуюць ад гарачыні, — адскочыць каторая, сядзе, вочы выпучаныя, задышліва, цяжка дыхае, аж белае падбароддзе раздзімаецца. Маленькія жабяняткі няўклюдна і смешна дрыгалі тонкімі доўгенькімі ножкамі, падобнымі на пласкагубцы, выграбаліся так-сяк з травы. Спачатку Севу яны былі ў навіну. Першую ён нават злавіў і патрымаў у далонях. Успомнілася дзяцінства. Хутчэй той год, калі яны адпачывалі на Альбе. Гэта азёры, хутчэй копанкі, недалёка ад Нясвіжа. Там яны жылі адно лета. З дня ў дзень загаралі, лазілі па азярынах, вудзілі рыбу, ірвалі аер. І ў Севы быў любімы занятак: сачком лавіць жаб. Іх была процьма ў зацягненых раскаю азярынах. Яны высоўваліся з вады, лупацілі вочы, раздзімаліся і краткалі, нібы дражніліся, пакуль не пападалі ў сачок. Маці проста не пераносіла гэтага яго занятку. Казала, калі будзе мучыць жаб, надвор'е сапсуецца. З таго ці не з таго, а так яно і здарылася, спусцілі такія ліўні, прасвету не было тры дні запар, захаладала. І нічога не заставалася, як ехаць, уцякаць ад гэтай восені дадому.

А цяпер ён іх не чапаў, толькі разглядваў, вельмі ж яны былі розныя, у кожнай свая расфарбоўка. Так і хацелася дурыцца, так і падмывала закінуць гэты вільготны жывы камячок каму-небудзь за пазуху. Але вакол людзі былі сталыя.

У першы дзень ён адчуваў зморанасць, можа, нават не зморанасць, а нейкую ляноту ва ўсім целе. Так і карцела прылегчы на сена. І ён самотна пазіраў у канец сенажаці: ці будзе канец гэтым пракосам, яны ж былі доўгія, як згледзець. А сёння настрой быў надзіва харошы. Сева быў рухавы, пруткі, як спружына. У руках адчуваў сілу. Працавалася ў ахвоту, весела, бадзёра; і работа была, як гульня, — займальная і цікавая, не было ўчарашняй сумоты; і людзі былі ўжо свае, знаёмыя спагадлівыя твары, усміхаліся ўхвальна і паразумела. Нават Астапавіч кідаў цёплыя пагляды стомленага, немаладога чалавека, які бачыць, што ёсць каму даручыць работу на гэтай зямлі.

Сева вырваўся ўперад, хутка варушыў свой валок, перакідваўся на суседні, заадно ладкаваў і яго. І ўжо неўпрыкмет для самога пагнаў туды, дзе хілілася долу сонца, нібы пракладваў дзве дарогі да яго. І трэба было паспець, пакуль яно не слізганула за далягляд.

Жанчыны, што так даверліва размаўлялі, нават і не заўважылі, як ён перайшоў на іх палосу, аказаўся наперадзе. А заўважыўшы, закінулі драўляныя граблі на плечы, пайшлі ўслед: усміхаліся, дзякавалі і жартавалі.

— Скажу Марыі, каб не яе нябож, загінулі б мы. Праўда, Раіна?

А Сева працаваў у ахвоту, сам дзівячыся сіле і спрыту. Не падазраваў нават такога ў сабе. І сенажаць не здавалася такой неаглядна вялікай. І дзень хай бы яшчэ доўжыўся, не канчаліся пракосы. Толькі б плёхнуць вады з далоняў на твар, ахаладзіць яго, змыць пот. Прызыўна, блакітам бліснула яна з канавы ў канцы сенажаці. І ён накіраваўся туды, сумняваючыся, ці дастане. Топкі, балоцісты бераг так густа ўзяўся асакою, вятроўнікам і чаротам — проста мясцовыя джунглі, — што дабрацца да вады не проста. Балоцістая глеба мякка зыбалася пад нагамі, чаўкала вада. Расхінуў густую, жорсткую асаку. Нахіліўся. Счакаў хвілінку, разглядваючы, як па застылай, бы цёмнае шкло, вадзе гойсалі, быццам на каньках, чорныя даўганогія жукі, пакідаючы за сабою лёгкія росчыркі. Асцярожна, каб не замуціць вады, акунуў у яе далоні, набраў у прыгаршчы, плёхнуў на твар. І вада была нейкая незвычайная, бы густая, сцюдзяністая, як вадкае срэбра.

Яна асвяжыла твар, надала бадзёрасці і сілы. І зноў — за работу: цяпер кучкаваць валкі, каб зручней грузіць на трактар.

— Севанька, нашто ты такія копкі ставіш? Іх жа на трактар не ўскінеш. Хто падыме столькі? Сам паспрабуй. Ну! — Гэта тая жанчына, Раіна.

Ён утыркнуў у копку вілы, паспрабаваў прыўзняць. О-го!..

Падаў сігнал аўтобус, які стаяў на абочыне дарогі, ля мастка: значыць, на вячэру, а потым адпачынак.

... — Я гляджу, гляджу, цябе выглядваю, — абрадавалася бабуля Анэля. — Тэж сена валкувалі? Сусед наш хадзіў: травы, мувіў, травы, даўно такой не было. Пайшоў з касою ды вярнуўся. Моцы нема, касу не пацягне.

Вот жыццё, халера! Век свой чалавек рабіў, думаў, адхланне ад работы не будзе, а цяпер — што дзіця малое. Нашто жыццё такое? Адно пакаранне.

Бабуля Анэля стаяла, трымаючы вядро на сугібе рукі.

— Відзіш, — сказала, усміхаючыся, — сабралася па воду, а сама стаю, забыла, старая, куды іду, каб не вядро, не ўспомніла б.

— А дзе калодзеж? Я прынясу, — Сева працягнуў руку да вядра.

— Пойдзеш да крыніцы, — яна ўлавіла яго запытальны позірк. — Не ведаеш дзе? Я пакажу.

І яна пабралася сцежкаю ў канец агарода. Сева ішоў следам. Прайшлі кавалачак бульбянога поля. І тут зноў вачам адкрыўся запяты сінявою прастор, нібы нехта змяніў занавес — удзень ён быў з празрыстых белых гардзін, а зараз з сіняга аксаміту. Наперадзе не відно было аніякай крыніцы, толькі гэтая сінеча ды трава, буйная, высокая, росная, і — ні сцежкі, ні следу.

Бабуля Анэля спынілася.

— Тутака заўжды росна. Ото ж каб боты, як у мене. Ты пастой, не хадзі далей. Чакай.

Яна не рухалася далей, нібы яшчэ разважала, ці ісці самой. Сумна пазірала на гэта буянства травы, бы зноў забыла, куды ідзе, пакуль не адчуе ў руцэ вядро, не ўспомніць.

— Лужок мой перастоеў. Скасіць не здолела... І Антон адмовіўся, нядобжэ яму. Нема касцоў у нас, нема, — пагаравала яна. — А з гэтай травы сена не будзе, а дрот. А скасіць трэба, каб лужок не здзічэў. Дак ты стой тут, — сказала яна Севу, як малому, ужо настойліва.

Ні азярыны, ні копанкі не відно было. Дзе ж тая вада? Дзе сцежка да яе? А можа, зацягнула яе, нятоптаную, травою, як і ў двары?

Бабуля пашорхала нагамі, прымінаючы траву, толькі галава ў чорнай тарановачцы, завязанай па-даўняму вузельчыкам на макаўцы, пакалыхвалася над метлюжкамі. Трава распрамлялася, і след яе знікаў, толькі крышачку цямнейшая палоска лугу засталася — не блішчала там пераліўна раса.

Сева падаўся-такі следам, але яна азірнулася.

— Стой! Чакай мяне, — сказала строга, як неслуху. Зірнула так, нібы не давярала яму, адумалася. Сева разгубіўся: чаго тады павяла, ён бы да калодзежа ўмо-

мант збегаў. Азіраўся наўкола, чакаў, як наказала яму бабуля. Можна было не паслухацца, падумаеш, кеды высахнуць да заўтра, але ён адчуў, што не з-за гэтага яна забараніла яму ісці, а нешта як не давярае, і перадумала ў апошні момант. Можа, нешта не так сказаў, зрабіў? Не, толькі на сцежцы наском кеда прабіў нейкі шырозны, як сланавае вуха, ліст. Вось так ён любіў на пустыры прабіваць лапухі, яны крохка прарываліся, але не падалі, а гэты — адскочыў, як збітая шапка мухамора, толькі шорсткі цырбунок, нібы дудачка, застаўся стаяць. Ды пры чым тут гэта?

Бабуля схавалася за купкай густога вербняку. Доўга не паказвалася. І Севу было няўцерпы і цікава, дзе яна, і трывожна — ці не здарылася што. Вечаровы морак скрадваў далячынь і гнаў перад сабою ці то гурт белых авечак, ці то пеністую марскую хвалю. Белая хваля паўзла на яго, і ён, здавалася, мог, працягнуўшы руку, дакрануцца. Неўзабаве адчуў морась на твары, волкасць той нізкай хмары, заўважыў, што апынуўся ў ёй, як у сырадоі, стаяў па калені. А хваля ўсё каціла і каціла: патанула высокая трава. Суцэльнае белае мора было ўжо яму па пояс: здавалася, можна кінуцца ў яго і паплысці. Гэта было незвычайна і дзіўосна. Каб ён верыў у цуды, падумаў бы, што гэта бабуля Анэля вядзьмарыць. Але ён толькі занепакоіўся, як знойдзе яна дарогу ў гэткім тумане.

— Бабуля Анэ-эля! — крыкнуў ломкім баском, але голас яго патануў у гэтым тумане.

Спачатку паказалася толькі яе галава, два ражкі хустачкі на макаўцы. Здавалася, яна плыла па белым моры і ўсміхалася яму. Вось дабралася да плыткага месца. Пайшла насустрач нейкая скасабочаная, адзін плячук абвіслы, бы рукаў яе плюшаўкі пусты. Ён здагадаўся: у той руцэ вядро, яно цяжкае, з вадою. Апусціўшы руку ў белае бухматае воблака каля яе спушчанага плечука, намацаў дужку і забраў вядро. Бабуля адразу выпрасталася, пайшла следам за ім.

— Перадыхні, — сказала яна задыхана, нібы сама яшчэ несла тое вядро.

І ён спыніўся. Хоць было зусім не цяжка, проста хацелася азірнуцца на белы туман: запомніць гэтае дзіва, каб потым расказаць дома. Ён быў упэўнены, што ніхто з іх — ні бацька, ні маці — гэтага не бачыў. Нібы мора затапіла бабулін лужок.

— Бабуля Анэля. А што, калі мы скосім гэты лужок? — сказаў нечакана нават для сябе Сева.

— Ці трымаў калі касу? Ці зможаш? — яна цёпла зазірнула яму ў вочы.

— А доўга вучыцца? — папытаў ён у адказ.

— Не знаю, вясковыя дзеці наўродзе і не вучыліся, а глядзіш — косіць каторы.

Бабуля Анэля захвалявалася, ажно выдаваў голас. Ён стаў мяккі, пяшчотны, яна зноў ставіла не там націскі ў словах, прапускала літары. Гаварыла, нібы знарок адгаворвала яго:

— Ото ж трэба ранелька, па расе, да сонца, як усе спяць.

Сева не зразумеў, чаму трэба хавацца ад людзей, закралася нават думка: ці яе гэта лужок? Можа, калгасны, і касіць яго няможна.

— Мы з табою ўстанем ранкам, яшчэ да пеўняў, — сказала яна неяк па-змоўніцку. — Я цябе навучу. А заўтра рана пайду да Антона, нехай касу пакляпае.

Яна паставіла на стол гладышык з малаком.

— Пі млечко, пі, — запрашала. — Ото ж кубачак стаіць, а хочаш проста з гладышка — нагбом. Калі лужок скасіць, а потым яшчэ раз траўка хутка адскочыць маладая, мяккая ды пенсіянерскае сенца дадуць, то млечка будзе. А зімою прыедзеш, пі сабе на здароўе. — Вочы яе свяціліся дабром і любасцю. Мусіць, думка скасіць лужок завалодала ёю. Яна толькі пра тое і гаварыла. — За два ранкі мы яго скосім. Траўка пасохне. Абы сонца. А я чую — пастаіць пагода, патрымаецца.

І толькі калі ён пачаў апранацца, папытала:

— Ото ж гуляць пойдзеш? Ідзі сабе. Я хату не буду зачыняць. Толькі глядзі, асцярожна. Я табе не расказала, да нас сёння нейкіх арыштантаў прывезлі. У школе пасялілі ўсіх разам — чалавек дваццаць. Апранутыя ў цывільнае, вот, як ты. Арыштанты? Дак — не. Хто іх ведае, што за людзі. А ото ж міліцыянер з імі. Выйшла я да магазіна, а яны ішлі. Адразу відно, не сваёю, мусіць, ахвотаю. Але і на арыштантаў не падобны, — расказала бабуля. — Адзін толькі голены, галава, як калена. Асцярожны будзь, Севасцян! Лепей не хадзі туды, — наказала напаследак.

# 18

— Севасцян, — прыцішана пазвала ў адчыненае акно бабуля. — Ён сядзіць на лаўцы.

— Хто? — не зразумеў Сева.

— Ото ж з тых, арыштантаў. Голены. Я яго і тады прыкмеціла.

— З гітараю? — папытаў ён.

Яна кіўнула.

— Гэта ж Венік з нашага мікрараёна. Я яго ўчора запрасіў.

Сева падхапіўся з кушэткі, выйшаў на ганак.

— Ну, калі так... — нерашуча прамовіла яна і пайшла следам, нібы не давярала Севу ці, можа, гатовая была абараніць яго ад гэтага арыштанта.

Венік заходзіў у двор. Ён, як заўсёды, трымаўся незалежна і крыху фанабэрыста. Пакланіўся бабулі, якая стаяла і, пераадолеўшы страх, бесцырымонна разглядвала яго. Венік нават манерна схіліў галаву і, здалося, нават прыстукнуў абцасамі, але на нагах у яго былі красоўкі — абутак мяккі, на гумавых падэшвах. Бабуля па-свойму зразумела яго крыўлянне, падціснула губы, зірнула неяк бокам, як пазіраюць куры.

— Што то ест за венік? — роблена здзівілася. — Венік у мене ў парозе стаіць, — і ўсміхнулася сваёй дасціпнасці.

І такі збянтэжыла Веніка. Ён зірнуў на яе, закапыліў губу, нібы паказваючы сваю перавагу. Так Венік рабіў заўсёды, калі бянтэжыўся.

— Севасцян, запрошай яго да хаты.

«Севасцян», здалося, яна сказала знарок цвёрда, нібы падкрэслівала, што ён сталы дзяцюк, гаспадар, а не нейкі Венік, арыштант, якога з міліцыяй водзяць.

Але яны ў хату не пайшлі, засталіся ў двары. І бабуля не адыходзіла, сядзела на ганку. Мусіць, цікавы быў ёй Венік.

А Венік не зважаў на яе, быццам і не было гэтай бабулі. І яна спачатку не чапала яго. Толькі слухала, што ён гаворыць, але выгляду не падавала, абірала сабе нетаропка бульбу, быццам нешта думала сваё.

А Венік расказваў сваю гісторыю:

— Узялі мяне ў бары. Сядзеў, нікога не чапаў. Гэта ўсё гэты, настаўнік моладзі, твой Мікіціч. Ну, пля, мужык! Да ўсяго яму дзела. Таксама прыдумаў — «працоў-

нас выхаванне». А каб не разбегліся — таварыша начальніка прыставілі. А мне што — я ўцякаць не збіраюся. Любуюся экзотыкай. Каштана дазволілі ўзяць. Толькі па вёсцы хадзіць з ім забаранілі, пля...

Ён шчыпануў струны гітары, пабрынькаў, прамармытаў нешта, бы спрабуючы голас.

Бабуля сцепанулася ці то ад холаду, што папоўз з лугоў, ці то ад Венікавых слоў. Не вытрымала-такі, сказала з абурэннем:

— Што ты ўсё плямкаеш, бы язык за зубы чапляецца?

Венік ускінуў на яе здзіўлены позірк.

— Звычка, — абараніў яго Сева.

— За што ж цябе ўзялі? Не зразумела я. Украў што, пабіўся, асарамаціў каго? Як-то так? — абуралася яна. — Ні за што ні пра што — пад арышт?

Венік не адказаў ёй. Памаўчаў. Потым пачаў зноў расказваць Севу:

— Участковы прыйшоў, сеў насупраць. Вочы жмурыць, як кот... — Венік стараўся не плямкаць, таму неяк дуспатыкаўся, гаворачы. — «Усё сядзіш, значыць, думаеш?» — «Думаю». — «Я табе даваў тры дні на роздум». Гэта ён мяне ўладкоўваў на будоўлю. Гавару яму: «Летам дурні працуюць. А разумныя на курортах пануюць». — «Добра, значыць, курорт? Што ж. Будзе. Вось позва — у 17-00». Прыходжу. Сядзяць... Чалавек дваццаць... Ну, думаю... кампанія. Маёр пачаў угаворваць... Заліваць пра цяжкасці ў сельскай гаспадарцы. Вось і прыехаў я... прымусова-дабравольна...

— Абажджы, мувіш, мувіш, а я ніяк не ўцямлю: за што ж цябе пад арышт? — бабуля Анэля чакала адказу. Не дачакалася. — Першы раз чую такое, каб ні за што чалавека пад арышт, — дзівілася яна.

Венік маўчаў.

Тады яна да Севы:

— Севасцян, тэж быць не можа, не па закону.

— За тунеядства, — адказаў ён, сустрэўшы нядобры позірк Веніка.

— Тунеядства? Як то?

— Ну, за тое, што не працуе нідзе, — паясніў Сева, а Венік брынькнуў на гітары, ірвануў струны — сярдзіта, нервова, пагрозліва. Ускочыў, гатовы ці не кінуцца да Севы.

— А-а, дак то дармаед, ці труцень. Ото ж і сказаў,

а то — тунеядства. Век такога не чула. Дак ты зусім нічога не робіш? А такі байбус. Вой-ё-ёй... — здзівілася, але веры не дала, — ці можа, дома што, па гаспадарцы? У нас толькі адзін не робіць у калгасе. Хата іх пад ліпамі стаіць. Вото ў гэтым канцы. Дак ён на старшыню зацяўся, што машыну нову не даў. Мувіў: не пайду, пакуль не падгоніць пад ганак. Дак тая і праўда была дабіта. Зачхае, зачхае і спыніцца. Дак ён дома што выробляе! Хату шыферам перакрыў, ваканіцы пафарбаваў, цяперака хляўчук перарабляе. А ты ото ж ходзіш і нічога не робіш? — здзівілася зноў, дапякала бабуля Веніка. — Яшчэ адзін быў, успомніла. Ні-ні ў калгас не хадзіў. Тэж усё сяло ведала. Ён змалку недапечаны, няразвіты. А дзецюком стаў — у гарэлку кінуўся. Дак той мувіў: каб у калгасе пасля работы пляшку «чарніла» давалі, хадзіў бы. Той усё па людзях: каму касіў, каму гной выкідаў — толькі за пляшку, адна плата. Так і загінуў. Замёрз зімою п'яны. Такая доля яго. А ты — бывае, зверху не відно — хворы, можа? Бацька, маці што мувяць?

— Ну ўсё! Даволі, бабуля! Пагаварылі пра гэта, і будзе! — злосна адрэзаў Венік. Устаў з лаўкі. Пазіраў на яе ва ўпор звужанымі вачыма, нібы нішчыў. Яна таксама пазірала смела, адчувала сваю праўду, не саступала. Але раптам сказала прымірэнча, мусіць, хацела яшчэ нешта давесці:

— Хай па-твойму. Я не супраць, — сказала нават абыякава. — Адно ведай: вось так і застанешся Венікам, кожны табою будзе падлогу церці. А дзеркачом станеш, з лысінаю (Сева засмяяўся: ну і бабуля!) — адумаешся, аж позна будзе. Чалавека за працу паважаюць.

Венік задумаўся, спахмурнеў, відаць, настрой у яго сапсаваўся.

— Севасцян! — загадала бабуля Анэля. — Вынесі яму кубак малака, там жа, відаць, не даюць, — як бы пашкадавала яна Веніка, а разам з тым намякала, што пара яму падавацца пад свой арышт.

Венік і сам помніў, зірнуў на гадзіннік, але яшчэ было рана.

Ён выпіў малако, нібы так і трэба, нават не падзякаваў. («Відно, што дармаед», — зазначыла сабе бабуля.) Выцер далонню губы, шмаргануў «маланку», зняў балоневую вятроўку і кінуў яе на невысокі плоцік. Зноў засяроджана пачаў тузаць гітару.

— Дай настрою, — Сева амаль сілком забраў яе ў Веніка. — Струны вісяць, як вунь тыя правады, — кіўком галавы паказаў угару, дзе сапраўды адвісла цягнуліся пад страху правады.

Венік усміхнуўся.

Бабуля абірала бульбу і не глядзела на іх, кінула толькі спадылба позірк, нібы нечакана ўражаная, потым падняла галаву, прыгледзелася. Бульбіна знячэўку выкаўзнулася ў яе з рук, пакацілася па сцежцы, паказваючы то белы, то ружаваты бок. А бабуля пазірала і пазірала на Венікавы грудзі. Адтуль нейкі чалавек, няхай сабе намаляваны, цэліўся з пісталета проста ў яе, ажно вока прыжмурыў. Яна прыкрыла вочы, прыжмурылася таксама, каб лепей разгледзець: ці сапраўды гэта так? Ён цэліўся, цэліўся... Пахаладзела ўсярэдзіне, захлынулася холадам сэрца, і яна ўжо ўбачыла яго твар, як жывы, сыты, з рудымі брывамі. Ён цэліўся ў яе, усміхаючыся, як бы забаўляўся. Раптам над галавою нібы нешта лопнула — самалёт браў гукавы бар'ер. Ці, можа, гэта ён там, у памяці, выстраліў. Не пацэліў — толькі кулька, як джала, сядзіць яшчэ ў сцяне. Добра, што яна адзержалася, не ўпала — там жа ззаду, за спінаю, за спадніцаю, схаваліся яе дзеці. Яна закрыла іх сабою. Не, гэта лопнула не неба, гэта ён выстраліў, але толькі ногі нібы ўехалі ў зямлю, а яна засталася стаяць.

— Нашто ты носіш гэта? — сказала да Веніка. — Не відзеў, не знаеш... Вот і носіш...

Твар бабулі засяродзіўся. Вочы пагаслі. Адразу стала відно, якая яна старая. Куточкі рота апушчаны, губы самкнуты, толькі рыска адна. Ссунула задумліва з галавы, з заінелых валасоў, хустачку, нібы душна было галаве, падставіла гарачы ад пякельных думак лоб ветрыку.

Загаварыла чужым, глухім голасам:

— Не знаеш, што было... — яна яшчэ крыху памаўчала, нібы ўспамінала. А яны, прыцішэлыя, пазіралі на яе, чакалі. — Толькі дня не хапіла. Адненькага дня... — нібы здзіўляючыся, хітала галавою. — З раніцы вельмі гухала: казалі ўсе, што фронт ідзе. І радасна ўжэ было: перажылі, дачакаліся збаўлення. А недзе ў поўдзень — панаехала іх, як варання наляцела. Тэхнікі найшло: зямля гула. А нас усіх выгналі. Прыспешвалі, быццам бы равы капаць. Усіх, усіх, з дзеткамі малымі, з немаў-

ляткамі. Стаім мы, гуртам, а яны нешта ўсё гергечуць. Са мною залоўка была, тая па-нямецку разумела. Гляджу, збялела ўся, калоціцца, а сказаць не можа. Потым за вёску пагналі. Тутака і ёкнула ў мяне сэрца. Як загалашу: «Людзі добрыя, як жа нам уратавацца, як гэты дзень перажыць? Чуеце — гэта ж нашыя ідуць. Дак яны нас пад кулі вядуць, прыкрывацца будуць. Людзі, хоць дзяцей уратуем! Дзеткі, разбягайцеся!» — крыкнула. А тут нешта пеканула ў грудзях — упала я. А дзеткі мае, дурненькія яшчэ, не пабеглі, а пакідаліся на мяне. Загаласілі: ма-а-мачка, ма-а-мачка. Шапчу ім знямелымі, як не сваімі, губамі: дзеткі, уцякайце... з людзьмі ўцякайце... з людзьмі ўцякайце! А яны не бягуць, мяне не хочуць пакінуць. Людзі ж, бачу, кінуліся хто куды, урассыпную, бягуць, бягуць лугам, падаюць... А яны, тыя карнікі, нібы пазвярэлі, як сталі з аўтаматаў касіць. Я ўсё бачу, а паварушыцца і сказаць што — не магу. А залоўка мая кінулася, пасцягала дзетак з мяне. Гляджу — з шашы кульнуліся, пабеглі. У другі бок пабеглі, дзе нікога няма. І адкуль той самалёт? Як коршак, цень адно ад крылаў. Прыціскае, прыціскае іх да зямлі. Ірванулася я, устаць хацела ці, можа, у гарачцы той, але толькі пакацілася некуды ўніз, ці не з броўкі дарогі. І больш не бачыла, не чула нічога, — бабуля з хрустам заламала рукі, роспачна захісталася на ганку. — Ноччу ўжо ачуняла трохі. Крыкнуць хацела, паваць дзетак, залоўку, а голасу нема, адно мыкаю, мыкаю, як у сне. І такі боль у горле...

І яна змоўкла. Нібы захрас у горле той боль і не даваў гаварыць.

Венік разгублена падняўся з лаўкі, сказаў, што яму пара, але яна не надала ўвагі, на развітанне нават не кіўнула. Сева праводзіў яго да школы. А бабуля ўсё сядзела на парозе, маўчала, вочы яе патухлі, як гэты дзень. Недачышчаная бульбіна ляжала ў драсёне ля ганка, як забыты мячык. Нагарнулася сіняватая шэрань, змерклася. А яна ўсё сядзела, маўчанне яе рабілася жудасным, але Сева баяўся яе трывожыць. Ён узяў касу, якую яна прыгатавала яшчэ ўдзень, пачаў абіваць траву ў двары, у садзе. Каса не слухалася (а здаецца, так проста — махай, і толькі), то слізгала па версе, то рвала метлюгі з каранямі, утыркаючыся лязом у купінкі, зразала траву пад корань. І так і гэтак ён прыладкоўваўся, стараўся, высільваўся, ажно ўмок, але касьба

не даваласся. Нават дзіўна было: не можа быць, каб ён не змог! Так валэндаўся ён дацямна. Туман ужо каціўся з лугу, здавалася там, недзе далёка, бабуля доіць карову, і малако даўно пералілося цераз край даёнкі і пеніста калышацца ў лагчыне. Не, карову яна не даіла. Карова хадзіла ў двары, пашчыпвала мураву, падымала пысу з ніткаю сліны, матала ёю, нібы хацела скінуць рогі. А яны ў яе былі велічныя і, мусіць, цяжкія. Бабуля сядзела, нібы не бачыла яе. Сева занепакоіўся. Яна сядзела нерухома, на парозе, абыякавая і маўклівая. І гэта яшчэ болей надало трывогі. Здалося, нехта сочыць за ім. Сева азірнуўся, прайшоўся позіркам па старым замшэлым плоце, нібы лічыў штыкеціны. Ага, вось яны, два вокі — як дзве спелыя ягады агрэсту. У шчыліне між плота мільганулі, зніклі, як толькі ён высачыў іх. Сева кінуў касу, падступіўся крадком, зірнуў між штыкецін. Убачыў і здзівіўся: адкуль тут такая дзеўчына?.. Тонкая, як лазінка, можа, гэта вузкія джынсы рабілі яе такою. Вочы порсткія, жывыя... Валасы доўгія, белыя. Страсянула імі, бы выказала сваю незалежнасць, горда прыўзняла галаву.

— Ты хто? — сказаў ён, уражаны. І, не дачакаўшыся адказу, дадаў: — Чаму падглядваеш?

— Хачу і падглядваю! — зноў страсянула валасамі, маўляў, адкуль ты такі ўзяўся, каб мяне дапытваць?

Але Севу хвалявала іншае: чаму нерухома сядзела бабуля? Проста дзіўна. Заўсёды рухавая і гаваркая, сядзіць і маўчыць, як знямела. І карову не доіць, а ўжо цямнее. «Можа, у яе запытаць?»

Сева прыпаў да шчыліны між штыкецін.

— Што з ёю? — папытаў у дзеўчыны, хітнуўшы галавою ў бок хаты. — Сядзіць і маўчыць. Увесь вечар...

Дзеўчына не адказала. Яна імгненна, як віхор, сарвалася з месца, раскінула, як фіранкі, штыкеціны, якія былі прымацаваны толькі зверху. Спынілася перад ім, глянула спачатку непрыхільна, нават варожа, аж яму стала ніякавата, нібы ў нечым правініўся.

— Ты яе разнервіў? — строга запытала, нібы ўчыняла яму дазнанне. — Распытваць стаў, нябось?

— Нябось, не стаў! — абараняўся ён прыцішана, ужо злуючы на яе. — Сама расказвала.

Дзеўчына кінулася праз сад, толькі белая, бы пырхнула там птушка ў змроку, кофтачка мільганула за яблынямі. Узляцела на ганак, чамусьці мінула бабулю,

пабегла ў хату. Хуткая, як маланка, выскачыла адтуль з кубкам вады, расплёхваючы яе на падлогу.

— Бабуня, бабунька, — абдымала і лашчылася да яе, нібы будзіла ад сну. — Наце, наце выпіце, — амаль сілаю нешта запіхвала бабулі ў рот, мусіць, нейкія лекі і ўсё прыгаворвала: — Запівайце вадзічкаю, запівайце.

Вада цякла на бабуліну кофту, спадніцу. Дзеўчына абтрэсла яе, змахнула рукою кроплі.

— А цяпер уставайце. Пайшлі. Ну, пайшлі класціся. Холадна сядзець.

Бабуля паслухмяна, як дзіця, паднялася з парога, згорбіўшыся, апіраючыся на плечы дзеўчыны, пайшла ў хату.

Сева сядзеў на ўслончыку, не ведаючы, што яму рабіць. Ісці да сваіх, шукаць іх па хатах было позна. Амаль што сцямнела. Усё сцішылася к ночы. Толькі карова хадзіла па двары, пашчыпвала мураву, падымала галаву з ніткай сліны, насцярожвалася, пазірала ў бок хаты, памыквала, бы падзывала бабулю.

Дзеўчына выйшла з даёнкаю — белым вядзерцам з адтапыраным вушкам. Пазвала карову: мякка і ласкава. Не так, як размаўляла з ім. Тая, мусіць, прызнаючы яе, радасна мыкнула, пайшла насустрач. Дзынкнулі звонка, як нечаканы лівень, забілі ў дно даёнкі тугія струмені малака. А з таго боку, ад крыніцы з лугу, каціўся і каціўся туман, нібы пеніўся сырадой.

Пад акампанемент малочных струн здалося нехта спявае, ціхенька, душэўна, як бы люляе кагосьці.

Прыслухаўся. Сапраўды спявае, дзеўчына гэтая! Спеў ужо ліецца з асветленай веранды: мусіць, яна цэдзіць малако. Псікнула на ката. Той, бабулін улюбёнец, так і лезе, відаць, ёй пад рукі, як і бабулі, трэцца, ілбом пад локаць штурхае. Наліла яму ў сподак. Строга сказала:

— Пі, вот, — а сама яшчэ сварылася, ушчувала яго: — Чуць малако мне не абярнуў. Во нахабны, не пачакаеш.

Севу захацелася разгледзець яе ў святле. І ён ціхенька падышоў, зазірнуў у акенца веранды. Яна была незвычайная! Якая? Расказаць бы ён не змог — проста незвычайная! Такіх, здаецца, ён ніколі не бачыў. Сэрца яго чамусьці сціснулася радасна і шчымліва. І ён стаяў, баючыся зайсці і парушыць яе ўпраўку, не ведаючы, што рабіць.

— А ты чаго стаіш? Ідзі вячэрай. Малако на стале. А можа, на танцы пойдзеш? Вашы там танцы ладзяць, — голас яе быў насмешлівы. Але яна пагасіла лёгкі здзек. Сказала прымірэнча: — Ты не бойся. Бабуля будзе спаць. Ты толькі не будзі яе. А калі што, заві мяне.

— Як зваць? — разгубіўся ён.

— Не знаеш? — узняла бровы. — Крычы: Насця! Нас-ц-я!

І пайшла. Не вуліцаю, а праз сад, праз тую адтуліну ў штыкетніку. Зноў мільганула, як птушка ў змроку, яе белая кофтачка.

«Насця, Насця, Насця», — гучала ў галаве. І цвыркуны, што дружна ўсчаліся дражніцца, стракаталі, смяяліся то з аднаго боку, то з другога, то з абодвух разам, не маглі заглушыць яе голасу. «Насця... Насця... Насця».

## 19

Незразумелае хваляванне, што ажно займала дых, і турбота, клопат не давалі яму заснуць. Не ведае сам, — ці гэта прымгнуў ён і пачуў у сне, ці бабуля сапраўды сказала, — у цішыні ночы яе голас прагучаў так роспачна, як стогн:

— Падумай, пяць касцоў у мяне было. Ці ж я прасіла б каго? Ці ж бы яны тую азярыну не скасілі?

Сева адкрыў вочы, прыслухаўся. Не, у хаце была цішыня. У вокны цадзілася, губляючыся ў хатнім мораку, святло. Ніколі ён не ўставаў так рана. Паціху, баючыся патрывожыць бабулю, улез у джынсы, закінуў коўдраю ложак, дзе спаў, ціхенька ступаючы, як бабчын кот, выйшаў на веранду, кеды абуў на ганку. Узяў з падстрэшша касу і падаўся праз бела-росны бульбоўнік. Кроплі, падаючы, прагна ўпіваліся ў кеды і калашыны штаноў. Было халаднавата. У лажку яшчэ блытаўся туман, нібы недзе курылася вогнішча, і дымок увачавідкі радзеў, падымаўся ўгору, чэзнуў.

Сева стаяў на ўзмежку, вырашаў, адкуль пачаць пракос. Зірнуў на ўсход, дзе бэзава свяціўся край неба. Сабраўшы сілу, размахнуўся, пусціў касу, здаецца, роўна і моцна. Яна ж адно каўзанулася — прайшла па версе. Трава пырснула кроплямі расы. Яшчэ і яшчэ браў ён пракос, але неслухмяная каса чаплялася, блыталася ў

траве. Ён упарта ішоў наперад, потны, мокры ад расы, але холаду не адчуваў. У мокрых кедах чаўкала вада. Ён зняў іх, кінуў на пракос ззаду, падкасаў калашыны. Ступіў босы, адчуў, як пеканула раса і стала колка ступакам, зноў усцягнуў на босыя ногі мокрыя, хлюпкія кеды, не завязаў, а, тузануўшы, заткнуў унутр іх шнуркі — абы на нагах трымаліся. Упарта налягаў на касу, паварочваў яе то так, то гэтак, але яна скубла, крамсала траву. Азірнуўся на пракос. Ён быў няроўны, пераблытаны. А пасярод, як на смех, чупрыліся грыўкі. Вярнуўся, пазмахваў іх, пазбіваў і зноў апантана пайшоў уперад, салёны пот шчыпаў вочы, а можа, гэта слёзы, бо ў грудзях была такая роспач, хоць заплач ці закрычы. Але што і каму крычаць? Не клікаць жа Насцю. Не, яна не павінна бачыць. Ён зможа, зможа! Упарта махаў і махаў касою, здаецца, прыраслі да касільна рукі. З-за краю лугу высоўвалася сонца — вялікае, чырвонае. І ён спыніўся. Глядзеў як зачараваны. Яно ж нібы смяялася над ім, усё вышэй і вышэй падымаючыся з-за далягляду, нібы хацела разгледзець гэтага няўдалага касца. І ён перастаў пазіраць на яго, апусціў вочы туды, дзе свяціўся крышталь расы, сціснуў касільна. І пайшоў, пайшоў упарта, не даючы сабе роздыху. Зноў азірнуўся на пракос, пераблытаны, няроўны. Зрэзаная трава ляцела як папала, лажылася на няскошаную, мяла яе. У роспачы хацелася кінуць усё, сесці і плакаць. Упарта, ледзьве перасіліў сябе, рынуўся, як у бойку.

Не заўважыў, як і адкуль з'явіўся гэты дзядок: невысокі, кашчавы, белая бародка рэдкая, але рота не відно, толькі люлька тырчыць у ёй.

Сева ад нечаканасці спыніўся. Яму здавалася, што гэты дзядок пачне смяяцца з яго. А той выбіў на росны дол сваю люльку, пстрыкнуў па ёй пазногцем і паклаў у кішэню выцвілай, падобнай на салдацкую гімнасцёрку, кашулі, тонкімі худымі пальцамі акуратна заплікнуў гузік, каб не выпалілася, не згубілася.

— Пастой, унучак, — падышоў і забраў касу ў разгубленага Севы. — Трэба памянташыць. — Утыркнуў касільнам у зямлю, а сам падаўся некуды агародамі. Разгублены Сева толькі пазіраў у той бок, куды ён знік. Дзядок не забавіўся. Прыйшоў. Нечым накшталт бруска пашморгаў, павастрыў касу. Потым пайшоў зусім у другі бок лужка. Спыніўся, адвярнуўшыся ад Севавага пракоса, нібы яго там і не было, і сказаў:

— Давай пачнём спачатку. Адгэтуль. Трэба, каб клалася на пакошу, а не на травастой, — гаварыў ён мякка, паблажліва, нібы не Сева, а сам толькі што перагблытаў, перашкуматаў столькі травы, — і вось так, глядзі.

Ён узмахнуў касою раз, другі, трэці. Толькі шыкала яна. Аж люба было пазіраць, як ядрана, густа і роўна клалася скошаная трава, а пад нагамі легла прасветліна, нібы тут паглыбеў нізок. Але не доўга красаваўся касец, неўзабаве закашляўся, рукі дрыжалі, і ўвесь ён згорбіўся, нібы асарамаціўся.

— Ах ты, пракляты, — лаяўся ён на некага, трымаючыся рукою за грудзі, якія разрываў кашаль, а другою — апіраючыся на касільна.

Сева падышоў, узяў у яго касу.

Кашаль у старога супакоіўся, і ён, не выціраючы слязы, якая спачатку вісела расінаю на вачах, потым папаўзла ў бараду, пачаў набіваць тытунём люльку, трамбуючы яго пальцам. Сева прыстроіўся касіць, пераймаючы паставу старога. Той ішоў ззаду, падказваў:

— Не цісні, не цісні так да зямлі, вальней. Навучыссяя. От гэты пракос пройдзеш, а там лягчэй стане. Налоўчышся. Не выкладайся, сілу аканомна расходуй, ашчаджай. Бо так доўга не пратрымаесся...

Шыкала, пазвоньвала каса. І не чуў Сева, калі суціх голас старога і сам ён недзе падзеўся. Мусіць, пайшоў дадому.

Сева не слухаў яго: не шкадаваў сілы, махаў і махаў касою, не размерана, разважна, як раіў яму стары, а аддаваўся касьбе ўвесь як апантаны. Радасна яму было, што каса слухае яго, што трава падатліва кладзецца ў валкі, што сонца смяецца, што неба яснае, што недзе тут — а можа, зноў падглядвае? — ёсць дзеўчына Насця. І каса гаварыла: «На-сця, На-сця...» Адно што душна і пот ліецца салёны, едкі. Твар бы спаласнуць, асвяжыць. Дзе ж тая крыніца? Бабуля тады хадзіла вунь за тыя разгатыя вербы.

Кінуў касу на траву і пайшоў туды. За колькі крокаў адчуў, не ад расы мокра пад нагамі, а, мабыць, пачалося балотца: ступаць было мякка, як на паралонавы дыванок. Нібы знарок, прыхаваны вербамі, стаяў сапраўдны калодзежык, толькі невялічкі, як цацачны. Вада ў ім, празрыстая, як шкло, бруілася, нібы закіпала пасярэдзі-

не, паціху пераліваласяцераз край. Ён прыпаў губамі да краю зруба — вада, як халодны агонь, прайшла ўсярэдзіну. Ён плёхнуў з далоняў на твар, адчуў яе пякучы холад. Паглядзеў, падзівіўся яшчэ на калодзежык, паназіраў, як б'ецца ўнутры яго струмень: вада, як жывая рыбіна, іграла на сонцы срэбна-зялёнай лускою. Напіўшыся, ён бы набраўся сілы, шырока ступаючы, пайшоў па пакошы. Памянташыў касу, як рабіў гэта стары, размашыста махаў і махаў ёю. Не даваў сабе перадыху. Спяшаўся. А дзевятай гадзіне трэба быць каля брыгадзірскай.

Ліпла да лапатак мокрая футболка, ён зняў яе, кінуў на пакошу, і самому захацелася прылегчы, крышку адпачыць. На адно імгненне толькі звёў павекі: хілілася, хілілася, нібы кланялася, трава, і срэбная рыбіна білася ў руках, вырывалася, аж холадна і козытна было ў далонях. Ён патрымаў крышку і выпусціў. Яна ўдарыла хвастом — апырскала сцюдзёнаю вадою, абрасіла яму твар і знікла.

Яго нібы нехта паклікаў. Прыслухаўся. Адкуль гэты голас? Як бы з-пад зямлі? Глухі і густы, як шолах лістоты. Ён прыпаў вухам да зямлі, замёр. «Слухай, — нехта падказаў яму. — Слухай. Я — зямля! — голас аддаваўся рэхам, плыў, як касмічная музыка. — Слухай, я адкрыю табе тайну... Ці піў ты з тае крыніцы?..» Але што гэта за перашкода: нехта трубіць і трубіць. Ну, Мікіціч — паставіў клаксан на сваю машыну. Дадумаўся ж. Цётачка Марыя дакранулася рукою да яго лба. Уся светлая, у вянку з жоўтых кветак. «Намаяўся», — сказала ласкава. Як ярка гарaць кветкі. Ён ажно зажмурыўся. Потым адкрыў вочы. Цётачкі Марыі не было і блізка. Бабуля Анэля сядзела і гладзіла яго па галаве. Ён падхапіўся, атрасаючы тлум сну. Яшчэ не разумеў: дзе ён і што з ім.

— Я думала, пайшоў да сваіх. Ото ж ты тут, — лагодна сказала яна.

«І тое «намаяўся» — таксама яна, мусіць, прамовіла, не цётачка Марыя», — блытаючы яву і сон, падумаў ён. Пацёр далонямі твар.

— Бабуня, нашто ты мяне пабудзіла, — сказаў з горыччу. — Я чуць-чуць не ўведаў нейкую тайну. Сама зямля гаварыла. Толькі сказала: «Ці піў ты з тае крыніцы?..»

Бабуля Анэля задумалася, усміхнулася, бо сярпок

губ выгнуўся ды вочы паяснелі. І ветрык дакрануўся да нераспелага дзьмухаўца яе галавы.

Сева падняўся. Аслабелы, як вымалачаны сноп. У роце было суха. Пайшоў да крыніцы, зноў прыпаў, хапіў яе вогненнай вады, апаласкаў, фыркаючы ад пякучага холаду, твар. Бабуля не пайшла за ім, чакала.

— Што гэта за крыніца? — папытаў у бабулі.

Яна памаўчала, паглядзела некуды далёка-далёка. Потым паказала яму кіўком туды, куды толькі што ўзіралася:

— Глянь. Там далёка серабрыцца рэчачка. Вось з гэтай крыніцы тая рэчачка і пачынаецца. І плыве яна ў большую, тая яшчэ ў большую, і так да самага мора. — Яна ўлавіла яго зацікаўлены позірк. — А ты думаеш, хто вялікія моры робіць? Яны, вось такія крынічкі. — Яна зноў пазірала туды далёка-далёка.

Сева глянуў на гадзіннік, заспяшаўся. Заставаліся лічаныя мінуты. Няма калі яму, спазняецца. І рушыў хутчэй, толькі ў аўтобусе, які вёз грабцоў на пакошу, зашнураваў кеды.

— Што, заяц, праспаў, — лагодна варухнуў яму чупрыну Астапавіч. — Гляджу, на сняданку няма.

— Праспаў, — кіўнуў ён галавою і засмяяўся.

...І зноў за работу — варочаць, варушыць сена. І пайшоў, пайшоў ён па пракосе з канца ў канец. У галаве яшчэ блытаўся той сон, чуўся голас зямлі. Не, не тое яна хацела яму сказаць, — не пра вялікія і малыя рэкі, — нешта другое. Ах, гэтая бабуля — узяла і пабудзіла. А каб не пабудзіла, зноў бы спазніўся, як да Мікіціча.

— Се-ева! — раптам пачулася з таго канца лугу. — Се-ва-сцян!

Ён азірнуўся. Крычалі дзяўчаты, паказвалі на старую, якая ішла пакошаю.

«Бабуля Анэля? Што здарылася?»

Яна ішла борздзенька, ажно прыгорбілася, спатыкалася на няроўным, калдобістым лузе. Бабуля несла штосьці ў руцэ, увязанае ў паркалёвую хустачку. Ён пайшоў насустрач.

— Севасцян, — сказала бабуля задышліва, прысаджваючыся на ахапак сена. Яна, відаць, стамілася, але вочы радасна свяціліся. — Як жа ты так, дзіцятка. Пабег не снедаўшы. Я туды-сюды, а цябе няма. Да брыгадзірскай — а там мувяць, паехалі...

Яна разраўняла пакамлычанае сена, развязала хустачку, выняла гладышак з малаком...

— Бабуня, ну што вы... — засаромеўся ён, тым больш што сталі падыходзіць цікаўныя. Пасмейвацца.

— А ты еж, еж, не саромейся. А я, не думай, прыехала. — Яна кінула позірк у канец пакошы. — Брыгадзірка наша, Даліна, на гэтым кані ездзіць. Ото ж на матацыкле б ёй, а яна — на кані. Матацыкла не хоча. А я ёй: пакуль ты будзеш тут засядаць, падлічваць ды падбіваць, я і вярнуся.

Ля канавы папасваўся конь, запрэжаны ў вазок.

Ніякавата было, але так хацелася напіцца.

Парыла, пякло сонца. Сева прыпаў да гладышака з малаком.

— Во каму шанцуе. Як кот у смятане, — смяяўся, падыходзячы да іх, малады мужчына. — Мне б так. А то трубы гарадзь з учарашняга.

Грабцы пакідалі граблі, вілы, радуючыся перадыху, моманту павесяліцца, паселі ўкруга, як восы ля варэння.

— Хопіць, бабуля, дзякую, — заспяшаўся Сева, соваючы ёй у рукі гладышак.

— Ты не зважай на іх...

— Праспаў, — паясніў усміхаючыся па-добраму, Астапавіч, — ускочыў у аўтобус, нават джынсы не зашпіленыя.

Усе зарагаталі.

— Не праспаў ён, — уступілася бабуля Анэля. — Ён раненька-раненька ўстаў, да сонца. І сена мне накасіў.

Бабуля пазірала на яго з любасцю, вочы яе свяціліся і шчокі пунсова заірдзеліся.

Усе прыціхлі, пазіралі здзіўлена.

— Багата скасіў, во-о-о, як вокам скінуць, — дадала яна, паказваючы на пакошу.

— Ну, не столькі... — перабіў яе Сева.

— А я прамарудзіла. Ногі не тыя, з ім не сыдуся. Я туды-сюды, а яго няма. Крычу: Севасцян, паеж, дзіцятка! А ён — дзе там. Я — да Даліны. Вунь, — паказала на каня, — я на яе каньку і прыехала.

Бабуля зняла з галавы хустачку і выцерла ёю твар. Валасы яе, белыя як снег, бэрсаў ветрык.

— Як жа ён будзе не еўшы, думаю? — выказвала свой клопат бабуля Анэля. — Я і прыехала...

Яна акінула вокам сенажаць.

— Сена накасілі, вачэй не хапае згледзець, — сказала прасветлена. — А некалі ж мы ўсё гэта рукамі...

— Цяжка было? — папытаў нехта з дзяўчат.

— Яно нічога не цяжка, калі сілы ды ахвота ёсць. Цяжка другое...

Сева захваляваўся: раптам яны пачнуць яе распытваць? І яна ўспомніць тое, чаго нельга ёй ні ўспамінаць, ні забываць.

— Бабуня, я падганю тваю карэту! — крыкнуў Сева і паімчаў да каня.

— Я сама дайду. Раптам не зможаш!

Сева скіраваў-такі каня сюды, падагнаў да бабулі. Яна села ў вазок, махнула яму рукою. І ён таксама. Бабуля паехала, а ён пайшоў шукаць свае граблі. Ішоў і бачыў — усе хораша ўсміхаюцца яму, і самому хацелася ўсміхацца. Светла было на душы. І ніколечкі не сорамна.

Азірнуўся. Далёка на дарозе за канаваю мільгала бабуліна белая хустачка. Конік бег трушком, і бабуля сядзела ў вазку, як паненка, што едзе на кірмаш.

## 20

— Бабуля, дзе граблі? Пайду сена зграбаць, — сказаў Сева ў адчыненае акно.

Голас яго рэхам аддаўся ў хаце. З хаты яму адказалі:

— Ото ж і я з табою. Каб хмара не найшла, сёння і ветрык памяняўся. Набрыняла паветра...

— Адны ўправімся, — запярэчыў ёй Сева. — Венік прыйшоў...

Грэбці сена Венік пагадзіўся, праўда, абыякава і ленавата. Наогул, яму было ўсё адно, што рабіць, а лепш — нічога. Але ён не сказаць каб паважаў, мусіць, пабойваўся бабулі Анэлі, не зразумелая была яна яму. Ніколі ніхто з ім так не гаварыў, а бабуля Анэля секла проста ў вочы, што думала. Востра кпіла над ім. І ён, — не ведае чаму, — цярпеў, не пярэчыў, не абараняўся. Ды Венік і засумаваў, усё яму надакучыла. Трэба ж так-сяк вечар перабыць. «Добра б, канечне, піўка пацягнуць бутэлечкі дзве. Ды гэты «таварыш гражданскіх» стаіць над душою. Песні пад гітару і то не ўсякія дазваляе. Яму, бачыш ты, «дан приказ ему на запад».

Якія яшчэ там ён любіць? Ага, пра бусла над хатаю. Бусла ўспомніў. Дзярэўня...» — расказваў ён.

Сева заўважыў, Венік стараецца не плямкаць, хоць і спатыкаецца, бы язык прыкусвае. Толькі што ён меў размову з начальнікам і ніяк не мог супакоіцца. «Што ты носіш гэтую гітару, як жабрак торбу», — сказаў той. Веніка гэта абразіла, але гітару пакінуў. Потым песні яго стаў высмейваць. Вось і злаваў Венік.

Венік гроб сена няўмела, нехаця. Проста не вытрываў бы, каб на яго пазіраў які-небудзь сталы чалавек, гаспадарлівы, — адабраў бы граблі і паслаў бы яго на ўсе чатыры бакі, а можа, і далей. Ён кеўчыў яго, заграбаючы чамусьці ў тугі камяк, усё роўна, як галушкі качаў, не мог даўмецца падпароць, падчапіць грабільнам ці ўзяць на зубы грабляў, прыхапіць рукою, паднесці. Але не любіў, калі яму падказвалі. «Што я, сам не знаю?» — абураўся. Нібы ўсё ведаў, але знарок рабіў па-свойму. Твар яго быў панылы, як гарбузны ліст у спёку.

З-пад сена выскачыла жабянятка, заспяшалася, адпіхнулася нязграбнымі лапкамі, перакацілася, паказваючы белае, маршчаценькае пузца. Веніку стала смешна. Ён ударыў па жабяняці граблямі. Яно перакацілася і ледзь папаўзло, сударгава торгаючыся. Венік злаўчыўся, прыціснуў яго нагою. Адчуў мяккае, як булка, цельца. Жабяня не варушылася, затаілася, ці, можа, было нежывое. Венік калупнуў яго наском красоўкі, шпурнуў ад сябе, як лядзяш на дарозе. Яно ляцела, выцягнуўшы лапы, бы хацела за нешта яшчэ зачапіцца.

— Ты што там? — папытаў Сева.

— Нічога, жабец замінаў...

Сева падышоў бліжэй. Стаў побач з Венікам, які яшчэ бязладна кеўчыў сена на адным месцы.

— Ну, што ты новае прачытаў пра Напалеона? — папытаў Венік.

— Новае? Нічога. Я думаў, думаў пра старое. Я прачытаў у Энгельгарта, што Напалеон праліў 800 тысяч вёдзер чалавечай крыві. Ты ўяўляеш? — сур'ёзна сказаў Сева. — Але ўсе яго войны зараз здаюцца лёгкай прагулкай забойцы па Еўропе. Гэта калі ўлічыць, што на кожнага з нас ужо прыгатавана бомба. У свеце назапашана 50 тысяч боегаловак. І кожная з іх можа знішчыць дзесяць Хірасім.

Сева абвёў позіркам прастор пакошы і, здаецца, на-

ват убачыў, як бліснула рака там, удалечыні, пра якую гаварыла бабуля. Ён маўчаў. Спахмурнеў і Венік.

— Пра гэта проста не трэба думаць. Ты жыві так, як я. Дзень да вечара. Ты ж ведаеш, у нашага пакалення кароткі век, урэзаны, — сказаў Венік.

— Як ты? — здзівіўся нечакана Сева.

— Я і забыў, ты ж будзеш вялікім гісторыкам, — трошкі насмешліва сказаў Венік.

— Гісторыя — цікавая навука.

— Хіба гэта навука? — засмяяўся цяпер адкрыта Венік.

— А як жа. На гісторыі вучацца. Толькі, каб вучыцца, яе трэба ведаць. Ці знаеш ты, што ў 1760 годзе нашы продкі, абараняючыся, узялі Берлін. І прускі кароль Фрыдрых II у роспачы лямантаваў: «Я нешчаслівы, што застаўся жывы». А ў лютым 1813 года, — горача, захапіўшыся, гаварыў Сева, — тады, у лютым, выганяючы Напалеона, нашы войскі зайшлі ў Берлін. А ў 1844 годзе руская армія поўнасцю разбіла германскую пад Гумбіненам ва Усходняй Прусіі. А потым — роўна праз 101 год — нашы салдаты распісваліся на рэйхстагу. Цяпер скажы: хіба гісторыя не навука? Каб Гітлер і яго хаўрус вывучалі яе і рабілі вывады...

Венік слухаў Севу з захапленнем, здавалася, ён нават зайздросціў, панік, пра нешта задумаўся. І Севу захацелася яго падбадзёрыць.

— Хадзем, я табе нешта пакажу, — сказаў загадкава. Ён разгаварыўся, раздобрыўся, і Венік быў яму цяпер лепшы сябар, якому можна даверыць любую таямніцу. Яны ж разам працуюць, разважаюць пра сусвет. Венік нават граблі не кінуў, а так і ідзе, ускінуўшы іх на плячо.

Кучомісты вярбняк і клейкалісты алешнік, угрэтыя за дзень, крыху ажывалі, мацнелі; ачынаўся, падымаў лісце бульбоўнік, які ўдзень бы знепрытомнеў ад задухі і млосці. Сонца ўжо не пазірала ў поўныя вочы, яно як бы толькі касілася на гэты лужок, прыбраны за дзень, на нязграбную, аднабокую, але ладную копку сена, і зазірала ў прагалінкі між шэрага вербняку на плёскатлівую крыніцу, дзе, здавалася, білася, вывroutочвала вясёлкавую спіну ў сіні, фіялетавы, зялёны крап сапраўдная рыбіна.

Венік і Сева — Сева, баючыся парушыць уражанне Веніка, — маўчалі, пазіраючы, як весела іграе вада.

— Ты пакаштуй, яна, як агонь, апякае нутро, — сказаў Сева, і сам прыпаў да зруба калодзежыка.

Напіўся і Венік.

— Глядзі ты, аж сківіцы зводзіць, — здзівіўся ён. Стаяў, пазіраў, як іграе варухлівая рыбіна, і нечакана грабільнам пачаў пароць, пароць тую рыбіну, што білася срэбна на сонцы, аж пакуль не ўскаламуціў ваду і з крыніцы не лінулася штосьці бурае, нават чорнае, як дзёгаць, можа, змешаная з торфам вада. Сева як аслупянеў, ён адразу не мог зразумець, што адбываецца, чаго Венік порацца там, што хоча зрабіць? Аж пакуль не плёхнула з калодзежыка бурая каламуць, нібыта нехта пабіты сплюнуў крывавую сліну...

Сева кінуўся да Веніка. Схапіўся за грабільна, але той трымаў яго моцна, і адчувалася, што сілы ў яго больш, чым у Севы, ён быў дужэйшы.

— Што ты робіш? — абурыўся Сева. — Нашто?

Але Венік забіваў крыніцу з нейкай нават асалодай, якая дурнавата-нахабна была напісана на яго твары. Сева злаўчыўся, з усяе сілы пхнуў Веніка. Той не чакаў, мусіць, удару і пляснуўся сваімі латанымі-пералатанымі жабрацкімі джынсікамі проста ў лужу, куды сплывала каламуць. Падхапіўся, твар яго быў разлютаваны, ён нават сказаў нешта брыдкае, хапіў Севу загрудкі. Яны пакаціліся па мяккай, што паралонавы дыван, балацявіне, толькі чаўкала пад імі вада, па рудой пожні, не зважаючы на тое, што яна колка парола ім бакі, абудзіла спіны.

— Варвар, — хрыпла шыпеў Сева, — і продкі твае, мусіць, былі захопнікі, можа, прыйшлі сюды...

Ён сам не зважаў на тое, што гаварыў, але хацелася не кулаком, дык словам дапячы яму, бо сам быў распластаны на пожні пад цяжкім і чэпкім, як спрут, целам Веніка. — І сам ты — ачышчальнік кішэняў, дармаед, — з натугай, увесь чырвоны, гаварыў Сева.

— Ану ўстаць! Каму гавару! — пачуўся звонкі голас.

Венік ад нечаканасці адпусціў Севу, усхапіўся на ногі. Сева таксама паціху ўстаў, абтрасаўся. Абодва былі перапэцканыя ў тарфянік, мокрыя. Венік пазіраў на граблі, якія трымала дзеўчына, на яе: адкуль узялася такая, фірменная, такіх ён тут не бачыў? І камандавала ім, як сабакам. Атрэпваўся, робячы выгляд, што нічога сур'ёзнага не адбылося.

Сева ў душы нават абурыўся на Насцю, сказаў незадаволена:

— Ты зноў падглядвала!

— Падглядвала! Люблю падглядваць! — але позірк яе быў звернуты на Веніка. Нават не павярнула галавы, пакуль гаварыла: — Ты ведаеш, што гэта за крыніца? Ад яе раны гояцца. І яшчэ. Хто нап'ецца з гэтай крыніцы, абавязкова сюды вернецца! — Яна задыхнулася, набрала паветра. — Але ты, ты сюды не вяртайся! Ты нічога тут не любіш. Думаеш, я не бачыла? Што табе зрабіла гэта жабянятка? А ішоў сюды — клянок вунь там зрэзаў. Трасцінка, бачыш ты, яму спатрэбілася. Не прыязджай больш сюды! Чуеш?

Венік слухаў яе і пазіраў на свае перапэцканыя, мокрыя джынсы.

— Ды пайшла ты! — сказаў адрывіста і злосна. — Глядзі, патрапіш мне... — І пакіраваў прэч.

Сева не вяртаў яго, не пайшоў следам. Ён стаяў і пазіраў на Насцю. Ад хвалявання яна зрабілася яшчэ прыгажэйшай: шчокі заліла лёгкая чырвань, вочы былі таго ж незразумелага колеру, як вада ў крыніцы — то зялёныя, то сінія, то ў залацісты крап, глыбокія і ясныя. І валасы ўспыхвалі, нібы з іх асыпаліся залацінкі, калі яна патрасала імі.

— Ты піла з гэтай крыніцы? — папытаў Сева.

— Канечне. Мяне нават бабка лячыла гэтаю вадою.

Але ён не вельмі верыў у гаючыя вартасці крыніцы, яму было цікава — ці вернецца яна сюды?

— Канечне, — упэўнена адказала. — Калі вывучуся на доктара...

— Чаму на доктара?

— Таму, што тут багата людзей, каго трэба лячыць. І бабулю Анэлю, і майго дзядулю. Ты чуў, як ён кашляе? У яго асколак у грудзях.

— А-а, гэта ты яго прыслала, калі я касіў?

— А што? Ты сам ніколі б не навучыўся. І наогул табе трэба многаму вучыцца.

— Цікава, чаму ж?

— Няўжо ж ты заўсёды будзеш касіць, як першабытны? Хоць бы трактар умеў вадзіць ці касілку. Усе сельскія гэта павінны ўмець.

— І ты мне дазволіш сюды вярнуцца? — ужо з лёгкай іроніяй папытаў ён.

— Дазволю. Толькі ты не вернешся... — голас яе па-

цішэў, стаў губляцца ў вечаровых гуках, стракатанні цвыркуноў, якія нібы скакалі вакол іх і смяяліся, дражніліся, як дражняцца дзеці, калі ўбачаць побач хлопчыка і дзяўчынку: «Цілі-цілі цеста, жаніх і нявеста!»

— Чаму? — папытаў сур'ёзна ён, як быццам яна магла ведаць наперад, што з ім будзе, угадаць, замовіць...

Яна як быццам сапраўды нешта ведала сумнае, ад чаго пасумнела і сама, аб нечым задумалася, але хуценька прагнала хмурынку з твару.

— А што ты цікавае ведаеш? Ён усё ў цябе пытаў, — паказала ў той бок, куды пайшоў Венік.

— А-а, ты яшчэ і падслухоўваеш? — папікнуў яе Сева.

— Не думай, не за табою падглядваю, — сказала сур'ёзна. — За бабуляю Анэляй. Калі яна замоўкне, зацятая зробіцца і сядзіць нерухома — гэта... — яна не знаходзіла слова, — гэтага ёй нельга, яна можа так... — яна баялася сказаць нешта страшнае. — Раней, калі на яе находзіла гэтае зняменне, мая бабуля яе — па шчоках, па шчоках, пакуль тая не заплача. Так трэба. А я толькі тармашу, ды цяпер і пілюлькі ёсць ад яе хваробы. І радзей з ёю гэта бывае, толькі калі ўспомніць. Яна нешта робіць, размаўляе з каровай, з катом, з клёнам, з гэтым бульбоўнікам, з крыніцай — таму і жыве. Зразумеў?

Яна страсянула валасамі і пайшла, ні разу не азірнуўшыся. А ён стаяў і ўсё пазіраў ёй услед, здзіўляючыся, што яна, маючы гадоў пятнаццаць (не больш), ведае нешта большае, чаго не ведае ён, прыкмячае і запамінае тое, што ён прапускае міма вушэй, ці ў адно вуха ўлятае — у другое вылятае. Ён жа сам чуў, як бабуля ўгаворвала Ваську: «Не хадзі ты туды, там табе чужыя каты вушы паабдзіраюць»; або, праходзячы каля плота, скажа: «Саўсім ты пахіліўся, ай-я-яй»; і нават яго кедам: «Тэж да ніткі ён вас вымачыў, пасушэцеся вось тут, на камінку». А пра людзей, дык і гаварыць няма чаго... Кожнага словам зачэпіць, пагаворыць, распытае і паспачувае.

— Глядзі, — паказала бабуля. У фартуху яе было некалькі яек. — Я яе ўсё-ткі падпільнавала. Седала сабе зробіла. Я цяпер буду ведаць твае пахады, — пагразіла

курыцы, якая хадзіла па двары і квохкала, быццам адгаворвалася, апраўдвалася.

— Бабуля, а праўда, што тая крыніца гаючая, што той, хто нап'ецца — вернецца? — папытаў нават нечакана для сябе Сева, так яму запала ў душу тое, што казала Насця.

Яна памаўчала, толькі зірнула вельмі ўважліва ў яго вочы, нібы здзівілася, адкуль гэта яму вядома. Ён ведаў, толькі дзеці задаюць такія пытанні — дарослыя ў цуды не вераць, і ён таксама ўспрыняў гэта несур'ёзна, але ёсць жа нейкая ў тым гісторыя.

— А-а, гэта ўсё Хасан гаварыў. Ён паранены быў, нежывы зусім. Я знайшла яго ў лузе, падцягнула да крыніцы, твар абмыла. Ажыў, пазіраць на свет стаў. Выхадзіла яго, пажыў трохі і — у партызаны. А пасля крыніцы не стала. Бой тут вялікі быў: танкі яе і затапталі. Пайшла яна ў зямлю, схавалася. Як трохі ажылі мы ад вайны, пачалі яе, родную, шукаць. Раскапалі, ачысцілі. А Хасан пасля вайны колькі разоў вяртаўся. Усё казаў: вады крынічнай напіцца, падлячыцца. То гэта яго словы. Мо і напраўду яго цягнула так, што вады гэтай гаючай напіўся. І свая зямля не адпускала, — мусіць, і тамака ёсць такія крыніцы. Мене ўсё зваў да сябе. А як жа я дзетак пакіну? Усё ж яны ў гэтай зямлі і ляжаць, мо яна таму такая і родная. Не, мне не можна было адсюль крануцца...

Сева спужаўся, што зноў растрывожыў яе ўспаміны, што яна зноў замоўкне, замкнецца, застанецца сядзець тут, знямелая, таму трэба было ёй нешта гаварыць, расказваць, расказваць. Але што? Не пра Напалеона ж, як Веніку, пра нешта харошае, добрае. Пра цётачку Марыю, пра маму, тату, пра Росціка, пра сябра свайго Вадзіка, пра майстра Мікіціча. Але сказаў самае-самае патаемнае, што і сам нядаўна толькі ўведаў:

— Мая бабуля знайшла дзяцей сваіх у канцлагеры. І толькі нядаўна цётцы Марыі сказала пра тое. Яны і роду свайго не ведаюць. Цётка, мусіць, француженка. Што як яна надумаецца туды паехаць? Я так не хачу, каб яна пакідала нас, — пажаліўся Сева нечакана для сябе бабулі Анэлі.

— І не пакіне, — упэўнена сказала бабуля. — Чалавеку добра там, дзе родныя людзі. А яна ўзрасла на гэтай зямлі. Можа, і з'ездзіць, зірне. Але ўсё адно вернецца. Ці ж яна зможа без цябе, без бацькоў тваіх, без

людзей тых, з якімі і гора і бяду перанесла, і радасць мела...

Бабуля Анэля стаяла каля копкі сена, папраўляла яе, аскубвала, абгладжвала і падторквала повалач.

— Зімою кароўка паласуецца, — ласкава сказала яна, не хаваючы сваёй радасці. І гэтая радасць перадалася Севу, і ён упершыню (ага, сапраўды ўпершыню) адчуў, што зрабіў нешта карыснае. І нават крышачку ганарыўся сабою. Толькі крышачку, аб чым і сам не здагадваўся. Проста неяк лёгка і ўзнёсла было ў грудзях.

...Зноў быў дзень. Працавалі на далёкім лузе. Можа, паўгадзіны ехалі аўтобусам. І цяпер ён стаяў ля мастка праз канаву, чакаў іх. Сева прыслухаўся. Здалося, паклікала яго Насця. Ён нават сумеўся: толькі што думаў пра яе, як наяве бачыў яе залацістыя валасы, вочы зменлівыя, у якіх можна чытаць і пачуцці і думкі, — такія не зманяць.

— Севасцян!

Ён азірнуўся. Гэта было наяве. Праз луг ішла Насця. Яна вяла за руль, як непаслухмянага казла за рогі, а той упінаўся, веласіпед. Мусіць, ёй было цяжка, а можа, нязручна весці яго па куп'істай пакошы, бо, зняўшы белы вузельчык з руля, пакінула веласіпед проста сярод лугу.

Сева і абрадаваўся, і зніякавеў — да яго ішла Насця, — і занепакоіўся: мусіць, нешта зноў з бабуляй? Усе пазіраюць і ўсміхаюцца, няхай сабе і па-добраму, але ўсё адно ніякавата, таму ён знарок нахмурыўся, нібы і не ведаў яе. Але Насця ўсміхалася.

— Чаго табе? — сказаў Сева незадаволена.

— Бабуля табе малака прыслала. Яна сама хацела. Ды Даліна некуды паехала: каня няма. Яна і папрасіла мяне...

Яна разгубілася. Грабцы ўсміхаліся, падыходзілі да іх. Вось яны ўжо ў сярэдзіне круга, як у карагодзе.

— Не хачу я. Што вы ўсе?! — голас у яго быў узрушаны і панылы.

Тады Насця прыўзняла галаву, адразу нібы падрасла, страсянула валасамі, якія заіскрыліся на сонцы.

— Ну, і я дадому яго не панясу! Што мне бабуля Анэля скажа? А выліваць малако няможна. Гэта табе не вада.

І яна вылузала з хусцінкі трохлітровы слоік з малаком, наверсе — капронавая накрыўка.

— У чым справа? — умяшаўся ў іх гаворку малады вусаты дзяцюк. — Маладыя не згаворацца. — Ён пасмяяўся. — Мы зараз яго вып'ем і вусы не памочым. — Ён ужо працягваў рукі да слоіка.

— Ну, ты туды са сваімі вусамі палезеш? — спыніў яго нехта.

Неўзабаве знайшлі кубак і пад смех і рогат, пахвальваючы, пілі малако, дзякавалі, перадавалі прывітанне бабулі Анэлі, хвалілі Насцю, хлопцы нават пачалі заляцацца да яе.

Насця ўсміхалася, не-не ды і кідала свой ясны позірк на Севу, нібы азорвала яго святлом. Але той хмурыўся і напускаў абыякавасць на твар, стражыўся.

Насця развіталася з усімі, панеслася на веласіпедзе па ўкатанай мяккай лугавой дарозе як птушка. Сева пазіраў услед, і чамусьці яму хацелася моцна-моцна крыкнуць: «На-а-сця!», нібы яна знікала назаўсёды...

Надвячоркам шэфы ад'язджалі дадому.

Сева забег па руксак. Часу было мала, але ён усё цягнуў з адыходам, сачыў з саду і заглядваў за штыкетнік. Зноў хацелася паклікаць: «На-а-сця!», але нешта стрымлівала яго, пабойваўся ці саромеўся, сам не ведаў, што адбываецца з ім. Ад'язджаць было цяжка і сумна, ажно нешта ныла ў грудзях, шчымела. І падумалася: няўжо гэта ад таго, што ён напіўся з той крыніцы. Здавалася, Насця тут ні пры чым. Ехаў дарогаю і нібы бачыў яе: то ляціць белаю птушкаю на веласіпедзе праз луг, то бяжыць садам, то сочыць за ім сваімі агрэставымі вачыма праз шчыліну ў штыкетніку. І дома ён думаў пра Насцю. І ў душы, як агеньчык, жыло спадзяванне, што ўсё наперадзе, што жыццё толькі пачынаецца, што ён абавязкова (інакш і не мысліў) знойдзе яе, бо паміж імі не пустата, не невядомасць, а жывая, светлая крыніца, да якой — верыў — абое яны вернуцца. Там і будзе іх сустрэча. Яны знойдуць адно аднаго. І будуць разам, абавязкова будуць разам. Яму цяпер здавалася, што тое пісьмо, якое ляжыць у матчынай шуфлядзе, пра яго і пра Насцю, нібы сам ён напісаў яго... А можа, напіша... Хацелася дастаць яго з шуфляды, перачытаць...

21

Алене было чамусьці цяжка, няўтульна на душы, што часам бывае, калі на цябе нехта ўпотай пільна глядзіць. Здавалася, пад тым позіркам яна была не сабою, а толькі рабіла выгляд, сама ж незнарок пазіравала, каб здацца лепшай, чым ёсць, а можа, проста непазнавальнай. Але на душы было ніякавата. Гэтая штучнасць павадзін была нязвыклая для яе. Усё, здаецца, было добра, аднак нечага не хапала. Роспачна не хапала. Трэба было супакоіцца: нешта ўспомніць, нешта забыць, каб прывесці ў суладдзе з галавою душу, але на гэта трэба быў час. «Я стамілася, — думала яна. — Гэтая бясконцая мітусня: работа — дом — магазін. Мітусня... Ёй ні канца ні краю. Я стамілася. Вось здаць гэты праект — і ў адпачынак. Нават не папытала, як там у Андрэя? Трэба і Росціка ўзяць і Севу. Пабыць з імі, а то, здаецца, і бачыш кожны дзень, а не ведаеш нічога пра іх. Сева стаў замкнуты. Маўклівы. Узрост...» — заключыла супакойліва. Але спакою не было. На сэрцы быў жаль. Ці то да сябе, што вось так у гэтай мітусні і жыццё пройдзе. Ну, колькі тут засталося? А потым старасць. Старасць — і ўсё. І зноў перад вачыма быў *ён* — стаяў з кветкамі. Канечне, гэта смешна і нават крыху сумна. Так, хутчэй сумна. Але гэта так. Навошта яна думае пра яго? Цяпер асабліва, калі трэба хутчэй здаць праект. І чаму позірк раз-пораз ды цягнецца да акна: можа, ён зноў там. Не, яна не хацела яго бачыць. Проста ўсплывала старая, як незагойная рана, віна перад ім, нават не перад ім, а перад тою дзяўчынаю, што даўно, гадоў васемнаццаць назад, сядзела на вакзале, можа, у слязах. Канечне, у слязах... Яна ж выправілася з ім у адзін шлях, думала пра жыццё. «Навошта, — думала з прыкрасцю цяпер Алена, — я адкупілася ад яе? Можа б, у іх усё перамалолася, перацерлася... і жылі б. Выраслі б ужо дзеці, як мой Сева і Росцік». Цяпер на ўсю гэтую гісторыю яна пазірала іншымі вачыма — стала, спакойна і разважна. І прыкра ёй было. І каб можна было... Не, нічога ўжо не вернеш. Цяпер яна не бачыла таго апраўдання, як раней. І гэтая віна грызла і прыгнятала яе. Ведала, ён хоча пабачыцца з ёю, не стаяў бы пад дзвярыма. Чаго ж баіцца яна? А раптам скажа: «Ты, Алена, ва ўсім вінавата. Нашто дала тады грошы? Можа б, у нас усё і зладзілася?»

Ужо каторы дзень яна не знаходзіла сабе месца. Расказала Марыі. Але тая ўспрыняла гэта надзіва спакойна.

— Ён проста хоча табе аддаць тыя грошы, — разважыла яна. — Мама тады не забрала іх.

— Яна ўсё пісала мне: дачушка, не пішы, забудзь пра яго, ён табе не пара, не наравіцца ён мне, дужа не наравіцца, — успомніла цяпер Алена.

— Мама ніколі і не пайшла б па тыя грошы. Але ж была ў судзе засядацелькай, — якраз нейкая жанчына спраўляла з яго аліменты. Мама і ўзлавалася: няхай жа і гэтыя аддае. Пайшла да яго мацеры. Але, расказвала, там — такая галеча, што душу прыкрыць нечым. Адно засталося — пашкадаваць яе ды развітацца, — расказвала Марыя.

— Вось як, — здзівілася Алена.

— Яна не хацела табе тады пісаць праўду. Ну, а потым з'явіўся Андрэй. І ты сама забылася на ўсё. І цяпер выкінь з галавы, — супакойвала Марыя.

Але не ўсё можна выкінуць з галавы што хочаш, наадварот, тое, што хочаш выкінуць, чапляецца ўсімі сіламі, упіваецца, ліпне, як дзядоўнік, каб застацца, прычапіцца, хоць зрэдку калоць, напамінаць пра сябе.

Цяпер Алена нават баялася гэтай сустрэчы. І ў канцы работы раз-пораз пазірала ў акно. А сама думала: трэба быць вар'ятам, каб прыйсці яшчэ. І тут здзівіў яе Вішнякоў:

— А што, старая — (не, яна не пакрыўдзілася, гэта яго звычайнае дружбацкае «старая»), — калі я цябе падвязу сёння дадому?

— О, нечаканы сюрпрыз. Толькі я мушу адмовіцца. Мне трэба ў ЦУМ ці «Дзіцячы свет» — купіць розныя дробязі малому.

— Росціку?

— Ага.

— Ну, давай падкіну...

— О, якое сонца! Здаецца, што ўвесь дзень наперадзе. Як добра летам! — гаварыла яна, сядаючы поруч з ім. А ён толькі неяк невідушча і разгублена зірнуў навокал. І гэта не прайшло па-за яе ўвагай.

— Пачакай, — сказала, пакуль ён яшчэ не таргануў машыну. — У цябе нешта здарылася? Я цябе проста не пазнаю...

Ён зірнуў на яе вачыма стомленага, расчараванага чалавека.

— Так, — адказаў паныла. — У мяне памерла маці... Адзіны чалавек...

Нешта яшчэ хацеў сказаць, потым спахапіўся. Не ў яго гэта было правілах спавядацца нават ёй, Алене, якая заўсёды ўсіх разумела, спачувала. Няхай спачувае іншым. Ён нават раззлаваўся на сябе і крышку на яе: гэтая можа ў душу ўлезці са ўсімі сваімі кацінымі лапкамі. Усе жанчыны аднолькавыя. Не, не... «Наперад і ўверх!» Але голас быў выдаўлены скрозь зубы, сцятыя, як абцугі. Той, яго двайнік, заўсёды зухаваты, настырны, які заўсёды падбадзёрваў яго, відаць, стаміўся, але, абліваючыся потам, плёўся, чапляўся, лез на вяршыню. Вішнякоў, нібы адышоўшыся ўбок, назіраў за ім, спагадліва і паныла. І як той ні зваў яго, ні заклікаў: «Наперад і ўверх», ён не кратаўся з месца, той спрабаваў нават мацюкнуцца, але розум Вішнякова маўчаў, сэрца сцялося. Ён стаміўся. Без падтрымкі, без апоры, без рукі — уверх і ўверх — гэта не проста. Гэта пагражае калі-небудзь абрынуцца ўніз. Ён стаміўся, можа, нават захварэў, рукі слабыя, ён ледзьве трымае руль. Усё баіцца, каб не выслізнуў. І Алена маўчыць.

— Так, гэта вялікая страта. Ведаю па сабе, — гаворыць яна.

«Што яна ведае? Страта... Гэта не проста страта...» Перакулены свет, у якім ён існаваў, спакваля пачынае станавіцца на ногі, на сваё месца, і цяпер кожную рэч трэба ўладкаваць на месца суадносна яе значнасці і зместу. А гэта не проста. Усё ў жыцці не проста. І калі ідзеш бяздумна і лёгка, абавязкова патрапіш у нейкі тупік або не згледзіш камень на дарозе.

Хацелася яму расказаць ёй, але нешта ўтрымлівала, можа, тая даўняя звычка здавацца незалежным і смелым, нібы нехта ўсемагутны ў цябе за плячыма.

— Мы скора цябе будзем віншаваць, — сказала яна.

— З якой нагоды, калі не сакрэт?

— Хведаровіч ідзе на пенсію. Лічаць, што лепшай кандыдатуры, як ты, няма. Ты ўмееш хутка перастройвацца. Хоць бы ў гэтай сітуацыі з праектам. Ты адчуваеш павевы часу...

«Ну, навошта яна так? Навошта гэта іронія? Гэта помста за тое, што, калі Хведаровіч не сходзе ўсё гэта гаварыў, ён не ўстаў, не сказаў: «Міхаіл Іванавіч, вельмі прыемна ўсё тое, што вы гаварылі, але ёсць тут і, так

сказаць, ініцыятыва знізу. Гэта прапанавала інжынер Арловіч. Я сумняваўся, нават супраціўляўся, баяўся, ці ўкладзёмся ў тэрмін. Я баяўся за сябе, наадварот — тармазіў, прыкладваў намаганні, прыходзіў раіцца да вас... Гэта была разведка. І каб вы сказалі толькі слова...»

Не, ён нічога гэтага не сказаў, а мог. Мог... Нечага ён баяўся... Чаго? Але пэўна знае чаго. Калі б пляснуліся ў гразь з гэтым праектам, а Хведаровіч, — ён даўно гэта ведаў: усё роўна непазбежна час ідзе, бяжыць, слабых, хворых, старых ён адкідвае на абочыну, і той, хто малады, хто адчувае сілу, камандуе сабе: «Наперад і ўверх!» — Хведаровіч так ці іначай пайшоў бы на пенсію, а ён, ён хутчэй за ўсё застаўся б з носам. «Вось так, старая! Я разлічыў наперад. Я — празорлівы. Не ведаеш, колькі сілы на гэта паклаў, колькі здароўя. Вось чаму я цяпер, як выціснуты лімон. Прычына тут — не маці, не яна... Не вер. Наогул, усё гэта мне абрыдла. Думаеш, лёгка вось так усё жыццё выкручвацца, агляд-вацца. А галоўнае — навошта? Я стаміўся, знямогся, засумаваў па самім сабе. Так, па самім сабе — простым і шчырым». Нічога гэтага ён не сказаў. Нічога...

— Нам даручаюць праектаваць атамную электрастанцыю. Цікава будзе... Спадзяюся, ты застанешся? Зразумей, цікавая работа — гэта многа значыць...

Не, яна не адказала яму нічога. Толькі зірнула. Як бліснулі вочы! А можа, толькі яму здалося? Можа, гэта толькі чуткі, што яна збіраецца перайсці ў другі інстытут? Злавіў сябе на тым, што боязна яму застацца без яе.

Душою ён адчуваў, разумеў, што яна не толькі добры, класны спецыяліст, але гэта было нібы тайнае пачуццё, якое не хацеў, не мог, а можа, не здагадваўся, што трэба выказваць словамі на сходах, у загадах, проста ёй — з вока на вока. Хоць бы цяпер. «Дык чаго ты маўчыш, Вішнякоў? Можа, яна таму і хоча звольніцца? Не, ты добра зрабіў, што сказаў ёй пра атамную. Гэта яе зацікавіць. Яна ж не жанчына, нават пры ўсім тым, што купляе футболачкі і трусікі дзецям. Яна дзеяч...»

— Спыніся, ты мяне завязеш чорт ведае куды, вось жа ЦУМ.

Яна ішла па вуліцы, вось-вось згубіцца ў людской плыні, што, як рака ў цясніну, нясецца ў шырока расчыненыя шкляныя дзверы ЦУМа. Ён пазіраў ёй услед, на

прыгожую, па-дзявочы танклявую постаць, якую лёгка абцякала шаўковая сукенка, на вузел светлых валасоў на галаве. Нешта было і другое, дзіўнае, трошкі незнаёмае, але што? Яна не накульгвала, толькі, калі гэта ведаць, ледзь-ледзь пагойдваўся пры рухах стан. Гэта нават зачароўвала. «Не, яна ўсё-такі жанчына. Не дзіва, што той стаяў, як дурань, з кветкамі».

«Што з табою, Вішнякоў. Я цябе не пазнаю. Што з табою. Наперад і ўверх!» — занепакоіўся, а потым скамандаваў той, яго двайнік, які ачнуўся, калі Віктар застаўся адзін. І перакулены свет станавіўся на ногі, рабіўся рэальным, набітым людзьмі, як у перапоўненым вагоне, дзе ім трэба было працаваць локцямі: нічога не зробіш. А розум, як дбайны гаспадар у бязладнай хаце, усё расстаўляў на свае месцы, нават тое, што ён некалі адкідаў. Наводзіў нейкі парадак і ў яго душы: пякло там, дзе ёй адведзена месца, і смылела. Пашкадаваў, што адпусціў яе, нічога б не адбылося, каб яны дзенебудзь пасядзелі, выпілі кавы, пагаварылі. Так, хацелася пагаварыць... Не, у яго былі сябры... Многа. А пагаварыць не было з кім. Яна зразумела б... Але той, другі Вішнякоў — упэўнены і рэспектабельны, пагардлівы і самавіты — прысарамаціў яго.

Не заўважыў, як мінуў праспект, выскачыў на кальцавую, прайшоў укруга, мінуў са скрыгатам петлі і раз'езды перад курганам Славы, выйшаў на шырокую бетонку. Вецер абцінаў плечы, мякка варушыў валасы. Мільгалі светлыя бярозавыя пералескі, нізіны, як зарослыя ўпадзіны мора; стромкая ніткa чыгункі толькі бліснула разок у алешнікавай прарэсе і пабегла недзе побач, збоку. Што яго гнала туды, куды ён ехаў, — не ведаў сам. Здаецца, і не намерваўся, не збіраўся, проста ў той прастрацыі, у якой знаходзіўся, не заўважыў, як выехаў на дарогу, па якой столькі, сам таго не заўважаючы, ездзіў у думках. Быў, быў у яго такі намер, прыехаць туды, сабраць старэнькіх, усіх, хто ведаў яе, яго маці, сяброўак яе і суседзяў. Ён сядзеў бы з імі за сталом, хмельны, са шчымотнай пяршынкай недзе ў горле. І слухаў бы, слухаў, што гавораць яны, памінаючы яе, і слабка, і даўка было ў грудзях, і спакваля вылівалася б горыч з грудзей: ён быў тут сам сабою, нічога яму не трэба было таіць — ні скрухі, ні стомы, ні сораму свайго. І супакойліва думаць, што ўсё па-людску, усё як належыць, як рабілі яго продкі, аддаючы даніну па-

вагі і ўдзячнасці таму, хто адбыў на вечны спакой, каб не пудзілася, не трывожылася яго душа, каб і тыя, хто застанецца, атрымалі хто дараванне, хто благаславенне. Так у людзей... Ён хацеў гэта зрабіць, каб не было таго напятага маўчання між імі, якое, здаецца, цягнецца і цяпер, і маці з дакорлівым позіркам, моўчкі аддаляецца ад яго... Не, ён тады дагнаў яе. Сказаў: «Можа стацца, што мяне доўга не будзе. Я буду заняты. Ты не крыўдуй». Яна толькі кіўнула галавою, як паслухмянае дзіця. Ён не сказаў, чым будзе заняты. Ён збіраўся тады жаніцца з Наташай. І не расказаў ёй пра нявестку, таксама як і той пра існаванне свякрухі. Здавалася, скажацца потым. Потым сказалася толькі ў сварцы, крыклівa і істэрычна, калі жонка ўчыніла яму допыт пасля таго як ён, устрывожаны, збянтэжаны думкамі пра маці, шукаў супакаення невядома дзе і невядома чаго блытаўся да ночы па пасёлку, быццам шукаў яе, як тады, калі яна сыходзіла з дому састарэлых. Напэўна, і яе душа ў гэтую мінуту мяцежна шукала яго.

Некалькі дзён пасля гэтай сваркі Наташа была заклапочаная. Яна нават паехала да сваіх бацькоў і параілася з імі, як быць. Вырашана было, што яны, Віктар і яна, паедуць адведаюць яе, а потым ужо можна будзе нешта думаць. Праз колькі дзён яны выбраліся яе наведаць.

Тое, што ён пачуў, было неверагодна. Так не павінна было здарыцца! Не павінна! Яна памерла... Яна памерла тою ж зімою... Невялічкі, апалы, падноўлены старэнькімі яе суседкамі і, мусіць, сяброўкамі, грудок на мясцовых могілках зарос маладым пырнікам... А Віктар даведаўся толькі нядаўна... Нешта несправядлівае і непапраўнае было ў тым, чаго ён не мог дараваць сабе, і ўсё, увесь свет ачужаў, змеркся. Ні радасці, ні нават звычайнага спакою і раўнавагі не было. І гэтае яго «наперад і ўверх» было смешным, нават раздражняла. І яшчэ як засвяцілася яе, Наташына, нішчымная душа, яна, дурніца, нават не магла схаваць гэтага. «Дурніца, дурніца! — роспачна крычала яго мяцежнае нутро. — Нават прыкідвацца разумнай не ўмее». Расчаравана думаў, што ўсё, да чаго ішоў, усё — пустое. Прыходзіў намер адмовіцца ад прапановы на галоўнага. Навошта гэта?.. Прапанавацъ Арловіч, яна справіцца не горш, а, можа, нават і лепш за яго. Яна ўмее, здаецца, не пераконваючы, пераканаць, давесці...

Мільгалі прыдарожныя вёскі, здаецца, калісьці іх было меней. Не, проста ён на аўтобусах і спадарожных імчаў не так хутка, з прыпынкамі і перасадкамі. Вось і знаёмая паваротка. Далей пойдзе шаша, — кіламетраў пяць. Трэба скінуць скорасць. Барэльеф нейкай жанчыны на стэле. Паставілі, мусіць, нядаўна. Але імя нічога не гаворыць... Нешта яна зрабіла, мусіць, у вайну. Толькі нядаўна ўспомнілі. Позна спахопліваемся мы. А можа, час, руплівы час, адвейвае мякіну і застаецца чыстае зерне.

Каменка, разварочаная, у калдобінах, дыбілася. Патрэсваліся, ляскалі сустрэчныя пустапарожнія грузавікі, вагаючыся, абгіналі яго легкавушкі, перлі насустрач — ну, не зверне! — крытыя брызентам «козлікі», відаць, вярталіся з нейкіх прачуханак раённыя начальнікі. Некалькі пяціпавярховак заступілі адзін бок вуліцы, пахаваўшы за спінамі прысады. Ці іх павысякалі? І гэты лес яму незнаёмы. Гэта парк над рэчкаю. Ён памятае, як утыкалі гэтыя дубчыкі. Ніколі не думаў, што яны ацалеюць і прымуцца... Цяпер — у завулак, гразкі, заўсёды тут былі нейкія надзіва чорныя, бы з дзёгцем, лужы. Насыпалі пяску... Аж тонуць колы. Які ж ён вузкі, гэты завулак. Раптам нехта папрэ насустрач — не размінешся. Стоп! Сонца коса слізганула па завулку, па чырвоных «Жыгулях», што спыніліся каля сядзібы, зарослай жоўтымі вяргінямі, адзічэлым бэзам, яшчэ нейкім глухім кустоўем, слізганула і па твары Вішнякова, які выйшаў з машыны.

Сядзібы, лічы, не было, відаць, кожны год суседзі перагароджвалі платы, пасоўваючы іх на які крок, так што ўрослая ў зямлю згарбелая хата пад высокай, стромкай, амаль без галля таполяй здавалася шпакоўняй, якая звалілася з дрэва. Таполю гэтую ён некалі сам пасадзіў ля хаты, прарасціўшы ў пляшцы чаранок. Цяпер яна трывожна, жаласліва зашумела, зашаптала нешта высока-высока, што працяло яго. Ён не адчыніў закручаных дротам весніц, не ступіў на двор, ды там і не было болей сцежкі. Здалося, нехта назірае за ім. Нейкая старая глядзела праз штыкеціны з суседняга агарода, дзе стаяў дагледжаны, шалёваны і пафарбаваны ў зялёны колер дом. Яна, відавочна, была не адна. Глухаваты голас, — тут як і раней далёка чуваць, асабліва надвячоркам, — папытаў:

— Хто-та, я й не прызнаю?

І другі, нечым вельмі знаёмы, дадаў:

— Дальбог — Бежанчын сын! Трэба падысці ды распытаць пра яе.

У яго захлынулася ўсё ўнутры, закруціла, як віхор. Хацелася бегчы, бегчы хутчэй адсюль, пакуль гэтыя старыя не апанавалі яго. «Бежанчын сын, Бежанчын сын», — стукала ў скроні. Ён сцяў сківіцы, кінуўся ў машыну, таропка, нервова завёў. І задам, задам, азіраючыся, падымаючы пыл, пагнаў машыну па завулку. «Дрэнь, слюнцяй, сантыментальны тып, — лаяў ён сябе, — гэта трэба, што ўдумаў. Зусім звар'яцеў. Псіх, псіх няшчасны! Схадзі да доктара — палячыся. Псіх!» Выбраўся сяк-так на шашу. Нейкі час ён быў як драўляны — ні думак, ні пачуццяў, у галаве — пуста і ў сэрцы цішыня. Механічна сачыў за дарогаю, за прыборамі. Нейкі тып усё сігналіў яму, цясніў да абочыны, выходзячы на абгон. Гэта ніколі не падабалася яму. І цяпер гэтыя сігналы нібы абудзілі Вішнякова, і той, ужо знаёмы яго двайнік стомлена, амаль праз зубы, але настойліва і ўпарта загадаў: «Наперад і ўверх». Яшчэ цяжкая была галава, бы нехта ўдарыў па ёй, так і хацелася пакласці яе на руль, спыніцца, але, пачуўшы той голас, ён уздрыгнуў, як бы ачнуўся, ажыў.

«Бежанчын сын, Бежанчын сын», — яшчэ намотвала дарога на колы гэтую яго даўнюю мянушку, але яе заглушаў голас матора, што аж узвываў, быццам машына збіралася ўзляцець, а следам, заціраючы яе сляды, нёсся суцэльны паток машын. Такі ж паток ішоў і злева насустрач. «Нельга спыняцца, нельга спыняцца. Толькі наперад і ўверх. Наперад і ўверх!»

## 22

— А я вось скажу, — пагражаў Росцік, за нешта ўсердзіўшыся на Севу.

— Другім разам будзеш сам прышываць гузікі... — нядбала, але крышку і занепакоена адказаў Сева.

— Ты нават не сказаў мне, што ў ім напісана. Самому было цікава?

Сева маўчаў.

— Яшчэ як, мусіць, цікава. Спачатку схаваў, потым дачытаў. Я бачыў. Ну, расказвай.

— Ціха ты, — занепакоіўся Сева. Ён і сам быў заін-

трыгаваны, бы прачытаў нешта недазволенае. Яму было і сорамна і ў той жа час цікава: хто напісаў яго і каму? Ён чакальна паглядзеў на маці, ці можна ў яе запытаць, але яна здавалася заклапочанай і крышку ўзрушанай. І ён не рашыўся.

Яна прыгатавала ім яешню, кожнаму на асобнай маленькай бліскучай патэльні, як у сапраўдным рэстаране, паставіла на талерачкі, парэзала кругельчыкамі даўжэзны, як кіях, гурок. А сама, здаецца, думала пра нешта сваё. Сева здагадваўся, што, мусіць, нешта ў яе не ладзіцца на рабоце, таму чапаць не стаў, адклаў да зручнага, нейкага другога выпадку. А Росцік усё назаляў яму.

— Вось і скажу... — выразна пазіраючы на Севу і перамешваючы відэльцам жаўток з бялком, гаварыў ён.

Алена не прыслухоўвалася: у іх сваё. Сева даўно спраўляецца з выхаваннем Росціка не горш бацькі з мацераю. Яна яму давярала.

Алена сапраўды думала пра сваё. І думкі лезлі, як назойлівыя мухі. Яна іх адганяла, а яны ляцелі, ліплі.

...Алена выбралася з мітуслівага людскога натоўпу, які хаатычна перамешваўся, заблытваўся, варушыўся, як мурашнік, але ў гэтай хаатычнай мітусні ў кожнага быў свой напрамак, свая мэта. Тое-сёе купіўшы, яна з пачуццём палёгкі разважала: што гоніць людзей бясконца сноўдацца па магазінах, што яны шукаюць, і сама сябе ўшчувала, што разважае як вясковая кабета, апраўдвала іх: не ўсё ж гэта адны і тыя ж. Але, увогуле, дзіўна калі-нікалі было ёй: ходзіш між людзей, прабіваешся праз натоўп, абмінаеш, уступаеш дарогу, табе даюць месца, а ўсё — чужыя людзі, незнаёмыя, бывае, скажаш пару слоў чалавеку, перакінешся рэплікай, укажаш дарогу — і ўжо нібы свой, знаёмы. А ўсё-такі дзіўна — гадзіну была на людзях і хоць бы знаёмы твар. Яна выйшла на плошчу Якуба Коласа, пад рэдзенькую засень бярозак, лістоцце якіх, яшчэ ўзнёслай і лёгкай, настойліва нешта нашэптвалі струменьчыкі фантана. І на плячы песняра спакойна драмалі галубы. Яна прайшла б міма, хоць і здалося, што мільгануў нечы знаёмы твар, каб не *ён*. Уражаны, ён спыніўся, папрасіў прабачэння і, нібы сумняваючыся — яна гэта ці не? — перапытаў, як пытаюць у даўно забытых знаёмых, калі нельга

прайсці міма. Яна таксама ўразілася, крышку разгубілася нават. Нейкі час яны маўчалі. Гаварылі нешта такое, што тут жа вылецела з галавы, потым ён прапанаваў зайсці ў кафэ. Але яна спаслалася на дом, на дзяцей. Ёй трэба спяшацца...

Лёгкі ветрык дыхнуў у твар, і так мройліва зашапталі бярозы, што яна крышачку, недзе ў глыбіні душы, засмуцілася, што стаіць лета, кароткае цёплае лета, а трэба спяшацца, спяшацца. Гэта была заўсёдная жаночая горыч, знаёмая кожнай жанчыне, якая дайшла да саракавой сваёй вярсты.

А ён неяк, — і ні радасць гэта была, і ні сум, — сказаў:

— Я зноў вольны...

Яна адчула: абрыдла, агоркла яму гэтая воля. А можа, яна памылілася? Толькі не, не было радасці ў яго волі. Але не было і гаркаты. А можа, ён хаваў гэта. І прыходзіў да інстытута таму, што некуды яму было дзяваць гэтую волю. Як наяве, убачыла — дзяўчаты і маладыя жанчыны адмахваліся ад яго кветак і, мусіць, гэтаксама ад яго самога.

Ён зазіраў у вочы, нешта шукаў нявыказанае ёю. Канечне, ён думаў, спадзяваўся, што гэта яе ўзрадуе. І была, была ў яго кволая надзея. Недарэмна ж яна дала тады гэтыя грошы? Спадзявалася на яго. Так ён яе разумеў...

Алена маўчала, і душа яе раптам заціхла, як і ўстрапянулася. Яна з радасцю падумала, што нічога, нічога ў яе няма да гэтага чалавека: ні былой любові, ні горычы страты, ні спачування, ні нават раскаяння за той свой учынак. Было ўяўленне, што незнаёмы чалавек спыніў яе і пытае, як прайсці, праехаць лепш да патрэбнай яму вуліцы. Не, бывае, і тады яна хвалюецца, стараецца як мага лепей яму расказаць, азіраецца, сочыць, ці туды ён кіруецца, а гэта — такая цішыня ў душы.

І ён адчуваў гэта. Нават занерваваўся, парашыў ёй што-кольвечы напомніць.

— Я нічога не забыў. Помніш, ты напісала ў пісьме: «У нас расцвілі макі. Я дару іх усе табе».

— Гэта цвіў відук, — усміхнулася яна. — Пустазелле. Яго ніхто не сее. Ён сам узыходзіць. Хораша цвіце, але коратка. Вось і тады цвіў відук.

Яна заўважыла, што перад ёю стомлены, не такі і малады чалавек, які, як няўмелы, але саманадзейны плы-

вец, загробся на высокую плынь, а цяпер хапаецца за саломінку, каб выплысці. Не патоне, выплыве, трохі адлежыцца на беразе і забудзе на тое, што было. Палезе зноў. Нешта накшталт гэтага яна падумала, калі яны развіталіся.

...Але Алену пужала гэтая цішыня ў душы: нязвыклая, стамляючая, нейкая чужая ёй. Яна з горыччу і страхам думала, што вось так і будзе цяпер жыць, тлець, як сырое палена на папялішчы. І горка ёй было і роспачна. Карміла дзяцей, а сама ўсё слухала гэтую цішыню ў душы, слухала і здзіўлялася. І жыццё здалося прэсным, як ежа без солі. А дзеці ўсё гаварылі пра нейкае пісьмо.

— Якое пісьмо? — папытала ў Севы. — Нехта прыслаў?

Сева апусціў вочы.

— Мама, ты даруй, але я прачытаў... Можа, гэта і не пісьмо? Але...

А Росцік ужо стрымгалоў кінуўся ў спальню, папоркаўся ў шуфлядцы, прынёс...

Алена разгарнула забыты пажоўклы лісток, прабегла вачыма, усміхнулася, пасвятлела тварам. Села за стол і з захапленнем, нібы ўпершыню, стала чытаць.

— Гэта ж тата, ага, ваш тата мне яго прыслаў!

Здавалася, што пісьмо прыйшло толькі што. Тата, якога так рэдка яны бачаць, які ўсё матаецца па горадзе на «хуткай», вечна заняты тата, выбраў час і даслаў ім гэтую вестачку.

І мама адразу стала шчаслівая, вясёлая, усмешлівая. І Росцік патрабаваў, каб прачыталі яму, зараз жа, таму што гэта ён успомніў пра пісьмо...

Алена расказвала дзецям, што калі яе рыхтавалі да аперацыі, прафесар прывёў сваіх студэнтаў. Расказваў, паказваў. Сярод іх быў і тата. Студэнты паслухалі прафесара і пайшлі, а тата — не таму, што ён быў самы лепшы студэнт, не, — прыйшоў назаўтра. І так стаў прыходзіць кожны дзень, прыносіць ёй апельсіны і вінаград. Ён падзарабляў дзяжурствамі ў клініцы. А потым, калі прыходзіць яму забаранілі, таму што былі выпадкі захворвання на грып і ў бальніцы аб'явілі каранцін, ён аднойчы ўлез у акно. А потым — напісаў гэта пісьмо. Угаворваў не рабіць аперацыю, што яна яму падабаецца і гэткая. Але яна зрабіла, як намерылася. А пасля аперацыі, праз два месяцы, яны пажаніліся.

Алена ўспамінала, расказвала дзецям, а сама нібы ажыла, нібы нанова адкрыўся для яе гэты свет.

«Якое шчасце, — думала яна, — што ёсць у мяне яны, Андрэй, дзеці. Я самая шчаслівая жанчына на свеце. І як добра, як светла і чыста, што нікога, акрамя іх, мне не трэба».

І зноў прыйшла да яе тая вастрыня і слодыч жыцця, ад чаго яна ўсё магла, усё хацела рабіць і да ўсяго была гатовая.

*1984*

# ХОЛАД ДОННАЙ ВАДЫ



## 1

Сутонлівая зямля, здаецца, паціху выплывала з-пад ног, нібы імклівая рака. І Анюта толькі ледзь-ледзь дакраналася пальцамі да грабеньчыкаў яе хвалі. Неба высыпала ў прадонне зоркі, і яны мігатліва свяціліся, бы рамонкі. О, гэта і сапраўды рамонкі, рассыпаныя па высокай траве. Гэта яна здалася хвалістай ракою. Анюта нібы пазірае на сябе збоку. Цікава як! Гэта — яна. Ідзе лётам, як птушка. Белая сукенка адкрывае круглыя, як яблыкі, каленкі. Дзед Медык грозіць, як заўсёды, пальцам: «Цьфу, што за мода? Сорам адзін». А яна ляціць, бяжыць праз сад. Яблыні дастаюць яе галінамі, расступаюцца.

А вось і ён, ён... Працягвае ёй рукі... А што гэта гупае вохка і часта — падаюць яблыкі? Ці б'юцца іх сэрцы?

«Анатоль, Анатоль, чаго мы тут? Яблыкі ж яшчэ не выспелі. Не выспелі...»

«Які Анатоль? Ганна Цітаўна (так жа цяпер цябе завуць?), ачніся, гэта я — Антон, Антон Кірылавіч».

Ён усміхаецца, цёпла і крышку юрліва. (Гэта ўсё з-за гэтых голых каленак... Як жа яна, як дзяўчынка, перад ім?)

«Антон? Ага, вы сапраўды вельмі падобны. Я ўпершыню, як убачыла цябе, думала...»

«Яго не было, Анюта. Гэта ўсё прыснілася табе. І яблыкі... Чаму не выспелі? Зірні, імі засыпана ўся зямля!»

Антон прыцягвае яе да сябе, да болю мне грудзі. Ажно няма чым дыхаць. Так яны блізка, як адно, і — не адступіцца.

«Ага, дачушка, у садзе нагою не ступіць. Мостам ляжаць».

«Гэта ты, мама?»

«Кожнае лета сэрца баліць».

Нешта моцна, сакавіта чаўкала, бы ішлі балотцам свінні. Многа, цэлая чарада.

Анюта азірнулася. Так і ёсць — свінні. Яны распаўзліся па садзе, толькі відаць сівавата-белыя, попельна-чорныя, рудыя натапыраныя хібы. І ў вушах гэты смачны, сакавіты хрупат. Ці то морась, ці то пырскі сліны і пены ляцяць з задраных — жуюць, жуюць, аж давяцца — лычоў, ляцяць проста ў твар.

«Гэтыя людзі цяперака сталі як свінні. Заеліся. У карыта з нагамі палезлі». Чый гэта голас? Вельмі знаёмы. Але чый? Анюта гідліва сцірае з твару прыкрую морась.

Узіраецца ўдалячынь, здаецца, быццам нехта ідзе да яе па доўгай-доўгай дарозе. Праясняецца твар, выплывае, як з вады, цьмяны, невыразны, немагчыма пазнаць. Што гэта — толькі белы канверт вагаецца на вадзе. Гэта пісьмо ад Галі, на якое яна не дала адказу. І голас яе: «Скажы, хіба гэта справядліва, што я ўсё жыццё працую, стараюся і не заслужыла мець дах над галавою. Сорам пазіраць у вочы дзецям. Ды я ні на кога цяпер не гляджу. Вочы выцяклі».

«Чым жа я дапамагу? Няма, няма такой праблемы малых гарадоў».

«Гэта тэарэтычна, а практычна?»

Канстанцін Іванавіч? Ён жа болей не працуе ў інстытуце. І пры чым гэта яго любімая фраза, чыста вы-

кладчыцкая. Ён мучыць ёю, пэўна, цяпер студэнтаў: «Гэта тэарэтычна, а практычна?» — «Практычна... Што ж практычна...» Анюце ажно душна стала, сэрца зайшлося страхам, як у студэнткі, якая не ведае адказу на пытанне. А Канстанцін Іванавіч дапытліва і неяк нават зласліва ўзіраецца ў яе твар.

«А практычна?!» — ён пераходзіць на крык.

«А самі, самі ж вы толькі тэарэтык! Няшчасны тэарэтык! Дапытвайцеся ў сваіх студэнтак!» — крычала ў адказ яна, а ў самой ажно ногі памлелі. Добра, што лавачка побач. Хоць можна прысесці.

І вось яны ўжо сядзяць з маці на лавачцы пад хатаю. Хата, некалі высокая, ганарыстая, асунулася, уехала, урасла ў зямлю, прыгорбілася. І лавачка — няўжо таксама ўрасла? — нізенькая. Нязвыкла, нязручна сядзець вось так — калені ледзь не да барады. Яна выцягвае ногі, апіраецца спінаю да рабрыстага, як батарэя, цёплага боку хаты.

«Ганна, ты не павінна так...»

Чаму яна называе яе Ганна, а не Анюта, як заўсёды. Гаворыць як з чужою...

Анюта ўзіраецца ў матчын твар. Нешта балючае ў ім. Такі твар дактары называюць гіпакратавым. Гэта вышэйшая ступень болю. Яго не схаваеш. Ён — на твары...

«Мама...»

Анюта прахапілася. Разгледзелася ў цемнаце. Цёмным раскрытым званцом вісеў абажур над ложкам. Святло мігатліва паблісквала ў створках паліраванай шафы. Тут жа, як у цёмнай вадзе, адбіваліся дрыготкія цені ад галінак таполі, якая стаяла далёка ля вуліцы перад ліхтаром. Раскінуўшы вольна рукі, ажно на яе ложак, моцна спаў Мікалай.

Блытана, кавалкамі, як вецер гоніць рваныя аблокі, успаміналася сон — абрыўкі далёкіх і блізкіх уражанняў.

«Гэта ж было, было...» — думала яна.

Яны тады сапраўды сядзелі пад хатаю, на ўрослай у зямлю лавачцы. І маці гаварыла, папракала яе:

«Усё-такі людзі тут спрадвеку гнёзды павілі. Іх нельга рушыць, пакуль не ападуць самі, ніхто гэтага не разумее... І сама я хачу дажыць тут веку. Ты падумай, ці лёгка старым зрывацца з месца. Тут прайшло наша жыццё, тут усё наша. Цяперашняе і мінулае...»

Анюта сцепанулася, быццам ветрам падзьмула ад ракі.

«Зноў яна пра мінулае». Нацягнула на плечы вязаны ўзорамі шалік, што аб'ехаў долу.

«Зразумей і мяне, я не магу сюды болей прыязджаць».

«Гэта ты гаварыла заўсёды, а вось жа прыязджаеш...»

«Таму, што тут ты».

Як ёй растлумачыць, што рвецца яе сэрца сюды? Якою казкаю здаецца здалёк вось гэта рачулка. Ды яшчэ калі Лешчанка так душэўна і мякка выводзіць: «...искупаться в речке детства моего...» Як замірае сэрца. Людзі мае, ці можна тут скупацца? Толькі, можа, уночы, каб ніхто, і нават сама, не бачыў гэтай вады, папялёхацца на перамеле. Але пры чым тут гэта рэчка: у дзяцінстве яна была шырокаю — той пары ўсё іншых памераў: і кот здаецца тыграм.

А цяпер гэта рэчка — вераб'ю па калена. І другое яе трывожыць — тое, што яна ўбачыла аднойчы з моста: у летняй празрыстай вадзе плыве нібы шэраш. Але шэраш бывае вясною, калі ападае лёд і сплывае падталы снег. Не, гэта шэраш сярод лета яе вельмі ўразіла. Шэраш была парафінавая. Гэта, мусіць, стокі таго заводзіка, хутчэй цэха прамысловага камбіната, які выробляе хрумсткую цэлафанавую плёнку, абгортку для цукерак, для кветак.

Вось чаму яна здалася ёй такой ціхай, быццам і дзяцей няма ў мястэчку. І людзі, мусіць, прывыклі, што не стала рэчкі, у якой можна было праць бялізну без мыла, бо вада была мяккая, як шчолак.

Рэчка — мёртвая. Здалося нават, яна не цячэ, а проста намаляваная на гэтым скупым, бляклым пейзажы, што выцвіў на сонцы разам з шэрай, чэзлай траўкай на беразе, як на пейзажах Філіпо Паліці.

І маці... Каб жа яна зразумела.

«Калі я выходжу з аўтобуса і іду па вуліцы міма гэтых вось хат, чэрпаючы туфлямі пясок, мне хочацца закрычаць ад болю, бегчы без аглядкі адсюль, не заходзячы дадому, вярнуцца назад. Як жа так, што тут усё засталося, як раней, нічога не змянілася?»

Яна заўсёды гаварыла гэта з болем.

«Чаму, чаму?—я хачу запытаць. — Дзеля гэтага я напісала дысертацыю пра развіццё малых гарадоў (не ве-

даеш, чаго гэта каштавала), а тут усё, усё застаецца як было. Больш таго — такой праблемы, як развіццё малых гарадоў, ужо не існуе. А тут усё застаецца па-ранейшаму. — Чаму?»

Такой праблемы не існуе. Гэта засведчыў сваім доктарскім аўтарытэтам сам Аронаў пры абмеркаванні яе даклада на канферэнцыі. Каб тады гэта не аглушыла яе, не паралізавала, яна б абаранялася і гэтай мёртвай рэчкай і гэтым старажытным гарадком, які ўрос у зямлю, як дрэва на ўзгорку. Дрэва даўно аджыло, адшумела, толькі карані моцна яшчэ трымаліся ды пускалі атожылкі, каб не памерці зусім. Колькі яна тады перадумала. Здалёку, як на карціне сучаснага мастака, якую яна нядаўна разглядала ў мастацкім салоне, не відно, якімі грубымі мазкамі яна напісана, як бугрыста ляжыць фарба, перакрываючы таны, здалёку даволі прыстойны пейзаж, а зблізку — хаос фарбаў, мазня. Здалёку і на яе твары не відно маршчын. А ў люстэрку (глядзець на сябе — кара) яны, як карані, што аплялі камяк зямлі. Ага, як зямля, шэры быў тады яе твар, нерухомы і стылы. Так гаварылі пра яе потым: што ж, яна мае на гэтым добры прыварак, можна не толькі пашарэць, а і ўпасці тут ніц. (Калі двое гавораць, адзін — абавязкова перакажа, будзе яшчэ з асалодаю зазіраць у твар, каб зноў убачыць замест яго шэры камяк зямлі, перавіты карэннем расліны, назва якой мука, боль, стома, жах — як хочаце.) «Крэціны, алігафрэнікі няшчасныя... Ім ніколі не зразумець. Яны думаюць толькі пра грошы. Яны засланілі свет. І сонца свеціць толькі праз гэтыя вадзяныя знакі». Не, яна маўчала, як сцяна: ім не зразумець. Кожны дбае пра сябе... Праўда Аронава толькі ў адным... (Чаму яна надае яго словам сэнс, які ён не меў на ўвазе? Каб заспакоіць сябе? Абяліць, ачысціць яго доктарскі тытул ад ганьбы недальнабачнасці, абмежаванасці. Ён не гаварыў таго, што намысліла яна. Намысліла...) Праўда яго ў адным, завельмі многа мы гаворым, пішам, а трэба ціха, спакойна, сваімі рукамі рабіць. Яна яшчэ раз перагледзела свой даклад. «Трэба, трэба, неабходна, пажадана...» Каму? Чаму? Гэта закліnанне духаў. Яно ўсюды! Усе заклінаюць, укленчваюць. Даюць некаму ўказанні, парады, загады. А той, неканкрэтны, аморфны — і вухам не вядзе. Гэта заклінанне духаў! Нехта павінен, нехта абавязаны... А ты сама, Анюта, Ганна Цітаўна, — гэтак жа цябе цяпер

завуць, — а ты сама? Калі ведаеш, як і што рабіць, каму і навошта даеш парады? А-а, адказваць табе цяжка. Нават цяжэй, чым абараняцца ад іх, апанентаў. Ты чула, як яны, тыя, хто быў на вучоным савеце, гулі басавіта, як чмялі, зыкліва, як мухі: чаму яна маўчыць, чаму не абараняецца? Яна нават пачула тую рэпліку: «Добра, што з дысертацыяй толькі што праскочыла...» Каб быў самалёт, аўтобус (каб можна было націснуць гузік і ён — тут, як казачны джын), ды завезці іх, паказаць: «Вось ён... Глядзіце! Гэта не горад, гэта дрэва, трухлявае, старое дрэва, але ў яго яшчэ моцныя карані. І яны ўраслі не ў зямлю, а ў душу маю. І цяпер ужо нічога нельга зрабіць. Не вырваць іх. А можа, усё заканамерна: адно аджывае, другое нараджаецца».

«А мне дык падабаецца, што тут усё так, як было. Прыязджаю і адпачываю душою, успамінаю дзяцінства...» Святлана... Яна недзе таксама жыве ў вялікім горадзе, дзе шахты. Што яна магла ёй сказаць? Толькі адно:

«А ты часцей прыязджай. Глядзіш, і пакіне дзяцінства...»

Так, гэта яна гаварыла там, на той лавачцы, толькі тады лацвей было ставіць ногі, ага, сапраўды яна не сядзела вось так — каленьмі ледзь не да барады. Як прагавіта і моцна за апошнія гады хаты, лавачкі пры іх, калодзежныя зрубы, прыгрэбіцы засмактала зямля. Толькі цяпер яна зразумела — дагэтуль не магла даўмецца, чаму пад зямлёю апынуліся старыя замчышчы? Вось так прагавіта зацягнула зямля. О, якую яна мае прыцягальную сілу, жаданне хаваць усё ў сабе. І гэты гарадок ні што іншае, як старое замчышча. Тут усё, як было, колькі яна памятае, а ёй ужо, дзякаваць богу... Яна сама не прызнаецца сабе — колькі. Многа, жахліва многа... І чамусьці цяпер яна адумалася, нібы праз гады, праз грымоту імклівага часу дайшлі да яе словы Паўлавіча. Ён прыйшоў і сеў на зэдліку, ля звязанага ў сноп куста вяргіні. Пастарэлы — лоб, як гармонік. Ён задумліва курыў і пазіраў звужанымі, як проразь прыцэла, вачыма далёка за раку. І яна тады сказала тое ж, быццам вініла яго, гаспадара гэтага драўлянага свету, які існаваў не недзе, а тут, блізка, існаваў рэальна і расчароўваў яе так востра, да глыбокай пакуты. Можа, яна балюча папікнула Паўлавіча, бо прыцэл вачэй пашырыўся. Яна заўважыла цяпер чырвоныя бялкі, нібы кроў

была ў вачах, кроў, якая бывае ад натугі. Мусіць, яму сапраўды было цяжка трымаць на плячах гэты гарадок, які зацягвае, засмоктвае зямля. Ён чакаў — мусіць дужа! — падмогі, а яе не было. Над адказам не доўга думаў.

«Гэта ўсё таму, што вы пакінулі роднае селішча, і хочаце нешта мяняць здалёку, на паперы... А яно — і застаецца на ёй». Ён нават пазіраць не хацеў на яе. І да маці: «Ці помніш ты, Антаніна, як мы асушвалі тут балоты? Адсюль жа да Вароніна можна было прайсці толькі зімою, як умярзала балота. Што і казаць, жыццё змянілася. Як успомніш ды падумаеш... А ведаеш, чаму гэта мясціна Вароніным завецца? Тут хутар стаяў на выспе і вароны зграяй ляталі. А сядуць на дрэвы — чорнае ўсё, нібы галавешка. А грай стаяў — голасу не чутно. Што ні гавары, жыццё змянілася...»

Чаму ж яна, Анюта, не бачыць змен? «Канечне, яно як з цёплае кватэры, дзе табе і газ, і вада, ды — сюды, то не вельмі ўтульна. Чалавек хутка да харошага прывыкае. І ўжо здаецца, што так яно і трэба, так заўсёды і было».

«Чаму, і ў нас — газ ва ўсіх, у каго столь дазваляе, калонкі парабілі ў сенцах, вада свая пад рукамі. Шмат чаго людзі навыдумлялі. Пераймаюць гарадское жыццё. Ацяпленне робяць паравое, у каго дамы новыя».

«То больш на вуліцы Савецкай. Там пасляваенны пасёлак. А мы ўжо ў гэтых дажывём...»

Яны гаварылі пра сваё. А яна здзіўлялася: што яны знаходзяць новае ў гэтым жыцці? Яна ж сюды вяртаецца, як у дзікунства. Летам яно яшчэ не так прыкметна, а зімою. Холадна, золка, сумна. Чаму?

«Гэта ўсё таму, што вы ўсё гэта пакінулі...» Сапраўды, а думалася іначай. Думалася, што пакінулі дзеля таго, каб навучыцца, узляцець высока і адтуль усё палепшыць тут, перайначыць. Дык вось чаму ёй не відно змен. Бо іх няма — няма таго, што зрабіла яна. А гэта яе дысертацыя, гэтыя выступленні ў друку — усё яе «трэба, неабходна, пажадана» — гэта заклінанне да некага. Яна помніць, не забылася, чаму сцежка на новы пасёлак, вулачка, нацянькі каторая, недзе пасярэдзіне, нібы раптам шарахаецца ўбок, а потым зноў выпростваецца — бура зваліла некалі дрэвы. Кожны, хто ішоў, гаварыў, калі было каму, думаў сам-насам, разважаў: «Трэба прыбраць з дарогі» і абыходзіў. Так і сцежку

новую пратапталі. Не, мусіць, усё ж яна забылася, чаму завіваюцца сцежкі, чаму няроўныя шляхі.

А думалася... Няўжо яна ашукала сябе? Што, калі Гэлечка гаворыць праўду? Глядзі ты, такая маладая і такая практычная.

У думках усё можна: толькі што яна сядзела на лаўцы пад роднаю хатаю, у маленькім палескім гарадку з суцішлівай назвай Ціша, а зараз — у аддзеле навуковадаследчага інстытута, дзе працуе. «Цяперашнія маладыя — усе рацыяналісты. Божа, якімі высокімі ідэямі некалі, у мяне, маладой, была забіта галава! Што значыць забіта? Кожная высокая ідэя — гэта святло... Якія светлыя ў нас былі галовы! Класамі ішлі на энергафак, таму што ў нейкай там вёсцы не было электрычнасці, хлопцы — усе ў лётнае, дзяўчаты — педагагічны і медыцынскі. Наргас — не лічыўся за інстытут».

«А што ж вы пайшлі, Ганна Цітаўна? Мабыць, далёка бачылі...»

Зноў гэта Гэлечка са сваімі пытаннямі. Знянацку яны — як стрэл з-за вугла.

Можна толькі дакорліва зірнуць: маўляў, можа, і бачыла. Не, хацела бачыць. Адным словам не перадасі.

А праз памяць бяжыць і бяжыць аўтобусік весела, спрытна. Дзе трэба — спыніцца. Асабліва любіць Анюта раніцу, калі гарадок толькі прачынаецца. Вунь дзядзька Васіль ужо сядзіць у акне: ён заўсёды так, замест таго каб вядро вады прынесці, сядзе за сталом ля акна, як груган, лыжку перад сабою пакладзе, як салдат, што выцяг яе з-за халявы, і чакае снядання.

Мусіць, толькі прачнулася Настачка — кудлатая, за хлеў пабегла. Цётка Мар'я па ваду выйшла, стаіць, чакае, не хоча з пустым цераз вуліцу пераходзіць ці проста баіцца: не разварушылася за раніцу, яшчэ пад аўтобус патрапіш. Дзед Медык вяртаецца ад ракі. Як не кожную раніцу нясе ён вірлавокага, нібы здзіўленага шчупака. Нясе ў залежнасці ад велічыні — ці перакінуўшы цераз плячо сваё невялікае згорбленай постаці, ці трымаючы навісу. Ён прадае рыбіну. Цана ў яго адна: «колькі дасі», але часцей за ўсё пакупнікі выстаўлялі сваю: «каб дарам», і ён, гледзячы хто пакупнік, — грошы ж толькі ў служачых, — аддае дарам, рыбіна яшчэ

ўздрыгвае, засынаючы, ёй, мусіць, бачыцца рэчка, можа, яна плыве ў невядомасць ці гоніцца за сваёй ахвярай.

Прачынаецца Ціша, прыходзіць новы дзень. І яшчэ невядома, які ён будзе, бо раніцаю не ўгадаеш: сонца выходзіць, здаецца, на ўвесь дзень, а глядзіш — нечакана дождж сыпане, скісне разам, добры ці паганы дзень — аб тым скажа вечар.

...Той вечар быў ціхі і цёплы. Па двары нехта хадзіў. Хадзіў як гаспадар, што прыйшоў дадому пасля доўгай адлучкі, і цяпер у ціхім роздуме глядзеў, што тут сталася без яго клапатлівых рук. Падышоў да плота, які пахіліўся і ледзь-ледзь ліпеў, паспрабаваў падняць аднёю рукою, але не змог, другая ў яго была сагнута, нібы ў той жа час ён намагаўся зашпіліць пінжак. Вось ён пакратаў шулы ля варот, потым пайшоў сцежкаю да хлява. Анюта сачыла за ім пільна, разгарнуўшы галіны вішняку, што абвешалі плот, нейкі момант нават з хваляваннем, быццам магло адбыцца нешта неверагоднае, і чалавек гэты быў загадкавы. На момант ёй захацелася, каб вось так прыйшоў бацька. Пакуль ступіць у хату, вось гэтак бы агледзеў гаспадарку (бо хіба можа чужы чалавек так аглядаць, цікавіцца, хіба пакупнік нейкі, але ні хлява, ні старога разваленага плота яны не прадаюць).

Анюта мяжою падышла да адчыненага акна.

— Мама! — паклікала чамусьці прыцішаным голасам. Маці сядзела на зэдліку ля стала, занятая шытвом.

— Мама! — паўтарыла яна гучней. — Нейкі чалавек прыйшоў!

— Ну, то няхай заходзіць, — адказала тая безуважна, не падымаючы галавы.

— Дык ён ля хлява ўсё ходзіць.

Анюта заўважыла, як раптам захвалявалася маці: рука яе, што трымала іголку, уздрыгнула. Маці, мусіць, укалола палец: зморшчылася, адклала ў бок шытво, похапкам абабрала з падолу ніткі, выйшла з хаты крыху заклапочаная, насцярожаная.

— Рашыў зірнуць, як жывеш ты, Антаніна, — сказаў чалавек, калі маці паздароўкалася.

— Жыву пацiху.

Настрой яе апаў, сунялося хваляванне: не яго, відаць,

чакала, не яго. Сцішана паглядзела, нібы была ў нечым вінаватая, а можа, проста сачыла, як ён выцягваў з пачка папяросу, чыркаў запальнічкай, зашчаміўшы ў пратэз, сачыла за яго адзінаю рухомаю рукою, бы дапамагаючы позіркам. Але ён надзіва спрытна закурыў «беламорыну», зацягнуўся дымам.

— Валіцца ўсё, старэе, — з жалем дбайнага гаспадара сказаў ён, гледзячы на пахілены плот.

— Нічога, яшчэ пастаіць, — адказала маці.

Русаковіч (а гэта быў ён) курыў, падняўшы вочы, аглядаў дах хаты.

— Не цячэ?

— Не, — адказала маці і трохі схлусіла, бо сенечкі працякалі: у вялікі дождж падстаўлялі начоўкі, вёдры.

Ён нешта яшчэ хацеў папытаць, але не паспеў: па сцежцы падыходзіла Наталля, суседка.

— От добра, што заспела цябе, Паўлавіч! — сказала яна, не зважаючы на Антаніну. — Заяву напісала. Ці чытаў?..

— Чытаў, — не даў дагаварыць ёй Русаковіч. — Ты напісала, Мар'я, напісала і Даша, — сказаў нервова. — Вось тут вы ў мяне сядзіце! — паказаў ён рабром далоні на свой востры, варухлівы кадык. Нібы адразу выказаў набалелае, раптам памякчэў, уздыхнуў нават, прысеў на лаўку ля нізкага абвітага хмелем плота.

Не раз ён гаварыў удовам, жартуючы, падбадзёрваючы: «Калі вы ўжо сабе якіх мужыкоў пазаманьваеце? Вот ля Мінска вёска ёсць, Бараўляны завецца, дык там шпіталь і зараз нат, то там удоў няма, усе яны сабе раненых павыбіралі, павыхаджвалі...»

— Палічы, колькі гадоў прайшло... колькі гадоў, — паўтарыў ён, нібы здзівіўся лічбе, — а ўдовы ўсё не пераводзяцца.

Наталля зірнула на яго. Нейкі момант яна як бы разглядала гэтага чалавека, бы вывучала. Знайшла нешта новае, уражлівае, якому не хоча даць веры.

— Столькі ж гадоў мінула... — лагодна, без папроку і нават з нейкім шкадаваннем сказала яна, — прыйшоў ты, Паўлавіч, з пустым рукавом: ні касец, ні жнец, ні на дудцы ігрэц і... — яна яшчэ нешта хацела сказаць пра яго руку, але не стала, толькі ўздыхнула, глыбока, шчыра. — І нашы мужыкі не паўстаюць, — голас яе задрыжэў, на хвіліну яна змоўкла, мусіць, авалодваючы сабою. І зноў стала ўпэўненая, непахісная і ўладарная, бо

гэтага патрабаваў момант, трэба было гаварыць не толькі за сябе. — І не да цябе мы ходзім прасіць то адно, то другое. Да Савецкай улады ідзём, за якую галовы мужыкі нашы паклалі!

Маўчалі. Калі ж Наталлі здалося, што маўчанне зацягнулася, яна скоса зірнула на Русаковіча. Бы адумалася, мякка сказала:

— Мо я не так што сказала...

— Усё так, Наталля, так... Я ж не папракаю цябе, — адказаў Паўлавіч, абдумваючы нешта сваё, курыў, не вымаючы з рота папяросы. — Былі б грошы, я палацы вам бы пабудаваў. Разумееш, Наталля, — ён нібы ўгаворваў яе, — няма ў нас прамысловасці, няма грошай. Якія там адлічэнні ад аднаго крухмальнага заводзіка ды прамкамбіната?

— Дык вунь жа ў «Чырвоным беразе» палац будуюць, — сказала Наталля, няўлоўным рухам галавы паказваючы на той бераг.

Ён кінуў позірк у бок ракі. Але раптам натрапіў на Анюту, якая стаяла за нізкім плоцікам, прыціснуўшы да грудзей раскрытую кніжку.

— А гэта твая такая?.. — ён не сказаў якая, бо глядзеў на яе і, відаць, яшчэ шукаў тое слова, а можа, не хацеў гаварыць яго ўслых.

— Мая, — адказала Антаніна, не хаваючы гонару, — дзесяць класаў закончыла.

— Дык гэта ты, Цітаўна? — нібы абрадаваўся свайму нейкаму адкрыццю Паўлавіч.

Анюта сумелася, але голасам не выдала гэтага, толькі, заліўшыся чырванню, кіўнула галавою, пацвердзіла.

Паўлавіч гаварыў з маці, а не зводзіў вачэй з Анюты. Такая ў яго была звычка: пазіраць на аднаго, а пытанні задаваць другому. Анюта глядзела на яго смела і задзірыста, нібы даючы яму адпор, каб не пасмеў пра яе сказаць ліхога.

— То як, Паўлавіч, будзе з заявай? — перапытала Наталля.

— Будзе, — адказаў ён, і гэты адказ быў такі няпэўны і нават раздражнёны, што перапытваць яна болей не стала.

Маці маўчала. Зрэдку пазірала на Наталлю і нават зайздросціла ёй — такая патрабавальная і ўпартая. Дарма, што без мужа, а ўвішная, дасціпная, усяго

даб'ецца, дастане. Дзяржава ёй і хату пабудавала і дзяцей у інтэрнаты паўладкоўвала (праўда, дзяцей у яе многа: з першым гаспадаром трое, а пасля вайны яна яшчэ сабе хлапчука прыдбала, — паспрабуй накармі ды абуй). Вось і ходзіць Наталля па дзяржаўных установах, дабіваецца свайго, бо мае на гэта права. А цяпер во Паўлавіча ўвартавала. «Каб мой чалавек жыў быў, хіба прыйшла б я да вас?» — гаворыць заўжды Наталля. І то праўда. Чалавек яе быў працавіты, увішны.

Антаніна ж ніякіх заяў ніколі не пісала, лічыла, што не мае такога права, бо няма ў яе тае жоўтае паперкі, але няма і яе Ціта... Няма тут, на гэтым двары, селішчы, якое яны разам будавалі. Зноў развярэдзіла толькі душу: няхай бы Паўлавіч не прыходзіў, не напамінаў ёй пра яго. Што ж, калі так здарылася, значыць, такая доля. І нечага гаварыць, наракаць.

— Значыць, ты, Цітаўна, — задумліва, нібы нешта сабе адзначаў, сказаў Паўлавіч. — Дзесяць закончыла. І куды?

Анюта паціснула плечукамі.

Паўлавіч яшчэ раз зірнуў на яе, як вывучаў.

— Вось што, Цітаўна, — відаць, ён упадабаў яе так зваць, — ці не пайсці табе папрацаваць на аўтобусе, кандуктаркай. Першы аўтобус мы атрымалі. Ганарова! — падбадзёрваў ён.

...Колькі клопату было ў той дзень, колькі хвалявання! Нават з гэтымі косамі: як іх заплесці — у адну ці ў дзве, уплесці стужкі ці проста надвіць канцы? Расплятацца будуць. Гэта не дома, што ўзяў ды заплёў (а там будуць рукі занятыя), ды дома Анюта часам зусім не заплятае, так і ходзіць, як русалка.

Маці ж хвалявала іншае:

— Ты ж глядзі, паводзь сябе з людзьмі сціпла, дзе і змаўчаць трэба. Людзі ўсе свае, не чужыя.

— Мама, што ты ўсё мяне вучыш?

— Вучаны ідзе, а не вучаны спатыкаецца, дачушка. Маці не навучыць, людзі мірам возьмуцца. А мір дуне — вецер будзе, мір плюне — мора будзе, мір вохне — лес ссохне. Так яно, дачушка... — Яна памаўчала. — А як і дрэннае хто скажа. А ты — бытта і не чула, не надавай увагі. Любі дома што захочаш, а ў людзях — што даюць.

Гэты ўрок мудрасці перарвала Любка. Яна ўскочыла ў хату, бы хто за ёй гнаўся, нават не павітаўшыся, кінулася да Анюты, з нейкай, відаць, радаснай навіной. Потым спахапілася:

— Ой, цётка Антаніна, даруйце, што не павіталася! Забылася, што не была ў вас.

— Але, бывала, разоў пяць на дзень адна да другое забягаеце, а цяпер вось і некалі будзе, і Анюта ідзе працаваць.

— Ты, Анюта? — здзівілася Любка. — Не казала ж нічога.

— Ай, сама не ведаю яшчэ...

Маці зірнула на Анюту: «Як так? Парашылі ўжо ж».

— Кажы куды? — дзелавіта патрабавала Любка. — На аўтобус? Ага, бачыла я яго. Прыгожы, Анютка, новенькі, аж блішчыць, а ўсярэдзіне — сядзенні мяккія, скураныя. Канечне, ідзі, — крышку зайздросцячы і радуючыся за сяброўку, раіла Любка. — Я цяпер цябе на сваёй гнядой і не даганю, — пажартавала напаследак.

...Гэлечка пазірае так, нібы ў нечым улічыла Ганну Цітаўну.

«Гэта зусім іншае, у двух словах не расказаць. Тут свая гісторыя».

«Толькі не кажыце пра высокія матэрыі — у гэта я не веру. Я буду паступаць на тавараведа дзеля таго, каб шмоткі лягчэй было здабываць. Гавару адкрыта».

Сапраўды, на твары яе была гордасць, нібы яна мела нейкую перавагу.

«Зірніце на яе — ні ценю сумнення».

«Чаго тут цямніць? Усе свае людзі. Дарослыя! Чаго прыкідвацца дзецьмі. Трэба глядзець на жыццё рэальна. Усе думаюць толькі пра сябе. Пра сябе... — Гэлечка нервуецца, ажно кулачкі грызе. — Праўда, некаторыя тыя, хто абараняе дысертацыі, разглагольствуюць, што быццам бы нешта робяць для навукі, і толькі для навукі, а, нябось, сам-насам думае: хутчэй бы абараніцца ды замест ста дзесяці рэ класці ў кішэню чатырыста. Кніжачку шэранькую завесці ды ля сэрца насіць. Ну, што я не так гавару?!» Здавалася, яна хоча, каб нехта запярэчыў.

«Зноў я пра гэтую Гэлечку. Трэба выхоўваць дзявуху. Пераконваць. Далася яна табе...»

Ганна Цітаўна адгарнула ад сябе, адкінула думкі пра Гэлечку. Але работа з галавы не выходзіла.

І сон ублытваўся ў рэальнасць, як дзіця ў размову дарослых, падказваючы нешта наіўнае. Але калі падумаць? Вось як з гэтымі яблыкамі. «Чаму мы плануем будаўніцтва бульбасховішчаў, а яблыкі? З году ў год пра іх адно гаворка ідзе. Трэба. Трэба. Каму трэба? Гэта зноў толькі словы. А зімою — яблычка залатое. Я зусім пра тое не думала. Дурніца... Трэба сёння ж запрасіць лічбу — колькі ў раёне садоў калгасна-саўгасных. Колькі можа даць асабістая гаспадарка... А можа, паехаць самой? Даўно не была. І маму адведаю».

Самае цяжкае было сказаць Антону, загадчыку аддзела. Ён, канечне, дазволіць, але як пра тое сказаць. Дзе ўзяць сілы?..

Успомніла пра яго і ўспыхнула ўся, бы скочыла ў агонь. І сэрца закалацілася, запульсавала, здаецца, кожная жылка. «Божа, — падумала. — Гэта нейкая хвароба. Канечне, канечне, трэба ехаць, як мага надаўжэй. Астыць, абдумацца... Можа, пройдзе. Так жа немагчыма болей жыць. Трэба перасіліць сябе, на нешта іншае скіраваць думкі, энергію».

## 2

Нешта неадчэпна моцнае, як хвароба, апляло яе ўсю, паралізавала, паланіла, ёй самой здалося, быццам не інакш, як звар'яцела. Можа, яе ўдарыла маланка? Схапілася за гэту думку, як за паратунак. Памятае, як усё пачалося, раптоўна, у адначассе. Здаецца, нават у сне. У тую ноч сапраўды была навальніца. І маланка зяхнула так, што яна прахапілася ад асляпляльнага святла і вострага нейкага ці то болю, — як хто ўдарыў па шчацэ, ці то спазму — быццам кроў на імгненне прыпынілася, потым рыўком хлынула ў скронь, ці то нешта вострае, як страла, пранізала ўсю, ажно ўваччу бліснулі іскры. Яна нават прыкрыла далонню твар і села ў пасцелі. «Мяне ўдарыла маланка», — падумала яна, пазіраючы ў акно. Але адкінула гэтую думку: фортка была зачынена, за цёмным акном паблажліва пагыркваў гром, дзёўб шыбы дождж. Пару разоў яшчэ чыркнула па небе, як запалкай, хрыпліва, па-старэчы адгукнуўся гром... Анюта, ціхенька ступаючы, пракралася ў дзіцячы

пакой, уключыла начнік, каб зірнуць, як спіць сын. Маланка яшчэ і яшчэ зазірала ў спальню, асвятляючы ўтульны рай, якому не раз зайздросцілі сяброўкі, адна нават сказала, што кожная прыстойная жанчына павінна мець такую спальню: айчынныя мякка-варсістыя кілімы на сцяне і пад нагамі, а не нейкая там замежная штучная дрэнь, румынскі гарнітур — толькі яны яшчэ вырабляюць мэблю з дзеравіны, астатнія ўсе з прасаванай тырсы...

Намаганні заснуць былі марныя, але не гэта трывожыла. Бяссонне здаралася і раней, яна нават лічыла яго «благодатью», на адзіноце абдумвала яна свае артыкулы. Але цяпер не пакідала думка, што яе пранізала маланка, прайшла праз левую частку галавы, эмацыянальную ці рацыянальную, — як іх падзяляюць, не ведала, — заўсёды блытала. Хацела разбудзіць Мікалая ці пасунуцца са свайго ложка на яго, падлезці пад махровую коўдру, апынуцца ў яго абдымках, адчуць яго няхай не пацалункі — дыханне на шыі, забыцца і сагрэцца каля яго, але стрымалася. Ён спакойна і моцна спаў.

Увесь дзень Анюта была сама не свая, жыло адчуванне, што ёй трэба нешта ўспомніць, засяродзіцца, а ўсё і ўсе замінаюць. Шукала супакаення, адзіноты. А тая, мусіць, эмацыянальная частка яе галавы нібы яшчэ захоўвала той начны электрычны зарад. Анюта не магла працаваць, думала, думала. Нешта сказаў сын, і яна нават прыкрыкнула на яго: «Не перашкаджай. Дасцё вы мне сёння падумаць ці не?» І тут яна з жахам зразумела: што думае пра *яго*. Галава, усё цела былі нібы ў агні. Здавалася, гэта гарачка.

Раніцай не магла падняцца з пасцелі. Не ела, не піла. Можа, нават трызніла. Да таго ж яна засталася адна дома: Мікалай паехаў у камандзіроўку, а заадно рашыў адвезці да маці сына.

Два дні яна ляжала як у агні. Аслабла, паблажэла. Вечарам пазваніла сяброўцы. Тая прыехала, зварыла бульбы, падсмажыла яечню і загнала яе амаль сілаю да стала. «Слабая ты жанчына, — гаварыла яна. — Хоць бы прызналася, што з табою». Але праўды Анюта не сказала: «Проста дрэнна мне, мусіць, захварэла».

Яна гнала ад сябе одум. І ў той жа час у думках, як купальшчыца ў моры, забыўшыся на свае малыя сілы і страх, заплывала ўсё далей і далей ад берага.

Анюта ведала Антона даўно, гадоў з дзесяць. Сустракаліся на рабоце, размаўлялі, часам жартаўліва, але цяпер усё, пра што гаварылі раней, як гаварылі, перафарбоўвалася ў памяці з шэрых будзённых колераў у яркія, ружовыя і блакітныя — святочныя. Нібы лакмусавую паперку апускалі ў розныя хімічныя растворы, і яна мяняла свой колер. І ўсё, пра што яны раней гаварылі, набывала іншы сэнс, неверагодна значны, хмельны. І што далей — болей.

Можа, і праўда віною была тая маланка, якая асвяціла тое, што было затоена, схавала на дне душы? Яшчэ раней яна аддала яму чытаць сваю дысертацыю. Хвалявалася, чакала прысуду. Здавалася, асабіста пра яго і не думала, толькі пра дысертацыю, але ўяўленне было такое, нібы даверыла яму штосьці вельмі патаемнае, быццам напісала любоўнае пісьмо, а ён маўчаў. Незразумелым і трывожным было гэта маўчанне. Яна чакала: вось-вось пакліча, а ён нібы забыўся. Яна зняверылася ў сабе, знервавалася, гатова была да самага найгоршага, толькі б хутчэй. Шукала нечаканых сустрэч, каб напомніць пра сябе. Пры сустрэчы ж нічога не пыталася, чакала, калі загаворыць сам. Ніякавела і бянтэжылася, бы закаханая. І тое, што на першым часе прыемна здзівіла, раптам стала цяжкім і невыносным, здавалася, усе бачаць яе трапяткое аголенае сэрца, не схаваць яго ад чужых насмешлівых і асуджальных позіркаў. Тым болей, што *ён*, відаць, таксама здагадваючыся, што творыцца з ёю, назіраў за ёю з цікаўнасцю, нібы чакаў: што будзе далей. Чакаў і падкідваў сякія-такія паленцы ў касцёр. Нібы пісьменнік, які творыць сюжэт, і ад яго, толькі ад яго залежыць: будуць пакутаваць, радавацца ці любіць яго героі, сам як быццам, і не ўдзельнічае ў дзеянні. І яна адчула, што ён творыць свой сюжэт, не падаючы ніякай надзеі і не адпускаючы яе ад сябе.

Усё думала, думала пра яго, пакутавала, шукала сустрэчы: толькі зірнуць — гэтага ёй было дастаткова. Шукала яго, нейкім абвостраным, ультра-тонкім чуццём адчувала на адлегласці.

«Я звар'яцела, звар'яцела. Гэта хвароба. Такой цяжкай хваробы яшчэ не было». Яна і дзяўчынай любіла, але хіба можна параўноўваць дзявоцкае каханне з любоўю жанчыны. Тым больш, калі яна нераздзеленая. Яна нібы згубіла здольнасць мысліць, забылася на работу. Галава поўнасцю належала яму, толькі яму, ён

уладарыў яе думкамі, кіраваў яе дзеяннямі. Некалі дзелавая, іранічная і жартаўлівая жанчына ніякавела і не знаходзіла слоў у яго прысутнасці.

«Гэта хвароба, нейкая хвароба... Зусім разышліся нервы», — разважала яна і ўсё смактала валідол, каб супакоіць сэрца, якое так часта зрывалася са звычайнага рытму і вытанцоўвала чортведама ў якім тэмпе. І не толькі тады, калі яна вылятала яму насустрач, інтуітыўна адчуўшы яго набліжэнне, не тады, калі, як шалёная, хадзіла па вуліцах, у парку, спадзеючыся сустрэць яго, а толькі ад аднаго позірку на тэлефон, калі трэба было пазваніць яму па нейкай справе, якую яна прыдумвала сама. І, нібы вар'ятка, чакала яго званкоў, хоць праз туман наслання прарывалася развага, што гэтага не будзе ніколі. Ніколі...

У часы одуму разумела, што ўсё гэта нічым іншым, акрамя душэўнага болю, для яе не скончыцца. Гэта нерэальна... Немагчыма. Балела і сціскалася сэрца, нібы пазірала на парослую палыном дарогу, на спусцелы дом, які рушыцца пад дажджамі і ветрам.

І муж прыкмячаў, што з ёй нешта творыцца. Назіраў з цікавасцю, з нейкім нават жалем.

«Расказаць яму? Пра што расказаць? Быццам нічога і не адбылося. І ў той жа час — адбылося. Даверыцца маці? Але як пра тое раскажаш? Ці зразумее тая, што ўсё жыццё пражыла ў цярпенні і жаночай адзіноце. Ці павернецца язык расказаць?

Значыць, трэба перабароць сябе. Перасіліць... Каб гэта хоць не так задаўнілася. Зацягло, як у вір. Трэба было адразу паслухацца Канстанціна Іванавіча і не ісці ў сектар Кавалёва, Антонаў сектар».

...Чуткі мелі падставу. І пагалоска, што сектар іх скарачаюць, станавілася рэальнасцю. Інстытут адмаўляецца займацца неіснуючай праблемай малых гарадоў. Усе яны — чацвёра навуковых супрацоўнікаў, тэхнік і загадчык сектара жылі як на хісткай палубе, ведаючы дасканала, што ўсіх іх змые хваля. Але з надзеяй выслухоўвалі ўсялякія прагнозы і здагадкі. Афіцыйных паведамленняў яшчэ не было: мусіць, недзе ўсё-такі нехта быў супраць, нейкі вінцік у гэтым рухавіку яшчэ быў моцна прыкручаны і таму нельга было разбурыць машыну. Чуткі дайшлі, што намеснік старшыні Дзяржплана супраць, ён настойвае, што праблема ўсё-такі мае правы на існаванне. Але, мусіць, голас яго быў не ра-

шаючы ці слабыя, бяздоказныя былі словы. У пакоі пацішэла, усе неяк нават апантана працавалі, званілі ў ЦСУ, вылічвалі наяўнасць працоўных рэсурсаў, апісвалі эканамічныя магчымасці раёнаў, малых гарадкоў, яшчэ таропка хацелі даказаць, што такая праблема існуе.

Канстанцін Іванавіч, загадчык сектара, быў хмурны, маўклівы. Ён прыходзіў на работу вельмі рана, амаль за дзве гадзіны, ніколі ніхто так рана не прыходзіў. Ён схуднеў, хоць і ніколі не быў спраўны. Але касцюм вісеў на ім, як на калу. Шчокі запалі, вочы зрабіліся неспакойныя. Анюта здагадвалася: мусіць, у яго бяссоніца.

Яна і сама многа думала, перачытвала свае допісы. Вагалася, можа, разумела, што ўсё гэта не навукова, схілялася да думкі, што нельга называць гэта праблемай. Гэтых праблем — ой-ё-ёй колькі, лесам яны пасталі ў парозе, як людзі на вясковым вяселлі. Ці, як любіць паўтараць Канстанцін Іванавіч: гэта тэарэтычна, а — практычна? Практычна?

Адна толькі Гэлечка, як заўсёды, насілася па калідорах, па аддзелах да незлічоных сваіх сяброўак. Прыносіла, як сарока на хвасце, усё новыя і новыя чуткі. Гэта, відаць, уносіла нейкае ажыўленне ў яе жыццё: цікава ж паслухаць, дзе хто што казаў, пераказаць сваім. Наогул, яе не вельмі турбавала, што будзе з сектарам: знойдуць іншую праблему, іх — як запалак у карабку, вымай і запальвай, а ёй, Гэлечцы, было ўсё адно, якія справаздачы друкаваць на машынцы, набіваць мазалі на пальцах ці праблемамі малых гарадоў, ці праблемамі вытворчасці малака і мяса. Гэта, можа, і цікавей: там хоць якую лічбу вывудзіш ды запомніш і дома можна сказаць: а ведаеце, колькі будзе мяса ў нас на душу насельніцтва ў 2000 годзе?.. Вунь Ева, як вып'е, нага за нагу закруціць, пачынае заводзіць у кампаніі навуковыя дыскусіі. Эфектна стрэсвае попел у скручаны з паперы кулёчак — не ведаючы, можна падумаць: вучоная дама. А яна ж такі тэхнік, як і Гэлечка. «Мы, — гаварыла Ева, — турбуемся, каб на душу насельніцтва...» Гэлечка заўважыла, што тут усе любілі разважаць пра гэтую злашчасную «душу насельніцтва», вылічваць і абмяркоўваць, што ёй трэба. Смешна было слухаць: што яны ведалі пра гэтую душу, што яны ведалі пра душу Гэлечкі, пра свае душы? Яна ж іх бачыла наскрозь. Хай сабе яна толькі «сярэдні чалавек». Гэта таксама з іх лексіко-

ну. Яна, Гэлечка, сярэдні чалавек, з патаемнаю сваёю душою, нават радавалася таму, што адбываецца, назірала, як яны хвалююцца, кожны за сваю кішэню. А гаворань... Можа, толькі Ганна, Ганна Цітаўна. Дык яна наогул дзівачка.

Гэлечку ўжо пераманьвалі ў аддзел планавання развіцця харчовай прамысловасці. Адтуль яна і прынесла дасціпны жарт: іх сектар называюць не іначай як «ні к сялу ні к гораду». Але чамусьці ніхто не смяяўся. Толькі Канстанцін Іванавіч сказаў:

— Гэта тэарэтычна, а практычна... Практычна, таварышы, мы проста закрылі тэму.

«Значыць, усё, ніякіх праблем, ва ўсім поўная яснасць. Гэта тэарэтычна, а практычна? Практычна»... Анюта пісала і пісала свае артыкулы, якія падкія да праблем газеты хапалі, як гарачыя блінцы. Яны там яшчэ таксама не ведалі, што праблем такіх не існуе...

«Для актывізацыі малых і сярэдніх гарадоў, якія маюць для гэтага спрыяльныя эканамічныя прадумовы, трэба прадбачыць у іх будаўніцтва прадпрыемстваў з наборам прафесій, што забяспечваюць прымяненне жаночай працы, для чаго патрэбна фарсіраваць развіццё такіх галін прамысловасці, як дакладнае машынабудаванне, лёгкая, харчовая прамысловасць. У той жа час гэта павінны быць невялікія, але рэнтабельныя прадпрыемствы. Некаторыя малыя гарады з мабільнымі працоўнымі рэсурсамі трэба выкарыстоўваць для куставога размяшчэння філіялаў галоўных вытворчасцей, якія знаходзяцца ў вялікіх гарадах». Напісала і сама здзівілася пустацеласці гэтай жалезабетоннай фразы. «Канкрэтна, канкрэтна. Што, дзе, калі і як...» А ў вачах гэтае маленькае мястэчка Ціша, цэнтр багатага раёна, але нейкі закінуты, забыты, — драўляныя рабрыстыя дамы нібы пусцілі карані і ўсё заглыбляюцца і заглыбляюцца ў зямлю, у мінулае.

«Зноў, зноў гэтае мінулае. Калі ўжо мы яго ці яно нас пакіне ў спакоі...» Там яна нарадзілася. Там і цяпер была яе маці, якая ўсё жыццё праседзела за швейнаю машынкаю. Усё жыццё... адна, у гэтым, дажываючым свой век доме, у арцель не пайшла. Можа, таму, што трэба было ісці са сваёю машынкаю, — абагульваліся такім чынам, — шкадавала яе. Але ж людзі ішлі, шылі навалачкі, куфайкі, трусы, бялізну, летнія суконкі, халаты, словам, — шырспажыў. Не, тады не было яшчэ

такога слова, усё гэта былі неабходныя, амаль дэфіцытныя тавары. Гэта потым, калі абжыліся людзі, усю гэту прадукцыю сталі пагардліва называць — шырспажыў. Як апантаныя пачалі ганяцца за імпартам, нібы гэта не той жа шырспажыў, толькі з прыгожай біркай: у госці ідучы заўсёды апранаемся як найлепш.

Калі б яна сказала пра гэта нават у сваім сектары, колькі пярэчанняў было б. Безумоўна, *яны* шыюць лепей. Але нешта ж і мы робім лепей. Проста няма «зацікаўленасці», стымулаў. Якія, к чорту, стымулы: маральныя, матэрыяльныя? Мала мы ўсё-такі робім сацыяльных даследаванняў. Колькі людзей, напрыклад, палічыць за лепшае маральнае стымуляванне, колькі матэрыяльнае? Баюся, што апошніх будзе занадта многа. Такіх, як Гэлечка. У мінулым годзе сектар прэміравалі за датэрміновую распрацоўку плана сацыяльнага развіцця раёна. Зноў жа не пыталі (не, а калі б запыталі?), каму маральнае, каму матэрыяльнае. Гэлечцы далі грамату. Там, на сцэне, яна ўсміхалася сваёю чароўнаю белазубаю ўсмешкаю, крышку манерна, нібы артыстка ківала галавою, дзякуючы за воплескі. Ах, вялікая артыстка! А ў сектары яна шпурнула грамату, гэту — як яна назвала — «нікчэмную паперку», разрыдалася: «другім па трыццаць рублёў далі, а мне гэту нікчэмную паперку, хай возьме яе сабе, будзе што за труною несці». Добра, што Канстанціна Іванавіча не было. О, якія яна памыі вылівала на яго галаву: «Стары паршывы кот. Бабнік няшчасны». Тут Анюта не стрымалася: гаварыла ёй пра камсамольскі гонар, пра годнасць. Аб тым, што яна ў яе гады не была такою. І, наогул, ніколі не думала ў першую чаргу пра сябе. І як гэта можна?

На твары Гэлечкі была здзеклівая ўсмешка.

«Ганна Цітаўна, вы старэйшая за мяне на нейкіх пятнаццаць гадоў. За гэты час у свядомасці людзей, спадзяюся, вялікіх зрухаў і перамен не адбылося, і мы з вамі на адной платформе».

«Платформе?» Яна здзекавалася. Пра якую платформу можа гаварыць гэта смаркачка, апроч той, што ў яе на нагах.

Анюта міжволі зірнула на яе стройныя, загарэлыя ногі. Так, сапраўды яны на адной платформе, дарагой «платформе» пад каўчукавае дрэва «Made in Italy». Толькі ў яе зверху ззяюць штучнай пазалотай спражкі. У Анюты верх больш сціплы.

Яна міжволі ўсміхнулася.

«Не хапала нам яшчэ быць на розных платформах. Ці не хочаш ты, каб я адстала ад моды?» — яна паспрабавала ўсё звесці да жарту. Гаварыць з ёю сур'ёзна — бавіць дарэмна час. Але жартаўлівага тону не было. Было самотна. «Проста мы па-іншаму ўваходзілі ў жыццё», — сказала яна.

«Ці многа вы ведалі пра жыццё?» — не здавалася Гэлечка.

«Многа. Мы ведалі, што жыццё трэба пражыць так, каб не было «мучительно больно...».

«Божа мой, кніжная мудрасць. Ну, чаму, чаму усе прыкідваюцца, што яны не такія, што яны лепшыя , — зморшчыўшыся, пыталася ў сябе ці ў нейкага іншага Гэлечка. — Не веру, не веру я».

Тут ужо ўмяшаўся Кавалёў. Стаў нешта даказваць, пярэчыць. Гэлечка нейкі момант слухала яго ўважліва. Потым запытала сур'ёзна, залішне сур'ёзна.

«Вось вы, Антон Кірылавіч, вельмі любіце разважаць... Я разумею, каму, як не вам, рабіць гэта. У вас вялікая ноша, вы ўзялі сабе на грудзі, як штангу, чатырыста рэ ў месяц. Скажыце, ці не цяжка вам?»

Кавалёў маўчаў, ён, здавалася, праглынуў язык, толькі яшчэ больш сцяліся ад нахлынуўшай злосці губы, нават пасінелі.

«А вы ж робіце не болей за іншых, калі не менш».

«Дзяўчынка, саплячка, — падхапіўся Кавалёў, аж паваліў крэсла. Здавалася, ён зараз яе ўдарыць. Анюта ажно падалася яму насустрач. — Ты ведаеш, ведаеш, — што табе трэба зрабіць? — захліпаўся ён, трасучы чамусьці рукамі. Ага, сапраўды рукі яго вар'яцелі, і ён сунуў іх у кішэні. — Цябе трэба разабраць на камсамольскім сходзе».

Гэлечка сядзела, угнуўшы галаву, з-пад ілба нацэліўшы на яго вочы, нібы цяля, якому карціць барацца з быком — зманліва і боязна.

Але вось яна распрамілася.

«Ага, мяне ўжо даўно трэба разабраць на сходзе. Мяне трэба паслухаць афіцыйна, бо тое, што я вам сказала, — неафіцыйна. Усе прапусцяць гэта міма вушэй, не нададуць увагі, не зробяць высноў».

Антон Кірылавіч яшчэ не мог супакоіцца. Але толькі зыркаў на яе вачыма ды жаўлакі хадзілі на шчоках.

«Было б смешна. калі б вы прыйшлі ў аддзел кад-

раў і сказалі, не, хутчэй бы ваўкі ў лесе паздыхалі: дайце мне хоць на сотню меней, а гэту — налічыце Ганне Цітаўне. Як-ніяк яна робіць на грамадскіх пачатках разлікі будаўніцтва нейкага «паветранага замка».

Цяпер яны ўсхапіліся абое. Зірнулі адно на аднаго. Між імі стаяла гэта дзяўчына. Яе цяпер, здавалася (не, яно так і было!), нявінныя вочкі лыпалі то на яе, то на яго, то на супрацоўнікаў аддзела, якія паўскоквалі з месцаў, занепакоіліся.

«Чаго вы, — недаўменна сказала яна, — што я такое сказала? Я паўтарыла толькі тое, што вы гаворыце адзін пра аднаго ў кулуарах».

...Анюта сядзела з заплюшчанымі вачыма: «Гэта яна знарок, знарок... Чаго яна дамагаецца?» А Гэлечка біла і біла па клавішах машынкі.

«Як яна працуе! Як аўтамат! Гэля, Гэлечка, прыгожая дурнічка, чымсьці яна і сімпатычная. І так біць, як яна гаворыць, за 80 «гразкіх» рэ, а чыстымі і таго меней. А сукенка каштуе 70—90, туфлі — за 50. Яна б'е і б'е, як па асфальце абцасікамі. Набойкі ляцяць, не паспяваеш «рубель дваццаць да іх прыкладваць». На яе мове гэта значыць рамантаваць...

Зусім з глузду з'ехала — гэта ж швейная машына... Маці шые. Стракатанне машыны даносіцца сюды з адчыненага акна.

Ага, яна не захацела тады ісці ў арцель. Прывыкла адна. А можа, сгаранілася людзей. І чамусьці яшчэ бадзёрылася, не падавала нават выгляду, што ёй цяжка. Ганарыстая».

А маці ўсё шыла і шыла: дзяўбла, як дзяцел дупло, машынка. Варта было прыкрыць вочы, як здавалася, што гэта Гэлечка друкуе. «Ці надрукавала яна даклад? За ёю трэба вока ды вока. Думае, мусіць, што я паехала, то і справаздачы не будзе. І так — дэмаграфічная сітуацыя ў рэспубліцы і некаторыя пытанні выкарыстання працоўных рэсурсаў... Працоўных рэсурсаў... Там трэба было б уставіць такі абзац: «Разам з тым не трэба кідацца ў крайнасць (так, у крайнасць), бо садзейнічанне развіццю мясцовай прамысловасці і мастацкіх промыслаў у малых гарадах без адпаведнага адбору ўмоў і магчымасцей для іх развіцця можа аказацца непрадукцыйнай, марнай тратай часу, людскіх і прыродных рэсурсаў, прывесці да наваднення рынка маламастацкімі (нейкае слова няпэўнае, лепш — не маючымі мастацкіх

вартасцей), так, не маючымі мастацкіх вартасцей і проста непатрэбнымі таварамі і вырабамі. Таму патрэбна пільна (пільна, можа, лепш дбайна, а, можа, няхай і тое і другое), пільна і дбайна (скажуць, ненавукова) вывучыць як эканамічныя магчымасці кожнага раёна, так і гісторыю развіцця ў ім народнага рамяства».

Анюта бачыла іх на рынку, гэтых гліняных баб, коцікаў — вушкі тырчком — а між імі проразь: кідай сабе капеечку, збірай манеткі...

«К чорту гліняных баб і лазовыя кошыкі (тут адзін кіраўнік гаспадаркі спецыяльна запусціў кавалак лугу пад лазу). К чорту! Трэба ўсё ўвязваць з вытворчасцю прадуктаў харчавання. Сельская гаспадарка губляе непасрэдную сувязь са спажыўцамі і ператвараецца ў пастаўшчыка сыравіны. Такім чынам, разрываецца адзіны працэс вытворчасці. Вот, вот дзе ўбіты цвік! А разам з тым ускладняюцца міжгаліновыя сувязі. Вот, вот аб чым трэба дбаць. І гэта не толькі тут, у Цішанскім раёне, а паўсюдна.

Гэта трэба больш аргументавана выпнуць. Больш аргументавана...»

«Гэта цікавая, цікавая думка». Як за яе тады ўхапіўся Антон Кірылавіч. Яна тады так верыла яму, гаварыла ўсё чыста, што думала.

Ён абняў яе за плечы. (Госпадзі, яна і дагэтуль яшчэ ўздрыгвае ад таго дотыку.) Шчырасць жа, шчырасць была ў яго вачах. Як было не паверыць?

«Геніяльнае, Ганначка, заўсёды проста. А гэта — проста геніяльна». Яна радавалася, яна была перапоўнена да краю маладосцю і энергіяй, сляпой верай у яго. І пісала той артыкул для навуковага зборніка як песню. І сама паставіла першым ягонае прозвішча, затым сваё, бы так і трэба было (ён жа кіраўнік яе працы). Так рабілі ўсе. Потым ужо з'явілася ціхая, затоеная горыч, калі ў рэспубліканскім друку, над аналагічным артыкулам, прозвішча яе раптам згубілася, сцерлася, прапала, выпала пры наборы, яго празяваў рэдактар ці карэктар: думай як хочаш, але яго не было.

...Вечарэла. Вечар быў цёплы, ціхі. Перад вачыма з узлобка, дзе стаяла хата, дзе сядзела яна, Анюта, была відаць зарэчная вёска. Адсюль яна здавалася горадам, што нечакана паўстаў і расце.

Маці таксама выйшла, села побач. Так, гэта ўжо было: яны вось так сядзелі і гаварылі. Гаварылі не раз, любаваліся садам і рэчкай, радаваліся цяплу і лету, а цяпер усё гэта яе раздражняла. Была горыч. Выходзіць, усё, што яна рабіла, — толькі для сябе. Іншых работа відаць... А яе?

— Бачыш, Ларывон набудаваў, — паказала яна кіўком галавы на «Чырвоны бераг». Так называлі калгас па той бок ракі, а Ларывон Кузьміч Лыкаў быў яго старшынёй. Чалавек тутэйшы, таму ўсе звалі яго проста Ларывон. За вочы, канечне, а іншыя і ў вочы.

— Цэлы горад.

— Не так даўно прыязджаў да яго сам Пётр Міронавіч, пахадзіў, паглядзеў — спадабалася. Толькі потым усё ж сказаў: гэта добра, Ларывон Кузьміч, толькі нам трэба мяса і малако, а не цаглінкі. — Маці памаўчала. — А і праўду сказаў. Мала хто з калгаснікаў пайшоў у тыя яго дамы, от толькі такія-сякія валацугі, што ўсё па свеце цягаюцца, месца не знаходзяць. Астатнія кватэры арандуюць раённыя ўстановы. Сабес туды перайшоў, атэлье розныя... Так што ты таксама, дачка, глядзі. На паперы яно проста, як той казаў, намаляваў і жыві.

...І зноў гэта Гэлечка са сваімі каверзнымі пытаннямі.

«Падыдзіце сюды, Ганна Цітаўна, я не разумею». Ясна ёй усё, хітруе, проста нешта хоча сказаць.

«Слухаю. Што там?»

Яна тыча пальцам з ярка фарбаваным пазногцем у тэкст, гаворыць сцішана:

«Вось вы пішаце, што, — яна шукае працяг фразы, — вашымі ж словамі: развіваць усе малыя гарады як прамысловыя цэнтры немагчыма і немэтазгодна. Сама лічба незанятага ў грамадскай вытворчасці насельніцтва не ёсць яшчэ дастатковы грунт для індустрыялізацыі таго ці іншага горада, калі ён не мае іншых спрыяльных эканамічных перадумоў... А ў дужках — выгодным транспартным становішчам, дастаткова моцнай інфраструктурай і г. д. — закрыць дужкі».

«Табе не ясна, што пад гэтым словам — інфраструктура?»

«Не, мяне гэта не цікавіць, мне не ясна, як вы будзе-

це абараняць развіццё свайго горадка, калі якраз там і няма гэтых умоў. Пабудавалі новыя гарады Салігорск, Наваполацк, то там знайшлі соль. Ага, хіба ў Полацку знайшлі нафту? Нешта не чула. Але няхай сабе. А ў вас жа там нічога няма... Ці не будзе гэта нейкі валюнтарызм. Нейкі новы від блату ў маштабах рэспублікі? Так кожны захоча адбудаваць свой пасёлак, вёску... А чаму не...»

Анюта ўскінула на яе поўны гневу позірк. І Гэлечка асеклася.

«Прабачце, — сказала яна. — Але мне незразумела...»

Ну як на яе злавацца: такія нявінныя вочы.

«Урэшце, гэта не ваша справа, — чамусьці Ганна звярнулася да яе на «вы», — гэта не ваша турбота! Ваша справа — друкаваць. І каб да майго прыезду было надрукавана».

— Мама, у мяне нешта баліць галава, — Анюта ткнулася лбом у матчына плячо.

— Ехала, дарога не блізкая. Я заўсёды баюся за цябе, калі ты едзеш на машыне, раней, як аўтобусам прыязджала, і мне было спакайней.

У двары, падагнаны пад вішняк, стаяў чырвоны «Масквіч».

— Ага, дарога не блізкая, а проста жахлівая, асабліва апошнія пяцьдзесят кіламетраў, на мяжы раёнаў. Гэта прыклад ведамаснага бар'еру.

Антаніна Пятроўна не вельмі разбіралася ў гэтых «ведамасных бар'ерах», яна знала адно, што дарога такі ліхая і трывожылася за Анюту кожны раз пасля ад'езду, аж пакуль не пазвоніць ці не прышле паштоўку. Наогул ёй было дзікавата: жанчына на машыне. Але цяперака...

— Хадзем, павячэраем.

— Пасядзім крышку. Так жа цёпла. Ціха. І добра мне з табою.

Анюта абняла яе за плечы.

— Добра, а тоішся ад мяне. Адчуваю я, нешта ў цябе не так з Мікалаем, можа? От прыедзеш і яго не ўспамінаеш.

— Ой, мама, не трэба пра гэта. Я і сама не ведаю, што ў мяне з ім. Не, мы ніколі не сварыліся. Мы як

быццам разумеем адно аднаго, як сябры, таварышы. Гаворым пра работу. Але ж няма ў мяне і, мусіць, у яго... Ну, ты разумееш, гэта павінна быць у такія годы. Як табе сказаць... Але давай не будзем пра гэта. У мяне іншая турбота. Скарачаюць наш сектар. Разумееш, няма цяпер такой праблемы — развіццё малых гарадоў... Няма. Не існуе.

Антаніна Пятроўна паківала галавою, ці то пагаджалася з ёю, ці то пярэчыла.

— Няма. Значыць, усё рошана, зроблена. Ну, няма дык няма, вам, вучоным, відней... Толькі, як казаў Паўлавіч, гэта ўсё на паперы лёгка: паставіў праблему — паклаў, паставіў — паклаў. Усё на паперы запісана і ў сталс ляжыць.

Яна нібы выгаварылася. Устала. А Анюта ўсё сядзела, пазірала на раку, на прыціхлыя зарэчныя лугі, пакрытыя смугой, з-за чаго не так ясна пазначалася далячынь. Белымі гарамі стаялі пяціпавярховыя дамы ў «Чырвоным беразе».

Было цёпла плячам ад нагрэтага за дзень боку хаты, ціха, не шастала ні адна галінка ў садзе. Толькі з-пад лісця маўкліва, здзіўленымі дзіцячымі вачанятамі, пазіралі яблыкі. І божая кароўка — чырвоная, у чорныя кропачкі — няспешна ішла па руцэ. З-пад верхніх размаляваных крыльцаў выглядала нядобра складзенае, мусіць, паспешліва, ніжняе шэрае, празрыстае крыльца. Але яна не падбірала яго, не ўладкоўвала на спіне, а паўзла па руцэ, і Анюта міжволі паварочвала руку. Вось казюрка на далоні, падалася на пальцы: узляціць ці сарвецца? Відаць, не можа расправіць крыльцы. Не, не спрабуе нават: стамілася...

— Я ўсё думаю. Увесь дзень... Ты гэта сур'ёзна, Анюта?

Антаніна Пятроўна зноў села з ёю побач, заклапочаная, нейкая сумна пастарэлая. Нават крышку разгубленая. Ёй былі надзіва незразумелыя яе словы: як гэта раптам усё вырашана? І сама будзе зараз без работы. Шкадавала, што ніколі з ёю не гаварыла пра сям'ю, работу. Здавалася, усё ў яе добра, ладна. А, відаць жа, не зусім.

— Дак дзе ж ты зараз будзеш працаваць?

— Ну што ты турбуешся? Работа будзе. Можа, выкладаць эканоміку пайду...

Маці сядзела сцішаная, задумлівая. Анюту гэта як

быццам бы не турбавала. Яна была спакойная, нават абыякавая.

...Нeяк раніцай Канстанцін Іванавіч не выйшаў на работу. Чакалі яго паўгадзіны, гадзіну. І ўсе чамусьці пазіралі на Гэлечку. Яна ўсё ведала. Але хітравала, нібы за так, за кукіш у кішэні не хацела выдаваць аніякіх сакрэтаў. А сама гарэла жаданнем падзяліцца навіною, не магла нават працаваць, ды і ніякай работы, акрамя аднаго артыкула, не было, а друкаваць ці не друкаваць — гэта яе справа. «Кожнаму дагаджай, як нанятая. Гэта не планавая работа. Трыццаць пяць кап. за старонку — ніякай скідкі. Сама хай пасядзіць, паляпае...» Гэта самае яна сказала і Ганне Цітаўне, толькі крышку мякчэй, акультурыўшы свае думкі, надаўшы ім тактоўнасці і акругліўшы суму. Атрымаўшы згоду, падабрэла, павесялела і сказала:

— Канстанцін Іванавіч захварэў. Сэрца. Учора завезлі ў бальніцу. І наогул — ён у нас болей не будзе. Загадчык сектара, — яна хітра абвяла ўсіх позіркам, — будзе... будзе. Ну, гэта пакуль сакрэт. Вы ж разумееце? Але, хутчэй за ўсё... Пакуль што настойліва мусіруецца (ах, як яна выгаворвала гэта слова) кандыдатура Кавалёва...

«Антона?» — у Анюты зайшлося і чамусьці часта-часта забілася сэрца. Яна ажно пабляднела, закусіла губу. Гэтага не схаваць ад вострага позірку Гэлечкі. Яна западозрыла: мусіць, яна, Ганна, спадзявалася, што прызначаць яе — усё ж піша, піша артыкулы...

Сама яна не надала таму ўвагі, яе цікавіла іншае: якімі праблемамі будзе займацца сектар, няўжо Аграпромам?

Нехта пра гэта папытаў, але Гэлечку праблемы не цікавілі. «Якая мне розніца?» — здзіўлена сказала яна.

Пасля работы Анюта купіла тры гваздзікі, апельсіны і пайшла да Канстанціна Іванавіча. Яму не дазвалялі ўставаць, і яна толькі крышку пасядзела каля яго, спакойна вытрымліваючы падазроныя позіркі медыцынскай сястры.

Анюта шчыра шкадавала Канстанціна Іванавіча, з ім добра, неяк спакойна было працаваць, без тузаніны і нервознасці.

— Вось бачыце, — неяк сароме́ючыся, гаварыў ён,

прапускаючы між пальцаў рукі свае белыя, сівыя валасы, нібы зачэсваючы іх. — Улажылі... А праз тыдзень трэба лекцыі чытаць завочнікам. А што, Ганна Цітаўна, давайце: вы ў інстытут. Вы ж валодаеце словам, ведаеце палітэканомію...

Анюта маўчала.

— Вам цяжка будзе працаваць з Антонам... — сказаў Канстанцін Іванавіч, прыкрыўшы вочы. І яна дзякавала ў душы, што ён не пазірае на яе, не бачыць, як чырвань, бы разлітая фарба, залівае яе твар. Як душна ёй стала...

«Няўжо ён здагадваецца?»

— Я разумею, вас цікавяць гэтыя праблемы... Дарэчы, я чытаў — вельмі цікавыя думкі вы выказвалі ў артыкуле пра набліжэнне вытворчасці да сыравінных рэсурсаў. Я рэцэнзаваў інстытуцкі зборнік. Нядаўна прагартаў, а вашага прозвішча чамусьці няма...

— Карэктары, мусіць, выпусцілі ці нешта такое, — спакойна адказала яна. Бо і ў думках не трымала, што магло здарыцца нешта іншае. Антон мог зняць наўмысна. Яна верыла Антону. Больш таго, яна любіла яго... І яе думкі былі ягонымі. Галоўнае, што гэта сказана. Няхай сказаў ён. Галоўнае для яе, што ён ведае — гэта яе думкі.

## 3

Гарачыя, моцныя Мікалаевы рукі абнялі яе, але чамусьці там, дзе яны дакраналіся, прабягаў па целе халад. Скура ўздрыгвала, бралася шурпаціннем. Так адчувае, мусіць, сябе рака, калі яе горача абдымае мароз, а ёй холадна... Холадна. І Анюта ўся напялася, унутры сабралася, сцялася, слаба баронячыся, адштурхнула яго. Мікалай зразумеў гэта як жарт, падахвочваў яе, абдымаў. Пякуча дыхаў у плячо, цалаваў у шыю. Крышку, на нейкае імгненне, яна расслабілася, адчула яго сілу, паддалася яшчэ зацята, як пупышка, якая доўга не раскрываецца насустрач сонцу. Мікалай напяўся ўвесь, заварушыўся, ледзьве датыкаючыся, бы збіраючыся ўзляцець. Яна ж, здаецца, апала, зрабілася цяжкая, як з гліны, абыякавая.

Калі ж ён пяшчотна прынік, бы прыслухаўся, як б'ецца яе сэрца, яна ўздрыгнула, як птушка, забілася ў

яго руках, і ў грудзях стала слабка і лёгка. Ён прыняў гэта з удзячнасцю. Вусны яго дакраналіся яе шчок, вачэй — і адхінуліся, адчуўшы яе слёзы. Яна ўпёрлася рукамі ў яго грудзі, адштурхнула, адвярнулася хуценька ад яго, і слёзы хлынулі з вачэй, нечакана прыйшла палёгка, што скоўвала дасюль.

— Што з табою, Анюта? — трывожна папытаў Мікалай.

Але яна маўчала, толькі ўсхліпвала. А слёзы апальвалі ёй шчаку, і на губах быў іх палынны смак.

Анюта не баялася сваіх слёз. Стамілася стрымліваць іх, хаваць. Застылыя ў грудзях, яны, здавалася, скавалі іх, сціснулі, як ільдзіна, яшчэ трохі і — разарвуць душу.

Стала страшна, неверагодна страшна: як жыць далей побач з чалавекам, для якога няма ў сэрцы нічога, ні любові, ні прыязні, калі ўсё прыхавана іншаму, таму, для каго, на жаль, гэта нічога не значыць, нібы жменя дробязі.

«Не, гэта нейкая хвароба. Чаму раптам так? Раней хоць можна было ўявіць яго твар і толькі баяцца, сцерагчыся аднаго, каб не назваць услых яго імя». Цяпер яе працяла страшная, жахлівая па сваёй сутнасці думка: «У мяне будзе дзіцёнак! Харошыя дзеці нараджаюцца ад любові. А я... Я думала пра іншага. Вось адкуль яны, здраднікі...» На імгненне, кароткае і жахлівае імгненне, яна ўбачыла панылы, падазроны твар чалавека, вочы ад зрэнак — жоўтыя карэньчыкі, нібы прарос гарох.

Холад заледзяніў душу.

Мікалай дакрануўся да плячэй. Яна міжвольна ўздрыгнула, нібы баронячыся, скураю адштурхоўваючы яго руку. Не прымала ласкі, хоць розум супярэчыў пачуццю, розумам, гарачым пульсуючым вузлом нейронаў і цэрэбральных структур, цягнулася да яго, як стомлены спёкаю падарожнік да ценю дрэва. А дрэва гэта было магутным, трывалым, пад ім можна было ўкрыцца надзейна і надоўга. І ёй хацелася забыцца, захінуцца яго венцем, пазбавіцца сумненняў, жыць ціха, утульна, як і раней. Яны ж пражылі з ім столькі гадоў. Але не атрымлівалася, не выходзіла, усё рассыпалася, апаўзала, як пясчаны насып. Яе прыхільнасць да яго і вернасць бралі верх удзень, яна нібы станавілася адушчай: сонца, раніца, дзень высвечвалі яго абаяльнасць, дабрыню і заклапочанасць пра сям'ю, удзень яна была з ім,

дзялілася сваімі думкамі, планамі, трывогамі. Але дзень канчаўся, надыходзіла ноч. Яна баялася ночы, затрымлівалася, знаходзіла сабе работу на кухні, старалася пазней з'явіцца ў спальні, — толькі каб ён заснуў. Ніколі з ёю такога не было за гэтыя пятнаццаць гадоў.

— Я хварэю, я ж табе казала. Ты зразумей мяне. Не чапай... Дай крыху акрыяць. Я ачуняю. Ачуняю...

Яна гаварыла глуха ў падушку, нібы сама сабе.

— Ага, я ведаю, гэта бывае ў жанчын у пэўным узросце... Потым праходзіць. Некаторыя ў гэты час вар'яцеюць, — гаварыў ён. — Перастройваецца арганізм...

«Я звар'яцела, звар'яцела, — пагаджалася ў думках яна. — Вар'яцтва ж і пачынаецца з таго, што чалавек не можа адкаснуцца ад нейкай адной назойлівай думкі. А я толькі і думаю пра яго, толькі пра яго. Усё адступілася на задні план».

— Жанчыны бываюць у такім стане, што могуць вытварыць што заўгодна. Нават... парашыць жыццё.

«Гэтак было б найлепш. А тут — ніякага выйсця». Адчувала, як глыбокая, бяздонная прорва адкрывалася перад ёй. Вось яна ўжо ляціць, сэрца замірае, жахліва і амаль соладка, яна ж чапляецца за колкія кусты, што паўрасталі ў камень, і карані іх моцныя, што драцяныя... і вяртаецца ў рэальнасць. Зноў чуе яго голас.

— Чаго табе не хапае? Усё ў нас добра. Супакойся. Жыві як усе...

«Не ведаю, як усе жывуць, калі так, то навошта, навошта гэтак мучыцца».

— Я да цябе, ты ж ведаеш, добра стаўлюся.

«Казённы, чэрствы чалавек, хоць бы раз сказаў, што люблю. Божа, а можа, мы ўжо старыя для гэтых слоў...» — падумала яна, жахнуўшыся свайго адкрыцця.

«Позна ўжо, завельмі позна. Прачакала, прамарыла, праспала ты сваё. Спахапілася... А ўжо дзень. Дзень! Не паспееш работу зрабіць, як і сонца ўніз пакоціцца. Гэта несправядліва, несправядліва, — пярэчыла яна сабе, — я яшчэ не жыла, не любіла. Я ўсё чакала...»

— І ўсё ў нас ёсць. Чаго няма, купім, — ён засмяяўся сваёй дасціпнасці, мусіць, не ставячы ўсур'ёз іх гаворку. І добра ведаючы, што не ўсё можна купіць за грошы.

Яна раззлавалася. Адкінула яго руку.

— Ты жывеш са мною, як са шлюхай. Ты не пытаеш

у мяне, хачу, не хачу я... — голас яе перарываўся ад усхліпаў.

— А як жа? Ты ж мая жонка? — шчыра здзівіўся ён. Памаўчаў. Потым зноў пачаў настройваць яе на жартаўлівы тон. — Ну, добра, сказаў, я буду пытаць у цябе: «Дазвольце, калі ласка, вас пацалаваць». А потым як? — ён шчыра смяяўся. — Не дуры, Анюта. Ты сур'ёзная жанчына, кандыдат навук, а гаворыш лухту.

«Не, з ім нельга размаўляць. Нельга... Ці, можа, я сапраўды звар'яцела».

— Ты надаеш значэнне нейкім дробязям, якія няварты ўвагі. Жыццё — прасцей. Ты яго сама залішне ўскладняеш. Жыві прасцей. Рабі сваю справу. Расці сына. Глядзі мужа. Вось твае абавязкі...

Не, не гэтага яна хацела. Не толькі гэтага.

...Раніцай, за сняданнем, ён неяк дзіўна разглядваў яе, бы не пазнаваў. Потым шчыра прызнаўся:

— Не разумею я жанчын... Падначаленая ў мяне просіцца на тры дні. І абавязкова ёй — панядзелак, аўторак і серада. Гавару: работа тэрміновая, закончым, потым будзем гаварыць. Яна ў слёзы. Чаго плакаць? Не разумею, — паціснуў ён плячамі. І яго вымытыя, кранутыя сівізной валасы ўпалі на лоб.

— Яна замужам? — папытала Анюта.

— Не, дзяўчына.

— Можа, ёй аборт трэба зрабіць. Прызначаюць жа на пэўны дзень, — сказала яна спакойна, маўляў, звычайная справа.

Ён ускінуў на яе вочы, пазіраў доўга, не разумеючы, нават скасавурыўся, бы зірнуў на яе збоку.

— Прыйдзеш на работу, скажы ёй, што адпускаеш. Зразумеў? — параіла яна спакойна, адвяла позірк і, нібы не яму, дадала: — Не распытвай толькі.

— Добра, — пагадзіўся, як загіпнатызаваны, ён, яшчэ не разумеючы, што ж тут добрага, з чым ён пагаджаецца.

— Глядзі, не задавай дурных пытанняў. А то прыйдзеш і папытаеш: ці праўда, што мая жонка сказала?..

Ён папраўляе валасы, забіраючы іх з ілба.

— Не разумею я ўсё-такі... — паціскае плячамі.

— Тут і разумець нічога не трэба. Свет трымаецца не на тым, што мы выстаўляем напаказ, а на тым, што мы хаваем, на тым таемным і трымаецца свет.

Яны абое маўчалі, прыхлёбваючы каву.

— Дарэчы, — сказала яна. — Табе не трэба машына? У цябе ж ёсць службовая, калі што. Я паеду на пару дзён у Цішу... Трэба сякія-такія лічбы яшчэ.

Ён кіўнуў галавою. Зірнуў на гадзіннік, заспяшаўся.

— Прывітанне цешчы, — сказаў у парозе, чмокнуў Анюту ў шчаку.

Яна праводзіла яго позіркам. Вось так заўсёды ранічай ёй хацелася пабегчы за ім следам, абняць, сказаць: «Ты даруй мне ўчарашняе. Гэта нервы. Ну, разумееш, нешта такое... Ты пачакай. Я змагу! Я ўсё перайначу! Не сумнявайся. Усё будзе добра». Але толькі пазірала яму ўслед.

Мыла бялізну, гатавала ежу, прыбірала кватэру, а думкамі, душою была ні дома, ні там, у Цішы. Душа яе непрыкаяная, перапоўненая непазбыўным болем і тугою, як жабрачка, стаяла пад вокнамі Антонавага дома, чакала яго. Утрапёна пазірала ўздоўж дарогі, на скрыжаваннях, позіркам шукала яго машыну і сама яна, як вылічальная машына, прамільгам звярала памяць з нумарамі легкавікоў, не знаходзячы патрэбы. Трымцлівая душа шукала яго пагляду, і, як каштоўнасці, перабірала ў памяці яго ўсмешкі, выказванні і нават самыя нязначныя словы, надаючы ім значнасць.

Чаму вось так, асабліва ранкам, находзіў одум. Ад бяссоння разломвалася галава, нібы малаткі стукалі ў скроні і, слабая, стомленая, з тупым, шчымлівым болем у сэрцы, яна нібы ачыналася, апускалася на зямлю, падала, бы абвялая расліна, зазначала сабе — гэта хвароба, хвароба... Здавалася, адкрыешся каму — і ўсё пройдзе, як некалі расказала Мікалаю пра Анатоля. Яна таксама цяпер пасмейвалася над тым сваім каханнем, яно здавалася далёкім сцёртым святлом дня, сном. Забывалася... Але не-не ды і пасвечвала, як мігатлівая зорачка на цёмным хмарным небе, вабячы вока і думкі. І яна думала: цікава б цяпер сустрэцца. Яе натоленая плоць радзей і радзей трывожыла душу... Да той пары, пакуль не з'явіўся Антон, жывы яго двайнік... Нешта з ёю здарылася. Душа зноў была поўная хвалявання.

Апошнім часам яна не магла нічога рабіць, хворая галава не магла сабраць у адно рассыпаныя, як чарапкі разбітае пасудзіны, думкі. І ўся гарэла сухім, гарачым агнём, які выпальваў, здаецца, усё начыста. Не ведала, не магла ўзяць у толк, як выступіць на пасяджэнні наву-

ковага савета, там жа будзе *ён*. І адмовіцца нельга — яна ж апанент. І наогул, як будзе працаваць далей разам з ім, пад яго кіраўніцтвам. Праўда была Канстанціна Іванавіча, калі казаў: «Вам будзе цяжка, Ганна Цітаўна». Ён ведаў, разумеў. Можа, трэба было з ім пагадзіцца і пайсці выкладаць эканоміку.

Ідучы на работу, яна зазірнула ў паштовую скрынку. Пісьмо... Незнаёмы почырк.

Пісьмо чытала дарогаю. Яно было адтуль, з Цішы, ад былой аднакласніцы. Дзіўна, ніколі яны не перапісваліся. Блытанае, істэрычнае, нават літары хіліліся то ў адзін, то ў другі бок, словы развальваліся, крычалі, напісаныя буйна, таропка, нервова і заходзіліся ціхім плачам дробненькія, злепленыя густа-густа ў шчыльныя радкі ў канцы ліста, нібы тоўпіліся на краёчку прорвы: «Не, мне не табе трэба было пісаць. Гэта ўсё варта гумарыстычнага часопіса, якога-небудзь «Вожыка» ці «Кракодзіла». Можа, я напішу і туды. Калі да гэтага часу не звар'яцею. Я ўжо болей месяца плачу бесперастанку. Перастаю разумець і свет, і людзей. У нас пагаворваюць, што ты нешта ўсё распрацоўваеш, плануеш нейкае вялікае будаўніцтва. Скажы: калі гэта будзе? І ці будзе? Я пятнаццаць гадоў стаяла ў чарзе, каб атрымаць кватэру. І мне — не далі. Не, спачатку далі, а потым забралі, калі сталі скардзіцца іншыя. Цяпер мне чакаць яшчэ гадоў дванаццаць. Бо ў нас будуюць адзін дом у дзесяць—пятнаццаць гадоў. А наша начальства гаворыць: хай бы яго зусім не будавалі, колькі клопату. І дзеці мае папракаюць мяне, што я за столькі гадоў не зарабіла кватэру. Не, я яе не дачакаюся. А дачакаюся, то калі жыць, скажы, і навошта жыць?

Скажы мне, чаму забыліся на нас?»

## 4

Яна паехала надвячоркам. Сонца было нізкае і, здаецца, слала промні пад колы машыны. Дарога — шырокая, гладкая, з аднабаковым рухам, хоць Анюта ведала, гэта толькі дваццаць кіламетраў за горадам, далей дарогу толькі яшчэ вядуць, пачнуцца аб'езды і калдобіны, як на ўсякай будоўлі. Яна адкрыла ветравое шкло: адчувала, як струмень паветра халодзіць лоб, бы выветрывае думкі з галавы. І сапраўды, язда захапіла яе,

супакоіла. Здаецца, нічога не было: усё пакінула далёка, ззаду, а наперадзе — ціхі супакойлівы шэлест таполяў, прастора для вока, цяпло роднай хаты... Мама...

Маці заўсёды чакае. Адразу ўключае газ, пачынае пячы, парыць. Абавязкова прынясе нешта прыхаванае: то спелыя памідоркі, то грушы-фунтоўкі.

Анюта таксама ўзяла сяго-таго ў магазіне, на заднім сядзенні ляжалі пляшкі, пакецікі, скрутачкі...

Ехала і радавалася, што наперадзе цішыня, духмяны пах настурцый і мацыёлы. Яна, як заўсёды, сядзе вачарам на лаўцы ля хаты, а маці будзе расказваць і расказваць, як яна ўмее, пра кожную, здаецца, галінку на яблыні, пра кожнае каліва расады на градзе, кожны радок агуркоў, пра суседзяў, знаёмых... І ціха і спакойна стане на душы.

«Не мані сабе, не мар дарэмна. Ніколі яго і не было, спакою. Можа, толькі на колькі хвілін, пакуль адыходзіла ад стомы, ела яблыкі, дастаючы іх з дрэва. Забывалася і бегла да сяброўак. Але вельмі скора вярталася: іх не было. Асабліва шкада табе было Любкі. Недагаварылі, недашушукаліся, затаіўшыся, як мышы, пад цёплай коўдрай у дажджлівы дзень. Яна ж адна ведала тваю тайну пра Анатоля. Сама ж і пазнаёміла. Але...

Гэтага аб'езду раней не было. Няўжо дамовіліся два раёны, каму рамантаваць гэтую нічыйную паласу?»

Пакуль трэслася на калдобінах на аб'ездзе, думала толькі пра дарогу, выварочвала машыну, паціху вяла па броўцы, баючыся абсунуцца ў кювет, а выскачыла на шашу — дала газу. Да дома заставаліся лічаныя кіламетры.

«Лічаныя кіламетры... Гэта ж так было блізка. Можна было, едучы на канікулы або свята, ды і потым — проста на выхадныя часта ездзіла, — спыніць аўтобус, выйсці і зайсці ў той дом, папытаць пра *яго*, Анатоля. Якая неразумная была... Спадзявалася — будзе шукаць. Шукаць... Якім рамантызмам была забіта галава. Цяперашняя моладзь не такая. Хоць бы Гэлечка. Як лоўка падбіраецца яна да Антона. Глупства. Пра што я? Не хапала раўнаваць чужога мужа...»

За шклом шыза слаліся палі, мільгануў пералесак, які нібы захінаў ад ветру з поля некалькі хат, што стаялі асобна, бязладна; потым вуліца выпрасталася ўздоўж шашы. Тады яна не ведала адраса, наогул не арыентавалася: цёмная, вясковая дзяўчынка. Хата была новая,

крайняя. Цяпер вуліца падоўжала, выцягнулася. Анюта міжволі кідала хуткія позіркі на хаты ля дарогі. Варта было зайсці і папытаць. Хто ведае, можа, усё ў жыцці было б іначай. Дурны характар. Цяпер? Навошта цяпер? Хіба толькі з чыстай цікавасці.

Міжволі з'ехала на броўку. Спыніла машыну. Сядзела і пазірала на невялікую хату з пафарбаванымі ў блакітны колер аканіцамі. За плотам густа сплёў галіны сад.

У прасторным двары жанчына падварушвала сена: можа, чалавек нанасіў вязкамі травы, ухапіўшы дзе ў лажку ля дарогі. Машына, што спынілася на броўцы дарогі, насупраць двара, яўна яе зацікавіла: можа, яна некага чакала, ажно прыставіла далонь казырком да лба, закрываючы вочы ад сонца, угледзелася. Анюта, нібы загіпнатызаваў яе ўважліва-прыветны позірк, пайшла насустрач, яшчэ не ведаючы, што скажа: можа, папрасіць напіцца, хоць пляшкі з сітром ляжаць на заднім сядзенні ў машыне, ці папытае дарогу... дарогу да Белай Лужы, якая, ведае, кіламетраў праз пяць за паваротка́й.

«Гэта яна, Варвара», — надзіва моцна ўвайшло ў памяць імя.

Але твар жанчыны нічога ёй не падказаў, хіба толькі дробныя рабацінкі, што расплыліся ў карычневыя плямкі. І чаму яна так уразілася, ажно рот адкрыла? Можа, здалося недарэчным пытанне пра Белую Лужу? На дапамогу прыйшоў мужык, ён таксама быў блізка. Пакуль тлумачыў, жанчына не зводзіла з Анюты вачэй. Можа, пазнала? Але Анюце меней усяго хацелася гэтага, і яна, ветліва кіўнуўшы, пайшла да машыны. За спінаю пачула ўтрапёны голас жанчыны:

— Павел, мусіць, цётка Марыя памерла. Бачыш, як гэта жанчына на яе падобна. А-ёй, як вылітая. Гэта знак...

— Яшчэ не ноч, каб здані з'ўляліся, — пажартаваў той, але асаблівай весялосці ў голасе не было.

— Ідзі, на фотакартку зірні. Я ж помню яе, маладую, — даводзіла яна. — Точна знак падала.

Анюта не азірнулася, хоць ведала: яны чакаюць, глядзяць услед. Ёй стала прыкра, быццам сапраўды прынесла людзям нядобрую, нават жахлівую вестку.

«І добра, што яны мяне не пазналі і я не стала тлумачыць хто і адкуль. Цікава, а што б сказала? Памя-

таецe, начавала ў вас... Харошанькая гісторыя... брат прывёў незнаёмую дзеўчыну, а сястрыца паслала пасцель... А цяпер, калі ласка, гэта я, тая самая. Чаго ж цяпер хочаш? Дурны не здагадаецца, разумны не скажа. Добра, што яна не пазнала, можа, і сама памылілася, падышла не да таго двара».

Не, такі яна тут была. Вярталася з практыкі. Купіць білет зараней не здагадалася, а сунулася да касы ў той дзень — прададзены. Тут, у людскім мурашніку вакзала, яны і сустрэліся. Сталі шукаць якую спадарожную машыну. Анатоль дамовіўся з шафёрам нейкага парэпанага брызентавага «казла». Газік тузаўся і чхаў усю дарогу. Шафёр то выскакваў і доўга корпаўся ў маторы пад капотам, то «хрысціў» гэтага чортавага «казла» на чым свет стаіць, круцячы абаранак. Потым абвясціў, што далей не паедзе.

Анюта разгубілася: па-першае, дарогі яна не ведала, хоць і адчувала, што Ціша не блізка, па-другое, апошнюю пяцёрку аддала шафёру, не спаганяць жа рэшту.

Анатоля гэта ніколечкі не збянтэжыла, нібы ён прыехаў дадому. Яна нават западозрыла: ведаў, так і дамаўляўся. А ён узяў яе і сваю сумкі і сказаў: «Пакуль будзем ісці, машына якая-небудзь дагоніць».

Ёй засталося адно: трымацца яго.

Дарога праставала лесам. Расступаліся, гарэлі медзяю на сонцы гонкія сосны, дзе-нідзе пахмурна, як цёмныя здані, стаялі яліны.

Анюта з Анатолем, памалу ладзячы гаворку, крочылі лёгка. Сустрэчныя машыны абдавалі іх воблакамі пылу, і змусілі збочыць на сцежку ўскрай дарогі. Непрыкметна з-за кустоў вербалозу выслізнула вузкая, празрыстая рачулка, перарэзала дарогу. Яны, не згаворваючыся, сышлі ля мастка на бераг.

Анюта зняла басаножкі, адчула босымі ступакамі мяккую, прахалодную пяшчоту травы і села.

Анатоль паваліўся на мураву, раскінуў рукі і нават заплюснуўся.

Маўчала і дарога, стаіў дыханне лес, тонка, амаль улоўна, як крышталь, звінела сіняя далячынь.

Анатоль сеў бліжэй да Анюты.

«Паглядзі, як хараша», — сказаў ёй.

Шырокае поле за рачулкаю разаслалася, нібы абрус,

на якім, як боханы духмянага хлеба, жаўцелі сцірты саломы. Гэты стол абступілі лясы.

«Не, табе гэтага не зразумець, — прамовіў сумна, — ты заўсёды гэта бачыш, а ў Данбасе — стэп...»

Анюта паглядзела ўважліва, нібы пыталася: «Хто ты, чый ты, і чаму мы сядзім з табою ўдваіх каля гэтай дарогі?»

«Вось думаў, у інстытут паступлю, — нібы адказаў на яе маўклівае пытанне, — а зараз — зноў на шахты...»

Твар яго засмуціўся, але ненадоўга.

«Скупнёмся», — прапанаваў ён і стаў распранацца.

Скокнуўшы ў ваду, ціха войкнуў, відаць, вада пеканула холадам. У такіх рачулках яна заўсёды ледзяная, а зімою рэдка спыняецца. Анюта засмяялася. Яна сядзела на беразе, спусціўшы ў ваду ногі. Вада была крыштальна чыстая, рачулка прасвечвалася да дна. Яна дробна вірыла, перамывала каменьчыкі, па-свойму бубніла. Анатоль з асалодаю дурэў, як малы, боўтаўся, поўзаў па дне, ускаламуціўшы ваду. Яна ж сядзела на беразе і смяялася. Ён выйшаў на бераг. І яна ўпершыню заўважыла, якім прыгожым можа быць чалавечае цела, і ажно здзівілася свайму адкрыццю. Не адхінулася, калі абняў яе, прыгарнуў да грудзей. Пачула, як тахкае сэрца. Губы яго, гарачыя, прагныя, знайшлі яе, моцна сцятыя. Закружылася, захмялела галава, і вусны раскрыліся, бы расцвітала кветка, і яна не адымала іх. Анатоль адхінуўся, засмяяўся шчасліва, схапіў яе на рукі, як дзіця, закружыўся на беразе. Яна ж абвіла рукамі яго шыю, баючыся, што разам зваляцца ў ваду. Вырвалася, паправіла разбэрсаныя валасы.

Яны яшчэ доўга сядзелі блізка-блізка. І Анюта забылася на дом, які немаведама дзе, пазнікалі ўсе трывогі, стала хараша і шчасліва. Але раптам яна заўважыла, што сонца ўвачавідкі коціцца за лес, і занепакоілася.

«Бачыш вунь тую вёску за полем? Там жыве мая сястра, дваюрадная. У яе пераначуем», — супакойваў яе Анатоль.

Варвара, сястра Анатоля, падалася Анюце ветлівай і простай. Нетаропкая, крыху сарамлівая. Круглы твар яе раптам ружавеў, калі яна гаварыла, ад чаго ярчэй выбіваліся рассыпаныя ля пераносся радзімкі, бы каліўцы маку. Размаўляючы з Анатолем, зрэдку кідала позірк на Анюту, але ў вачах не было ні асуджэння, ні спрадвечнай жаночай цікаўнасці, а ветлівая цеплыня.

Варвара распытвала ў Анатоля, як ён жыве там, у Данбасе. Задавала такія пытанні, што і ёй, Анюце, было цікава пачуць адказ. Яна ж амаль нічога не ведала пра яго, да гэтага адзін раз толькі і бачыліся. З Анютаю Варвара паводзіла сябе далікатна (ёсць такая рыса ў простых вясковых кабет), нічога не пыталася, толькі, калі хвалілася дзецьмі, што спалі за паркалёвай у ружы шырмай, шэптам пацікавілася ў Анатоля:

«Мо жонку сабе вязеш?»

Анатоляў адказ Анюта не пачула. Можа, адказаў ёй толькі кіўком галавы.

«Дык харошая», — прашаптала Варвара. У голасе былі радасць і захапленне.

Неўзабаве прыйшоў гаспадар: яго крокі пачуліся за акном, але ў хату не заходзіў, нешта яшчэ рупіўся ў двары.

«От, і ночы яму няма», — быццам незадаволена, але з цеплынёю, спакойна сказала Варвара. Паклікала ў хату.

«Павел, ці пазнаеш ты, хто да нас прыйшоў?»

Павел спыніўся ў парозе, зняў кепку. Высокі, худаваты, па-вясковаму крыху неахайны, ён, здавалася, быў прамою процілегласцю жонцы, але позірк меў таксама спакойна-гасцінны.

«Дык гэта ж Толік, той, што ў Данбасе, дзядзькі Цімоха сын», — пайшла на выручку мужу Варвара. Павел заўсміхаўся, падаў руку, потым запытальна-трывожна глянуў на Варвару. Яна зразумела яго позірк, супакоіла:

«То ён у нас застанецца яшчэ і заўтра. Магазін адчыніцца ці ў каго пазычым».

Анюце і Анатолю гаспадыня прынесла па кубку сырадою.

Павел падрабязна расказваў, як будавалі хату. Відаць, гэтыя ўспаміны былі вельмі прыемныя, хвалявалі яго. Вельмі ўжо ўдзячліва гаварыў пра бацьку Анатоля, які памог з лесам. Распытваў пра Данбас, выслухаў і заключыў:

«А на гібель ён табе здаўся? Што, у твайго бацькі лесу не будзе на хату, га? Заставайся тут. Гэта ж мода пайшла, — сказаў Павел, памаўчаўшы, — як школу скончаць, дык ад дому далей, быццам тут і рабіць няма чаго і вучыцца няма чаму, — разважаў ён. — Потым прыедзе каторы, ходзіць па вёсцы панам. Не, я пра цябе не гава-

ру. Можа, ён там гэта самае на лапаце носіць, а во ў адпачынак прыбраўся і... — недагаварыўшы, махнуў рукою. — Трэба трымацца бацькаўшчыны», — заключыў, паляпаўшы Анатоля па плячы.

Той нічога не адказаў, але крыху замаркоціўся, відаць, раздвойвалася яго душа, балюча і шчымліва, і сум быў у вачах.

Заседзеліся позна. За вокнамі стала цёмна. Празрысты, бы падталая льдзінка, месяц плыў па небе, заглядаючы ў акно. У Анюты зліпаліся вочы, яшчэ крыху — і яна засне пад іх нетаропкую, спакойную, бы шапаценне лістоты, гаворку. Гаспадыня заўважыла гэта. Яна спахапілася: трэба паслаць ложак. Скора паклікала Анюту за шырму.

«Лажыцеся, — сказала ветліва. — Адпачывайце».

Ачмурэлая ад дрымоты, Анюта хуценька сцягнула сукенку, акуратна павесіла яе на спінку нікеліраванага ложка, каб за ноч адвіселася, калі дзе прымята, і лягла.

Цёмная цішыня агарнула хату, толькі чуваць было, як у сне пасапвалі дзеці, і Анюта імгненна як бы правалілася ў бездань. Колькі яна спала — не ведае. Раптам адчула, як чыесьці моцныя рукі абхапілі яе, гарачыя, адкрытыя вусны апяклі шчокі, губы. Здавалася, вось-вось яна задыхнецца. Спачатку не магла зразумець: ці не сон гэта, але, сабраўшы ўсю сілу, вырвалася, спалохана ўсхапіўшыся на ложку, падалася да сцяны, прыціснулася да яе, шорсткай і калючай, яшчэ не тынкаванай.

«Ты чаго? — дрыготкім здзіўленым шэптам спыталася яна. — А дзе ж усе?»

Яна шукала паратунку ў іх, а ён, відаць, зразумеўшы па-свойму, супакоіў яе:

«Не бойся. Яны ў сенцах. Там ложак ёсць...»

Ён памкнуўся да яе, паспрабаваў прыгарнуць, але яна адштурхнула яго рукі.

«Выбірайся адгэтуль, — цвёрда прашаптала яна, — выбірайся зараз жа».

Сэрца тыхкала, як у загнанай казулі, і пэўна такім жа дзікім бляскам гарэлі вочы, але ў хаце панавала ноч. За ненапятай фіранкай высока на белым воблачку чэзнуў месяц, ледзь сеючы рэдзенькае святло.

«Ты ж мая, мая!.. Ідзі сюды!» — палка зашаптаў ён.

Рука яго дакранулася да яе пляча, лашчачы, спусцілася да локця.

«Ты не пасмееш! — дрыготка, амаль уголас сказала яна. — Не пасмееш!..

Яна гатова была закрычаць, бо не ведала, каго болей баяцца: сябе, што не вытрымае і вось-вось працягне да яго руку, каб дакрануцца да мяккага аксаміту скуры, ці гэтага, што так тлуміў галаву, шэпту і гэтых слоў, якія хацелася чуць зноў і зноў:

«Любая мая, харошая...»

«Не, не, не... — паўтарала Анюта. — Я прашу цябе, адыдзі, ідзі адгэтуль!»

Яна зашылася ў куток на ложку і закрыла рукамі твар, баронячыся ад пацалункаў, што асыпалі яе мокрыя ад слёз рукі.

Нечакана заварочалася ў люльцы, зачмокала губамі дзіця. Невядома, што рабіла ў такіх выпадках маці, перапавівала яго ці проста пакалыхвала. Анатоль прыціх, чакаў, пакуль яно супакоіцца, і Анюта тым часам нацягнула сукенку.

Малое, пакрактаўшы, падало голас, заплакала пакрыўджана і капрызна.

Анатоль сеў на край ложка. Ён пакалыхваў люльку, але дзіця не сунімалася. Тады ён замармытаў закрытым ротам нейкую песню: а-га-га, га-га-га, а-а-а.. Дзіця доўга не засынала і, як толькі ён пераставаў пакалыхваць і спяваць, настойліва і капрызліва падавала голас. І Анатоль скараўся яму.

Канчалася кароткая летняя ноч. Бралася на золак. Па краі неба пралягла блакітна-шэрая паласа, ніз якой пачынаў пацiху ружавець.

Анюта сцішылася і прылегла. Анатоль жа ўсё пакалыхваў люльку. Часам яму здавалася, што малое спіць, і ён заціхаў, але капрызлівы голас не даваў адысці. І ён калыхаў малое, пакуль не пачулася роўнае, цёплае пасопванне — яно спала.

Анатоль на дыбачках прайшоў да дзвярэй, дзе стаялі яго чаравікі, узаткнуў іх на босыя ногі і выйшаў з хаты. Не вяртаўся ён доўга, а можа, так хутка прабівалася святло і ружавеў усход. Вярнуўшыся, ён не падышоў да Анюты, толькі штосьці кінуў ёй на ложак. Гэта былі яблыкі. Анюта намацала іх рукою, вялікія, па добрым кулаку, крамяныя і чыстыя, відно, з маладых яблынь, халаднавата-вільготныя ад расы. Анатоль сў іх, смачна

пахрумстваючы. Анюта ж паспытаць не адважылася: яна рабіла выгляд, што спіць.

Драмала яна ці не, але раптам адкрыла вочы ад яркага святла: у вокны скоса зазірала сонца, чамусьці здалося, што ўстае яно не з таго боку.

Паціхеньку, бы кошка, прайшла глянуць на дзяцей гаспадыня. Накінула коўдру на Анатоля, які спаў, скурчыўшыся, як малы, на голай канапе.

Раніца была нетаропкая, расяная і сонечная. Анатоль і Анюта выйшлі да шашы, яшчэ маўклівай і, здавалася, вільготна-шэрай ад начной волкасці.

Селі на лаўку пад сукаватай хваінай. Было ўражанне, што яны не спяшаюцца, бо наперадзе вялікі летні дзень, апяты блакітным небам, што абяцала сонца і цяпло. Яны сядзелі моўчкі, толькі скоса, употай назіралі адно за другім. Гэта бяссонная ноч замест таго каб зблізіць іх, аддаліла, кінула паміж імі невідочны цень. І чым даўжэй было маўчанне, тым болей разрастаўся гэты цень, рабіўся гусцейшы. Ва ўсякім разе, так здавалася Анюце. Яна глядзела на Анатоля новымі вачыма, хацела разгледзець у ім штосьці важнае для сябе, разгадаць. Хацелася ведаць, што ён думае, седзячы з ёю пад гэтай скарэжанай хваінаю, і, можа, нецярпліва чакаючы машыну, каб назаўжды разысціся і, відаць, лічыць, што гэта сустрэча — проста недарэчны выпадак. Анюта і сама не ведала, што з ёю. Уся яе істота раздвойвалася: то імкнулася хутчэй дадому, то хацела застацца, ловячы хвіліны, маліць, каб не спяшаліся ці не спыняліся машыны. Яна чакала чагосьці галоўнага, важнага. Ёй хацелася зразумець, што гэта між імі? Калі гэта любоў, то чаму яна такая вераломная, нібы віхура, паспешная, як полымя?

Анатоль таксама быў засяроджаны і ўражаны, бы спутаны конь. Ён гэта адчуў яшчэ ўранку, калі Варвара падавала на стол снеданне, яе позірк нібы суцяшаў, падбадзёрваў яго. Па-іншаму, з большай цікавасцю гаспадыня пазірала на Анюту, нібы хацела нешта адгадаць у ёй.

Павел адкаркоўваў бутэльку віна, відаць, раненька пазычыў у запаслівага суседа. Выпілі «за ўсё харошае», моўчкі елі. Гаворка не клеілася, так — пра надвор'е, пра гуркі, што няшчадна склёўваюць куры. Потым Варвара папытала ў Анатоля, называючы яго чамусьці даў-

нім дзіцячым іменем, быццам падладжвалася, баялася, што не прызнаецца:

«Толік, ці не ты гэта сарваў яблыкі з тае, маладзенькае, што ля варыўні? — і, не чакаючы адказу, дадала: — Мы думалі, што да спаса давісяць».

Анатоль маўчаў, толькі ўсміхаўся ды мяккім позіркам каяўся, як прасіў літасці.

«Ці смачныя ж?» — запыталася яна.

Анатоль сумеўся. Ён спрабаваў прыгадаць і, відаць, не мог.

«Даліся табе гэтыя яблыкі. Кажу табе, што смачныя, — супакоіў яе Павел, — дзядзька Пятро маніць не будзе. У яго ўсе яблыні добрых гатункаў».

...Шаша памалу ажывала. Цугам праскочылі фурманкі. Задумлівыя, відаць, яшчэ сонныя падлеткі хрыплавата падбадзёрвалі коней: пэўна, ехалі звозіць салому. На броўцы дарогі ўважліва і дзелавіта перабіралі пацяруху куры. Некалькі чалавек сноўдалася ў чаканні аўтобуса, які вось-вось павінен быў падысці.

Анатоль узяў у далоні Анюціну руку, пацалаваў.

«Даруй, я не ведаў, што ты такая...» — прашаптаў ён, хаваючы твар у кіпень яе валасоў на плячы. На момант яна задыхнулася, загарэлася, нібы ўскіпела нутро, і ўтрапёна адхіснулася.

«Якая?»

«Харошая, мілая, строгая... Едзем зараз жа да маіх бацькоў! — прасіў ён. — Стань маёю назаўжды... Малю цябе!»

Анюта як праз сон бачыла, што крануўся аўтобус, прыпыніўшыся на нейкую хвіліну. Таропка патрусіла за ім старэнькая бабка з кійком, дарэмна намагаючыся дагнаць.

«Хутчэй дадому, хутчэй...» — думала Анюта, як аб паратунку. Бо і хацелася даць згоду і боязна было. Падумала, што штосьці не так робіцца, маланкава, паспешліва. Зусім не так, як думалася, марылася.

Анюта памкнулася да шашы. Насустрач ішлі машыны, гружаныя збожжам. Заўважыўшы знаёмы твар цішанскага чалавека, яна падняла руку.

«Збожжа вязём», — прыпыніўшы машыну, сказаў ён, відаць, таксама пазнаўшы яе.

«Вазьміце мяне, як будзеце вяртацца. Я буду тут чакаць».

Шафёр кіўнуў галавою ў знак згоды і даў газу.

«Я хачу дадому», — сказала Анюта. Анатоль глядзеў на яе доўгім, сумным позіркам, нібы развітваўся і не мог развітацца. Раптам ён хутка пайшоў па броўцы насустрач машынам, быццам тут жа хацеў выканаць яе жаданне.

Ён галасаваў газікам, легкавушкам, але яны прабягалі міма, толькі, скрыгнуўшы тармазамі, спынілася таксі. Анатоль падбег, пагаварыў з шафёрам, адлічыў яму грошай і, праводзячы Анюту да машыны, прагна абсыпаў яе твар пацалункамі.

«Я буду шукаць цябе», — горача сказаў ён. Твар яго быў сур'ёзны, здалося Анюце, патухлі вочы. Хацелася зараз жа вярнуцца, кінуцца да яго, але машына рванулася. Пра тое, што не ведае яго прозвішча, не падумала. Гэта яе не турбавала.

...Усё гэта ўспомнілася Анюце цяпер так яскрава, што нават уразіла. У думках пакпіла з сябе: «Дурніца, наіўная дурніца. Чакала, верыла, што яе сапраўды ён шукае. Рамантычная асоба. І цяпер, хоць гэта і смешна, на сённяшні розум, раптам заные сэрца, зойдзецца, быццам нехта мяне шукае. Вар'ятка я. Ну, канечне, вар'ятка — гавару сама з сабою. А ўспомні, як убачыла ты Антона, бегла за ім, ледзь пад машыну не трапіла. Так, ён падобны на Анатоля. Нават падумала — ён...»

## 5

Цімох сышоў з бальнічнага цэментавага ганка. Пад ногі, як лісце з дрэва, сыпануліся вераб'і. Нейкія дробненькія, рудзенькія, як падсмаленыя. Ступаючы з асцярогай, падумаў нават: «Каб каторага не прыдушыць ботам. Бач ты, не баяцца, блазнота, лезуць пад ногі». Потым даўмеўся, што гэта ж хворыя іх прывучылі: булкі крышаць, семкі сыплюць, кашу грудкамі носяць. Вунь, падгалісты і пруткі, ускочыў на біла лаўкі і, шырока разяўляючы жоўценькую ўсярэдзіне дзюбу, моцна і сварліва ціўкае. Яшчэ некалькі ўзляцела да яго, і крычалі ўжо разам, наперабой.

— А халера на вас, папрывыкалі. Усіх гультаёў не пeракорміш, — сказаў ён грубавата, але яго замілавалі гэтыя падарэйкі. «Халера на яго, і канаплюк, пры чалавеку жывучы, згультаіўся, чарвяка не знойдзе, камара не дагоніць». Пакорпаўся ў сумцы: Марыя так нічога і

не захацела браць, і ўчарашняе і заўчарашняе ў сумку папхала. Ён дастаў кавалак сыру, які зверху пакрыўся плёнкай жаўцізны. Расцёр у руках. Сыр крышыўся добра, рассыпаўся ў руцэ, нібы грануляваны. «Кісляк у печы перастоеў, запёкся», — падумаў ён, крышачы сыр на асфальт. А канапляннікі загаманілі, закрычалі, гатовыя біцца, крыламі пыл узнялі, пырхалі, падляталі то з аднаго боку, то з другога, хапалі адзін у аднаго як не з дзюбы. А гэты во, хітры, хапіў вялікі кавалак і адлядзеўся, азірліва дзяўбе, дзяўбе, аж прысядае, хвастом у асфальт упінаецца.

Цімох падняў вочы, са спадзяваннем зірнуў яшчэ на бальнічныя дзверы: Але Марыя за ім не выйшла. Раней, праводзячы яго да весніц, што-небудзь ды і накажа: то рабеньку курку пад цэбар пасадзіць — пастрашыць, каб не закватала, то ў картапляніку ці на вышках паклады пашукаць, свіней разгарадзіць, каб паасобку карміць, карове вазелінам саскі змазаць. А цяпер во... Не ўстае, пра гаспадарку нават не ўспамінае, як і няма нічога. І дадому, як раней, не просіцца.

Ён і сам насілу прышкробся. Зноў сярэдзіну стала адбіраць. Мо застыў дзе ці ад гэтай, халера, работы, што ўвесь дзень топчашся, топчашся... А бывала, досвіткам у лес сыдзеш і вернешся дадому толькі ўпоцемках. Свет, здаецца, абходзіш, і хоць бы што, а гэта во ногі не ідуць. Маладзейшы быў, рухавейшы. А можа, каб не гэта, халера, сярэдзіна. Гэта аднаго разу лясіну ўскідваў на калёсы. І лёгка, здаецца, узяў, а выпрастацца, хоць крыкам крычы, нельга. Так і прыйшоў дадому, сагнуты ў тры пагібелі. Не скора распрастаўся і не зусім, у хрыбетнік бы клін забіты, і тая лясіна ўніз усё цягне.

Да адыходу аўтобуса яшчэ дзве гадзіны. Можна было ля Марыі пасядзець: словам-другім перакінуцца, але яна выправіла: ідзі ты, ідзі. Можа, да Жоржыка зойдзеш, адведаеш. Гэта каб тутака, у Цішы жыўшы, ды мацеру ў бальніцы не адведаць, сорам людзям у вочы глядзець. Хацеў сказаць ёй: «Чаго ён да цябе пойдзе, хіба ты яму мензурку, як ён гаворыць, нальеш? Ён цяперака толькі гэтай мензуркі і пільнуецца».

Вось і не ішлі туды Цімохавы ногі. І трэба б, канечне, зайсці, а ногі не ідуць. Ды і дадому добра б раней дастацца. Там ужо свінні хляўчук варочаюць. Выгаладаліся, халера на іх. Можа, яшчэ падысці ў нарыхтоўчую кантору, такі ж неяк трэба здаць аднаго. Халера

на іх, к дому як прывязаны з імі. І ўсё топчашся, топчашся, як той таўкач у ступе. А дзеля чаго?

І ўсё-такі — ідуць ногі ці не ідуць — трэба да Жоржа схадзіць. Непрыемна скаланула думка, што зноў нявестка будзе жаліцца. Ды каб жа жаліцца, а то сварыцца ўскідаецца, што Жорж п'е. Дак што ён, Цімох, яму зробіць? Каб ведаў, дзе той кран, перакрыў бы, як у водаправодзе ваду. Папікае, што грошы, маўляў, вы яму даяце. А як ты не дасі, калі прыстане як смала. Гэта да мацеры, то тая яму тройку-пяцёрку, хоць ім, праўда, ліку ўжо няма. А на ім, Цімоху, не вельмі паедзеш. Дзе сядзеш, там злезеш.

Цімох разагнаў ботамі вераб'ёў — яны адскоквалі, пырхалі, выйшаў на асфальтаваную дарогу паўз драцяную агароджу бальнічнага гарадка, пайшоў да станцыі, якую ніяк не мінеш, як ідзеш з бальніцы. Потым падаўся ў вуліцу, што, як рукаво, адкінулася ад станцыі на мікраараён, да Жоржа. Вуліца тут была зусім як вясковая. Цімох, ідучы, з цікавасцю зазіраў праз частакол у агароды: у людзей усё хораша дагледжана, выпалана, але нейкае ўсё здрабнелае, не буйнае, і гурочнік вунь рэдзенька папоўз, а трэба, каб усё тут звілося, граду, як дыванам, накрыла. І бурачнік не лапавухі, а лісце як завостранае. Раней і тут, здаецца, усё было інакш: гурочнік аж на платы лез. Вось што значыць гной. Раней, як кароў трымалі ў гаспадарцы (гэта ўжо ў канцы шасцідзесятых гадоў звялі), а як кароў трымалі, і гной быў, дак і картопля, і гурок радзілі. А гэта во... Хіба будзе тут картопля, калі цавіна, як нітка? Зямлі трэба гной... А чалавеку? Што чалавеку трэба? Што трэба сыну яго Жоржу? Што трэба яму, Цімоху? Што трэба жонцы яго, Марыі?

Успомніў пра Марыю, як наяве ўбачыў яе сумны, апалы твар, нават губы патанелі і пакарацелі. Мусіць, нічога ўжо ёй не трэба, нічога. Вось так чалавек жыве, і ўсё яму, здаецца, трэба, а прыйдзе час, на ўсё забудзе, усё кіне. Нічога на той свет з сабою не возьмеш. І Марыя нічога не пытае — ні пра гаспадарку, ні пра грошы.

Цімох адчуў, як балюча і нудліва зашчымела ў грудзях і так няміла ўсё стала. І гэты мікраараён. Ён яго і раней недалюбліваў. Дамы якія моцныя, з бетону пабудаваныя, а стаяць, як дачасныя, і людзі тут жывуць бы часова — нічога ім не трэба, бы заўтра паміраць. Дак і памірае чалавек, а нешта хоча пакінуць для іншых. А

гэта хоць бы хто якое дрэўца ўваткнуў, не гаворачы ўжо пасадзіў, а хоць ямку выкапаў ды торкнуў якую вярбіну ці таполіну. Таполя — дрэва жывучае: пасядзіць, пасядзіць ды і возьмецца расці, за зямлю чапляцца. Нашто ён у лесе, лічы, жыве, а ля двара клён шуміць. Разгалісты, кучаравы, як стог. Успомніў, што пасадзіў яго Жоржык, як малы быў. Пацяплеў душой да сына, падумалася: не-такі ён ужо і безнадзейны чалавек. Дурыцца толькі. Ды ці ён адзін. Вунь зямлі кругом колькі, а ўзяў бы каторы ды градку ўскапаў, хоць бурак які вырас. Тут жа некалі былі людскія агароды, зямля павінна быць урадлівая. От дачасныя гарадскія, халера на вас! Але ж у кожнага матацыкл ці машына — вунь хлеўчукоў рад панаставілі, засовы ды замкі на дзверы пачаплялі, што гіры вісяць, — дык сядзе каторы ды да мацеры ў сяло, нагрузіцца, набярэцца. Так у горадзе, халера на іх, добра жыць. І грошы ёсць, і сальца сваё. Ідзі параўнайся з ім каторы, хто тое сальца па дзвесце грамаў у магазіне бярэ. Параўнайся. І Жоржык, як прыедзе, то з пустымі рукамі з дому не выпраўляецца. Усё яечкі бярэ. Кажа, іх пасля чаркі глытнуў — закусі ніякай не трэба. Гэта так укінуцца ў гэту заразу! Прыедзе, бывае, дак сяло аббегае, як ганчак, шукае, дзе «самагнёту» купіць. І бацьку ўсё падбівае: давай ціскані ў лесе заторчык-два. Халера з тымі заторчыкамі, каб гэта на дакопкі ды пасяўную не трэба было.

Цімох, аддыхваючыся, ледзьве ўскараскаўся на трэці паверх па цяжкой лесвіцы, націснуў на чорны гузік на вушаку шэрых, пад колер лесвіцы дзвярэй... Раз, другі... Пастаяў, пачакаў, паазіраўся. Яшчэ як ішоў, заўважыў, што многія дзверы паабівалі цыратай, пафарбавалі, а ў Жоржыка — так шэрыя, што зямля, і засталіся, і замок у дзвярах раскалупаны, ледзь ліпіць, мусіць, не раз выламаны ды ўстаўлены. Ніхто Цімоху не адчыніў, не чуваць было нікога за гэтымі хліпкімі дзвярыма. І Цімох не прызнаўся сабе, але абрадаваўся. Падумаў, што Жорж, можа, дзе на рыбалцы ці, як ён гаворыць, на грыбалцы (гэта, калі выпіваць пад грыбы, грыбамі закусваць). Нядобра, канечне, так думаць пра сына, але разважыў, нібы супакойваючы Марыю: нічога з ім не станецца, хіба п'яны на матацыкле галаву скруціць, то пачуем. Ужо ж раз улятаў у аварыю, адляжаўся і зноў гарцуе. «Вот бяда, што не працуе нідзе, правы забралі на год, з машыны за гэту п'янку скінулі, дык ён і рады.

Нікуды не ўладкоўваецца, чакае. Чаго чакаць, халера на цябе?» — у думках ушчуваў ён сына, сыходзячы па прыступках зверху ўніз.

Парашыў: халера яго бяры, аўтобус. Не перціся ж назад, калі блізка тут шаша: машыны ідуць цугам, мо хто знаёмы ці незнаёмы падкіне. А не, то і аўтобуса там дачакаецца, сядзе на лаўку пад кантораю льнозавода, а то і на зямлі пасядзіць.

Але, калі датупаў да таго льнозавода, садзіцца не стаў, а, спыніўшыся на броўцы, ускідваў руку, галасуючы, машынам. Свет не без добрых людзей: спыніўся хлопец з Беліцы.

— Дзядзька Цімох, я — да повараткі! — націснуўшы на тармазы, пракрычаў ён.

Цімох згодна кіўнуў і падаўся хутчэй да дзверцаў кабіны.

— Машыны, халера, высокія сталі ці я стаптаўся, па лесе ходзячы, — пажартаваў ён, умошчваючыся ў нажаранай, як печ, кабіне.

І сапраўды, Цімох не толькі стаптаўся за жыццё. Паглыбелі зморшчыны на лобе, і ён як бы аб'ехаў, павузеў. Валасы, яшчэ густыя і чорныя, спаўзлі ледзь не да броваў, таксама яшчэ густых, але рудаватых, нібы спаленых.

— То чаго толькі да повараткі? — папытаў, сеўшы.

— Я ж у шостую брыгаду важу ўдабрэнне.

— А-а-а, — паківаў галавою Цімох.

Хлопец маўчаў, сачыў за дарогаю, маўчаў і ён. Дарога была тут не лёгкая. Мусіць, збіраліся класці асфальт, таму падсыпалі гравійку, але яшчэ не разраўнялі. Не ўсочыш, не аб'едзеш грэбень, то і кульнуцца можна.

Злез ён ля повараткі, якраз насупраць Лаўрэна. Лаўрэнаў дом стаяў наводшыбе, як і належала жытлу дарожнага майстра. Праўда, Лаўрэн ужо гадоў колькі як не працаваў. А новы дарожнік жыве ў райцэнтры, у Цішы. На матацыкле дарогу раз у дзень аб'язджае. Што ж, начальнік...

Лаўрэн з малым на руках сядзеў на лаўцы. Убачыў Цімоха, прыўстаў, абедзвюма рукамі трымаючы малое на прыгнутых каленях.

— Братачка, ты? — глуха, даўно прастуджаным голасам, але радасна, клікнуў ён Цімоха і зноў сеў ямчэй, на калена, як на лаўку, апусціўшы малое. — Хадзі сюды, прысядзь.

Лаўрэн усміхнуўся, і ў той усмешцы шырокі яго нос раз'ехаўся, нібы буданок над рыжым параснікам закураных вусоў. На галаве, дзе, бывала, ганарліва сядзела фуражка дарожнага майстра, цяпер варушыўся — аднекуль узяўся тут у гале ветрык — рудзенькі рэдзенькі пушок, як у ашчыпанай птушкі. Твар жа яго быў васпаваты і бугрысты, як гравійка.

Цімох падышоў, працягнуў руку. Але пакуль Лаўрэн падаў сваю, за вузлаваты Цімохаў палец ашчаперылася, як птушаня за сук, малое. Цімох адчуў, як знячэўку здрыганулася сэрца і да горла ад любасці падступіла нешта мяккае, даўкае. Ён, не зважаючы на Лаўрэна, пачаў забаўляць і падражніваць дзіця, а яно зморшчыла ва ўсмешцы нос і заскугітала, адкрываючы востранькія зубкі, якіх і было ўсяго па два зверху і знізу.

— От скугіча, зубы прарэзаліся, дак точыць і точыць іх. Падкінулі во, братачка, ляльку, так і сяджу цяпер. Сваіх не было калі на рукі ўзяць — на ўнуках здаволюся.

Відаць было, што Лаўрэн і ганарыцца і радуецца. А ў Цімоха раптам у роце перасохла, язык не павярнуць.

— Каб вады кубак глынуць, — сказаў ён, пазіраючы на двор.

— Славік! — крыкнуў Лаўрэн. — Нясі дзеду вады кубак! Халоднай, — распарадзіўся некім нябачным Лаўрэн.

З белым эмаліраваным кубкам, расплёскваючы ваду, з варотцаў выскачыў неўзабаве Славік, белабрысы, гадоў шасці хлапчук. Падаў кубак, стаяў, чакаючы, каб забраць ды занесці на месца.

— Гэта Тосьчын гя-ярой, — пахваліўся з любоўю Лаўрэн. — Накідалі, братачка, на лета... Скора я ім — косы ў рукі ды на канаву. Праўда, Славік?

Славік угукнуў, пагаджаючыся, і пабег з пустым кубкам у двор.

— А табе Жорж яшчэ не расстараўся. Што яго таўстуха падкачала, а я, калі не ўбачу яе, усё, здаецца, што вот-вот раскідаецца, — гаварыў Лаўрэн.

І прыкра было Цімоху, і гаркава...

— Скажу табе адкрыта, што таіцца. На бітай сцежцы трава не расце...

Яны змоўклі. Толькі малое нешта лапатала сабе. І Цімох, каб пачаць гаворку, папытаў:

— Яшчэ не гаворыць?

— Спрабуе. Дзедзя, мама, дай... Яны ўсе, братачка, цяпер перш-наперш «дай» гавораць.

— Дай, дай, дай, — паўтарала дзіця, нібы папугайчык, радасна.

— Скажы «на», што ты ўсё: «дай» і «дай». На!

— Ня, ня, — працягнула яно Цімоху надкусаны пячэнік, але толькі ён, паддаючыся гульні, працягнуў руку, як малое адхапіла пячэнік, схавала. А вочкі загарэліся хітра і жартаўліва.

— Бачыш во, братачка. Гэта будзе з іх толк. Калі малое, а хітрае... Ідзі во папоўзай на мураве, уселася дзеду на калені...

Ён адпусціў малое, павярнуўся да Цімоха.

— Як жа там, братачка, Марыя? Чуў я... — захіваў галавою.

— І не пытай... — уздыхнуў і адвёў позірк Цімох, маргануў вачыма, нібы сцёр морась, якая абтала з ільдзінак вачэй, пакуль забаўляўся з гэтай малечай, што цяпер поўзала каля лаўкі, хочучы ўстаць на ногі.

— І не пытай... — паўтарыў Цімох. І Лаўрэн зразумеў, засмуціўся, прымоўк.

— Зойдзем у хату, братачка, пасядзім... — прапанаваў ён, не ведаючы, як і чым супакоіць сябра.

— Не, — адказаўся Цімох. — Бачыш, сонца ўжо нізка, пакуль зайду — звечарэе. А яшчэ работы... Свінні там, можа, хлеў дагары нагамі перавярнулі, халера на іх. Дак пайду я.

Ён падняўся з лаўкі, разагнуўся, не адразу, але разагнуўся. І Лаўрэн пашкадаваў, што напомніў яму пра Марыю. Пасядзелі б, можа, пагаварылі...

Цімох ішоў лясною сцежкаю. Сюдой, напрасткі — два кіламетры да Беліцы. І сцежка гэта ходжана-пераходжана. Тут усё знаёма, як у роднай хаце: вунь галінастая сасна, куды яны некалі, зрабіўшы палаткі, усцягалі з Лаўрэнам борць. Струхлявела калода, а пчол няма. А далей — лаўка з плахі, дзе прысесці можна. Але ні той галінастай сасны з калодай, ні лаўкі ён не бачыў, а толькі схуднелы жаўтавы Марыін твар, а можа, і яго толькі спачатку, а потым — нічога, нічога не бачыў, ішоў, як у цемры. Думаў адно, што Марыя ўсё па дачушцы, якую не ўратавала, не зберагла ў вайну, гаруе, хварэе душою ўсё жыццё. Бывае, аж чорная зробіцца ды ціхенька плача. Думалася яшчэ, ведама, адна дома ля гэтых свіней, нудзіцца. Дык возьме, ці раз, ды

на базар яе ў нядзельку выправіць. Ніколі не папытае, што і як прадала, бачыць, вочы трошкі паяснелі, і то добра. Цяпер, адмяклы, пацяплелы душою каля Лаўрэна і асабліва яго ўнукаў, ён разумеў, — яшчэ як! — разумеў Марыю. Якія толькі раны час не загойвае, а гэта вось нейкая незагойная. Як Жоржыка нарадзіла, Марыя акрыяла трохі. А потым, як сын вырас, ізноў тое найшло. «Гэта і перайшло ў хваробу, — думаў ён. — А як жа іначай. Зажыва ўвагнала сябе ў магілу. Гэта каб Жоржык і яго жонка людныя былі ды вось, як Лаўрэну, унука падкінулі, то яна б і акрыяла, думкі б тыя адагнала. А то рукі занятыя звыклаю работаю, якую, здаецца, цяпер і без галавы б рабіў, а думкі — усё пра адно. І Анатоль, старэйшы, гэта ж падумаць толькі, мо гадоў пятнаццаць дома не быў, хоць кожны год абяцае. Можа, жонка не пускае. Нешта былі раз, дык незалюбіла. Цімох добра і не ведае, з чаго гэта ў іх узгарэлася тады. Да Варвары пайшлі, а тая — таксама галавы няма, ведама, баба... — зірнула на жонку яго, потым зазвала за шырму ды папытала: «А дзе ж тая? Вой жа яна мне тады панаравілася. Здаецца, і цяпер у вачах стаіць...» Пра якую тую пытала Варвара, ніхто так і не даведаўся ні ад яго, ні ад яе. А жонка яго, Наташа, чула ўсё: усхадзілася, дапытвалася, пра каго Варвара гаварыла, ды яшчэ і заплакала. Можа, выпіла баба? Ён і тады гэта даводзіў Наташы. А яна — ні прыступу. І ён аж учарнеў за некалькі дзён: так, пасварыўшыся, і паехалі. І з кім ён мог да Варвары прыходзіць? Ці, можа, дзе на вяселлі якім з кім яго бачыла?..

І ад таго ні адзін не едзе, ні разам. Цімох думаў пра гэта ўжо дома, топчучыся па гаспадарцы, кормячы свіней, доячы карову. Натаміўся, гатовы быў упасці і заснуць. Гэтага толькі і жадала душа. А тут затарахцеў матацыкл ля двара — Жоржык прыехаў. Не сказаць, каб Цімох узрадаваўся сыну, не ў пору ён, ужо ж поцемкі, і — пазнаў адразу — добра выпіўшы. Чула сэрца, што не так сабе прыехаў. Зноў пачне старую песню: грошай, мусіць, няма на выпіўку? Не, гэтага дак ён — халеры — не палучыць.

— Бацька! — крыкнуў Жоржык. — Дзе ты?

— Тутака, — глуха азваўся Цімох. — Ідзі ў хату, я карову зачыню...

Жоржык сядзеў за сталом. Цімоху ён здаўся худым, зморапым, як пасля хваробы. Можа, мала было святла

ў хаце, і ад таго твар Жоржыка быў цёмны, шызы, з завостранымі скуламі. Цімох нават пашкадаваў яго, і ў той жа час нагарнулася на душу ці то гідлівасць, ці то прыкрасць, калі ўбачыў, як ён, седзячы за сталом, трасецца, як малярыйны, ажно зубы цахкаюць.

— Улі чаго, бацька, — папрасіў, не могучы суняць дрыжыкі.

Цімох маўчаў. Толькі насупіўся, лоб яшчэ больш, здаецца, аб'ехаў, захаваліся мітуслівыя вочы, ён не паглядаў на Жоржыка, бы і не чуў нічога. Палез у шкапчык, дастаў парэзаныя на нушачцы сала і каўбасу, мо яшчэ леташнюю, усохлую, ажно скура паадставала, паставіў сыр, свежы, нядаўна выняты з клінка.

— Паеш, — сказаў сыну. — Забыўся яечак пакласці...

Ён зноў падаўся да шкапчыка, пашарыў у шуфлядзе, узяў, колькі загрэбла рука, і паклаў на стол. Адно пакацілася па стале, вось-вось зляціць на падлогу. Але Жоржык злаўчыўся і шлёпнуў яго, як муху, на стале. Урабіў у жаўток руку, скрывіўся гідліва, мацюкнуўся, пайшоў да вядра, стаў мыць рукі. Ён усё яшчэ спадзяваўся, што да гэтай закусі бацька падасць і кілішак. Маці, дык тая хутка здаецца, абы не назаляў ды не каўраў душу, а бацьку раскалоць не лёгка, — сын гэта ведаў. Насупіцца зараз і гаварыць не стане. Але не...

— А я заходзіў да цябе... Дзе гэта ты быў? — папытаў Цімох.

Але Жоржык не дакладваў яму, дзе быў, — маўчаў, маўляў, яго цяпер там няма.

— Да маці хадзіў... — Цімох сеў насупраць сына, пакута і сум былі ў яго вачах. Туманам яны абвівалі стол, сцены хаты, Жоржыка. Сынаў твар расплыўся бляклай плямай. — Нядобра з ёю. Нядобра... — сказаў бацька, не таячы збалелай сваёй душы. Трэба было некаму сказаць, падзяліцца горам, якое стаяла на парозе, каб яно адступіла хоць на гэту ноч, не мучыла яго аднаго ў пустой, аглухлай хаце.

— Ты думаеш, чаго я... — Жоржык не сказаў «п'ю», ён не любіў гэта слова, бо лічыў сябе непітушчым.

Цімох не надаў сказанаму і недаказанаму ўвагі: у яго заўсёды знаходзілася прычына.

Жоржык сцепануўся, у вачах яго быў сухі бляск, яны гарэлі нецярпеннем. І сам ён не мог сядзець доўга на месцы, усё падскокваў, нечага бегаў па хаце.

— А ты вось і не заходзіш да яе. Трэба і Анатолю пазваніць. Няхай бы прыехаў, — разважаў Цімох. Да яды ён не дакранаўся таксама, як і Жоржык. — Яна ўжо і не ўстае, — жаліўся Цімох. — Вось так во жылі, жылі... А думаў, хату пабудую. Лесу навазіў, кожнае бервяно звініць — не падсочанае.

— Вой, на чорта каму твая хата, — скоранька прагаварыў Жоржык, — хто ў ёй будзе жыць?

І зноў ускочыў.

— У мацеры ёсць грошы на кніжцы? — нечакана папытаў ён.

Цімох ажно сумеўся.

— Адкуль жа яны ў яе? Як што якое, дак... — Цімох развёў рукамі. — Мы ж аднаею сям'ёю жылі... Разыходзіцца не думалі.

— Дак у цябе, значыць... — праз зубы працадзіў Жоржык, упінаючы ў яго свой востры, сухі позірк.

— Вось і гадуй дзяцей... — разважаў нібы сам з сабою Цімох, мусіць, зразумеўшы Жоржыкавы намеры.

— Чаго ты? Хіба я вам мала памагаю. Хто дамовіўся на капалку восенню? А на машыне як быў — сена, салому, дровы. Усё я! Вот добра Анатолю, з'ехаў і без клопату сабе, — пакруціў ён галавою, хмыкнуўшы. Вочы яго раптам звузіліся, сталі падазроныя, кплівыя.

— А я, думаеш, чаго тут сяджу? — Жоржык не спяшаўся даваць адказ на сваё пытанне, пакуль Цімох не падняў на яго вочы з-пад гушчэчы рудых броваў. Але пакута, што невідочна цякла з іх, не давала добра разгледзець Жоржыкаў твар, ён быў як у тумане, і толькі голас абуджаў, дрогкі, захліпісты, — Жоржыка ўсё яшчэ калаціла. Цімох нават пашкадаваў яго, падумаў: добра б, каб ён лёг на печы ды выграўся, — можа, на матацыкле прабрала ветрам.

— Дак я чаго тут сяджу? — перапытаў у яго Жоржык. Цімох не мог даўмецца: чаго ён сядзіць і наогул, дзе ён сядзіць. — Чакаю паперы! — шчыра выпаліў Жоржык. Яго апаленыя, збузаваныя мазгі не маглі, відаць, ужо трымаць на засаўках свае тайнікі, і яны расхрысталіся, як незашчэпленыя вароты.

— Якія паперы? — не зразумеў Цімох.

— Казённыя. Што хрумсцяць... — Жоржык пацёр вялікім пальцам правай рукі аб указальны і сярэдні.

Цімох як знямеў. Не мог ні слова сказаць, ні крануцца з месца. Толькі рукі неяк разам апусціліся, каўза-

нуліся з каленяў, цяжкія, абмяклыя. Амаль не звалаклі пад стол яго самога. Абапёрся аб стальніцу грудзьмі. А галава падала на стол, як у п'янага.

— Ты давай, бацька, зубы не загаворвай, а налівай. Дзе яна ў цябе там захавана?

Жоржык забегаў па хаце, заглядваючы па кутках, адчыніў шкапчык, адкінуў фіранку на паліцы.

— Няма! — глуха і ўпарта сказаў Цімох.

— Не дурыся. Каб які Лаўрэн ці хаця б гэты трактарыст Хведар прыйшоў, дак знайшлася б... Кажы, дзе захаваў, я сам...

— Няма, — паўтарыў Цімох.

— Дак дай грошай, я сам куплю, пакуль людзі не палеглі.

— Няма, — як заведзены, механічна паўтараў ён.

— Як-та няма, — пяцёрку не знойдзеш? Няма ў яго...

— Пенсію парастыкаў. Да маці ідзеш — трэба штосьь смачнейшае. Мукі мех купіў, круп. Трэба ж... Думаў кабана здаць, дык не прымаюць цяпер, — апраўдваўся ён.

Жоржык пачаў нервавацца, абрыдла бацькава ўпартасць. Падбег, схапіў падпашкі, ірвануў з-за стала. Цімох крутануўся, адкідваючы яго рукі, і цяпер быў з ім тварам у твар. Нейкае незнаёмае дасюль пачуццё — бо ні такой агіды, ні такой злосці ён ніколі не адчуваў на сына — накаціла, як хваля, ажно вочы прамыла, як струмень вады шкло, і ён ясна ўбачыў яго вырачаныя, нейкія шалёныя, з сухім бляскам вочы, якія нібы і не бачылі яго, а шарылі, шарылі па сценах, нібы нешта шукалі, пакуль не спыніліся. І Цімох зірнуў туды. На сцяне вісела паляўнічая стрэльба. Цімох рвануўся, Жоржавы рукі дрогка, але ўчэпіста трымалі рукавы пінжака.

— Няма ў яго... няма... — Жоржык скрыгаў зубамі і дробна ляскаў імі.

— Халера на цябе, — выдыхнуў Цімох, і рэзкім, дужым яшчэ узмахам рук, што некалі цягалі лясіны, адкінуў ад сябе Жоржыка, аж той ногі задраў. Цімох — у дзверы, Жоржык ускочыў і за ім. У двары пад ногі трапіла нешта бразгатлівае, можа, якая міска ці вядро, — сам жа іх тут панастаўляў, у Марыі быў парадак, — зачапіўся і грымнуўся з усіх ног у картаплянік. Жоржык уссеў на яго, прыціснуў да зямлі. Чамусьці

ўспомнілася, як некалі ў час атакі вось так уссеў на яго фрыц. Думаў — усё... Пруткі аказаўся, здаровы, добра што падаспелі свае. Зноў упоцемках яму здалося, што той фрыц уссеў на яго, і ён адчуваў, як трапечацца яго сэрца, як не выскачыць, і як глуха, зацята, амаль не чутна — сваё; рукі, што душылі яго, слабелі, дрыжалі. Слабак! Цімох вылузаўся з-пад сына, спачатку паўзком, як вуж, потым неяк ускараскаўся на ногі, пакуль той цялёпкаўся ў збуялым картапляніку, пабег мяжою за стажок, што стаяў яшчэ з зімы за гародамі ля кустоўя, аб'едзены дробнай лясной зверынай. Далей пачынаўся лес. Прыхіліўся да стажка грудзьмі, а ногі не трымалі, падгіналіся, абсоўвалася цяжкае цела, так і прысеў, аб'ехаў на калені. Прыслухоўваўся і ад роспачы, нейкай непапраўнай бяды ледзь не плакаў, а можа, і плакаў, нешта ж пякло ў грудзях — яны былі як прастрэленыя, нешта гарачае аблівала твар, рукі, усё цела. Праз колькі часу пачуў прыглушанае, дрыготкае і таксама як бы роспачнае, раскайнае:

— Бацька! Бацька!

Але Цімох не азываўся.

— Бацька, я паеду...

Толькі як раўнуў матацыкл, потым затарахцеў і тарахценне аддалілася, Цімох азірліва паплёўся дадому. Няслушныя ногі спатыкаліся, ступалі абы-як, ледзьве пераастаўляліся.

Ідучы паўз хлеў, пачуў за дзвярыма глыбокі ўздых каровы, яна шумна пацягнула паветра, мыкнула. І ён падаў голас, супакоіў:

— Спі, Красуня, спі...

## 6

Анюта сядзела з маці ля хаты, у засені вішняку. Як добра і лёгка душы, і ў вачах, здаецца, прасвятлела. Прыціхла сэрца, не б'е гэтак глуха, як бубен, і яна ўспамінае, думае пра Антона спакайней, бы здалёк разглядвае ў одуме. Так бывае, абудзіўшыся, калі ўспамінаеш сон, і маркоцішся, і радуешся, што гэта толькі сон.

Здалося, яна, дзеўчына, сядзіць на беразе, а гусі, пападгінаўшы шыі, пакалыхваюцца на хвалях, а яна — чытае, бы шукае сябе ў кніжцы. І радуецца, калі знаходзіць нейкае падабенства. І цяпер усё, што тварылася

з ёю апошнім часам, здалося раптам нерэальным, а вычытаным у кніжцы. З палёгкай адзначыла, што, пэўна, пазбавілася гэтага насланння: раней у вачах быў толькі ён, Антон. Засланіў сабою ўвесь свет, усюды, куды б яна ні зірнула, — ён. Нібыта яго партрэты развешаны на дрэвах, на сценах дамоў, на парканах — усюды, куды ні кінеш вокам. А гэта бачыць і далёкія-далёкія сінія зубчыкі лесу, і зарэчнае поле, рэчку, чародка гусей выбіраецца на бераг на той бок. І адчуванне такое, быццам ёй трэба бегчы, заняць іх, пакуль не ўбіліся ў сеянку, і дзед Медык не запыніў іх. Гусак Кузьма будзе пратэставаць, угінаць шыю, сыкаць, падстрашваючы, паказваць, як джала, зялёна-жоўты язычок.

Невыказна лёгка зрабілася на сэрцы. Яна прыхінулася да сцяны, прыкрыла вочы.

— Стамілася, дачушка, за дарогу? — паспачувала маці. — Ідзі аддыхні.

— Што ты, — Анюта шчыльней прыціснулася да маці. — Мне проста добра з табою, цёпла, як у дзяцінстве, як тады, калі я прыязджала студэнткаю.

— Ага, ніхто з тваіх сяброўак так часта не прыязджаў, як ты. Мне ўсе гаварылі, што твая без мацеры не можа...

— Мама, мне раней усё здавалася, што мяне нехта шукае. Памятаеш, я прыязджала і ўсё дапытвала цябе: ці хто мяне пытаўся? Ты гаварыла: не. І так мне было горка. Як тады, у дзяцінстве. Памятаеш, як ты мяне знайшла?

Антаніна Пятроўна ўздрыгнула. Сэрца ўраз абмерла, страх працяў яго, але розумам, раптоўнай, маланкавай развагай даўмелася: яна ж была немаўляткам, яна не можа гэтага помніць. Ледзь не выдала сваё хваляванне, рэзка павярнулася, здзіўлена зірнула ў даччыны вочы.

— Няўжо ты забыла? — весела папытала Анюта. — Гулялі мы ў хованкі. Я залезла ў хлеў на вышкі, у сена зашылася, сяджу як мыш, чакаю. І цяпер помню: жмурыўся Ванька. Ці ён пра мяне забыўся, ці спужаўся навальніцы. Дзеці ж разбегліся, калі хмара найшла — я не бачыла...

«Вось яна пра што». Антаніна з палёгкай уздыхнула, квола, як пасля хваробы, усміхнулася.

— Вось так і сядзела надвячоркам у хлеве і румзала. Спачатку — са страху, а потым — шкадуючы сябе, што

ніхто не шукае. І так горка было мне. І неяк так соладка плакалася, нібы нараджалася душа... Потым ты мяне знайшла...

Анюта абняла маці, дакранулася шчакою да яе шчакі. Стала сцішана і лёгка, і хацелася плакаць, нібы зноў, нанава нараджалася душа, не тая кволая дзіцячая, а жаночая — шчодрая і моцная, але разам з тым жаласлівая і разгубленая, якая, як зерне ў волкай, цёплай глебе, набрыняла болем і тугою.

Маці адчула, як умакрэла яе шчака, адхінулася, уражаная, зазірнула ў вочы дачцэ. Хацела неяк суцішыць, але словы заледзянелі ў горле, а можа, яна не ведала іх, як не ведала, што гэта за слёзы: замілавання ці горычы. Але матчыным сэрцам адчувала: нешта з ёю не так.

Хацелася неяк падступіцца, пагаварыць, распытаць, але хіба яна скажа.

Анюта прамакнула слязінкі, усміхнулася, потым пільна зазірнула ў матчыны вочы.

— Мама, няўжо мяне ніхто не шукаў? Скажы. Цяпер мне ўсё роўна. Але калі нешта не так у жыцці, думаецца: магло быць іначай.

Антаніна Пятроўна адвяла позірк.

— Яно ў кожнага так. Думаеш, у мяне не магло? Але што пра пустое гаварыць.

Антаніна Пятроўна мітуслііва ўстала, кінула позіркам у адзін бок, у другі, нібы шукала нейкую работу. Так яна рабіла заўсёды, калі нервавалася.

— Мама, пасядзі, чаго ты ўсё мітаешся? — паспрабавала супакоіць яе Анюта, хоць разумела, не хоча яна гаварыць пра гэта, ухіляецца. Ну і не будзе ёй назаляць.

— Пачакай, я нешта пакажу табе, — сказала маці, кіруючыся ў хату. Потым вярнулася з пажаўцелай газетай у руках. — Перабірала ўчора квіткі розныя і знайшла.

Яна разгарнула гэтую замалёвачку, агорнутую віхлястай, як хвалькі, рамачкай.

— А-а, гэта пра тое, як я Петрачка ўратавала, — усміхнулася Анюта. — Ну ты і напалохалася тады за мяне... Помніш?

...Дзень быў ветраны і халодны. Надараліся такія дні вясною, калі рака яшчэ не месцілася ў берагах, а плё-

хала і плёхала хваляю, пералівалася на лугавіны. (Было раней такое.)

Чаго ён палез у ваду, гэты малы? Потым прызнаўся, што за плотачкамі сачыў, а шапка ў ваду і звалілася. Палез за ёю, а там глыбока — стаў тануць.

Выцягнула Анюта Петрачка. Усё на тым абышлося б, каб не Іван Жук, карэспандэнт мясцовай газеты «Прамень». Цікавы гэта чалавек. Невысокі і шчуплы, звонку някідкі, але гаваркі і вясёлы, нібы аднойчы заведзены рухавік. Яго можна напаткаць усюды, дзе спадзяешся і дзе не спадзяешся. Едзе на сваім рыплівым веласіпедзе, з усімі здалёк вітаецца, у кожнага знойдзе што запытаць, спыніцца, пагаворыць. Асабліва любіць ён базарныя дні. А базары ў Цішы былі вялікія. Здаецца, увесь раён сыходзіўся сюды. І ў Івана Жука тут знаёмых процьма: што ні чалавек, то яму знаёмы. А з незнаёмым ён без усялякіх захадаў і закідаў пачынае знаёміцца: «Паслухай, дзядзька (або чалавек), чаму я цябе не ведаю? Адкуль ты?» У яго, казалі, і блакнота, як у сапраўднага карэспандэнта, не было, бо ён ніколі нічога не занатоўваў, нават імёны і лічбы трымаў у галаве. На базары яшчэ здалёк убачыць патрэбнага яму чалавека і ўжо крычыць: «Ігнат, колькі Мар'я малака надаіла ад лысух сваіх? Ага, нічога сабе! А ты не хлусіш? Нешта ж багата? Яна ж абавязацельства на меней брала! Ну, бывай!» Потым у газеце будзе апісана ўсё так яскрава і дасціпна: як ідзе Мар'я таропка на досвітку расянаю сцежкаю да фермы, як мыкаюць каровы і цягнуць да яе свае вільготныя, мяккія пысы, лашчыць яна іх, гладзіць, корміць, акуратна абмывае кожнай вымя, расцірае яго. І потым позна, ужо ўпоцемках вяртаецца дадому, непакоіцца, як там дзеці: ці абедалі, ці вячэралі, і, каб было хутчэй, прыпускае подбежкам. Потым, натупаўшыся па гаспадарцы, кідаецца ў чуйны сон, каб на досвітку ўсхапіцца...

Анюта не памятае, ці быў хто на рацэ ў той дзень і час, калі яна выцягвала з віру Петрачка. Здаецца ёй, што не было нікога, толькі потым, задыхаючыся ад трывогі, прыбегла маці хлопчыка, Надзея: ці падказаў хто, ці чула яе сэрца. Анюта толькі помніць, якая пякуча халодная была вада і як моцна ашчаперыў яе за шыю Петрачок, цягнуў за сабою, што яна збаялася: ці хопіць сілы выплысці? На беразе, на мураве ледзьве разняла яго чэпкія рукі. Прыбегла дадому, пераапранулася ў

сухое, залезла на печ пад коўдру, пякла на чарэні пяткі, і ніяк не магла сагрэцца.

Іван Жук усё распісаў так, як быццам бачыў на ўласныя вочы, як яна хутка, не раздумваючы, кінулася ў ваду, як цяжка ёй было плысці з малым, як ледзяная вада сціскала цела і што Анюта — камсамолка, выдатніца. Усё, здаецца, было праўда, але не тое ўзрадавала Анюту, а радавала, што ён не дазнаўся і не напісаў, як яна потым паўдня сядзела на печы. У газеце вялікімі літарамі было напісана яе прозвішча, імя і імя па-бацьку — Лаўрыновіч Ганна Цітаўна. Гэта зусім не пасавала да яе ўзросту, але карэспандэнта лёгка было зразумець, ён турбаваўся аб праўдзівасці, бо што тут зробіш, калі кожны трэці ў Цішы — Лаўрыновіч? У гэтых Лаўрыновічаў, на думку Анюты, была дзіўная завядзёнка (да вайны, канечне), яны жылі нібы навыперадкі: у адных народзіцца дзіцятка — назавуць Анюткаю або Галькаю, і на табе — другія ўжо маюць Анютку ці Гальку. Добра, як імёны па бацьку розныя, а бывае што і не. І даводзіцца потым даваць мянушкі, без гэтага не абыдзешся.

Пасля выпадку з Петрачком імя ў Анюты як прапала. Усе, як згаварыўшыся, пачалі зваць яе Цітаўна...

Маці ўважліва перачытвала заметку, як тады, у першы раз, Анюта помніць, як часта і радасна білася і яе сэрца, чакала ўбачыць, што расцвіце цёплая матчына ўсмешка, а твар яе асвеціць ціхая радасць, захаваная недзе глыбока, якую толькі ў вачах і можна зрэдку падгледзець. Але радасці не было, наадварот — гаркота. «Ну чаго ты, мама? Я ж не застудзілася, не спужалася. Благога ж нічога не здарылася», — угаворвала яе.

— Помніш, што ты мне тады сказала? — папытала дачка і сама ж паўтарыла яе словы: «Гэта добра, што ты ўратавала Петрачка. Людзі памятлівыя на дабро. Але ты, дачушка, не выпінайся, жыві ціха...» Яна нібы папракнула тым маці, нібы тая стрымлівала яе памкненні, нібы вінавата была ў нечым, што не збылося.

Антаніна Пятроўна падняла на яе вочы, строгія, рашучыя.

— Тое самае, дачушка, скажу табе і цяпер, хоць ты вучонейшая і разумнейшая за мяне, — цвёрда адказала яна.

Анюта падняла на яе запытальны позірк, але маці, адвярнуўшыся, пазірала ў бок ракі.

Сонца закацілася за гарызонт, і на захадзе неба яшчэ свяцілася, быццам цвілі зараснікі бэзу. Прытушанае бэзавае святло, што падала на ваду, ужо цяжэла, свінцовела і патанала на дно ракі. Адно раз-пораз на шызай вадзе ўспыхвалі бэзавыя плямкі, прарываючыся праз волкі морак.

Берагам ішла жанчына ў халаце, паверх якога была надзета старая, абвіслая, можа, нават зашмальцаваная фуфайка. Яна ішла азірліва, бы кралася, і ўсё сцепалася, хавала ў рукавы кісці рук, бы мерзла.

— Ліза выйшла, — сказала Антаніна Пятроўна, кіўком галавы паказваючы на постаць на беразе. — Удзень яна не выходзіць. Толькі калі прыцямнее. Старонiцца людзей...

— Ліза?! — здзівілася Анюта.

Падхапілася з лаўкі.

— Ліза! — крыкнула яна радасна.

Але тая нават не павярнула галавы.

— Ліза!

І зноў яна не азвалася, толькі яшчэ шчыльней уціснула галаву ў плечукі, як ад пярэпалаху, і паскорыла хаду.

Анюта памкнулася дагнаць яе. Пайшла проста праз агарод, як бывала, падсвядома помнячы, што там, у пахіленым штыкетніку ёсць лаз. Ён і сапраўды быў. Але аказаўся залішне вузкім, не адрываць жа штыкеціну. Калі б не маці, яна б, можа, тое і зрабіла, але цяпер пакіравала да весніц.

А Ліза ўсё аддалялася і аддалялася. Анюта звала яе, крычала, але Ліза не паварочвала галавы і ўсё надавала хады. Подбежкам мінула вулку, што вяла да іх, да хаты Нурыных. І Анюта засумнявалася: ці ж гэта яна? Спынілася.

Бедная Ліза. Так яе празвалі яшчэ ў дзяцінстве. У яе былі круглыя, шырока раскрытыя, ад чаго, здавалася, заўсёды здзіўленыя вочы. Яны нібы два люстэркі паказвалі ўсё, што было ў яе на душы: то нечаканы сполах, то радасць, то ніякаватасць, але заўсёды са здзіўленнем. (Ага, яна нават ніякавела са здзіўленнем, нібы ўпершыню гэта адкрывала ў сабе.) Але часцей за ўсё была сумная, самотная. Трымалася асобна. Ды і аднакласніцы, апрача Анюты, да яе не хадзілі, не сакрэтнічалі, не шу-

шукаліся, бо, як вартавы, стаяла бабуля. Яна ні на крок не адыходзіла ад Лізы, нібы баялася, што нехта нешта ёй не тое скажа, абразіць. А калі не бабуля, дык маці. Жылі яны ўтраіх. Былі яшчэ дзядзькі, цёткі, але яны прыязджалі, ад'язджалі — затрымліваліся ненадоўга.

Анюта пастаяла ў нерашучасці. Потым наважылася ўсё-такі зайсці ў весніцы. Але ў двары, апёршыся на іх, стаяла Таццяна, маці Лізы. Яна не адчыніла гасцінна весніц, больш таго, непрыкметна рукою прытрымлівала зашчапку.

Таццяніны вочы баязліва і бездапаможна бегалі, як у злоўленага звера.

— Няма Лізы, — сказала яна коратка. Па поглядзе, які хавала, было відно — хлусіць. Шукае, што сказаць далей.

І Анюта як падказала ёй.

— Паехала?

— Паехала, — абрадавана пацвердзіла. І зноў відаць было, што хлусіць. Нічога не распытвае, а бывала, хоць якое пытанне задасць: надоўга? колькі дзетак? Застаецца адно — пайсці, пакінуць яе ў спакоі, зрабіць выгляд, што паверыла.

«Не, яна дома, дома! Але, як і ў дзяцінстве, — пад аховай. Маці нават яе, Анюту, не хоча цяпер пусціць у хату. Чаму?»

Анюта, вяртаючыся дадому, пайшла ўздоўж берага па выбітай, віхлявай сцежцы, якая гублялася часам у пясчаных наносах, па сцежцы, якою нядаўна, бы здань, прайшла Ліза.

Рака плыла ціха, нібы крадучыся, не плёхала ў бераг разгойданая хваля, не бруілася, не вірыла вадой. Спрамленае русла ракі нідзе не замінала плыні. Вада лёгка і бясшумна сунулася, як па жолабе, берагі аб'ехалі, як апалае цеста. Але Анюта пазнала тое месца, дзе калісьці былі віры. Называлі іх Фрыцавы ямы.

Патаемна, каб ніхто з дарослых не пераняў, ішлі купацца на Фрыцавы ямы. На гэтым месцы спакойная і разважлівая рака рэзка спынялася, як конь на краі абрыву, пачынала круціцца на месцы, бы верацяно, што намотвае ніткі, потым вырывалася з таго калаўрота, яшчэ дрыжучы і пенячыся, патроху суцішвалася, спакайнела. Фрыцавы ямы з'явіліся недзе ў сярэдзіне вайны, калі, не даўшы рады партызанам, фашысты выклікалі самалёты, і тыя бамбілі зарэчныя лясы і вёскі, ста-

ры млын ля затокі і цэлую эскадру лодак каля яго.

Купацца тут было небяспечна. Але, мусіць, гэта і маніла сюды дзятву.

І зноў з глыбінь памяці, з далёкага дзяцінства, чуе яна Лізін голас: «Трымайся на паверхні! Не тані...» Голас яе перарывісты, ад дрыжыкаў, што нагнаў холад, а можа, страх, за Анюту: «Трымайся! Грабі да берага!»

Дзяўчаты, сяброўкі таксама нешта крычаць з берага. Але яна нічога не чуе, не бачыць. Інтуітыўна разумее, што трэба супакоіцца, не мітусіцца. Спрабуе запаволіць рухі, прыўзняць галаву, убачыць бераг, але нехта адтуль, з глыбокага, хапае за ногі. Яна ледзьве паспявае дрыгаць імі. А рукамі ўсё шарыць, шарыць, нібы хоча за нешта ўхапіцца. Галаву стараецца трымаць уверх, выцягвае яе, як чарапаха з-пад панцыра. Але цела патанае, нейкая сіла цягне яго ніжэй і ніжэй. І яна адчувае, як шурпаты, пранізлівы страх скоўвае яе рукі, апякае, палоніць.

«Трымайся на паверхні! Нагамі... Працуй нагамі! — урываецца праз плёскат вады Лізін голас. — Трымайся на паверхні!»

Анюта б'е, б'е нагамі, стараючыся, бы рыба, выблытацца з нерата, толькі б не адчуваць халоднага, мярцвячага дотыку доннай вады. А вада вірыць, цяжкая, густая, гатова закруціць, зацягнуць на дно, халоднае, цёмнае, як магіла. Шчымлівы боль у грудзях, цяжка дыхаць.

Зноў крычыць Ліза: «Трымайся наверсе!» Але яна чуе, адчувае падцятым жыватом, гузыркамі грудзей, скурай ног, усім целам — холад глыбокай, цёмнай доннай вады...

Дахаты яна вярнулася сцішаная, задумлівая. Маці, накінуўшы наапашкі шарсцяную жакетку, чакала.

— Мама, што з ёю? — роспачна папытала Анюта. Тлумачыць не трэба было, маці здагадалася пра каго яна, але маўчала, нібы збірала ў адно рассыпаныя думкі.

— Што з ёю? — нібы ачнулася. — За бацьку сплочвае, за яго, мусіць.

— Як?

— Людзі гавораць усякае. Але ж ім толькі пападзіся на язык, дак у муку змелюць, — сказала раздражнёна, бы з некім спрачалася. — Потым сумна дадала: — Жыла яна ў Гомелі, замужам была, хлопчык ужо вялікі, як

і твой, мусіць. Калі заходзіла, то, мусіць, бачыла. (Анюта не стала расказваць, як сустрэлі яе, баялася не туды скіраваць гаворку.) Працавала, і на пасаду яе вялікую вылучылі, дэпутатам абраць хацелі, ажно гэта — з бацькам і адкрылася. Ці напісаў хто, пазайздросціў...

— Госпадзі, якая лухта. Дзеці за бацькоў не адказваюць, — горача, амаль не выкрыкнула Анюта, ёй ажно знобка стала.

— А вось жа, — з уздыхам выціснула Антаніна Пятроўна. Памаўчала, не ведаючы, як прыступіцца і сказаць ёй, каб таксама не выпінalася, але зноў загаварыла пра Лізу: — Ёй трэба было жыць тут, сярод сваіх людзей.

— А свае што, лепшыя? Ваўкамі празвалі...

— Таму што стараніліся... Свае хоць ведаюць, не абвінавацяць, што скрывала... І цябе, дачушка, я прашу: будзь абачлівай...

Анюта ўзлавалася, але выгляду не падавала.

«Зноў яна пра гэта, пра мінулае. Колькі ўжо яно будзе вісець над намі, як меч, колькі будзе гнесці да зямлі, заганяць, як мышэй у падпол, — думала сумна Анюта. — А яна, мусіць, гэтым і жыве».

— І ў нас не ўсё чыста ў раду... (Зараз з дзеда пачне. І сапраўды ўгадала.) — Некалі дзеда твайго Марка раскулачвалі, як глыбокі корань з зямлі выцягвалі, ой жа не хацеў ён родную зямлю пакідаць. За адну ноч ссівеў, як снег галаву ўкрыў. Аж людзі задзівіліся, як ён пасівеў. Ад'язджаючы, стаў на возе, шапку з галавы сцягнуў, сціснуў у паднятай руцэ і сказаў: «Як рэкі цяклі, так і цякцімуць, а хто быў багатым, той багатым і будзе».

— Што, ён вельмі багаты быў?

— Як табе сказаць, не галадаваў, як другія, дзве каровы і каня меў... У Сібір яго выслалі. Многіх тады туды выправілі. То пісалі людзі, што ён і там рабіў як апантаны. Зямлі многа: карчуй лес ды абрабляй. Дак ён і памёр на полі, упаў — і канцы.

А Ціт (чаму яна гаворыць Ціт, а не бацька?) вучыўся ў дарожным інстытуце, а як бацьку раскулачылі, яго паклікалі да начальства інстытуцкага, сказалі: напішы, што адракаешся ад бацькі-кулака. Але ён пісаць не стаў, не адрокся. Дак яго і выключылі. За бацькам не паехаў. Тут у мястэчку, на асушцы балот стаў працаваць. Там мы і сустрэліся. І дзядзька Васіль яго ведае, і Паўлавіч.

З гэтым дак яны супернічалі. Заляцаліся абодва да мяне, але я адмовіла Русаковічу. А ты гаворыш, магло быць іначай. У кожнага магло быць іначай...

Анюта падумала, што, мусіць, маці цяпер раскайваецца, што не абрала Паўлавіча, але не стала трывожыць яе роспытамі. Не напомніла і пра бацьку: пра яго яны звычайна маўчалі. Анюта не хацела цягнуць нітку размовы далей, каб не растрывожыць яе ўспамінаў, балючых і горкіх.

У іх маўчанне, як у ваду, упаў голас: падмыты, сыры край берага абваліўся, і голас быў сыры, вязкі, як стогн:

— Анютка, Цітаўна. Падыдзі сюды, дай хоць зірнуць на цябе зблізку.

Анюта не варухнулася, быццам не ў гэты момант яе паклікалі, а некалі даўно, і знаёмыя, звонка бадзёрыя ноткі голасу таго, хто клікаў, растварыліся ў тумане часу, зволглі пад дажджамі, абтрапаліся на ветры і ўпалі сюды шаматліва-дрыготкай, сырой жменяй пажухлай лістоты.

— Саўсім зламалася Наталля, — шапнула са скрухай маці і лёгенька падштурхнула Анюту: падыдзі. І тая пайшла, пераступаючы бульбяныя карчы, да экзатычнага ў сваёй старасці штыкетніка: рэдкія, сям-там ацалелыя, расхістаныя зубы. Наталля стаяла, узлёгшы на яго, і, здавалася, вось-вось яны паваляцца разам. Анюта ўбачыла яе сыры, як камяк гліны, твар, жоўтую гнойную рану рота.

«Чаму сказала: зламалася? — запярэчыла ў думках мацеры, — яна ж спілася...» Аж занудзіла ад бражлівага горкага перагару, які сачыўся з раны яе рота, вырываючыся разам з булькатам — ці то ікаўкі, ці то ўсхліпаў.

— А я даў-но тутака стаю, усё пазіраю, паз-зіраю. І мая б Лю-ю-ю-бка, — імя дачкі яна правыла, — была-а б така-а-я...

Сыры камяк гліны абцякаў вільгаццю: Наталля плакала.

У Анюты заледзянела горла, яна не магла ды, урэшце, і не знала, што сказаць, як супакоіць. Яна адчувала сябе нібы вінаватай, што Любкі няма, а яна жывая, здаровая, вось тут стаіць перад яе мацераю. Падышла бліжэй, дакранулася сівых, растрапаных (грабеньчык выехаў, можа, згубіўся дзе) валасоў і ўразілася: яны

былі волкія, расяныя. Хай бы яна не рабіла гэтага, цяпер не супакоіць Наталлю, не забраць з яе чэпкіх, дрыжачых рук сваю, за якую яна ўхапілася, як тапелец.

Уратавала маці:

— Ідзі, Наталля, ідзі... Кладзіся спаць, позна... Заўтра пагаворым, — сказала яна роўным, але строгім голасам.

Наталля ачнулася. Прыадкрыліся чырвоныя шчылінкі вачэй, яна затрэсла галавою, пагаджаючыся і адступаючы. Так і ішла, ці не разумела, што трэба павярнуцца, ці не магла яшчэ адарваць вачэй ад Анюты.

Яны таксама пайшлі да хаты.

— Збяру што-небудзь на вячэру, — сказала клопатна маці і накіравалася ў хату. Анюта ж, як непрыкаяная, растрывожаная, блукала па двары, па садзе.

Успаміны запаланілі яе. І тое, што здавалася далёкім, сцёртым жывою рэальнасцю сном, паўставала выразна ў драбніцах, якія набывалі асаблівы сэнс. Не, гэта не сон, гэта было. І іх было тут многа. Колькі голасу, гоману, смеху было на гэтай рацэ. А пад гэтай яблыняй яна любіла чытаць, тады ж якраз рыхтавалася да прыёмных экзаменаў у інстытут.

...Цень ад яблыні паціху радзее, нібы растае. Вось з аднаго боку сонца падкралася да Анюты, апякае плячо. А на рацэ ўсё не сціхаюць галасы. «Дзяўчаты купаюцца...» Анюта ўскочыла на ногі, узяла пад паху кніжку і — на рэчку. Лёгка, басанож па чыстым жвіры ўзбегла на высокі бераг, які яны звалі бурта, памахала рукою дзяўчатам.

«Сюды, Цітаўна!»

Хуткімі рухамі яна скідае лёгкі паркалёвы сарафан і спыняецца ля канціка вады, якая здаецца пякуча-халоднаю, ажно шурпацень ідзе па нагах.

«Не бойся, Цітаўна, не халодная!» Нехта сыпануў у яе крыштальнымі пацеркамі пырскаў. Кідаецца ў ваду і плыве, плыве, не могучы нацешыцца прахалодай. Заўважае, адна на вадзе.

«Чаго так хутка павыскоквалі?» — крыўдзіцца на дзяўчат.

«Мы з раніцы купаемся. А ты, напэўна, назубрылася да ачмурэння».

Анюта кідаецца на зыркі пясок. Яны ж чакаюць, што яна адкажа, але яна маўчыць, заплюшчыўшы вочы ад яркага сонца.

«Дзяўчаткі, трэба ж і нам што-небудзь чытаць», — з ценем трывогі гаворыць нехта з іх, але ніхто не падтрымаў той голас.

«Ой, як добра вам, дзяўчаткі!» — амаль зайздросціць Анюта.

«Давай і ты з намі — весялей будзе, — упрошвае яе Галя. — Аленчын жа бацька пра ўсіх напісаў».

«Не хачу, — адказвае Анюта. — Цітаўнаю будзеце зваць, як дома...»

Усе дзяўчаты з Рачной вуліцы падалі заявы ў медвучылішча, некуды аж за Гомель. Сапраўды, Аленчын бацька напісаў брату, які быў там дырэктарам, ліст. Пра ўсіх напісаў, усіх пералічыў паіменна.

Напісаў брату, каб усім памог, нікога не пакрыўдзіў, «бо ўсё то людзі свае, тутэйшыя, блізкія».

«Акушэркамі будуць, павітухамі», — смяяўся дзядзька Васіль, хоць і яго Галя была ў тым ліку. Ён раіў і Анюце: «Не цурайся дзяўчат. Гуртам яно лепей. Акушэрка — ого як ганарова. Вунь Насцю маю як, бывала, паважалі. Ні адзін проста Насцяю не называў, а ўсе Настасся Андрэеўна! Вайна пачалася, а бабам сваё. Прыспела, нічога не зробіш. Яна ж ноччу, як кошка, агародамі, — іначай нельга, патрулі, як тычкі, стаяць, — нацянькі хадзіла баб ратаваць». Дзядзькавы вочы туманіліся. І ён наракаў на табак: «Дзярэ моцна». Знарокава кашляў, каб выбіць горыч з грудзей, бо Настассі Андрэеўны даўно няма, а ўсе добрым словам успамінаюць.

Дзяўчаты ж, абнадзееныя і бесклапотныя, адно дзень у дзень купаюцца.

«Ціха вы, вунь Любка імчыць на Гнядой», — спавяшчае нехта з іх. Але віск і смех не ўнімаюцца. Нават Гнядая насцярожваецца з непрывычкі і стрыжэ вушамі.

За ракою будуюць клуб. І Любка ўвесь дзень тралюе на кабыле туды бочкі з вадою.

«Гэй, вадавоз, калі клуб будзе? — крычыць нехта з дзяўчат. — Танцаваць хочацца!..»

«Восенню!» — нясецца ў адказ Любчын крык.

«Восенню нас тут не будзе... Паскарай тэмпы!»

Вясёлую перамову двух берагоў абрывае Аленка. Чарнявенькая, у дзве коскі заплеценая, у рабацінні твар, Аленка, бацька якой напісаў ліст брату, дырэктару медвучылішча, ледзьве пераводзіла дух ад хуткага бегу.

«Дзяўчаты, прапалі мы...» — Аленчын голас зрываецца.

На момант над берагам навісае цішыня, толькі чуецца плёскат вады: Любка вядром налівае яе ў бочку.

«Цётка Марыля ліст прыслала... Не працуе дзядзька больш у медвучылішчы... Два месяцы, як не працуе. Ён на...»

Але ніхто болей не слухаў яе. Дзяўчаты таропка, нязграбна нацягвалі сукенкі, нават забыўшыся апаласнуцца, спяшаліся дадому — вучыць, нібы можна было пераняць час, прабаўлены на рацэ.

Анюта засталася адна. Уткнулася ў кніжку.

«Но-о-о, гультайка», — пачуўся знаёмы голас. Перамелам ехала Люба. Гнядая боўтала нагамі ваду, толькі ляцелі пыркі. Ля самага берага паглыбела, вада лізнула кабыле чэрава, холадна бліснулі калёсы і перасталі круціцца: угразлі ў глеі. Люба з усяе сілы ўпіналася ззаду вазка.

Анюта пайшла ёй на дапамогу.

«Бяры за аброць ды заводзь лявей», — сказала ёй Любка.

Гнядая, цяжка храпучы, намацала нагамі цвёрдую глебу, выйшла, асцерагаючыся, на бераг. Дзяўчаты распраглі яе, склалі на беразе потную збрую, і кабыла, адчуўшы волю, пабрыла па выгане, пашчыпваючы дробную дзікую канюшыну.

А яны, Анюта і Любка, улягліся на пяску, песціліся на сонцы.

«А ты як, Любка. Так і будзеш ездзіць на Гнядой?»

Любка не паварочвае галавы, не расплюшчвае вачэй.

«Калі чалавек шчаслівы, — гаворыць яна, — ён можа рабіць любую работу, нават самую цяжкую. Я ўсё змагу, калі буду шчаслівая...» Можна падумаць, што Любка самая шчаслівая. Але Анюта ведае: птушка, што завецца шчасцем, ніяк не залятае ў іх хату. Любіна маці ў трэці раз выйшла замуж, нарадзіла дзіця, а муж яе, Любін айчым, ішоў, мусіць, п'яны цераз раку і — утапіўся. Куды ёй цяпер, Любцы — трэба працаваць ды мацеры памагаць. Але Любка і выгляду не падае, што горка ёй.

«А Гнядой трэба дэкрэтны даць, — жартуе яна. — І дзядзька Васіль мяне папярэдзіў, кажа, ты яе вельмі не гані, бо цяжка ёй, а як ёй трэба спыніцца, то счакай, не заходзься з дубцом».

І ў дзяўчат, напужаных Аленкай, прайшоў першы пярэпалах. Дома не забавіліся. Толькі па кніжкі збегалі, ды зноў — на рэчку. Ляжаць на посцілачках — у кніжкі паўтыкаўшы насы. Любка села, агледзелася.

«Вось што, таварышы акушэркі! — раптам сур'ёзна звярнулася яна да сяброўак. — Хто будзе прымаць роды ў мае Гнядое?»

Дзяўчаты зарагаталі. Зноў было весела, нібы і не прыносіла Аленка тую вестку.

Гнядая брыла па беразе, раскаціста пырхала, бы здувала пыл з нізкарослага, у дробнай квецені дзяцельніку.

На тым беразе ракі размахваў рукамі, нібы збіраўся ўзляцець цераз раку, і нешта крычаў дзядзька Васіль, хутчэй за ўсё, сварыўся на Любу, што прапала з вадою. Дзяўчаты кінуліся да Гнядой, сталі дапамагаць Любе запрагаць кабылу.

«Што за д'ябал, папруга не сыходзіцца».

«Давай напнем тужэй».

«Дурніцы, кабылу ўдушыце, яна ж жарэбная! — крычаў дзядзька Васіль, пераходзячы раку. — Дзесяць гадоў вучыліся, а кабылу не ўмеюць запрэгчы...» — бурчаў ён, спраўна ўходжваючыся каля Гнядой.

А Любка налівае і налівае ў бочку ваду, толькі пыркі ляцяць.

На сярэдзіне ракі яна крычыць Анюце:

«Увечары сустрэнемся!»

«Сустрэнецеся, сустрэнецеся, нідзе не дзенецеся», — бубніў яшчэ сярдзіта дзядзька Васіль, паганяючы Гнядую. А Люба махае рукою на развітанне.

...Няма, няма Любы. Нідзе на белым свеце. Маці расказвала, як гэта здарылася: гарэла бальніца. У гэтым драўляным горадзе толькі і бойся, што пажару. Як загарэлася — ніхто не ведае. Люба прымчала на Гнядой, кінулася выносіць хворых. Апаліла лёгкія: не магла дыхаць. Мучылася. Трэба была тэрмінова баракамера, але яе ў мястэчку не было.

Не стала Любкі, а сэрца яшчэ ўсё не верыла, а галава забывалася. Былі цёплыя, хмельныя вечары. І аднойчы, лётам, як белая птушка ў прыцемку, ідучы да клуба, Анюта — зусім жа забылася — крыкнула, паклікала яе, прыпыніўшыся ля весніц. Убачыла, як разгублена, як на вар'ятку, пазіраюць з двара на яе Любчыны браты.

Неаднойчы яна спынялася ля Любчынага двара, глытаючы крык: зусім забылася, зусім, што няма яе...

«Люба, Люба. Як буду шчаслівая... Адна ты адплаціла гэтай мясціне, гэтай рэчцы, гэтаму небу — і назаўсёды засталася тут. Як буду шчаслівая — усё змагу. Усё змагу... І ў мяне яшчэ ўсё наперадзе. І я змагу...» — думае Анюта, Ганна Цітаўна.

## 7

Астатак вечара яны прасядзелі моўчкі. Кожная думала пра сваё. Антаніна шкадавала дачку. Дакарала сябе: можа, і сама вінаватая. Трэба было ёй тады сказаць адразу. Усё! А то яна чакала яго, цягнулася, як сляпая. Мусіць, чула родную кроў. Трэба было сказаць адразу. А ці не гаварыла: не думай пра яго. Хіба ж хлопцаў мала там, дзе ты вучышся? А яна, як прыедзе дадому, перш-наперш: «Мама, мяне ніхто не пытаўся, не шукаў!» — «Не, дачушка».

Прыкідвалася. Ведала, пра каго пытае. Ён жа прыходзіў. Колькі разоў бачыла, што стаяў ля двара, пільнаваў. Якраз праз лета. Мусіць, у яго быў адпачынак, а яна якраз у Ленінград са студэнтамі паехала. Вярнулася і зноў гэтае пытанне: «Мама, мяне ніхто не шукаў?»

Хай жа б сказала, як усё было. Так, ён шукаў... Колькі падвячоркаў стаяў тут, ля варотцаў. Яна тады выйшла на сцежку, прайшла да вуліцы. Згледзела: стаіць. Паходзіць, паходзіць каля гародчыка і спыніцца, як вартавы які. Сказалі ёй, што гэта Цімохаў сын, з Беліцы. Прыгледзелася: праўда, выліты Цімох. Яна ж Цімоха маладога яшчэ помніць. Дзіва што, у адной вёсцы жылі... Даўно, ой даўно. Можна было забыць, а вось глянула і ўспомніла. Выліты Цімох: чарнявы, вочы, як вугаль, шапка валасоў кучаравых, што ў цыгана. Некалі Цімоха і дражнілі цыганам. Дак, можа, сароме́ўся: прыйдзе на вечарынку — шапку не скідае, пакуль дзеўкі не здзяруць. Сарамлівы быў... А гэты — не хавае. Толькі ростам вышэйшы за бацьку.

Пацікавала за сынам Цімоха з саду, а голасу не падала. Хвалявалася: што і як гаварыць. Згледзела — пайшоў, і ад сэрца адлягло. А назаўтра — зноў тут. Выйшла з весніц, а ён на лавачцы на вуліцы сядзіць. А хлопчык жа ты мой! Убачыў, з лаўкі ўскочыў, «добры дзень»

даў. «Ці дома Анюта?» — папытаў, здалося, смела. Сказала: «Няма яе і не будзе». Сумеўся. Відаць, гэта ён не ўлічваў. «Можа, адрас дасцё яе?» — «І адраса не дам. Не хадзі ты сюды, хлопча, не можна вам... — слоў не магла знайсці, сказала як ёсць... — любіцца. Не можна вам любіцца...»

Заліўся чырванню, як агнём узяўся: «Чаму?» — «Не магу я цяпер табе гэтага сказаць, але гэта так». — «Вы не хочаце?» Відаць, хлопец ганарысты, супраць поўсці не пагладзіш. Сказаў, ускінуўшы галаву, маўляў, зірніце, ці ёсць у мяне загана. «Можа, і я не хачу...» — сказала цвёрда, як адрэзала. А ў самое сэрца заныла-заныла, каб голас яму — сабачае выццё, не іначай, пачулася б. Ну што ты зробіш? Што ты зробіш? Такое жыццё...

А на дачку ўсё паглядала са шкадаваннем, угаворвала адно: ідзі пагуляй, схадзі ў клуб на танцы. А ёй — ні да каго няма справы, аціхла, як манашка зрабілася. Толькі кніжкі ўсё чытала.

А каб сказала тады, можа б, пакінула думаць пра яго. Замуж бы раней выйшла.

Неяк дзіўна яны жывуць з Мікалаем: яна ўсё сюды і сюды, а ён мо разы са два і прыехаў. Вядома, чалавек заняты. На вялікай пасадзе. Але ж нешта не так у іх. Раней хоць дзіця на лета прывозілі, цяпер — то ў лагер яго, то на мора, ці ён да сваіх бацькоў вязе. Можа, ад таго разу, як прыехаў з ім, і вецер якраз павярнуўся. І цяпер вось, каб не пагнала дым...

Пахла кветкамі, маладой гароднінай, але ўжо, як трывога, ледзь-ледзь чутна патыхала гарам. Антаніна Пятроўна ведала — завалачэ зараз, засмуродзіць, прыйдзецца ўцякаць у хату.

Трывожна глянула на дачку. Не, тая яшчэ нічога не чуе, звыклая да гарадскога паветра. Нешта думае сваё... Мусіць, пра тое, што заўтра скажа ў райкоме. Будуць жа абмяркоўваць, як жа ў яе называецца, праект плана сацыяльнага развіцця раёна.

Анюта ўсё падлічвае, піша, думае.

Зямля пахла кветкамі. Але гэты пах памалу пачаў адступаць, знікаць, забіваў яго другі, смуродліва-едкі. Спачатку здалося, што гэта ад машыны, якая стаяла з таго боку хаты на зарослым муравой двары. Цяпер, калі Анюта прыязджала на машыне, маці не засаджвала бульбай невялічкі кавалак, недзе два на тры метры, зямлі, зрабіла двор. Раней жа была толькі сцежка, за-

вітая драсёнам. І ён хутка перакінуўся туды, на незасеянае, аплёў, мякка накрыў гэты лапік зямлі.

Смуродлівы чад спачатку накочваўся хвалямі, напльіваў, бы рванае воблака, на сонца, потым пагнала яго густа, нізка над зямлёю. Ён забіваў дых.

— Зноў павярнуўся вецер, — Антаніна Пятроўна ўстала з лаўкі. — Пойдзем у хату і шчыльна зачынім вокны. Няма спасу, калі паварочваецца вецер.

Шызы, едкі дым завалокваў пасёлак, яго асфальтаваныя вуліцы і дворыкі, слаўся, прыпадаў да іх, абнюхваў, як звер, нібы адчуваў роднасць з гэтым ацвярдзелым шызым покрывам дарогі. І сапраўды, ці гэта толькі здавалася, ён спыняўся ў паветры, густым марывам вісеў над вуліцамі, над плошчай, нібы вялізная калматая пачвара.

Пачынала нудзіць. Хацелася затаіцца і не дыхаць.

Анюту, Ганну Цітаўну, ахапіў страх. То быў нават не страх, а нешта іншае, што раптам адкрываеш у сабе, і тады ўжо прыходзіць той страх.

«Гэта — я-а-а», — паўтаралася бясконца, як енк, гатовы захліпнуцца гэтай смугою.

— Андросавы паехалі... Калі паварочваўся вецер — вельмі хлопчык у іх хварэў: увесь чырванеў і драў на сабе скуру. Алергія... Ніколі раней такой хваробы не ведалі, — расказвала маці. Ужо былі шчыльна зачынены вокны і дзверы. І па тэлевізары спявалі хлопцы пра траву ля дома, і стары, можа, яшчэ дзедаўскі гадзіннік спакойна і немітусліва адлічваў бясконцы час.

«Гэта праекціроўшчыкі не ўлічылі, — спрабавала яна супакоіць сябе. — Гэта іх віна. Наогул, хто калі думае пра вецер. Кожны думае пра нешта сваё. А можа, нікому і не ў галаве. Пабудавалі — і ўсё. Вецер тут часцей усяго дзьме з захаду. Заходні вецер... Трэба было заводзік аднесці за пасёлак куды-небудзь у лясы. Быццам не дыхаюць лясы? Проста яны нямыя. Ня-мы-я... Пашумяць самі з сабою, пагамоняць...»

— Яно-то добра. Чыста, добра хадзіць стала, аўтобусы лёгка бегаюць. Паўлавіч некалі казаў, што будуюць такія цяпер трубы, якія ўкручваюць дым у...

— Атмасферу, — падказала Анюта.

А сама падумала: «Гэта, можа, будзе праз сто гадоў... А яна верыць».

І зноў Анюціна сэрца рванулася да Антона, рванулася, бы ратуючыся ад бяды, і адхінулася, зайшлося бо-

лем вострым і шчымлівым, бы наткнулася на шыпы. «Гэта наша дзіця. Агульнае дзіця. Хворае дзіця маёй бяздумнай любові. І пазіраць на яго, і пакутаваць — мне. Прывезці і яго, Антона, сюды і паказаць. Глядзі: гэта наша дзіця, яно расце (нядаўна паставілі яшчэ адну печ, павялічылі магутнасці), яно зжырае ўсё наўкола, яно пагражае раслінам і людзям».

## 8

Не, не заснуць... Вочы нібы вылузваюцца з арбіт, не замружыць вейкі, не звесці павекі. Здаецца, і хату запаўняе гэты дым, запаўзае ў нябачныя шчыліны, дзярэ горла. Яна не магла ўвечары ні есці, ні піць, быццам усё набралася пахам гарэлага мазуту. І цяпер здаецца, за вокнамі не ноч, а гэты едкі чорны дым, ён згусціўся, прылёг да зямлі.

— Ты нешта ўсё варочаешся. Ці табе мулка?

— Рана, відаць, легла, я дома — а першай гадзіне...

Яна сказала «дома». Значыць, гэты дом ужо не яе. Яе дом там, далёка.

І зноў ёй мроіўся горад, цудоўны і светлы, які пакуль яшчэ ў лічбах і разліках — у шэрай з белымі завязачкамі папцы, з якою яна раніцай пойдзе на пашыранае пасяджэнне бюро райкома. Галоўнае, перакanaўча, спакойна далажыць. Праўда, думкі яе не новыя — пра аграпрамысловыя комплексы пішуць цяпер многа. Яна ж толькі на выснове раёна разлічыла перспектыву. Гэта яе асабістыя думкі. Але, калі будзе прынята...

Яна злавіла сябе на думцы, якія выгоды гэта дае ёй. «Хіба гэта галоўнае? — прысарамаціла сябе, — галоўнае, што ўсё гэта будзе: аграмадныя гароднінасховішчы, заводы па перапрацоўцы гародніны і садавіны, мясцовыя каўбасныя цэхі і капцільні. Перапрацоўку ўсяго, што дае тутэйшая зямля, трэба рабіць на месцы. Гэта не руда, не металалом, што нагрузіў яго на Урале і вязі ў Беларусь. А скажыце, як давезці на Урал свежы, прыгожы, як толькі з яблыні, яблык, цвёрдзенькі памідор? Божа, прайшло столькі гадоў, і не пабудаваць дасюль гароднінасховішчы? Ці табе абурацца? Ці табе не знаць, што толькі нядаўна ўспомнілі закон вартасці... Палітэканомы яшчэ спрачаюцца. Некаторым не па нутры, што калгасы займелі грошы, ды і самі кіраўнікі не навучы-

лісяіх вышукваць, усё чакаюць каманды зверху: як райком. А там жа ні аднаго эканаміста. Вось і сыплюцца дасюль: «план, план любой цаной», «паднажаць, выкарыстаць усе сродкі». Сродкі... Гэта не тыя сродкі, за іх хлеба не купіш...»

І зноў гаркавы, смярдзючы дым упаўзае ў хату, здаецца, нечым дыхаць. Не, не заснуць...

«Ці толькі мая віна? А Паўлавіч? Хіба ён — ды колькі разоў — не пісаў у Дзяржплан, не прасіў размясціць якую-небудзь вытворчасць. Якую-небудзь... Як яна не думала раней, што гэта не проста якую-небудзь... Панацягалі, панатыркалі заводаў, і сыр'ё возяць чорт ведае адкуль: беднасць робіць чалавека неразборлівым. Што-небудзь — толькі дай. І мы нахапалі сабе хімічных, нафтаперапрацоўчых, сілікатных заводаў...»

— Мама, а як Паўлавіч?

— Паўлавіч...

Маці змоўкла, быццам успамінала ці не ведала, што гаварыць.

— Божа мой, — сказала неўзабаве, нейк ужо як бы спуджана. — Няўжо ты не ведаеш? Проці ночы і ўспамінаць цяжка. То ж ён усё дабіваўся, каб які-небудзь завод тут «пасадзілі». Помніш, і да цябе прыязджаў, у мяне твой адрас пытаў, казаў, што ты ў гэтай сістэме працуеш.

— Я тады, мама, над дысертацыяй працавала.

Анюта злавіла сябе на думцы, што адхрышчваецца ад гэтага заводзіка.

— А далей вот і дабіўся. І сам жа потым біўся як рыба аб лёд, пісаў усюды, каб закрыць яго. Ну, яго за гэтае, мусіць, ды яшчэ ў райкоме пасварыўся, нікуды і не перавялі, як цяпер робяць, а знялі з пасады старшыні выканкома, ды і ўсё. Дык ён увесь учарнеў — стаў як дым той, што з трубы валіць. А як во гэты цэх пабудавалі, што ўсю рэчку вытруціў, дак ён яшчэ больш усхадзіўся. Куды толькі не пісаў. Колькі камісій ды правяраючых усякіх папаездзіла. Ну што, паходзяць, паглядзяць — і паехалі! Штраф дадуць дырэктару. Дак ці ж з яго кішэні? Заплоціць — і далей, да новай праверкі. А гэта раз пагалоска пайшла — нехта ўначы машыны паламаў. Можа, з месяц ці болей гэты цэх стаяў. Цягалі ўсіх у пракуратуру. А потым — Паўлавіча забралі. Як там было — невядома. Толькі гады са тры ён у лагерах быў. А вярнуўся — ні з кім ні слова. Толькі сядзіць

дзень у дзень на бурце ды на раку пазірае, бы за касяком рыбы сочыць. Спрабавалі загаварыць з ім. І я колькі разоў падыходзіла. А ён — як сцяна. Здаецца, нават нічога не помніць і нікога не пазнае. Не ў розуме ён, гавораць. Мо за тым і адпусцілі...

У Анюты ахалодала ўсярэдзіне. Не было сілы сказаць: «Даволі, мама, я ўсё ведаю, нават больш...»

А яна гаварыла, гаварыла:

— Цяпер ужо прывыклі, што ракі як няма. Ніхто бялізну не палошча, як раней, гусей, качак ніхто не трымае. Праўда, кажуць, нейкія фільтры паставілі. Але яны часта забіваюцца, адно рамантуй. Дзеці, бывае, і боўтаюцца там, а каб хто з вудаю выйшаў, ото б смеху было.

У цёмнай цішыні яе голас гучаў неяк ненатуральна, шапатліва, нібы асцерагаючыся некага, каб не пачуў, а ёй, Анюце, напамінаў, што яна ведала, але сілілася забыць, пахаваць, моцна зачыніўшы ў куфры памяці. І вось зарыпелі яго ржавыя завесы, ажно нервы напяліся, здалося, не вытрымаюць, парвуцца.

І зноў памяць ірванулася назад, далёка назад, аж...

Паўлавіч пазваніў ёй на работу: папрасіў сустрэцца. Яна, уражаная гэтым неспадзяваным званком, — гадоў колькі яна яго не бачыла ды і наогул спачатку падумала, што нешта з маці, аж сэрца ёкнула, потым толькі даўмелася: у яго сваё. Ён адразу не гаварыў, хаваў тое за сціплымі словамі: «Вось шукаю вас, землякоў: хто дзе... Цяпер вы вучонымі парабіліся, мо хто дапаможа, слова закіне». Сустрэліся яны ў гарадскім скверы. Як ні запрашала зайсці дадому — не захацеў, спасылаўся на занятасць ды спешку. Паўлавіч змяніўся, з пратэзам не здаваўся аднарукім, хоць гэтая штучная рука яму болей замінала, чым дапамагала, яна заўважыла адразу, калі пачаў даставаць з пацёртага партфеля паперы, каб даць іх прачытаць

Ён зноў пісаў у плануючыя органы. Анюта пачала чытаць. Невыказна ўразілася, бы не чакала нетактоўнага жарту ад сур'ёзнага чалавека. Падняла вочы з немым пытаннем, але ён адвёў свае, вінаватыя і адчайныя, так, мусіць, адчувае сябе бацька, якога абразілі ці нават пабілі пры дзецях. Ён хаваў позірк, і яна адно толькі бачыла яго схіленую, як у скрусе, галаву, заклапочаны маршчыністы лоб у ямінках, бы пабіты дробнымі асколкамі (а можа, яно так і было), русявыя, але як нежы-

выя, нібы сапрэлі пад шапкаю, загорнутыя назад валасы. Як тады, калі Паўлавіч выклікаў яе, — цяпер бы сказалі: «на кавёр» — растлумачыць што-колечы ў эканоміцы раёна. І неба здалося нібы прасвечаным праз празрыстыя вокны выканкома, намытыя да бляску цёткай Саўчыхай, што трымалася сваёй работы, як мусіць трымацца за яе вялікі начальнік; адчула пад падэшвамі не асфальтавую дарожку сквера, а выбітую нагамі шматлікіх прасіцеляў, мулкую — сукі на дошках тырчалі, як мазалі, — падлогу выканкомаўскіх калідораў. І гэты ліст паперы, што яна чытала, быў не толькі вонкава — машынка папрабівала яе навылёт (замест «о» скрозь былі пустыя вочкі), — але і зместам быў падобны на той, што яна ўжо некалі чытала. Па вуліцы з грукатам каціліся трамваі, а ў галаве, у памяці, якой не падуладзен і час, і адлегласць, райвыканкомаўская сакратарка Каця малаціла так, што старая машынка ляскала і скрыгатала кожным сваім суставам, як каменедрабілка, і, здавалася, вось-вось разваліцца. Сакратарка працавала хутка, страчыла, як кулямётчыца, але за граматнасць не ручалася, спасылаючыся на свае шэсць класаў і сёмы калідор. Паўлавіч жа меў мо і таго меней тых класаў, хоць калідораў прайшоў... Пад якімі дзвярыма толькі не сядзеў! Пад дзвярыма бюракратаў і адпіхал, абяцалкіных і ківалкіных, і зараз прыйшоў да думкі, што ўсюды трэба свае людзі. А датуль яшчэ верыў у магічнае дзеянне папер, не падазраючы, колькі іх у краіне — каб хто рассыпаў, укрылі б, як снегам, зямлю.

І ў гэтым лісце, што Паўлавіч даў ёй прачытаць, цяпер ужо не на граматнасць, як першы раз, яна гэта разумела, а з нейкай іншай прычыны, было ўсё як тады, усе тыя ж праблемы: і занятасць насельніцтва, і актывізацыя малых гарадоў, так званых пасяленняў застойнага характару, аднабокае развіццё прамысловасці і сацыяльныя фактары, пра якія забывацца нельга... І зноў ён пагаджаўся з тым, што пры будаўніцтве прадпрыемстваў у малых гарадах разам з выдаткаваннем сродкаў на аб'екты асноўнай вытворчасці неабходны і затраты на невытворчыя фонды (жыллё, кінатэатры, дамы культуры, пральні і лазні). Так, ён зноў пагаджаўся з гэтым, але нічога грунтоўнага, як тады здавалася Анюце, не мог супрацьпаставіць, апрача цьмянага, неканкрэтнага «маральнага фактара». Але цяпер за

гэтым фактарам яна бачыла людзей, сваіх местачкоўцаў, хаты якіх, як гнёзды, укрытыя зялянінай дрэў, усё глыбей і глыбей урастаюць у зямлю, беднасць, якую ўсё цяжэй прыхарашыць песняй і жартам, захаваць за бадзёрай прамовай.

І адрасы, куды Паўлавіч накіроўвае свае прашэнні, былі ўсё тыя ж. Да аднаго з іх і яна мела дачыненне, хоць ускоснае. Таму ён і адшукаў яе, прасіў прасачыць, напомніць, калі ведае каго з плануючых устаноў, маўляў, якраз складаецца пяцігадовы план... «Я зразумеў, — гаварыў ён, — начальства вырашае толькі глабальныя пытанні: будаўніцтва буйных ГЭС, заводаў, каналаў, а маё трэба правесці праз ніз... Малыя справы рашаюць малыя начальнікі, вялікія — толькі візіруюць».

На развітанне сказаў: «Не забывай мацеру». І ў гэтым, яна адчула, было штосьці іншае, што ён атаясамліваў з маці і што яна не павінна была забываць.

Пасля той размовы з Паўлавічам яна і прыйшла да Кавалёва, які працаваў у сектары размяшчэння прадпрыемстваў мясцовай прамысловасці. «Можа, тады гэта ўсё і здарылася. Пацiху прарастала ў душы, як семя ў глебе, пакуль аднойчы пасля цёплай навальніцы не ўзышло», — думала не раз потым, а тады села насупраць, усміхнулася. О, як яна помніць усе свае гаворкі з ім, да драбніц. Узбуджаная, што агнём гарэла, галава, як магнітафон, узнаўляла старыя запісы.

«Заплануй што-небудзь у Цішы».

«Якія там рэсурсы?»

А яна чамусьці пачала яму расказваць пра дзядзьку Васіля, у якога ўсё жыццё не было работы, хоць рукі меў залатыя, але перабіваўся па людзях — то печ каму пераказдзе, то дах пакрые...

Кавалёў спачатку пазіраў на яе крышку здзіўлена і, магчыма нават, збянтэжана, потым разглядаў адкрыта і з цікавасцю, яны ж былі мала знаёмыя. (Пасля супрацоўнік яго сектара, развязны, языкаты пашляк Цёскін, сказаў ёй пра ўражанне Антона пасля яе візіту, выказанага нібыта яму: «Да-а, у гэтым доме ёсць жанчыны, але з гэтай я хацеў бы заімець дзела!» Але тады яна не надала ўвагі балбатні Цёскіна, адмахнулася і забыла.)

Антон Кірылавіч, здавалася, не слухаў яе, і яна падумала: «Навошта я ўсё гэта расказваю?» А ў памяці зроку (і бывае такое): дзядзька Васіль сядзіць на лаў-

цы, пазірае туды, за раку, дзе ўзвышаецца цагляны будынак клуба калгаса «Чырвоны бераг», глядзіць, бы наглядзецца не можа. Клуб пабудавалі, і ў яго зноў няма пастаяннай работы, зноў, як батрак, ходзіць па людзях.

Антон Кірылавіч усміхнуўся:

«На жаль, у гэтай пяцігодцы я не гарантую пастаянную работу твайму каларытнаму дзядзьку Васілю, — жартуе ён, але гэта ўсё сур'ёзна. — Няма дастатковай інфраструктуры. А сувязь? Адна разбітая шасейка».

«Але існуе маральны фактар — незанятасць. Трэба ўлічваць і выявіць магчымасці актывізацыі малых гарадоў хаця б з наяўным, сціслым узроўнем капіталаўкладанняў».

«Ёсць супрацьлеглая праблема: старэнне насельніцтва...»

«У якой ступені прагнозы аб далейшым старэнні насельніцтва адпавядаюць рэчаіснасці?»

«Прафесар Дабравольскі на гэта пытанне адказвае так: «Пры ўсёй умоўнасці, уласцівай перспектыўным падлікам насельніцтва, менш сумнення выклікаюць перспектывы росту насельніцтва пажылых узростаў. Бо людзі, якім у будучым выпадае стаць пажылымі, ужо існуюць у момант састаўлення такіх прагнозаў, а веданне зыходнай базы перспектыўных падлікаў з'яўляецца сур'ёзнай гарантыяй іх рэальнасці. І так, мілая Ганна, як вас, Цітаўна, да якіх высноў мы прыйшлі? Што не варта нам агарод гарадзіць».

Антон зноў усміхаецца:

«Ты не сумуй, галубачка. (Як гэта ласкава ў яго гучыць.) Якраз пад тваёй Цішай — аграмадныя залежы сланцаў. Праўда, вучоныя даказваюць, што выкарыстанне іх не эфектыўна. Але прыйдзе час — і, як гаворыцца, «здесь будет город заложен».

Так гэта ці толькі ёй здалося, што ён мелькам зазірае ў разрэз яе кофтачкі на грудзях. І Гэлечка пазірае з абурэннем...

Пры чым тут Гэлечка? Яна слухала іх гаворку, потым зморшчыла нос:

«Ну і сумота з вамі. Смертная. Пайсці, хіба, да Евы, развеяцца».

«Але пры чым тут Гэлечка?» .

І вось гэта нядаўняе...

«Я магу, канечне, пачытаць ваш артыкул, але ж... —

Антон так блізка, зусім побач, — але ж так ззяе сонца і ўся прырода проста млее. Ці не праўда?» — Ён пакручвае на пальцы ключык ад машыны. А Гэлечка пачынае, нібы са злосці, біць па клавішах машынкі.

Як блытае ўсё, крышачы час і адлегласць, памяць. Гэта ж цяпер... Цяпер... Так, не лёгка мець маладую суперніцу. Алс ж і яна, мусіць, нервуецца. Ага, не на жарты ўсхадзілася. А-а-а, зараўнавала.

«І наогул я зматваюся ад вас. Надакучыла пісаць і перапісваць вашыя пражэкты! Іх усё адно пакладуць пад сукно!»

«Не гавары глупства. Гэта ўсё калі-небудзь будзе здзейснена. Яны будуць закладзены ў народнагаспадарчы план».

«Калі-небудзь... А мне трэба цяпер, цяпер...»

Яна прыкрывае вочы і абапіраецца на сціснуты кулак.

Цікава... Усім цікава. Вунь як яны павярнуліся сюды. Якія ж у яе прэтэнзіі, і што яна хоча цяпер. Яны ўсе ўсміхаюцца, сочаць спадцішка. Ага, відаць, гэта зразумела не толькі ім траім. Чым жа скончыцца гэта суперніцтва. Гэлечка, канечне, гадоў на дзесяць—пятнаццаць маладзей за Ганну Цітаўну. Яе загарэлыя з сінімі пражылкамі падколенцы ўвесь час зазыўна аголены. І світэрык замалы, можа, на два памеры меншы, абцягвае яе так шчыльна, што два невялічкія гузыркі спераду тырчаць, як дзічкі.

«Значыць, трохкутнік. Традыцыйны бязглузды трохкутнік, і адзін куток яго завельмі востры. І ці не стане ён тупым, калі яна напомніць яшчэ пра адну дзеючую асобу?»

«Не забывайце: ён жанаты». І ў самой нешта зашчаміла ўнутры пякучым болем. «Ну і няхай, няхай». Яна ніколі чамусьці не раўнавала яго да жонкі. Яна нават хацела з ёю пазнаёміцца, сысціся, але разумела: гэта амаральна, гэта пачварна.

«Вось вы пішаце, па перапісе насельніцтва на кожныя сто мужчын прыходзіцца сто дваццаць жанчын...»

«У вашым узросце, па-мойму, сто дзесяць» (Ганна Цітаўна чамусьці з ёю на «вы»).

«Няхай сто дзесяць. Але чаму я павінна ўваходзіць у гэту дзесятку. Чаму? Не-е. Прабачце...»

Яна зноў са злосці б'е і б'е па клавішах.

«Слухайце, кашмар (гэта яна, мусіць, дайшла да вы-

кладак дэмографа і статыстыка Паеўскага). У двухтысячным годзе нас будзе 455—470 тысяч! Нічога сабе, цэлая армія старых дзевак. Не-е, гэта абуральна!»

Антон пазірае на яе юрліва, позірк яго гаворыць: дзяўчынай пара заняцца.

«Не турбуйцеся, Гэля. Вось цяпер вы, дзяўчаты, паводзіце сябе так (я толькі гляджу і здзіўляюся) — курыце адкрыта, інтымныя адносіны выстаўляеце. Думаю, да таго часу норавы падуць ніжэй і будзе афіцыйна дазволена мець палюбоўніцу», — гэта гаворыць Рыгор, Рыгор Рыгоравіч, рахманы стары разваднік.

«Ха-ха-ха», — смяецца ён свайму, як думаў, дасціпнаму жарту. Твар яго быў злавесна ружовы ад частага ўжывання спіртнога, апошнім часам, відаць, ён перайшоў на «чарніла», бо стаў сінець. «Прыстрасціўся» да бутэлькі, калі пайшла жонка... Яны жылі ў вёсцы, настаўнічалі. Спачатку яна паступіла ў аспірантуру — абаранілася, а ён тым часам падгадоўваў дзяцей, потым ён так-сяк узяўся за навуку. А яна пайшла... Узяла развод і скора паехала на два гады ў Венгрыю. Канечне, не адна, а хоць бы сабе і адна...

Гэлечка зірнула на яго знішчальным позіркам.

«Вам гэта не пагражае. Можаце быць спакойны».

«Ды я спакойны». — Гэтага дабрака пакрыўдзіць было цяжка.

Ганна ловіць позірк Антона: ах, як ён зацікаўлены Гэлечкай, нават не хавае гэтага. Нецярпліва пакручвае ключык на пальцы.

Канец рабочага дня. Летняга, спякотнага, вунь нават ліпа абвяла за акном.

«Ну дык хто са мною на прыроду? — пытае ён. — Яшчэ можна скупнуцца».

«Я ўжо і купальнік надзела», — радасна гаворыць Гэлечка.

Антон смяецца задаволена і шчыра.

«Няўжо?» Ён падыходзіць да Гэлечкі і заглядвае ў выраз летняй сукенкі.

Ганна моўчкі адводзіць вочы, нібы яе тое не датычыцца, нібы ёй усё роўна. Яна моўчкі збірае свае паперы. Доўга іх перакладвае, тасуе неяк нервова і зусім механічна, як карты. Мусіць, усё пераблытала.

А потым ідзе дадому і плача. Ага, самым звычайным чынам — плача. І сама не разумее чаму, чаму ёй так горка, так самотна. Ідзе пешшу і кружыць, кружыць

па парку, быццам не ведае, як выйсці. Не трэба ёй гэта, не трэба, але так здарылася нечакана. Як яна магла дапусціць? Як яна не ўпільнавала сябе? Як цяжка... Як цяжка, няма горшай мукі. Гэта ўсё ад таго, што яна гэтак доўга чакала, спадзявалася, што яе будуць шукаць. Але рыцараў няма — не тыя часы. А гэта ёй трэба перажыць. Сама, сама вінавата. Хацелася палашчыць сэрца, памарыць, папакутаваць гэтай салодкай пакутай, знемагаючы ад яе. Застарэлая, наіўная дурніца. А мужчынам — некалі, асабліва такім дзелавым, як Антон, яны ведаюць, што жывуць толькі аднойчы ў гэтым пераменлівым свеце, у гэтым хуткаплынным часе, і чаго не ўзяў сягоння, заўтра, таго можа не быць, а калі і будзе, раптам не спатрэбіцца. Жыццё кароткае. Гэта спачатку здаецца, што наперадзе такі прасцяг, і то здаецца толькі, можа, да дваццаці — дваццаці пяці гадоў. А потым — у сорак — пакоціцца, як камень з гары.

Білася сэрца, звар'яцелае, калаціла-калаціла ў грудзі, грукала, нібы хлапчук кулакамі ў дзверы цёмнай каморы, у якой заперлі яго, гуляючы ці дурэючы, сябрукі і — забыліся.

Пастаяць і суцішыцца. Разабрацца, абдумаць, што здарылася. Толькі ж учора, здалося, ён чакаў яе. Відаць, чакаў, бо, калі яна зайшла да яго, з нейкай палёгкай і мукай сказаў: «Як ты доўга не заходзіла». Падышоў і мякка паўабняў яе, злёгку дакрануўшыся грудзей. Агнём абдало галаву, усё цела, яна ледзьве ўстаяла на нагах. І ён гэта, мусіць, заўважыў, але не зразумеў, спужаўся, хуценька адскочыў. «Ах, дурніца, беспрасветная дурніца... Ён жа чакаў! А ты панесла нейкую лухту пра тое, як багата ў цябе прыхільнікаў. Вось і сёння шафёр аўтобуса чакаў на прыпынку. Дурніца... Так, хлопчык-шафёр клікнуў цябе. Бо ведаў: кожны ж дзень ты садзішся ў яго аўтобус на ціхім прыпынку, дзе толькі два-тры пасажыры. А гэта — аўтобус падышоў, а ты стаіш, бы не бачыш яго. Вось ён і піпікнуў, пачакаў, а ты ўсё стаяла, як зачараваная: думала пра яго, пра Антона, ты забыла пра ўсё на свеце, нічога не бачыла і не чула, апрача яго твару і голасу. Шафёр потым высунуўся ў акно кабіны і сказаў: «Вы паедзеце сёння ці не?» Ты тады спахапілася, кінулася ў адчыненыя дзверы аўтобуса, якія паволі ўжо рухаўся. А цяпер сказала Антону зусім іншае, быццам шафёр цябе знарок чакаў. Чаму ты гэтак зрабіла? Набівала сабе цану? Ці спужалася? Спужалася яго па-

пору, зноў захацела аддаліць тое, чаго чакала. Спужалася... Не, пабаялася, што вось так ліхаманкава ўзгарэўшыся, гэта полымя ачахне, зноў стане холадна і няўтульна і ўсё скончыцца.

Яна бачыла, як ускіпеў Антон, аж ускінуўся падбародак.

Ён тут жа выклікаў Гэлечку, нешта стаў ёй гаварыць, адчыніўшы шырока дзверы. А-а-а, ён выганяў цябе, а ногі твае не ішлі. Нешта ён і табе гаварыў, толькі ты не чула. І Гэлечка была нейкая спачатку разгубленая, кусала губы, ламала пальцы, а потым ускінула пагардліва галаву. Яна не дурніца, яна ведала — ён абараняецца, закрываецца ёю ад цябе.

Не, жыць так далей было немагчыма... «Я патанула ў той рацэ, — падумала яна. — Я ведала, што так будзе. Я патанула ў той рацэ... Я патанула ў той рацэ...»

Яна не вельмі надавала ўвагі снам, адно было цікава, як часам крыва, коса, а то прыгожа і ўзнёсла адбівалася ў іх рэчаіснасць, успыхвала, быццам полымя, фантазія ў ніколі нядрэмным, непазнаным самім чалавекам механізме, у памяць якога, як у электронную машыну, закладзены факты, падзеі, пачуцці, вобразы. І на аснове іх, — чуць толькі паслабіў кантроль чалавек, — пачынае выдаваць сумесь фантазіі з рэальнасцю.

«Я ж патанула ў той рацэ...» Якраз перад гэтым сніўся сон. Чаго яна пераходзіла ўброд раку? Недалёка ад моста? Чаго ёй трэба было на той бераг? А-а, там стаяў ён, Антон, а ўзбягаць па выспе на мост, бегчы праз яго, даўжэзны, не скора. Ды ў дзяцінстве на той бераг яна ніколі не хадзіла праз мост. А вось так — сукенку ў рукі — і перамелам. І гэта пайшла напрасткі. Вада да каленяў, вышэй... Па грудзі... Чаму яна не плыве, а ідзе па дне? Ступакі вязнуць у перамытым, тугім донным пяску... Чаму яна не плыве?

Вада цягне да сябе, мякка, пяшчотна лашчыць грудзі, і здаецца, што гэта яго рукі. Яшчэ помніўся той нечаканы дотык... І нельга дыхаць ужо — вада цягне на дно ў мяккі водарасцевы ложак. Але так хочацца яшчэ хоць раз зірнуць на яго. І яна рванулася ўгору, нават рукою яму махнула, валасы абляпілі твар, як водарасці. Але ён стаяў, як бы нічога не бачыў. І яшчэ раз яна рванулася, але, ужо знямоглую, павяло яе ўбок, ногі не намацалі дна, вада завірыла, закружыла яе да самапрачэння. «Я патанула... — падумала яна. — Чаму Ан-

тон не падаў мне рукі? Не ведае. Я патанула, а ён не ведае».

...«Я патанула ў той рацэ», — паўтарала яна, спрабуючы запэўніць сябе, што ўсё скончана. І не варта думаць пра гэта. Божа мой, — жахалася, — каб ведаў Мікалай, пра што я думаю. Не, не, трэба ўзяць сябе ў рукі. Трэба працаваць. Я патанула... а жыццё працягваецца... І мы разам працуем, не ў гульні гуляем. Ніхто не ведае, колькі сілы трэба было сабраць, як закілзаць сябе, каб прыйсці назаўтра і сказаць:

«Жыццё працягваецца, Антон Кірылавіч. Давайце працаваць».

Упершыню гаварыла з ім на «вы».

Ён таксама, відаць, абдумаўся, затрывожыўся, і гэтыя яе словы «давайце працаваць» былі як выйсце з той ніякаватасці і недарэчнасці адносін, якія адначасна ўтварыліся між імі і здаваліся, мусіць, і яму таксама, непраходным балотам. Як энергічна ўхапіўся ён за работу, сам дапамагаў Паўлавічу дабівацца будаўніцтва, звёў з патрэбнымі людзьмі, закінуў слова, абгрунтаваў неабходнасць на Палессі асфальтабетонных заводаў, маўляў, як падмурку і базы пяцігодкі дарог. Неўзабаве з'явіўся яго артыкул у рэспубліканскай прэсе, дзе сур'ёзна і заклапочана прапаноўвалася назваць будучую пяцігодку — пяцігодкай дарог.

## 9

Адганяла ад сябе думкі, а яны яшчэ назольней лезлі ў галаву, блыталіся, рэальнасць упляталася ў мроі, а мроі ахутвалі рэальнасць. І жыццё ўжо не здавалася такім складаным і хісткім. А хто сказаў, што яно магло быць іншым? Ну, добра. Сустрэлася б з тым хлапчуком, што разам елі яблыкі. (Ты не спытвала. Ну, добра. Ты не спытвала, ён — еў, а ты, затаіўшыся, слухала хрумсценне.) Знайшоў бы ён цябе. І сталі б жыць-пажываць і дабро нажываць. На тым і казцы канец. І не было б ні Мікалая, ні Антона. Антона? — запратэставала душа. — Як жа? Мы з ім разам працуем, у нас адны думкі, погляды. У нас з ім адна справа, адно «дзіця», хворае, неразумнае. З-за яго баліць сэрца і ў Антона. Толькі ў мяне па-мацярынску роспачна, а ў яго стрымана, затосна, мусіць, як заўсёды ў мужчын.

Якое «дзіця»? Пра што ты? Хіба толькі ветрам занесла... А-а, гэты заводзік... Прыеду, і Антон запытае: «Ну, як там наш выпладак? Капціць?» — і адвернецца да акна і будзе доўга моўчкі глядзець на шаматкую лістоту ліпы пад акном. І я адкажу: «Гэта ўсё ад таго, што ты мяне не любіў, ад каханых вырадкаў не бывае». Не, ніколі так не скажу. Толькі падумаю. І абое мы будзем пазіраць, як хвалюецца на ветры лістота, як яна дыхае, а можа, задыхаецца? І позіркі нашы сустрэнуцца, але ў іх не будзе нічога, апроч клопату і самоты. І ніхто ніколі не дазнаецца, што ў нас (у яго і ў мяне) там, у надзейнай схове душы. І я скажу яму: «Трэба нешта рабіць», — думаючы пра сябе і пра яго, а ён будзе думаць пра той заводзік, што труціць усё навокал, і адкажа: «Ты ж ведаеш, у нас лягчэй пабудаваць, чым закрыць».

А каб жыццё павярнулася не гэтак?

І жывая была Любка. Яна ж адна ведала Анатолева прозвішча, адрас.

«Люба, Любачка, Любка».

Наяве ці ў сне — не зразумець — яна бачыла яе: абгарэлыя бровы, вейкі, твар невыразны. А можа, яна забыла яе рысы. Люба, Любачка, Любка лавіла ротам паветра, захліпалася, заходзілася ад болю, і сінія яе валасы чамусьці парудзелі, сталі як пакулле. Не, не, гэта не яна. Дайце ёй паветра, расступіцеся, людзі! Расступіцеся... І пакладзіце яе далей, каб не даходзіў дым. Ёй няма чым дыхаць...

Дым, дым, дым... Ён лезе ў хату, прасочваецца ўсюды праз самыя вузкія шчыліны. Ад яго ажно нудзіць. Анюта стойвае дыханне да болю ў грудзях. А над усім гэтым — хітраваты насмешлівы позірк. Хто гэта? Чаму ён не спускае з яе вачэй, проста душу вывечвае. І руку трымае ў сваёй, і з ёю нешта такое творыцца незвычайнае, сэрца трымціць і часта-часта калоціцца ў грудзях. Яна не можа адняць сваю руку, адпіхнуць яго. І вось так трэба прайсці, як праз пекла, каля дзядзькі Васіля, цёткі Наталлі і маці. Яны пазіраюць усмешліва, паразумела. А маці... Што з ёю? Што яе так узрушыла? Устрапянулася, як птушка, рот прыадкрыла, бы хацела нешта сказаць, насварыцца, можа, ды пры людзях не пасмела. Не, давайце назад, хутчэй да школьнага двара, да «пятачка» ля клуба, адкуль нясецца шчымлівая музыка. А ён так і не адпускае яе рукі, тры-

мае моцна, а можа, яна проста не хоча яе вырываць? Цёпла ёй там, утульна, як ластаўцы ў гняздзе.

Шызы вечар праглынуў Любку, толькі вясёлы смех рассыпаўся па садзе, сярод сонных нерухомых яблынь. Анюта задыхаецца, не ад бегу, ад той ціхай радаснай шчымоты, якой зайшлося сэрца. І хваляванне гэтае яшчэ незнаёмае, ад яго нават крышачку страшнавата. На момант ёй здалося, што трапілі яны ў сад не проста так, а ўлезлі ў яблыкі. І сэрца трапеча ад страху, што вось-вось заспее вартаўнік. Трэба спяшацца. Задыханая, яна спынілася пад разгалістай яблыняй, высокая трава абвіла ногі, прыцемак прасвечваў некалькі бялявых рамонкаў. Анюта разгледзелася, мацнула рукою звіслую нізка галіну, слізганула па лісці. У пальцах засталася невялікая, як сліва, завязь. Яна жахнулася як ад неверагоднага падману. А перад ёю, блізка-блізка, — яго вочы. У прытоенай цішыні здалося, што яна чуе, як б'ецца сэрца, і не ведае — яго гэта ці яе.

«Чаго мы тут? — запытала разгублена, нават са страхам. — Яблыкі ж не выспелі...»

Ён узяў яе руку ў сваю, але яна адхапіла, бы апяклася.

«Люба, Люб-ка-а, дзе ты?» — крыкнула, нібы шукаючы паратунку. Але сад маўчаў. Патрывожаныя яблыні сцябалі аголеныя рукі і твар, калі, не разбіраючы сцежак, бегла назад.

Назаўтра задажджыла. Кроплі дажджу дзяўблі, як кураняты, малады гурочнік, шыбы ў акне.

Любчын голас сцішаны, таямнічы, каб маці не пачула:

«Ты чаму не прыйшла? Ён цябе чакаў...»

«Не задыхайся, Любка, скажы, як яго завуць і адкуль ён? Ты ж нічога не расказала...»

Дым, дым, дым... Мне таксама няма чым дыхаць... Любка, я задыхаюся, Любка! Няма спакою і жыцця. Ссекчы, ссекчы той сад! Ён стары і здзічэлы. Яблыні як калекі. Але хто пасадзіць новы? Хай толькі сыйдзе туман. Не, гэта дым, зноў гэты дым... Што, як і я задыхнуся? Любка, ён жа абяцаў мяне шукаць. Даўно... Хіба я сказала не? Госпадзі, напэўна, сказала. Не магла ж я адразу пагадзіцца... Як было гэта не зразумець?..

Анюта расплюшчыла вочы. Яе ўразіла зыркае сонца і цішыня. Паляжала, прыслухалася: маці тупала на кухні. Зайшла да яе ў чысты пакой, адчыніла акно ў сад,

адкуль тонка і квола пацягнула пахам настурцыі, рэзеды і маладога гурочніку. Анюта ўдыхала яго з асалодай, радуючыся, што ўсё гэта быў сон, толькі сон.

— Бачыш, вецер уначы павярнуўся... — сказала маці. — Сагнаў смурод.

Ніколі раней яна гэтак не радавалася звыклай і простай навіне: вецер пераменіўся. Ніколі не зважала, адкуль ён дзьме. Ніколі не баялася ветру. Але чаму нават у сне пячэ душу горыч? Усё-такі ёсць і яе віна. Як гаварыў Паўлавіч, гэту зямлю яна любіла здалёку, ніколі не задумваючыся, не пытаючыся: як жывецца ёй і таму гнязду, з якога вылецела, добра ці не ад яе вялікай пяшчотнай любові.

Антаніна Пятроўна зірнула на дачку, нібы выбіраючы момант, каб распачаць гаворку. Але твар яе не падабаўся, выклікаў трывогу — бледны, сінякі пад вачыма. Вось і муціць яе, есці не можа. Западозрыла: панесла, мусіць. Што ж, не старая... У самай моцы жанчына. Адзначыла, што гэта добра было б, дзеці мацуюць сям'ю.

— Як мой там унучак? — уздыхнула яна. — Гэта ж трэба, на ўсё лета заперлі ў піянерскі лагер...

— Мама, ён на моры... Купаецца, загарае. Ды і лагер не піянерскі, а спартыўны, ён ужо дарослы чалавек. У дзесяты пойдзе.

— Гляджу на вас — неяк не так жывяце. Неяк кожны сабе.

— Жыццё такое. Вось і Мікалай, відаць, паедзе на два гады за мяжу. А я, ведаеш, пераехала б на гэты час сюды, дадому.

Тут маці не вытрымала.

— Ці ліха табе там? Нашто было дысертацыю абараняць? Працуй сабе...

— Тэарэтычна праблемы малых гарадоў болей не існуе. Тэарэтычна... — Анюта сумна ўсміхнулася. — А практычна застаецца адно: зруйнаваць гэту нашу Цішу, пакуль яна не разваліласся сама. І ўсё...

— Ты не выспалася. Твар асунуўся...

Яна пазірала з трывогай на дачку, падумала: «Добра, што вецер павярнуўся. Каця таксама скардзілася, што вельмі настрой псуецца, аж вочы засцілае туманам, і з галавою нешта робіцца».

— Рушыць прасцей. На гэта розуму не трэба, — даводзіла ўслых Анюце. — Трэба людзям памагчы гэтыя дамы паднавіць...

— Мама, помніш, пасля вайны табе ўсе неслі перакройваць шынялі, сукенкі, перашываць са старога на новае. А ты марыла шыць плацці з тонкага крэпдэшыну ці шыфону, каб было адчуванне, што ўбіраеш нявесту, а не жабрака. Так і мы. Колькі ж перакройваць старое на новае. Трэба глядзець у заўтра.

— У заўтра і глядзелі, мусіць, як і гэты заводзік ставілі. Ета каб людзям дыхаць няможна было, — не сцярпела Антаніна, ажно ўзлавалася.

— Мама, ты ведаеш, што тады трэба была хоць якая, хоць невялічкая прамысловасць. Як Паўлавіч дабіваўся, каб хоць што...

— Дак вот і на табе, божа, што нам нягожа.

— Прадукцыя яго згадзіцца пры будаўніцтве іншых аб'ектаў: гароднінасховішчаў, перапрацоўчага камбіната...

Анюта спахапілася: не пра тое яны гавораць з маці, развялі навуковую дыскусію. Пра гэта яна будзе гаварыць у райкоме.

— І калі ж гэта будзе? — папытала Антаніна.

— У перспектыве.

— А-а, то і нечага бунтаваць народ. Няхай дажываюць спакойна. А то сёння ішла, дак людзі бядуюць, як будзе з месца зрывацца, як пасёлак будуць зносіць.

Анюта пачала ёй тлумачыць пра неабходнасць перапрацоўкі сыравіны на месцы, пра тое, што дзяржава зараз ідзе насустрач ініцыятыве з месц па выкананні Харчовай праграмы, заадно можна вырашыць і шэраг сацыяльных пытанняў.

— Гаворыш як па радыё. А толькі табе скажу як маці, — яна запнулася, — ты зрабіла, што прасілі: падлічыла, абгрунтавала і жыві сабе там, дзе жывеш. Я ведаю, цябе сюды зманьваюць — абяцаюць райфінаддзел, потым выканком. Думаеш, я не ведаю. Але ты паслухайся мяне. Я цябе прашу... — маці сказала апошняе жаласліва, нібы просячы яе. — Людзі яшчэ не разабраліся, што да чаго. Прывыклі тут, ды і ў кожнага свае прычыны...

— Мама, я думала, людзі будуць рады, — разгублена сказала дачка, — я ж дзеля іх старалася.

— Рады і людзі, канечне, але не ўсе.

— Што ж яны за людзі такія? Што ім, і так дрэнна і гэтак.

Яна выйшла на падворак. Мякка, хораша грэла сонца. Прысела зноў на лавачцы пад вішнямі.

«Што ж яны за людзі такія?» — зноў, як некалі ў юнацтве, задавала сабе гэта пытанне.

Усё жыццё яна старалася зразумець людзей. Але...

Памятае, стала працаваць кандуктаркай на аўтобусе, як цікава спачатку было, радасна. Кругом свае людзі, да аўтобуса пачалі прывыкаць: «Анютка, падвязі», — толькі і чуваць. А не — яна сама пакліча: «Цётка Марфа, ідзіце, падвязу вас». І шафёр хлопец харошы. Ён крыху сталейшы за Анюту, у арміі адслужыў, на лесавозе год рабіў, цяпер на аўтобусе. Не-не ды яму хто і скажа: «Цішэй ты, Андрэй, вязі, то табе не дровы, людзі ўсё ж». Але гэта па-свойску, нязлосна.

Анюта бачыць яго твар у люстэрка ў кабіне, але пазіраць не пазірае, бо ён так і ловіць яе вочы.

Мчыць аўтобус ад прыпынку да прыпынку. Заходзяць, выходзяць людзі.

«Добры дзень, Цітаўна!»

«Дзякуй, Цітаўна!»

Усе свае людзі, тутэйшыя. Рэдка каго Анюта не ведае, але, аказваецца, яны ведаюць яе. Усе прыветныя, зычлівыя. Але сэрца ўсё-такі штосьці скрабе, нехта другі ў ёй не радуецца з ёю, а трывожыцца. Ой, як трывожыцца!

А чаго, і сама не ведае. Людзі ж усе свае, знаёмыя, і ведаюць яны Анюту вось такенькаю яшчэ, не адзін на руках яе трымаў. І яна іх ведае — яны людзі не благія — той яблыка ёй некалі сунуў у руку, той абаранак, той у кіно правёў...

Яна толькі цярэбіць у руках рулончык білетаў, пакручвае яго, пазірае на людзей. Вунь цётка Хадора ў сумку палезла, мусіць, грошы дастае. Не, толькі кашалёк праверыла, ці на месцы. І раптам замітусілася: а-я-ёй, хату сваю праехала. Напусцілася і на Анюту, і на Андрэя, чаму не спынілі, што яны — хаты яе не ведаюць...

Прыкра на душы. Жаліцца Андрэю:

«Толькі «дзякуй» і гавораць. А што я тыя «дзякуй» буду ў касу здаваць?» «Не бяры да галавы. Прывыкнуць», — суцяшае ён. Яму ж таксама яны свае, тутэйшыя.

І вось яе выклікаў Паўлавіч. На «дзень добры» нават не падняў галавы, як не чуў: злуецца, мусіць, незадаволены.

«Вось што, Цітаўна...» — пачаў неяк неахвотна, без запалу, падалося, нават здзекліва, бо не любіла, калі яе звалі, як старую, па бацьку.

«Анюта я», — паправіла яна.

«Дык вось, Анюта, — Паўлавіч узяў новы разгон, — не задаволены я табою. Спадзяваўся на цябе. Ведаў, не хцівая, зможаш працаваць. Што ж выйшла? Ганяем аўтобус з ранку да вечара, а выручка — дробязь. Ці мо ахвотнікаў няма ездзіць?» — ён дапытліва падаўся тварам да Анюты, зазірнуў у вочы, каб не даць схлусіць.

«Не, чаму, ёсць», — ціха адказала яна. Але ён нібы не пачуў яе сцвярджэння, працягваў:

«Калі няма, навошта ж нам траціць сродкі і сілы, аддадзім аўтобус, няхай ходзяць пешшу, як дагэтуль. Аддадзім на міжгародныя маршруты — і справе канец».

Ён памаўчаў, зірнуў на яе дапытліва, дадаў:

«І ты не на сваім возе едзеш — каго хачу, таго качу...»

«Яны самі білетаў не бяруць, як іх прымусіш? Свае ўсе, знаёмыя...»

Анюта гатова была заплакаць. Самае крыўднае было тое, што яна гэта прадчувала, ведала сама, але не хапіла настойлівасці, смеласці. Хацела быць добраю. А яно вунь як павярнулася.

«Вазьміце каго чужога, каб нікога не ведаў. Чужому будуць плаціць».

«Ага, ты скажаш, — хмыкнуў Паўлавіч, — мо яшчэ з Мінска прывезці кандуктара? У нас сваіх недзе прыстройваць. Палічы, колькі вас скончыла школу, дзе працаваць будзеце? Сказала!» — Ён, яшчэ нібы здзіўляючыся, хітнуў галавою.

«Вось што, — ужо строга сказаў Паўлавіч, — ты мне гэта кінь! Трэба быць стражэйшай з людзьмі. Ты зразумей, — даводзіў ён, — табе даручана дзяржаўная машына, дзяржаўная работа, усё, што ты на ёй заробіш, — дзяржаўнае. Як могуць быць такія адносіны ў савецкай дзяўчыны? У камсамолкі! Каб мне з заўтрашняга дня ніводнага пасажыра без білета не было, а калі ты такая добрая, то сама ім купляй білеты. Усё!»

...Раздвойвалася душа. Рабіць, як казала маці: да

людзей трэба гарнуцца ці, як раіць ён, быць стражэйшаю, — усё адно, як зрабіцца чужою?

Рэдкае, шараватае святло цадзілася праз шыбіны ўсё смялей і вальней, увачавідкі вымалёўваючы абрысы рэчаў. З прыадчыненага акна ліўся птушыны спеў. Анюта ўпершыню зведала бяссонніцу. Павекі былі цяжкія, набрынялыя слязьмі. Ноч здалася празмерна доўгаю, нібы год. За колькі летніх цёмных гадзін яна зноўку пражыла сваё кароткае жыццё, перагледзела яго, пераацаніла, шкадавала і суцяшала сябе, на адзіноце шукала вінаватых ва ўсім. Як веснавая рака, вірыла душа, імкнулася знайсці новае рэчышча, загасіць горыч.

Ціха да ложка падышла маці:

«Дачушка, пара», — сцішаным голасам, шкадуючы будзіць, сказала яна.

«Нікуды не пайду», — парашыла Анюта.

Праз нейкі час яна зазірнула зноў.

«Не ўстала ты? Захварэла, ці што?»

Яна борздзенька падышла да Анюты, паклала на лоб далонь, пасля, як бывала, калі Анюта была маленькай, прыпала да лоба вуснамі, каб без усякіх тэрмометраў адчуць, «гарыць» дзіця ці не.

«Заленавалася, два тыдні парабіла і заленавалася», — сказала, з дакорам ківаючы галавою. Потым, пастражэўшы, загадала зараз жа ўставаць.

«Ні за што!» — трымалася свайго намеру Анюта, але і сама не заўважыла таго, як абвастраецца слых, як ловіць гукі вуліцы. Вось амаль улоўна піпікнуў аўтобус, коратка, як заўсёды. «Мусіць, Андрэй думае, што я стаю ў вулцы пад ценем грушы, як бывае ўдзень». Сігнал паўтарыўся, ужо даўжэйшы, разгублены. І раптам «піппіп» — зусім блізка. Андрэй прыехаў па яе. Затрывожылася, затахкала сэрца; яна падхапілася, сцягнула са спінкі крэсла сукенку. «Не», — кінула яе як папала, легла і накрылася коўдраю.

«А людзі мае, дык што ж гэта такое?» — занепакоілася маці. Яна села на ложак побач з Анютаю, абняла за плечы. Сказала знарок сярдзіта: «Уставай, Анюта! Чуеш, Андрэй прыехаў. Не дачакаўся цябе... Людзі на работу спозняцца. Яны ж спадзяюцца на аўтобус, на цябе!»

На парозе стаяў Андрэй. Разгубленым позіркам ён акінуў хату, быў тут упершыню, павітаўся. Ускінуў галаву, бы толькі рухам пытаўся: што здарылася?

«Вось што, — Анюта села на ложку, напяўшы да падбародка коўдру, — ты каці, — сказала яна. — Я не буду болей працаваць!»

На кухні нешта засіпела, затрашчала: мусіць, закіпела варыва, і маці кінулася да керагаза.

«Ён на цябе сварыўся?» — ціха, як змоўшчык, запытаў Андрэй.

Анюта адмоўна пахітала галавою. Яна сядзела, засланіўшыся коўдраю, і не падымала вачэй. Ёй было сорамна, што сядзіць вось так перад ім, — няёмка, нязручна.

«Ідзі адгэтуль, — прамовіла, — я апрануся».

Андрэй усміхнуўся. Добра, проста і шчыра.

«Чакаю цябе», — сказаў ён і падаўся на кухню.

«Андрэй, — з трывогаю спытала яго маці. — Дык што здарылася?»

«Русаковіч, мусіць, нешта сказаў. Ён і мне гаварыў: аўтобус ганяеце, а толку ні на грош».

Маці задумалася, параіла: «То вы рабіце так, каб добра было...»

Маці заглянула ў дзверы чыстай паловы, дзе апраналася Анюта. Павесялела.

«Халаднавата, дачухна, сёння. Мо і дождж збярэцца, бач, захмарылася ўраз неба. Вунь тую сукенку надзень, шарсцяную, вішнёвую».

Гэта была самая лепшая, святочная Анюціна сукенка з карункавым каўнерыкам. Анюта сумелася, завагалася.

«Надзявай, надзявай. Да свята новую пашыю».

Ой як цяжка было Анюце! Колькі цвёрдасці, душэўнай сілы і нават дзёрзкасці спатрэбілася, каб сказаць тыя некалькі слоў людзям, якіх лічыла, як не кожнага, амаль раднёю. Не, не лёгка ёй было. Яны яе чакалі...

«Нешта ты запазнілася, Цітаўна, — весела папікнуў дзядзька Васіль. — Дзве цыгарэты скурыў. А кожная — скарачае жыццё на пятнаццаць хвілін. Во што выходзіць: на трыццаць хвілін раней адкінуся».

«А яшчэ на колькі кожны кілішак скарачае да ўсё разам падлічыць...» — сказала яму важная, як капа, Тоця.

Павесялелыя, ажыўленыя садзіліся ў доўгачаканы аўтобус.

«Толькі глядзі, Анютка, каб зноў не праехалі», — папярэдзіла цётка Хадора.

Анюта строга маўчала, не ўзнімала ні на кога вачэй.

«Ці здарылася што?» — запытаў дзядзька Васіль.

Голас яго быў спачувальны, лагодны, але ад гэтага Анюціна сэрца чамусьці зашчымела непрыемна, зласліва.

«Здарылася!»

На ўвесь аўтобус надрыўным голасам, як бы не сваім, сказала яна. Стала ціха.

Усе, хто быў у аўтобусе, настрыліся, пазіралі на Анюту.

«З сённяшняга дня, запамятайце, — гаварыла яна, а вочы ні на кога канкрэтна не пазіралі, — вы ўсе будзеце браць білеты! Хто не хоча, хай ходзіць пешшу!»

Анюта бачыла, як ускінуліся здзіўлена позіркі, відаць, ад яе дзёрзкасці, як запаланіла ўсіх здзіўленне. Маўчалі, ніхто нават не рэкнуў. І яна пайшла ім на выручку.

«Калі хто-небудзь сёння забыўся дома грошы — я пазычу, — яна выняла з кішэні сукенкі кашалёк. — А заўтра — усё!» — сказала Анюта. А ў самой сэрца, збалеўшыся, ныла, не супакойвалася: усе ж свае людзі, тутэйшыя, знаёмыя.

«Дак ето ты нас цураесся, Анютка, — дакорліва і пытліва сказала Тоця. — Ужо, выходзіць, чужыя мы табе, з намі знацца не хочаш...»

Загаварылі яны разам, усе. Яна ж не бачыла іх твараў, слёзы, што стаялі ў вачах, размывалі іх, толькі прыкрасць гняла: «Нічога не зразумелі».

«А я так думаю, — уставіў слова рахункавод, звычайна ціхі, сціплы чалавек, — яна праўду гаворыць. Колькі такіх во знаёмцаў ездзіць. А дзеўчыне трэба план. Падлічы...»

«Вось ты і падлічы на сваіх кругляшках», — адмахнуўся дзядзька Васіль.

«Не, не, ты слухай! Чаму ты вось едзеш дарэмна? Яна табе хто? Суседка. А ў магазіне чаму не бярэш бясплатна, там жа твая сваячка робіць?»

«Параўняў быка з індыкам, — умяшалася Тоця, — то ў яе нястача будзе...»

«А тут, выходзіць, не? От хітры, хітры, ды дурны. У эканоміцы нічога не петрыш».

«Не петрыш... Эканоміка... Куды хапіў. Ды проста на

чорта мне ў кішэні гэтая дробязь. Мала возьмеш — згубіш, болей — прап'еш».

«Аддай за месяц наперад і катайся».

Гэта бязладдзе галасоў накрыў раптам Хадорын, гучны і хрыплы, як вароніна карканне. Аж нос яе доўгі збялеў, і ў чорнай хустцы яна сама была падобна на варону.

«От жа, людзі мае, па продках пайшла, па продках... Тыя ўсё ваўкамі на людзей кідаліся, усе як з ланцуга сарваліся, усе берaглі лес гэты, калаціліся, людзям шкадавалі. А як Саветы прыйшлі — усё стала народнае. Дык як пачалі людзі лес рэзаць ды вазіць, за колькі дзён толькі лысіна засталася ад Звонкага бору за млынам. Казалі людзі... чуеш, Анютка, пра дзеда твайго расказваю, — звярталася цяпер толькі да яе. — Казалі, месца сабе не знаходзіў. Роў, як вол той, што на бойню вядуць. Яшчэ Хоня-карчмар, нябожчык, расказваў, — зямля яму пухам, — кажа, дзве кварты гарэлкі выпіў, на нагах не стаіць і плача, як дзіця, прыгаворвае: што вы робіце, людзі? Што вы робіце? — а ў самога слёзы, як у бабра таго. Потым мужчыны яго дадому завялі, на печ паклалі, дак ён тры дні не злазіў. Потым жа во самаго раскулачылі... Недзе і згінуў там».

«Бо і багата тады лесу зглумілі. Не глядзелі, секлі, пілавалі... Цяперака кругом ужо і куста няма...» — задумліва сказаў дзядзька Васіль.

«То хіба ягоны быў? Усім належаў! Народны! — горда сказала Хадора. — Пачакай, дай даказаць. І той, з матчынага боку, настырны быў сельсаветчык: папаганяў людзей грэблю рабіць. Але і сам, не скажу ліхога, варочаў зямлю, што трактар. А бацька яе... Відаць, праштрафіўся, бо апасля вайны і носу не паказаў. А кажуць жа, жывы...»

У Анюты ўсё апала ўсярэдзіне, яна села, бо ногі сталі вагкія, як лазіны, а можа, аўтобус гайдала?

«Скруціўся з якою, можа, дак і сям'ю кінуў. А можа, недарма кажуць, што ў лесе бачылі... — разважала Хадора. — Мо за бацьку раскулачанага...»

«І што ты плешчаш, старая! — абурыўся дзядзька Васіль, аж падскочыў. — От няма чаго табе гаварыць. Забылася, як па каноплях ды скляпах ад немцаў хавалася? А твой Хведар у андарак, ха-ха-ха, — дзядзька Васіль рагатнуў, — у бабу пераадзяваўся!»

«А ты што рабіў?! — узвілася Хадора. — Таксама

нідзе не быў, толькі пад канец у армію ўзялі. А то ўсё малаточкам цюкаў. Беркулёзным прыкінуўся...»

Хадора раптам у запале запярэчыла сабе і неўзабаве ўжо, апраўдваючы дзядзьку, дадала:

«Увесь ваш род сухотны».

«Я ваяваў. Паранены быў... Але што з табою гаварыць. Табе каб усё народнае — бясплатна. А ці варта яго ты? Вунь Ларывон падвозіць на работу на сенажаць бясплатна. От каб не ўцякла з бацькамі з Выспы, то і ты б барыняй была. Дык не, калгасаў спужаліся, на гэты бок ракі рванулі».

Дапёк яе дзядзька. Белы Хадорын нос пасінеў, вочы выгаліліся, бы ў горле перасеў вялікі кавалак, і яна не магла сказаць ні слова.

Сапраўды, шмат цішанцаў родам з Выспы ці з Пясочнага. Як калгасы сталі, пакідалі яны і зямлю, і хаты, паўцякалі сюды, перабіваліся з агародаў, сякіх-такіх заробкаў, а ў калгас не пайшлі. Местачкоўцамі сталі. І цяпер не раз паглядалі з цікаўнасцю ў той бок, асабліва ў апошнія гады, калі людзі грошы сталі атрымліваць. Ды і сам дзядзька Васіль сядзіць, бывала, на лаўцы і пытае ў якой-небудзь знаёмай высыпчанкі, калі тая ішла ў напрамак цэнтра:

«Мар'я, мо і ты грошы ў ашчадку нясеш?»

«Нясу».

«Ці багата?»

«Тры тысячы».

«Ого», — толькі і мог сказаць дзядзька. Потым усім расказваў пра тыя тры тысячы. Казаў: «Паўцякалі, цяпер пазірайце туды».

Саступаючы на сходкі, дзядзька Васіль неяк сарамліва торкнуў у Анюціну руку рубель. Падміргнуў ёй весела, моў, усё будзе ў ажуры, як ён гаварыў часта, хоць наўрад ці ведаў значэнне гэтага слова. Тоця таксама сунула ёй у руку дробязь. Перадавалі грошы і іншыя. Але білеты не бралі: «На ліха яны нам, не адрывай, не трэба». — Адмаўляліся.

«Ну, што вы за людзі?! — не сцярпела Анюта. — Не разумею я вас».

... — Глядзі, як разрося сад! — сказала маці, падсеўшы да яе на лаўку. Яна нібы шукала ў дачкі спагады, шкадавання.

— Сад здзічэлы, і яблыні ўжо старыя — трэба высякаць.

— Шкода ж... — са страхам у голасе амаль не прастагнала маці.

— Чаго шкадаваць? Усё трэба зносіць. Падагнаць бульдозер і расчысціць пляцоўку.

Антаніна Пятроўна з жахам пазірала на дачку. «Не, не, нічога ёй тут не міла. Яна чужая... чужая...» І была гатова крыкнуць: «Чужая ты, чужая!» А ўголас сказала:

— Вам бы толькі рушыць. Хіба мала зямлі? Вунь за ракою, дзе некалі быў стары млын, хіба благое месца? Будуй там свае кансервавыя заводы. Людзей сялі. А мы тут дажываць будзем, — сказала ўпарта і адчужана яна.

— Мама, — супакоіла яе дачка, — яшчэ ж толькі плануецца, мусіць жа, вас запытаюць. Не сілаю ж...

— Запытаюць... Цяпер у нас нічога не пытаюць. Нішкам начальства рошыць, і ўсё.

## 10

Цімох неяк перабыў ноч. Доўгай яна здалася і цёмнай. Каб пра што думаў, дык — не. Пуста было ў галаве, ляжаў, як трухляк, толькі косці нылі ды пякло за грудзінай. Змогся, прымгнуў. Здалося, нехта асцярожна пастукаў у акно. Устаў — туды-сюды — нікога. Пакурыў, седзячы ля акна, выпусціў ката, што мяўкаў пад дзвярыма. І сам пастаяў на ганку. На двары было яшчэ шэра, ціха. Толькі недзе на сяле ўскінуўся ранні певень, і яго, Цімохаў, узадраўся за ім і аціх. Забрахаў суседскі сабака. І Цімох успомніў, што наказваў Пракоп з таго канца вуліцы, каб прыйшоў па шчанюка. Цімох быў у Пракопа, пазначыў шчанюка, але за клопатам не змог выбрацца. Пачуў — нехта ідзе па вуліцы. Падаўся да весніц. Пазнаў — Іван Шпак спяшаўся на ферму, а за ім — два «шпачкі», хлапчукі. Кірпаты Саўка, уцягнуўшы галаву ў плечы, схаваўшы рукі ў кішэні, а меншы Грышка відно, што спіць на хаду, спатыкаўся.

— Куды ты іх вядзеш? Добрай раніцы. Яны ж яшчэ спяць...

— Раніцы добрай. Пакуль да фермы дойдуць — папрачынаюцца.

«Вось каб так вадзіў я сваіх, можа б, іначай было...» — пазіраючы ўслед Шпакам, падумаў Цімох.

Людзі гавораць: тры бедствы ёсць у чалавека: старасць, смерць і дрэнныя дзеці. Старасць не абмінеш, ад смерці не адкупішся, а ад дрэнных дзяцей можна ўберагчыся. Але як? З не застылай яшчэ плыні ўспамінаў паказаліся яго дзеці. Анатоль — хто ведае, які цяпер, змяніўся, мусіць, а Жоржык навідавоку, бачыўся, бы стаяў перад ім: бледны твар, асмяглыя губы, лядашчы. А Марыя ўсё яго шкадавала, усё шкадавала... Дашкадавалася.

Успаміны пра Марыю зашчамілі сэрца.

Цімох пастаяў яшчэ крыху на ганку, выгаворваючы ёй за Жоржыка, нібы Марыя была недзе блізка, можа, карміла парсюкоў ці даіла карову. «Вось табе маеш, насілася з ім, як кот з салам», — сказаў ён уголас і здрыгануўся: дайшоў да чаго... Падаўся ў хату, рашыў легчы і такі заснуць. Ніякіх думак у галаву не дапускаў: за вялікі дзень усё перадумаецца, сто разоў перавернецца ў галаве, як варыва ў катле. Але дзе ты заснеш, калі толькі звядзеш павекі, як, пацепваючыся, пазірае ў твар Жоржык, яго Жоржык, якому ён, Цімох, нагледзеўшыся на вайне на смерць і жорсткасць, аддаваў душу, любіў яго як мог. Жоржык для яго быў нібы нанова пачатае жыццё, у якім усё павінна было быць светла і радасна. Ці калі на яго насварыўся, ці, не дай бог, руку падняў? Не, не было такога...

«Ты думаеш, чаго я тут сяджу? Я чакаю паперы...» Усё ўнутры халадзела, нібы ён паміраў. А над ім, яшчэ над жывым, сядзеў чорны груган, чакаў, каб выклеваць вочы. І ён варушыўся, каб той груган не палічыў яго за мёртвага і не пачаў сваю работу раней. Але варушыцца было ўсё цяжэй і цяжэй, цела нібы дзеравянела, ногі — як калоды, і рукі — лясіны з абпіленым голлем. Так і праваліўся ў цемнату, не ўпільнаваўшыся ґругана. Але ненадоўга. Прачнуўшыся ж, не мог даўмецца, ці напраўду гэта тузаў, душыў яго ў картапляніку Жоржык, ці сон... Сам сабе не мог даць веры. Галава была цяжкая, што булавешка бязмена. Выйшаў на ганак і, яшчэ не верачы сабе, зазірнуў за плоцік на бульбоўнік. Сапраўды, перамяты,ператаптаны, нібы мядзведзь па ім паваляўся. Добры мядзведзь.

Стаяць і разважаць не было часу, бо рэзаў вушы тонкі, што бензапіла, парасячы віск. Галодныя куры,

калі расчыніў куратнік, кохкаючы, чарадою кінуліся яму пад ногі, кот і той лашчыўся, цёрся ля ног. Усё вішчала, сакатала, мяўкала, на ўсе лады прасіла есці. Карова занепакоілася ў хляве, шумна цягнула ноздрамі паветра, вынюхвала, ці блізка гаспадар, памыквала.

І Цімох зноў пачаў круціцца, як спіца ў коле, у будзённых клопатах, то размаўляючы з кароваю, то сварачыся з парсюкамі, і патроху забываўся на Жоржыка. Адыходлівае яго сэрца даравала. І сам вініўся перад сабою, трэба было даць пляшку, была ж прыхаваная. Тым, што аднойчы не дасі, піць не адвучыш. Трэба шукаць іншага паратунку. Можа, папрасіць Лаўрэна, ён заўсёды ўмеў з ім гаварыць... А што ён яму скажа? Гэта ж не дзіця, што паслухае. Бяда... Бяда, здаецца, была кругом. І ён цэлую раніцу, такую светлую, — сонца аж шчаміла вочы, — таптаўся па гэтай бядзе, як па гразі. Раз-пораз выходзіў за варотцы, пазіраў у канец вуліцы: няўжо не прыедзе Жоржык? На трэск матацыкла, а яны па вуліцы носяцца туды-сюды — ездзяць і старыя, і малыя, — сэрца яго сцікалася. «Не можа быць, каб Жоржык не прыехаў. Як жа так?» — думаў ён. І ўяўляў, як Жоржык, паставіўшы матацыкл, ідзе да яго па двары. А ён тут пад паветкай, ля варштата. Стругае і стругае вагонку, выбірае калёўкаю роўненькія пазочкі па краі. Тонкая стружка завіваецца, кучаравіцца, як светлыя кудзеркі. Такога колеру валосікі былі ў малога Жоржыка, потым пацямнелі, развіліся, як і не быў кучаравы. Мроіцца, Жоржык садзіцца на кругляк побач, курыць. Цімох не падымае на яго вачэй, ведае: Жоржыку сорамна, ніякавата. Таму і не пазірае яму ў вочы. «Ты, гэта, даруй за ўчарашняе, бацька, можа, я што не так сказаў. — Жоржык хавае вочы. — Чаго не бывае між сваімі... Ды і хмель дурны. Дык ты, гэта, не крыўдзіся».

Цімох, здаецца, дараваў бы яму, але на душы прыкра, горка. Ад чаго гэта? «А і сам добры. Чаго было выкручвацца. Ён цябе толькі за плечы ўзяў, а ты — выкручвацца. Распаліў хлопца. А ён, вядома, п'яны...» Але раптам бы хто халоднаю вадою абдаў, надышоў одум. «Ён чакае паперы... Грошай захацеў. Яшчэ не пахаваў бацьку, а сядзіць чакае, як той груган!»

Ды зноў, крыху супакоіўшыся, развconfigured: «А маць іх туды, гэтыя грошы». Сам, калі ўспомніць, колькі сварыўся з Марыяй і ўсё з-за іх. «Халера на іх, на грошы!»

«Дак нашто ты іх збіраў?» — у думках гаварыў сам з сабою.

«Чалавеку, пакуль жывы, усё трэба. Думаў, сыны падрастуць — хаты трэба будуць. Вунь і лесу нарыхтаваў, смольны, што золата, — пад паветкаю ляжыць. Казаў Жоржыку: не хочаш тут, то давай завязём у Цішу ды дом, як ляльку, пастаўім. А-а-а?.. Яму гэта трэба? Ён у той шпакоўні, аднапакаёўцы, сядзецьме. Кажа, бацька, не бядуй, палучым... Што ён палучыць, за што? Усе чакаюць, у чаргу выстраіліся, як некалі па хлеб. А ці цяжка дом паставіць з гатовага лесу? А-а-а?.. Няхай гіне! Нічога ім не трэба, толькі грошы. Вось ён чаго чакае... А нашто яму, Жоржыку, грошы? Ведама на што — на гарэлку... Бацька збіраў, ашчаджаў усё жыццё, а ён — прап'е. А можа, яно так спрадвеку было: адзін — ашчаджаў, а другі — з рук спускаў, цаны ім не ведаючы. І грошы Жоржык, канечне ж, прап'е. Глядзі, яшчэ з гэтай п'янкі сам загіне...»

Цімох адагнаў прыкрыя думкі, роўненька зложыў, пераклаўшы рэйкамі, каб прасыхалі, дошчачкі. Рабіць больш — рукі не бралі. І ён, замкнуўшы хату, падаўся на другі канец вёскі. Пакуль ішоў, думаў сваю думу пра Жоржыка, пра Марыю, пра грошы. Паланіла, паланіла яго туга. Але людзі не давалі ёй завалодаць ім поўнасцю, завалачы ў сваю цямніцу, — адганялі. Адзін паздароўкаецца, другі нешта запытае, нешта скажа. Сярод людзей — не ў лесе. Ды і сам на людзях рабіўся іншы, выпростваўся, бадзёрыўся. Але сёння не пакідала насцярожанасць: ці ведаюць людзі, што ў яго было з Жоржыкам? Ніхто нічога не пытае, не намякае, значыць — не ведаюць.

Пракоп, гладка голены, кашчавы і, можа, ад таго маладжавы з выгляду, абчэсваў у двары лясіну. Лёгка, спрытна скакала ў яго руках далікатная цяслярская сякера, пазвоньвала, трапляючы на сукі.

— Ты ўсё будуешся, як той бабёр, — пажартаваў Цімох, шукаючы вачыма, дзе сесці. Знайшоў, прымасціўся на парожку варыўні. Пракоп таксама разагнуўся, утыркнуў сякеру ў недачэсанае бервяно, сеў з ім побач. Закурылі.

— Дак што гэта будзе? — папытаў Цімох.

— Гараж. Вянок уніз — і вянок угору на стойках падыму, між імі зашыю дошкамі, ды і добра будзе. Упраўлюся, пакуль Пятро машыну прыгоніць.

— Ну, але...

— Там у горадзе летуе ў двары пад вокнамі, а на зіму — да бацькі.

— То хіба гэтага мала? — Цімох паказаў на збудову ля хлеўчукоў.

— Тут, бачыш ты, свінушнік побач. Кажа, аміяк з'ядае жалеза.

— Які аміяк?

— Ад свіней каторы, смурод... То — аміяк. А ты не ведаў?

Цімох пацісную плячыма.

— Вось і я. Цёмныя мы з табою, — пажартаваў Пракоп. — Дык загадаў: зрабі, бацька, да восені. Ды пастаў далей... От пачаў...

Цімох паківаў галавою. Падумалася сваё: «Каб на добры лад, дак і Жоржык мог бы так рабіць».

Успамін пра яго пакутна скамечыў і так стомлены і маршчыністы Цімохаў твар. Пракоп зірнуў на яго паразумела, паківаў галавою. Ці так здалося Цімоху. Ён паспрабаваў усміхнуцца, але дзе там.

— Ведаеш, шкадую, — Цімох ажно ўздрыгнуў: не хапала, каб яго шкадавалі, — шкадую, што жыццё пражыта. Цяпер бы спачатку ды нанова.

— Ну, яно як патрэніраваўшыся...

— Я не пра тое. Час які... Глядзі: нейкі смаркаты Грышка трыста рублёў у месяц з г... грабе на ферме, а Тося — даярка. У яе ўжо гэтымі нулямі ўся кніжка спісана, проста ў ашчадкасу і пераводзяць...

— А што з гэтага. Дурны чалавек, што ашчаджае грошы. На халеру яны, — з горыччу сказаў Цімох.

— Ну, а ты хіба...

— Я і ёсць найпершы дурань, — загарачыўся Цімох. — Я ашчаджаў, а Жоржык возьме ды іх прап'е. Як пусціць, толькі дымець, халера на яго, будзе. Ды і сам яшчэ дзе... А-а-г, — махнуў ён рукою, маўляў, пра гэта гаварыць — толькі душу травіць.

— Яно так, але ж жыць цяперака можна. Гэта не тады, як мы за голы працадзень... за палачку, — таропка зацягваючыся, гаварыў Пракоп. — Цяпер, канечне, грошы людзям далі, а яны да іх не прывыклі... Распарадзіцца не могуць. Дзецям пруць... А тыя распанелі, пазіраюць на бацькоў, як на парабкаў.

Цімоху не хацелася пра гэта гаварыць. Ён і так з гарачкі сказаў лішняе. «Жоржык прап'е... Ну, канечне ж,

прап'е. А ты думаў... Горшай заразы няма, як гэтыя грошы. Разабрацца, то навошта яны мне? Пенсію не адбяруць. Яна да смерці. Ну, а на якую халеру больш?»

Адагнаў хуценька думкі, што ўжо вязалі яго па руках і нагах, наганялі тугу, сказаў:

— Ты вось мне зубы не загаворвай, нясі майго ганчака. Ці, можа, каму аддаў?

Пракоп усміхнуўся.

— Ото толькі пад нагамі круціўся, за калашыны тузаў, а я з сякераю. Думаю, яшчэ незнарок... Дык узяў ды запёр.

Пракоп пайшоў да адрыны, адчыніў яе. І ўподбег, ледзьве не куляючыся, — аж трэсліся лапушыстыя вушы, — бег шчанюк паджарай масці. Брахнула, павіскваючы, сука, ірванулася за ім, ля варывенькі стала ў стойку, перабіраючы пярэднімі лапамі паветра. Кароткі ланцуг не пускаў яе далей. Пакуль Цімох лашчыў шчанюка, яна стаяла, павіскваючы, і вочы яе гарэлі трывогай і жалем, як у чалавека.

— Ідзі ляж, — супакоіў яе Пракоп. Яна перастала павіскваць, затаіла голас, але не спускала пільных вачэй з Цімоха, ірвала ланцуг, кружыла па двары.

Цімох засунуў шчанюка за борт пінжака, і ён, дурны яшчэ, высоўваў адтуль галаву і тыцкаўся халодным вільготным носам яму ў падбародак, у шорсткую, калючую, няголеную шчаку. І смешна, бы спужана, пырхаў, шчэрыўся.

Цімох прыціснуў яго рукою да грудзей. Так і пайшоў дадому. На вуліцы, пацяплелы душою, паказваў яго, хваліўся кожнаму сустрэчнаму.

— Дзядзька, ваш Жоржык на машыне паехаў, — сказаў яму, сустрэўшыся, суседскі хлапчук, відаць, удзячны, што і яму паказаў шчанюка, даў нават пагладзіць. Хлопчык пагнаў некуды на веласіпедзе, а Цімох захваляваўся, заспяшаўся.

«Жоржык... Ён ведаў, ведаў, што прыедзе. На машыне? Мо правы вярнулі. Начальства, мусіць, пахадайнічала. Жоржык...»

Здаецца, лягчэйшыя і прутчэйшыя сталі ногі, і сэрца прыспешвала іх, ірвучыся наперад.

«Жоржык прыехаў...»

Яшчэ здалёк, ажно ад мастка, што вясною прапускаў пад сабою талую ваду на гэты бок вуліцы ў крыніцу, летам сухую, парослую чубкамі змяльчалага трыснягу,

Цімох пачуў, як недзе, здаецца, праз сілу, прарэзліва і роспачна вішчаў печы вяпрук, бы яго калолі.

«Згаладаўшы так вішчаць не будзе, гэта толькі, як на згубу. Але гэтаю спякотаю хто будзе калоць?» Толькі калі мінуў высахлую крыніцу, даўмеўся, што гэтае свіное галашэнне рвецца з яго двара. А з адчыненых варот, вытыркнуўшы радыятар, як тая свіння між частаколін лыч, стаяў грузавік. Матор, не заглушаны, тарахцеў, і машына трэслася і шыза дыміла. Цімох як урос побач з машынаю. Ніяк не мог зразумець: што гэта робіцца? Два распараныя, чырвоныя, як пасля лазні, дзяцюкі ўспіралі на машыну па адхоне, зробленаму з дошак, аперазаўшы вяроўкамі пад лапаткі, яго вепрука. Ззаду падахвочваў вепрука крапівою ўвесь мокры Жоржык. Валасы яго зліпліся, як пакусціліся, і сталі дыбкі. Вяпрук ірваўся, падаў на заднія падкурчаныя крывыя ногі, якія былі слабай яму апорай, ён ледзьве цягнуў свой сыты азадак.

Цімох спачатку непаразумела сузіраў гэтую валтузню, нібы не толькі ногі, а і мову яму адняло, — ні рэкнуць. Потым ускіпела нутро і паднялося мулам да горла, а з яго ён вырыгнуў пару гарачых, аж апякалі губы, — мацюкоў. На гэты вокліч толькі Жоржык, яшчэ няўцямна, бліскануў вачыма, а тыя, чырванатварыя, і не пачулі.

— Падваж цяпер, падваж! — крычалі яны, і Жоржык хапіўся за ніжнія канцы дошак і стаў напінацца падняць іх уверх, перакінуўшы за борт канец вяроўкі, падскочыў да яго адзін з памагатых. Здаровы, хапіў за дошкі, ані крэкнуў, аж затрашчалі тонкія іх канцы, і вяпрук укуліўся, вішчучы, у кузаў, тыцнуўся лычом у перацёртую на амецці салому, цяжка і хрыпла, як задышлівы, соп.

Цімох кінуўся да Жоржыка:

— Што ты робіш? Навошта?

Хлапец у клятчастай кашулі, — ці не шафёр? — хутка зашчэпліваў задні борт.

— Ты ж сам учора казаў, што здаў бы, ды не прымаюць! — чуць не крычаў Жоржык. — Я і дамовіўся з чалавекам у суседнім раёне!

— Дак што, гарыць?! У бацькі не папытаўшы... Згружай кабана!

Цімох стаяў перад сынам, смурны, касабокі: і твар перакасіўся, і ўся яго пастава. Жоржыку здалося, што ён хавае пляшку ва ўнутранай кішэні. І гэта яго вельмі

займала. А Цімоху заняло дых, ужо і рот перакрывіўся. І ён толькі лавіў паветра.

Нешта зразумелі і Жоржыкавы памагатыя. Хлопец у клятчастай кашулі стаяў, разгублена развёўшы рукі, нібы падрыхтаваўся да вобыску, а другі захадзіў жаўлакамі, паказаў жоўтыя зубы і палез у кішэню па цыгарэты. І спадылба толькі зыркаў на Жоржыка.

— Рашаеш гаспадарку... Бацька яшчэ жывы... Халера на цябе... Які ўпраўны!

Цімохаў голас ірваўся, як гнілая вяроўка, і гэтымі абрыўкамі ён не мог звязаць Жоржыку рукі. Той размахваў імі і даказваў сваё, маўляў, на якое ліха табе гэтыя грошы і гэтыя кабаны. Скупярдзяй няшчасны...

Цімох дзе стаяў, там і сеў — на ўроблены курамі гніланогі зэдаль, што стаяў, прыслонены да сцяны сенцаў. Сеў, сцішыўся, стаў абыякавы, віслашчокі. Нейкае здранцвенне раптоўна напала на яго, паралізавала ўсяго. Не хацелася ні рухацца, ні гаварыць, ні жыць.

Жоржык злаваўся. Толькі той у клятчастай кашулі затрывожыўся. Пабег да калодзежа, выцягнуў вядро вады. Зняў з частаколіны слоік, зачарпнуў і падаў Цімоху. Той глынуў разы са два, ацёр мокраю рукою твар.

— Дзядзько. Мы ж нічога не ведалі. Жоржык папрасіў — вот і... — апраўдваўся ён. — Вы тут самі рашайце.

— А-а-а-г, — спыніў яго ўздыхам і рухам рукі, маўляў, адчапіся ты, хлопец. А хлопец, забраўшы ў Цімоха слоік, рыўкамі, бы апякаючыся, піў калодзежную ваду, і той, другі, не вытрываў, не стаў чакаць слоіка, а хапаў набгом, паставіўшы вядро на бетоннае колца калодзежа. Патаміліся хлопцы, упарыліся. Кабан быў спраўны, пудоў на пятнаццаць... Напіўшыся вады, яны абодва прыселі на слупкі нізкага плоціка, чакалі, што будзе далей, без асаблівай увагі разглядвалі сад, недзе на яблыні сакатала, можа, дражнілася з курамі ці трывожылася, здзіўлялася ўбачанаму сарока. На нядаўна пераматычаныя — дзе падсыхала, а дзе бралася зноў лебяда — грады ўпалі з прысады вераб'і, радасна заціўкалі і заціхлі.

— Ну, паехалі! — скамандаваў Жоржык.

Машына раўнула маторам, вырвалася з варотаў на вуліцу. Зноў завішчаў, зарохкаў патрывожаны вяпрук. І Цімох нібы ачнуўся, але як не разумеў, дзе ён і што адбылося. Сядзеў і пазіраў у расхістаныя вароты на ву-

ліцу. Слухаў, як, аддаляючыся, падвывала машына. Яго абступілі чарадою куры, трывожна кохкалі, трос чырвоным падбароддзем певень, шырока разявіўшы дзюбу.

Цімох адчуў цяпло ля грудзей — заварушыўся, выспаўшыся, шчанючок. Ён высунуў галаву з-пад пінжака, прадраў вочы, глянуў на свет і, шырока разявіўшыся, пазяхнуў, потым стаў тыцкацца мордачкаю ў Цімохаў твар. Згледзеўшы гэта, бы абураны і здзіўлены, ажно заверашчаў, як падавіўшыся голасам, певень. Падбухтораныя яго крыкам куры ўздрыгнулі, утаропіліся на шчанюка і трывожна закудахталі. Цімох узяў шчанюка на калені, пагладзіў, палашчыў, потым пусціў на зямлю. Яго з'яўленне ў двары абурыла курэй. Яны адступіліся, кохкаючы, нібы здзіўляючыся, пасталі, як разяватыя цёткі, пазіралі на яго здалёку. У расхлістаныя вароты з вуліцы ўварваўся сухі вецер, пахадзіў гаспадарліва, мецянуў саламяную пацяруху, што ссыпалася з машыны, падняў яе ўверх. Цімох засланіў даланёю вочы, але, мусіць, у іх патрапіў пыл — вочы слязіліся дробна і балюча, слёзы былі калючыя, як пясок. Ён узяў на рукі шчанюка. Гладзіў яго паджарую поўсць, а рукі дрыжалі. Ныла ўсярэдзіне, пякло грудзі — трэба было некаму расказаць, пажаліцца. І так выпадала, што, акрамя Марыі, у яго не было нікога... Толькі ёй можна было гэта расказаць, але нельга, навошта лішні раз яе нерваваць, хутчэй заганяць у труну. Дактары і так кажуць, што хвароба яе ці не з нерваў.

Ведаў, што нічога ёй не скажа, але, здавалася, пасядзіць каля яе, хоць словам з ёю перакінецца, адтане, ачахне душа. Як трэба была яму цяпер Марыя!

Укінуў у хату шчанюка. Уключыў радыё, можа, каб таму не сумна было.

«Мы перадавалі канцэрт для скрыпкі з аркестрам, напісаны вялікім кампазітарам у 1836 годзе, — прагучала з дынаміка. — А цяпер...» Але таго, што перадавалі пасля, Цімох ужо не чуў.

Ён не пільнаваўся аўтобуса, не чакаў на прыпынку. А ішоў — і ўсё. Не мог стаяць, не з-за ног, нервы не вытрымлівалі. Яму трэба было рухацца. «Здагоніць — падбярэ», — падумаў і выправіўся пешкі па абочыне дарогі. Дарога была доўгая, а дума яго яшчэ даўжэй. Яе хопіць і на гэтую дарогу, і яшчэ, адзін гасподзь ведае, на колькі. Яго абганялі машыны. Каб ён падняў руку, прыпыніўся б каторы вадзіцель, узяў, але ён не зважаў

на іх: трэба было дадумаць сваю думу, якая, здаецца, вяла яго і вяла па гэтай дарозе. І сам ён не ведаў, куды завядзе, але трэба дайсці да нейкай высновы.

«Жыў, жыў і дайшоў да пустога канца», — гаротна разважаў сам-насам Цімох. Смерць Марыі, а гэта было ўжо відавочна, і ён пачынаў з тым памалу звыкацца, ужо не так пужала і страшыла яго. Ён, як перад прорвай, стаяў перад яе непазбежнасцю. Наадварот, крышку недзе глыбока ў душы зайздросціў Марыі і, каб тое можна было, падмяніў бы яе. Але гэта не чараду кароў адпасвіць і не праехаць па сяле — сабраць ранішай малако. Апошнім часам ён яе часцяком падмяняў. А тутака не падменіш. І зайздросціў, і супрацiўляўся, уражваўся і абураўся несправядлівасцю, якая абрынаецца: за што, за якое? Ён быў падобен на чалавека, якога ў нечым абвінавацілі, а той так і не разумее ў чым, launched перагрэсвае рыззё свайго жыцця, шукае свае віны. То супакойваецца, то баліць, ірвецца сэрца, нібы нешта яшчэ не зрабіў, нечым не распарадзіўся. «Яно, разабрацца, то чым тут распараджацца? Усяму дасць рады Жоржык. Усё пусціць...» Пра гэта было балюча думаць. «Не так думалася, не так. А вот, выходзіць, што жыў попусту. Прамарнаваў жыццё, а дзеля чаго, каб Жоржык во так. Ашчаджаў сабе, Марыі лішнюю адзежыну купіць скупіўся. Яна, бывала, таксама папракала: «Нашто тыя грошы, хіба ты млын будзеш ставіць?» Гэта ў іхнім некалі родзе, як спадчына, пераходзіла мара набыць млын. І прадзед, і дзед (а можа, і раней тое пачалося?) капеечку да капеечкі складвалі, і бацька набыў-такі млын даволі танна. Але хто ведаў, што так павернецца. «Цяпер вось усё дзяржаўнае. Яно і добра. Колькі таму чалавеку трэба. Каб гэта вечна жыў, а то...» Ён скрывіўся ад болю, так круціла, рэзала ў жываце, нібы нейкае карэнне разрасталася, пераціскала кішкі.

Трэба было зайсці ў кусты... Ён азірнуўся: ці не праміне аўтобус. «Таксама, мусіць, з нерваў. Усе хваробы — з нерваў». Заўважыў: абы панярвуецца — кішкі зводзіць, як уюнок сцяблiну, пачынае іх нешта, бы жывое, аплятаць. Можа, і ў яго тое самае, што і ў Марыі. «Вот жа прарасце ў чалавеку нейкае семя і пачынае пускаць карані, кусціцца... Халера на яго!» — Цімох плюнуў. У роце зрабілася горка... Аўтобуса не было. І ён зноў пайшоў па дарозе, пацягнуў сваю думу. Думаў пра жыццё, пра гэтую вось дарогу, якую на яго памяці насыпалі, і

яго тут праца ёсць. Вот жа быў час! Людзі, як мурашы тыя, гуртам, усюды гуртам, усё рабілі — і хаты ставілі, і дарогі насыпалі. Цяпер жа ўсе на дзяржаву спадзяюцца. Ужо — на што ў сяле ніхто сам будавацца не хоча, чакаюць дзяржаўных кватэр. Ці ж грошай не маюць? Не сакрэт, што па сельсавету ў ашчадкасе мільён ляжыць. Узяць бы той мільён ды на будаўніцтва пусціць. Дак не, чакаюць дзяржаўных кватэр. Хоць бы і яго сыны...

«А-а-а-г, халера на іх, пра што гаварыць... А старэйшаму трэба будзе пісьмо напісаць, зайшоўшы на пошту, — мацнуў у кішэньцы пінжака акуляры. — Ёсць. Няхай бы пры мацеры пабыў. Ці мала што...»

Аўтобус яго нагнаў аж на пятым кіламетры. Спыніўся. Цімох з задавальненнем сеў, цяжка апусціўся, бы глёўкі бохан, на лаву. Адчуў: разанула ў крыжы, калі згінаўся.

Разгледзеўся. Кіўнуў знаёмым. Адказаў коратка на такія ж кароткія пытанні. Глянуў на пустое сядзенне побач. Нехта паласнуў яго нажом ці нечым вострым, і з таго парэзу бухмата, бы мякіш здобнай булкі, выпіраў паралон.

— Не цэняць, не берагуць, — сказаў Цімох з болем, павярнуўшыся да чалавека, які сядзеў за плячыма.

Той нахіліўся да яго: ці хацеў прыслухацца, ці то ўважыць. Цімох пазнаў настаўніка матэматыкі, чалавека тутэйшага, ад вайны ён выкладае ў школе, вучыў яго дзяцей. Вочы настаўніка былі сумныя, у праменьчыках зморшчын, твар учарнеў, асунуўся. «Таксама, відаць, хворы», — заключыў Цімох і дадаў, быццам вінячыся перад настаўнікам за Жоржыка.

— Бо мы іх на ўсё гатовенькае... Не ведае потым, як кавалак хлеба зарабляць. А дзяржаўнае, дык яно наогул як з неба падае.

Настаўнік сумна кіўнуў галавою.

— Вось у газеце нядаўна чытаў. У Мінску ў парку фантанік стаяў: хлопчык з лебедзем. З мінулага веку яшчэ. Войны прайшлі — устаяў. А вось нядаўна ноччу двое напіліся і давай там купацца ды таму лебедзю шыю круціць... Хіба ж іх не вучаць дабру, хіба не ўталкоўваюць...

— Яны цяпер у яго не вераць.

— Гэта праўда, — настаўнік, відаць, разахвоціўся гаварыць, падсеў да яго на тое падранае сядзенне. — Вот

я еду... Ці блізка гэта мне, у Кіеў? Дык вот... Напісалі пра мяне ў газеце, ды і раней яно разоў колькі пісалі... Пра танк, што мы, тры курсанты, купілі ды на ім усю вайну прайшлі. І прычапіўся нехта — ды я ведаю хто, я яму ў атэстат круглае пасрэдна выставіў, хоць і бацькі хадзілі, пагражалі, — прычапіліся, закідалі ўсе ўстановы пісьмамі, ананімкамі: маўляў, хлусіць ён. Мяне ўсюды цягаюць: пакажы дакументы, тэлеграму Сталіна. А ў мяне, — ён развёў рукамі, — і была ж яна, але дзе падзелася? — ён паціснуў плечукамі. — Тады, як кніжкі яго выкідалі, мо і яе выкінуў.

— А ў Кіеве?

— Мой таварыш жыве, разам служылі. У яго і фота танка ёсць, дзе нашы прозвішчы напісаны. І тая франтавая газетка зберагл ася...

— А ты ганарыся — нехта табе пазайздросціў, — сказаў, супакойваючы яго, Цімох.

— Пазайздросціў... Знайшоў чаму, — настаўнік паказаў свае рукі, яны і цяпер былі бы спечаныя, з плямістай белай скурай. — Во і загар іх не бярэ. А сарочку каб зняў... Самае прыкрае, — памаўчаўшы, сказаў ён, — не вераць, не вераць, што грошы аддаў. Каб, скажам, напісалі, што ўкраў тыя грошы, мабыць, мала хто і пад сумненне б узяў. І цяпер я тыя грошы як бы ўкраў. Апраўдваюся... Паеду, прывязу пацвярджэнне, пакажу...

Цімох варухнуўся, зірнуў у акно аўтобуса: ён ужо мінаў Слабаду. Вуліцу запрудзіў народ, і аўтобус ледзьледзь валюхаўся, цісн уўся да плота.

— Некага хаваюць, — сказаў настаўніку.

Увесь аўтобус рынуўся на іх бок. Кожнаму карцела зірнуць, як плыла над галовамі труна. Сцішаныя людзі ішлі следам, стаялі ля платоў і двароў.

— Няўжо таго... — здзівілася жанчына з цёмным абветраным тварам. — Толечкі ж учора ўвечары... А ўжо хаваюць. Не далі, можа, чалавеку абыцца.

— Бо ўеўся ў пячонкі. Хутчэй яго ў яму, і рукі атрэсці, — дадала другая, маладзейшая, але, відаць, жорсткая, танкагубая. Вунь як зл ажыла іх, толькі сінявата я рыска пад вострым — к старасці загнецца! — носам.

У Цімоха стала нудліва ўсярэдзіне, быццам гэта працэсія кранала яго асабіста, быццам тої бялявы — убачыў, калі нахілялася труна, русявыя валасы нябожчыка — быў Жоржык. Чаму не падумаў пра сябе. пра Ма-

рыю, — што неўзабаве, — а пра Жоржыка? Чаго загадзя яго хавае? Ён утаропіў у жанчыну нямы, запытальны позірк. Яна ўлавіла яго, сказала суха, грубавата:

— Каўтануў замест гарэлкі хларафосу. І лапы склаў, як клоп. Мор пайшоў на мужыкоў.

— То, кажуць, гэта яна яго... — данёсся ззаду нясмелы голас. І аціх у цішыні. Танкагубая толькі зірнула: маўляў, так яму і трэба. — П'юць — не бачаць што, — гаварыла бы сама з сабою.

У Цімоха ныла ўсё нутро: ніяк не мог адкаснуцца ад думкі, што гэта Жоржык. Можа, здалі кабана ды набраліся да страты розуму. Не мог даўмецца: калі — учора ці сёння — забраў вепрука.

Ледзь звязаў разарваную нітку дня, што здоўжыўся, бы год, блыталася, успомніў валтузню ў картапляніку — тое было вастрэй і балючай за сённяшняе, пакуль не даўмеўся, што сёння, іменна сёння раніцай прызджаў Жоржык. І не магло быць... Але чула яго сэрца, што такое будзе і з яго Жоржыкам. Не сам, дык яна, падумаў пра нявестку, ліне яму ў шклянку атруты. Астатак дарогі маўчаў, адмахваючыся ад гэтай назольнай думкі, прымхліва пужаючыся яе, бы нячыстай сілы. У галаве, як тады ў пустой хаце, пранеслася чутае раніцай: «Мы перадавалі канцэрт для скрыпкі з аркестрам, напісаны вялікім кампазітарам у 1836 годзе...» І яшчэ мацней укараняўся ў ім намер распарадзіцца разумна хаця б тым, што засталося. Трэба было з некім параіцца. Можа, пайсці да сакратара райкома? Пагаварыць з чалавекам... Не, спачатку параіцца з тымі, хто блізка, каля яго. Хоць бы з Шылiным. Хлопец свой, тутэйшы. Заходзіў да яго неяк адзін раз Цімох, скардзіўся, што сала не прымалі ў райспажыўсаюзе. Дак некуды пазваніў Шылін — ён працаваў інструктарам — і ўзялі. Цімох не стаў адкладваць, злез у цэнтры, зайшоў у райком...

Потым ішоў дарогаю і лаяў Шыліна на чым свет стаіць. Варочаў іхнюю размову то так, то гэтак, як дзіравы нерат, якім трэба было лавіць рыбу.

«Біракрат! Глядзі ты — засеў. А вочы як выгаліў! Голас прыцішыў, як асіп: дзядзько, вы ў сваім розуме? Пятнаццаць тысяч... А што дзеці скажуць? І шыльду? Вы ж не пан які, не капіталіст. Гэта тыя любілі шыльды вешаць накшталт: гэты палац пабудаваны графам такім-та. Вы ж не пан і не граф. І стануць разбірацца: дзе,

адкуль узяў грошы? Можа, лесам дзяржаўным гандляваў? Хочаце на старасці за краты ўскочыць?»

— А-а-аг, каб ты ў кіпень ускочыў!.. — аж прастагнаў Цімох.

«Грошы, канечне, можна ўнесці! Проста аддаць у фонд будаўніцтва. А шыльду? Шыльду — нельга. Як адрэзаў. Што, як кожны запатрабуе? Увешаем імі ўсё, як іконамі. Біракрат! Дак не кожны аддае! Пакуль што — толькі я».

Успомніў сумнага настаўніка, які ехаў у Кіеў па даведку, і падумаў: «Мусіць, гэты недаростак разбірае тыя ананімкі... Мусіць, ён. Трэба было адразу ісці да сакратара. Не, потым Шылін задумаўся. Сеў, вочы паставіў, кажа: я тут параюся. Ах ты, біракрат! Гэта ён мне па-свойску: дзядзько, лепш дзецям адпішыце. Яны зрасходуюць... А халера на цябе, недаростак ты, ты павінен мяне быў упрошваць, каб я ўнёс грошы. Думаць перш пра дзяржаву. А ты што! Ты ж у райкоме сядзіш, не... Сам, мусіць, душыш бацькоў, доіш іх, як мяне Жоржык. Біракрат... Што ўжо далей чакаць, калі ў райком такіх панабіралі? Куды яны завядуць?»

Дзіўна было, нязвыкла. Быццам свет перакуліўся, нешта не так робіцца.

Ужо колькі дзён жыве ён як бы не сваім жыццём: ці людзі яго не разумеюць, ці ён іх. Не ўсіх, канечне, а во хаця б гэтага Шыліна, свайго Жоржыка, Марыю, якая сабралася на той свет. Хоць што ёй цяпер... Яе лёс вырашаны. А гэтых ён не разумее. Ды ці толькі іх?.. Можа, сам вінаваты? Не, не глухі яшчэ, не сляпы, каб чаго не дачуць, не дабачыць, і з глузду яшчэ не з'ехаў, не памяшаўся, каб не разумець. А во то адна, то другая спіца выскачыць з кола жыцця, так нечакана і ў канаву зваліцца... Злавіў сябе на тым, што толькі во думаў: відушчы яшчэ і не глухі, — а ідзе і нічога, нікога не бачыць і не чуе — разважанні дарогу заслалі. Стаў трохі на людзей пазіраць, на хаты, што пахаваліся, папрысядалі ў шэрых запыленых дрэвах і кустах. І зусім быў злякнуўся — нешта-такі з ім! — насустрач ішла яго Марыя... Марыя зусім маладая. Валасы колеру падзолу, перамешанага з рачным бліскучым пяском. Ажно ў вачах пацямнела, у галаве мазгі, здаецца, заварушыліся, нібы памяць ірванулася назад, тузанула, ледзьве на нагах адзержаўся. Потым замуціла. Не зважаючы на людзей, на ганак магазіна сеў. А яна прайшла міма. Ачо-

маўся трохі, зразумеў: то ж чужая жанчына, падобная нечым на Марыю.

Захацелася дагнаць яе, зазірнуць у твар. Ці сапраўды падобна на Марыю, ці яму толькі так здалося. Папытаць: чыя, адкуль? Ні разу ж не бачыў яе ў мястэчку, хоць, прызнацца, вельмі рэдка бываў тут. Гэта во цяпер ездзіць, бо Марыя ў бальніцы. Пайшоў следам, задыхаючыся. З перабоямі, асцюкавата білася ў грудзях вялае сэрца, бы трос, ідучы, старую торбу. І ўвесь быў абмяклы, як пасля хваробы: ногі цяжкія, рукі — адно ў кішэні ўтыркнуць, каб не цягнулі гэтак да зямлі. Захацелася зноў прысесці ў цяньку, аддыхацца. Думаў, яна сядзе ў які аўтобус і паедзе. Не, абышла натоўп, што сабраўся на пасадачнай пляцоўцы, пайшла далей. Мусіць, у бальніцу. Там жа праз сад толькі бальніца, а далей.— клады. Цімох крыху супакоіўся. Як ачнуўся, прысарамаціў сябе: маўляў, улёг за незнаёмай жанчынаю і прыадстаў. Цяпер ён ведаў: наперадзе бальніца — і ён ідзе да Марыі.

І тая маладзіца, убачыў, увайшла ў бальнічныя варотцы і знікла, як здань. І зноў яму здалося, што з ім нешта не тое.

А Марыя... Толькі дзень не бачыў, а, здаецца, пабалажэла, гасне, чэзне проста на вачах. «Марыя... Марыя...» — пабедаваў.

Убачыла яго, губы крыху расцягнуліся, мусіць, хацела ўсміхнуцца, паказала нямоцнаю рукою, што ажно свіцілася, на ложак: маўляў, прысядзь. «Трэба яе забіраць дадому, там хоць свежага малака пап'е ды ў двор выйдзе». І ён сеў каля яе. Маўчаў, цяжка дыхаў, каб адсапціся. І яна, гледзячы на яго, часцей стала дыхаць, ротам, як рыбіна, захвалявалася, мусіць. «Марыя... Марыя...»

З жалем і шкадаваннем пазіраў Цімох на жонку. «Што ж гэта з табою сталася? Нібы цьмяны прывід ад тае, што была». Паківаў галавою. Захацелася нечым падвесяліць яе. Яшчэ ўзрушаны тым, што адбылося, расказаў, як ішоў па вуліцы і бытта яна сустрэлася яму, маладая. Вочы яе, здалося, шырока адкрыліся, выдалі здзіўленне, яна пагрэбала рукамі прасціну, бы хапалася за нешта, каб не ўпасці.

— Уся, як ты маладая была.

— Як я? — выдыхнула рыўкамі. — Дзе яна?

— Таксама ішла сюды... — ён падышоў да акна, што

пазірала на малады бальнічны садок. Паўглядаўся на хворых і наведвальнікаў, што сядзелі на лаўках. І праяснеў:

— Вунь яна. З маладзічкаю, як сама, гаворыць...

— Хачу... — Марыя, як дзіця, працягнула кволыя рукі, і ён падбег памагчы ёй устаць, адгарнуў прасціну, падклаў руку пад спіну, абняў, зарадаваны, што яе гэта зацікавіла: устане ды, можа, і расходзіцца. Лёгка падняў, павёў да акна. Паціхеньку, як не на сваіх нагах, ступіла яна пару крокаў, захісталася, пачала хапацца за ложак.

І ён падхапіў яе, паціху павёў з незнаным дасюль халодным страхам, адчуваючы, якая бязважкая яна, як птушка. І, як птушынае, трапеча ў яго руках яе кволае цела. Яму нібы перадалося тое трапятанне. Забіла, як ад холаду, а грудзі сцяло болем.

Яна зірнула ў акно, можа, яшчэ і не ўбачыла тую, сябе, маладую, ці ўбачыла, а толькі — ці сонца асляпіла яе? — стала абсоўвацца на падлогу.

Нехта паклікаў доктарку, убегла медсястра са шпрыцам.

Цімоха папрасілі пакінуць палату. Перад тым як выйсці, ён жаласліва і бездапаможна зірнуў на Марыю.

— Пакліч яе, — задыхаючыся, прашаптала яна.

## 11

Анюта, Ганна Цітаўна, пайшла садам.

Сэрца яе затрывожылася, быццам зноў, як многа разоў дасюль, трэба было ўбачыць агеньчыкі вачэй, пачуць свой да дрыготкі ўзрушаны голас: «Чаго мы тут? Яблыкі ж не выспелі...» І зноў маладыя, чэпкія яблыні будуць хвастаць яе, тую, што без пары хацела нарабіць шкоды.

Але і голас, і сэрца, і сад маўчалі. Сцішана і глыбока. Старыя, каржакаватыя яблыні выглядалі абыякавымі, знясіленымі ад работы і штогодніх родаў жанчынамі. Голле, як пакрыўленыя вузлаватыя рукі, бездапаможна апушчана. На сад тужліва было пазіраць. І Анюта паскорыла крок, перайшла дарогу, што аддзяляла сад ад маладзейшага, нядаўна пасаджанага парку. Дрэўцы кволыя, гонкія дубчыкі. Здавалася, што гэта

дзеці адбегліся ад мацярок і бабуль за дарогу і спыніліся: ці не ўшчуваюць іх? Старыя ж яблыні дрымотна думалі свае невясёлыя думы, асуджана, гатовыя да ўсяго. Яны ўжо, мусіць, не цвілі, не радзілі.

Без жалю, а неяк рашуча і жорстка, яна падумала: «І гэтыя яблыні — вон. Усё спачатку, усё спачатку. Вось каб і жыццё так, спачатку, нанова. Увогуле цяпер мы жывём як два жыцці. Некалі нашы не такія і далёкія продкі жылі гадоў па сорак — сорак пяць. Цяпер жа сярэдняя працягласць жыцця амаль удвая большая. Сёе-тое можна паправіць, пачаць як бы спачатку».

У душы была раўнавага, быццам яна, Анюта, цяпер Ганна Цітаўна, сапраўды пачынала ўсё спачатку. Быццам можна было ўсё зрабіць інакш, не так, як раней, быццам стыхійна. Нанова. Цяпер усё пражытае было недзе далёка, нібы не было ні гэтага звыклага пастаянства з Мікалаем, ні юрлівага твару Антона, яе такой уніжальнай, ганебнай любові да яго, што, як камень на шыі, не давала ёй жыць! І любіць не магла, і не любіць таксама. Яна нібы знайшла выйсце з гэтага тупіка. Знікла недзе і Гэлечка. Чаму яна думала пра яе? Раўнавала. Цяжка і неяк безвыходна... Дурная жанчына. А відаць жа, не гэта галоўнае ў жыцці...

Ганна Цітаўна адчувала сябе вольнай, як птушка, раскаванай і ўзнёслай. Быццам сапраўды ўсё пачынала спачатку.

Цяпер ёй трэба былі грошы, многа грошай. Ёй асабіста хапала і зарплаты кандыдата навук. Трэба былі грошы для Цішы. Многа! Мільёны!

Перабірала ў памяці тое, што гаварылася на пасяджэнні эканамічнага савета пры райкоме партыі. На яго запрасілі ўсіх старшынь калгасаў, дырэктараў саўгасаў, вёў — сам сакратар райкома. Яна ж рабіла даклад аб перспектывах сацыяльна-эканамічнага развіцця раёна. Гаварыла захоплена, даказвала лічбамі. Прыгадала пра спрадвечную талаку. Цяпер гэта будзе інакш. Кожная гаспадарка ўнясе сваю долю...

— Я грошай не дам! — цвёрда сказаў Азёрны, старшыня «Барацьбы». У вачах яго залёг холад, а губы скавала ўпартасць.

Але з другога канца вялізнага стала, што быў на ўвесь кабінет, як птушачка, выпырхнула рэпліка: маўляў, Азёрны — самы бедны.

Анюта, Ганна Цітаўна, не ведала таго, хто падаў

рэпліку. Толькі потым здагадалася, што гэта быў дырэктар маслазавода. Пакуль што яна яго розніла ад іншых толькі па вачах. Былі яны нейкія плыткія, нават плыценькія, і жаўтаватыя, як мелкаводдзе, дзе праглядаецца рачны пясок. Адчулася адразу: спрэчка паміж ім і Азёрным даўняя. Яны яе працягвалі і цяпер.

— Цябе трэба паставіць у такія ўмовы, каб ты выпрошваў у мяне малако. А не я, надаіўшы, чухаў галаву: як яго збыць табе.

— У мяне няма лішніх магутнасцей. Завод выконвае план і нават перавыконвае. Мы атрымалі пераходны Чырвоны сцяг за мінулы год... — ад задавальнення вочы дырэктара, здаецца, змялелі яшчэ больш. Затое ў вачах Азёрнага можна было ўтапіцца. Але ён апусціў галаву, як бык перад кідком на праціўніка. Здаецца, і не размыкаліся губы, не ўздрыгнулі жорсткія дужкі, што трымалі іх лінію, а пачулася:

— Не варта было даваць.

— Гэта чаму ж? — у плыткіх вачах бліснула цікаўнасць, але яе прытушыла насцярожанасць. — Недарма на цябе нараканні, што ты грубы, суровы з людзьмі. І тут ты не прымаеш да ўвагі людзей, — здалося, той, хто гаварыў, патрабуе павагі да сябе, але не, павярнуў на іншае. — Людзі, разумееш, людзі працавалі. Я як кіраўнік...

Але Азёрны не даў яму дагаварыць, абарваў, як адсек:

— Вось пакуль будуць такія кіраўнікі, як ты, мы будзем таптацца на адным месцы, як чарада на выгане, пакуль не выб'ем капытамі траву, а потым станем дохнуць.

Плыткія вочы хітануліся на сакратара райкома, але той нешта занатоўваў. У яго, заўважыла Ганна Цітаўна, не было звычкі перапыняць сваркі кіраўнікоў, калі выказвалася слушнае і на карысць справе. «Праўда, сказаная ў вочы, смела, — двайная праўда», — сцвярджаў ён.

— Я выконваю свой план, — аж падскочыў дырэктар малаказавода

— Ведаю, наслухаўся, — буркнуў Азёрны, нібы на тым абрываючы перапалку. Але, відаць, зразумеў сам, што гэта датычыцца не толькі яго, Азёрнага, таму абвёў позіркам старшынь калгасаў і сказаў, нібы ўзяў на сябе кіраванне нарадай.

— Таварышы, пытанне сур'ёзнае. Не далей як учора завод вярнуў калгасу ранішні ўдой. Уяўляеце. — Азёрны падняў угару палец, бы ставіў клічнік пасля слова. — Дзве цыстэрны малака. Прытым вярнуў пасля абеду. Дагэтуль машыны стаялі на спякоце, чакаючы прыёмкі. Добрая гаспадыня нават гладыш малака на стале ў хаце не пакіне такої парою. Паставіць у халадзільнік, у склеп вынясе, у адстойніку апусціць у свой калодзеж. А тут — на сонцы.

— У цяньку пад ліпамі, — падказаў нехта з прысутных.

Сапраўды, каля малаказавода раслі старыя ліпы са здрабнелай лістотай.

— Малако ж прынялі. Чаго ўсчынацца? — зноў не вытрымаў той, з плыткімі вачыма, неяк прыхоўваючы іх.

— Але па якой цане? Мы з вамі сур'ёзныя людзі і давайце гаварыць сур'ёзна. — Незаўважна перайшлі на «вы», а можа, Азёрны запрашаў сказаць слова іншых. — Гэта не ўпершыню. Вы спецыяльна затрымліваеце, — цяпер гэта «вы» датычылася не толькі дырэктара, а нейкай кампаніі, якая заадно з ім, — затрымліваеце, каб знізіць гатунковасць.

Анюта зірнула на сакратара райкома, які сядзеў, задуменна падпёршы рукою шчаку, ёй здалося, што размова ішла не ў тым кірунку, а ён не рэагуе. Але ўбачыла, што ён нібы секундант паміж гэтымі двума. Разумелі гэта і іншыя, таму не ўмешваліся пакуль.

Цяпер і той, з плыткімі вачыма, не зіркаў на сакратара, хутчэй пазбягаў яго позірку.

Найперш ён здзівіўся. Раней, мусіць, такога не здаралася. Упершыню яму трэба было абараняцца самому, без прыкрыцця. І ён пайшоў на Азёрнага, аж падаўся ўперад, устаў і папёр, як танк, усёй, здавалася, сваёй грузнай, мажнаю паставаю. Голас яго памацнеў.

— Завод за якасць вашага малака не адказвае. Якое прывезлі, такое мы прынялі. І скажыце дзякуй. У нас перагружана абсталяванне да краю. І мы, таварыш Азёрны, пайшлі вам насустрач, далі магчымасць выканаць план. Але вам гэтага мала...

Азёрны маўчаў, як сцяна, твар яго быў шараваты, нібы запылены. Рот — прамая лінія, забраная ў жорсткія дужкі. Яны акрэсліліся рэзка, бы напяліся, ледзьледзь утрымлівалі гэтую лінію.

— Вам мала. Вы хочаце перавыканаць ледзь не ўдвая. Захацелася ордэн.

Напятыя дужкі не вытрымалі, пырхнулі ў бакі.

— Я не за ордэны працую! Я... Мне даверылі людзі гаспадарку. Дзяржава чакае ад мяне мяса, малако, хлеб. І я раблю ўсё, што магу.

Твар Азёрнага бы прысыпаў хто попелам. Толькі два вугельчыкі чорныя, загаслыя таксама, цямнелі ў ім. Затое зноў засвяціліся жаўцізною плыткія вочы яго суперніка, раскрыліся, бы сонца асвяціла водмель. Усёй паставай ён павярнуўся да сакратара, нібы дакладваў яму:

— Усё, што магу... Ён можа вясною бульбу прадаць... І па якой цане? Спекулянт... Так, гэта спекуляцыя! Не ведаю, чаму райком закрывае вочы.

Халодны, праніклівы пагляд сакратара (навучыўся нічым не выдаваць сваю думку) крышку астудзіў яго.

— Але з тваімі далейшымі махлярствамі яшчэ пападзешся. Тады і гэта прыпомняць.

Азёрны, які сядзеў, угнуўшы па-бычынаму галаву, пазіраючы ў стол, не зварухнуўся, толькі захадзілі жаўлакі, нейкую хвіліну ён памаўчаў, потым з-пад ілба з дакорам зірнуў на дырэктара маслазавода. Гэты дакор быў не як бы за тое, што ён выставіў яго перад людзьмі, а асароміўся сам, паказаў сваё неразуменне. Павольна ўстаў, як перад таварыскім судом.

— Так, таварышы, я на самой справе вясною прадаў бульбу па завышанай цане. Я гэта зрабіў свядома. Уявіце сабе. Я прыняў калгас. Ён меў запазычанасць дзяржаве мільён, а на рахунку — сто сорак адзін рубель. Я пазычыў у дзяржавы яшчэ сто сорак тысяч і першае, што зрабіў, пабудаваў машынны двор, бульбасховішча. Каштавала гэта і сілы, і сродкаў, і нерваў. Ночы не спаў. Вы ведаеце, што такое будавацца... Лічу, што не той яшчэ гаспадар, у каго бульба буяе, а той — у каго вясною ў склепе ляжыць. Але ўжо каторы год, глядзіш, у адных памерзла, у другіх — пагніла бульба, а ў нас, у нашым калгасе — сухенькая да вясны. Дык чаму ж я павінен таму, хто палец аб палец не ўдарыў, каб зберагчы ўраджай, хто спадзяваўся, пазяхаючы, на бога, аддаваць за нішто працу маіх калгаснікаў. Няхай ён так пакруціцца, як я, тады будзе ведаць, па колькі бульбачка вясною.

Старшыні маўчалі, але позіркі, кіўкі іх не асуджалі

Азёрнага. Тады «малакавед» рашыў усяму гэтаму надаць палітычную афарбоўку.

— Гэта не метад сацыялістычнага гаспадарання, — цвёрда сказаў ён.

— Усе метады добрыя, калі яны прыносяць карысць. Але мы адхіліліся ад тэмы, — адказаў яму Азёрны. І да сакратара: — Прапаную ўсе малакавозы ўсіх калгасаў і саўгасаў аддаць у распараджэнне масласырзавода. Няхай не мы за імі бегаем, а яны — за намі. Тады яны будуць адказваць і за якасць прадукцыі. Трэба, канечне, павялічыць і план заводу. Яны стараліся дасюль узяць паменш. Канечне, прыйдзецца расшырыць і магутнасці. А можа, зірнуць некаму зверху, як выкарыстоўваюцца наяўныя.

— Гэта слушна, — падтрымалі яго ледзь не хорам. Толькі адзін ціхмяны, хлапчукаваты, відаць, малады кіраўнік з жалем сказаў суседу:

— Толькі мы малакавозікі набылі новенькія, як цацкі. Шкада расставацца.

Той паразумела ўсміхнуўся, абняў яго за плечы.

Сакратар райкома нешта занатаваў сабе.

— Лічу, што гэта пытанне мы абмеркавалі. Давайце вернемся і канкрэтна абгаворым будаўніцтва кансерввага завода на кааператыўных умовах. Перш чым выходзіць з гэтым пытаннем вышэй, трэба ведаць, што мы маем і што прасіць.

...Ганна Цітаўна была ўзбуджана. Бачыла: справа зрушваецца. З пасяджэння ішла порсткім крокам. Але раптам нешта заныла ў грудзях, часта-часта, як збіўшыся з тропу, забілася сэрца, прыкрая ванітная хваля падкацілa да горла.

Здалося, што зноў павярнуўся вецер і патыхнуў дым. Яна нават азірнулася на заводскую трубу, што на яснай пагодзе чорнай кветкай бухмацілася ў небе.

Злёгку закружылася галава, і Ганна Цітаўна прысела на аўтобусным прыпынку на лаўку. Нейк адразу спусцела, замаркоцілася душа, нібы напомніў хто: ты жанчына і справа твая жаноцкая. Яна, як ярмо, адчула на сабе гэту сваю належнасць да жаночага роду, якая не давала забывацца на спрадвечныя зямныя клопаты. «Няўжо зноў?»

Колькі разоў находзіў гэты, — ажно абдавала халод-

ным потам, — страх. У адчаі яна кляла жаночую долю, якая ў самы рашаючы час, калі яна вось-вось, здаецца, зроўніцца з мужчынам, стане на адну шалю з ім, а, можа, і пераўзыдзе яго розумам, здольнасцямі, як зайздросніца падсцерагае, каб накінуць свае путы, астудзіць і нагадаць, што яна жанчына. А жанчыне — жаночае. І яна адчувала, як набрыньвае ўнутры яе семя, адступаюцца неяк самі сабою гэтыя мізэрныя жыццёвыя аднадзённыя клопаты і ўсю яе падсвядома і ўладарна запаланяе наканаваны спрадвеку жанчыне абавязак і доўг прадаўжэння роду людскога. І ўсё, у параўнанні з гэтым, не варта яе думак і памкненняў.

## 12

— Галі няма. На рабоце... Бывае, і ў начную застаецца, — сказаў дзядзька Васіль, нібы адкаснуўся ад яе. І рука яго — спрацаваная, заіржавелая, з пагнутымі зубамі матыка — грэбла, рыхліла зямлю вакол тонкага, як дубчык, стволіка яблынькі ў агародчыку. Дубчык быў голы, бязлісты. Відаць, яго восенню ці вясною перасадзілі, ён не развіўся, не выпырхнула лісце з карычневых зазубрынак пупышак, ці яно апала, пакінуўшы толькі слядкі. Не, вунь адна галінка такі акрыяла. Сярод лета, гарачага і пыльнага, раскрыла зялёную дзюбку: піць, піць... І дзядзька, падрыхліўшы зямлю, зрабіў ямку каля стволіка і заліў у яе ваду, як у закопчаны чорны чыгунок.

Дзядзька Васіль быў нейкі зусім састарэлы, хоць ніводнага сівога воласа. «У нас парода такая — усярэдзіне ўсё перагарае», — гаварыў ён заўсёды. І, відаць, яно перагарэла разам з болем, які адбіўся на твары, сціснуў яго, пакамечыў. Анюце цяжка пазіраць на яго, нібы ў нечым вінаватая.

І хата яго аб'ехала, пастарэла. Успомнілася, што пісала ёй Галя: «Ты не помніш нашу хату? Звонку яна выглядае вялікаю, а ўсярэдзіне — катухі. Раней, здаецца, і не цесна было: бацька з мачыхай у адным пакоі, а мы — у другім. А цяпер, калі ў кожнага сям'я... І ўсе мы там, брат меншы пасхаў давучвацца, а жонку пакінуў з дзіцем. І я вярнулася з дзецьмі. Іх у мяне двое, адзін ужо студэнт. Перад дзецьмі сорамна, што я нічога не дабілася ў жыцці. Не зарабіла нават кватэру. Так і бадзя-

емся, як бежанцы, па чужых хатах. А ўсё ж жыццё працавала, старалася...»

Дзядзьку Васілю, яшчэ калі стаяў за ракою клуб, як старадаўні мур, прыземісты, сцены таўшчэзныя, як у крэпасці, здавалася, нешта і пасля яго застанецца. Бывала, выйдзе, сядзе на лаўцы ля двара і пазірае туды. Промні сонца, слізгаючы па круглым акенцы мураванага франтона, адбіваюцца ў шкле, і здаецца, што само сонца ўціснулася туды на гарышча і пазірае, уткнуўшы твар, як дзіця ў фортку, у гэтую, што як кола, раму. А цяпер на тым месцы іншая забудова. Нехта іншы, — канечне, у яго было болей магчымасцей, ваду ў бочцы не вазілі на Гнядой, — нехта іншы ўзвёў на выспе высачэнны панельны гмах: на версе — карона. Некалі здавалася, што той вясковы клуб будзе стаяць вякі. Кожную ж цаглінку перамацаў сваімі рукамі. І ўстаяў бы... Не, разбурылі... А хай бы гэты новы гмах стаў побач. Не, такога не было яшчэ, каб на адным вяку пабудаваць і разбурыць. Пабудаваць з каменю, з цэглы. І разбурыць... Ён і сам у бацькавай хаце яшчэ жыве, і ўсе наўкруг будаваліся пасля першай сусветнай, а нашчадкі і цяпер жывуць у тых драўляных, прыземістых, пастаўленых пасля бяды хатах. І пасляваенныя таксама харавством не выдаюць... А гэта — цагляны гмах. Зламаць!.. На адным вяку... Можа, месца іншага не было? Не. Так лепей відзён новы гмах на выспе, аж з цэнтра Цішы. Паказушнікі! Зад голы, а морда намазана! Выскачкі!

І яшчэ думаў ён не раз і людзям казаў, што па жыцці трэба ісці асцярожна, каб ні аднае казюркі не растаптаць, абачліва, каб разгледзець усё наўкола, што да чаго прыдатна, дайсці розумам: чаму, нашто ўсё створана, разгадаць кожнага карысць. А гэтыя не глядзяць, пруць навыперадкі, напрасткі. Кожны хоча сабе помнік пры жыцці! Толькі і думаюць пра ордэны ды помнікі...

Галя, Галіна Васільеўна, сядзела ля стала ў доўгім белым калідоры, сама ўся белая, нібы галубка, а яе абступалі мажныя, ўстрывожана-занепакоеныя будучыя парадзіхі. Чаканне і страх у вачах, асабліва ў тых, хто патрапіў сюды ўпершыню. Яна ж была для ўсіх іх ратавальніцай і дарадчыкам.

— Нешта ў вас ціха! — сказала, бы здзівіўшыся, Анюта.

— Ага, зацішша. Ноччу пачнём... — усміхнулася Галя. — Мы працуем у асноўным па начах. А цяпер можам і адпачыць. Давай выйдзем на двор... Сонца там...

Анюта ўбачыла, як занепакоіліся жанчыны. А маладзенькая, са стрыжкай пад хлопчыка, ускінула на яе пякучы позірк, нібы Галя здраджвала, пакідала іх, і, збіваючыся ад боязі, запытала:

— Галіна Васільеўна, вы... ненадоўга? Недалёка? — са страхам дапытвалася.

— Табе — няскора. Ідзі прыляж, расслабся, — кранула яе за плячо Галіна. — А ты, Таіса, як што — кліч. Я буду вунь там — на лаўцы, — паказала рукою за акно.

Яны прыселі ў цені кустоў.

— Ну як у цябе з кватэраю? — папытала Анюта ў Галіны. Закранула яе больку. Убачыла, як успырхнулі яе бялявыя вейкі — крыльцы. Яна плакала. Плакала неяк лёгка, слёзы, здавалася, не цяклі, а рассыпаліся па шчоках, бы гарошыны, калі раскрываліся стручкі вачэй.

— Абяцаюць, а пакуль маю нешта часовае.

— Божа, Галя, перастань. І так ты мне здаешся зялёнаю...

— Дзіва што, столькі выплакала. Заўважыла ж, вейкі пабялелі, высаліліся... Жанчыны жартуюць: усе чэрняць, а ты — беліш. — Яна паспрабавала ўсміхнуцца.

— Гэта ў мяне ў вачах зялёна, — супакоіла яе Анюта. — І мусіць... Ой, Галіна, трэба мне твая дапамога.

Пра ўсё недаказанае яны паразумеліся позіркамі.

— Зайздрошчу мужыкам. У нас, у жанчын, як толькі якая цікавая работа — на табе! — круці галаву: адно ці другое.

— Хіба дрэнна? Заўсёды ёсць выбар. Разумная баба, як што на рабоце не так — хоп і ў дэкрэт пайшла. А мужыкі... Яны таксама розныя. Як у мяне быў, дак што яму зайздросціць: чуць што — у запой... Ай, што ўспамінаць... — пырхлівай капуснай бялянкай узляцелі вейкі, і з зелянцовых стручкоў сыпануўся няспелы гарох. — Сын у мяне — пайшоў у падводнікі, курсант. Шкода яго, сэрца баліць: калі дома нядобра і на дне акіяна не схаваешся. А другі тожа гаворыць: мама, я скора таксама паеду, як Слаўка. І застануся я адна. Хто я тады? І кватэра не трэба: вось тут у бальніцы на кушэтцы і спаць буду. — Яна пасядзела задумліва. І Анюта шука-

ла словы суцешыць яе, але ўсе яны здаваліся пустымі, як мякіна.

На сонейку пад кустом, ля броўкі тратуара, разлёгся кот. Ён млява мружыў вочы, засынаў.

Але не давалі спакою вераб'і. Падступаліся, забіякі, да яго, лезлі чуць не ў зубы, крычалі, падражніваліся. Кот мякка распускаў кіпцюры: ох і паганяўся б, каб не так змарыла. Заставалася забіцца галавою ў куст, закрыць лапамі вушы. А яны аж заходзіліся, гатовы былі яго заклюваць. Галіна махнула на іх рукою. Пырхнулі, адляцеліся.

— Я адна іх гадавала. Нагаравалася... Жылі на адно маё гэта жабрацкае жалаванне. Аліментаў як кот наплакаў. Іх заўсёды трэба было шукаць. А цяпер і саўсім з'ехаў некуды. Не пашанцавала мне з мужам. Каб не піў... Ай, да што гаварыць...

Гаварыць было цяжка, і ў Галі словы застравалі ў роце, перасмяглыя, ліплі да языка, яна ледзь іх выштурхоўвала, здаецца, ранячы сухія губы.

— Васільеўна! Васільеўна! — раптам пазвала яе жанчына ў пярэстым халаце. — Гэта маладзенькая раджае, крычыць...

— Крычыць, гэта яшчэ не раджае, — цёпла адказала Галя, але ўстала. — Ёй яшчэ не скора. Проста баіцца, што я адышлася. Хадзем... — сказала Анюце, — я і цябе гляну...

...Упоцемках яна не магла разгледзець яго твару. Хутчэй уяўляла: ён аброслы, худы, у шчаціне, як у зарасніку хмызоў равы, пахаваліся зморшчыны. Яна б і не глянула яму ў твар — баялася ўзняць вочы. І ўсё пазірала толькі на яго руку, нібы сцераглася яе. І голас яго быў неразборліва-нудлівы, дакорлівы. Але яна ведала, што ён гаварыў, у чым вінаваціў яе.

Яна не апраўдвалася, толькі ўсё асцерагалася яго рукі, хоць і ведала: яна — пратэз. Але гэтая мёртвая рука сціскала кулак і малаціла ім па стале. Згіналася і разгіналася, як жывая. І гухала, гухала драўляна па стале. Гэта быў нейкі дурны, паганы сон. Анюта ніколі не бачыла такога, але запала ў галаву, што людзі расказвалі. Быццам Паўлавіч пасля амністыі, выпіўшы, бывала, гухаў гэтаю сваёю штучнай рукою па стале і вельмі ж лаяўся:

«Шолудзі вы — не людзі! Струпы!.. Хай жа б раку баранілі, дак — не, кожны за сваю капейчыну затросся. Струпы!..»

Яна разумела, што гэта сон, але адкрыць вачэй не магла, нібы страшылася, баялася, што над яе галавою занесена гэта яго драўляная рука.

Здаецца, павінна была быць палёгка, але яе не было. Непрыемнае, трывожнае прадчуванне ссала душу. Нудзіла, ажно закладвала вушы, як у вадзе была яна ўся. І праз тую ваду пачула голас Галі, адкрыла вочы, павярнула, бы набрынялую, галаву.

— Нічога, нічога. Гэта пасля наркозу. Бачыш, ты ж нічога і не пачула. Паляжы яшчэ трохі.

— Нудзіць, — пажалілася яна. — Душна...

— Можа, што вокны зачынены? Вецер павярнуўся. Няхай перагоніць.

Дзень ужо згасаў. Ціха было наўкруг. Прырода быццам замерла, зморaная, асмяглая ад дзённай спёкі, чакала вечара. Анюта, Ганна Цітаўна, таксама адчувала смагу. Яна вярталася з бальніцы. Да дому было яшчэ далёка. Праўда, можна было, як некалі, напіцца вады ў любой хаце, каля любога калодзежа ці калонкі. Але быў не той час, а хутчэй — яна не тая. Зарадавалася, убачыўшы, што адчынены рэстаран. Зайшла. Унізе працаваў буфет. За столікамі ў кутку сядзела кампанія мужчын, крыху далей маладая маці карміла хлопчыка катлетай з картапляным пюрэ. Ён капрызіў, крывіўся, выкідваў з рота. Анюта села за вольны столік ля акна, пад фікусам. Папрасіла бутэльку мінеральнай і, заўважыўшы, як падціснула губы афіцыянтка, маўляў, з-за бутэлькі вады круціся тут каля цябе, заказала што-небудзь з закусак: сыр, яйка. Ёй было ўсё адно. Есці не збіралася. Толькі піць. Піць...

А кампанія ў кутку шумела, мацюкалася, ці не спрачаліся там за нешта. Аж сюды далятaлі іх запененыя півам словы.

«Божа мой, тры заваляшчыя мужыкі і такі гвалт...» — падумала з нейкай нават агідай. Яны яе не цікавілі, але асобныя фразы, у якіх быў нейкі сэнс, неяк вырываліся з смецця слоў, далятaлі. Вельмі гарачыўся адзін, худы, доўгі.

— Ды я вось пайду зараз пазваню яму. Скажу: брат, прыязджай, бацька здурнеў!.. Канечне, здурнеў, такую яго...

— А што, шыльду, бляху павесяць. І табе пачот.

— Ды на хрэн мне гэты пачот! Я сам чакаю папе-ры... Гэта ўсё тая ўзбаламуціла. Помніш, выступала тут... Маці яе ля ракі жыве... Вучоная. А ў яго ўжо... за-скокі на старасці.

— Баіцца, мусіць, чаго ці совесціцца. Абнаружыцца, што...

— Што абнаружыцца? Ды ён усё жыццё, падла, укалваў і капейка да капейкі... — ён пляснуў далонь аб да-лонь. — Каб крадзеныя, хрэн бы з імі... Зараз вось пайду пазваню: бацька здурнеў, скажу.

Невядома, стрымлівалі яны яго ці падтыкалі, пад'юджвалі, але галасы, асабліва трэцяга, у клятчастай кашулі, сталі цішэйшыя.

— Хай толькі. Не дарую, падла!

Анюта выпіла жадна, як п'яніца гарэлку, шклянку цеплаватай салёна-калючай вады, паклала на стол дробязь. Ужо на вуліцы кінула позірк на вокны рэстарана і ўбачыла, што яны, тыя трое, — што іх магло зацікавіць? — аж як не высадзяць шкло, папрыліпалі, упяліся ў шыбу. Пазіралі на яе... А можа, ёй здалося. У іх — сваё. І яна паціху, нага за нагу, пайшла далей.

## 13

Антаніна накапала валяр'янкі. Водар яе пачуў кот, усчаў несусветны лямант.

— Дай,і яму лізнуць, — жартам сказаў Васіль, а сам падумаў: «Можа, не трэба было ёй гэта расказваць, ці мала што людзі плешчуць... Не трэба было ўспамінаць пра Ціта».

— Дасі — шалець стане. Шпалеры паабдзірае...

— Даруй, разнерв\іў цябе, Антаніна.

— Не, што там... — уздыхнула яна.

Тое, што сказаў ёй Васіль, не ўразіла, не было нечаканым, не здзівіла. Гэта толькі яшчэ раз напомніла, што Ціт жывы... Жывы! Яна нібы сама наканавала яму лёс. Яшчэ тады, даўно, як сабрала самаробны рэчмяшок — фарбаваную палатняную торбу на паўмяшка — вяроўчына за ніжнія рагі, набітыя пакуллем, і пятля на гарлавіну. Падала, толькі зірнула на засяроджаны Цітаў твар. Трэба было кінуцца ды прыцісиуцца да грудзей, а яе як хто трымаў. Потым бы нехта падказаў: «Бачыш ты

яго ў апошні раз». Адвярнуцца б тады ды хоць плюнуць тры разы, каб з ветрам панесла тое насланне, а яна стаяла, як слуп, ногі мякчэлі, ледзьве трымалі. Сама ж, як гара, і з-за гэтага, з-за спакою, які трэба таму, хто соладка спіць у яе пад грудзямі, нічога блізка не дапускае да сэрца, усё праходзіць як у паўсне. І зноў той жа голас: «Ты бачыш яго ў апошні раз», — а ёй нібы ўсё адно. І голас той хоча яе пабудзіць, вярнуць да рэальнасці, але яна —як глухая. І не зразумела, ці гэта сэрца так б'ецца, ці дрыгаецца штуршкамі яно, іх ненароджанае дзіця, прачнулася. І яна ўся замірае, заціхае, слухае толькі яго... А потым, спахапіўшыся, зганяе туман з вачэй, шукае Цітаў твар. «Ён будзе жыць, будзе жыць...» — як заклён, паўтарае ў думках. І верыла, што ён будзе жыць.

Яшчэ шумяць тыя таполі ля двара. Ой, як шумяць, без перапынку трывожаць памяць. Асабліва ў дождж. І чуе яна яго словы: «Ой, не лёгка табе будзе, Анця». Анця, Анця... болей ніхто і не заве яе так. І конь, падрогваючы целам, неспакойна, прыцішана ржэ. Страшна жывёліне, водзіць яблыкамі вачэй, ускідвае галаву, бы прыспешвае гаспадара. А ён цалуе яе рукі, мокрыя, халодныя. Ніколі ён не цалаваў іх. Усяго нейкія хвіліны стаялі яны пад таполямі. Потым ён ускочыў на каня. Ёй бы не пусціць яго: ведала, шмат мужчын вярнулася, не паспелі ў ваенкамат. У Слуцку і Пагосце ўжо немцы. Здалося, моцны гром скалануў неба. Яно было нейкага незвычайнага колеру на захадзе, бы сонца толькі-толькі зайшло, край неба агорнуты барвовым, нейкім злавесным святлом. І дождж. Такога яна ніколі не бачыла, нібы канец свету. Дождж высыпаўся буйны, як лубін. І гром без перапынку трос і трос хмары. Але яна не зважала на дождж. Учапілася за стрэмя, нібы хацела не адпусціць мужа, затрымаць, але ён адчапіў яе рукі. Яшчэ раз саскочыў з каня. І яна кінулася да яго са стогнам, які вырваўся нібы не з грудзей, а з самога ўлоння, дзе спала, скруціўшыся, тая істота. Страх, што яна вось-вось раскідаецца тут без пары, суцішыў, яна сцялася. І Ціт адразу стаў нібы чужы ёй, у яе з'явіліся больш важкія клопаты. Можа, і ён адчуў гэта, дакрануўся, як да нейкага скарбу, да яе круглага, што падышоў пад грудзі, жывата: «Зберажы... — сказаў ціха, з мальбою, нібы прасіў гэта не ў яе, а ў самога неба, чырвонага, грымучага, разгневанага. — Зберажы...» І яна

наструнілася, прыслухалася да сябе, ужо амаль абыякавая да яго, да гэтага грымотнага неба, да буйна-кроплістага рэдкага дажджу. Ціт зноў схапіў яе рукі, прыклаў да сваіх гарачых, запёкшыхся губ, да твару, і яна адчула пякучае цяпло.

Конь, напінаючы повад, ускінуты на частаколіну, неспакойна заіржаў, ужо не гэтак стрымана, а неяк роспачна і трывожна. Паўз іх прамчаў коннік. Нешта глуха крыкнуў, і Ціт адказаў: «Я здаганю». А яна захвалявалася, што ён адстане, застанецца адзін невядома дзе ў лясах ці на дарозе — не дай бог у бядзе аднаму, — і сама адштурхнула яго ад сябе. І ён, ускочыўшы на каня, прашаптаў ёй глухім, як стогн, голасам: «Прашчай, Анця». Яна ж толькі прастагнала: «Не-е-е».

Шумяць — як шумяць! — таполі. І цяпер яна чуе: «Прашчай, Анця». Ці ён не спадзяваўся на сустрэчу, ці ведаў, што не будзе яе. Хадзілі чуткі пасля вайны, то бачылі яго ў лесе, то на старых хутарах... Вось яна тады і пачала шукаць яго, пісаць ды дазнавацца. Адказалі казённа і точна: пражывае па адрасе... Год, два, тры, каб ачомацца ад той навіны, нібы звар'яцелая была. Пісьмо напісала...

«Сама ж яго знайшла. Сама ўскінула на языкі. Сама...»

Шумяць таполі, ажно чуваць іх пошум праз адчыненае акно, нібы той даўні дождж шапаціць у лістоце. Заглушае нават голас, пастукванне малатка па цэгле, то звонкае, то глухавата-сцішанае, рассыпістае...

— Гэта ты правільна робіш, Антаніна, што ляжанку перарабляеш, — нібы перарабляла тую ляжанку яна, а не Васіль, якога яна папрасіла. — Скора казка кажацца, ды не скора дзела робіцца. Яно перазімаваць і то добра. Саўсім жа, глядзі ты, душнік заваліўся, во таму яна і капцела.

Ён прымаўкае. І зноў шумяць таполі, зачыніць бы акно, каб не чуць іх, вельмі ж трывожаць душу, будзяць успаміны. Ды толькі няможна зачыняць — няхай хоць крыху пыл выцягвае, вунь ён стаўбуром прэцца. Добра, што яна панакрывала ўсё.

Васіль рушыць ляжанку. Яна дапамагае: адкладвае ўбок цэлыя цагліны. Лёгкім пастукваннем малатка ён адбівае іх адну ад другой, абцірае і адкалупвае наліпы гліны, бы разбурае не старую ляжанку, а вядзе нейкія археалагічныя раскопкі.

— Гэта цэгла не тое, што цяперашняя, якую ў рукі ўзяць нельга, рассыпаецца. А то во, чуеш, звініць, як жалеза.

Што б ні гаварыў Васіль, на што б ні зірнуў, у заключэнне абавязкова скажа: «Гэта — што, вот даўней было. Да вайны...» Усё яму было лепшае: і свет, і людзі, нават сады не так цвілі, і лета было цяплейшае, і неба вышэйшае.

— Да, якія годы былі! Як бы мы жылі, каб не вайна. Колькі багацця, а галоўнае, колькі людзей харошых...

Васіль кладзе малаток, садзіцца, дастае цыгарэту. Задумліва курыць. Моўчкі, зацяжна, кашляючы.

— Да, — падводзіць ён рысу нейкім сваім думкам. І зноў, памаўчаўшы, гаворыць:

— Вот я малы асірацеў, а адчуў гэта востра толькі пасля вайны. Глянеш — і таго няма, і таго... Былі людзі, суседзі, браты... і — няма.

Антаніна быццам яго і не чула, яна, спаласнуўшы рукі, села за шытво. Застракатала машынка, іголка пачала дзяўбці тканіну, як заводная птушка. І Антаніміны ногі гушкалі педаль, бы яна, седзячы, танцавала гэтыя сучасныя бугі-вугі, не адрываючы ног ад зямлі. Васіль пазіраў на яе незадаволена: трэба было такі сказаць, і ён ужо рабіў не адзін захад, але не даводзіў гаворкі да канца, галоўнае заставалася не сказаным. А трэба сказаць, папярэдзіць.

Ён выбраў момант, калі гаспадыня спыніла «танец», калі іголка перастала кляваць тканіну.

— Слухай, Антаніна...

Яна падняла вочы, і ён сказаў:

— Жорж званіў брату. Таму, што ў Данбасе. Казаў: бацька здурнеў. Гэта нашто грошы... Зваў прыехаць, разабрацца... Толькі грошы грашыма. Іх Жоржык усё адно прап'е, а гэтак, можа, яно і лепш. Але Соня-тэлефаністка казала, што прыйшоў п'яны. Пакуль чакаў размовы, матляўся, як сабака, языком мянціў, быццам Анюта тую кашу заварыла, яна, наўродзі, усім камандуе. Слухаюць, маўляў, яе і ў райкоме і ў выканкоме.

Антанінін твар пасвятлеў, усмешка выплыла з глыбіні, зацвіла і тонка-тонка кранула струнку губ: радасна стала за дачку.

— Грозіўся, адкрые ім вочы. Думаю, не сам ён, нехта падказаў. Кажа, напіша куды трэба, абняславіць. Маўляў, бацька жывы... Дагэтуль хаваецца...

Губы, на якіх толькі-толькі была ўсмешка, перасмыкнуліся, сцяліся сурова і трывожна.

Вось яно тое, што яна трымала глыбока, як хавае рачны гарлачык у затоцы карань, хавала, як злодзей крадзенае, чаго баялася — усплыло.

Таргануліся нервова ногі, іголка тузанула нітку, пеpакусіла яе. І Антаніна, як ні старалася, надзела нават круглыя, маленькія, як савіныя вочы, акуляры, тыркала, наслініўшы, нітку, але тая ўсё не трапляла ў вушка. Быў хоць занятак, не трэба было пазіраць, гаварыць з Васілём.

— Бачыш ты — аслепла зусім, — гаварыла як сабе Антаніна.

А Васіль усё разважаў:

— Глупства гэта... Не можа быць, каб жывы чалавек з вайны не прыйшоў дадому. Ды такі чалавек...

Рваў ён Антаніціна сэрца, як гэту нітку машына, рэзаў без нажа. Хоць бы памаўчаў! А таполі шумелі і шумелі — аглухнуць можна.

— ...Вы моцна з ім любіліся, Антаніна...

Зноў парвалася нітка, а рукі, як чужыя, як драўляныя — пальцы не слухаюцца, нітка, як сляпое кацяня, тыцкаецца, не знаходзіць вушка.

Антаніна нічога не адказала, толькі паклала твар у далоні, сухі і гарачы, як глыж на санцапёку. А Васіль усё не сунімаўся.

— Я ж помню...

— Што цяпер успамінаць, — узняла яна галаву, сказала раздражнёна і нават злосна. — Было і прайшло. Травою парасло.

Няхай сабе ядранай травою парасло, лесам высокім, попелам развеялася, але балюча ўспамінаць ёй, балюча гаварыць пра гэта. Хочацца сказаць Васілю: не дзеля размоў прыйшоў, узяўся рабіць ляжанку, дак чаго зубы сушыць ды языком мянціць. Але што ты зробіш, трэба трываць. Колькі чалавеку за жыццё ўсяго перажываць трэба, катораму, каб наперад сказаў, усё гэта пералічыў, то і на свет з'яўляцца не захацеў бы. Што ты зробіш... Добра, што Наталля выручыла, зайшла ў хату і з парога:

— У-у, як насмяціў ты, Васіль. І разувацца не буду...

Больш усяго баялася Антаніна, каб Васіль не стаў пры ёй разводзіць, бы куццю на вадзе, гаворку.

— Нешта ты хацела, Наталля?

— Ды што яшчэ, — шыць прынесла... Спадніцу... Ды ці выйдзе... — Яна разгарнула крам. Антаніна ўзяла яго, звыкла прыкінула на руку, то мерка была дакладная.

— Выйдзе, чаму не...

— Добра б, каб і ўнучцы сарахванчык, — сказала Наталля.

— А ты, Антаніна, — параіў жартам дзядзька, — рабі так, як колісь Мойша. Прынёс яму чалавек крам шапку шыць. Аддаў. Потым вярнуўся ды і кажа: «Мо дзве пашыеш?» — «І дзве пашыю». Пайшоў, зноў вярнуўся. «А мо тры...» — «Хай будзе тры...» Прыходзіць той чалавек па тыя шапкі, а яны ні на яго, ні на сыноў, а на вераб'ёў. «Што ты нарабіў?» — пытае. «Як што? Колькі ты прасіў, столькі я і пашыў». Так і ты рабі, Антаніна.

Ён ажывіўся, павесялеў, нібы і не сядзеў толькі што задумліва, не разважаў сумна пра людзей і жыццё, не тужыў па тых, каго няма, не вініў табак за слязу на воку.

— Вой, не выдумляй пра Мойшу абы-чаго. Ён сам штукар добры быў, сам пра сябе чорт ведае чаго нагаварыць мог, каб людзі потым смяяліся. Але не за гэта яго трэба помніць і шанаваць, — яна глыбока ўздыхнула. Памаўчала. — Колькі людзей выратаваў. А сам — першы загінуў.

Усе маўчалі, бы паміналі Мойшу. Потым Наталля пачала за ўсіх успамінаць. Гаварыла яна, бы прыслухоўвалася да свайго голасу, удумвалася ў тое, што гаворыць. І яны слухалі знанае і шмат разоў пераказанае, слухалі і маўчалі.

— Нашы тады адступалі, ужо за Слабадою былі, у лесе. Ці думалі яны адбівацца, ці не — невядома. Але немцы, мусіць, баяліся. Бо сагналі ўсіх мужчын у пуню, мы — бабы — стаім кучаю ды выем. Напраўду вылі. Не плакалі, не рыдалі, а вылі. А яны сказалі, што як толькі нашы адтуль, з лесу, пашлюць хоць адзін выстрал, усіх мужчын, каторых пабралі, прыкончаць. Ох жа і страшна было! Стаяць нашы мужыкі ў пуні перад адчыненымі дзвярыма, нібы ад дажджу пахаваліся. І Мойша з імі, а чорненькі Мойшык на руках. От жа любіў яго, усё на руках насіў за сабою. І ён, Мойша, усё нешта ім, немцам, гаворыць па-свойму. І яны разумеюць, гергечуць.

Ён усё, казалі, даводзіў, што людзі ні пры чым. Доўга гаварыў. Яны сваё, а ён з пуні — сваё. Ці ён угаварыў іх, ці нехта такі збегаў да нашых, чырвонаармейцаў, на Бажню за Слабадою, папрасіў не страляць, людзей пашкадаваць. Трымалі мужчын усю ноч, раніцаю такі выпусцілі. Ішоў і Мойша дадому, Мойшык, паклаўшы яму на плячо галоўку, спаў. Галоўка яго боўталася, бы макаўка на ветры. Яны ж, немцы, адумаліся, нікога не зачапілі, а Мойшу дагналі і забілі. Яго і дзіця. Мой божа, яно так і не прачнулася. А ён упаў спачатку на каленкі, як прысеў, а рук не разняў, усё трымаў сынка.

— А помніш ты, Наталля, Шубіна? Ён камандзірам быў у партызан потым. Дак гэта ён даў каманду тады салдатам не страляць, а рассыпацца на Бажні. А цяпер, гавораць, што нехта пачаў капаць на яго за тое.

— То ён нядаўна памёр...

— Ад таго і памёр. Сэрца...

Яны зноў маўчалі. У кожнага было сваё маўчанне, аб сваім асабістым і ўсіхным, і думкі цяклі, як вада між пальцаў, але клаліся цяжка на сэрца, падымалі мул у грудзях.

Па беразе ракі ішла Ліза. Хуценька, неяк азірліва, нібы баялася каго, ці нехта за ёю ішоў услед. Загнаным звярком кралася яна паўз бераг па звілістай, роснай пасля нядаўняга дажджу сцежцы. У выцвілай фуфайцы, гумавых чорных ботах яна была падобная на старую, а не на тую белакосую дзяўчыну са здзіўленымі вачыма.

Наталля ўбачыла яе ў адчыненае акно і вяла далёка, аж пакуль не схавалася тая за звівам высокага берага. Наталля каменціравала прысутным:

— Ліза ідзе. Бачыш ты, якая стала. Крадком усё. Па вуліцы і не ходзіць. Кажуць, у горадзе недзе працавала і добра ўладкавалася была, пасаду займала. Кажуць, нават дэпутатам абіралі. Але ж некаму не дагадзіла, пачалі пісаць ды дакопвацца. Нехта свой падказаў, мусіць. Ага, — развaжыла яна, — жыццё — нітка вузлаватая. Адзін вузел завяжа — другому разблытвай або рві.

— Выдумляеш абы-што, — усердзіўся на яе Васіль. — Мусіць, нешта ў сям'і, з чалавекам не заладзілася.

— Вось таму і не заладзілася.

Васіль падазрона зірнуў, бы Наталля была вінаватая, што гаворыць так упэўнена. Усіх гэтых дзяўчатак,

і Лізу, і Анюту, і, бывала, яе Любку, і іншых ён па-свойму любіў. Яны раслі на вачах, сябравалі з яго Галяю. Як збяруцца, бывала, усе — шум, гамана. А на душы радасна, любасць да іх... Каго за што вініць, у чым? Была вайна... «Гэта цяпер кожны разумны разважаць, як бы ён... А тады ў гэтай калатнечы, пад бясконцым страхам...»

Наплываў і раставаў твар Нурына, вірлавокі... Нічога болей не помнілася, адны вочы, што называюць, па яблыку. Чалавек з такімі вачыма бы народжаны ўсміхацца, а ён хмурны. Але вочы цвітуць, і ён варочае імі, хавае, а не захаваць.

«Ведаю, куды ты ходзіш. І чаго... — гаворыць Нурын і спрабуе схаваць позірк, апускае долу. — Хадзі сабе, ды на іх не нарвіся, а то і мне... разумееш. Хы-р, туды іх... адседжваюцца ў лесе, — зноў харкануў, плюнуў. — А ты весткі носіш. Ідзі і скажы — заўтра прыбудзе карны атрад. Няхай хаваюцца...» Гаварыў Нурын груба, харкаўся, мацюкаўся, але не хлусіў. Спачатку Васіль яму не верыў, а потым... Зглядзеў неяк — ідзе ў хату. Малаточкам заляпаў, застукаў, як дзяцел. Галавы не адпняў. Так заўсёды і гаварылі, не пазіраючы адзін аднаму ў вочы, агрызаліся, бы два сабакі, між якімі костка. «Здароў, сухотны! Скажы сваёй — ноччу хай не бадзяецца, як кошка». — «Бабы раджаюць...» — «Знайшлі час, курвы...»

«От так, чорт яго ведае, што ў чалавеку намешана: і дабра, і злосці... І што быў ён за чалавек? Наўродзі і дабра багата зрабіў, але, можа, яно тады ўспрымалася, як так і трэба?» — разважаў сам з сабою.

— Не сам жа пайшоў — мабілізавалі, — паспрабаваў абараніць Васіль, можа, не Нурына, а Лізу. — Гэта каб і я не хворы быў, думаеш, пакінулі б? Трасцы! А яна яго, можа, і не памятае, што і быў той бацька...

— Затое людзі памятлівыя.

Наталля сказала адрывіста, нібы тым і спыніла гаворку, адсекла яе, як галаву пеўню. Як не лапачы цяпер крыламі, а не кукарэкнеш. Пасядзела, потым сама ж зноў пачала:

— Помню: палавілі іх... Першы раз такое бачыла: ідуць, а ў іх валасы дыбкі стаяць, як хібы ў дзікоў. Людзі выйшлі — пазіраюць. А Нурын то таму крыкне, то другому: «Помніш, я цябе ад Германіі ўратаваў!» «Цябе б расстралялі, каб не я...» — усё ўказваў... Думаў,

апраўдаюць... Але ніхто, — можа, баяліся, — не пайшоў прасіць за яго.

— Нехта ж такі дапамог уцячы. І — як у ваду...

Антаніна пазірала то на Наталлю, то на Васіля. Хацелася ёй сказаць, хацелася... Язык штурхаўся аб зубы, бы чалавек у цемнаце шукаў дзверы. Хацелася сказаць: «Жывы Нурын». Але тое, нібы сказаць пра Ціта. Як ні круціла, а ў думках звязвала іх у адно.

Зірнула ў акно. І бывае ж такое насланне: нібы не Ліза, а Анюта ідзе па беразе прыгнуўшыся, сцяўшыся, пазірае пад ногі, бы апанавала яе курыная слепата. На людзей не пазірае.

Сэрца рванулася, здаецца, пакацілася, абдзіраючыся да шчымоты аб шорсткі жвір дарогі, аб грыўкі вострай, як лязо брытвы, асакі, пакуль не ўпала на той сцежцы, не застыла, не зацвярдзела каменем. Антаніна разгледзелася, адумалася. Але адчула скразняковую пустату ў грудзях, і сэрцу, якое вярнулася туды, было няўтульна, самотна і горычна.

— Цяпер от і мірны час... А свет пайшоў: усе занятыя, заклапочаныя... Ні да каго не даступіцца. Ніхто разумець нікога не хоча. Глядзі ты, як у Галі з кватэраю атрымалася. Гэта ўсё ад таго, што ў бацькі хата ёсць. А тут жа ўсё на віду: не палянуйся, крок ступі, паглядзі, ці ёсцека тут дзе жыць. Адна з камісіі сказала: вот каб ты была прыпісана там, дзе жывеш. Дык падавалі тым, прыпісаным. Хто спрытнейшы ды ўмее выкручвацца. Вочы пазаплюскалі, ці што?

Ён разнерваваўся. І рукі яго, што ляжалі на каленях, варушыліся, як злоўленыя ракі. Рукі шукалі работы, і ён пацягнуўся па цагліну.

— Гэта кіраўніку гэтак сказаць: «Хай бы той дом яшчэ сто гадоў не будавалі: з ім толькі клопат...» Скажы ты, Наталля, што такі чалавек рабіў бы ў вайну?

Яна маўчала. Вочы звузіліся, нос завастрыўся. Яна думала...

— Прырода стварыла чалавека далікатным, ранімым, кволым. Здаецца, і душа павінна быць такая, а яна чарсцвее, грубее. Нешта тут не так, — разважаў Васіль. — Нешта тут не так...

Жанчыны маўчалі. Невядома, пагаджаліся яны з ім ці не.

— Значыць, не скора яшчэ тое... — быццам сама з сабою, прагаварыла Наталля.

— Што тое? — не зразумеў Васіль.

— Ды вось калі Антаніна ляжанку перакладае, то не скора тое свята. А то гвалт паднялі: будуць зносіць старыя хаты, пачнуць будаваць дамы...

— А ты і абрадавалася... — нібы пажартаваў з яе Васіль.

— Анягож не. Хата, чаго добрага, абваліцца, а хочацца ж пажыць утульна ды чыста хоць пад старасць. Ажно гэта не скора, — расчаравана і нават гаротна зазначыла яна. — А я ўчора яшчэ і Жоржа паспавядала. Удумаў такое...

Яна раптам схамянулася. Зірнула на Антаніну: можа, яна не ведае?

## 14

...Што ж ёй, Антаніне, рабіць? Як адвесці бяду? Каб сказаў хто: памры, здаецца, памерла б, толькі б у яе, Анюты, было шчаслівае жыццё. За што паміралі ў вайну людзі? За тое, каб дзецям вольна ды шчасліва жылося. Ды не ўсе, мусіць, думалі пра дзяцей сваіх...

Добра, што яна паехала. Казала, што будзе скора: прыедзе на тым тыдні...

А пакуль нешта трэба рабіць. Неяк ратаваць. Жорж не хлусіць. Гэта праўда, праўда... Антаніна сама быццам забывала, што ляжыць у яе на дне куфра. А даходзіла да розуму, сэрца, якое толькі што нудзілася, знемагала ад пякучага, незваротнага ўспаміну — раптам бы хто знянацку абдаваў халоднаю вадою, і яно сціскалася ў цвёрды, ахалодалы глыж, балюча бухала ў грудзях, заціхала, затойвалася. І Антаніна не магла дабраць розуму, як жа і чаму ўсё здарылася? Нешта ж такое ёсць, калі чалавек не паказвае вачэй? Усю вайну прайшоў... Адумліва яна паварочвала гэта другім бокам: хто яго ведае, як прайшоў? Казалі ж людзі, што бачылі яго ў лесе, як нашы адступалі... Ды і сама яна помніць тое. Каму, як не ёй, помніць. «Прашчай, Анця, прашчай...» Словы гучалі цяпер як дараванне, нібы наперад ён прасіў яе аб гэтым. «Дзіва што. Ведаў, мусіць, што ўсякае можа здарыцца, не абараніў яе, людзей, якім потым і вачэй не паказаў. Ды і што тут разважаць. Усякае магло здарыцца. Што яны, звяры, выраблялі над людзьмі... Чалавек не каменны. Не кожнаму дадзена вытрываць».

Яна зноў думала пра мужа спачувальна, нібы ведала, што давялося яму перанесці, якую роспач, якія мукі. «Чалавек не жалезны, можа і ён зламацца». І сама ж сабе пярэчыла, разважаючы: «Што можна было такое зрабіць, каб вачэй не паказаць? Дзіця ж роднае... Дзіця... Ага, адкуль жа яму ведаць? А можа? Хто-небудзь... Не-не, нікому тое не ў галаве. Што, што ж такое трэба было зрабіць, як запэцкацца, каб на людзей, якіх ведаеш змалку, не змагці глянуць, зямлю гэту не скінуць вокам хоць у сутонні?

Нурын і той заявіўся. Крадком, цішком, поначы. Чаго ён прыйшоў да мяне, не да жонкі, а да мяне? — неяк запознена прыйшло да яе гэтае пытанне. — Упэўнены, мусіць, быў, што не выдам. Ён ашчадзіў мяне, а я — яго. Ён мяне ботам, ботам, як тую суку, закаціў ды ламаччам прыкінуў. Божа мой, я і не помню гэтага. Адэля тое расказала. Я ж як мёртвая была, без памяці, ашчаперыўшы халоднае дзіця, сядзела на купіне. Усё роўна было. Як праз сон помню... Ага, нібы як ягоны твар, і ён б'е мяне азвярэла ногцам. Мусіць, п'яны. Божа мой, як пазвярэлі людзі былі, ад страху ці з чаго ім мазгі так павыкручвала? І не думалі, мусіць жа, нічога, не разважалі... Адэля ўсё бачыла. «Ён так быў заняты табою, — казала, — што на мяне і не зважаў, я ў елку ўбілася, пад лапнік, учапілася за камель, каб не закрычаць. А на цябе мо падумаў, што адзеравянела, седзячы, што з табою важдацца. Ачнешся, то ўсё адно з ямы не выберашся, а не ачнешся — то мацуй тваю так...» Вось, скажы ты, думала пра чалавека свайго, а дайшла да Нурына, нібы ў адно іх звязала. Пра Нурына ўсякі ведае, ён тутака быў, у гэтых людзей на вачах. І перад судом уцёк. Таму і баяўся паказвацца. Поначы прыйшоў...»

...Тонка-тонка зазвінела шыбіна, нібы лядок калоўся на рацэ. Антаніна ўскочыла на ложку, села, прыслухалася. Потым, як ашалелая, насілася ўпоцемках па хаце, не могучы знайсці якую адзежыну, каб ускінуць на сябе. Падскочыла да акна, у поцемкавай цішыні ўбачыла і пачула — пакашліваў у кулак — мужчыну. Гухнула сэрца, як мех з плячэй, здалося, прагнулася падлога: Ціт... Ціт... (Толькі нядаўна напісала яму. Не папракала, яшчэ не ведала за што, проста прасіла азвацца... А гэта і сам...)

Чамусьці не запаліла святла. Можа, не даўмелася ад

хвалявання, неспадзеўкі. Добра, што не кінулася да яго на грудзі. Стрымала невядомасць, што была столькі гадоў між імі. Адступіла, дала прайсці ў хату, зашчапіўшы сенцы. Увайшла следам, дробна тупаючы ад хвалявання, зашарыла на камінку, шукаючы запалак.

Пачула сцішанае: «Не трэба, суседка». І, здаецца, абмерла ўся, ледзьве не абсунулася. «Хто то?» — папытала страхотліва.

«Не пазнала... — чалавек бы злёгку сарамаціў яе, маўляў, сваіх не пазнаеш. — Не чакала, — ужо заключыў, бы для сябе. — Канечне, не чакала...»

«Божа мой, асвяціся. Няўжо ты, Нурын?»

«Я, каму яшчэ. Забыла ты... Забыла, як уратаваў цябе, пад карчы схаваў».

Антаніна ўся дрыжала, дробна-дробна, ажно пастуквалі зубы. Яна сцяла іх, як галодная ваўчыца, каб не кінуцца на яго, не ўпіцца яму ў шыю. Ашчаперылася праз шырму, ледзь не абарваўшы, за біла ложка, які стаяў за печчу ў пярэдняй хаце.

І ён заўважыў, што яна дрыжыць. «Хто ёсць?» — папытаў скоранька і баязліва.

«Дачушка. Спіць у той хаце...»

«Садзіся да стала, — сказаў ён, — пагаворым». Сказаў, нібы не яна, а ён тут быў гаспадар. «Ды накінь што на сябе. Халодзіць, бачу, цябе».

«Ага, халодзіць». Яна намацала, усё яшчэ не могучы адпусціць біла ложка, куфайку, якая сушылася ля бока печы. «Анютка надзявала, бегала — во і рукавы закасаны — праз плот да Любкі ды мо ўдзвюх яшчэ да Лізкі насілася задачку якую спісаць... — Не заўважыла, што сказала гэта ўслых, — Лізкі...» Прашыла, як маланка, — гэта ж яе бацька, бацька той маленькай з тонкімі коскамі Лізкі. Сумелася яшчэ больш... «Мусіць, хоча што пра сям'ю даведацца», — падумала. І неяк пачала супакойвацца. Вядомая справа, чалавек столькі не быў дома. Ужо колькі гадоў, як вайна скончылася. То чаму б пра сям'ю не распытаць? Ачомаўшыся, села да стала, за якім сядзеў на канапе і ён.

У акне насупраць Антаніны высокая, кучомістая, голая, што дзяркач, таполя махалася, бы падмятала неба, прадзірала нізкія аблокі. Махала, махала дзеркачом, потым выпроствалася. Тады здавалася, што неба сапраўды яснела, пазначыліся абрысы рэчаў, але самі яны пataналі, расплываліся ў густым яшчэ сутонні.

Разгледзець твар Нурына было нельга. І што ў яго там на твары, здагадвалася толькі па голасе. Затое, як толькі выпроставалася таполя і аблягаў пыл аблокаў, ён добра, мусіць, бачыў яе твар і, здавалася, не спускаў вачэй.

Антаніна падумала, што ён чакае, калі яна скажа пра яго сям'ю.

«Жывуць твае...» — пачала толькі, а ён — як абсек:

«Не расказвай, ведаю... Адрэзана ўсё, Антаніна». Ён бразнуў па стале нажом, які ляжаў там пасля вячэры. І яна пазірала, як сталёва адсвечвала лязо ў мораку ночы.

«Чаго ж ён прыйшоў, — падумала, — калі пра сваіх і слухаць не хоча?»

А ён усё нешта муліўся, чакаў, раз-пораз заглядваючы ў акно.

«Адрэзана...» — паўтарыў ён. І гэта прагучала як працяг дрыготкага, глыбокага ўздыху, быццам не сам, не сваёю ахвотаю і воляю ўсё гэта адрэзаў. Адрэзана, а гаіцца не гоіцца і не адростае. Гэта не хвост у яшчаркі. Ды і той ці адрастае, хто бачыў, можа, хлусяць. Што адрэзана, то адрэзана...

«А ты як жывеш, Антаніна?»

«Чаго пра мяне занепакоіўся, можа, не рады, што ацалела? Колькі народу тады пагінула, усіх жа пагналі ў лагер, каго палавілі... А можа, узяліся за яго? Узяліся, мусіць-такі...» Яна маўчала, толькі разважала сама з сабою. Пераменлівы цень хадзіў па яе твары, а яго твару не відаць было, толькі — бляклая пляма. Яна адчувала, як коўзаецца па твары цень ад галінкі прысады, бы, пужаючы, дубцом хто замахваецца. І ўсё спрабавала ўхіліцца ад яго.

Паматлялася і супакоілася таполя. І праз навалач пашматаных хмар дзе-нідзе прарывалася святло. Вось і яго твар стаў прамывацца праз змрок. І ён матануў у акно галавою, мусіць, занепакоіўся.

«Дак чаго ж ён прыйшоў? Вось так бы во і папытаць: чаго ты прыйшоў?» — думала яна. І ён нібы адчуў гэта, зразумеў.

«Прыйшоў я табе сказаць... — ён як бы завагаўся. — І ў вас з Цітам усё... Ты пісала яму?»

У яе ажно вочы палезлі на лоб, выпрасталіся сашчэпленыя рукі, якімі падтрымлівала галаву, самі сабою

бразнуліся аб стол, упалі, як з-пад прыстрэшка граблі.

«Не пішы яму болей. У яго сям'я. Што цяпер табе да яго. Колькі дзеўчыне тваёй ужо?» — папытаў, але адказу не чакаў. Памаўчаў, мусіць, прыкідваючы, ведаў жа, ну няхай на год мог памыліцца. «Як што ўжо, пражыць не зможаш, — пішы, грошай вышле... Вось такая табе мая парада». Апошняе прагучала неяк цвёрда, бы не парада гэта была, а загад няйначай. Але да таго ў яе ўсё памуцілася ў галаве, што яна не магла асэнсоўваць, абдумваць такія адценні, як інтанацыя. Яна чула толькі яго словы. Яны ўдарылі, як выспятак, толькі звон, тонкі, нудлівы звон яшчэ стаяў у галаве, падвываў, як абвіслая электралінія ў непагадзь.

Так яна і сядзела глухая і анямелая, а ён нешта яшчэ ёй гаварыў. Дайшло-такі, гэта ж ён запрашае яе з сабою, не, не запрашае, а намякае, што калі б яна пагадзілася, то ён бы быў не супраць. І гэта яго рука ўжо ў яе на плячы. «Ах ты гад! Гад! Гад!» Мусіць, гэта нутро яе крычала, бо зубы, як сціснуліся, не расціскаюцца. «Гад! Ты і яго зачарніў, мусіць?! Ніхто, ніхто мне не трэба! Ні ты, ні ён!» — гэта яна ўжо выкрыкнула, аж ён адступіўся.

«Ціха ты, дурніца, я ж па-харошаму, па-добраму, — шаптаў ён, бы радуючыся. — Як так, дык што ж...» Сеў.

Яна таксама выгаварылася, апала духам, целам. Галава валілася на стол, на рукі, якія паздзіранымі, абламанымі пазногцямі — восень бульбу капала — шкрэблі стальніцу, бы хацелі ўчапіцца за яе, каб не зваліцца долу.

«Прашу цябе аб адным: што я быў — нікому... Чуеш, нікому».

Ён ужо адчыняў дзверы, а яна звалілася галавою на стол, як забітая. І толькі чула: «Нікому, нікому, нікому...»

Каму ж яна раскажа, што яны разам нечым завязаныя? Каму? «Божа мой мілы, асвяціся! Дай сілы не памерці!.. Дай вытрываць сэрцу... Скажы, дзеля чаго, навошта жыць?..»

Выпусціла яго з хаты. Замкнула. Вярнулася.

Босыя ножкі дачушкі, якая прачнулася, цёпла чмокалі па падлозе. Анютка падышла да маці, абняла за шыю. Маўчала, не разумеючы, што з ёю, а можа, не

раскатурхалася ад сну і яшчэ не адрознівае, ява гэта ці сон. Абдымае і ападае ёй на рукі, засынае, мусіць. Гэта прыснілася ёй, прыснілася.

Антаніна прыціскае дачку да сябе і вядзе ў пасцель.

«Чаго я, дурніца, вось жа ўцеха і жыццё маё. Усё. Болей няма нічога. Болей нічога...»

І ўжо, лежачы побач у пасцелі, гладзячы худзенькую спінку, рабрыстыя бачкі, думала, суцяшаючы сябе:

«Хіба не дажыву... Хіба не дажыву толькі! Збяруся неяк і паеду. Пагляджу яму ў вочы. Нічога не хачу, толькі ў вочы зірнуць».

Так і жыла з незагойнаю ранай. Умела прыкрывала яе, прыхоўвала, звыклася. На адзіноце, калі толькі клявала-клявала, як кураня проса, швейная машынка ды шапацелі, шапталіся таполі за вокнамі, успамінала, перадумоўвала ўсё да драбніц. Не сыходзіліся канцы з канцамі, не звязваліся, як абарваныя ніткі, а калі і звязваліся, вузел не праходзіў у вушка... І ўсё часцей даставала тое казённае пісьмо з куфра і перачытвала адрас...

Ішла таропка. Падганяла жахлівая думка, ажно сціскала грудзі, захоплівала дыханне: «Марыя можа памерці. Тады — усё...» Яна спяшалася, нібы магла затрымаць Марыіну смерць, адцягнуць, адкінуць, адштурхнуць. «Не памірай, Марыя! Не памірай. Табе няможна. Мы ўдзвюх ведаем. Толькі мы... Адэля ж, сястра мая, памерла. Цяпер толькі ты і я, як мы вырашым, так і будзе. Як ты скажаш...»

Яна ў думках гаварыла з ёю. А можа, нават услых. Бо, размінаючыся з нейкай дзяўчынай на тратуары, заўважыла яе мімалётны ўражаны позірк: тая як бы адхіснулася ад Антаніны, зірнула на яе, як на вар'ятку.

Яна не заўважала людзей. Ішла, спяшалася,ківала таму-сяму, механічна здароўкалася, хаваючы чамусьці вочы, бо па іх можна было ўгадаць, што з ёю творыцца. А гэтага ўсё адно ніхто не павінен ведаць: гэта толькі іх з Марыяю. І нікому ніякай справы.

«Не памірай, Марыя. Табе трэба жыць. Абаім нам... Мы ж... Хто яшчэ Анюту абароніць? Толькі мы ёй радня. Мы абедзве маці яе. Хто раднейшы, цяпер і не скажаш, не ўгадаеш. Ты ці я? І мы ж з табою родныя... Крэўныя.

Мы — маці аднаго дзіцяці. Апошні наш доўг — абараніць яго. Хоць сваім жыццём... Не памірай, Марыя...

Цяпер ты можаш сказаць так, як хочаш. Можаш нават сказаць, што гэта я ўкрала, адабрала... Мне ўсё роўна. Абы ёй добра было. А ёй і так не соладка. Бачу я, не сляпая. Я ж першая маці. Так, маці! — Яна настойвала, даводзіла, нібы Марыя не пагаджалася. — Маці я ёй, маці! А ты, ты кінула яе, кінула на марозе, у снезе... Ты казала: думала вярнуцца. Кінула... Мокранькую... За намі гналіся сабакі. Яны ж бы яе разарвалі, як зайчаня. Ты думала толькі пра сябе, Марыя. Я гэта ўжо табе гаварыла. Кожная маці павінна абараніць сваё дзіця, сваё будучае, бо што чалавек без будучага? Як бы я жыла без яе? Нашто б мне была такая жытка? Хочаш, я распрануся. Зірні на маю спіну, яна ўся рваная, як залапленая. Пазажывалі раны абы-як, чым толькі нябожчыца сястра Адэля не мазала. Мачой прамывала. Яны рвалі мяне з усіх бакоў, але я скруцілася ў клубок, як той вожык, яна ў мяне — ля жывата. Здаецца, каб магла, захавала б яе ў нутро. А яны рвалі мяне з усіх бакоў... І цяпер, Марыя, я не магу прайсці міма аўчаркі, валасы ўстаюць... Становяцца дыбкі, бы растуць, як трава. Гэта на ўсё жыццё. На ўсё жыццё гэты страх. Ведаеш, хто адагнаў іх? Нурын. Ногцам, ногцам мяне адкінуў у яму...»

Памяць — сляпая, нямоглая старая — намацвала хісткія прыступкі, а намацаўшы, баялася ступіць, каб не нізрынуцца ўніз.

«Не памірай, Марыя».

Вусны шапталі, заклінаді, прасілі: «Мы толькі ўдзвюх яе абаронім. Памятаеш, ты прыйшла і прасіла не гаварыць Цімоху, што спужалася ты, пакінула дзіця. Ага, пакінула. Бездапаможнае, кволае, як парастак на марозе, як зярнятка, не прысыпанае глебай. Мо таму і хвараеш гэтак, таму і сэрца тваё збалела, стамілася. Чалавек не можа доўга насіць такое... Колькі можна трымаць раскалены вугаль у руцэ, не перакідваючы з далоні ў далонь, а заціснуўшы ў кулак? Колькі можна, Марыя? Ты гадавала свой боль, вось ён і рве табе грудзі. Помню я: прыйшла ты, нічога не гаварыла, толькі пазірала затраўлена, баязліва. Ты баялася ўсяго. Спачатку іх, гэтых выродкаў праклятых. Баялася загінуць. Хацелася жыць. Ой, як жа ўсім хацелася жыць! І мне таксама. Але дзіцятка... Цяжка ўспамінаць, Марыя. Я сваё,

мёртвае, насіла два дні і дзве ночы па лесе. Сама па шыю ў вадзе, а яго на руках паднімаю. Насіла, пакуль Адэля не падмяніла хітрыкамі і сілаю на тваё. Страшна табе расказваць, Марыя, успамінаць страшна, нібы нешта неверагоднае, бо цяпер і самой не верыцца: як можна было такое перанесці. Я ж была як звяр'яцела. Нічога не чула, не разумела, толькі трымала малое на руках, люляла і калацілася ўся, як у ліхаманцы. Сядзела на купіне сярод балота, а на руках — халодны, не сагрэць ужо ні целам, ні дыханнем, камячок, ацiхлы, бязгучны.

А можа, я аглухла? Аглухла, мусіць. Разбудзіў мяне плач, дзіцячы плач, як раніцой будзільнік, калі чуеш, бывае, што звініць, а прачнуцца не можаш. І я думала — гэта сон. Плача і плача маё дзіцятка, а я не магу прачнуцца, і голас яго — што музыка. І прачынацца не хачу, не магу спужнуць яго плач, гэтую цудоўную музыку. Гэта ж Адэля і сунула мне ў рукі немаўля, звар'яцелай ад гора, паднесла да грудзей дзіцятка, якое ты, Марыя, пакінула на купіне. Як яно загрэбалася ля грудзей — згаладалася — халодненькімі ручкамі, дрыжачымі і здранцвелымі, абдымала цыцку. І я ачнулася, нібы доўга спала: дзіця ссе грудзі, Адэля сядзіць побач на лапніку. А я пазіраю на яе няўцямна, зразумець нічога яшчэ не магу: дзе я і што са мною. Кажу Адэлі: «Госпадзі, які мне сон прысніўся жудасны, не давядзі нікому такое». — «Які?» — пытаецца Адэля. «І расказваць страшна», — гавару, а сама ўся скаланаюся: «Прыснілася, што Анютка мая нежывая, халодненькая, а я яе на руках нашу. Божа, як добра, што гэта толькі сон». Я і тады яшчэ не магла ачуцца, Марыя. Хіба ў памяці не адрозніла б сваё дзіця ад чужога? А бач жа... «Сон гэта, сон, — супакойвала мяне Адэля. — І, дзякаваць богу, што ты прачнулася. Трэба ісці хутчэй за людзьмі. Мы з табою зусім адсталі». І тады мы пачулі брэх сабак. Хочаш, я распрануся, Марыя, зірні на мае плечы, калі не верыш. Яны — як пералапленая апратка. Толькі потым, праз колькі дзён, калі мы патрапілі сюды, у мястэчка, я ачуняла крыху, разгледзелася. Здалося, быццам перамянілася вельмі мая Анютка. «Дзеці мяняюцца хутка», — сказала Адэля.

А праўду яна сказала толькі перад смерцю. Паклікала мяне і кажа: «Даруй мне, Анця, даруй, сястра... Я тады дала табе ў рукі чужое дзіця, а тваё, мёртвае, закапала ў купіну на Цэцеруковым балоце. Цяперака тую

купіну і не знайсці мне. Недзе з краю ля старой грэблі. Не сон, не сон то быў, Анця, не прыснілася табе... А да памяці ты прыйшла, як дзіцятка выссала твае грудзі. Скажу цяпер табе, чыё яно. Марыі, Цімохавай Марыі. Яна пакінула яго на купіне. Не асуджай яе. Цяжка, мусіць, ёй было з дваімі. Хлопчыка ўзяла, а гэтае немаўлятка пакінула. Ратавалася, душу ратавала...» Так здавалася. Толькі душа болю не пазбылася, а набыла яго. Вось і баліць твая душа, Марыя. Мусіць, людзі табе падказалі ці чула сэрца: прыйшла ты...

Прыйшла, села на лаву ля стала, маўчала, доўга маўчала. Мне і не ў галаве. Думала, на базар хадзіла — зайшла. Мы ж дзеўкамі з табою сябравалі. Ты за свайго выйшла, вясковага. А я — у мястэчка. Ды і ў вайну, як усё ўсчалося, я падалася дадому, у вёску. Можа, і не трэба было з месца зрывацца. Нагаравалася...

Ты сядзела ля стала. Мы і колькі слоў не сказалі, як з чыстай палавіны Анютка выйшла, а ты як застогнеш, рукі заламаўшы. І бразь аб стол, знепрытомнела. Яно і тады ўжо ў цябе сэрца балела. Госпадзі, як напужала ты мяне. І яе, Анютку. Я хуценька адправіла яе на вуліцу, а цябе давай вадою адліваць ды валяр'янкай паіць.

«Мая гэта, мая дачушка», — шаптала, рыдаючы, ты. Уся сіняя зрабілася.

«Не дурыся, Марыя, — кажу, — табе ўжо зданькі здаюцца». Я не ведала, Марыя. Я ж нічога тады не помніла... Мы з табою нават пасварыліся, я цябе нават з хаты выганяла... Даруй мне. Я не вёдала. А ты, бывала, усё забягала. Сырок ці масла галышку — усё прынясеш, пакінеш: маўляў, на базары не прадала. За гэта мы і сварыліся. І з шытвом я табе задаўжала. А гэта аднойчы — віск на ўсё вуліцу: ты парася ў катух укінула, а грошы не ўзяла. Ну як было не сварыцца з табою, Марыя?

Падрастала яна, і стала я прыглядацца. Падумаю, што на цябе як бы падобна і сама сябе лаю: маўляў, адна дурніца сказала, а другая паверыла. А як сказала Адэля — яна недзе гадоў праз дзесяць пасля вайны і памерла — тут і я затрывожылася. Так і жыву, Марыя. Думаеш, мне лёгка было? Не лёгка... А потым хлапец твой стаў за ёю хадзіць. І яна яго ўпадабала... Сэрца і маё збалелася, Марыя. Ой, збалелася...

Але я цяпер не пра тое. Ты ж ведаеш мужа майго, Ціта. Не скажу, словам мяне не пакрыўдзіў да вайны.

Мяккі быў, ласкавы. А як яно адбылося — не ведаю, дадому ён не вярнуўся. І вестак ніякіх... Можа, помніш, людзі неяк пра яго ўзгаварыліся, успамінаць сталі. Ды я і сама пачала шукаць яго. І прыйшло мне пісьмо. Казённае, з яго адрасам. Колькі я пападумала, колькі папаплаквала, і так і гэтак круціла, пераглядала сваё жыццё. І яго. Неяк ужо чуць не паехала, думала, у якім шпіталі дзе, многа ж вось так дадому не вярнулася. А потым Нурын прыйшоў неяк ноччу, пра яго расказаў... Толькі я цяпер не вельмі веру. Мо так яно, мо не так... Ды ці мала што... А раптам? А ты ж яе маці. І я яе маці. І трэба нам ратаваць дачку. Бачыш, што Жорж твой уздумаў, ды і брата выклікае... Натвораць яны, потым разбірайся, а ў Анюты могуць быць непрыемнасці на рабоце, у сям'і. Бачыш, што з Лізаю, дачкою Нурына, сталася?

Пакліч ты Жоржа, Марыя, ды раскажы яму, угавары... Ты ж маці. І табе лягчэй будзе. Я ведаю, і ты мучышся, ужо колькі гадоў ні жывеш, ні паміраеш. Спакойна памерці — гэта таксама шчасце, Марыя...»

Так думала яна ўсю дарогу да бальніцы. Ішла — не бачыла ні людзей, ні прысад. Як у сне...

«І будаўніцтва тое будзе не скора. Гэта ж, як яны кажуць, на перспектыву. Пакуль што толькі кансервавы завод будуць будаваць. То пра якую шыльду можа быць гаворка з яго, — перамаўлялася з ёю і пра Цімоха, — з яго нейкімі дзесяццю-пятнаццаццю тысячамі? Шыльду захацеў... І прыдумаў жа. Гавораць, раілі яму ў Фонд міру перавесці, дак адказаў: хачу, каб вось тут, на Радзіме, помнілі мяне. Гэта некалі паны сябе гэтак услаўлялі. А ў савецкі час... А што, каб і шыльду павесілі. Гэта ж не кожны зробіць... Не кожны...»

...Марыя ляжала з закрытымі вачыма. Антаніне здалося, што няма ў яе твары жыцця — вочы запалі, і тонкія, маршчыністыя павекі іх былі падобны на бельмы. Адно што яны нервова ўздрыгвалі. Па тым і можна было здагадацца, што ў гэтым схудалым, немачным целе яшчэ пульсуе, — квола, непрыкметна, як у крынічцы пад лёдам, — жыццё. Марыя інтуітыўна адчула на сабе позірк — шчылінкі вачэй вузенька прыадкрыліся. Павекі — два апалыя, зморшчаныя і пажухлыя пялёсткі, — мусіць, былі цяжкія, не падняць. Варухнулася на белай

прасціне худая рука, як пажоўклы сухі тытунёвы ліст, які занёс вецер на снежнае поле. І ў грудзях глуха забілася рыданне.

Антаніна ўтрапёна і зацята пазірала на Марыю і не пазнавала яе. І не адчула — па шчацэ пацякла доўгая, як хто цягнуў нітку з клубка, сляза. Жаль, жудасць, а можа, разгубленасць перад непазбежным скавалі яе рухі, замарозілі язык, горла. Адно хапіла сілы не павярнуцца, а нейкім бакавым зрокам зірнуць на жанчын. Адчувала: стаяць яны, абапёршыся на бліскучыя білы жалезных ложкаў. Твары іх горка-застылыя, адно вочы пазіралі паразумела, спачувальна. Вецер зноў крануў тытунёвы ліст, і тонкія сухія губы заварушыліся.

— Прывядзі яе, Антаніна, богам цябе прашу, — скрозь клёкат і сіпенне, што былі цяпер Марыіным галасам, разабрала яна некалькі слоў, разарваных парыўным дыханнем. Заківала галавою. І невядома — ці згаджалася, ці спачувала хворай.

Вярталася дадому, і свет здаваўся жорсткім і бяздушным: неба як не садзілася на плечы, гняло да зямлі, рака — шэры шыфер. І людзі напорыстыя, з задранымі галовамі — толькі саступай дарогу. Патыхнуў прыкрасалодкі пах рэзеды, здавалася, яна сілілася перакрыць усе іншыя пахі, як іншы хоча перакрычаць у сварцы іншых.

«Мусіць, павернецца вецер, — падумала Антаніна. — Трэба зачыніць вокны».

Нічога яна не сказала Марыі з таго, што думала. Нічога. Ды і як скажаш? Гэта ж — забойства. Чыстае забойства. «Мучыцца яе душа і без таго. Б'ецца, як падранак. Грэх цяпер кроіць ёй сэрца».

Антаніна разумела Марыю, спачувала, шкадавала яе. Зірнула на жоўты спакутаваны твар, змізарнелае цела і аціхла ў душы бура, што бушавала ўсю дарогу. Бы раку, што толькі што струменіла і бруіла, адначасна скавала марозам. Яна адчувала нават гэты ледзяны глыж, які залёг у грудзях. Якое трэба цяпло, якая радасць, каб растапіць яго? Можа, такой і ў свеце няма. Ды якая радасць цяпер ёй трэба? Толькі каб ціха ў свеце было ды ў Анюты — шчасце. Нічога, нічога болей ёй не трэба. Ні сон не ішоў, ні яда не лезла ў горла. Яна адчула, што нават аслабела за гэтыя некалькі дзён. Раніцой не магла падняцца з ложка, вось так бы і ляжала, як гліняная. І толькі перасільваючы сябе, уставала, нешта рабіла.

Колькі дзён ужо яна пільнавала Жоржыка. Хадзіла дамоў да яго, але кватэра была зачынена.

І вось заспела вечарам. Ужо цямнела. Каб трохі, паімчаў бы на сваім драндулеце, які трашчаў пад ім, пыхаў гарам, тросся, адно крані педаль — і панясецца. Але Жоржык трымаўся нагою зямлі, а ззаду на багажніку сядзеў сябрук яго: некуды навастрыліся, нанач гледзячы. Яна ўпрыцемку добра не разгледзела другога: хто, чый? Трэба было пагаварыць з Жоржам з вока на вока, пагаварыць грунтоўна, але момант быў непрыдатны. І сам Жоржык, відно было, з матацыкла не злезе, спяшаецца, і гэты нецярплівы, нават варожы пагляд з-за яго спіны бянтэжылі і спынялі яе. Але калі яшчэ зловіш Жоржыка, і яна таропка і не так, як думалася, амаль не чуючы свайго голасу з-за трэску матацыкла, папрасіла:

— Жоржык, дзіця маё, прашу цябе, як роднага, не вытварай нічога на Анюту. Яна ж ні пры чым тут. Гэта як начальства вышэйшае рошыць, будаваць што ці не. А яна ж толькі падлікі робіць, што папросяць. Жоржык, вы ж родныя...

Жоржык глянуў на яе недаўменна, нібы не зразумеў адразу, пра што гаворка. Яна нават падумала, што ён, можа, і забыў, можа, з п'янай галавы намалоў, набрахаў. І ажно зніякавела, але не дала яму ачомацца:

— Жоржык, я хацела з табою перагаварыць. Не злаўлю цябе ніяк. То зайдзі калі, галубок. Зайдзі. А цяпераха едзь сабе, едзь. Спяшаешся ж, бачу.

Жоржык няўцямна кіўнуў. Матацыкл ірвануўся пад ім, і той, што маўчаў ззаду, чула яна, вылаяўся, нешта выкрыкнуў яшчэ, але голас яго не вяртаўся, панёсся разам з трэскам матацыкла.

А яна падумала: «Ці прыйдзе? Трэба на выпадак хоць які «сонцаўдар» купіць ці «фугас». Якая ж гаворка з Жоржыкам без іх...»

## 15

Яны сядзелі ў балоце, мокрыя, гразкія, аддыхваліся, як загнаныя. І сапраўды — загнаныя. Дрозд на выгляд спраўны, моцны мужык, а задыхаўся, хакаў, як сабака, дыхаў ротам. Жоржык нават кухтыльнуў яго ў бок, каб сцішыўся. Сам ён таксама ўпарыўся, чамусьці ламала

грудзі ў самай сярэдзіне, аж у рукі аддавала... Ён моцна сціснуў зубы, як абцугі, стараўся стаіць дыханне, перамагчы боль, што крышыў грудзі, круціў рукі, бы выцягваў з іх жылы.

Непраглядная цемра акружыла іх. Было нават ніякавата, хоць яны і ведалі тут кожную купіну, пералазілі ўсё наўкруг. Не першы раз сядзелі тут, у хмызах, і толькі градка алешніку аддзяляла іх ад дарогі. Рыбгас на другі бок ад яе. Яны нібы адгарадзіліся ад яго гэтаю шасейкаю. Сядзелі, аддыхваліся, прыслухоўваліся...

Жоржык адпусціў ніжэй з плечукоў лямкі рэчмяшка, але не зняў. Зірнуў на неба — яно было цёмнае. Як крыга, навісла хмара. Толькі цяпер, калі крыху суняўся боль у грудзях, Жоржык адчуў, што пячэ шчаку: як агнём гарыць. Ён цеpанyў ёю аб плячук — зашчымела мацней. Зразумеў, што напароўся ў гэтых хмызах на патырчаку.

— Дзе торба? — хапіўся Дрозд.

Жоржык назнарок крышку памаўчаў, як бы не чуў. «Толькі сваю шкуру ратаваў», — непрыязна падумаў пра Дразда, але ўмомант патушыў непрыязнасць: маўляў, і сам, мусіць, зрабіў так, каб рэчмяшок не быў пры сабе.

Дрозд яшчэ раз паўтарыў сваё пытанне. Цяпер сполах быў у яго апалым голасе.

— Ды ў мяне... — абыякава адказаў Жоржык. Дрозд, бы не паверыў, мацнуў рукою яму за плечы.

— Такую тваю... — усё яшчэ хакаючы, няроўным, што як бы рваўся, голасам сказаў Дрозд. — Я так і ведаў... Як якая старая сцерва пярэйдзе дарогу, можаш вяртацца. Ні храна не будзе.

Жоржык толькі на імгненне ўбачыў перад сабою постаць цёткі Антаніны. Гэта яна і была, тая сцерва. Жоржык ведаў яе і не ведаў. Ведаў хутчэй завочна. Яшчэ як у школу хадзіў і потым маці ўсё пра яе распытвала: як жыве, ды дачка дзе, што парабляе? Прасіла, каб зайшоў: усё-такі радня нейкая, а якая — не гаварыла. Бывала, нешта совала перадаць, але ён так ні разу і не зайшоў. Маці папытае — схлусіць ці паабяцае зайсці. Потым ужо, як ажаніўся, у жонкі яго распытвала. Тая ведала ўсё. Жоржыку нават здавалася, што за гэта яна яе і любіла.

На адзін момант Жоржык пачуў, як штуршок сэрца, трывогу ў яе голасе. Чамусьці хацелася, можа, таму што

нарастала, як пухліна, раздражэнне і злосць на Драздa, хацелася яму абараніць цётку.

— Сам вінаваты, — горача сказаў Дразду, — як дамаўляўся, так і атрымалася. А хваліўся, бляха! — Жоржык скалануўся, яго прабіралі дрыжыкі. Ён быў мокры па пояс, не скінуў штаноў, як ставілі нерат, а так і палез у ваду. Дрозд дык распрануўся дагала. А Жоржык навучаны. Было вось так, як маці нарадзіла, і прыйшоў дадому, ды яшчэ са с... спечанаю крапівою. Вартаўнік тады адзежу забраў, думаў, нікуды не дзенецца, прасіцца прыйдзе, голы не падасца дадому. Ага, выкусі... Жонка Жоржыка, нашто ўжо баба смелая і баявая, адчыніла дзверы — і самлела. Са сну думалася, што нябожчык які...

— Гаварыў, прыйдзем — налоўлена будзе, прыгатавана... Амаль што насмажана, — кпіў з Драздa Жоржык. — Добра, што з матацыклам не паперліся. Як адчуваў.

Матацыкл Жоржык схаваў недалёка ў алешніку па другі бок дарогі. Але ехаць цяпер было рызыкоўна. Калі гэта рыбнагляд, а яны таксама спрактыкаваныя, могуць чакаць на развілцы...

— Дык нешта Хамчука не аказалася. Другі зусім... Хіба рыбнагляд награнуў. Яны, бывае, прыедуць, стоража, як сабаку, — у будку. Не давяраюць ні храна. А самі тады ўжо лахкаюць... А з Хамчуком мы зачарнілілі. Ён і сказаў: надыходзь. Усё будзе... А, бач, ні храна. Шкада, як сетку знойдуць, — гаварыў ён, пераскокваючы з аднаго на другое. Можа, са страху.

— Знойдуць, канечне...

— Сетка новая, — пашкадаваў Дрозд. — Пайсці б ды праверыць...

— Пасядзім трохі, — супакоіў яго Жоржык, зноў скалануўшыся ад холаду, што прабег па целе.

Недзе непадалёк гартанна і хрыпла, як хто апрабаваў дудку, кракнула качка. Яны заціхлі, прыслухаліся. Качка, можа, ужо іншая, дзеранула цішыню і заціхла. Пачулася як бы чаўканне.

— Нейкі звер палюе, — прашаптаў Дрозд.

— Глядзі, каб сабака які на нас не паляваў, — не падтрымаў яго спакою Жоржык.

Нешта зашапацела, зашумела. Гэта па алешніку, нібы крупы, сыпануў дождж. Спачатку дробненькі і часты, а потым кроплі пабуйнелі, памацнелі. Абодва на-

ват абрадаваліся: можа, пужане вартаўнікоў. Дрозд выказаў услых такую думку, на што Жоржык скептычна заўважыў:

— Ага, у дождж яны сама лахкаюць...

Дождж быў цёплы, мяккі. Жоржыку здалося, што ён нават сагрэўся, прагнаў дрыжыкі. Яны ўсё-такі выбраліся на заціхлую шашу, пайшлі не па сетку, а да матацыкла. Так настаяў Жоржык. Матацыкл быў яго, а сетка — Дразда. Парашылі пакінуць рыбу на багажніку, а потым ужо ісці па сетку. Жоржык тайна спадзяваўся, што потым адгаворыць Дразда. Забярэ ён сваю сетку потым. Нешта не было ахвоты вяртацца на вадасховішча, каб не папасціся.

Але матацыкла на месцы не было.

Гэта мяняла сітуацыю. Цяпер яму было ўсё роўна. Адказваць, дык спаўна.

— Раніцой прыкоцяць, — не вельмі перажываючы па гэтым, сказаў Жоржык.

— Ты ж зняў нумары...

— Яны і без нумароў ведаюць чый — гэта не трусы ў кветачкі, — адказаў ён, успамінаючы, як прыносілі адзежу на апазнанне.

Сетка ж была на месцы поўная рыбы, аж кішэла, як падцягнулі да берага. Недарма Дрозд пачапіў ля грузіла для прыманкі сухія батоны.

Сетку схаваць не было дзе. І яе і рыбу пёрлі на сабе. Шлях, кіламетраў у шэсць-сем, здаўся не блізкі. Таму адразу падаліся да Дразда. Ды і заяўляцца Жоржыку дадому было небяспечна. Можа, ужо яго пільнаваў які Зарагулька. Міліцыянер Зарагулька быў стары дружбак: разам у школе вучыліся. Зарагулька не раз выручаў, але апошнім часам, заўважыў Жоржык, капыліўся. Не хацеў пазіраць у яго бок. Сказаў недвухсэнсоўна: «Усё, Жорж, пападзешся — я цябе не ведаю. Зразумеў?» «Мы ж разам вучыліся», — напомніў Жоржык. «А навучыліся рознаму. Значыць, не разам. Зразумеў?»

Не, Жоржык нічога не зразумеў, што з ім, якая муха ўкусіла. І цяпер, ідучы з рыбалкі, калі можна так было назваць іх начныя прыгоды, ён расказваў пра тое.

— У філасофію кінуўся, ні храна болей не скажаш, — заключыў Дрозд, — мо цяперака жонка давучыла: настаўніцу ўзяў.

Дрозд жыў на пасёлачку ля самага ўезда ў мястэчка, які здаўна называлі Слабадою. Чаму так зваўся гэты

пасёлак? Такая думка Жоржыку ніколі не прыходзіла ў галаву, як многае іншае. Здавалася, яго не цікавіў навакольны свет, у яго было нейкае сваё ўнутранае жыццё, сваё кола разуменняў і ісцін. Здавалася, наогул, што ён ніколі нічому і нідзе не вучыўся, а вырас вось так, як крапівіна ля плота, невядома адкуль набраўся цынізму і злосці: дакранешся — джгане. Можа, гэта гарэлка так абтрэсла яго пачуцці, як лісце з дрэва, агаліла і сцерабіла іх танчэйшыя адценні, пакінуўшы самыя грубыя, нейкія нават жывёльныя сігналы іх. Як быццам камандавала не галава, не душа, а страўнік, сонечнае спляценне...

Ён і сам здзівіўся, чаго, з якой нагоды яму — ды так назольна! — зайшло ў галаву пытанне: чаму пасёлак завецца Слабада? І наогул, апошнім часам мазгі яго пачалі ні з таго ні з сяго прачынацца. Вось так во нагорнецца, бы раптам заснеш ля тэлевізара, гледзячы кіно, прымгнеш і прапусціш нешта. Здавалася, што ён нешта праспаў, прапусціў у жыцці, адразу і не адкажаш. Самыя неверагодныя пытанні сналіся ў галаве. Простыя і ўсё ж неверагодна складаныя, і прыходзілі яны зняцэўку, самі па сабе. Сядзеў ён аднойчы дома на кухні за сталом, пазіраў у акно і раптам сказаў да жонкі:

— Чаму лісце на дрэве зялёнае?

— Ну, а якое табе трэба? Лета — вось і зялёнае, восенню пажаўцее, — буркліва, з насмешкай адказала яна.

— А чаму? — неяк глыбакадумна, бы шукаючы адказу ў сваёй начыста высклыганай галаве, паўтарыў ён.

Жонка зірнула на яго, як на несамавітага, выразна пакруціла пальцам каля скроні:

— Ты ўжо здурнеў з етага «чарніла». Зялёнае, ну і зялёнае. Так спрадвеку было і будзе. Табе што да гэтага? Здурнеў зусім. Мала, што знізу аднялося, дык і мазгі дзяцінеюць. — Яна пазірала на яго — можа, яму так здалося? — гідліва. І ён адчуў нейкую сваю перавагу над ёю, нейкую духоўную перавагу, упершыню зразумеўшы, што і яна вось гэтак жыве, як у сне, ні пра што надта не турбуючыся, не задумваючыся над самым простым. І трэба ёй толькі адно: наталіцца. Гэта была мажная, плячыстая, як грузчык, самка, якой не было дзе дзяваць сваю сілу, якую перадаў ёй у спадчыну спрадвечны моцны сялянскі род. Жорж з прыкрасцю ўспомніў, як яна заўсёды ненасытна стагнала, расслаблена

апаўшы целам. Дзіўна было, што напачатку гэта, іменна гэта ў ёй падабалася яму. Сышліся яны лёгка. Ён тады працаваў экспедытарам, вазіў з базы прадукты. І ў той маленькі магазінчык пры шашы, дзе яна працавала. Прыняўшы прадукты, а то і да таго, яна ўлівала яму чарку для бадзёрасці і потым, зачыніўшы магазін для прыёму тавараў, ненасытна стагнала пад ім на мяхах мукі. Ён па дурасці і маладосці прыняў гэта за любоў і нават ганарыўся сабой, сваімі мужчынскімі здольнасцямі. Аж пакуль спрасоння не пачуў гэты цюленевы стогн, пражыўшы з ёю гадоў шэсць, у сваёй хаце. З нейкай нагоды, а хутчэй без нагоды, звечара яны добра выпілі. І ён зваліўся ў сон, як і чаму, не помніў. Заставаўся ў хаце, — зрэшты, гэта ён і прынёс выпіўку, — Адзінец, новы экспедытар. Жоржык на той час працаваў ужо на аўтабазе. Ён выразна чуў, як яна стагнала. Хацеў устаць, праверыць, ці пайшоў Адзінец, але падняць галавы не мог, не мог уцяміць, дзе ён і што з ім.

Раніцой спрабаваў разабрацца з жонкаю, але дзе там, збэсціла яго, зрабіла дурнем, алкаголікам, якому ўжо здані здаюцца. Можа, і здані, але ён пасля таго не раз прыкмячаў то позірк, то салёны, з намёкам на жарт прыгавор: нешта такі было між імі. І ўсё зрабілася нямілa, прэсна. Прынудзілаўка, а не жыццё. І жыць было нудна, і выблытацца не мог. Не было характару.

...На світанку, толькі па гадзінніку можна было пра тое меркаваць, бо нізка вісела дажджавое, набрынялае неба, яны зладзеевата прайшлі вуліцу. Дрозд ажно сцяўся, — пракраліся ў веснічкі, на падворак. Толькі тут, у гушчэчы старых дрэў, крыху адчулі сябе ў бяспецы. Дрозд адмыкнуў касабокія дзверы, сунуўшы нечым накшталт нажа ў шчыліну пад клямку. Папярэдзіў Жоржыка не шумець. І яны прайшлі праз дашчаны, што свіціўся, як рэшата, калідорчык у хату. Відаць, гэта была кухня: выгараджаны дошкамі і аклееныя шпалерамі закутак з печчу і акном у агарод. Жоржыка білі дрыжыкі, яго не сагрэла нават доўгая хада, холадна было неяк знутры, і ён з любасцю і зайздрасцю пазіраў на печ. Але, як аказалася, яна была халодная. Ад яе, здалося, нават ішла сырасць. І яму неяк адразу стала няўтульна ў гэтым Драздовым гняздзе. Тым больш што назольна, — бывае, як услухаешся ў чыканне насценных ходзікаў і не можаш адвязацца ад іх, — назольна размерана булькалі кроплі вады. Жоржык убачыў каля печы балею

з вадою — працякаў, мусіць, над тым месцам дах, і кроплі дажджу раз-пораз зрываліся з намоклай пляміны столі і звонка пляскаліся з вышыні.

Дрозд узяўся дзяліць рыбу, раскідаць яе на нейкай дзяружцы на дзве кучкі: табе — мне. Але Жоржык непрыязна спыніў яго.

— Давай будзі бабу, няхай насмажыць, — нецярплі-ва і дрыготка сказаў. Яго калаціла.

Дрозд адхінуў цяжкую штору, якой быў завешаны дзвярны праём. За дашчанаю сцяной пачуўся хрыплівы шэпт і валтузня, потым шэпт узмацніўся — гэта быў шапатлівы крык, лаянка. Дрозд выскачыў адтуль, як корак з бутэлькі шампанскага. Паразумела развёў кароткімі з вялізнымі пяцярнямі рукамі, хаваючы па-сабачы позірк. Падобна было, што Феня, так звалі Драздзіху, паслала яго далей з яго рыбай, ёй не хацелася ўставаць у такую рань. І Дрозд ужо загрымеў пасудзінай, збіраючыся чысціць рыбу сам.

— Скажы ёй, што я пакідаю ўсю... — гучна сказаў Жоржык, каб яна пачула. — Дадому не панясу!

Дрозд паклаў ужо на стол карычневую драўляную нушачку, а на яе здаравушчага — луска на спіне медзяная — карпа. Сонная рыбіна нібы ачуняла, выгнулася, як спрабуючы ўстаць, захаўкала ротам, ловячы паветра. І Жоржык зноў сцепануўся:

— Бяры меншыя рыбіны. Гэта будзе цвёрдая, старая.

На кухню, заспаная, у халаце, зашпіленым не данізу, выйшла Феня. Пастаяла, падзівілася — колькі рыбы прыпёрлі (яна так і сказала) — і пачала яе ладаваць. З сенечак скора пачуўся тонкі звон алею, што закіпваў на патэльні, а потым трэск і пастрэльванне: смажылася рыба.

Мужчыны сядзелі за сталом. Раздобрыўшыся, Феня паставіла на стол каля Жоржыка — для сугрэву — паўпляшкі самагонкі, строга пры гэтым зірнуўшы на Дразда: маўляў, ты патрываеш, але Дрозд трываць не хацеў і запатрабаваў тую, што яна адліла. Стаў з мацюкамі шукаць яе і знайшоў-такі. Выпілі. Супакоіліся. У Жоржыка крыху пацяплела нутро. Ён пазіраў праз кухоннае акно ў сад на ацяжэлыя, мокрыя яблыні, картаплянік у буйных кроплях. І там, за садам, здалося яму, праяснілася неба, нібы адчынілася вечка куфра. І ляжала быццам у тым куфры нешта бэзавае, светлае. Увача-

відкі яно пачынала жаўцець. Гэтае жоўтае святло прашылася ў сад, пафарбавала яблыкі.

Дзень заспяшаўся. А Жоржыку спяшацца не было куды. І замест радасці, што дзень пачынаецца, з'явілася нудлівая туга. А можа, гэта ад прыцемнаватай хаты, дзе толькі нядаўна перастала вызваньваць, капаючы ў балею, вада. Хата была нібы пячора — зацягнула яе зямля.

— Чаму не будуешся? — папытаў нібы між іншым Жоржык. Хоць і зыркала трохі на Дразда жонка, але ён заўважыў, што жывуць яны хораша, наколькі яму падказвала яго разуменне. І дзеці ёсць, то чаму не будавацца?

Дрозд нібы і не чуў яго, дзелавіта, акуратна абіраў мяса з касцей, так чыста і ўмела, што на талерцы застаўся адно шкілет рыбіны, ні адно раберца не выламана, хоць анатомію вывучай.

— Чаму, пытаю, не хочаш будавацца? — паўтарыў Жоржык.

— Нашто? — непаразумела перасмыкнуў тварам Дрозд. І Жоржык не зразумеў гэта «нашто» ці то было «навошта», ці «на якія шышы?». Каб на якія шышы, то так бы і сказаў. Бо нядаўна, як ішлі да вартаўніка на вадасховішча, казаў мройліва: «Бляха, куплю машыну — усё вакруг калхознае, усё вакруг маё».

Жоржык засмяяўся тады з яго жарту. А цяпер пратыкаў Дразда позіркам, чакаў адказу.

— Феня на вочарадзі, палучым дзяржаўную. Пачні гэту рамантаваць — з вочарадзі скінуць. А так — яна ў аварыйным стане. Акт складзены. Усё...

Дрозд расказваў і з нейкім гонарам аглядаў запушчаныя, закопчаныя, у зацёках куткі.

— Паразіт! — не вытрымаў Жоржык, усяго яго закалаціла, бы толькі што вылез з халоднае вады. — Чакаеш, пакуль мой бацька грошай дасць! Можа, на сваіх дзвярах тую шыльду павесіш, не пасаромеешся... — Жоржык крыў яго мацюкамі, як апошнюю сволач. У хату ўбегла Феня, падлагоджваючыся, мітусілася вакол Жоржыка, зыркала злосна на мужа, і твар яе мяняўся ад усмешкі да грымасы, так ні адзін клоун не змог бы.

— Ціха, ціха... Дзяцей пабудзіце.

Толькі гэта трохі ацішыла Жоржыка. Ён грабянуў ад сябе Дразда і выйшаў на вуліцу. Дыхнуў вольна, на поўныя грудзі, але іх працяла боль, вострая, як стрэл.

Здалося, нехта па ім шарахнуў проста ў сэрца. Азірнуўся. Дрозд стаяў ля абвіслых, што трымаліся на адной завесе, весніц. І чый гэта голас, — ці не яго мацеры? — сказаў яшчэ тады, калі яны хадзілі ў школу і ён кватараваў у іх, але цяпер прагучаў у памяці так гулка, як у вечаровым паветры: «Чаму Слабада? Сюды пекалі, яшчэ за тым часам, пасялялі тых, хто не пудчыняўса ўласцям». З гэтым нават яе «пудчыняўса».

— Канакрадава душа... — сказаў з агідай і жалем. І пайшоў — рукі ў кішэні. Па дарозе думаў, што сам бы пабудаваў дом, каб не з ёю. Ён даўно не называў жонку па імені, а толькі — яна ці баба. Тады, як бы апраўдваючы сябрука, нібы спрабуючы яго зразумець, як бы здагадаўся, можа, і ён не хоча, нашто з ёю, Феняю.

## 16

Ганна Цітаўна перачытвала даклад, з якім павінна была выступіць на вучоным савеце. Яна пісала яго ноччу. Перад вачыма — толькі падымі галаву, зірні ў акно, — пасвечваючы мігатліва агеньчыкамі, як Млечны Шлях, ляжаў горад.

Цяпер яна правярала сябе прыдзірліва і цвяроза, як быццам пісала не сама, бо адна справа ісці па Млечным Шляху, а другая — па калдобістай, храпістамарознай, шэрай зямлі. Яна ішла па зорках, пакуль з цёмнай бездані памяці нечакана не выплыў, як бляклы падталы месяц, твар дзядзькі Васіля, не цяперашняга, абыякавага, а яшчэ таго, які любіў пагаварыць пра палітыку.

«А-а-й, што ты мне гаворыш, і слухаць не хачу. Planаванне, фінансаванне... Дзяржава перакладае грошы з кішэні ў кішэню. І толькі». Яна адчула, як там, далёка на тым шляху, які быў перад вачыма, ледзяны вецер абцякаў зоркі, задуваў іх. Згасла адна, другая, трэцяя... Заструменіў холад. Над трамвайнымі рэйкамі плюскала жоўтае вока семафора, бы драмала.

Ганніна галава гарэла як у агні. Сухі, гарачы, ён як бы заняўся знутры. Гэты агонь будзе выпальваць яе да раніцы ўсю, з галавы да ног, пакутліва і бязлітасна. І дарэмны будуць яе намаганні заснуць.

Яна і не заснула. А раніцою, як ні дзіўна, галава была лёгкая, адно шчокі дагаралі, як цяпельцы пад шэ-

рым попелам. Твар быў бледны, стомлены. І толькі адна думка... Адна думка... Не, так немагчыма жыць. Яна пойдзе і ўсё яму раскажа: і няхай што будзе. І некалі рэўнасная прыхільніца і абаронца маралі, пачуцця доўгу, калі хочаце, патаемна думала, што нічога ганебнага ў тым, што адзін чалавек прагне блізкасці з другім, няма, што гэта натуральна. На гэтым трымаецца свет, усё жывое. Яна жахнулася сваіх думак. «Я звар'яцела, — падумалася. — Чалавек не можа доўга ўтойваць думак сваіх. Трэба некаму расказаць. Стане лягчэй. Маці? Не. Яна жыла ўсё жыццё адна. Кашчунства гаварыць ёй пра такое. А можа, яму? Яму... Не, я проста звар'яцела. Мяне трэба ўдарыць, нахвастаць па шчоках. Добра б, каб ён... каб ён... Я б ачнулася». Яна ведала, што будзе потым: глухая, чорная, густая туга заляжа ў грудзях, нямілым стане белы свет. Але што, што рабіць? Іначай нельга. Работа... Толькі работа.

Яна спрабавала засяродзіцца, акунуцца ў халодную мутнаватую ваду будзённай рэальнасці, засяродзіцца на тым, як найлепш перакласці грошы з розных кішэняў у адну, стварыць цэнтралізаваныя фонды аграпрамысловага аб'яднання. «Цэнтралізаваны фонд развіцця вытворчасці ствараецца за кошт акумуляцыі да 15 працэнтаў асабістых сродкаў, прызначаных для развіцця калгасаў, саўгасаў і іншых прадпрыемстваў і арганізацый, якія ўваходзяць у раённае аграпрамысловае аб'яднанне».

Не, гэтае «да» ёй не падабалася. Не было ў ім цвёрдасці і раўнавагі. Бачыла суровы твар з замкнутай у цвёрдыя дужкі лініяй рота, глыбокія вочы Азёрнага. «Згодзен толькі на роўных. Нечага зноў пладзіць утрыманцаў! Знаю гэтых бедных. Яны ўсё жыццё будуць жабракамі. Да пятнаццаці... Значыць, з мяне пятнаццаць, а з яго — пяць...»

У сектары было ціха. Адчувалася адсутнасць Гэлечкі: не ляпалі дзверы, не цокалі абцасы, маўчала зачахлёная машынка. Гэта было амаль самае горшае. Друкаваць цяпер трэба было ў машынным бюро, а там — чарга. Гэлечка вясною паступіла на завочнае аддзяленне наргаса, так скарочана называлі інстытут народнай гаспадаркі. А пакуль, як напісана ў заяве, перайшла працаваць па спецыяльнасці — прадаўшчыцай ва універмаг.

Двойчы званіў тэлефон. Гаварыў Рыгор Рыгоравіч.

Размова была, відаць, цяжкая. Ён слухаў, хутчэй прымушаў сябе слухаць. Твар стомлены, скамечаны. Слухаючы, ён пакутаваў: то сцінаўся, як ад кашлю, які душыў у грудзях, то выцягваўся, нібы нешта хацеў запярэчыць, але ўпарта сцяты рот, пасінелыя мяккія губы толькі варушыліся, мыляліся. Часам яны выціскалі пакутлівае: «Я падумаю, я падумаю...» Рыгор Рыгоравіч цёр лоб, супрацiўляўся ўсё слабей і слабей, нібы былы выпівака, які «завязаў з гэтай справай», а сябрукі яго зманьвалі. Так, пэўна, усе і думалі. Рыгор Рыгоравіч апошнім часам кінуў «чарніліць», паспакайнеў, стаў таўсцець, твар яго раніцой быў азызлы: мусіць, нешта пасадзіў усярэдзіне. Ды і хто яму мог званіць: жонка з-за мяжы, відавочна, яшчэ не вярнулася, а калі і вярнулася — жылі ж яны паасобна. Дзеці — сыны: адзін недзе ў плаванні, а другі вучыцца ў інстытуце, жыве ў другім горадзе. Было падобна, што званкі — доўгія, настойліва-патрабавальныя — былі міжгароднія. Яны даймалі яго ўжо не першы дзень. Пагаварыўшы, Рыгор Рыгоравіч маўчаў, толькі выходзіў пакурыць. Вось і цяпер зачыніліся за ім дзверы. І вастраносенькая Маргарыта, — яна ніколі і галавы не падымала ад разлікаў або кніжкі, а ўсё чуе і ведае, — нібы няўзнак, як затраўку для гаворкі кінула, як сама з сабою гаварыла: «Во даймае сын. Цягнуць духі з яго гэтыя дзеці. Блага быць добрым...» Але ўсе прамаўчалі. Пра дабрату цяпер не вядуць гаворкі. Крытэрыі яе, як гаворыцца, размытыя.

Паспрабуй зразумець, дзе дабро, дзе зло. Чалавек нібы табе робіць дабро, а ты пакутуеш. Нездарма ёсць апраўданне: хацеў як лепш... Ды пакінем яго ў спакоі. Людзі любяць рабіць дабро, толькі не за свой кошт, а цяпер і на тым спахапіліся.

Рыгор Рыгоравіч сядзеў за сталом, паклаўшы на яго свае вялікія шызыя рукі селяніна, сталяра, каваля, але даўно абвялыя без працы, на якую, мусіць, былі запраграмаваны. А цяпер нейкая нягода выбіла з іх і тонкую трысцінку самапіскі. Ён не-не ды і пазіраў на Ганну Цітаўну. Вочы, рахманыя і вінаватыя, злёгку паморгвалі, і здавалася, мужчыну карцела пагаварыць, пагаварыць менавіта з жанчынаю, можа, нават з ёю, Ганнаю, бо ад мужчын, што курылі і рагаталі за дзвярыма, ён хутка вярнуўся, відавочна, не дакурыўшы і цыгарэты.

Але ў яе было сваё: як быць з ведамаснай падначале-

насцю. Пакуль што аб'яднанне, нібы добраахвотнае, толькі намечана, юрыдычна ж прадпрыемствы падначалены сваім ведамствам. І інтарэсы іх, бывае, не супадаюць з інтарэсамі саўгасаў і калгасаў.

— Ну як у цябе? — падсеўшы да Ганны, папытаў Рыгор Рыгоравіч, а вочы, тлумна заклапочаныя, гаварылі пра сваё, таму яна не стала расказваць, што і як у яе. Толькі кіўнула галавою, маўляў, усё добра: а ў цябе? І вочы яго, што разбедаваліся было, пацяплелі, запраменілі надзеяй і шчырасцю.

— У мяне... Бачыш, жыцця яны мне не даюць — звоняць, пішуць, просяць.

— Ты павінен радавацца. Не забываюць, — падбадзёрыла яго яна.

— І Ангеліна пісьмо прыслала, — неяк мройліва прамовіў ён, нібы яшчэ чакаў таго пісьма. — Усё абклеенае маркамі. Ганна, — ён уздыхнуў, нібы пачынаў нанова гаворку, — памажы мне.

Яна трошкі здзівілася: чым, як? Ён прачытаў гэта ў яе вачах і пастараўся вытлумачыць, але крышку і ўхільна, каб не гэтак зразумела было іншым, хто як бы і не прыслухоўваўся, не звяртаў увагі на іх размову, але...

— Разумееш, старшы мой набедакурыў, як быў тут. Цяпер ён — у моры, а яна — у раддоме. Дзяўчына,— сірата. Забіраць няма каму. А я ў гэтым прафан, як, дарэчы, ва ўсім астатнім, — не прамінуў, каб не папікнуць, не паўшчуваць сябе. Ён быў з тых людзей, якія любяць нагаворваць на сябе, жартаваць і высмейваць сябе. Можа, ад гэтага і ўсе яго беды. Ён, расказваючы пра сябе, і падхлушваў часам не на карысць сабе, і радаваўся, калі гэтаму верылі. Ну, якая жонка стане паважаць мужа, калі ён кожны дзень ёй будзе гаварыць, што ён дурань, або выстаўляў сябе ў смешным выглядзе. Добрая яго душа, здавалася, баялася, лічыла непрыстойным узвысіцца над іншымі, заступіць дарогу, а нібы хацела падбадзёрыць, прапусціць наперад другога, натхніць. Гэта была непазбыўная, што ўрасла, як дрэва ў зямлю, рыса вясковага настаўніка. Яму б і быць ім як некалі. Відаць, і сам шкадаваў тыя часы, бо ўспамінаў з непадробным сумам, шчыра, называючы сябе дурнем, што папёрся за сваёй Ангелінай. А як лёгка было расчуліць яго нават яўным падманам.

Ганна пазваніла Мікалаю. Ехаць нікуды ён не збіраўся, меўся затрымацца на рабоце. Яна ўзяла машыну.

Толькі наважыліся ехаць з Рыгорам Рыгоравічам у раддом, аказалася — з пустымі рукамі. Новаспечаны дзед не падумаў, у што загарнуць малое. Дарэчы, як потым выявілася, не ведаў, хто ў яго: унук ці ўнучка. Горш таго, ён не ведаў прозвішча сваёй нявесткі... Гэта высветлілася пазней.

Спачатку ж яны заехалі ў ГУМ. У аддзеле дзіцячага адзення ў іх запатрабавалі даведку, маўляў, наша прадукцыя карыстаецца вялікім попытам, яе разбіраюць наезджыя, таму, каб забяспечыць нованароджаных жыхароў горада, патрэбна даведка аб іх нараджэнні. Гэтага яны, даўно не меўшыя справы са з'яўленнем на свет новага чалавека, прадугледзець не маглі. Трэба было адразу пачынаць з блату. Добра, што Ганна ўспомніла пра Гэлечку: яна цяпер працавала недзе тут. Сталі абыходзіць аддзелы, пытаць. І як абрадаваліся, знайшоўшы!

Гэлечка ажно насцярожылася. Тады ж, калі яна сказала ім, што ідзе за прылавак, яны асуджалі яе. Не, ніхто яўна не выказваўся, але яна бачыла на іх тварах як не пагарду. І ён, «гэты ахламон», — яна інакш і не называла ў думках Рыгора Рыгоравіча, — падсеў і стаў яе ўгаворваць, маўляў, не так проста ўладкавацца цяпер у навукова-даследчы інстытут, а ў яе — карты ў руках: паступай у той жа наргас, а потым, скончыўшы, бяры тэму і абараняйся. Наслухалася яна гэтых «абарон», начыталася дысертацый, друкуючы, у якіх не бачыла ніякіх адкрыццяў, здзіўлялася, што там былі агульнавядомыя ісціны. І ўсё болей і болей упэўнівалася, што абараняюцца яны адзін ад аднаго. Цягнуць адзін аднаго і топяць. Усё з-за той надбаўкі за «корачкі». З усіх яна найбольш паважала Ганну. Наогул Гэлечка любіла «разумных баб», якія могуць любому мужыку даць фору, але лічыла яе прасцячкай. На сходзе аддзела выступіць, выкажацца. А другія, тыя, што маўчаць, глядзіш, праз колькі дзён ужо артыкулы панапісвалі ў часопісы, газеты: Гэлечка, перадрукуй. Ды яшчэ і прыспешваюць. А там тое, пра што яна гаварыла, толькі абсмактана, абслінена, як драбок цукру дзіцем. Хто ім цяпер друкуе? У яе мільганула думка: «Відаць, не знайшлі на сто рэ дурня, які дзень будзе ляпаць на машынцы ды без пропуска нікуды не выскачыць, — угаворваць прыйшлі». Гэта яе крышку ўзрадавала. Яна пастаралася надаць твару больш годнасці, нават абыякавасці, але горыч, хутчэй прыкрасць, што падступіла да сэрца, не ападала.

Не, не яны прынеслі яе з сабою. У Гэлечкі было сваё. Толькі што яе «разбіралі» на камсамольскім бюро. Але гэтая нітка прыцягнулася за ёю яшчэ з інстытута. Ева з аддзела размяшчэння прадпрыемстваў харчовай і мясамалочнай прамысловасці, тая, што любіла, пакурваючы, — нага за нагу, — паразважаць пра «душу насельніцтва», «гэтая дурніца», іначай цяпер яна не магла яе называць, усё абяцала пазнаёміць яе са сваім братам. І вось прыйшло ад яго пісьмо. Пісьмо харошае, нічога не скажаш, нават разумнае. Але адкуль прыйшло? Гэта не толькі засмуціла Гэлечку, але нават абразіла. Яна будзе важдацца з нейкім крымінальнікам. Хоць хлопец і пісаў, што трапіў «з-за дружкоў», але... І Гэлечка пад гарачую руку, без развагі напісала, што думала. Напісала, што не хоча знацца з нейкім зэкам, што ў яе не гэтакіх, як ён, а хіповых не злічыш, што за пару англійскіх чаравікаў можа любога заарканіць, варта захацець. Хлопец, відаць, таксама з гонарам аказаўся. Напісаў у райком камсамола, што ён чэсны чалавек, які ўступіўся за таварыша ў бойцы, але, на жаль, меў пры сабе нож, адбывае пакаранне, а вось такія спекулянткі і распусніцы ходзяць на свабодзе, вось іх трэба саджаць, а не яго...

У Гэлечкі яшчэ тургаліся вейкі ад нядаўніх слёз, але яна паспела іх нафарбаваць і трымалася цяпер быццам нічога не адбылося. Праходжвалася каля стэлажоў з чорнымі — абрыдла на іх з дня ў дзень пазіраць, хоць вочы завяжы — «лучаўскімі» паўбацінкамі, не глядзела і ў той бок, не сачыла за пакупнікамі: гэтыя кандалы дарэмна давай — ніхто не возьме. Яна злавалася на Еву, на сябе, на гэтую будзённасць, абутковую чарнату, якую ніхто не хацеў браць. Было прыкра. Таму твары Ганны Цітаўны і Рыгора Рыгоравіча здаліся ёй нават роднымі. Яна сабралася ўся, страпянулася, пайшла насустрач. Адно здзівіла, што яны разам.

Ганна быстрым жаночым позіркам акінула паліцы з абуткам, нічога, відаць, не прыкмеціла. І Гэлечка хацела выняць з шуфляды пару модных басаножак, што ўзяла ў жаночай секцыі, ды раздумала, стрымалася, парашыла, няхай папросяць, што самой набівацца?

Просьба іх яе развесяліла. І яна дамовілася ў аддзеле дзіцячага адзення на камплект для нованароджанага толькі таму, што пашкадавала, як думалася самой, тую дзеўчыну, што, мусіць, патрапіла ў бяду па дурасці. І

тая размова на камсамольскім бюро стала забывацца, яна зноў адчула сябе патрэбным, незалежным і нечага вартым чалавекам.

Пакуль Рыгор Рыгоравіч разлічваўся, яна выбрала мінуту, сказала да Ганны Цітаўны:

— Хочаце, скажу, што я думаю пра вас?

Ганна ажно ўскінула бровы: «Ну так, ад Гэлечкі можна чаго заўгодна чакаць. Яна нікольні не перамянілася». Кіўнула, маўляў, давай.

— Вы разумная баба...

Непрыемна разанула гэтае «баба», але Ганна Цітаўна стрывала.

— Вы разумная баба. Мужыкі гэтага не церпяць. І ён (яна здагадалася, гэта пра Антона), ён, можа, крышачку любіць вас, але... — Гэлечка памарудзіла, відаць, выбірала слова, — а ў асноўным вядзе нейкую гульню, якую, я не магла зразумець.

Ганна адчувала, што мяняецца з твару, але язык як прысох, — слова не сказаць. Ды і што ёй адкажаш?

— І не адпускае, і сам сцеражэцца, — працягвала Гэлечка, пазіраючы на Ганну Цітаўну. Нібы гаварыла не пра яе, не пра сябе, а наогул пра мужчын і жанчын. — Ім не патрэбна наша любоў, тым больш што ў разумных жанчын гэта вельмі сур'ёзна. Ім трэба, каб мы былі слабыя, кволыя. А любоў робіць жанчыну слабай. Яна тады не супернік у рабоце. Вось яны і заводзяць гульню.

Што яна гаварыла, гэтая Гэлечка? Што яна разумела? І Ганна Цітаўна слухала яе з заледзянелаю душою, мусіць, штучна ўсміхалася сціснутымі губамі, выказваючы калі не пагарду, то хутчэй за ўсё годнасць і душэўную перавагу. Заўважыўшы, што на іх звяртаюць увагу, занепакоілася і, як паратунак, пашукала вачыма Рыгора Рыгоравіча.

І Гэлечка змоўкла. Але ненадоўга.

— Апошняе вам скажу. Што таіць. Цяпер можна расказаць. Памятаеце, аднойчы мы збіраліся ехаць купацца...

Ганна Цітаўна наструнілася. Чакала яшчэ нейкага замаху на сваю годнасць.

— Ды не даехалі, — ніякавата ўсміхнулася Гэлечка. — Ён, каб ведалі, яшчэ і баязлівец. Праз кварталы два спыніў машыну. Усё, кажа, вылазь, прыехалі. Я ж яму — пра вас. Маўляў, мусіць, хацеў з ёю паехаць. Усердзіўся, жаўлакі захадзілі: «Яе не касайся. Яна —

зусім другое». Гэта ён пра вас. А я зненавідзела яго, — злосна звузіўшы вочы, сказала Гэлечка. — Можа, з-за гэтага і звольнілася.

## 17

Яна б не паехала ў Цішу, каб не гэты званок. Званіла суседская дзяўчынка, гэтакі падгалісты падлетак, што ўжо марыць пра вырай. Сказала, што даўно хацела пазваніць па міжгародняму, але не было каму. А тут — ішла ў кіно, а цётка Антаніна і папрасіла пазваніць. Анюта разумела яе: гэта — першы пробны сігнал у невядомы свет, першы невідочны прыступак лесвіцы, які спрабуеш навобмацак. І галасок рассыпіста-радасны, як званочак, але міжволі закралася трывога: званіла не сама маці. Пераказвала, калі зможа, каб прыехала...

Мікалай быў у камандзіроўцы, сын праз колькі дзён павінен быў вярнуцца з піянерскага лагера, вось тады з ім яна і планавала паехаць, пакінуць яго яшчэ на тыдзень у бабулі перад заняткамі ў школе. Але гэты званок яе занепакоіў.

...Паставіла машыну каля двара, сама — хутчэй у хату. Маці яна застала ў ложку, хоць тая, відаць, убачыўшы яе ў акно, усхапілася, як і не ляжала, скоранька тупала ў панчохах ёй насустрач. Але Анюта ўлавіла і гэты загусцелы сум у вачах, і вымучаную ўсмешку, што толькі крывіла моцна сціснутыя губы, не могучы іх разняць.

— Ты хворая, мама? — занепакоілася яна, беручы ў свае яе вялую, нямоглую руку. — Кладзіся, не мітусіся. Я ўсё сама.

Маці не слухала. Падавала на стол няхітрую ежу: слоік з кіслым малаком, буханку зачарсцвелага хлеба з пабялелым, што ўжо зацвітаў, бокам, кавалак каўбасы на талерцы, пажаўцелае масла.

Здаецца, яна не радавалася прыезду дачкі, ні пра што не пыталася — так, слова-два. Па тым, што яна паставіла на стол, па твары, што асунуўся, пабляжэў, Анюта зразумела: маці не есць нічога, хварэе. Нешта здарылася. Анюта не дапытвала, ведала: у мітусні не пагаворадь. Трэба ці заманіць на лавачку пад хату, — але нешта захаладала, — ці выбраць зручны момант перад сном, калі яны, як бывала, патушыўшы святло, яшчэ доўга перамаўляліся.

— Анюта, я вот усё думаю...

Анюта ўзрадавалася, што маці загаварыла. Але фраза павісла ў цішыні, як абарваная святочная гірлянда, якую не кратаў нават вецер.

— Я вот думаю ўсё пра жыццё... Колькі яго дадзена чалавеку, а і тое ператрэцца, перамнецца абы-як. Глядзіш і... Адна надзея, каб у цябе было ўсё добра.

— Мама, ну што ў мяне благога можа быць? — Анюта заспакоіла мацеру, а ў самой было прадчуванне, быццам штосьці павінна здарыцца, яно не пакідала ні на хвіліну. Затоіцца, бывае, але не адыходзіць. Змагалася, цвёрда намерыўшыся як мага хутчэй нешта вырашыць для сябе, знайсці раўнавагу.

— Гэта, бывае, ад самога і не залежыць, як абставіны складуцца...

— Чалавек павінен быць вышэй за абставіны, мацней за іх.

— Не, мая дачушка, я таксама раней так думала. І ніяк дараваць не магла. А цяпер, увечары жыцця, падумоўваць стала, што ўсякае можа здарыцца, усяк жыццё можа павярнуцца... І самае, можа, горкае вось што... Што не ад бога, не ад прыроды ці нейкай там нячыстай сілы. Тыя абставіны людзі самі ствараюць. Адны ствараюць, а другія трапляюць у іх, як у пастку. Раней гаварылі: такая судзьбіна, так на раду напісана... Не, нічога не напісана... І хто-та волен каму што напісаць... А вот жа... Усё на зямлі — ад любові і нелюбові нашай. Я ніколі табе не гаварыла...

У цішыні, у прыцемку хаты раставалі словы, пакідаючы толькі ціхі, незразумелы, то трывожны, то супакойлівы шэпт. А можа, гэта за акном перашэптваліся таполі?

— Вазьмі ключ і адчыні куфар...

Голас маці быў слабы, здавалася, яго мог патушыць гэты пошум таполяў, што рваліся ў неба. І перш чым дастаць ключ і адчыніць куфар, Анюта мітнулася на кухню і наліла ў кубак малака: хоць гэтак хацела падтрымаць яе слабыя сілы. І маці, нібы забыўшыся, узяла кубак. Рука яе дрыжала ці то ад хвалявання, ці то ад слабасці. Мабыць, было і тое, і другое. Яна паднесла кубак да губ, але піла, як малое дзіця, неахвотна і няўмела.

— Трэба, трэба выпіць, — гаварыла Анюта таксама, як малой. — Ты зусім занядбала сябе, не глядзіш...

Анюту як быццам не цікавіла, што маці хоча паказаць, што там у куфры.

— Там на саменькім дне, пад маімі «вясельнымі» уборамі... — «вясельнымі» яна сказала з іроніяй. І Анюта зірнула на маці з дакорам. Але яна не прыняла яго. Адно сумна растлумачыла: — Гэта я сабралася на той свет... Усё прыгатавала, каб табе клопату не было.

Сапраўды, у куфры, ляжалі тарановачкі, восем штук, па мясцовым пахавальным звычаі столькі і трэба было, скрутак паркалю, доўгая сіняя ў дробныя кветачкі сукенка, новыя лодачкі на высокім абцасе, дарагія, прыгожыя.

Анюта ўсё гэта вымала і разглядвала з нейкім холадам у грудзях. Як быццам напраўду маці памерла і трэба ў гэта апранаць. Задумліва затрымала ў руцэ лодачкі.

— Маладая я вельмі любіла... Перад вайною мода была... Але так і не знасіла. А пасля як убачу на кім, вачэй адвесці не магу. Лодачкі... Гэта ўсё надзенеш мне...

Анюта ў душы абурылася на маці. Не, гэта было не абурэнне, то быў пратэст. Пратэст супраць яе настрою, супраць таго, што закладзена ў чалавечай прыродзе...

— Мама, ну што ты гаворыш? — сказала з дакорам.

— Не, дачушка... Вот і Адэля мне прыснілася. Толькі не помню... Нічога не помню...

Здалося, яна была далёка ў сваіх снах. Думала пра Адэлю, намагаючыся ўспомніць, што ж ёй сказала Адэля, і не магла. І, відавочна, гэта было для яе важна, куды важней, чым тая размова, якую яна вяла з дачкою.

— Мама, табе проста трэба пабыць на людзях. Вось уставай, садзіся ў машыну, правязу цябе...

Сказала і спужалася сваёй прапановы. Раптам будзе як у мінулы раз. Тады маці сама папрасіла звазіць яе да Цэцэрукова балота. Чаму туды? Анюта не пытала, ведала, у вайну там хаваліся людзі ад карнікаў.

Яны спыніліся на нейкай аслізлай, ляснай дарозе. Гіблае месца. Можа, толькі нядаўна засланілася яно алешнікам, захавалася ад людскога вока. Тут нават паветра было іншае. Патыхнула сырасцю і задухай, нібы ўехалі яны ў скляпенне. І лес перамяніўся, са звонкага, гудлівага бору ператварыўся ў каржакаваты, крывы, бы

змучаны, пераламаны, бы па ім пахадзіла бура. Дарога адно пазначалася чарнатою даўніх каляін. Дзве глыбока выбітыя сцяжыны, хутчэй канаўкі, патаналі ў забраснявелай вадзе, а пасярэдзіне сакавіта-зялёнай асакою ўзялася высокая баразна. Чаго, якія — а, відаць, магутныя, — машыны некалі ішлі сюды ў гэта балота? Анюта дала задні ход: не хапала ссці. Зірнула на маці. Тая, як птушка з гнязда, уважліва і насцярожана азірала лес.

— Ты пачакай, пасядзі ў машыне, я — тут недалёка...

Маці заспяшалася, здалося, што ўсё нутро ў яе калоціцца. Вылезла з машыны і пашыбавала напрасткі праз куп'е, дзе-нідзе абыходзячы яго, абапіраючыся рукамі на сухастой, які крышыўся, падаў. Балота чаўкала сытай жывёлінай, патрэсквала гніллё пад ботамі. Анюта не пайшла, спынілася, як толькі чарпанула вады, нават не вады, а нейкай чорнай, як адстаялая кроў, жыжы ў туфлі, вярнулася да машыны. Сядзела, пазірала на балота, і чым больш пазірала, тым болей дзіўным яно ёй здавалася: карлікі-сасонкі, што прымасціліся на купінах, былі крывенькія і сухія. Дзе-нідзе на галлі тырчалаігліца, рудая, як балотная жыжа. Ёй падумалася, што дрэвы паміраюць тут дзецьмі. Нешта жахлівае было ў тым: дрэвы паміраюць дзецьмі. Падзівілася з маці — цікавейшай прагулкі яна сабе не знайшла? А яе доўга-такі не было ці, можа, Анюце сцяглося пазіраць на гэты панылы краявід. І яна, выбраўшы больш моцную сухастоіну, на ўсякі выпадак апіраючыся на яе, як на лату, пайшла, не зважаючы на тое, што прамоклі туфлі. Зняць іх яна баялася, здавалася, што пад нагамі кішаць вужы і гадзюкі, часам яна ўздрыгвала ад нечага слізкага агіднага дакранання, аж кідала ў халодны пот, пазірала сабе пад ногі, абыходзячы высокія, як валуны, купіны. На імгненне зірнула на купіну перад сабою і замерла: скруціўшыся вяроўкаю, металічна пабліскваючы, ляжалі вужы. Здавалася, яны заўважылі яе, закруціліся, зашыліся ў рудым, бы выцвілым імшочку з накінутым зялянцовым, як тонка выплеценыя карункі, журавінніку. Зірнула ў другі бок, і там, пакручаста выгінаючыся, шыліся яны ў купіны. Ногі нібы ўраслі ў хліпкую, вагкую балоціну, і тая пачаўквала, засмоктвала іх, а яна не магла зрушыцца з месца, адарваць позірк ад гэтых пакручастых вяроўчын, што акружалі, апаўзалі яе. Яны, здава-

лася, нават пагойдваліся на галлі, нібы назнарок, каб разагнацца і кінуцца на яе. Толькі потым разгледзелася, зразумела, што гэта пагойдваюцца старыя выцвілыя стужкі, навязаныя на галлё. Хто калі пакінуў тут гэтыя банты?

Яна ўся сцялася, насцярожылася і, нібы жаробка, сачыла за ўсім бакавым зрокам, а сама шукала, як паратунку, мацеру. Убачыла, што тая мітаецца ад купіны да купіны, як зачараваная, нешта шукае ці адзначае. А там, дзе яна прайшла, на крывых сасонках развіваліся, трапяталі блакітныя, ружовыя, белыя касnічкі, стужачкі. Нешта яшчэ болей страшнае, нават жудаснае было ў тым: смуродлівае, хліпкае балота з грудкамі купін нагадвала магілкі, і сама маці стаяла між іх разгубленая, нібы не магла знайсці тую, якую шукала. Ружовыя, блакітныя, белыя стужачкі трапяталі на кволых, крывенькіх, што памерлі дзецьмі, сасонках, а тут выкручвалася, пагойдваючы, абвіваючы хвастом ствалік, гэта агіднае стварэнне, а побач шылася, звівалася ў клубок другое, масляніста-шэрае, з белымі плямамі. І нават не гэта халадзіла душу, а нешта знутры незразумела роспачнае, нейкая неверагодная закінутасць і самота. Незразумелы страх, які як быццам жыў у ёй увесь час, прытоены, сцішаны, заварушыўся, стаў расці, шырыцца, агортаць холадам нутро. Анюціны нервы не вытрымалі. Страх, які халадзіў сэрца, падкаціў да горла, нібы хацеў замарозіць голас, каб яна не змагла нікога паклікаць на дапамогу. Яна закрычала роспачна і моцна:

— Ма-а-ма...

Балота не адазвалася рэхам. Яно толькі глуха застагнала, недзе ўдалечыні крумкнула, нібы камень упаў у прорву. Маці нібы ачнулася, хутка-хутка пайшла насустрач. Потым азірнулася, прыпынілася, нібы нешта ўспомніла ці хто яе паклікаў, нябачны і ціхі, але Анюцін голас быў рэальны, і яна, абуджаная ім, пайшла насустрач... Што было б тады з ёю, каб маці не ішла насустрач?

...Анюта сядзела перад куфрам з уборамі, усё гэта ёй здавалася да прыкрасці непатрэбным і нават недарэчным. І зноў ёй зрабілася жудасна, як на тым балоце. І раптам падумала, што дарэмна прапанавала ёй новую паездку. Абрадавалася, што нехта ішоў да іх: чуцен быў тупат ног на ганку, стук у дзверы. Яна не чакала, пакуль той нехта адчыніць, адчыніла сама.

Хударлявы, з завостранымі скуламі мужчына спыніўся ў дзвярах, разглядаючы яе ўважліва і зніякавела, нават забыўшыся павітацца, толькі пераклаў з рукі ў руку чырвоны шлем. Можна было здагадацца, што ён прыехаў на матацыкле, які стаіць недзе ля двара.

Антаніна прыадчыніла дзверы на кухню, убачыла госця. І ён кіўнуў, паздароўкаўся.

— Добры вечар, — адказала яна. — Праходзь, Жорж...

Прыязні ў яе твары не было, — Анюта бачыла, — адна насцярожанасць, нават разгубленасць. Усім сваім выглядам маці нібы хацела паказаць, што чакала яго, але прыйшоў ён не ў пару.

— Цётка, я па вас. Маці зусім ужо... Яна мучыцца... І вельмі прасіла...

Антаніна села на табурэт каля стала, нібы замлелі ногі. Нейкую хвіліну сядзела нерухома.

— Цётка, я завязу вас...

Антаніна нібы аглухла. Маўчала, упяўшы позірк у стальніцу, хоць і не бачыла перад сабою нічога.

«Усё, — думала яна. — Няма ў мяне дачкі», — але паднялася, прагнала кволасць і млосць, што падступіла да грудзей.

— Мы зараз, — сказала Жоржыку. — Прыедзем. А ты вяртайся сабе... — І да Анюты: — Збірайся. Я дарогу ўкажу...

...Адкуль яны ўзяліся, людзі? Ішлі і ішлі. На вуліцы быў глыбокі вечар. Неба, здавалася, хінулася да зямлі, такое стала нізкае, набрынялае сінявою. І праз вёску ехалі, толькі дзе-нідзе свяціліся познія вокны. Сцішана перагаворваючыся, людзі стаялі каля двара, заходзілі ў хату, спыняліся ля парога, сядзелі ў першай хаце. І каля стала, і на кушэтцы, і на зэдлі, што, мусіць, быў прыступкаю, каб узлезці на печ. Яны нібы нечага чакалі... Анюце нават непамысна стала: чалавек памірае, а яны сядзяць, чакаюць. Ажно холад пайшоў па спіне і незразумела, роспачна сціснулася сэрца, хоць яна яшчэ і не бачыла яе, тую, што памірае ў гэтай хаце, толькі вельмі цьмяна помніла, як яна заходзіла, бывала, ідучы з базару. Нешта ў іх было з маці, сяброўства не сяброўства, варожасць не варожасць. Але Анюце яшчэ маленькай было яе чамусьці шкада, здавалася, што маці ў нечым

несправядлівая: аднойчы нават выгнала з дому. Адчувала, што і маці як бы пабойваецца гэтай жанчыны, хоць і гаварыла, што радня... Аднойчы, згледзеўшы, што ідзе да двара, маці (яны вярталіся з лазні) схапіла Анютку за руку і схавалася з ёю ў чужы двор за прыгрэбіцу. Стаялі ціхенька, пакуль жанчына не вярнулася: іх хата была замкнёна. На ганку пад перавернутым і накладзеным каменем вядром яны знайшлі пакінуты ёю слоік з мёдам, пахучым, салодкім. Помніцца, Анюта тады яго ела ўпершыню. Жанчына выразам твару, паводзінамі была падобна на жабрачку, адно што яна не прасіла, а давала сама.

Марыя ляжала на белых прасцінах, відаць, пасцель была нядаўна пераслана. Анюта заўважыла на белым яе жоўты, вастраносы твар. Нічога ў ім не было ад той цёткі, за якою яна цікавала з-за прачыненых дзвярэй, з-за хаты, з-за шула варот, бо маці, калі тая прыходзіла, выпраўляла яе на двор. Аднойчы цётка Анюце здалася вельмі прыгожай, проста вачэй нельга было адвесці. Што ў ёй было прыгожае, Анюта не разумела, але вабіла пазіраць. Упершыню тады ўбачыла, што твар яе быў ясны, прасветлены, вочы незамутнёныя. Потым цётка перастала прыходзіць.

Нічога ў гэтай дробненькай, кволай жанчыне, што патанала ў падушцы, не было ад той, якую яна помніла. Нават падумалася: можа, гэта другая. Ступіўшы ў аціхлую, шапатлівую хату, дзе ледзяніць душу яшчэ нябачная, што недзе тоіцца, смерць, але прадчуванне міжволі сцінае сэрца, Анюта падумала найперш пра маці, каб ёй не стала дрэнна.

Яна не бачыла твараў, акрамя таго, што заміта̂ўся на падушцы. Хворая парывалася ўстаць, але толькі хітала галавою. З грудзей яе перарывіста, як узрыды, вырываліся няясныя, незразумелыя словы-гукі. «Госпадзі, — пачуўся шэпт за спінаю, — гэта ж ёй пацягло язык. Яна нічога не можа сказаць».

Анюта ўбачыла, як павяло ўбок мацеру. Падтрымала за плечы, абняла. Так і падышлі да ложка. Нечыя рукі падставілі табурэт, і Анюта пасадзіла маці, адчуваючы, як трапеча яна ад нутранога плачу, як усю яе калоціць.

— Мы прыйшлі, Марыя, — сказала Антаніна ціха, з намаганнем разлепваючы губы. І Анюта кіўнула галавою, ці то пацвердзіла яе словы, ці то паздароўкалася.

І ўбачыла тую страшную, невыказную пакуту на гэтым падабенстве твару. Гэта пакута цякла з вачэй, ірвалася ў горле бездапаможнымі гукамі, цягнула роспачныя, як аголеныя галінкі, рукі. І яна ўзяла ў свае гэтыя рукі, у якіх не было ўжо цяпла, але яны бы чапляліся за паветра, за прасціны. Так, відаць, намагаецца зачапіцца хоць за што чалавек, які падае ў прорву. І вось яны ўхапіліся за яе з непаразумелай, што крыкам крычала з грудзей, надзеяй на ўратаванне, Анюта ажно разгубілася і трымала іх у сваіх далонях, нібы хацела сагрэць, вярнуць ім сілу, а жанчыне — жыццё.

— Вазьмі, маё дзіцятка, яе на рукі, каб не мучылася. Яна раджалася на рукі... — падказаў шапатлівы старэчы голас. Анюта ўся да жаху знямела, але паслухмяна прасунула далоні пад спіну хворай, як бяруць на рукі дзіця. Лёгенька падняла. Адчула, якая бязважкая яна, бы спавітае немаўля, нават не дзяўчынка-падлетак. Паплыло, паплыло ўсё навокал, сцерліся, раставі твары, коса неяк павярнуўся кут хаты, і яна асунулася на калені, але асцярожна апусціла хворую на ложак і рук з-пад яе не выняла.

Зашапацела, зашаптала навокал, а можа, гэта зашумеў лес. Як адчайна, як роспачна шумелі дрэвы! Сярод гэтага шуму-гоману яна пачула той жа з хрыпатою старэчы голас:

— Вось і супакоілася яе душа... Хвала богу...

Нечыя рукі ўзялі Анюту за плечы: твару яна не бачыла, толькі рукі — моцныя, мужчынскія. І зноў зашумелі, зашумелі дрэвы, зашапталі, загайдалі яе да млосці.

Новым, што схаваны быў дасюль, бокам павярнулася перад Анютай-Ганнай жыццё. Яна пасталела за гэтыя дні, калі не сказаць пастарэла. Нібы прайшла жыццёвымі сцежкамі сваіх мацярок, увабрала ў сябе іх пакуты і зразумела, якое вялікае цярпенне трэба мець, каб жыць вось так, знешне ціха і спакойна, з несціханаю бураю ў душы, умеючы караць сябе і судзіць высокім судом сумлення, што ачышчае і высвечвае душу. І яе асабістае станавілася плыткім, як гэтая рэчка ў сярэдзіне лета, якую яна так лёгка пераходзіла некалі ўброд. І цяпер была сярэдзіна яе лета. І яна ўпершыню, можа, думала не толькі пра сябе, пра свае пачуцці і памкненні. Яна навучылася заглядваць наперад і ясна, як у люстэрку, убачыла, што будзе з тымі, кім яна так безагляд-

на магла яшчэ нядаўна ахвяраваць дзеля сябе, дзеля ўцехі свайго сэрца. Іх было многа: і Мікалай, і сын яе, жонка і дзеці Антона. Ці не будзе яна пакутаваць усё жыццё, караць сябе, калі надыдзе одум. Яшчэ яна думала: колькі таямніц назаўсёды, незваротна забірае з сабою смерць. І як чалавек не хоча несці іх з сабою, якія б яны ні былі. Можа, гэта спрадвечная цяга да праўды і справядлівасці дае яму апошнюю моц і трыванне, а можа, апошняе імкненне папярэдзіць наступніка, паказаць той камень на дарозе жыцця, дзе спатыкнуўся, бо галоўнае не тваё жыццё, а таго, хто застаецца, хто ідзе за табою. І, любячы аднаго, аддаючы яму душу, нельга ахвяраваць другімі. Як ураўнаважыць гэтыя шалі? І ці магчыма гэта наогул?

А можа, яно і павінна быць, нешта патаемнае, глыбока схаванае ў чалавеку, як залацінкі ў пяску. Без гэтага чалавек пусты. Няхай сабе пакута; але нешта ж павінна быць у душы? Нервовыя клеткі гінуць не толькі ад стрэсаў і страсцей, але нават у большай ступені ад недагрузкі. І як ні пакутліва, трэба цярпець, хаваць тое, што на душы, каб зберагчы яго.

«Пра гэта ніхто ніколі не даведаецца. Ніхто... Ніколі... Трэба перамагчы сябе, перасіліць. А мы ўсе гэтак баімся патраціць свае нервы, нібы ашчаджаем сябе для нейкага іншага жыцця. Жыццё адно. І пражыць яго трэба...»

Яна яшчэ перажывала ўчарашні дзень. Забывалася, нібы на руках яе яшчэ задыхалася, вяла, як скошаная травіна, маленькая, мізэрная, падобная на дзіця, жанчына. І падтрымліваў самую яе чарнявы мужчына з глыбокімі залысінамі, з сіня-чорнымі, як макавінкі, радзімкамі, а можа, вугальным пылам, што паўядаўся яму ў скуру. Яна заўважыла гэта, калі адкрыла вочы і твар яго быў блізка: мужчына падаваў ёй вады. Яна захлёбвалася, вада цякла за пазуху.

— Вы не пазналі мяне? — сказаў ён. — Я — Анатоль. Памятаеце: школьны сад, яблыкі тады не выспелі...

— Ага, — азвалася Анюта. Паглядзела пільна, нібы хацела абавязкова пазнаць. І, як ні дзіўна, бачыла яго ўпершыню. Нічога, ні драбніцы не было ў ім ад таго юнака, які рваў няспелыя яблыкі. Нават жахнулася. І з палёгкай падумала: «Добра, як добра, што ён мяне не шукаў».

— А потым маці твая мне сказала, што мы — радня... І вельмі блізкая... Работа, армія, зноў работа, сям'я... Так я і не прыязджаў.

«Добра, што ён мяне не шукаў».

...Шыферная рака рабрыста і чуць варухліва плыла за высокімі дрэвамі, нібы застывала, расплавіўшыся за дзень. І паветра, і трава, і гэты вечар былі сухія і бляклыя, нібы абвялыя, скораныя. Ціхая бездапаможнасць і пакора была ва ўсім. І Анюта-Ганна адчула, як, паганячы мядовы пах рэзеды і салодкасць настурак, поўз пачварны і гідкі смурод.

— Цётачка Антаніна, мяне залічылі...

Суседская дзяўчынка, тоненькая ў стане, як мурашка, з распушчанымі па плячах валасамі, уся ў яркай пластмасе, — шпількі, кліпсы, рознакаляровыя абручыкі на руцэ, — цокала тоненькімі абцасікамі па асфальце, можа, на спатканне ці на танцы, радасная, узрушаная. Рукі яе ажно разляталіся ад шчасця, пашчоўквалі, як кастаньеты, яркія абручыкі.

— Вернешся да нас вучонаю...

— Ой, цётачка, чаго я тут не бачыла. Нашы ніхто не збіраецца. — Зноў лёталі яе рукі, пашчоўквалі абручыкі і пацоквалі абцасікі. Яна так і пайшла, раскрыліўшы рукі.

— Ляці, ляці, птушка, — задумённа сказала Антаніна, гледзячы ўслед. Потым кіўнула на раку: — Бачыш, Паўлавіч вось так і сядзіць днямі, пазірае на ваду...

Сапраўды, на бурце, што некалі насыпалі, спрамляючы раку, у чорнай ватоўцы, у чорнай кепцы на галаве, увесь чорны, як груган, сядзеў чалавек. Анюта прыкмеціла яго даўно, думала: нейкі дзівак, мусіць, рыбу вудзіць. А гэта ж — Паўлавіч...

— Вось і Ліза выйшла...

Маці, нібы каментатар, вяла свой няхітры рэпартаж цішанскіх навін.

Ліза апранута на летні дзень цёпла, глухі світэр, гумавыя паўбоцікі на нагах. Ішла яна паціху, блізка, можна было пагукаць, здагнаць. Але Анюта не кранулася з месца, не пабегла наўздагон, як тады...

— І Гарбач пайшоў за сваёю казою, — гаварыла нібы сама сабе маці.

З вулкі паказаўся чалавек — квадратны, даўгарукі.

Вялікія далоні даставалі ледзь не да зямлі, рукі маталіся ў суставах, як на шарнірах.

Анюта ведала яго, ведала і тую гісторыю, чаму ён стаў такім. Урэшце, ніякай гісторыі і не было. Дзіцём ён быў вельмі прыгожанькі, а можа, як і ўсе дзеці. Яго вельмі любіла цётка, матчына сястра. Ухопіць на рукі, цалуе, абдымае, цісне. Вось аднойчы і ціскaнула, аж нешта хруснула ў дзіцяці...

«Так і мы загубілі гэты куток, зрэдку наязджаючы здалёк, любячы яго здалёку». Гэта адкрылася ёй неспадзеўна і ўразіла, зайшло ў душу непапраўным болем.

## 18

Маці шкадавала Марыю, гаварыла і гаварыла пра яе, уздыхала, маўчала, нешта недагаворваючы. Рукі не бралі работы. Нават куфар стаяў з адкінутым вечкам, як пакінулі тады. І «вясельныя» ўборы ляжалі навідавоку.

— Што ты хацела мне паказаць? — папытала Анюта, складваючы паркалёвыя тарановачкі.

— Ага, там, на самым днечку... Я хавала гэта ад цябе, а цяпер — чытай...

Анюта дастала пацёрты, зжаўцелы ад часу, надарваны з аднаго боку канверт.

Яна не адкрывала яго, толькі глянула запытальна на маці: ці гэта.

І тая адказала:

— Чытай.

А сама неяк сцялася ўся, заціхла, толькі вочы лавілі кожны даччын рух. Вось яна і дастала гэты злашчасны аркуш паперы. Прабегла вачыма: установа салідная — Галоўны ваенны камісарыят рэспублікі паведамляў грамадзянцы Лаўрыновіч Антаніне Пятроўне, што яе муж, Лаўрыновіч Ціт Маркавіч, пражывае ў Татарскай...

Усё гэта яна ведала: горад, вуліца, нумар дома, поўнасцю адрас... Ён праляжаў, схаваны на самае донца куфра, столькі гадоў. Як снарад у зямлі.

Анюта заплюшчылася толькі на адно імгненне, бы пацямнела ўваччу. Значыць, яны жылі, хаваючы адна ад адной адну і тую ж тайну. Толькі маці не ведае, што Анюта бачыла яго, гаварыла з ім, бачыла яго дзяцей. Двое чарнавокіх хлапчукоў за нешта біліся ў двары.

Можа б, яна і папытала ў яго што, хоць намёкам напомніла б што-кольвечы, каб не тыя хлапчукі, што, убачыўшы яе, адразу перасталі тузацца і пазіралі цікаўна, нават з нейкай засцярогай. Прыслухоўваліся, калі гаварыла з іх бацькам. Анюта толькі і папытала: ці ён гаспадар гэтага дома? На што ён, таксама насцярожана, адказаў: «Ага». Гэта крышку збянтэжыла, ведала, што па-татарску «ага» — гэта і ёсць гаспадар. Падумала: відаць, мясцовы жыхар і дарэмна яго падазрае. І, каб упэўніцца, пацвердзіць свае сумненні, запытала:

«І даўно тут жывяцё?»

Ён зноў, але неахвотна і раздражнёна, нават рэзка сказаў:

«Ага! А што вам трэба?»

Гэта «ага» цяпер сказала ёй пра многае, але гаварыць з ім чамусьці больш не хацелася. Яна толькі папытала: «Дзе жыве...», — сказаўшы першае, якое прыйшло ў галаву прозвішча...

Ён маўчаў, востра пазіраў, нібы бачыў, адчуваў хлусню, а можа, некага яму нагадаў яе твар, і стаяў, нібы аслупянелы, адно пазіраў на яе, прыжмурваючы шэра-блакітныя ў жоўтых, як карэньчыкі, прожылках вочы. Нібы круглыя цёмныя гарошыны зрэнкаў прараслі ў вадзе. Толькі гэты расток і ўбачыла яна, болей нічога ў іх, відаць, звыклых хаваць свае пачуцці, насцярожаных, не было. Затое хлапчукі пачалі наперабой даказваць, што чалавека з такім прозвішчам тут няма. Бацька зазлаваў на іх, адагнаў ад весніц. Але адзін успомніў, што ёсць, толькі ў самым канцы той вуліцы. І бацька зірнуў на яго па-іншаму, з ціхай радасцю і спадзяваннем, вочы яго выгаліліся, паказаўшы жоўтыя карэньчыкі, што ішлі ад зрэнкі ў глыб вады яго вачэй. Яна падумала, што хлапчукі, мусіць, у мацеру і цяпер недарэчна варушыць старое, тым больш што калі б гэта і быў яе бацька, ёй ад яго нічога не трэба. Столькі ж гадоў прайшло, ды і хлапчукі яго, можа, крыху большыя за яе сына, — няхай спакойна гадуе іх.

...— Ты даруй мне, што я маўчала, думала, так будзе лепш... — мацерын голас выдаваў хваляванне.

За адкрытасць трэба было плаціць адкрытасцю, але зрабіць гэта яна не магла. Нешта ў тым чалавеку здалося ёй чужым. Яна толькі зірнула на партрэт бацькі, які вісеў над ложкам, як ва ўсіх вясковых хатах, куды не вярнуліся мужы. І нават прыўзнялася ўражаная:

той чалавек зусім быў не падобны на гэты партрэт. Але разважыла, сама ж была сведкаю, як прывозілі заезджыя фотахаўтуршчыкі партрэты, і, бывае, заказчыкі іх не пазнавалі, а то і самі прасілі, як заказвалі, зрабіць прыгожымі, маўляў, ён дрэнна атрымаўся на гэтай фотакартцы, у жыцці быў прыгажэйшы. І ўсё-такі ён быў не падобны... Але ўразіла іншае: зірнула на дату. Калі маці ведала, што ён жывы, навошта аддавала павялічваць тую, адзіную фотакартку? Для сябе. Каб запомніць яго тым, маладым, і, відаць жа, любімым? Для людзей. Каб кожны, хто зойдзе (а людзей да швачкі заходзіла многа), ведаў, што і ў яе, як ва ўсіх, мужык загінуў на вайне. А можа, дзеля яе, Анюты, каб таксама ведала, што ў яе, як ва ўсіх, бацька не вярнуўся з вайны.

— Што ты пазіраеш? — насцярожліва папытала маці.

— І ты, ведаючы, усё-такі перазняла яго картку.

— Гэта мінулае... А ў ім — ён быў харошым чалавекам... — Яна пазірала задумліва, нешта ўзважваючы, перабіраючы ў памяці забытае, нібы сама яшчэ раз усумнілася: ці так гэта? — Ага, ён быў вельмі харошым чалавекам. Нешта, мабыць, з ім здарылася. Што? — яна як бы пытала ў Анюты. І тая не магла адказаць. — Што? — яшчэ раз паўтарыла Антаніна. — А мне за гады перабалела, цяпер я магу ў яго гэта запытаць... Я хачу ў яго гэта запытаць! — упарта, бы Анюта спрабавала пярэчыць, сказала яна. — Дачухна, свет, канечне, не блізкі, але колькі таго жыцця засталося, давай паедзем. Я толькі папытаю... Даўно сабрала грошай на дарогу, думала, усё-такі хоць перад смерцю ды з'езджу. Цяпер я змагу яго зразумець і... дараваць.

— Чаму дараваць? — папытала Анюта. Перад вачыма яшчэ быў той, са зменлівым позіркам чалавек, якому, яна лічыла, проста нельга дараваць, і ў той жа час ніякіх пачуццяў, ні цеплыні, ні горычы, ні помсты ў яе не было.

— Ачысціць душу, каб не мучыцца, паміраючы, — растлумачыла маці.

— Зноў ты пра сваё. Ну колькі табе гаварыць: усё пройдзе, ты паздаравееш. Ты ж яшчэ маладая, ага, маладая кабета. Паздаравееш. Я вазьму адпачынак, і паедзем, — паабяцала дачка.

...І вось яны абедзве ля таго дома, завітага з аднаго боку хмелем. За шчыльным плотам — малады сад.

Толькі весніцы на дзве зашчапкі. А можа, так было і ў першы Анюцін прыезд, але хлапчукі, ганяючыся адзін за адным, пакінулі іх адчыненымі. Нешта загрымела, нібы ланцуг, тонка, металічна зашаргацела. Так і ёсць. Па дроце, працягнутым на ўвесь двор ад дома да нейкай збудовы накшталт летняй кухні, пасоўвалася кальцо ад ланцуга. Да весніц яшчэ спакойна, нібы разведваючы хто і што, ішоў вялікі паджары сабака. Спыніўся. Пасталі і яны. Пазіраў. І гэтак сумна і абыякава сабачыя вочы гаварылі: надакучылі, абрыдлі вы мне, і калі б не гаспадар ды не гэты грымучы ланцуг, сышоў бы на край свету... Ён задраў морду, разявіў пашчу, нібы хацеў брахануць, але замест гэтага, выварочваючы язык, слюнява, з падвывам пазяхнуў. Потым азірнуўся на гаспадара, які быў таксама ў двары, — прыладзіўшыся пад ценем паветкі, ён рамантаваў нерат, — брахнуў не на іх, хутчэй на яго: маўляў, разбірайся сам, калі ты тут, і, бразнуўшы ланцугом, лёг каля будкі, паклаўшы галаву на лапы.

Антаніна нібы акамянела, нешта хацела сказаць, але рот, тонкія шызыя губы толькі прыадкрыліся. Яна хапанула імі паветра і сцяла, вочы таксама прыкрыла, нібы не верыла, хацела скінуць нейкае відовішча, каб зірнуць нанава.

Яна моўчкі пазірала і пазірала на гэтага чалавека. Ён, мусіць, таксама пазнаваў яе здалёк, пазіраў паныла, апусціўшы плечы, і раптам рукі яго замітусіліся, пачаў выгрэбацца, вылазіць з нерата, які ляжаў у яго на каленях, зірнуў па баках: ці шукаў каго, ці хацеў пусціцца наўцёкі? Але кругом быў высокі плот, ім жа самім, відаць, і пастаўлены. Нерат ублытаў яго нагу, і ён ніяк не мог выслабаніць, нават, чутно было, вылаяўся. Сабака, пачуўшы, зірнуў на яго лянівa і зняважліва, нібы звыкла дараваў абразу, потым гыркнуў, бы адказаў яму тым жа на сваёй мове. Гаспадар зрэагаваў адразу, бы разумеў:

— У-у, ваўкарэзіна, каб ты здох!

Сабака толькі плюснуў вачыма. Размова між імі, відаць, была звыклая.

Антаніна, не зважаючы на сабаку, парыўна адчыніла весніцы.

— Дык гэта ты, Нурын? — здзіўленым голасам, што сеў да хрыпаты ад хвалявання, пракрычала яна.

Вочы яго ўпіліся ў яе: не, ні радасці, ні здзіўлення ў іх не было, толькі нацэленыя, як два зарады ў двухстволцы, адно што не маглі стрэліць.

Анюта таксама пазірала на яго, чакала, што ён уразіцца ці абрадуецца і пакажа зялёныя гарошыны з аголенымі жоўтымі карэньчыкамі, але гэта былі толькі дзве драбіны з металічным бляскам, халодныя, вострыя.

— Ты тады сказаў, што жывеш у белым свеце. Гэта і ёсць белы свет? — папытала Антаніна.

Яна захвалявалася, голас перарываўся, захліпаўся.

— Гэта адрас Ціта. Што ж ты тады не сказаў, што вы з ім... Ён з табою... — яна не ведала, як і што сказаць, бо тое, што яны разам, на нейкі момант унесла яснасць у яе даўняе непаразуменне. І яна магла, — так, гэта яна магла, — са сваім зацятым гордым характарам зірнуць на яго са знявагай, бокам, ганарліва прыўзняць галаву. Нічога не сказаць, не тлумачыць, а павярнуцца і пайсці, нібы назаўсёды праклясці гэта месца, гэты дзень і дарэшты выкінуць усё з галавы, з сэрца. Не выкінуць — затаіць са шчымлівым болем, нікому не вядомым, не бачным. Яна ўся напружылася, як дрэва на ветры. Але побач стаяла Анюта, што нічога пакуль не разумела, а таму, як чалавек, звыклы быць ва ўсім дасведчаным, не магла што-колечы не высветліць. Яна не магла адносіцца да чалавека, як да каменя на дарозе, які можна пераступіць і моўчкі пайсці далей.

— Ты сказала Нурын? Чаму — Нурын? Што гэта азначае? — дапытвалася яна.

З хаты выйшаў танклявы, скуласты юнак. Можа, каторы з тых хлапчукоў, што некалі тузаліся ў двары. Ён не сказаць каб зацікаўлена, але і неабыякава пазіраў на жанчын, на бацьку, які слупам стаяў перад імі.

— Таму што ён і ёсць Нурын! — цвёрда сказала Антаніна.

— Бацька Лізы?!

Юнак ускінуў быстрыя чорныя вочы, настрыўся. Нешта ў тым яму здалося цікавым.

— Вы памыліліся, грамадзянка! — роспачна і віскліва, бы тонучы, закрычаў гаспадар і чамусьці стаў адчапляць ланцуг на шыі сабакі, які ахвотна ўгінаў галаў, дапамагаючы. — Вы памыліліся!

Цяпер Анюта ўбачыла яго вочы, выгаленыя іх яблыкі яшчэ болей апялі жоўтыя карані.

Голас яго зрываўся, мацаваўся, але ўвесь выгляд быў нейкі несамавіты і праслівы, вочы то касавурыліся на юнака, то спыняліся на Антаніне, бы давалі ёй зразумець, што з-за яго, дзеля яго ён гэтак гаворыць.

— Слава! — раздражнёна азваўся ён да хлопца, — прынясі пінжак! — сказаў, мусіць, першае, што прыйшло ў галаву, ці, можа, не раз прыкрываўся ім.

Гэта быў роспачны крык, і юнаку, відаць, стала непрыемна, можа, нават крыўдна. Ён толькі зірнуў на яго, нічога не адказаў, ды, мусіць, і не чакаў адказу, бацька даваў яму зразумець, што ён тут лішні, што яго тут нічога не датычыцца, але юнак не разумеў яго.

Гаспадар нерваваўся. І каб сын яго быў хлапчуком, такім, якога бачыла Анюта ў свой камандзіровачны прыезд, сыкнуў бы зараз, сагнаў з вачэй, ды і ўсё.

Антаніна грэбліва зірнула на Нурына, потым, занепакоіўшыся, пачала шукаць вачыма некага яшчэ ў двары, зірнула на нумар дома. Здалося раптам, што не туды патрапіла. Але не. Нумар дома супадаў і вуліца тая, што бы распаленым жалезам выпалена ў грудзях, тонкай іголкай выкалана ў мазгу. Каб яна і страціла памяць, то гэтага ніколі б не забыла. Бывала, цёмнымі бяссоннымі начамі ён, як доўгайграючая пласцінка, круціўся ў яе ў галаве, — не выкінуць, не адчапіцца. Нагадалася і тая ноч, калі крадком, як злодзей, прыходзіў Нурын. (Здалёку ж ён ехаў!) Чаму ён угаворваў тады яе не шукаць свайго Ціта: маўляў, зробіць толькі горш яму, чаму не сказаў, што ён цяпер і ёсць Ціт... Гэта здагадка жахнула яе, здалася неверагоднай. Яна нават хіснулася, ледзь на нагах адзержалася. Ён адкрыта тады прызнаўся, што мае другую сям'ю, дзяцей, але што ёй да таго: яна шукае свайго Ціта. Але чаму ў тым казённым пісьме гэты адрас? Хваля гарачай крыві ўдарыла ў скроні: здалося, яна траціць розум.

Юнак падаў бацьку пінжак. Відаць, ён думаў, што той хоча быць перад незнаёмымі людзьмі пры поўным парадзе. Нурын нервова стаў апранацца. Бліснулі на сонцы вясёлкава ордэнскія планкі... Антаніна згледзела іх і чамусьці не магла адвесці вачэй.

— Дзе ж Ціт, Ціт Лаўрыновіч? — папытала, дрыжучы, як у ліхаманцы, халоднай дрыготкай.

— Я гэта, я — Ціт! — злым, поўным нянавісці на ўвесь свет шэптам, хутчэй не ёй, а яму, — гэтаму юнаку, сказаў ён.

Яна ж, Антаніна, неяк не ўспрыняла гэта розумам, толькі вочы раскрыліся самі сабою, бы палезлі на лоб, ды сэрца сцялося да болю. Яна кінулася да яго, не пом-

нячы сябе, учапілася ў грудзі, не зважаючы, што ўскочыў, загыркаў сабака. Яна рвала, рвала з яго пінжака ордэнскія планкі:

— Дак ты, гад, носіш яго ўзнагароды! Га-ад... — захліпалася яна.

Анюта ж зразумела толькі адно: што гэты чалавек у дзвюх асобах. Нешта неверагодна страшнае і нялюдскае было ў ім. Аж холад пайшоў па целе, як тады, калі заплылі яны, яшчэ малыя дзяўчаткі, на віры. Старыя віры на ціхай іх плыткай рацэ ўтварыліся ў часе вайны ад бамбёжак. Вада ў іх не прагравалася, бы на дне ўсё лета ляжаў лёд. І Анюта нібы зноў адчула холад той доннай вады, якая скоўвала цела, не давала паварушыцца, а віры зацягвалі ў сваё халоднае, мёртвае нутро. І Ліза сядзела на беразе, дрыжучы ўсім целам, і праз дрыжыкі крычала ёй: «Трымайся! Трымайся на паверхні!» Але яна адчула, што не можа супраціўляцца вірам, яны закручваюць яе, цягнуць уніз. Жахліва ледзяніць душу страх, а цела — холад доннай вады.

* * *

Жыццё на тым не скончылася. Яно, здаецца, шпарчэй пабегла наперад і, як гаспадыня, якая запазнілася, не ўправілася ў час, пачало наводзіць парадак, расстаўляць усё па сваіх месцах.

Нурына неўзабаве судзілі адкрытым судом, куды сцёкся ўвесь Цішанскі раён. Шкада Лізы, яна засілілася. Антаніна Пятроўна вельмі пастарэла. Яна ўсё ходзіць да магілы Ціта: Нурын на следстве ўказаў месца, дзе ён высачыў яго, параненага салдата, калі той вяртаўся, камісаваны, дадому ў першыя дні пасля вызвалення раёна, і забіў, каб забраць дакументы.

У раённым музеі яго фота, два ордэны, медалі, якія адабралі ў Нурына.

І гарадок Ціша змяніўся: вуліца Першамайская забудавана шматпавярховымі дамамі, заводзік рэканструявалі, будуюць новы.

Ганна Цітаўна ўсё ездзіць паміж Цішай і Мінскам. Угаворвае мужа пераехаць назаўсёды. Ці кахае яна Антона? Не ведаю... Даўно не сустракалася з ёю. Даўно... І даўно не была ў тым гарадку пад назваю Ціша.

*1978, 1985*

# ЗМЕСТ


ЗАМОВА АД СТРАХУ . . . . . . . . 3
ХОЛАД ДОННАЙ ВАДЫ . . . . . . . 165



*Литературно-художественное издание*

**Маевская Нина Васильевна**

ХОЛОД ДОННОЙ ВОДЫ

Повести

Минск, издательство «Мастацкая літаратура»

На белорусском языке

*Літаратурна-мастацкае выданне*

**Маеўская Ніна Васільеўна**

ХОЛАД ДОННАЙ ВАДЫ

Аповесці

Рэдактар *В. М. Хлебавец*. Мастак *С. А. Філіпаў*. Мастацкі рэдактар *М. Я. Шкурпіт*. Тэхнічны рэдактар *Л. М. Шлапо*. Карэктар *Т. В. Трубач*.

ІБ № 2866

Здадзена ў набор 14.04.88. Падп. да друку 20.02.89. АТ 06184. Фармат 84×108¹/₃₂. Папера друк. № 2. Гарнітура літаратурная. Высокі друк. Ум. друк. арк. 17,64. Ум. фарб.-адб. 18,06 Ул.-выд. арк. 18,93. Тыраж 12 000 экз. Зак. 1058. Цана 1 р. 60 к.

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Дзяржаўнага камітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Друкарня «Перамога», 222310, Маладзечна, вул. Таўлая, 11.

Маеўская Н.
М 13 Холад доннай вады: Аповесці. — Мн.: Маст. літ., 1989. 335 с.
ISBN 5-340-00019-2.
Маевская Н. Холод донной воды: Повести.

Новую кнігу Ніны Маеўскай склалі творы, якія насычаны цікавымі жыццёвымі калізіямі. Лёсы герояў няпростыя і падчас супярэчлівыя. У гераіні аповесці «Холад доннай вады» Анюты-Ганны добрая сям'я, клапатлівы муж, але яна пакахала другога чалавека... Праблемы абавязку, маральнай чысціні, адказнасці за свае ўчынкі — вось галоўнае, на што звяртае ўвагу пісьменніца.

М $\frac{4702120201-083}{М\ 302(03)-89}$ 14—89 ББК 84 Бел7